


Наследие слуцкого края



Наследие слуцкого края
Сайт, посвященный истории Слуцкого

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Наследие слуцкого края



СЛУЦКІ РАЁН
СЛУЦК

У 2 кнігах

Кніга 1-я

МІНСК
БЕЛТА
2000

Наследие слуцкого края

УДК 947.6
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.К.КІСЯЛЁЎ (галоўны рэдактар выдавецкага цэнтра БЕЛТА),
Я.І.БАРАНОЎСКІ, В.С.ВІДЛОГА, П.Б.ДАЎГУЧЫЦ, З.К.ЛОМАЦЬ,
А.Л.ПЕТРАШКЕВІЧ, А.А.САЙКО, Б.В.УЛЬЯНКА, В.Б.ШАГІМУРАТАЎ

АБ'ЯДНАНАЯ РАЁННАЯ І ГАРАДСКАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

П.Б.ДАЎГУЧЫЦ (старшыня камісіі), В.Р.СІТНІК (намеснік старшыні), Г.С.БУРАЧКОЎ,
В.С.ВІДЛОГА, Г.І.ГЛУХАЯ, А.У.ЖУК, М.Р.ЗІНІЧ, І.Р.ПІСАРЫК, У.М.ЦІШКЕВІЧ,
В.Б.ШАГІМУРАТАЎ, Т.І.ШАХНОВІЧ

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

Б.В.УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Укладальнік
В.С.ВІДЛОГА

Мастак
Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-6302-27-7

© БЕЛТА, 2000

Наследие слуцкого края



Рака Случ.

35—10 тысяч гадоў таму.	На тэрыторыі Случчыны з'явіліся першыя пасяленні людзей.
1116 г.	Першыя летапісныя звесткі пра Слуцк (Случеск).
1160 г.	Слуцк — цэнтр удзельнага Слуцкага княства.
1205 г.	Упершыню згадваецца Слуцкі Свята-Троіцкі (Трайчанскі) манастыр.
1395—1612 гг.	Слуцкае княства належала літоўскай дынастыі Гедзімінавічаў і іх нашчадкам князям Алелькавічам.

Наследие слуцкого края



Помнік княгіні Соф'і Алелькавіч у Слуцку.

Ліпень 1410 г.	Удзел Слуцкага апалчэння ў Грунвальдскай бітве супраць крыжакоў.
1419 г.	У Слуцку пабудаваны фарны касцёл.
1441 г.	Слуцк атрымаў Магдэбургскае права.
1480 г.	Першыя звесткі пра Грэск.
1502, 1503, 1505, 1506 гг.	Напады крымскіх татар на Слуцк і слуцкія землі.

Наследие слуцкого края



Герб «Пегас», атрыманы Слуцкам у 1652 г. Сучасны герб горада.

1 мая 1585 г. — 19 сакавіка 1612 г.	Жыццё і дзейнасць слуцкай княгіні Соф'і Алелькавіч, прылічанай да ліку святых праваслаўнай царквы.
1612 г.	Пераход Слуцка і Слуцкага княства ва ўладанне князёў Радзівілаў.
1617 г.	Заснаванне ў Слуцку гімназіі — адной са старэйшых навучальных устаноў Беларусі.
1669 г.	Пажар у Слуцку, у выніку якога выгараў цэнтр і гандлёвыя рады горада.
1671 г.	Заснаванне ў горадзе бернардзінскага манастыра.
1672—1705 гг.	У Слуцку працавала друкарня.

Наследие слуцкого края



Касцёл езуітаў у в. Замосце. Помнік архітэктуры XVII ст.

1695 г.	Слуцкае княства перайшло ва ўладанне прынцэсы Нейбургскай.
1715 г.	Пабудаваны касцёл езуітаў.
1736—1844 гг.	Дзейнасць Слуцкай мануфактуры шаўковых паясоў.
1744—1832 гг.	Слуцк і Слуцкае княства ва ўладанні Радзівілаў.
2-я палавіна XVIII ст.	У Слуцку пабудавана Свята-Міхайлаўская царква.

Наследие слуцкого края



Свята-Міхайлаўскі сабор у Слуцку. Помнік архітэктуры XVIII ст.

1751—1760 гг.	**Стварэнне прафесійнага тэатра Радзівілаў у Слуцку.**
1756 г.	**Адкрыццё балетнай школы пры тэатры Радзівілаў.**
1785 г.	**У Слуцку пачала працаваць праваслаўная духоўная семінарыя. Слуцк аб'яўлены цэнтрам праваслаўнай царквы Беларусі, Правабярэжнай Украіны, Літвы і Польшчы.**
1791 г.	**Ліквідацыя Слуцкага княства. Слуцк стаў цэнтрам Случарэцкага павета Навагрудскага ваяводства.**
1793 г.	**Уваходжанне Случчыны ў склад Расійскай імперыі. Слуцк аб'яўлены павятовым цэнтрам Мінскай губерні.**

Наследие слуцкого края



Слуцкі пояс.

Сакавік — лістапад 1794 г.	Удзел случан у паўстанні Тадэвуша Касцюшкі.
Ліпень — пачатак лістапада 1812 г.	Знаходжанне ў Слуцку і яго наваколлі напалеонаўскіх войскаў.
1831 г.	Закончана будаўніцтва ўчастка Маскоўска-Варшаўскай шашы, якая праходзіла праз Слуцк і павет.
1832 г.	Случчына стала ўладаннем князя Л.П.Вітгенштэйна.
1844 г.	Адкрыццё ў горадзе бальніцы.
1872 г.	У в. Чапліцы адкрыта народнае вучылішча.

Наследие слуцкого края



Г. Скрыпнічэнка. З вякоў мінулых.

1889 г.	У Слуцку пабудаваны Свята-Мікалаеўскі сабор.
1896 г.	Пачатак будаўніцтва чыгуначнай лініі Асіповічы — Слуцк.
1897—1924 гг.	У в. Старэва дзейнічаў шклозавод.
1904 г.	Стварэнне ў Слуцку арганізацыі РСДРП. Заснаванне гарадской публічнай бібліятэкі.
18 красавіка 1906 г.	Агульнагарадская палітычная забастоўка.

Наследие слуцкого края



Будынак былога дваранскага сходу. Помнік архітэктуры XIX ст. Цяпер Слуцкі краязнаўчы музей.

1907 г.	Надрукаваны Слуцкі летапіс.
Люты 1908 г.	Выступленне сялян вёскі Заграддзе супраць адміністрацыі і паліцыі.
1917—1920 гг.	Дзейнасць культурна-асветніцкай арганізацыі «Папараць-кветка».
Лістапад 1917 г.	Устанаўленне савецкай улады ў Слуцку і павеце.
Люты—снежань 1918 г.	Акупацыя Случчыны войскамі кайзераўскай Германіі.

Наследие слуцкого края



**Будынак былой мужчынскай гімназіі ў Слуцку.
Помнік архітэктуры XIX ст. Цяпер сярэдняя школа № 1.**

25 сакавіка 1919 г.	Выйшаў першы нумар газеты "Молат і плуг".
10 жніўня 1919 г. — 24 лістапада 1920 г.	Польскія інтэрвенты двойчы акупіравалі Случчыну.
25 красавіка 1920 г.	Расстрэл польскімі акупантамі 14 слуцкіх партызан.
Лістапад — снежань 1920 г.	Дзейнічала рада Случчыны.
17 ліпеня 1924 г.	Утвораны Слуцкі раён з цэнтрам у Слуцку.
1924 г. — ліпень 1927 г.	Слуцк — цэнтр акругі.

Наследие слуцкого края



Капліца Святой Варвары ў Слуцку.

1927 г.	Адкрыццё ў Слуцку педагагічнага тэхнікума.
Чэрвень 1927 г. — ліпень 1930 г.	Слуцкі раён у складзе Бабруйскай акругі.
Красавік 1930 г.	Пачала выдавацца раённая газета «Ленінскі шлях».
1934 г.	Арганізаваны Казловіцкі народны хор.
Чэрвень 1935 г.	Утворана Слуцкая акруга.
Люты 1938 г.	Ліквідавана Слуцкая акруга, Слуцкі раён у складзе Мінскай вобласці.

Наследие слуцкого края



Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў у в. Селішча.

27 верасня 1938 г.	Слуцк — горад абласнога падпарадкавання.
1938 г.	Пачала выходзіць раённая газета «За сацыялістычную Радзіму».
1939 г.	Раён прадстаўлены на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве.
Чэрвень 1941 г. — чэрвень 1944 г.	Слуцк і Слуцкі раён акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.
Ліпень 1941 г.	Партызанскі атрад М.І.Жукоўскага разграміў нямецкую камендатуру ў Слуцку.

Наследие слуцкого края



Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Вёска Заполле.

Ліпень 1941 г. — чэрвень 1944 г.	Дзейнічала Грэскае партыйна-камсамольскае падполле.
Кастрычнік 1941 г.	Масавае знішчэнне яўрэяў (звыш 5 тыс. чал.) у слуцкім гета.
Кастрычнік 1941 г. — сакавік 1943 г.	Дзейнасць Слуцкага антыфашысцкага падполля.
1942—1943 гг.	Дзейнічалі Слуцкі падпольны міжраённы камітэт КП(б)Б і Слуцкі падпольны міжраённы камітэт ЛКСМБ.
Кастрычнік 1942 г.	Масавае знішчэнне мірных жыхароў ва ўрочышчы Гараваха.
Сакавік 1943 г.	Пачалі дзейнічаць Слуцкі і Грэскі падпольныя раённыя камітэты

Наследие слуцкого края

Да чытача

Случчына... Радзіма-маці, зямля нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў, што дзеля цябе жылі, крывёй і духам сваім цябе баранілі. Баранілі, каб на золку ўмывалі цябе крыштальныя росы і сваёй пяшчотай саграваля сонейка, каб бела-ружовым вэлюмам квітнелі вёснамі сады, каб па мурожнай траве бегалі і весела смяяліся дзеці, каб ткаліся нашы сурвэты і паясы, каб складаліся санеты і звінелі песні...

Любая, родная наша зямля! Багатым на розныя падзеі быў векавечны шлях твой, якім прайшлі праз стагоддзі сыны і дочкі твае.

Заўжды найбольшай бядой для ўсіх народаў і цывілізацый былі войны. На жаль, яны і зараз яшчэ застаюцца спадарожнікам чалавечага жыцця. Аднак іх разбуральнае ўздзеянне неаднолькавае ў розных мясцінах. Больш церпяць тыя, хто знаходзіцца на скрыжаванні ваенных шляхоў. Сярод такіх мясцін і ты, наша родная Случчына. Колькі разоў рабавалі цябе, вораг таптаў твой жытні колас і краскі твае? Самая свежая ў нашай памяці і таму, мабыць, самая трагічная для нас Вялікая Айчынная вайна вогненнай віхурай пранеслася над табою, наша родная зямля, знішчаючы ўсё на шляху. Якія страты — матэрыяльныя і духоўныя — панесла ты! Але самае каштоўнае з усяго страчанага — людзі. Разбуранае можна аднавіць, пабудаваць, зноў завараныя і засеяныя палі дадуць новыя ўраджаі, а людскія страты — беззваротныя.

Ідуць гады. Зарубцаваліся, Случчына, раны твае, пакінутыя ваенным ліхалеццем. Каласіцца жыта, узняліся гмахі будынкаў. Але аб мінулым напамінаюць маўклівыя помнікі, што, углядаючыся ў нябесную сінь, нібыта кажуць вуснамі загінуўшых: «Памятайце, памятайце нас! Гэта мы, хто змагаўся за родны край».

Вечная слава загінуўшым у розныя часы за цябе, Случчына, за прадаўжэнне жыцця на зямлі тваёй!

Нізкі паклон усім, хто з пажарышчаў руін уздымаў цябе і сваёй руплівай працай і талентам засяваў і цяпер засявае поле тваёй гісторыі, Случчына!


Шаноўны чытач! Кніга, якую ты трымаеш у руках, з'яўляецца своеасаблівай энцыклапедыяй нашага горада і раёна, працягам гісторыка-дакументальных хронік населеных пунктаў Беларусі. Сама яе назва «Памяць» ужо гаворыць аб многім: гэта не проста памяць аб падзеях, людзях, гэта — помнік. Ён напомніць прозвішча кожнага загінуўшага, кожнага, хто ўпісаў і ўпісвае радок у гісторыю нашага краю. Але, на жаль, імёны не ўсіх загінуўшых трапілі ў гэту кнігу. Пошук працягваецца. Няхай жа хроніка Памяці стане вечным агульным помнікам і для іх.

Гісторыка-дакументальная хроніка Случчыны складалася на падставе архіўных дакументаў і матэрыялаў, публікацый у газетах і часопісах, успамінаў удзельнікаў і сведкаў гістарычных падзей.

У пошуку, зборы і апрацоўцы матэрыялаў прымалі ўдзел прадстаўнікі грамадскасці горада Слуцка і Слуцкага раёна, навукоўцы, супрацоўнікі архіваў, музеяў, бібліятэк, пісьменнікі, журналісты, рэдактары выдавецтва «Вышэйшая школа».

У кнізе выкарыстаны матэрыялы і дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расіі, Дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Расіі, Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці і яго філіялаў у Слуцку і Бабруйску, Слуцкага краязнаўчага музея, Слуцкай цэнтральнай гарадской бібліятэкі.

Наследие слуцкого края



Карта Слуцкага раёна.

Слуцк, горад абласнога падпарадкавання, цэнтр Слуцкага раёна, на р. Случ. Чыгуначны вузел. За 105 км на поўдзень ад Мінска. 63 тыс. жыхароў (1999). Асноўныя галіны прамысловасці: харчовая (цукраварафінадны камбінат, хлебазавод, макаронная фабрыка, мясакамбінат, сыраробны камбінат, кансервавы завод, камбінат хлебапрадуктаў, піваварны завод), лёгкая (ільнозавод, фабрыкі пашыву адзення, мастацкіх вырабаў, тэкстыльная), а таксама заводы (аўтарамонтны, «Эмальпосуд», жалезабетонных вырабаў, «Модуль», «Слуцкмэбля» і інш.). Медыцынскае вучылішча, прафесійна-тэхнічнае вучылішча перапрацоўчай прамысловасці, прафесійна-тэхнічнае вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі, вышэйшае прафесійнае вучылішча перапрацоўчай прамысловасці-97, 11 сярэдніх школ, сярэдняя політэхнічная школа, гімназія, дзіцячая музычная, мастацкая і спартыўная школы, цэнтр тэхнічнай і прыкладной творчасці, станцыя юных натуралістаў, цэнтр дзіцячай творчасці, станцыя юных турыстаў, спарткомплекс «Дэльфін», 20 дашкольных устаноў, Дом культуры, кінатэатр «Беларусь», Дом моладзі, маладзёжны цэнтр, цэнтр вольнага часу, парк культуры і адпачынку, 2 бібліятэкі, краязнаўчы музей, філіял абласнога архіва, народны тэатр імя У.Галубка пры Доме культуры, бальніца, 2 дыспансеры, 2 паліклінікі, жаночая і дзіцячая кансультацыі, 2 праваслаўныя царквы, касцёл.

Слуцкі раён — на поўдні Мінскай вобласці, утвораны 17.7.1924 г. У складзе Слуцкай акругі Мінскай вобл., Слуцкай акругі Бабруйскай вобл. (1924–1938), у Мінскай вобл. (1938–1944), у Бабруйскай вобл.

Наследие слуцкого края

(1944 – 1954), з 1954 г. у Мінскай вобл. Плошча раёна 1,9 тыс. кв. км. Колькасць насельніцтва на 1.1.1998 г. — 41 734 жыхары. Населеных пунктаў 210.

У раёне 10 сельскіх Саветаў: Акцябрскі, Амговіцкі, Беліцкі, Бокшыцкі, Вясейскі, Гацукоўскі, Грэскі, Знаменскі, Ісернскі, Казловіцкі, Кіраўскі, Ленінскі, Маяцкі, Паўстынскі, Першамайскі, Покрашаўскі, Рачкавіцкі, Сорагскі, Сяражскі.

Паверхня раёна раўнінная. Большая частка тэрыторыі ў межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны. На паўночным захадзе — Капыльская града. Найвышэйшы пункт 212 м (на паўночным усходзе ад в. Шышчыцы Грэскага сельсавета), найменшая адзнака 145 м (урэз р. Случ). Сярэдняя тэмпература ў студзені -6,3, ліпені 18,0 °С. Вегетацыйны перыяд 193 суткі. Ападкаў 580 мм за год. Карысныя выкапні: 2 радовішчы торфу, 2 радовішчы мелу, 3 радовішчы будаўнічых пяскоў, 3 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу, 3 радовішчы цагельнай сыравіны. На тэрыторыі раёна р. Случ з прытокамі Морач, Лакнея, Вясейка і інш., вадасховішча Рудня: плошча 3,76 кв. км, найбольшая глыбіня 5,7 м. Глебы сельгасугоддзяў: дзярнова-падзолістыя, дзярнова-падзолістыя забалочаныя, дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя, поймавыя, тарфяна-балотныя. Паводле механічнага складу: сугліністыя (пераважна), супясчаныя, пясчаныя і тарфяныя. 22% тэрыторыі пад лесам, пераважна на паўночным усходзе. Пашыраны хвоя, елка; з лісцевых — вольха, бяроза, дуб, ясень, асіна. З паляўніча-прамысловых жывёл водзяцца лось, дзік, заяц-бяляк, заяц-русак, вавёрка, ліс, воўк, рысь. З ахоўных жывёл і раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі, трапляюцца трохпальцы дзяцел, шэры сараку ш, балотная чарапаха, кадзіла сармацкае, каменяломнік балотны, перацвет веснавы, званочак персікалісты, наперстаўка буйнакветкавая, венерын чаравічак сапраўдны, ятрышнік мужчынскі, касач сібірскі, пылкагалоўнік даўгалісты.

У складзе раёна 27 калгасаў, 3 саўгасы, лясгас, воцатны завод, торфабрыкетны завод «Слуцкі», гандлёва-прамысловае прадпрыемства «Металіст», ТАА «Белінтэрагра», райаграпрамэнерга, 3 будаўнічыя арганізацыі, сельскі будаўнічы камбінат, транспартнае прадпрыемства па бытавому абслугоўванню насельніцтва «Сяльчанка», вучгас ПТВ-209, падсобная гаспадарка раённага аб'яднання «Сельгасхімія», эксперыментальная база «Танежыцы», дапаможная гаспадарка «Крывая града», арэндная сельскагаспадарчае прадпрыемства «Колас», калектыўна-долевая гаспадарка «Селішча» і інш.

Дзейнічаюць раённая бібліятэка з 38 філіяламі, 39 дамоў культуры і клубаў, 3 дзіцячыя музычныя школы, 4 школы мастацтваў, 1 басейн, 1 стадыён, 35 спартыўных залаў, 23 сярэднія школы, 12 базавых (васьмігадовых), 8 пачатковых, 30 дзіцячых садкоў (на пач. 1999 г.). На тэрыторыі раёна знаходзяцца дзіцячыя санаторыі «Случ» і «Сонейка» аб'яднання «Белмяжкалгасздраўніца», 8 бальніц, 35 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 29 помнікаў археалогіі, звыш 200 гістарычных, 4 помнікі архітэктуры.

Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгункі Баранавічы — Слуцк — Асіповічы і Слуцк — Салігорск, аўтамабільныя дарогі Масква — Бабруйск — Слуцк — Івацэвічы, Мінск — Слуцк — Мікашэвічы, Асіповічы — Нясвіж — Баранавічы і інш.

Выходзіць раённая газета «Слуцкі край».

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел раёна

Акцябрскі сельсавет: вёскі Акцябр, Бязверхавічы, Еўлічы, Машчыцы, Рэтаўшчына, Селішча, Цалевічы; пас. Бязверхавічы.

Амговіцкі сельсавет: вёскі Амговічы, Аступішча, Гутніца, Дворышча, Каліта, Краснае, Кучына, Ляхава, Новы Гуткоў, Падлошыца, Падстарэва, Паўлаўка, Рубеж, Сліўка, Стары Гуткоў, Старэва (дачная), Тарасаўка, Хінолаўка, Хорашава, Ціхань, Чырвоная Старонка.

Беліцкі сельсавет: вёскі Балотчыцы, Белічы, Горкі, Квасынічы, Млынка, Навабелічы, Чыжоўка.

Бокшыцкі сельсавет: вёскі Бокшыцы, Васілінкі, Гарадзішча, Гарохаўка, Забалаць, Загор'е, Заполле, Кухты, Малая Падэра, Малоткава, Міхейкі, Новая Ніва, Прошчыцы, Радзічава, Уланава, Ушаловічы.

Вясейскі сельсавет: вёскі Боркі, Буслаўка, Бярозаўка, Васількова, Вясея, Ізбудзішча, Камора, Краснае Сяло, Ленькі, Ліпнікі, Лошыца, Муравішчына, Мялешкі, Набушава, Папоўцы, Слабада, Таліца.

Гацукоўскі сельсавет: вёскі Азярцы, Белая Лужа, Белы Бор, Буда Грэская, Вежы, Гацук, Залессе, Крывая Града.

Грэскі сельсавет: вёскі Астравок, Вераб'ёва, Грэск, Забелы, Марозы, Прагрэс, Старына, Сцяпкова, Ульянаўка, Швяды, Шышчыцы, Яўладавічы.

Знаменскі сельсавет: вёскі Барок, Ванькоўшчына, Знамя, Лапаціч ы, Сярэднікі; пасёлкі Беларусь, Вішнёўка, Дуброва, Красная Ніва, Малінаўка, Міхайлаўка, Сахалін, Свабодны, Усход (Восток), Хлебны Клін.

Ісернскі сельсавет: вёскі Вялікае Быкава, Гуляева, Ісерна, Малое Быкава, Нежаўка, Панічы; пасёлкі Калінаўка, Малінаўка, Навасёлкі.

Казловіцкі сельсавет: вёскі Агароднікі,

Наследие слуцкого края
Сайт, посвященный истории Слуцкого

Бліжнія Бандары, Валаты, Вялікая Падзер, Вялікая Сліва, Дальнія Бандары, Казловічы, Лесуны, Малая Сліўка, Ячава.

Кіраўскі сельсавет: вёскі Агароднікі, Вялікае Журава, Іванскія Агароднікі, Івань, Кірава, Кляпчаны, Лясішча, Маглышы, Малая Падзер, Навадворцы, Новы Двор, Працавічы, Устрань.

Ленінскі сельсавет: вёскі Заляддзе, Кажушкі, Леніна, Нявязцы, Падлессе, Славінск, Ульянаўка, Цяраспаль, Шалавічы.

Маяцкі сельсавет: вёскі Боркі, Ветка, Клешава, Леткаўшчына, Маяк, Мусічы, Шулякі.

Паўстынскі сельсавет: вёскі Загранддзе, Кублішча, Мерашыно, Паўстынь, Рабак.

Першамайскі сельсавет: вёскі Апаліны, Баравая, Гольчыцы, Жылін Брод, Кальчыцы, Кулікі, Навінкі, Ніва, Палікараўка, Пільня, Ржаўка, Строхава, Таковішча, Шантароўшчына.

Покрашаўскі сельсавет: вёскі Адамова, Ануфравічы, Бабовішчы, Вынісцы, Замосце, Ленькі, Паўлаўка, Покрашава, Рудня.

Рачкавіцкі сельсавет: вёскі Бялевічы, Замошша, Лядна, Малышэвічы, Новыя Рачкавічы, Прыдзіркі, Пятніцы, Рачкавічы, Танежыцы, Чапліцы; пасёлкі Кавержыцы (дачны), Славіна, Чайчыцы, Чапліцы, Юлісіна.

Сорагскі сельсавет: вёскі Аступішча, Волашава, Круглае, Мелітонава, Рыжыца, Сорагі.

Сяражскі сельсавет: вёскі Бранава, Бранавічы, Варкавічы, Качалава, Лучнікі, Падліпцы, Паўлаўка, Сярагі.

Населеныя пункты Слуцкага раёна, якія не існуюць

Амговіцкі сельсавет: вёскі Баравая, Гондарава, Лявішча, Падстарына; пасёлкі Двор, Купішча; хутары Адраджэнне, Вугальнае, Вярбішчына, Харашоўка.

Беліцкі сельсавет: пасёлкі Дзягцяніца, Дубоўка, Копань, Крыніца, Маёўка, Раёўка.

Бокшыцкі сельсавет: вёскі Кулікі, Фаявіца; пасёлкі Веранеўшчына, Засценак, Захараўка, Новае Жыццё, Чырвоная Горка; хутары Вяленічы, Герачкі, Горбава, Дзесяціны, Заселле, Міхейкаўшчына, Навінка, Палопнішча, Паршуціна.

Вясейскі сельсавет: вёскі Баравуха, Жураўка, Малыя Амговічы, Манева, Немча; пасёлак Масткі; хутар Даўганоша.

Гацукоўскі сельсавет: пасёлкі Вежы, Захацінава; хутары Балатны Асавец, Востраў Успалоха, Кучкі, Лісоўшчына, Ляскі, Марцінаў Бор, Пасека, Уздымач, Чарцен.

Грэскі сельсавет: пасёлкі Андрэеўка, Навінкі, Някрасаўка; хутар Сцяпкоўка.

Знаменскі сельсавет: пасёлкі Барок, Волгіна, Краснова, Курганы, Міхайлаўка, Нованікольск, Рэўбарацьба, Чырвоны Прамень; хутары Схабоўшчына, Чарнева.

Ісернскі сельсавет: пасёлкі Акцябр, Высокае, Дубава, Случ; хутары Бранавіцкае, Дуброўка, Маркоўшчына.

Казловіцкі сельсавет: пасёлак Некрашы.

Кіраўскі сельсавет: вёска Новыя Маргі, пасёлак Яноўскі; хутары Агароднікі, Жыгмянтовіча, Кулага, Мікалаеўшчына, Некрашэвіча, Новіка, Яноўка.

Ленінскі сельсавет: вёска Пуцята, пасёлкі Дубкі, Крушнікі, Маргі, Сухаўчыцы, Чырвоная Бяроза.

Маяцкі сельсавет: пасёлкі Камароўка, Курганы, Птушыныя Горы.

Першамайскі сельсавет: вёскі Барок, Беразінец, Бондарава, Вялікі Таковішча, Заплессе, Камяністае, Копань, Крушнік, Ляды, Макавішча, Малы Таковішча, Навіны, Падсадок, Пераходы, Фадзееўка, Хмелішча, Чырвоны Араты; пасёлкі Астравок, Беразінец, Дуброўка, Задоўба, Зара, Кошышча, Краснае, Леніна, Лясніцтва, Ніва, Нівішча; хутары Дубовае, Кабыліна Балота.

Покрашаўскі сельсавет: пасёлкі Пераволока, Старая Смалярня; хутар Пліцнік.

Рачкавіцкі сельсавет: пасёлкі Карамі-ны, Крошня.

Сяражскі сельсавет: вёска Іванаўка; пасёлкі Араты, Выбранецкі, Манькова, Навасельцы, Пралетарый, Прыбытак, Ружа, Спаскі, Чэпечкі; хутары Волгіна, Дзямідава, Культурнага, Кунтыша, Марфін, Пятрулікаў, Смольскі.

Наследие слуцкого края

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

КАМЕННЫ ВЕК

8500—8300 гадоў да н.э. закончылася ледавіковая эпоха, адбылося змяненне клімату. Ужо не халодныя стэпы і снегавыя прасторы, а зялёныя пушчы аддзялялі адны пасяленні людзей ад другіх. Стужкі рэк злучалі радавыя абшчыны, дапамагалі першабытнаму чалавеку арыентавацца ў лясных масівах. Гэта былі шляхі, прадуманыя самой маці-прыродай. Эпоха каменнага веку, самай першай ступені развіцця чалавека як сацыяльнай істоты, дзеліцца на тры этапы — палеаліт, мезаліт і неаліт. У палеаліце на тэрыторыі сучаснай Беларусі склаліся ўмовы для жыцця першабытнага чалавека. Засяленне Случчыны людзьмі адносіцца да мезаліту — сярэднекаменнага веку. Людзі асталёўваліся па берагах рэк Случ і Лань. Шчыльнасць засялення была нізкая, стаянкі размяшчаліся на краях надпоймавых тэрас, на пясчаных пагорках. Асноўнымі заняткамі старажытнага чалавека былі паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. У мезаліце з'явіліся новыя прылады працы: рагавыя нажы, клінкі, наканечнікі, грубаабабітыя сякеры, кіркі, цёслы, скрабкі, разцы, скоблі. Шырока выкарыстоўваўся лук са стрэламі, драўляныя чаўны, быў прыручаны сабака.

Стаянкі чалавека эпохі мезаліту па сваіх памерах звычайна былі невялікія, у даўжыню складалі 50—100 м. На стаянцы знаходзілася некалькі круглых або авальных жытлаў па 2—4 м у папярочніку, якія заглыбляліся ў грунт на 0,4—0,6 м. Вогнішча распальвалася ў ямцы каля сценкі ці пасярэдзіне жытла.

Каменны век завяршаецца эпохай неаліту, які пачаўся ў 5-м і закончыўся ў пачатку 2-га тысячагоддзя да н.э. У гэты час людзі пачалі выраблять і абпальваць гліняны посуд, удасканаль-

Курганны могільнік каля в. Паўлаўка.

Наследие слуцкого края

ваць каменныя прылады працы. У Слуцкім раёне стаянкі неаліту адкрыты паміж в. Агароднікі Падзерскія і вясковымі могілкамі. Матэрыялы гэтага перыяду знойдзены таксама на тэрыторыі сучаснага Слуцка і калгаса імя Энгельса.

У неаліце гаспадарка адных плямёнаў спецыялізавалася на рыбалоўстве або на земляробстве. На гэтай аснове паглыбляўся грамадскі падзел працы. Усё больш пашыраўся абмен вынікамі працы паміж абшчынамі, родамі і нават плямёнамі.

Мацярынскі род у неаліце набыў сталыя формы, найвышэйшага развіцця дасягнуў родаплемянны лад. Значна ўзрасла колькасць племянных абшчын і родаў. Развівалася племянная форма ўласнасці. Кожная племянная абшчына адрознівалася ад суседняй як матэрыяльнай культурай, так і асаблівасцямі духоўнага жыцця — культамі, уяўленнямі і традыцыямі.

ЭПОХА БРОНЗЫ

Бронзавы век на тэрыторыі Случчыны пачаўся на мяжы 3-га і 2-га тысячагоддзяў да н.э. Аддаленасць ад старажытных цэнтраў металургіі абумовіла больш працяглае карыстанне тут каменнымі прыладамі працы. Шырока ўжываліся ў эпоху бронзы шліфаванне, свідраванне, пілаванне. Важнае месца побач з традыцыйным паляваннем, рыбалоўствам і збіральніцтвам пачалі займаць земляробства і жывёлагадоўля. Гадавалі кароў, авечак, коз, коней, свіней. Невялікія ўчасткі зямлі апрацоўваліся каменнымі і рогавымі матыкамі, жалі крамянёвымі сярпамі, расціралі зерне ручнымі зерняцёркамі. Разнастайным стаў гліняны посуд. Паступова адбываўся пераход да грамадскага падзелу працы. Паміж жывёлаводамі і земляробамі ўстанавіўся рэгулярны абмен прадуктамі. Ва ўжытак усё больш уваходзілі бронзавыя рэчы.

У канцы 3-га — пачатку 2-га тысячагоддзя да н.э. на тэрыторыі Беларусі рассяляюцца плямёны розных культур шнуравой керамікі. Ад таго часу засталіся каменныя прасвідраваныя сякеры, якія знойдзены ў вёсках Вялікая Сліва, Гарадзішча, Кулікі, Маглышы, Рачкавічы, Ржаўка, Цярaспаль, у г. Слуцк. Прылады працы бронзавага веку — крамянёвыя сякеры-кліны, лопасцевыя сякеры, тоўстаабушныя сякеры-кліны і іншыя — трапляліся вучоным у розных кутках Случчыны. Сляды паселішчаў таго часу выяўлены каля в. Агароднікі Падзерскія, у левабярэжжы р. Случ.

Плямёны шнуравой керамікі, узброеныя каменнымі прасвідраванымі



Гарадзішча каля в. Амговічы.

Наследие слуцкого края

баявымі сякерамі, лукамі, дзідамі з крамянёвымі наканечнікамі і кінжаламі, часта вандравалі ў пошуках лепшых лугавін, вадаёмаў. Археалагічныя даследаванні месцаў іх бытавання працягваюцца.

ЭПОХА ЖАЛЕЗА

Случчына ў эпоху ранняга жалезнага веку — адзін з найбольш асвоеных раёнаў Беларусі. Аб тым часе апавядаюць 12 гарадзішчаў, адкрытых вучонымі-археолагамі. Помнікі сведчаць, што слуцкая зямля — пагранічная зона некалькіх археалагічных культур. Магчыма, большасць пасяленняў заснавана носьбітамі мілаградскай культуры, якіх змянілі плямёны культуры штрыхаванай керамікі. Першым, хто звярнуў увагу на гэта, быў беларускі археолаг А.М.Ляўданскі, які ў 1932 г. на выснове разведак і раскопак правёў размежавальную рысу паміж этнакультурамі. У паўднёвай частцы раёна адчуваецца ўплыў зарубінецкай культуры, аднак прамога пранікнення яе носьбітаў у вярхоўі Случы, відаць, не было.

Адным з найбольш яскравых помнікаў ранняга жалезнага веку на Случчыне з'яўляецца гарадзішча каля в. Івань. Упершыню яго раскопкі правялі ў 1929 г. А.М.Ляўданскі і С.А.Дубінскі. У 1979 г., 1981—1983 гг., 1989—1991 гг. даследаванне гарадзішча праводзілася аўтарам гэтага артыкула. На працягу сямі палявых сезонаў было раскрыта 820 м² пляцоўкі пасялення і зроблена прарэзка вала. Як паказалі раскопкі, большая частка культурнага пласта гарадзішча ўтрымлівае матэрыялы ранняга жалезнага веку. Аднак у верхніх пластах сустракаюцца таксама сярэдневяковыя знаходкі.

У ходзе прарэзкі вала ўдалося прасачыць характар першапачатковага пасялення людзей і ўстанавіць этапы рэканструкцыі абарончых пабудоў. Пасяленне было заснавана носьбітамі мілаградскай культуры і не мела штучных умацаванняў. Праз некаторы час імі быў насыпаны П-падобны вал, вышыня якога была 2 м, шырыня — 8 м. Унутры вала знаходзілася драўляная канструкцыя ў выглядзе неапрацаваных бярвён, укладзеных паралельна адно да аднаго, якія прадухілялі апаўзанне насыпу. Знаходкі элементаў ранняй мілаградскай керамікі дазваляюць аднесці час пабудовы першапачатковага вала да VI—IV ст. да н.э. Найбольш прыметны след у жыцці гарадзішча пакінулі носьбіты культуры штрыхаванай керамікі, якія жылі тут у канцы I ст. да н.э. — I ст. н.э. Удалося ўстанавіць дзве рэканструкцыі абарончых



Гарадзішча каля в. Івань.

Наследие слуцкого края

пабудоў. Мілаградскі вал быў дасыпаны пластом зямлі з уключэннем культурных рэштак з пляцоўкі гарадзішча.

У ходзе раскопак паўсюдна на рознай глыбіні былі зафіксаваны хаатычна раскіданыя камяні, часта са слядамі абпалу. Разам з імі ў асобных месцах выяўлена вялікая колькасць камянёў авальнай і круглай формы. Вядома, што падобныя вымасткі шырока распаўсюджваліся на гарадзішчах штрыхаванай керамікі і днепрадзвінскай культуры.

У культурным пласце знойдзены шматлікія вырабы з гліны, жалеза, бронзы, косці і шкла. Рэчавы матэрыял яскрава адлюстроўвае жыццё і побыт гэтага паселішча. Знаходкі прадстаўлены галоўным чынам рэштками гаршкоў з высокім прамым адагнутым наверх венчыкам і акруглым днішчам. Частка фрагментаў мае арнаментацыю ў выглядзе жамчужных і ямачных уціскання, якія нанесены на шыйцы або венчыку. Іншыя вырабы гэтай культуры — вялікія біканічныя праселкі са старанна загладжанай паверхняй.

Самым багатым на знаходкі аказаўся пласт, звязаны з культурай штрыхаванай керамікі. Тут выяўлены два цэлыя і вялікая колькасць рэштак рабрыстых гаршкоў, жалезныя, жніўныя сярпы, жніўныя нажы, наканечнікі коп'яў, кельты з прамавугольнай утулкай, нажы з прамой і гарбатай спінкай, бронзавыя падвескі, пацеркі, шпількі, фібула, пярсцёнкі, шкляныя пацеркі, гліняныя праселкі, тыглі і іншыя рэчы. У ніжніх адкладах культурнага пласта знойдзены шкляная пазалочаная пацерка II ст. да н.э. — I ст. н.э. і тыпова зарубінецкі кельт, які датуецца па чаплінскіх аналагах сярэдзінай I ст. да н.э. — I ст. н.э. Спалучэнне гэтых знаходак дазваляе аднесці час з'яўлення на гарадзішчы носьбітаў культуры штрыхаванай керамікі не раней сярэдзіны I ст. да н.э. У верхніх пластах знойдзена шкляная бочачкападобная пацерка аранжавага колеру, датаваная I ст. н.э.

Некалькі выпадае з гэтай храналагічнай шкалы жалезная шпора, датаваная III—VIII ст. н.э. Гэта знаходка сведчыць аб тым, што пасля I ст. н.э. гарадзішча магло выкарыстоўвацца ў якасці сховішча. Нельга не адзначыць і таго факта, што ў перыяд, звязаны з носьбітамі культуры штрыхаванай керамікі, адчуваецца вялікі ўплыў з поўдня, з арэала зарубінецкай культуры. Аб гэтым сведчаць знаходкі глянцавых місак, шкляных антычных пацерак, сякер-кельтаў і іншых вырабаў. Асаблівую цікавасць прадстаўляюць некалькі фрагментаў ад глянцавага гаршка, на вонкавай паверхні якога нанесены прадрапаны малюнак у выглядзе жаночых постацей, заштрыхаваных трохвугольнікаў, «сцяжкоў» і г.д. Сюжэт, відаць, быў звязаны з культам урадлівасці.

Знойдзеныя на гарадзішчы наканечнікі стрэл, нажы і шыферныя праселкі, датуемыя XII—XIII ст., дазваляюць меркаваць, што і ў сярэднявеччы гарадзішча магло служыць сховішчам для навакольнага насельніцтва. А пазней тут, магчыма, знаходзілася позняе сярэдневяковае паселішча, аб чым можна меркаваць па шматлікіх рэштках шэраглінянага ганчарнага посуду, канцэнтрацыя якога асабліва вялікая ў паўднёва-заходняй частцы гарадзішча.

Па ўсёй верагоднасці, у пачатку I ст. н.э. спыняецца жыццё і на іншых гарадзішчах Случчыны. Ва ўсякім разе і Слуцкае гарадзішча, і гарадзішча каля в. Леніна (Раманава) не маюць знаходак пазней I ст. н.э. Па якіх прычынах замірае жыццё на ўмацаваных паселішчах, пакуль што невядома. Гэта магло быць выклікана або пераходам насельніцтва на селішчы, або адыходам носьбітаў штрыхаванай керамікі ў больш паўночныя раёны. Аднак ніводная з версій пакуль не знаходзіць пацвярджэння.

А.А.Егарэйчанка.

Наследие слуцкого края

У сутоках Случы і Бычка

«Зямля, што добрая маці, прыняўшы ў нетры свае ўсё, ад яе ж рукою чалавека ўзятае, у немачы захоўвае яго для далёкіх нашчадкаў. І тады заступ археолага раскрые нетры і прымусіць іх расказаць аб мінулым», — пісаў яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. вядомы беларускі археолаг, краязнавец і этнограф А.М.Семянтоўскі.

Гарадзішча старажытнага Слуцка. Найстарадаўнейшая частка сучаснага Слуцка — гарадзішча, знаходзіцца ў цэнтры горада, непадалёку ад скрыжавання вуліц Леніна і Максіма Багдановіча, у сутоках рэк Случы і Бычка. Яно займае пясчаную выспу памерамі 100х80 м, якая ўзвышаецца над поплавам на 5—7 м.

Першыя насельнікі, што аблюбавалі гэтае месца, з'явіліся тут, відаць, яшчэ ў сярэдзіне 1-га тысячагоддзя да н.э. Ад той далёкай пары дайшлі да нас знаходкі: жалезная сякера-кельт, некалькі гліняных праселкаў і чарапкі грубаляпнога посуду. У старажытнарускі перыяд на гэтым месцы славянскім племенем дрыгавічамі быў заснаваны дзядзінец летапіснага Случаска. У часы Вялікага княства Літоўскага тут размяшчаўся Верхні замак Слуцка. У XIX—пач. XX ст. гарадзішча мела назву Саборная горка, бо на той час тут размяшчаўся сабор Аляксандра Неўскага. У 1930—1940-я гады гарадзішча атрымала назву Бязбожная горка, храм, што знаходзіўся тут, быў узарваны і на яго месцы ўзведзены гарадскі Дом культуры. Зараз амаль уся пляцоўка гарадзішча забудавана і пакрыта асфальтам. Гарадзішча носіць назву Вялікая горка. Гэтае месца іншы раз і сёння называюць Верхні замак Слуцка. Яшчэ захоўваецца паданне пра існаваўшы тут некалі падземны ход, па якім, нібыта, можна было на кані дабрацца з Верхняга замка Слуцка да Капыльскага.

За сотні гадоў, у выніку жыцця і дзейнасці чалавека, на слуцкім гарадзішчы ўтварыўся так званы культурны слой. Ён утрымлівае сляды дзейнасці чалавека: трэскі, косці жывёл, чарапкі бітага посуду і іншыя рэчы. Таўшчыня культурнага слоя ад 3 да 4 м. Па афарбоўцы, шчыльнасці, складзе і гістарычным паходжанні ён падзяляецца на некалькі стратыграфічных напластаванняў. Так, першае напластаванне, што ўтварылася ў XI ст., мае таўшчыню 0,2—0,4 м. Яно цёмна-шэрае, амаль чорнае па афарбоўцы, вельмі шчыльнае, зрэдку ўтрымлівае знаходкі таго часу. Другое напластаванне, што ўтварылася ў XII—XIII ст., мае таўшчыню больш за 3 м. Слой гэтага часу па афарбоўцы карычневаты, вільготны, утрымлівае рэшткі старадаўняй забудовы і шмат знаходак. Трэцяе прыпадае на XIV—XVIII ст. Па афарбоўцы яно светла-шэрага колеру, шчыльнае, утрымлівае мноства чарапкоў посуду. Таў-



Рэшткі сядзібнай забудовы XII ст. на дзядзінцы летапіснага Случаска.

Наследие слуцкого края

шчыня пласта 0,5—1 м. Археалагічныя даследаванні пачаліся яшчэ ў даваенны час. Так, у 1929 г. беларускія археолагі А.М.Ляўданскі і С.А.Дубінскі зрабілі тут невялікі раскоп. Яны сабралі чарапкі ляпнога і ганчарнага посуду, металургічныя шлакі. У 1958 г. і ў 1966 г. беларускімі археолагамі Э.М.Загарульскім і П.Ф.Лысенкам выяўлены восем ярусаў старажытнай забудовы, а таксама сабраны рэчы XII—XIII ст., сярод якіх былі прылады працы, зброя, упрыгажэнні, прадметы побыту.

Значныя раскопкі былі праведзены ў 1985—1986 гг. Л.У.Калядзінскім. У выніку гэтых даследаванняў вывучана планіроўка і забудова слуцкага дзядзінца XII—XIII ст., выяўлены тры вулічныя маставыя і каля 40 пабудоў, сабрана вялікая калекцыя прадметаў, якія характарызуюць матэрыяльную культуру і побыт насельніцтва тагачаснага Слуцка.



Рэшткі гарадской забудовы XIII ст. на дзядзінцы летапіснага Случаска.

Дзядзінец летапіснага Случаска. Краінай гарадоў называлі іншаземныя купцы і вандроўнікі ў XI—XIII ст. Русь. Толькі ў адной Беларусі на той час, згодна з пісьмовымі крыніцамі, было 35 гарадоў, сярод якіх пачэснае месца займаў старажытны Слуцк, першае ўпамінанне пра які ў старажытных летапісах адносіцца да 1116 г., калі кіеўскі князь Уладзімір Манамах напаў на менскага князя Глеба Усяславіча, напярэдадні спаліўшы Случаск і, як гаворыць летапісец, не каяўся аб гэтым.

Натуральна, што ў часы феадальнай раздробленасці такія трагічныя падзеі маглі адбывацца часта. І таму, для бяспекі жыхароў, горад павінен быў мець добрыя ўмацаванні. Тая частка горада, дзе былі такія ўмацаванні, называлася «дзядзінец». Тут пражываў князь з дружынай — сваімі «дзецьмі» (адсюль і такая назва), жыла і яго прыслуга.


Што ўяўлялі сабой умацаванні Слуцка ў XII—XIII ст.? Па-першае, уся пляцоўка гарадзішча абнесена магутным валам. Ядро вала было з чырвонай шчыльнай гліны, насып — з пяску. Каб пясок не асыпаўся, паверхня вала была задзернавана. Шырыня вала ў аснове больш як 20 м, вышыня каля 6 м. Па грэбені вала ішоў вастракол з дубовых бярвён. Па-за валам выяўлены роў глыбінёй каля 2 м і шырынёй да 25 м, які злучаўся з рэчкай Бычок, на той час яшчэ паўнаводнай.

Калі мінуць гарадскую браму, што стаяла на вале, і ўвайсці на тэрыторыю дзядзінца, то першае, што кінулася б у вочы — гэта драўляныя вулічныя маставыя, якія перасякалі дзядзінец. Яны насцілаліся з дошак, аполкаў ці бярвён. Іх шырыня была каля 2 м. Звычайна такая маставая служыла 20—30 гадоў. На працягу некалькіх стагоддзяў змянілася некалькі такіх маставых.

Уздоўж вуліц месціліся сядзібы, якія ўключалі жытло і некалькі гаспадарчых пабудоў. Сядзібы размяжоўваліся вастраколамі. Яны існавалі двух тыпаў: слупкі ці плашкі, укапаныя ў грунт, або дубовыя калы, што ўбіваліся ў глебу і складалі аснову плятня.

Зрубы жытлаў рабіліся ў чашку з хваёвых бярвён. Ніжні вянок пабудовы, для большай засцярогі ад вільгаці, рабілі з дубу. Каб у хаце было цяплей, шчыліны паміж бярвёнамі канапацілі мохам.

Наследие слуцкого края




Прылады працы слуцкага каваля XII ст.: 1,5 — цвікарні, 2,6 — зубілы, 3,4 — прабойнікі, 7,8 — цвікарні-зубілы.



Замкі і ключы. XII — XIII ст.



Сякеры. XIII ст.



Малаток-цвікадзёр. XII ст.



Крэсівы: 1 — XI ст., 2—4 — XII—XIII ст.


Наследие слуцкого края



Прадметы ваеннай справы XII—XIII ст.: 1,2 — наканечнікі дроцікаў, 3,4 — наканечнікі стрэл, 5 — скрыжаванне мяча, 6 — псалій, 7 — наканечнік рагаціны, 8 — уток кап'я, 9 — цуглі.



Кісцень. XIII ст.



Бронзавая навершніца булавы. XIII ст.

Шыферныя прасліцы. XII—XIII ст.

У некаторых пабудовах захаваліся дзвярныя праёмы. Гэта прамавугольныя вырубкі ў чвэрць таўшчыні бервяна, шырынёй каля 80 см. Знойдзена і некалькі дзвярэй. Адны з іх мелі памеры 86x59 см.

Усе пабудовы, незалежна ад іх прызначэння, мелі падлогу з дошак, што ўсякаліся на ўзроўні 2—3-га вянка зруба. У жытлах, у адным з аддаленых ад увахода вуглоў, стаяла глінабітная печ. Яе памеры па аснове былі прыкладна 1,5x1,5 м. Печ рабілася на слупавым апечку. Дах пабудоў XII—XIII ст. рабілі з дошак. Плошча слуцкіх жытлаў на той час была 9—20 м². Клеці і хлявы мелі плошчу 4—12 м².

У пласце XII ст. былі выяўлены рэшткі кузні. Гэта зруб памерамі 3,4x3,5 м. У кузні мелася печ-каменка. У пласце, што запаўняў гэтую кузню, знойдзена шмат жалезных вырабаў, сярод якіх ёсць прылады металаапрацоўчай вытворчасці, паўфабрыкаты і адходы кавальскай справы.

У пласце XIII ст. былі ўскрыты рэшткі зруба плошчай 16 м². Тут выяўлена вялікае скапленне металургічных шлакаў, жалезных вырабаў.

Рэчы з раскопак слуцкага дзядзінца з'яўляюцца тыповымі для ўсходнеславянскага горада. Яны прадстаўлены вырабамі з чорнага і каляровага металу, косці і дрэва, шкла і бурштыну, каменю і гліны. Сярод іх ёсць прылады працы і рэчы хатняга ўжытку, дэталі транспартных сродкаў і прадметы ваеннай справы, упрыгажэнні і культавыя рэчы.

Так, вырабы з чорнага металу прадстаўлены прыладамі працы: кавадлам, зубіламі, цвікарнямі, прабойнікамі, далотцамі, малаткам-цвікадзёрам, нажамі сталярнымі і касцярэзнымі, свярдзёлкам, разцом такарнага станка, шыламі, сякерамі і г.д.

Прадметы хатняга ўжытку ўключаюць нажы кухонныя і сталовыя, нажніцы шарнірныя і спружынныя, цыліндрычныя замкі, ключы да іх і да ўнутраных замкоў, крэсівы, шпількі-заколкі, спражкі, вушкі катлоў і вёдраў, абручы ад вёдраў і дужкі да іх, патэльні, чапялу, качаргу і інш. Да ліку рэдкіх знаходак адносіцца брытва XII ст. На Беларусі , акрамя Слуцка, знойдзена брытва толькі на раскопках Бярэсця. Цікавасць маюць і знаходкі дэталяў бязмена: абойміца, колцы і гіра вагой шэсць фунтаў.

Даволі разнастайная калекцыя прадметаў узбраення. Гэта наканечнікі рагаціны,

Наследие слуцкого края

дзіды, суліц, стрэлаў. Знойдзены таксама ўток ад кап'я, скрыжаванне мяча, гіра кісценя, бронзавае наверша булавы, кольцы кальчугі, стрэмя ад сядла, шпоры некалькіх тыпаў, падковы, цуглі.

Вырабы з дрэва ўключаюць прылады працы. Гэта дубовыя рыдлёўкі, лапаты для веяння зерня, пранікі, даўбежкі, шавецкая калодка. Драўляны посуд прадстаўлены бандарнымі вырабамі (клёпкі і донцы бочак, вёдраў, бойкі, біклагі, лыжкі, конаўкі) і посудам, зробленым на такарным станку: міскі, талеркі, кубачкі. Знойдзены і скураныя мячы, чаравікі, боты, дыскі ручных жорнаў.

Касцяныя вырабы ўключаюць накладкі на лук і калчан для стрэлаў, гузікі, рукаяткі нажоў, муфты, праколкі. Кераміка прадстаўлена гаршкамі і міскамі. Гаршкі арнаментаваны хвалістым ці лінейным арнаментам. Іх аб'ём 1,5—2,5 л.

Незвычайна мала для Слуцка знойдзена вырабаў з каляровага металу, хаця рэшткі мясцовай вытворчасці ювеліра на слуцкім дзядзінцы знойдзены. Гэта каменная ліцейная формачка для вырабу пацерак. Менавіта такія ўпрыгажэнні былі ўласцівы дрыгавіцкім жанчынам. Сярод нешматлікіх прадметаў з каляровага металу ёсць бранзалеты і пярсцёнкі з бронзавага дроту. Мяркуючы па прастаце іх вырабу, яны маглі быць мясцовага паходжання. Але сустрэты і прывазныя рэчы. Гэта бронзавая падвеска балцкага тыпу, якая паходзіць з зямлі латгалаў, і другая сярэбраная, якая ўласцівa ўжо фіна-угорскім народам. Трапіць у Слуцк яны маглі хутчэй за ўсё гандлёвым шляхам. Такім жа шляхам трапілі ў Слуцк у XII—XIII ст. з Кіева шкляныя бранзалеты, каралі, пярсцёнкі, шкляны посуд. З паўднёвых зямель Русі ў Слуцк трапілі крыжыкі з чырвонага каменю-парфіру. Яны выраблялiся ў Корсуні (Херсанесе), адсюль і іх назва «крыжыкі-карсуньчыкі». Адтуль жа, відаць, прывозіліся ў Слуцк і амфары, у якіх было віно ці аліўкавы алей. З Каўказа паступалі самшытавыя грабяні. З Прыбалтыкі прывозіліся бурштын і вырабы з яго. Знойдзены бурштынавыя пацерка і падвеска.

Насельніцтва Случаска ў XII—XIII ст. займалася металаапрацоўкай, гарбарнашавецкім, касцярэзным, дрэваапрацоўчым, ганчарным, ювелірным, каменячосным рамёствамі.



«Кароль». Шахматная фігурка з косці. XII ст.



«Слон». Шахматная фігурка з косці. XIII ст.

Аб занятку земляробствам сведчаць знаходкі сашніка, сярпоў і гарэлага збожжа (ячмень, каноплі), жорнаў. Відаць, у ваколіцах дзядзінца раслі пладовыя дрэвы, бо ў культурным слоі XII—XIII ст. нярэдка трапляюцца костачкі вішань і сліў.

Шматлікія знаходкі касцей свойскіх жывёл сведчаць пра занятак насельніцтва і жывёлагадоўляй. Тут гадавалі кароў, свіней, авечак, коз, коней.

Аб занятку хатнімі промысламі сведчаць знаходкі трапашак, верацёнаў, прасліц.

Жыхары слуцкага дзядзінца мелі гандлёвыя сувязі як з суседзямі, так і з далёкімі землямі.

Параўнальна багатай была духоўная культура. Знойдзены чатыры шахматныя фігуры: пешкі, ладдзі, слана і караля. Пешка і ладдзя выразаны з дрэва, а слон і кароль — касцяныя. Апошні ўяўляе сабой выяву чалавека шляхетнага выгляду ў дарагім галаўным уборы, які сядзіць на троне. Вышыня фігуркі 6,8 см. Знаходка датуецца пачаткам XII ст. Бліжэйшы аналаг ёй вядомы ў Нарвегіі. На тэрыторыі Усходняй Еўропы гэта пакуль што першая знаходка такога роду.

Аб распаўсюджванні пісьменнасці сярод жыхароў слуцкага дзядзінца сведчаць знаходкі, якімі пісалі на навошчаных дошчачках. Знойдзена днішча бочачкі з выразанай літарай «И».

На дзядзінцы старажытнага Слуцка меўся каменны храм, узведзены, відаць, у сярэдзіне XII ст. Матэрыялам служылі тонкая цэгла і вапняковыя пліты. Змешаная муроўка збліжае яго з храмамі Св.

Наследие слуцкого края



Паліхромная кафля з выявай герба Слуцка. XVII ст.



Курыцельныя люлькі ў выглядзе чаравічкаў. XVII ст.

Міхаіла і Дабравешчання з Віцебска і Барысаглебскай царквой з Навагрудка.

Верхні замак Слуцка. Беларусь у XIV — XVII ст. называлі краінай замкаў. Яны ўзводзіліся амаль праз кожныя 30—40 км. Верхні замак Слуцка ўпершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах у 1409 г. Ён узнік на месцы дзядзінца летапіснага Случаска, меў круглую форму і займаў плошчу 1,5 га. Да Верхняга замка быў перакінуты пад'ёмны мост, за якім размяшчалася замкавая брама. Яна была даволі высокая, мела чатыры ярусы бою, на якіх размяшчаліся гарматы. Над брамай знаходзілася вежа з гадзіннікам. Вежу вянчаў медны шар з выявай арла, пакрыты пазалотай. На тэрыторыі самога замка стаяў палац, узведзены з часаных дубовых брусоў. Плящоўка была абнесена драўлянай сцяной з вежамі, якія ўзвышаліся не толькі над горадам, але і над усёй ваколіцай, што дазваляла паспяхова адбіваць атакі праціўніка.

Культурны слой Верхняга замка мае таўшчыню каля метра і датуецца XIV—XVII ст. У час раскопак тут было знойдзена каля двух дзесяткаў каменных ядраў. Яны акуратна вычасаны з шэрага граніту, адшліфаваныя, гладкія. Іх дыяметр 8,5—13,5 см, вага 1,5—3,5 кг. Керамічныя вырабы гэтага часу прадстаўлены знаходкамі кухоннага посуду, для пітва выкарыстоўваліся кубкі, куфлі, чаркі. Для транспарціроўкі вады ці віна ўжываліся біклагі. Яны былі круглыя, дыяметрам 18—22 см, мелі вузенькае горла і па баках вушкі, праз якія чаплялася вяроўка.

Быў ва ўжытку ў XVI—XVII ст. і шкляны посуд. Гэта кварты, шкляніцы, чаркі. Знойдзена керамічная пячная кафля з геральдычнымі сюжэтамі. На адной з іх маецца выява аднагаловага арла, на грудзях якога змешчаны трохкутны шчыт з відарысам на ім трох паляўнічых ражкоў. Гэта ўласны герб князёў Радзівілаў. Да ліку унікальных знаходак адносіцца кафля з выявай крылатага каня — Пегаса. Гэты сюжэт быў уласцівы выключна для слуцкай кафлі і больш нідзе на Беларусі і за яе межамі невядомы. Магчыма, што выява Пегаса ўжывалася некаторы час як гарадскі герб Слуцка. Кафля з такой выявай мела памеры пласціны 19,5х19,5 см. Тут жа выява трох сумешчаных лацінскіх літар — BRD, што расшыфроўваецца як «Багуслаў Радзівіл дукс» (з лацінскай мовы — князь). Кафля з такім сюжэтам, але паліхромная маецца ў Слуцкім краязнаўчым музеі.

Знойдзены таксама з керамікі: курыльныя люлькі, скарбонкі, свістулькі. Курыльныя люлькі сустрэты як звычайнай формы, так і ў выглядзе жаночага чаравічка. Скарбонкі выраблялі ў выглядзе цыбуліны. Іх аб'ём быў 35—40 см³. З боку мелася шчыліна, праз якую апускаліся дробныя грошы — соліды. Цацкі-свістулькі выраблялі ў выглядзе жывёл і птушак і амаль не адрозніваюцца ад традыцыйных вырабаў сучасных майстроў народных промыслаў.

Вакольны горад і Ніжні замак Слуцка. Вакольны горад летапіснага Случас-

Наследие слуцкого края

ка размяшчаўся на паўночны ўсход ад дзядзінца і аддзяляўся абарончым ровам з вадой. Яго памеры былі 40—80х150 м. Культурны слой тут вельмі пашкоджаны сучаснай забудовай. У час земляных работ трапляліся шкляныя бранзалеты і шыферныя праселкі. У XIV—XVII ст. на месцы вакольнага горада ўзнік Ніжні замак Слуцка. Паводле пісьмовых крыніц, тут размяшчаліся тры палацы, узведзеныя з часанага бруса, і іншыя пабудовы. Абодва замкі абмываліся водамі Случы і Бычка.

Пасад Слуцка — помнік археалогіі канца XVI—XVIII ст., які размяшчаўся на паўднёвы захад ад дзядзінца — Верхняга замка на правым беразе р. Бычок. Культурны слой на пасадзе ў прыбярэжнай палосе рэчкі дасягае тоўшчы да 3—4 м. Слой добра захоўвае рэчы арганічнага паходжання. У час раскопак, што праводзіліся тут у 1985 г. , былі выяўлены рэшткі гарадской забудовы: участак вулічнай маставой, вастраколы, пабудовы XVII ст., сабрана шмат фрагментаў глінянага і шкляного посуду XVII—XVIII ст., кафлі. Знойдзены быў таксама скураны абутак, вырабы з косці (тронкі нажоў, грабяні) і жалеза (нажы, цвікі). Далей ад прыбярэжнай часткі культурны слой памяншаецца да 0,6—0,2 м. У XVIII ст. гэтая частка горада была абнесена ўмацаваннямі і ўвайшла ў склад Старога месца Слуцка.

Абарончая лінія Старога месца Слуцка нагадвала земляны вал, які дугой ахопліваў старую частку горада з усходу, поўначы і захаду і ўпіраўся сваімі канцамі ў Случ. Тут мелася 12 бастыёнаў рознай канфігурацыі і памераў. Перад земляным насыпам знаходзіўся вадзяны роў. Трапіць у Слуцк можна было праз тры брамы, вымураваныя ў вале. Гэта брамы Астроўская, Ільінская (пазней Віленская) і Капыльская. Інвентар Слуцка за 1728 г. дазваляе высветліць памеры слуцкіх умацаванняў таго часу. Шырыня вала ў аснове была 26,6 м, вышыня каля 8 м. Брамы Капыльская і Ільінская мелі памеры ў аснове 25,6х36,6 м, Астроўская — удвая меншыя. Перад брамамі цераз роў былі перакінуты пад'ёмныя масты, перад якімі знаходзіліся яшчэ дадатковыя перадмаставыя ўмацаванні.

Другая частка Слуцка, так званае Новае месца, размяшчалася на левым беразе р. Случ. Цэнтрам абароны Новага месца быў Новы замак, узведзены ў канцы XVI ст. Ён меў форму квадрата з адным равелінам і чатырма бастыёнамі. На вуглах бастыёнаў узвышаліся вежы. Новы замак быў абкружаны вадзяным ровам, што злучаўся з рэчкай цераз спецыяльна схаваны шлюз. Увогуле ж, усё Новае месца Слуцка ўмацоўвалася таксама валам з сямю бастыёнамі і адной брамай — Навамейскай. Агульная ж даўжыня ўсіх гарадскіх умацаванняў Слуцка ў XVIII ст. дасягала каля 4 км. На працягу XVIII ст. Слуцк заставаўся адным з наймагутнейшых умацаванняў Рэчы Паспалітай.

Л.У.Калядзінскі.

Каля вытокаў дзяржаўнасці

У VIII—IX ст. на тэрыторыі сённяшняй Беларусі знаходзілася некалькі славянскіх этнічных аб'яднанняў. Гэта — крывічы, дрыгавічы, радзімічы, палачане. Яны ўяўлялі сабой, у пэўным сэнсе, пачатковыя дзяржаўныя ўтварэнні.

Тэрыторыя сённяшняй Случчыны была заселена дрыгавіцкімі плямёнамі. Вось што гаворыцца аб гэтых людзях у кнізе М.Гайдука «Паратунак» (Мн., 1993): «Як заўважаюць вучоныя (археолагі, мовазнаўцы, гісторыкі і інш.), дрыгавічы ў найбольшай ступені захавалі ў сабе праславянскасць, найменш паддаліся ўплывам іншых народаў і самі не імкнуліся займаць чужыя тэрыторыі. Толькі на поўначы, на рацэ Бярэзіне і верхнім цячэнні Нёмана, яны паступова асімілявалі або выцеснілі на паўночны захад рэдкае там балцкае насельніцтва. Невялікая частка надпрыпяцкіх ды надбужанскіх дрыгавічоў пад час гэтай вандроўкі апынулася ў ваколіцах Салуні (сённяшніх Салонікаў у Грэцыі).

У тыя часы, калі ў «Аповесці мінулых гадоў» летапісец запісаў, што яны «седоша межи Припетью и Двиною и нарекошеся дреговичи», а візантыйскі імператар Канстанцін Багранародны ў сваёй працы «Аб кіраванні імперыяй» (949) занатаваў іх пад назвай «другувітаў», дрыгавічы ўжо

Наследие слуцкого края

былі з'яднаным, шматлюдным, моцным племем. На поўначы яны межавалі з крывічамі і перамяшчаліся з імі па лініі, якую сёння вызначаюць беларускія гарады: Гродна — Наваградак — Менск — Барысаў. Па Дняпры суседзямі дрыгавічоў былі радзімічы. На поўдні да сённяшняга ўкраінскага Чарнігава праз Чарнобыль, Оўруч, Дубровіцу і ўверх па рацэ Гарынь аж да мястэчка Дзеражнога праходзіла мяжа паміж дрыгавічамі і драўлянамі. Ад мястэчка Берасцяное паўз паўночную ўскраіну Ковеля і непадалёку ад вытокаў Прыпяці аж да Уладавы на рацэ Буг, затым (ужо ў Польшчы) ад Уладавы да Радзыня-Падляшскага дрыгавіцкае насельніцтва межавала з валынянамі.

Інтэнсіўнае развіццё гаспадаркі і грамадскага жыцця, пастаянная пагроза знешніх нападаў і, урэшце, уздзеянне суседніх і далёкіх народаў рана прывялі да ўзнікнення зародкаў дзяржаўнасці — племяннога саюза дрыгавічоў. Няма сумнення, што ўзначальваў яго свой уласны дрыгавіцкі княжацкі род і палітычнае жыццё засяроджвалася ў нейкім гарадскім цэнтры. На жаль, звесткі пра першае дрыгавіцкае княства і яго сталіцу не захаваліся. Аднак увесь ход пазнейшых падзей паказвае, што ў дрыгавічоў склалася моцнае самастойнае княства з добра развітай сельскай гаспадаркай, рамяством, унутраным і замежным гандлёвым абменам, моцнай абаронай. Доказаў таго ёсць мноства, найважнейшы з іх — гэта тое, што тэрыторыя дрыгавічоў не была захоплена іншымі плямёнамі, а яе насельнікі не былі зняволены ці выцеснены са сваёй зямлі, як гэта здарылася з іншымі слабейшымі ўнутранай еднасцю плямёнамі. Таксама і ў «Аповесці мінулых гадоў» гаворыцца, што свае княжанні мелі іншыя ўсходнеславянскія плямёны, «а дрыгавічы сваё». І калі шмат пазней у той жа летапіс быў унесены пад 980 годам запіс: «а Тур трымаў уладу ў Тураве, і ад яго празваліся тураўцы», дык ён толькі пацвердзіў існаванне ў дрыгавічоў самастойнага княства, пануючага ў ім княжацкага роду і сталіцы.

Уласную дынастыю дрыгавічы захавалі да 988 г., калі княскі пасад у Тураве вялікі князь кіеўскі Уладзімір аддаў свайму сыну Святаполку. Такім чынам кіеўскі князь намагаўся падпарадкаваць Тураўскае княства цэнтральнай уладзе старажытнарускай дзяржавы, аднак яго старанні закончыліся няўдачай.

Дрыгавіцкая зямля была густа заселена, мела развітую гаспадарку, значную колькасць гарадоў, якія тут паўсталі ў глыбокай старажытнасці і затым пераўтварыліся ў асяродкі гаспадарчага, палітычнага і культурнага жыцця: Бярэсце (сённяшні Брэст), Дарагічын (Драгічын на Бузе), Пінеск (Пінск), Чартарыеск (Чартарыск), Случаск (Слуцк), Клечанск (Клецк), Брагін, Новагарадок (Навагрудак), Валкавыеск (Ваўкавыск), Бельск і інш.

Апошні раз у летапісах племя дрыгавічоў згадваецца пад 1149 г. Але дрыгавіцкая традыцыя, яе выразныя сляды захаваліся да сённяшняга дня ў заходнім рэгіёне».

На месцах рассялення дрыгавічоў (на Прыпяці, Бярэзіне, правабярэжжы Дняпра, у вярхоўях Случы, Арэсы) захаваліся археалагічныя помнікі — гарадзішчы, селішчы, курганныя могільнікі з пахавальным абрадам трупаспалення. Пахавальны інвентар дрыгавічоў не дужа багаты — гліняныя гаршкі, спражкі, крэсіва, сякеры, наканечнікі коп'яў і інш. У жаночых пахаваннях сустракаюцца бронзавыя скроневыя кольцы з заходзячымі канцамі, пярсцёнкі, бранзалеты і інш. Зрэдку ў курганах трапляюцца збудаванні ў выглядзе невысокага драўлянага зруба з дахам. Характэрная племянная адзнака дрыгавічоў — вялікія медныя або сярэбраныя пацеркі, аздобленыя напаянымі на іх паверхню дробнымі па памерах сярэбранымі шарыкамі — зерню. Другая этнічная асаблівасць — скроневыя кольцы — завушніцы з круглага дроту, на якіх замацаваны па тры металічныя пацеркі невялікіх памераў.

Усходнеславянскія плямёны, пра якія ідзе гаворка ў «Аповесці мінулых гадоў», былі, уласна кажучы, не «плямёнамі», а саюзамі сваяцкіх плямёнаў — племяннымі саюзамі. Яны як дзяржаўныя ўтварэнні ўзніклі на базе развіцця прадукцыйных сіл з уласцівымі ім своеасаблівымі этнаграфічнымі прыметамі, асобым моўным дыялектам.

Слуцкая зямля можа ганарыцца сваім мінулым, асобае месца ў якім займае ўтварэнне і існаванне Слуцкага княства. Яно ўзнікла ў складзе Турава-Пінскага княства як удзельнае. Адносіцца гэта падзея да 1160 г.

Наследие слуцкого края

З летапісных крыніц вядома, што да таго часу Слуцкам валодалі кіеўскія, а потым чарнігаўскія князі. Пасля 1160 г. у Слуцку княжылі нашчадкі тураўскага князя Юрыя Яраславіча. Гэта слуцкая дынастыя Рурыкавічаў правіла амаль 200 гадоў. У 1387 г. у грамаце ўпамінаецца слуцкі князь Юрый, апошні з гэтай дынастыі.

Вобраз Слуцкага княства таго часу перадаюць звесткі аб Турава-Пінскім княстве. Узнікненне на дрыгавіцкай зямлі Тураўскага княства адносіцца да канца X ст. Яго найбольш буйныя гарады Пінск, Слуцк, Капыль, Клецк, Давыд-Гарадок, Дубровіца і інш. Ёсць звесткі, што ў Тураве дзейнічала веча, існавала пасада тысяцкага, які ўзначальваў гарадскі полк (апалчэнне). Галоўная ўлада Турава-Пінскага княства належала князю. Да 988 г. адносіцца летапіснае ўпамінанне аб пачатку княжання ў Тураве Святаполка Уладзіміравіча, сына вялікага кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. Тураўскія князі паводле права атрымання спадчыны, якое дзейнічала тады, траплялі на велікакняжацкі трон у Кіеве.

Тураўская зямля знаходзілася на поўдзень ад Полацкага княства па цячэнні Прыпяці. Прыпяць звязвала Тураў з Кіевам, а яе прытокі адкрывалі шлях з Турава ў межы Полацкай зямлі, на Валынь, у Польшчу. Княства называлі яшчэ Турава-Пінскім, улічваючы, што другім горадам пасля Турава быў Пінск. Але ўсё ж у палітычным і духоўным жыцці цэнтральнае месца адводзілася Тураву. Амаль усе гарады Турава-Пінскага княства былі на рэках: Тураў на Прыпяці, Пінск на Піне, Клецк на Лані, Слуцк на Случы.

Тураўскае княства на працягу першых ста гадоў пасля смерці Яраслава Мудрага (1054) каля сарака гадоў існавала самастойна, 60 гадоў было ў падпарадкаванні Кіева, а ў канцы 50-х гадоў XII ст. канчаткова вылучылася, і ў ім зацвердзілася пастаянная дынастыя князёў.

Але, выйшаўшы з-пад улады кіеўскіх князёў, Турава-Пінскае княства распадаецца на асобныя княствы і ўдзелы. Гэты працэс пачаўся яшчэ ў першай палавіне XII ст. Так, напрыклад, у 1128 г. у летапісах упамінаецца аб Клецкім удзеле. У другой палавіне XII ст. вылучаецца Дубровенскае, незалежным становіцца Пінскае і ў канцы таго ж стагоддзя канчаткова адасабляецца Слуцкае княства. Раздробленая і аслабленая міжусобіцамі Турава-Пінская зямля ў XIII ст. трапляе ў сферу ўплыву то галіцка-валынскіх, то літоўскіх князёў. У залежнасць ад гэтых князёў трапіла тады і Слуцкая зямля.

Падрыхтаваў Я.І.Бараноўскі.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

XIII ст. азнаменавалася ўтварэннем на тэрыторыі Беларусі Вялікага княства Літоўскага. Адбылося гэта пад уплывам, у першую чаргу, знешніх фактараў: агрэсіі з боку крыжакоў, татара-мангольскіх захопнікаў. У якасці цэнтра фарміравання новай дзяржавы выступіла Наваградская зямля разам з суседняй Літвой. Нездарма першы князь гэтага дзяржаўнага ўтварэння Міндоўг зрабіў Наваградак сталіцай сваёй краіны.

Уваход Слуцкага княства ў склад Вялікага княства Літоўскага адносіцца да XIV ст. У 1395 г. вялікі князь літоўскі Вітаўт адабраў багатае Кіеўскае княства ў Уладзіміра Альгердавіча, брата польскага караля Ягайлы, і ўзамен перадаў гэтаму князю ў спадчыннае ўладанне Слуцкае княства. Так Слуцкае княства стала ўдзельным уладаннем літоўскай велікакняжацкай дынастыі Гедзімінавічаў. Нашчадкі Уладзіміра Альгердавіча — князі Алелькавічы — валодалі княствам да 1612 г.

У грамаце вялікага князя літоўскага Аляксандра (1499) пералічаны найбольш буйныя населеныя пункты княства — г. Слуцк, двары Івань, Пагост, Амговічы, г. Капыль, двары Баслаўцы, Сыравадчыцы, Старыца, Цімкавічы, Скеб'ева, Старое Сяло. У XVI ст. да Слуцкага княства адносіліся таксама

Наследие слуцкого края

Урэчча, Любань, частка Палесся з Петрыкавічамі, або Петрыкавам, Пясочнае, Раманаў, Дарогі (Старыя Дарогі), Ленін (на Случы), Бялевічы, Семежава, Язы, Бранавічы, Лучнікі, Баркавічы, Бязверхавічы, Селішча і інш. Уладанні княства ахоплівалі тэрыторыі сучасных Слуцкага, Капыльскага, Салігорскага, Любанскага, Старадарожскага і частак Уздзенскага, Глускага, Петрыкавіцкага і Жыткавіцкага раёнаў.

Слуцкія князі Алелькавічы падтрымлівалі цесныя сувязі з суседнімі і іншымі княствамі Русі, асабліва маскоўскімі. Але сувязі гэтыя былі не дынастычныя, а палітычныя. Вакол Алелькавічаў, якія кожны раз падкрэслівалі сваё паходжанне ад вялікіх князёў літоўскіх Гедзіміна і Альгерда, групаваліся незадаволеныя вялікімі князямі літоўскімі мясцовыя феадалы.

Слуцк — трэці горад Беларусі, пасля Брэста і Гродна, які набыў у 1441 г. магдэбургскае права. Магдэбургскае права адпавядала старажытным традыцыям самакіравання, якія існавалі, напрыклад, у Полацку, Віцебску і іншых беларускіх гарадах. Адбывалася як бы спалучэнне старажытных традыцый самакіравання з нормамі магдэбургскага права, згодна з якімі замест шматлікіх натуральных павіннасцей гараджане плацілі адзіны грашовы падатак. Яны вызваляліся ад суда і ўлады велікакняжацкіх (каралеўскіх) чыноўнікаў. Гэта ў значнай меры засцерагала ад самавольства маёмасць і эканамічную дзейнасць гараджан.



Старадаўні герб Слуцкага княства і Слуцка «Пагоня».

Справамі горада — рамяством, гандлем — кіравалі самі жыхары, на якіх распаўсюджвалася дзейнасць гарадскога права. Але яны па-ранейшаму падпарадкоўваліся князю і яго адміністрацыі, выконвалі павіннасці на карысць князя. Выбарным органам самакіравання была рада ці магістрат, які збіраў падаткі, выконваў судовыя функцыі, кіраваў грамадскімі работамі, наглядаў за гандлем, прымаў у гарадскую абшчыну новых мяшчан і г.д. Членамі рады маглі быць толькі законнанароджаныя заможныя мяшчане, якія пастаянна пражывалі ў горадзе. Не выбіраліся ў раду іншаземцы, нехрысціяне, ліхвяры, беднякі, калекі. Здаралася, што побач з ратушай (памяшканне, дзе праводзіліся пасяджэнні рады) стыхійна адбываўся і агульны сход гараджан, які нагадваў ранейшае веча. Устанаўленне самакіравання, нягледзячы на яго абмежаванні, паляпшала ўмовы рамеснай і гандлёвай дзейнасці, аслабляла феадальную залежнасць гараджан, якія былі асабіста свабодныя. У Слуцкім княстве на чале адміністрацыі стаяў намеснік слуцкі, а ў горадзе — войт, якога назначаў князь з ліку гараджан.

Да Люблінскай уніі (1569), якая азнаменавала ўтварэнне новай дзяржавы — Рэчы Паспалітай, Слуцкае княства не раз было цэнтрам розных палітычных падзей, тут не раз праходзілі войны, жыхары Случчыны

Наследие слуцкого края

ўцягваліся ў канфлікты паміж феадаламі.

Вядома, што слуцкі князь Алелька Уладзіміравіч разам са Слуцкім палком удзельнічаў у бітве народаў з крыжакамі пад Грунвальдам у 1410 г. Слуцкае апалчэнне было пад сцягам з гербам князёў Алелькавічаў як членаў дынастыі Гедзіміна і Альгерда. У канцы XV — пач. XVI ст. Слуцкае княства ўдзельнічала ў барацьбе мясцовых феадалаў супраць вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча. У 1433 г. гэта паўстанне ахапіла цэнтр Беларусі і Палессе. Гараджане Слуцка падтрымлівалі выступленне за незалежнасць Вялікага княства Літоўскага ад Польшчы. Жыгімонту прыйшлося ў 1434 г. выдаць грамату аб ураўнаванні правоў усіх федалаў, у тым ліку і беларускіх.

Пасля смерці Алелькі (1454) вялікі князь літоўскі Казімір Ягелончык перадаў у пажыццёвае ўладанне Сямёну Алелькавічу Кіеўскае княства (1454—1470), а Міхаіл Алелькавіч атрымаў Слуцкае і княжыў на працягу 1454—1481 гг. У сувязі з тым, што Слуцкае княства суседнічала з Кіеўскім, Чарнігаўскім, Маскоўскім, многія слуцкія князі мелі сваяцкія адносіны з маскоўскімі, кіеўскімі, чарнігаўскімі князямі. Нават маскоўскі вялікі князь Іван III быў дваюрадным братам аднаго са слуцкіх князёў па лініі маці. Па некаторых звестках ім быў слуцкі князь Міхаіл Алелькавіч. Міхаіл Алелькавіч і Іван Гальшанскі, блізкі сваяк Міхаіла Алелькавіча, за спробу змясціць з прастола вялікага князя літоўскага Казіміра Ягелончыка пры дапамозе здрадніка былі схоплены ў красавіку і пакараны смерцю ў жніўні 1481 г. на адной з плошчаў Вільні.

Насельніцтва Слуцкага княства падзялялася ў асноўным на дзве галоўныя групы: сялян і «мяшчан» — жыхароў гарадоў Слуцка, Капыля і сямі мястэчак, якія існавалі ў 1566—1582 гг.: Дарогі, Любань, Петрыкаў, Пясочнае, Ленін, Семежава і Тонва (цяпер Тонава). Мяшчане — жыхары гарадоў — займаліся галоўным чынам рамяством і гандлем.

У пачатку XVI ст. удзельныя княствы былі паступова ліквідаваны, але Слуцкае як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка захавалася да 1791 г. У 1507 г. яно ўвайшло ў склад Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства. Яно захавала пэўныя рысы феадальнага ўдзела са сваёй сістэмай кіравання, замкавым судом, апалчэннем з дробных феадалаў (шляхты) і ваеннаслужылых людзей — зямян, выбранцаў, татар і баяр, якія атрымлівалі за сваю ваенную службу зямельныя надзелы ў спадчыннае ўладанне.

У складзе Рэчы Паспалітай Слуцкае княства адстойвала правы сваіх гараджан на выкарыстанне беларускай мовы як дзяржаўнай, вяло барацьбу супраць паланізацыі, падтрымлівала праваслаўную царкву. Барацьба ў той час за «старыну», за незалежнасць Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага азначала змаганне за захаванне дзяржаўнасці беларускай мовы. Пры падтрымцы прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя шырокае распаўсюджванне ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім ў канцы XVI — пач. XVII ст. атрымала дзейнасць брацтваў — нацыянальна-рэлігійных арганізацый праваслаўнага насельніцтва, што ўзніклі ў адказ на польска-каталіцкую палітыку ўрада Рэчы Паспалітай. Буйныя беларускія брацтвы існавалі ў той час у Вільні, Магілёве, Берасці, Слуцку, Менску, Пінску, Барысаве, Оршы, Полацку, Мсціславе і іншых гарадах. Яны сталі сапраўднымі інтэгратарамі беларускага тагачаснага грамадства на базе нацыянальнай ідэі. Пачатковыя сярэднія брацкія школы былі адкрыты ў Вільні, Берасці, Пінску, Слуцку, Менску, Магілёве і многіх іншых гарадах і мястэчках. Брацкія друкарні надрукавалі 127 выданняў, сярод якіх буквары, палемічна-публіцыстычныя творы.

Наследие слуцкого края

Большасць з гэтых кніг напісана на царкоўна-славянскай і беларускай мовах.

Насельніцтва Слуцка, як і многіх іншых гарадоў Беларусі (Магілёў, Віцебск), не прызнала Брэсцкую царкоўную унію (1596). У Слуцку, Капылі і іншых гарадах яна так і не была праведзена. Князі Радзівілы, да якіх у XVII ст. перайшоў горад, самі былі не католікамі, а кальвіністамі. Яны шмат зрабілі для ператварэння Слуцка ў моцную крэпасць. Гэта адбылося ў 30—50-я гады XVII ст. Уся тэрыторыя старога і новага горада была абкружана абарончымі збудаваннямі — земляным валам, ровам з вадой і бастыёнамі. Крэпасць мела сваю артылерыю, а гарнізон дастатковую колькасць агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў.

Насельніцтва Слуцкага княства прымала ўдзел і ў барацьбе супраць феадалаў Рэчы Паспалітай. У 1654 г. пасля Пераяслаўскай рады, на якой было прынята рашэнне аб уз'яднанні Украіны з Расіяй, пачалася вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Рускія войскі перайшлі мяжу і ўступілі на тэрыторыю Украіны і Беларусі. Вясной 1655 г. адна з рускіх армій пад камандаваннем князя А.Н.Трубяцкога наступала ў напрамку Быхаў—Слуцк—Слонім. 2 верасня 1655 г. пачалася аблога Слуцка войскамі Трубяцкога, але 6 верасня яны адышлі на поўдзень у лясы, а затым павярнулі на Нясвіж. Слуцк не быў разбураны ў ходзе ваенных дзеянняў у час вайны 1656—1657 гг., як гэта здаралася з іншымі беларускімі гарадамі.

У перыяд Паўночнай вайны 1700—1721 гг. жыхары горада падвергліся новым выпрабаванням. Адбылося сутыкненне паміж імі і драгунамі літоўскага войска. У горадзе пабываў цар Пётр I. Па яго загадзе зімой 1705—1706 гг. у раёне Слуцка стаялі ўкраінскія казакі Міргарадска-Пераяслаўскага палка. А 11 мая 1706 г., пасля адыходу казакоў, Карл XII без супраціўлення заняў Слуцк. У час Паўночнай вайны насельніцтва Слуцка панесла значныя матэрыяльныя страты.

Слуцк у 1-й палавіне XVIII ст. заставаўся буйным горадам і эканамічным цэнтрам Беларусі. У 1728 г. тут налічвалася 1177 жылых дамоў і 1470 сямей. Пражывала 7,5—8 тыс. чалавек. У горадзе развіваліся рамёствы, гандаль. Усяго ў Слуцку налічваліся 874 рамеснікі 102 прафесій, найбольш значнымі былі гарбары — 39, шаўцы — 112, прадзільшчыцы — 76, пекары — 40, краўцы — 38, кавалі — 36. Рамеснікі



Уезд у Слуцк з паўднёвага боку.

Наследие слуцкого края

былі аб'яднаны ў цэхі для лепшай арганізацыі вытворчасці і збыту тавараў. У 1777 г. у Слуцку было 18 цэхаў, а ў 30—40-я гады XVIII ст. у асобных майстэрнях з'явіліся першыя ў Беларусі мануфактуры.

У гістарычных падзеях 1776—1777 гг. Слуцку належыць значная роля. Якраз у той час Кацярына II і яе верны саюзнік прускі кароль Фрыдрых II прапанавалі польскаму каралю Станіславу Аўгусту Панятоўскаму праект ураўнавання правоў некаталіцкай шляхты з каталіцкай. Для падтрымкі гэтага праекта Кацярына II увяла на тэрыторыю Рэчы Паспалітай свае войскі. У Слуцку сабраліся 266 канфедэратаў на чале з праваслаўным епіскапам з Магілёва Георгіем Канісскім і лідэрам кальвіністаў у Літве і Беларусі генерал-лейтэнантам Тамашам Грабоўскім. У сваім акце канфедэраты патрабавалі ўраўнавання сваіх правоў з правамі каталіцкай шляхты. Яны звярнуліся з просьбай аб дапамозе і заступніцтве да Кацярыны II. Пад націскам Кацярыны II сейм Рэчы Паспалітай прыняў пастанову аб ураўнаванні правоў праваслаўных і пратэстантаў з католікамі. У 1785 г. Слуцк стаў рэлігійным цэнтрам праваслаўнай царквы ў Беларусі, Правабярэжнай Украіне, Літве і Польшчы.

У лістападзе 1791 г. Слуцкае княства — адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, якая праіснавала некалькі стагоддзяў, — пастановай сейма была ліквідавана ў сувязі з агульнымі рэформамі дзяржаўнага ладу ў Рэчы Паспалітай. Слуцк стаў цэнтрам Случарэцкага павета Навагрудскага ваяводства. Большая частка тэрыторыі павета, гарады Слуцк і Капыль заставаліся ва ўладанні Дамініка Радзівіла. Павет падзяліўся на сем парафій: Слуцкую, Капыльскую, Цімкавіцкую, Клецкую, Ляхавіцкую, Глускую і Мядзведзіцкую. Адпаведна на сейм выбіраліся два паслы-дэпутаты. У лютым 1792 г. у Слуцку адзін раз сабраўся павятовы сеймік з 219 дэпутатаў, які выбраў уладу павета і суддзяў павятовага суда. З студзеня 1793 г. Слуцк і яго павятовыя землі сталі часткай Расійскай імперыі, а Слуцк ператварыўся з цэнтра княства ў павятовы цэнтр Мінскай губерні.

Я.І.Бараноўскі, В.С.Відлога.

Дакументы сведчаць

З «АПОВЕСЦІ МІНУЛЫХ ГАДОЎ» АБ МІЖУСОБНАЙ БАРАЦЬБЕ, УЗБРОЕНЫХ ПАХОДАХ, ЗАВАЁЎВАННІ НОВЫХ ЗЯМЕЛЬ І РАБАВАННЯХ КНЯЗЁЎ-ФЕАДАЛАЎ

977—1117 гг.

23. В лето 6624 (1116). Приходи Володимер на Глеба; Глеб бо бяше воевал Дреговичи и Случеск пожег, и не каяшеться о сем, ни покаряшеться, но боле противу Володимеру глаголюще, укоряя и. Володимер же, надеяся на бога и на правду, поиде к Меньску с сынъми своими и с Давыдом Святославичем, и Олговичи.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 40.

З ПАЦЬЕЎСКАГА ЛЕТАПІСУ АБ ФЕАДАЛЬНАЙ РАЗДРОБЛЕНАСЦІ І МІЖУСОБНАЙ БАРАЦЬБЕ КНЯЗЁЎ У ЗАХОДНІХ ЗЕМЛЯХ РУСІ

1119—1195 гг.

15. В лето 6667 (1159). Том же лете иде Рогъволод Борисовичь от Святослава от Олговича искать собе волости, поем полк Святославль, зане не створиша милости ему братья его, вземше под ним волость его и жизнь его всю; и приехав к Случьску и нача слатися ко Дрьючаном. Дрьючане же ради быша ему, и приездяче к нему вабяхуть и к собе, рекуче «Поеди, княже, не стряпай, ради есме тобе; аче ны ся и с детьми бити за тя, а ради ся бьем за тя».

20. В лето 6670 (1162). В то же лето Рурик Ростиславич и Святополк Юриевич Туровский, и Святослав, и Ярослав Всеволодичи, и Олег Святославич, и Борис Володымерич, и

Наследие слуцкого края

кривский князи, пройдоша ко Слуцку на Володымера Мстиславича, Ростиславля брата; Володымер же видя силу их не хотяше кровопролития, пусти им Слуцк, а сам пойде в Киев к Ростиславу брату, Ростислав же даде ему Триполь и инныя чтыри городы.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 59—61.

ЗВЕСТКІ ПРА СТАРАЖЫТНЫ СЛУЧАСК

Слуцк, древний Случеск, расположенный по обеим сторонам реки Случи, главное поселение Дреговичей, существовал еще в X столетии; в XII столетии был уже столицею отдельного княжества. Здесь была вотчина славного рода князей Слуцких и Копыльских, потомков в. кн. Ольгерда. Некоторые их этого рода сидели на киевском столе, другие были князьями Новгорода Великого. Олелько Владимирович, внук Ольгерда, был родоначальником князей Олельковичей-Слуцких. Сын его, рожденный от Настасии, дочери Василия Дмитриевича, в. кн. Московского, а внук великого Витовта, которого дочь София была за Василием, Симеон, был князем киевским, брат его Михаил был князем копыльским и казнен в Вильне в 1482 году по велению короля Казимира, наконец внук Олельки сын Семена киевского, Василий, был князем слуцким. Последним князем слуцким был Юрий Юрьевич, женатый на Екатерине Тенчинской. У них были три сына Юрий, Иван-Семен и Александр. Все они перешли в римскую веру и умерли бездетными. Но оставался двоюродный брат их, князь Юрий Семенович, внук казненного Михаила, умерший в 1586 году и похороненный в слуцком кафедральном соборе. Он был женат на Варваре Кишка. У них была единственная дочь княжна София Юрьевна Олелькович-Слуцкая, вышедшая замуж 1 ноября 1600 года за князя Януша, сына князя Христофора Радзивилла. Она была последнею в роду. Умерла в Слуцке и похоронена в Св. Троицком монастыре, где и теперь лежит в свинцовой раке, над которой надпись: «1617 года марта 19 преставися благоверная София ксенжна Слуцкая Олельковна Юрьевичева, Ольгердова племя, и положена бысть в Слуцку, в монастыре Святое Живоначальное Тройцы». Мощи ее считаются нетленными. В народе сохранилась память этой благочестивой княгини, и в день совершения о ней панихиды, 17 сентября, народ всегда собирается во множестве.

Княгиня София была единственною наследницей Олельковичей.

Поэтому вся Слуцко-Копыльская вотчина перешла во владение Радзивиллов. Вотчина эта одна из богатейших в Белоруссии. Она простиралась слишком на тридцать миль; богато орошенная водами Случи, Лани, Мазы и Оресы, стремящихся с одной стороны к балтийскому морю, а с другой к Припяти и Днепру, она считалась самою плодородною. Пшеница и лен в то уже время произрастали здесь в большом изобилии. В Слуцком и Копыльском княжествах считалось 32 большия имения и семь городов с замками, именно: Слуцк, Копыль, Романов, Старобин, Пясечна, Ленин и Любань.

Князь Януш Радзивилл вместе с Зебржидовским руководил восстанием против Сигизмунда III. Он умер в Черлине в 1620 году, на 41 году жизни, похоронен в Дубинках. В Слуцке он основал евангелическо-реформатский сбор и высшее училище. Его наследник, князь Богуслав, был тоже покровителем кальвинистов. Он устроил в Слуцке сильную крепость, считавшуюся одною из лучших в стране, постоянно содержал четыре полка на свой счет и, когда в 1655 году князь Трубецкой осадил город с большими силами, не смотря на двукратныя нападения не успел взять замка. Слуцк постоянно находился во владении Радзивиллов, хотя Сапеги на правах наследства по женской линии предъявили на него притязание и вели продолжительную тяжбу, окончившуюся едва в 1732 году в пользу Радзивиллов. Последнею владелицею Слуцка из этого рода была княжна Стефания, вышедшая замуж за князя Льва Витгенштейна, почему, после смерти ее, Слуцк перешел в собственность сына их князя Петра Львовича Витгенштейна. В 1846 году Слуцк куплен в казну за 342,821 рубль.

Во все времена владения Слуцком князьями Радзивиллами, последние были постоянными покровителями как реформатского исповедования, так и православия. В этом отношении особенно памятен другой князь Януш, сын князя Христофора, храброго литовского гетмана. Он много жертвовал на поддержание кальвинских сборов и православных церквей, а вторая супруга его, Мария, дочь Василия Лупуллы, господаря Молдавского, в 1669 году завещала 600,000 польских злотых на литовские православные монастыри. Она похоронена в 1661 году в том же Св. Троицком монастыре. В том же склепе находится небольшой гроб с останками неизвестного князя-отрока. По преданию, это был сын кн. Януша и

Наследие слуцкого края

Марии Лупуллы, отравленный нянькою, которая, будучи подкуплена врагами их, разрезала яблоко пополам ножом, которого одна половина была отравлена; одну часть съела сама, а другую, к которой прикоснулось отравленное лезвие, дала ребенку, от чего он и умер. Наследницею князя Януша осталась дочь Мария-Анна, от первого брака с Екатериною Потоцкою. Она вышла замуж за двоюродного брата своего отца, князя Богуслава, последнего из линии Николая Рыжего. У них тоже была одна только дочь, Лудовика-Каролина в супружестве с Лудовиком маркграфом Бранденбургским, после его смерти вступившая в брак с Карлом-Филиппом герцогом Нейбургским. Лудовика-Каролина была последнею из рода Радзивиллов покровительницею кальвинистов и православных. Она подарила слуцкому Преображенскому монастырю остров Кочов в Домоновичах, при кенигсбергском университете учредила двенадцать стипендий для протестантов, посвятивших себя духовному званию. Кроме того много жертвовала на воспитание литовских протестантов в Оксфордском университете, во Франкфурте-на-Одере и в Берлине. После ее смерти в 1695 году Слуцкая вотчина и все другие имения достались единственной дочери ее Елисавете-Софии, в замужестве княгини Зульцбах, и следовательно перешли в чужия руки. Но впоследствии линия Радзивиллов Несвижских и Олыкских выкупила все эти имения, т. е. все бывшее владение княжеств Слуцкого и Копыльского.

Слуцк делится на старый и новый город. В старом, на высокой горе стоял сильно укрепленный замок, называвшийся верхним, потому что у подошвы горы стоял другой, нижний замок. Оба замка были окружены валом. Такой же вал окружал и весь Старый Слуцк с четырьмя воротами: Виленскими, Польскими, Островскими и Уречскими. Новый Слуцк воздвигнут едва в XVII столетии; сейчас же за его пределами заметны следы другого замка, тоже окруженного валом. В Новом Слуцке находится Св. Троицкая церковь, от чего вся эта часть города называется Тройчаны. Наконец есть еще особая часть города, несомненно древнейшая, где находится величественное городище, на котором тоже стоял замок. Здесь же находился древнейший храм, кафедральный собор. Собор и Троицкая церковь истреблены пожаром, но в нынешнем столетии отстроены вновь. Существовали здесь монастыри Св. Ильи и другие. Ныне находится Троицкий монастырь и 8 церквей. Древнейший католический костел фарный. Поэтому-то во время происходивших споров и религиозной борьбы с протестантами сложена песня (в кантычках), в которой между прочим говорится:

Starsza slucka fara
Niż niemiecka wiara,

т.е. слуцкая фара постарше немецкой веры. Фара эта существует и ныне. Был здесь монастырь бернардинов и иезуитская коллегия. Евангелический собор и теперь существует.

Старовольский, в половине XVII столетия, считал Слуцк значительнейшим городом в стране. Не смотря на разные невзгоды, нападения татар, войны с Россией, внутренния междоусобия, Слуцк славился своей торговою и промышленною деятельностью. Самым цветущим для него временем было XVII столетие под опекою Радзивиллов. Кальвинисты постоянно содержали здесь гимназию и большую типографию. Вообще покровительство и защита протестантов были столь сильны, что их единоверцы даже из-за границы приезжали сюда, избегая преследований и ища защиты у Радзивиллов. Так из Шотландии сюда приехало большое число колонистов. Они здесь поселились и своею неутомимою деятельностью и знанием дела много содействовали развитию фабрик, торговли и промышленности. Фабрик было много разных, но в особенности славилась на всю Литву и Польшу фабрика слуцких поясов, составлявших украшение и необходимость для каждого не только магната, но и обыкновенного шляхтича. Поэтому-то эти пояса были доступны всякому от 10 до 50 и 100 дукатов за штуку. Ни одна фабрика не могла сравниться со Слуцкою в отношении отделки, красоты цветов, отличного выбора узоров и прочности. Во многих польских богатых домах и теперь еще можно видеть эти пояса, хранимые как дорогое наследие; в Галиции же, где теперь усвоен польский костюм, заменяющий во всех торжественных случаях, как официальных, так и семейных, форменные мундиры, за слуцкие пояса платят большие деньги. Все слуцкие пояса обозначены вышитыми золотом русскими надписями, или же, на некоторых, словами: Factus est Sluciae.

С упразднением самостоятельного княжества, Слуцк был причислен к Новогрудскому воеводству; уездным городом Минской губернии назначен в 1795 году. Жителей в Слуцке ныне считают около 18 тысяч.

Живописная Россия: Литовское и Белорусское Полесье: Репринтное воспроизведение изд. 1882 г. Мн., 1994. С. 365—367.

Наследие слуцкого края

Радавод князёў слуцкіх

АЛЕЛЬКАВІЧЫ (Алелькі, Слуцкія), беларуска-літоўскі княжацкі род, герб «Пагоня», адна з галін Гедымінавічаў. Прадстаўнікі яго ў XV—XVI ст. займалі ў ВКЛ прывілеяванае становішча, адыгрывалі значную ролю ў грамадскім і дзяржаўным жыцці Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы. Неаднойчы станавіліся ў апазіцыю да вялікіх князёў, выступалі за аб'яднанне літоўска-беларускіх і ўкраінскіх зямель з Маскоўскай дзяржавай, змагаліся з татарамі.

Алелькавіч (Алелька) Аляксандр Уладзіміравіч (?—1454), заснавальнік роду князёў Алелькавічаў, палітычны дзеяч, военачальнік, дыпламат Вялікага княства Літоўскага, удзельны князь слуцкі і капыльскі (з 1394), князь кіеўскі (1441—1454). Другі сын кіеўскага князя Уладзіміра Альгердавіча, адзінакроўнага брата Ягайлы, унук вялікага князя Альгерда. У 1417 г. ажаніўся з Настассяй, маскоўскай княгіняй, дачкой вялікага князя маскоўскага Васіля і Соф'і Вітаўтаўны (дачка Вітаўта). У іх нарадзіліся тры дачкі і сыны — Сямён і Міхаіл. А.Алелька ўдзельнічаў у паходах Вітаўта пад Ноўгарад, у абароне паўднёвых рубяжоў ВКЛ.

Пасля смерці Вітаўта ў 1430 г. разгарэлася ўзброеная барацьба за велікакняжацкі прастол, на які адным з магчымых прэтэндэнтаў быў і князь Алелька. Погляды яго мяняліся: спачатку падтрымліваў Свідрыгайлу, потым Жыгімонта Кейстутавіча, у 1433 г. — зноў Свідрыгайлу, за што Жыгімонт Кейстутавіч арыштаваў яго і пасадзіў у астрог у Кернаве. Жонка Алелькі Настасся разам з сынамі таксама была зняволена ва Уцянах. Пасля забойства Жыгімонта прысягнуў вялікаму князю ВКЛ Казіміру IV, які вярнуў Аляксандру Алелькавічу Слуцк і даў Кіеўскае княства (кіраваў ім аж да самай смерці). А.Алелька асноўныя ўладанні меў у «рускіх» (беларуска-ўкраінскіх) рэгіёнах ВКЛ, падтрымліваў не толькі праваслаўныя цэрквы і манастыры, але і каталіцкія (зацвердзіў прывілей каталіцкага касцёла Св. Мікалая ў Кіеве). Рашуча выказваўся за прызнанне царкоўных і ўладальніцкіх правоў уніяцкага мітрапаліта Ісідора, што з'яўлялася процівагай велікакняжацкай уладзе, якая падтрымлівала кандыдатуру саборнага папы.



Пячатка слуцкага князя Аляксандра Алелькавіча.

Пад апекай Алелькі працавалі розныя кнігапісцы і скрыпторыі. На жаль, звестак пра іх дзейнасць амаль не захавалася. Але на Лаўрышаўскім Евангеллі XIII—XIV ст. выяўлены тэкст яго дару манастыру: «Се язь князь Олександр Володимерович и с своею княгинею московъскою и своими детми дал есмь десятину в св(вя)тей б(о-городи)цы ў Лаврашов манастырь с Турца ў веки». Магчыма, што адзін з кодэксаў, якія ўзніклі ў часы А.Алелькі, пазней быў перапісаны і ўпрыгожаны знакамітым слуцкім дзякам У.Яцкавічам. На думку П.А.Гільтэбранта і А.Л.Міратворцава, у пачатку XV ст. у Слуцку вялося летапісанне. Пра гэта сведчыць знойдзены імі ў Нясвіжскім архіве Радзівілаў у 1867 г. фрагмент старажытнага рукапісу, дзе паведамлялася пра заснаванне Новага «града» ў Слуцку побач са Старым, будаўніцтва ў 1409 г. царквы Св. Багародзіцы ў высокім горадзе на «дытынцу» (у замку). Паводле гісторыка Улашчыка, тэкст гэты хутчэй за ўсё быў напісаны ў пачатку XVI ст., але, магчыма, на аснове летапісных слуцкіх запісаў у пачатку XV ст.

Аляксандр Алелькавіч пахаваны ў Кіева-Пячэрскім манастыры.

Алелькавіч Сямён (1420—3.12.1470). Старэйшы сын Аляксандра, князь кіеўскі. Прэтэндаваў на велікакняжацкі пасад у 1454 г. і 1456 г., шукаў падтрымкі ў Маскве. Аднавіў саборную царкву Кіева-Пячэрскай лаўры. Удава яго, Марыя Гаштольд, атрымала ад вялікага князя Пінскае княства ўзамен за Кіеўскае.

Міхаіл (каля 1425—30.8.1481). Малодшы сын Аляксандра, князь слуцкі і капыльскі. У 1470—1471 гг. намеснік вялікага князя ВКЛ у Вялікім Ноўгарадзе. З мэтай скінуць Ягелонаў і стаць вялікім князем ВКЛ стварыў групоўку магнацкіх родаў. Пры няўдачы меў намер аддзяліць ад ВКЛ усходнія землі

Наследие слуцкого края

Беларусі і Украіны і перайсці з імі пад апеку вялікага князя маскоўскага. За арганізацыю змовы супраць вялікага князя Казіміра IV пакараны смерцю. Пакінуў сына Сямёна, ад якога пайшлі наступныя слуцкія князі.

Васіль (каля 1425—4.6.1495).

Сын Сямёна, князь пінскі.

Сямён (каля 1460—14.11.1505).

Сын Міхаіла, князь слуцкі. У 1502 г. і 1503 г. слуцкія атрады пад яго камандаваннем разбілі нашэсце крымскіх татар на рэках Уза і Прыпяць.

Юрый (1492—17.4.1542).

Сын Сямёна, князь слуцкі. Удзельнік абароны Слуцка ў час Глінскіх мяцяжу 1508 г., бітвы з татарамі ў 1511 г., Аршанскай бітвы 1514 г.

Юрый II (каля 1531—9.11.1578).

Сын Юрыя, слуцкі князь. Удзельнік Лівонскай вайны 1558—1583 гг., узначальваў атрад слуцкіх воінаў з некалькіх тысяч. Жанаты быў з Кацярынай Тэнчыньскай, кракаўскай кашталянкай (дачкой Станіслава), якая пазней выйшла замуж за Крыштафа Мікалая Радзівіла. З Юрыем Алелькавічам мела дзяцей: Юрыя, Яна-Сямёна і Аляксандра.

Пахаваны ў Любліне, у капліцы Св. Станіслава Косткі касцёла езуітаў.

Юрый III (17.8.1559—6.5.1586).

Сын Юрыя Юр'евіча, князь слуцкі, адзін з апошніх Алелькавічаў па мужчынскай лініі. Жанаты з Барбарай Кішчанка, дачкой падляшскага ваяводы, меў з ёю адзіную дачку Соф'ю.

Ян-Сямён (1560 (?)—9.3.1592).

Сын Юрыя Юр'евіча і Кацярыны Тэнчыньскай, ахрышчаны па ўсходнім абрадзе, перайшоў у каталіцызм. У 1586 г. ажаніўся з Соф'яй Мялецкай, дачкой Мікалая, кароннага гетмана і ваяводы падольскіх зямель. Была ў іх дачка, якая памерла ва ўзросце аднаго году ў 1591 г. Памёр у Любліне і як соцый езуітаў пахаваны ў іх люблінскім касцёле ў капліцы Пана Езуса Трыбунальскага, пабудаванай яго маці Кацярынай.



Аляксандр Алелькавіч.



Юрый Алелькавіч.

Аляксандр (?—26.6.1591).

Сын Юрыя Юр'евіча і Кацярыны Тэнчыньскай, не быў жанаты. Памёр у Кракаве, пахаваны ў Слуцку, у царкве манастыра Св. Тройцы.

Соф'я (1.5.1585—19.3.1612).

Дачка Юрыя III і Барбары Кішчанка, апошняя слуцкая княгіня. У 1600 г. выйшла замуж за Януша Радзівіла, падчашага ВКЛ, якому пасля смерці Соф'і пры родах перайшло княства Слуцкае і Капыльскае. Памерла ў Амеляве, была пахавана ў Слуцку, у Свята-Троіцкім манастыры.

Літаратура:

Беларуская энцыклапедыя ў 18 т. Т. 1. Мн., 1996; Грицкевич А.П. Древний город на Случи. Мн., 1985; Каламейска-Сааед М. Партрэты і помнікі старадаўнасці князёў Алелькавічаў у Слуцку. Інвентарызацыя Юзэфа Смаліньскага з 1904 г. Варшава, 1996; Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995.

Падрыхтавала В.С.Відлога.

Мястэчка Грэск у XVI—XVIII ст.

Да найбольш старажытных паселішчаў Случчыны адносіцца Грэск. Ужо ў часы ранняга жалезнага веку (VIII—VI ст. да н.э.—VIII ст. н.э.) тут існавала ўмацаванае паселішча — гарадзішча. Акрамя гэтага помніка ў ваколіцах Грэска раней знаходзілася і шмат курганоў.

Першыя пісьмовыя звесткі пра Грэск адносяцца да пачатку XVI ст. У 1536 г. Грэск належаў каралеве Боне і быў цэнтрам воласці ў Троцкім ваяводстве. Па загадзе Боны яе служэбнікі збіралі даніну з падданых і рабілі перапіс насельніцтва для будучага падаткаабкладання. Такія дзеянні выклікалі супраціўленне сялян Грэскай воласці, і яны ўзнялі бунт. «И они,

Наследие слуцкого края

милостивая господарыня, жадною мерою прописатися не хотели и слуг моих перебили, а жадного куса у волости писати не дали», — пісаў у лісце да Боны яе намеснік Іван Гарнастай. Мяркуючы па гэтым дакументе, бунт узначальваў нейкі старац, якога Бона раіла Гарнастаю «взяти до казни».

У 2-й палове XVI ст. маёнтак у Грэску належаў Марціну Валадковічу, потым слуцкім князям Алелькавічам, а з канца XVI ст. ён уваходзіць у склад радзівілаўскіх уладанняў. Найбольш ранні вядомы нам інвентар Грэска датуецца вераснем 1509 г. Паводле яго, панскі двор у Грэску меў невялікія памеры. На яго тэрыторыі знаходзіліся два жылыя дамы, тры невялічкія свірны, піўніца (склеп), пякарня, кухня і стайня з адрынай. Сам Грэск у гэты час ужо быў мястэчкам. У ім налічваліся 34 рыначныя і 35 вулічных пляцаў. На рынку знаходзіліся царква і карчма. У мястэчку дзейнічаў млын. Жыхары займаліся у асноўным земляробствам. Большасць з іх мелі па валоцы зямлі (валока = 21,37 га). За валоданне зямлёй местачкоўцы павінны з кожнай валокі плаціць штогод па тры капы грошай (капа = 60 грошай). Сярод жыхароў Грэска было нямала рамеснікаў.

На працягу першай палавіны XVII ст. назіраецца паступовы рост паселішча. У 1654 г. тут налічвалася ўжо 95 двароў. У мястэчку было ўжо шэсць вуліц — Міліцовая, Менская, Раковіч, Тарасовіч, Слуцкая, Крывая. Некаторыя з гэтых вуліц называліся па прозвішчах людзей, якія там жылі. Напрыклад, на Міліцовай жыло некалькі сем'яў з прозвішчамі Міліца, а на вуліцы Тарасовіч былі двары Тарасовічаў. Сярод насельніцтва Грэска было некалькі сем'яў радзівілаўскіх драгунаў і гайдкоў.

У XVIII ст. жыхары Грэска, як і раней, займаліся пераважна земляробствам. Аднак памеры іх зямельных надзелаў скараціліся да паўвалокі. З кожнай валокі местачкоўцы плацілі Радзівілам чынш у 50 злотых. У большасці жыхароў было па два валы, а ў найбольш заможных — яшчэ і па аднаму — два кані. У 1721 г. на 69 двароў прыходзілася 105 валоў і 21 конь. У 1771 г. у мястэчку налічвалася 88 двароў. Усё большая колькасць местачкоўцаў займаецца рамёствамі.

Грэск быў тыповым беларускім мястэчкам. На працягу стагоддзяў ён захоўваў сваю старадаўнюю планіроўку і забудову.

Крыніцы:

1. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильно, 1887. Т. 1. С. 41–42.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1599, 1600, 1603, 1604; Ф. 673. Воп. 4. Спр. 1. Л. 365–369.

В.У.Шаблюк.

Набегі крымскіх татар на Случчыну

Стэпаўцаў (крымскіх татар) асабліва вабілі густа населеныя і багатыя землі Случчыны. У XVI ст. Слуцкае княства займала землі, што ляжалі па верхняй Случы і яе прытоках, а таксама па верхніх прытоках Арэсы. З поўдня да яго прымыкалі палескія балоты, а з поўначы — лясны абшар. На захадзе Слуцкае княства межавала з Клецкім. Слуцк быў важным транспартным вузлом: дарогі і тракты вялі ў бок Клецка, Нясвіжа, Менска, Бабруйска. На поўдні Слуцк быў звязаны сухапутным шляхам з Петрыкавічамі (Петрыкаў) і Мазыром, далей гэты шлях пралягаў на Кіеў.

Напады крымскіх татар адбываліся звычайна ў канцы лета — пачатку восені, калі паспяваў ураджай і людзі, у тым ліку і ваеннаслужылае саслоўе — шляхта, былі заняты яго зборам. Існавала некалькі асноўных маршрутаў, па якіх крымскія татары пранікалі на Случчыну і сумежныя з ёй землі. Адным з іх з'яўляўся так званы Чорны шлях, які пачынаўся паблізу самага Перакопа і далей цягнуўся паміж Дняпром і Бугам. Каля Белай Царквы ён дзяліўся на некалькі напрамкаў. Гэтыя шляхі-адгалінаванні вялі ўглыб Вялікага княства Літоўскага. Татары былі добра знаёмы з тапаграфіяй Палесся, ведалі сухапутныя шляхі, валодалі прыёмамі і сродкамі пераправы цераз рэкі.

Крымскія татары неаднаразова выкарыстоўвалі броды каля Лоевай гары (Лоева). Ад Лоевай гары далейшы маршрут ваяўнічых атрадаў пралягаў на Мазыр, Петрыкавічы, дзе існавала пераправа цераз Прыпяць, і далей на Слуцк. Летапісы і дакументы зафіксавалі выкарыстанне крымцамі гэтага маршруту ў 1505–1521 гг.

Першы напад татар на Случчыну адбыўся ўвосень 1502 г. Слуцкі князь Сямён

Наследие слуцкого края

Міхайлавіч Алелькавіч разам з падольскім ваяводам Янам Бучацкім разбілі атрад крымцаў у колькасці 150 чалавек («Хроніка Літоўская і Жамойцкая» піша пра 1500 крымцаў) і адабралі ўвесь палон.

У наступным, 1503 г., татары двойчы наведвалі слуцкую зямлю. Асабліва небяспечным быў першы напад, які адбыўся ў канцы жніўня. Набег быў імклівы і неспадзяваны. Алелькавіч даведаўся пра набліжэнне татар, убачыўшы іх. Вось аб чым сведчыць «Хроніка Быхаўца»: «Князь жа Семён Міхайлавіч в тот час был в Слуцку и не ведаючы ні о чом, только возривши з города на місто за реку Случ з церкві Святого Юр'я, и увіделі татар скачучих на конях, и мужи и жены імаюча и станаючи...»

За адзін гэты дзень крымцы прайшлі 25 міль (180—190 км) ад месца пераправы на Прыпяці. І вечарам таго ж дня апынуліся каля сцен Слуцка. Яны размясцілі кош[1] каля мястэчка Умаль і пастаянна рабавалі насельніцтва бліжэйшых паселішчаў. Становішча слуцкага князя было надзвычай складанае: у замку знаходзілася толькі невялікая колькасць ратнікаў. У гэтых умовах князь Алелькавіч прыняў рашэнне зачыніцца са сваёй дружынай у замку, тым часам паслаўшы адначасова ганца ў Вільню за дапамогай. Крымцы не маглі авалодаць слуцкім замкам. Спустошыўшы тэрыторыю ад Слуцка да Ішкалдзі і спаліўшы Клецкі замак, з палоннымі і здабычай яны пакінулі Случчыну.

Затое другі напад абярнуўся для крымцаў буйным паражэннем. Калі стэпаўцы вярталіся назад, князь Сямён Алелькавіч, Альбрыхт Гаштаўт і Юрый Неміровіч перахапілі іх ужо за Прыпяццю за мілю ад Давыд-Гарадка. У баі ў крымцаў быў адбіты ўвесь палон са здабычай.

У 1506 г. абаронцам Слуцкага замка прыйшлося вытрымаць самую працяглую за ўвесь час крымскіх нападаў аблогу і штурм. Два крымскія царэвічы, Біціс-Гірэй[2] і Бурнаш, спрабавалі авалодаць слуцкімі ўмацаваннямі. Абарону замка ўзначаліла ўдава князя Сямёна Міхайлавіча — княгіня Настасся. Татары рабілі падмёты, падпальвалі замкавыя сцены, але ўсё было дарэмна. Абаронцы адбілі ўсе атакі насядаўшых ворагаў. Страціўшы надзею захапіць Слуцкі замак, царэвічы знялі аблогу і рушылі далей на паўночны захад, у бок Наваградка, адкуль павярнулі назад, у Крым. У выніку крымскага набегу 1505 г. амаль уся Случчына была спустошана і разрабавана.

На наступны год, не залячыўшы яшчэ раны пасля папярэдняга нападу, Случчына зноў трапіла пад удар татар. Рухаючыся ў бок Клецка і Наваградка, крымскія загоны рабавалі ўсё тое, што траплялася на шляху. Не выключана, што ў 1506 г. татары спрабавалі чарговы раз авалодаць Слуцкам. Пасля катастрофы пад Клецкам слуцкія ратнікі перарэзалі крымцам шлях да адступлення. Асабліва вялікія страты стэпаўцы панеслі паблізу Капыля і на пераправе каля Петрыкавічаў. Рэшткі ацалелых загонаў праследаваліся ажно да Оўруча і Жытоміра. Толькі невялікая іх частка здолела дабрацца да Крыма.

Няўдачай закончылася і спроба асобнага крымскага загона ў 1508 г. пранікнуць з Валыні пад Слуцк. Ротмістр Лукаш Мараўскі з пешым войскам разбіў і прагнаў іх.

Апошні набег крымцаў на землі Слуцкага княства адбыўся ў 1521 г. Пяцітысячнае татарскае войска, пераправіўшыся цераз Дняпро каля Лоевай гары, спаліла Мазыр, а затым рушыла ўглыб беларускіх зямель. Былі разрабаваны абшары паміж Пінскам і Слуцкам. Пасля гэтага нападу паўднёвая частка Случчыны ўяўляла сабой вялікае папялішча.

Абарона Случчыны ад крымскіх набегаў ляжала ў асноўным на мясцовых апалчэнцах. Згодна з попісам войска Вялікага княства Літоўскага 1528 г., харугва слуцкіх князёў налічвала 433 ратнікі. Безумоўна, у выніку буйной выправы крымцаў (у некалькі тысяч вершнікаў) яна адна не ў стане была аказаць належны адпор. І справа хутчэй была не ў колькаснай перавазе нападаўшых. Хуткасць, з якой крымскія татары рабілі свае напады, не давала магчымасці своечасова сабрацца для абароны краю ўсім слуцкім ратнікам. У гэтых умовах надзвычай узрасталі роля і значэнне Слуцкага замка. Замак даваў прытулак жыхарам Слуцка і навакольных сёлаў. На той час ён быў даволі добра ўмацаваны. Невялікі гарнізон меў на ўзбраенні нават

[1]Кош — ваенны лагер татар.

[2]У розных крыніцах сустракаюцца іншыя варыянты напісання гэтага імя.

Наследие слуцкого края

гарматы, страляючы з якіх, случакі нанеслі адчувальны ўрон жывой сіле ворага ў час штурму ў 1505 г. У замку знаходзілася дастатковая для працяглай аблогі колькасць боепрыпасаў і харчоў. Што тычылася насельнікаў аддаленых ад Слуцка месцаў, то ім прыходзілася спадзявацца толькі на саміх сябе, свой спрыт і сілу. Перад пагрозай крымскага палону альбо смерці людзі хаваліся ў густых лясах ці непралазных балотах, куды не маглі дабрацца крымскія загоны.

Калі на Случчыну прыходзілі буйныя аддзелы татарскага войска, слуцкім апалчэнцам дапамагалі вайсковыя адзінкі Вялікага княства Літоўскага (тактыка ратнікаў ВКЛ заключалася ў пераследзе абцяжараных палонам і здабычай ворагаў). У 1502 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Аляксандр прысылаў на дапамогу Сямёну Алелькавічу войска падольскага ваяводы Яна Бучацкага. Дапамога накіроўвалася случакам і ў 1503 г., але, на жаль, прыбыла тады са значным спазненнем, калі першы напад крымцаў ужо закончыўся. Другі напад, у канцы таго ж года, дзякуючы сумесным намаганням ратнікаў Сямёна Міхайлавіча Алелькавіча, Альбрыхта Марцінавіча Гаштаўта і Юрыя Неміровіча, закончыўся паражэннем татар паблізу Давыд-Гарадка. У 1506 г. апалчэнцы слуцкай княгіні Настассі разам з наваградскімі, менскімі і гарадзенскімі ратнікамі ўдзельнічалі ў пераследзе крымскіх загонаў пасля Клецкай бітвы. У час вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім у Слуцку і паблізу яго размяшчалася рота наёмнікаў на чале з Лукашам Мараўскім, якая налічвала 230 пехацінцаў і 6 вершнікаў. У час бітвы з татарскім загонам па рацэ Случ у 1508 г. пехацінцы Л.Мараўскага, маючы дасканалае на той час узбраенне і даспехі, смела ўступілі ў бой з конніцай ворага, адкінулі яе і прымусілі ўцякаць. Тады ў пагоню за імі княгіня Настасся паслала конных ратнікаў са Слуцкага замка. У сваю чаргу слуцкая харугва неаднаразова прыходзіла на дапамогу ратнікам з іншых княстваў і ваяводстваў ВКЛ. Зімой 1527 г. слуцкі князь Юрый Сямёнавіч Алелькавіч удзельнічаў разам з іншымі князямі і шляхтай Вялікага княства Літоўскага ў вялікай выправе супраць крымскіх татар, у выніку якой стэпаўцы былі разбіты каля Альшаніцы, пад Кіевам. Частку ўцякаўшых коннікі ВКЛ патапілі ў балотах альбо знішчылі, іншых захапілі ў палон.

З 7 крымскіх нападаў непасрэдна на землі Слуцкага княства 4 закончыліся паражэннем для іх арганізатараў і ўдзельнікаў: у 1502 г., 1503 г., 1506 г. і 1508 г. Але ў 1503 г., 1505 г. і 1521 г. слуцкія ратнікі былі не ў стане абараніць свае землі. Як правіла, случакі дасягалі поспехаў у цесным узаемадзеянні з іншымі харугвамі Вялікага княства Літоўскага. За ўвесь час татарскіх набегаў Слуцкі замак так і застаўся для ворага непрыступным.

У.І.Кананоўіч.

* * *

...Раніцай татарскі кош прачнуўся ад грукату літаўраў. Замітусіліся воі, заскакалі езныя, забегалі сотнікі, збіраючы сваіх людзей у загоны. Віклівыя галасы мулаў клікалі да малітвы.

У Слуцкім замку таксама прачнуліся. Загудзелі ў настылым паветры званы замкавай царквы. Для тысячы вязняў, што трапілі ў татарскую няволю, трывожны гул званоў абудзіў трапяткую надзею на боскую літасць. Мо ўбачыць Бог іхнія пакуты і вызваліць з ардынскага палону.

Праз паўгадзіны татары пагрозлівымі шэрагамі выстраіліся перад замкам. У сонечных промнях ззялі даспехі вояў, зброя, конская вупраж, луналі на ветры хвастатыя бунчукі. Цішыню парушала карканне груганоў, што лёталі над зямлёй, іржанне коней ды трывожны звон клепалаў. У замкавай царкве служылі малебен за выратаванне Слуцка ад ворага. Хвіліну-другую цягнулася нядобрая, нібы перад навальніцай цішыня, маўчанне дзесяткаў тысяч людзей. Раптам па шэрагах татарскага войска, бы вецер на вершалінах у прыціхлым начным лесе, пранеслася лёгкае хваляванне. Ваяўніча завылі трубы. І не ў аднаго з абаронцаў замка халадок жаху прабег па спіне, не ў аднаго трывожна зайшлося сэрца. Але гэта не быў знак да штурму. Уздоўж татарскага войска скакаў на малочна-бялюткім жарабку царэвіч Біціс-Гірэй. Залатыя даспехі і шолам, наверсе якога развявалася пышная сутана, зіхацелі на сонцы. Некалькі нецярплівых абаронцаў, не вытрымаўшы спакусы, схапіліся за лукі і кушы, але адлегласць да татарскага войска стрэлы не адолелі і без карысці пападалі на зямлю. За царэвічам скакала світа, сярод якой вылучаўся не менш

Наследие слуцкого края

багатымі даспехамі царэвічаў брат Бурнос-Гірэй. Следам лавінай імчала адборная тысяча вершнікаў. Татары, убачыўшы свайго вожа, радасна крычалі і махалі шаблямі.

— Уррах-а-а-а-х! Уррах-а-а-ах!

Царэвіч сядзеў на кані нерухома, поўны пагарды да ўсяго, што адбывалася вакол яго. Халодныя вочы з-пад шырокага пляскатага лба абыякава пазіралі на войска. Ніводны мускул не крануўся на царэвічавым твары, быццам не бачыў і не чуў царэвіч вар'яцтва сваіх воінаў. І чым болей татары шалелі, тым болей іх ахоплівала сляпая патрэба крычаць і крычаць, нібы з крыкам яны пазбаўляліся баязлівасці перад смерцю, і да іх прыходзіла смеласць і мужнасць.

Штурм замка пачаўся абстрэлам з катапультаў. Упершыню за папярэднія штурмы татары карысталіся імі. Раней крымчакі болей спадзяваліся на ўдачу. З пагрозлівым грукатам і ляскатам узмахнулі катапульты рычагамі, і ў паветры са страшэнным гудам замільгалі, з добрую цялячую галаву, камяні. Частка камянёў так і не даляцела да замка, пападала ля высокага землянога вала, астатнія глуха забарабанілі па дубовых гароднях. Другі раз татары зарадзілі катапульты меншымі камянямі. Ударылі, заляскалі рычагі, і зноў паветра напоўнілася гудам. Каменны град загрукатаў па сценах. Татары спрытна хапалі з калчаноў хвастатыя стрэлы, клалі іх на лукі і, нацягваючы тугую цеціву аж да самага вуха, рэзка адпускалі яе. Адна за другой сотні стрэлаў спявалі камусьці з абаронцаў замка развітальны спеў з жыццём. Крыклівыя, узброеныя лавіны набліжаліся да гародняў. Віскліваe, у тысячы глотак «а-а-а-а...» каціласа ў паветры. Нягледзячы на тое, што штурмуючых сустрэў рой стрэл, яны перабраліся цераз равы, ускарабкаліся на высокія валы і, прыставіўшы да сцен драбіны, палезлі ўгору. Зверху на штурмуючых паляцелі камяні, бярвенні, палілася гарачая смала, пасыпалася вапна, якая зацярушвала вочы.

Два дзесяткі палонных пад наглядам варты штурхалі да брамы таран. Рыпелі вялікія, у чалавечы рост, драўляныя колы. Случакі адчайна абстрэльвалі таран з лукаў, кушаў і ручніц. Стрэлы і ядры забівалі і нявечылі палонных. На месца забітых вартаўнікі гналі новых нявольнікаў. І таран няўхільна падбіраўся да брамы.

З глухімі выбухамі, у слупах дыму, плявалі ў варожыя рады смяротныя ядры (гарматы) хуфніцы. Ядры збівалі татараў з ног, ламалі ім косці на крывавыя шматкі. Шмат штурмуючых ужо развіталіся з гэтым светам; іхнія целы пакрылі валы. Яшчэ болей бегла і паўзло ад замка параненых, знявечаных, апечаных смалой. Хто сціскаў на бягу рассечанае стрыкусай плячо, хто спрабаваў выдраць з цела стралу, хто поўз па зямлі, цягнучы за сабой перабітыя ногі, і кленчыў дапамогі, хто, схапіўшыся за твар, на якім чорнымі пухлінамі ўздымаліся апёкі, скакаў ад нясцерпнага болю, хто круціўся па зямлі, каб збіць з сябе полымя. Аднак татары не адступалі. Зняважыўшы смерць, зацята лезлі на гародні.

Царэвіч Біціс-Гірэй не шкадаваў воінаў. Смерць і вайна для яго былі такой жа натуральнай з'явай, як дождж восенню ці снег зімой. Не вялікія страты хвалявалі яго, а маруднасць, з якой войска авалодвала замкам. Ужо каторую гадзіну без усякай карысці войска таўчэцца ля сцен. Царэвіч бачыў, як да брамы нарэшце падабраўся таран. Са сцен на яго кідалі камяні, дзежкі са смалою, паходні, пылаючае агнём галлё. Моцныя дубовыя бярвенні і сырыя конскія скуры, якімі быў абшыты таран, не паддаваліся агню. І тут ударылі хуфніцы. Некалькі ядраў прагудзела каля тарана, аднак два трапілі проста ў яго. Ад выбуху паляцелі ў розныя бакі шчэпы дрэва.

Біціс-Гірэй умеў валодаць сабой, але калі ўбачыў ахоплены агнём таран, царэвіч пачаў траціць вытрымку. Незадаволена хмурыў бровы, ноздры ягонага прыплюснутага носа расшырыліся і з усхліпам уцягвалі спякотнае паветра. Ледзьве стрымліваючы сябе, царэвіч адрывістым голасам загадаў выступаць на штурм замка новым загонам. Дзесьці апоўдні некалькі соцень татараў нарэшце ўварваліся на замкавыя сцены. Царэвіч Біціс-Гірэй з палёгкай уздыхнуў: здаецца, імгненне перамогі надышло. Слава табе, вялікі алах, што не мінуў сваёй міласцю. Нарэшце... Але праз паўгадзіны сечы яго воінаў са сцяны выбілі...

Толькі адвячоркам, калі поцемкі апускаліся на зямлю, татары, так і не авалодаўшы замкам, сунялі штурм. Болей чым тры тысячы забітых і параненых — такімі былі іх страты. Седзячы ў сваім шатры, царэвіч Біціс-Гірэй ацэньваў няўдачу. Ён не авалодаў замкам і на гэты раз.

Друкуецца па кн.: Чаропка В. Храм без бога. Мн., 1992. С. 20—23.

Наследие слуцкого края

З Хронікі Быхаўца

Як татары перакопскія зямлю Слуцкую зваявалі

Тою ж восенню (1502 г. — *Рэд.*) прыйшла вестка каралю Аляксандру, што татары, перайшоўшы раку Прыпяць, ваююць па воласцях, і кароль напісаў да князя Сямёна Міхайлавіча Слуцкага, і паслаў яму на дапамогу ваяводзіча падольскага Яна Бучацкага, а з ім дваран сваіх літоўскіх ды рускіх і радцаў нямала. Князь жа Сямён Слуцкі з панам ваяводзічам і з усімі вышэйназванымі дваранамі гналіся за татарамі і дагналі некаторых за Бабруйскам, за шэсць міляў ад горада, на рацэ Ужы. Было іх усяго паўтары сотні, і, дагнаўшы, пабілі іх і назад вярнуліся.

...Тое ж восені месяца жніўня 30 дня нечакана прыйшоў сын цара перакопскага Мэндлі-Кірэя — султан Бітыс-Кірэй — з шасцю тысячамі татараў і найперш з'явіўся пад горадам Слуцкам. Князь Сямён Міхайлавіч тады быў у Слуцку і не ведаў ні пра што, толькі зірнуўшы з замка, з цэрквы святога Юр'я, на месца за ракою Случчу, убачыў, што татары, скачучы на конях, мужчын ды жанчын хапаюць і сцінаюць.

Пабачыўшы тую нягодную паганскую навалу, князь Сямён Міхайлавіч з людзьмі, якія былі з ім у горадзе, вельмі здзівіліся такому нагламу і незаўважанаму іх прыходу: пераправіўшыся цераз Прыпяць, татары ў той жа дзень прайшлі да Слуцка дваццаць пяць міляў, частка з іх у той дзень, мінуўшы Слуцак і прайшоўшы яшчэ пяць міляў, дасталіся да Капыля. Князь жа Сямён не мог вымысліць, што пачаць рабіць, бо людзей з ім на той час у горадзе было вельмі мала, усе былі па сёлах. Татары іх усіх адрэзалі ад горада і ўсе табуны конскія пазабіралі, князь жа толькі з вельмі нешматлікаю сілаю ў горадзе затварыўся і паслаў да караля ў Вільню паведаць пра тое. А царэвіч Бітыс-Кірэй стаў кашом пад Слуцкам за ракою Умаль. Татары ж пайшлі ў загоны на землі навакольныя, і, ідучы, ваявалі каля Клецка ды Нясвіжа і спалілі горад Клецак, і, не дайшоўшы да Новагародка шасці міляў, павярнулі ад Ішкалдзі назад, шмат месцаў ды сёлаў папалілі, і невымоўнае кровапраліцце хрысціянам учынілі, з вялікім палонам і здабыткам сабраліся да Слуцка, і без усякае шкоды ўсе ў цэласці назад вярнуліся.

Кароль жа Аляксандр колькіх дваранаў сваіх паслаў да князя Сямёна ў Слуцак. З'явіўшыся ў Слуцак і даведаўшыся, што татары ў цэласці з зямлі Слуцкае выйшлі, каралёвы паслы вярнуліся ў Літву.

У год 7012 ад пачатку свету, ад Божага нараджэння 1503 прыходзілі тры тысячы татараў і, быўшы пад Слуцкам ды пад Новагародкам і многа зла ўчыніўшы, пайшлі назад іншаю дарогаю, праз Грычынскае балота, у бок Гарадка. А паны-рада Вялікага княства Літоўскага пра тое не ведалі, толькі гетман Станіслаў Пятровіч, празваны Кішка, пан Ольбрахт Гаштольд ды пан Юры Неміровіч ведалі. Да іх прыехаў князь Сямён Міхайлавіч Слуцкі, і, злучыўшыся усе разам, падаліся за татарамі і, пераправіўшыся цераз Прыпяць, дагналі іх за Гарадком, за мілю ад месца, і стачылі з ім бой і з Божаю дапамогаю нашы пабілі татараў, палон увесь вызвалілі і са здабыткам ды з вялікаю славаю назад вярнуліся.

Пра новую навалу татарскую на Вялікае княства Літоўскае

У год 1506 (як сведчыць летапісец, а паводле Кромэр Мехавіта ды іншых мае быць год 1505) прыйшоў царэвіч перакопскі, сын Мэндлі-Кірэя, Махмет-Кірэй-султан з братамі сваімі — Бітыс-Кірэй-султанам ды Бурнаш-султанам — і з усімі сіламі татарскімі. І прыйшлі яны да Дняпра на Лоеву гару, і, там цераз Дняпро, пераправіўшыся, сам Махмет-Кірэй-султан рушыў пад замак Менск у сярэдзіну Літвы, а пад Слуцак паслаў двух братоў сваіх, Бітыс-Кірэй-султана ды Бурнаш-султана. І ў пятніцу, у святы дзень — на ўнебаўзняцце Панны Марыі тыя царэвічы прыйшлі пад Слуцак, у якім была княгіня Анастасся з дзіцяткам Юр'ем Сямёнавічам, і так вакол Слуцка ваявалі ўсе аж да замка, ведаючы, што ў ім толькі княгіня была, і штурмавалі замак, падкопы робячы ды агонь пакладаючы. Але мужна бараніліся случакі, якіх абавязвала шлюбам і просьбаю княгіня Анастасся, каб адзінага дзедзіча свайго ад гвалту паганскага цвёрда баранілі. Мноства татараў пад замкам палегла, бо шмат шляхты ды іншых князёў на той час у княгіні Анастассі ў Слуцку служылі...

Полымя. 1993. № 12. С. 208—210.

Наследие слуцкого края

Паданне пра абарону Слуцка

У паданні адлюстраваны падзеі пачатку XVI ст., калі крымскія татары напалі на Слуцк і іх напад быў адбіты. У летапісе пра гэта гаворыцца так: «И хотяху татаре взяти Случеск, и не могаша, биша бо их града крепко». «Паданне пра абарону Слуцка» было запісана вядомым беларускім пісьменнікам-случаком Язэпам Лявонавічам Дылам, якое пачуў ён ад сваёй бабкі Дамінікі ў Слуцку, казачніцы і захавальніцы народных песенных скарбаў, і перакладзена ім на сучасную беларускую мову.

А і было гэта, сталася ў нас, на Белай Русі!..
Як паўстала на ёй улада княжацкая.
Павялася крыўда над людзьмі,
што раней вольна жылі!
Стала княжацкаю зямля
Разам з лесам, разам з рэкамі, азёрамі...
Так з карысці княжай на сялян
І прыгон самы паўстаў!
І хоць князьмі цэрквы богу будаваліся,
Не было літасці княжай да аратых!..
Угнявілі, відаць, людзі Спаса з Прачыстаю,
І паслана была кара на зямлю нашую...
Па знішчэнні Кыява й Чарнігава
Пачалося найсце татарскае на Слуцак наш...
А вёў татараў на тутэйшую Русь
Купец-здраднік тураўскі...
Князь жа Андрэй Случэскі
Да цесця ў Мінск падаўся...
І калі б дзяцінец-замак Слуцкі
Не Мураш-майстар будаваў,
І калі б абарону яго
Не ваявода Пуцята трымаў,
Быць бы тады бядзе немінучай –
Загінулі б слуцкія людзі!..
Падступілі да сцен дзяцінца ворагі –
Тучай шлюць татары стрэлы доўгія...
А ў адказ ім нашы з самастрэлаў
Пасылаюць свае стрэлы жалезныя, калёныя,
Што нясуць смерць пэўную ворагу...
І хоць татараў ад сцен і адбілі,
Удалося ім пралом у браме зрабіць.
І хоць безліч татараў з таго палягло,
А замест іх новыя перліся...
Пачала тады слабнуць сіла случчан...
Ды якраз у той час Настася, жонка лучніка,
З дзіцем сваім на руках, з малым хлопчыкам,
А за ёю і маткі іншыя з малымі дзецьмі!
Да абаронцаў падышлі-заявіліся,
Імем дзяцей сваіх Наста з маткамі
Перамагчы ворага заклікаць сталі...
І цуд вялікі той час стаўся.
Дух абаронцаў ён узняў удзесяцёра,
А татараў дух з таго заняпаў...
І пагналі нашы ворага лютага
Аж да самага стану іх!
А назаўтра, падпаліўшы дамы горада,
Адышлі татары ад Случэска,
На захад далей пайшлі гвалтаўнікі...
Так Настася, жонка лучніка,
Родны горад уратавала ад ворага,
За што і памяць пра яе паміж нас
Засталася неўміручая!

Жанчына-легенда

Дома княгіні, князёўны ў святліцах
не чахлі –
Дзейсныя, мудрыя, цвёрдыя,
што камяні.
Вось адкуль з'явіцца сімвал
На фрэсцы, на кафлі –
Вобраз жанчыны з мячом вярхом
на кані.
Д.Бічэль-Загнетава.

Жыў у XVI ст. у Слуцку князь Сямён Алелькавіч. І была ў яго прыгажуня-жонка Анастасія. Яны кахалі адзін аднаго. Вера іх была аднолькавая — праваслаўная, мелі агульнага продка — Альгерда; абое ў дзяцінстве прайшлі праз цяжкае выпрабаванне — сіроцтва. Князь Іван Мсціслаўскі, бацька Анастасіі, памёр у 1483 г. Дзяўчынцы тады было не больш за дзесяць гадоў. Прыкладна ў такім жа ўзросце страціў свайго бацьку Міхала Алелькавіча яе будучы муж Сямён. Але смерць гэта была больш жахлівай. Князь Міхал быў прысуджаны да пакарання смерцю за ўдзел у змове супраць вялікага князя літоўскага, караля польскага Казіміра IV. Паклаў ён сваю галаву на плаху. Цудам удалося адмаліць-адплакаць Міхалавай жонцы Ганне Мсціслаўскай у Казіміра IV права на спадчыну сыну. Адшкадаваў кароль Сямёну Міхайлавічу Слуцк і Капыль, частку ўладанняў бацькі.

Да паўналецця сына ціха жыла княгіня-ўдава, памятала, што сям'я яе ў апале. Але надышоў час шукаць Сямёну нявесту. Знатных родаў на Белай Русі шмат. Ды трэба выбраць тую, адзіную, якая здолее зрабіць шчаслівым яе сына, якая ніколі не папракне бацькам-«здраднікам». Успом-

Наследие слуцкого края

ніла княгіня, што ў яе ёсць дзве юныя пляменніцы, дочкі нябожчыка-князя Івана — Ульяна і Анастасія. Абранай Сямёна стала апошняя. Ніколі князь слуцкі не шкадаваў аб гэтым.

У 1492 г. у маладой пары нарадзіўся сын Юрый. Яго нараджэнне яшчэ больш прывязала мужа да жонкі.

Здавалася б, лёс прыгатаваў прыгожай Анастасіі ціхае сямейнае шчасце. Ды, пэўна, і ўвайшло б яе імя ў гісторыю толькі як імя адной з бязлікіх княжацкіх жонак, галоўнае прызначэнне якіх — працягваць род сваіх мужоў, калі б не варожая навала.

Гэта былі крымскія татары. Першая сутычка князя Сямёна Алелькавіча з імі адбылася летам 1502 г.

...Але гэта быў толькі пачатак. 30 жніўня гэтага ж года сын крымскага хана Баты-Гірэй прывёў шасцітысячнае войска да Слуцка. Татары ўзялі горад, але замак, у які кінуліся ратавацца случчане, вытрымаў іх штурм. Татары папалілі і разрабавалі наваколлі Слуцка, Капыля, Койданава, Клецка і Нясвіжа і з багатай здабычаю вярнуліся ў Крым.

Ці не пасля гэтых падзей маладая слуцкая княгіня загадала збройніку выкаваць ёй кальчугу?

Зіма і вясна прайшлі ў напружанай падрыхтоўцы. Інтуіцыя не падманула: новы татарскі набег адбыўся наступным летам. Ворагі палілі Нясвіж, Клецк і Наваградак. Асобныя атрады іх накіраваліся да Мінска і Лагойска. Раптоўна трохтысячны атрад з'явіўся пад Слуцкам. Тут усё было загадзя падрыхтавана для адпору. Праўда, князь Сямён быў у ад'ездзе. Яго месца заняла Анастасія. К.Тарасаў, аўтар кнігі «Памяць пра легенды», піша: «Слуцкая княгіня Анастасія, жонка Сямёна Міхайлавіча, сама ўзначальвала абарону горада і, надзеўшы даспехі, вывела полк супраць татараў у поле».

Быццам былінная Настасся Мікулічна, яна адкінула ворагаў ад свайго горада. А за Прыпяццю, каля Давыд-Гарадка, іх дагнаў падаспеўшы князь Сямён і, як піша летапісец, «идеже погромиша их и полон отъяша».

Заваёўнікі баяліся халадоў, таму набегі свае рабілі летам. Ці не таму палюбіла Анастасія зіму? У гэты час ёй ніхто не перашкаджаў кахаць мужа, выхоўваць сына. У адзін са спакойных месяцаў свайго жыцця слуцкая княгіня нарадзіла другое дзіця, якому далі ваяўнічае імя Аляксандра.

У сярэдзіне жніўня 1505 г. стары знаёмы Баты-Гірэй зноў наведаўся «ў госці» да случан. М.Ткачоў у кнізе «Замкі і людзі» так апісвае гэтыя падзеі: «...Жыхары, атрымаўшы звесткі пра паход татар, добра падрыхтаваліся да абароны. Яны адбілі некалькі штурмаў. Татары рабілі падкопы, спрабавалі ўзарваць умацаванні і падпаліць горад, але жыхары мужна абараняліся. Як адзначалася ў Іпацьеўскім летапісе, «и хотяху татаре взяти Случеск и не могоша, биша бо их из града крепко».

Баты-Гірэй вымушаны быў зняць асаду. Нарабаваўшыся, татары вярнуліся ў Крым. На гэты раз яны пакінулі пасля сябе не толькі разбураныя гарады і вёскі, але і страшную хваробу. На землях Белай Русі ўспыхнула эпідэмія, якая забрала шмат людзей. Захварэў і князь Сямён. Не дапамаглі ні маленні, ні знахарскае майстэрства. Анастасія аўдавела. Усе справы Слуцкага княства лягліна яе плечы, бо сын, спадчыннік Алелькавічаў, быў зусім дзіцем. Будучы яшчэ ў жалобе, княгіні давялося адбіваць чарговы напад татар у ліпені 1506 г. На гэты раз Баты-Гірэй прыйшоў не адзін, а з братам, перакопскім царэвічам Бурнашом. Дваццацітысячнае войска татар неаднаразова хадзіла на штурм, «подметы чинечи и огонь подкладаючи». Са сцен асаджанага Слуцка ўдава князя Сямёна, адзетая ў даспехі, кіравала абаронай. І зноў татары адышлі ні з чым.

Мужнасць і адвага слуцкай княгіні ўразілі яе сучаснікаў. А князь Глінскі нават захапіўся ёю. Звязаць жыццё з яшчэ даволі маладой, прыгожай жанчынай, якая б падзяліла з ім яго славу, было даволі прыцягальна для не маючага жонкі князя Міхала. Да таго ж уладалюбівага Глінскага п'яніла думка пра тое, што ў выпадку згоды абшырныя землі Слуцкага княства пяройдуць яму ва ўладанне. Са слуцкай крэпасцю ў Глінскага былі звязаны і іншыя планы: яму патрэбна была такая цвярдыня, каб выкарыстаць яе ў абарончых мэтах падчас мяцяжу, які ён рыхтаваў супраць Жыгімонта I Старога. У 1508 г., будучы «праездам» у Слуцку, Міхал Глінскі, ужо мяцежнік, пасватаўся. Але яму адмовілі. Чым не задавальняла слуцкую княгіню яго кандыдатура — невядома.

Наследие слуцкого края

Даследчыкі выказваюць розныя меркаванні. Магчыма, Анастасія жадала захаваць вернасць мужу. Яе мог непакоіць і лёс сына, які страчваў усе правы на княства, калі б у яго з'явіўся малодшы брат ад айчыма. Верагодна і тое, што княгіню бянтэжыла паходжанне жаніха. Глінскі быў нашчадкам хана Мамая, сын якога — Мансур пасля паражэння на Куліковым полі ўцёк у Літву. Анастасія магла інстынктыўна адчуваць непрыязь да татар, нават беларускіх. Можа, адмова была выклікана нязгодай з дзеяннямі мяцежніка. Але хутчэй за ўсё Глінскі проста не падабаўся ёй як мужчына. Выходзіць жа замуж без кахання княгіня не жадала.

Як бы там ні было, але Глінскі адчуў сябе абражаным. Ён вырашыў адпомсціць і ўзяць Слуцк сілаю. Двойчы войска князя Міхала падыходзіла да Слуцка, брала горад, штурмавала замак, спрабавала запаліць умацаванні. Але без поспеху. Непрыступная для татар крэпасць не здалася і на міласць іх пераможца. Летапісы пра гэта распавядаюць так: «В сие лето Глинский некто в Литве много зла починил... и Слуцка хоте взяти под Анастасиею княгинею Симеоновою, но не може, только волость ея якоже Татаре поплени и Копыль, и Туров доста и Мозыр».

У гэтым жа 1508 г. недалёка ад Слуцка войска княгіні разбіла яшчэ адзін невялічкі атрад татар.

Час ішоў. Непрыкметна стаў дарослым сын Анастасіі Юрый. І яна перадала яму кіраванне княствам. Але характар у сына быў неспакойны. Маладая гарачая кроў клікала ў бітву. Ужо само слова «татары» дзейнічала на юнака, як чырвоны колер на быка. У 1511 г. Юрый б'е іх пад Кіевам, у 1514 г. — пад Оршай. Маючы ў душы трывогу за сына, княгіня Анастасія спрабавала ўтаймаваць яго, прывязаць да дома жаніцьбаю. Нявестай стала князёўна Алена Радзівіл. Але нават гэта не дапамагло. У часы доўгіх сынавых адлучак маці зноў прымала на сябе ролю слуцкай гаспадыні.

У 1521 г. татары ў апошні раз паспрабавалі авалодаць Слуцкам. Але развеяць міф пра яго непераможнасць ім так і не ўдалося. Гэта здарылася за чатыры гады да смерці княгіні Анастасіі.

Яна паспела яшчэ ўладкаваць лёс дачкі, выдала яе замуж за высакароднага князя, гетмана Канстанціна Астрожскага, удаўца, які ўрачыста абяцаў берагчы і любіць сваю маладую жонку. Гэта была бліскучая партыя для Аляксандры Сямёнаўны. Маці адчула, што выканала ў гэтым жыцці ўсё, што павінна была.

Яна адышла ў нябыт ціха і лагодна, як маюць шчасце памерці толькі людзі з чыстым сумленнем. Гэта быў 1524 г.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Маслянiцына І.А., Багдзяж М.К. Слава і няслаўе. Мн., 1995. С. 142—147.

Святло далёкай зоркі

...У Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы, справа ад алтара, стаіць свінцовая труна. На труне выбіты словы з Евангелля: «Шчасныя тыя, што плачуць, бо яны суцешацца». Тут пакояцца астанкі маладой і прыгожай жанчыны. У праваслаўныя святцы яе імя было занесена як імя святой. У гісторыю ж яна ўвайшла як апошняя прадстаўніца некалі магутнага магнацкага роду Алелькавічаў. Паданні захавалі для нас чароўны вобраз юнай красуні, што марыла пра ціхае жаночае шчасце і памерла, не зведаўшы яго ў поўнай меры.

Соф'я Слуцкая... Імя знаёмае і незнаёмае адначасова. Жанчына, лёс якой узрушае... Цікава, ці жадала калісьці сама Соф'я такой славы? Ці імкнулася да яе? Пэўна, не.

Маленькая дзяўчынка, дачка князя Юрыя Алелькавіча і прыгажуні Кацярыны Кішка, нарадзілася ў маі 1585 г. Вясновы Слуцк сустрэў гэту падзею царкоўным звонам і птушынымі спевамі. Здавалася, сама прырода дае добры знак нованароджанай. Хто мог думаць у той дзень пра бяду? Тым не менш яна здарылася вельмі хутка. У наступным годзе адзін за адным адышлі ў нябыт маладыя бацькі Соф'і. Шлюбу Юрыя і Кацярыны не споўнілася і года.

На тых часах Слуцкае княства і нават сам горад Слуцк былі падзелены на тры тэрытарыяльныя больш-менш роўныя часткі. У кожнай з іх уладарыў свой князь. Яны не сварыліся паміж сабой, яны даводзіліся адзін аднаму братамі. Гэтак перад смерцю распарадзіўся спадчынай іх

Наследие слуцкого края



Соф'я Слуцкая.

бацька. Ён не хацеў абдзяляць нікога з сыноў. Пасля смерці Юрыя Алелькавіча Соф'я адразу ж стала спадчынніцай трэцяй часткі родавага багацця. Але на працягу літаральна некалькіх гадоў паміраюць і дзядзькі Соф'і — Аляксандр і Ян-Сымон. Дзяцей у іх не было. І таму Соф'я ператвараецца ў самую багатую нявесту Вялікага княства Літоўскага. Праўда, нявесце ўсяго толькі шэсць гадоў. Але гэта не страшна. Хутка ў бок слуцкай спадчыннiцы, дакладней, у бок яе багацяў, пачынаюць накіроўвацца прагныя позіркі рыцараў Вялікага княства Літоўскага. Яны марылі «прыбраць да рук» слуцкія скарбы, распараджацца імі. Але да паўналецця Соф'і абавязак яе апекуна ўзяў на сябе Юрый Хадкевіч. Ён адвёз дзяўчынку ў Вільню, сам жа ад яе імя пачаў кіраваць Слуцкім княствам. Пагаворвалі, што пад час свайго апякунства Юрый Хадкевіч паклаў сабе ў кішэню нямала грошай са спадчыны няшчаснай сіроткі. Калі гэты чалавек памёр, шэфства над дзяўчынкай узяў яго брат Іеранім, які таксама не пазбягаў нажывы.

А як жа жылося маленькай Соф'і ў Хадкевічаў? Князёўна не мела да свайго апекуна ніякіх прэтэнзій наконт задавальнення матэрыяльных патрэб. Яна была апранута і сыта накормлена, аб яе здароўі клапаціліся лепшыя лекары княства, ёй нанялі лепшых настаўнікаў. Але побач з дзяўчынкай не знаходзілася нікога, хто б мог сагрэць сваёй любоўю сэрца сіроткі. Яна была пазбаўлена шчасця і шчырага, сапраўднага сяброўства. Хадкевічам было абыякава ўсё, што датычылася яе пачуццяў.

Магчыма, яшчэ тады Соф'я пацягнулася ўсёй душой да Бога, адзінага, які не адштурхнуў яе. Убачыўшы набожнасць дзяўчынкі, праваслаўныя святары зрабілі ўсё, каб развіць яе рэлігійныя пачуцці. Гэта давала пэўныя гарантыі ўсяму праваслаўнаму насельніцтву Случчыны, якое з усіх сіл супраціўлялася ўвядзенню на землях княства уніі.

Непрыкмета ляцелі гады. Соф'я падрастала і расцвітала непаўторнай, дзіўнай прыгажосцю. Цяпер ужо не толькі Слуцк, які, па ўспамінах сучасніка, маскоўскага дыпламата Карабейнікава, быў «города Менска больши и лутчи», а і Соф'іна краса станавілася для Хадкевічаў выгадным таварам. «Пакупніка» на яго апякун князёўны знайшоў самага вернага — князя Януша Радзівіла. Яго бацьку ён лічыў сваім лепшым сябрам. Жаніх быў маладым (дзевятнаццаць гадоў), выдатнага паходжання, прыемнай знешнасці. Свой клопат аб сіраце Іеранім паўсюль выстаўляў напаказ.

Князёўна пачала з нецярпеннем чакаць вяселля, якое павінна было адбыцца, як толькі яна стане паўналетняй. Становішча нявесты ўсё больш падабаецца ёй, бо Януш, зачараваны прыгажосцю юнай Алелькавіч, становіцца частым госцем у палацы Хадкевічаў. Яго галантныя заляцанні амаль зусім знішчаюць у душы Соф'і непрыемны асадак, выкліканы нярыцарскімі паводзінамі Хадкевіча перад заручынамі.

Але пакуль надышоў тэрмін вяселля, Іеранім пасварыўся з сябрам. Аб'ектам канфлікту стаў нейкі маёнтак, які Хадкевічу вельмі не хацелася ўключаць у спіс нерухомасці, што перадавалася нявесце ў якасці пасагу. Закончылася ж справа тым, што Хадкевіч рашыўся скасаваць заручыны. І зноў думкі Соф'і наконт яе ўласнага лёсу Іераніма не цікавілі.

Аднак Радзівілы былі зусім не тымі людзьмі, з якімі можна было б так абысціся. Яны рашуча заявілі, што не жадаюць адмаўляцца ад багатай і прыгожай нявесты, і падалі ў суд на Хадкевічаў. Рашэнне суда было на карысць Радзівілаў: Іераніма асудзілі да выплаты велізарнай няўстойкі, а ў выпадку адмовы — да пазбаўлення правоў і выгнання.

Гэта вельмі ўдарыла па гонары апекуна Соф'і. Вярнуўшыся ў свой палац пасля таго, як рашэнне суда было абвешчана, Іеранім Хадкевіч загадаў сваім людзям «спусціць з лесвіцы» Януша Радзівіла, які ў гэты час з'явіўся да Соф'і, каб даведац-

Наследие слуцкого края

ца, як яна ставіцца да выбрыкаў апекуна. Наказ Хадкевіча быў выкананы слугамі літаральна. Пасля такой абразы Радзівілы пачалі збіраць войска, каб сілаю захапіць Соф'ю. На заклік бацькі Януша, віленскага ваяводы і літоўскага гетмана Крыштафа Радзівіла Перуна, адгукнуліся тры сыны Канстанціна Астрожскага, смаленскі ваявода Абрамовіч і шмат шляхціцаў. Сабралася шасцітысячнае войска.

Хадкевіч рыхтаваўся да абароны. Яму ўдалося сабраць 1600 вершнікаў і 600 пехацінцаў. З такім войскам яго ўжо не палохала перспектыва ўзброенай сустрэчы з Радзівіламі. Бо віленскае жытло Іераніма можна было пры неабходнасці з поспехам выкарыстаць ў якасці крэпасці. Адбіцца ад ворагаў насельнікам палаца дапамаглі б таксама і гарматы. Іх было ў Іераніма ажно дваццаць чатыры. Віленцы ў тыя дні жылі як на парахавой бочцы. Усё Вялікае княства Літоўскае з нецярпеннем чакала, чым жа закончацца гэтыя падзеі. Кароль сур'ёзна занепакоіўся. Да ўдзельнікаў віленскай драмы былі накіраваны яго паслы. Кароль заклікаў ваяўнічых магнатаў да міру, але голас цвярозага розуму быў не пачуты.

Перад пагрозай унутранай вайны ў дзяржаве здолелі знайсці агульную мову нават дзеячы розных рэлігійных канфесій, якія варагавалі. Так, напярэдадні падзей уніяцкі мітрапаліт Іпацій Пацей піша ліст настаяцелю Слуцкага праваслаўнага манастыра Ісаю Сабалеўскаму. У лісце гэтым ён заклікае слуцкае духавенства шчыра маліцца за мірнае вырашэнне Віленскай справы і нават прапануе сумесны трохдзённы пост.

Калі ўсё было падрыхтавана да бітвы, здарылася нешта дзіўнае. Вопытны палкаводзец Радзівіл Пярун раптоўна скамандаваў адступленне, так і не пачаўшы ваенных дзеянняў.

Гісторыкі згодны бачыць тут воінскую мудрасць. Радзівіл быццам бы адчуў, што пры такім раскладзе сіл перамога будзе не на яго баку. Ён улічыў таксама і тое, што яму будзе даволі цяжка развярнуць сваё войска на вузкіх вуліцах Вільні і, відаць, таму не захацеў дарэмна губіць цвет рыцарства Беларусі.

Людзі веруючыя трактуюць падзеі інакш. Юнай князёўне Соф'і, чыстай і добрай дзяўчыне, здавалася брыдкай нават сама думка пра тое, што з-за яе адбудзецца кровапраліцце. Яна звярнулася да Бога са шчырым маленнем і прасіла ва ўсявышняга альбо абразуміць тых, хто імкнецца з-за яе пасагу да забойстваў, альбо паслаць ёй смерць. Бог пачуў гэта маленне, і войскі Радзівілаў пакінулі Вільню. Мала таго, Іеранім Хадкевіч і Радзівіл Пярун здолелі, урэшце рэшт, дамовіцца паміж сабою. Па гэтай дамоўленасці Соф'я становіцца жонкай Януша, а Радзівілы абяцалі не прад'яўляць прэтэнзій гэтаму сямейству наконт грошай Соф'і, прысвоеных яе апекунамі раней. Каму дастаўся маёнтак, з-за якога і разгарнуўся канфлікт, — невядома.

Так у пагожы кастрычніцкі дзень 1600 г. апошняя прадстаўніца роду Алелькавічаў уручыла свой лёс маладому рыцару з роду Радзівілаў.

Дарэчы, перад шлюбам яна таксама здолела выставіць жаніху пэўныя ўмовы. Соф'я пажадала, каб яе дзеці, калі Бог дасць іх, былі хрышчаны ў праваслаўе. Дзяўчына вельмі талкова растлумачыла сваё патрабаванне. Род Алелькавічаў заўсёды быў аплотам праваслаўнай веры на Беларусі. Пакуль жывы хаця б адзін прадстаўнік роду, яго духоўная спадчына павінна захоўвацца. Слава Алелькавічаў, якія не здрадзілі адноймы абранай веры, павінна перайсці пасля Соф'і яе дзецям. Януш Радзвіл згадзіўся на такія ўмовы.

...Як жа склалася сямейнае жыццё Януша і Соф'і?.. Адразу пасля шлюбу малады муж накіраваўся на шведскую, а пазней — на маскоўскую войны. Такім быў яго рыцарскі доўг перад каралём і радзімай. Доблесці, праяўленай Янушам Радзівілам на ваеннай ніве, прысвечана паэма яго сучасніка, лацінамоўнага беларускага паэта Саламона Рысінскага «Кірмпенстум».

...А што ж Соф'я? Соф'і даводзіцца падоўгу заставацца адной. Княгіня прысвячае ўсю сябе дабрачыннай дзейнасці. Здаецца, ёй дастаўляе асабістую радасць раздаваць грошы бедным, дапамагаць хворым, апекаваць ганімых адзінаверцаў. Яна шмат ахвяруе на праваслаўныя манастыры і храмы, матэрыяльна падтрымлівае царкоўныя брацтвы, пачынае будаўніцтва некалькіх бальніц для бедных, робіць паломніцтвы па святых мясцінах. Слуцкія цэрквы атрымліваюць ад Соф'і некалькі шыкоўных залатых рыз. Іх княгіня вышывае ўласнымі рукамі.

Наследие слуцкого края

У сваіх маленнях Соф'я просіць Бога хутчэй закончыць вайну, у якой вымушаны прымаць удзел і яе муж. І каб вярнуліся ўсе воіны да сем'яў. Яна бачыць вакол сябе ганенні на праваслаўных беларусаў. Бачыць, як гвалтоўна людзей адной з ёй веры робяць уніятамі. Як у былых храмах незалежнай беларускай царквы пачынаюць весці службу па новай модзе і гэтым пазбаўляюць храмы душы. Соф'і становіцца страшна ад адной толькі думкі, што такі гвалт могуць учыніць і над яе Случчынай.

І кволая маладая жанчына вырашае абараняць да апошняга тых, хто даверыўся ёй. Не, яна не стала бязвольнай лялькай у руках палітыкаў ад духавенства. Яна асэнсавана выбрала свой шлях.

У адзін з кароткачасовых прыездаў мужа Соф'я шчыра дзеліцца з ім сваім болем. Словы яе выклікалі здзіўленне. Аказваецца, Януш зусім нічога не ведае пра духоўныя запатрабаванні сваёй жонкі. Яму ўяўляецца там, на полі бою, што ў родавым палацы яго чакае сціплая, ціхая істота.

Але Соф'я — асоба, сапраўдны палітык і гатовы дыпламат! Януш пачынае ганарыцца сваёй жонкай. Ён абяцае Соф'і зрабіць усё, каб дабіцца каралеўскага рашэння аб забароне гвалтоўнага далучэння случкіх праваслаўных да уніі.

Януш Радзівіл быў рыцарам, словы якога не разыходзіліся са справамі. І хутка Соф'я атрымала каралеўскую грамату, юрыдычны дакумент, які абараняў правы яе адзінаверцаў.

Ці не з гэтых часін яна адчула ўсю паўнату свайго кахання да Януша? Ці не ў час гэтага духоўнага адзінства Соф'і і яе мужа маладая княгіня адзначыла для сябе, што няма на зямлі большага шчасця?

Неўзабаве да першай радасці далучылася другая: Соф'я адчула, што хутка стане маці. З якім спадзяваннем насіла яна пад сэрцам гэтае дзіця кахання! З нецярпеннем чакаў з'яўлення яго і Януш. Але не было дадзена лёсам здзейсніцца гэтым спадзяванням. 19 сакавіка 1612 года княгіня памерла, нарадзіўшы нежывое дзіця.

Увесь Слуцк аплакваў добрую сваю гаспадыню, князь быў няўцешным.

Апошнюю з роду Алелькавічаў пахавалі ў Слуцкім Свята-Троіцкім манастыры. Хутка сярод гараджан папаўзлі чуткі пра дзівосы, якія быццам бы адбываюцца ля труны Соф'і. Няшчасная нябожчыца, якая і сама пры жыцці была хваравітай, пасля смерці стала пазбаўляць ад хваробаў іншых жанчын. Цуду ахвотна паверылі, бо памяталі, як слабой Соф'і ўдалося зрабіць для Слуцка тое, што не кожнаму мужчыне было пад сілу. Але кананізавалі слуцкую княгіню значна пазней, пасля Вялікай Айчыннай вайны. Гэты акт быў сімвалічным, бо ім царква прызнала заслугі перад Богам усяго роду Алелькавічаў, які на працягу стагоддзяў, па сутнасці, быў сям'ёй рыцараў праваслаўя. Апошнім з рыцараў гэтых была кволая жанчына. Яна адышла ў нябыт, завяршаючы справу, пачатую яе продкамі. Апошняя зорка ў сузор'і Алелькавічаў згасла, але так, што святло яе назаўсёды засталося ў чалавечай памяці.

Друкуецца па кн.: Маслянiцына І.А., Багадзяж М.К. Слава і няслаўе. Мн., 1995. С. 173–180.

Да Слуцка

Родны мой горад, ты
слаўны са слаўных
У небе паўночным.
Ты Радзівілаў князёў
дыядэма,
Ты гонар і іх
прыгажосць.
Слуцк, ты багаты
на золата і ўраджаі.
Для гарадоў жа
суседніх —
Сапернік адзіны ты ёсць.
Сад ураджайны,
карміцель багоў
дабрачынны,
Правадыроў пералічым
тваіх,
Святы абавязак кіруе
тваімі сценамі...
Слуцк, пераўзыйдзеш
сябе прыгажосцю
Сваіх перамог.

Аляксандр Бянецкі,
вучань Слуцкай гімназіі.
Слуцк. 1625 г.

(Верш быў напісаны на лацінскай мове)

Фонды Слуцкага краязнаўчага музея.

Наследие слуцкого края

Дакументы сведчаць

ГРАМАТА КНЯЗЯ МІХАІЛА АЛЯКСАНДРАВІЧА БАЯРЫНУ ВАСІЛІЮ ЦАРУ НА ПРАВА КУПЛІ МАЁНТКА ДЛЯ ПЕРАДАЧЫ Ў ДАР МАНАСТЫРУ СВ. ТРОЙЦЫ Ў СЛУЦКУ

20 сакавіка 1445 г.

Мы, кн. Михайло Олександрович, произволили есмо боярину нашему пану Василью Царю купити дворец Ивашка Гридковича на Локней, его купленину, и, купив тот дворец, придати святей троици у Слуцку; а на то есмо дали десь наш лист с нашею печатью, вечно и непорухомо.

Дан у Копыли марта в 20 день.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 124.

КОПІЯ ВЫПІСІ АБ ПАДЗЕЛЕ 6 ЛІПЕНЯ 1528 г. ПАМІЖ БРАТАМІ ЮРЫЕМ, ЯНАМ-СЫМОНАМ (СЯМЁНАМ) І АЛЯКСАНДРАМ АЛЕЛЬКАМІ

Раздел совершен между братьями с согласия матери их Екатерины Тенчинской.

Юрий получил: верхний и нижний замок Слуцк и Старое Место; дворы: Ивань, Еловский, Погост, Метявичи, Вына, Заушичи, Прусы, Целевичи, Беличи, Красный; волость Березницкую с Монастырем Морочским и им. в Городенском повете — Весна.

Ян-Сымон: — в Слуцке за рекой «Новое место» с двором при городе — «Новый Двор», двор Омговичи, волость Сковышинскую, Волотынскую и замок Копыль с местом и волостью; дворы: Тимковичи, Савичи, Скиепово, дворец Усово; Томицковичи, место Семеново, из имений Глушково и Дорошково и местечка Дороги получает половину.

В Гродненском повете — Личково.

Александр: в Слуцке получает «Остров» с замковыми селами: Шостаки, Брановичи и двор Басловцы и фольварок Грозово. Дворы: Старица и Свидымский, Быстрицу, Белевичи, Корупатвинский с местечком Себежевским: дворец Душова, Велешино, Еремичи: местечко Дубайское и Язиль и вторую половину имений: Глушкова и Дорошкова и двор Глуск. В Мозырском повете — волость и замок Петриково, двор Колно с местечком Ленином; волости: Добро-Деревскую и Юденовскую. В Ошмянском — Волко-лату. В Минском повете — Семеновичи.

Так как Слуцкий монастырь по воле покойного их отца должен был оставаться в общем подаваньи всех трех братьев, то после смерти теперешнего архимандрита наследники втроем подадуть монастырь новому архимандриту закона греческого, и так должно продолжаться вечно.

За монастырем остаются все угодия, данные ему предшественниками — Олельками.

Также за римско-католическим костелом в Слуцке оставлены все привилегии и побавать его плебанам впредь будут князья все вместе.

Право подаванья монастыря св. Илии и соборной замковой церкви принадлежит Юрию, но все привилегии, обременяющия в их пользу части других братьев, остаются в силе по старому.

На Киево-Печерский монастырь будет отчисляться с Слуцкага мыта по 50 к. грошей лит. ежегодно, т. е. по 16 к. 40 грошей с доли каждого брата.

А когда аренда мыта, находящаяся теперь у евреев, кончится, то ее отдадут мещанам Слуцким, при чем оговорено, что в случае общественных бедствий арендаторам мыта — мещанам, будет сделана уступка.

Касательно шпиталя в «Острове» сделан следующий договор: Юрий будет платить ежегодно на содержание его 50 к. грошей, Семен и Александр будут в натуре давать определенное количество ржи, крупы и проч. Старшаго в шпиталь будут назначать князья по взаимному соглашению.

Три мельницы в Слуцке поделены между тремя братьями с подробными оговорками, как каждый из них должен пользоваться водой, балластом и правом рыбной ловли, чтобы не причинять друг другу вреда.

Пристань с местечком на Немане — «Пясочное» остается в общем владении трех братьев.

В конце в извлечении приведен инвентарь Слуцкий, в котором упоминается, где какие

Наследие слуцкого края
Сайт, посвященный истории Слуцкого

службы находились, так в селах: Пасека, Осовец, Пласток, Тябусы были плебанский службы; в Пуховичах, Редковичах, Шипелевичах, Яминском, Вехшиковичах Тройчанского монастыря: в Терушкове — Ильинскаго: в Мелешкове — Морочанскаго монастыря.

Минская старина (Трайчанский архив). 1913. Вып. 4. Т. XXIV. С. 4—5.

ПІСЬМО КАРАЛЯ СТАФАНА БАТОРЫЯ КНЯЗЮ ЮРЫЮ СЛУЦКАМУ АБ ПЕРАДАЧЫ БАБРУЙСКАГА ПРЫКАМОРКА МІНСКАЙ МЫТНАЙ КАМОРЫ Ў РАСПАРАДЖЭННЕ ЗЕМСКАГА ПАДСКАРБІЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЛАЎРЫНА ВОЙНЫ

14 красавіка 1577 г.

Стэфан... [Т] кн. Юрю Юрьевичу Олелковича Слуцкому, што перво сего в року, прошлом 1576, будучы есмо у Кнышине а обмышлеваючы пилные потребы Речи Посполитое, панства нашого Вел. кн. Лит., жебы ся завжы слушне отправовати могли з зданьем и намовами некоторых панов — рад нашых того ж панства Вел. кн. Лит., на он час при нас, г[оспо]д[а]ры будучых, мыто новое от товаров людей купецких, через короля е. м. славное памети Жикгимонта-Августа, продка нашого, постановленое, ку скутку прыводячы, в оном панстве нашом Вел. кн. Лит. от людей купецких брати есмо расказали, и то з одного з мытом з старым звыклым подскарбему земскому Вел. кн. Лит., писару нашому, старосте пиньскому, державцы олитскому и квасовскому, пану Лаврыну Войне в справу е. м. дали и поручыли, где ж водле воли и постановенья нашого, г[оспо]д[а]рского, тое мыто новое и старое вжо на иных всих коморах мытных через справец пана подскарбего земского порадком своим отправуеться. Толко маем того ведомость, иж врадник твоей м[и]л[ос]ти бобрыйский воли и постановенью нашому г[оспо]д[а]рскому спротивенье чынечы, у Бобруйску пры коморку, мытного, который там здавна до коморы меньское ест постановлен, справцам пана подскарбего земского ешо и до сих мест не поступуеть и того мыта нового, также и старого от людей купецких выбирати там не допускаеть, а к тому дей справу мытную собе своволне прывлашчаючы, купцов сам отправуеть; зачым ся не толко скарбу нашого великая дееть, ам и потребы жилные речы посполитое, которые ся с приходу того мыта нового отправовати постановили, в затрудненье и омешканье немалое прыходять. Што мы, уважаючы такового спротивенья, врадников твое м[и]л[ос]ти, которые ся в той справе над вомо и расказанье нашое г[оспо]д[а]рскую показають, з ласкою нашою г[оспе]д[а]рскою прыймовати не можем и не хотечы болше шкоды скарбу нашого терпети, напоминаем и приказуем; аж бы твое м[и]л[ос]ть через то тому, што ся от нас, г[оспо]д[а]ра, с порадаю и намовами панов-рад нашых их м[и]л[ос]ть с потребы Речы Посполитое постановило: спротивенья никоторого не чынечы, у Бобруйску прыкоморок мытный, до коморы меньское належачый, справцам пана подскарбечо земского поступили и мыта нашы новое и старое там от вшеляких товаров людей купецких подлуг уставы нашое выбирати и всякое в том шкоды скарбу нашого постерегати, а людей купецких, которые бы не оповедавшыся на коморах мытных и не заплатившы от товаров своих мыт наших, без мыт не упором либо потаемне проездчаючы, справцам пана подскарбечо земского товары их гамовати и упромыту на нас забирати допускати велел; и на то помочы вшелякое водле звыклого в том обычаю додавати казал, вед же штобы твоя м[и]л[ос]ть в справы мытные врадником своим ничым ся устоповати и переказы в том некоторое, яко во властной Речи нашой и пожытку земского чынити не велел для ласки нашое г[оспо]д[а]рское.

Писан у Вроцлавку лет[а] бож[его] нарож[еня] 1577 м[еся]ца апреля 14 дня.

Подпис руки г[оспо]д[а]рское.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 157—158.

ДУХОЎНАЕ ЗАВЯШЧАННЕ КНЯЗЯ СЛУЦКАГА ЮРЫЯ ЮР'ЕВІЧА АЛЕЛЬКІ

15 кастрычніка 1578 г.

Тризна предъявила от имени княгини Слуцкой, урожденной гр. Тенчинской, воеводзянки Краковской, вдовы Юрия Юриевича, духовное завещание ее покойного мужа — у нее осталось три сына: Юрий, Семен и Александр. Покойный завещает: 1) похоронить его по православному обряду в Киево-Печерском монастыре, где лежит прах его предков.

2) Ввиду малолетства детей, все имущество передается вдове, которая со временем им и

Наследие слуцкого края

распорядится согласно его воли. (У Слуцких были имения в Литве, «отчистые и матерынскіе» волостями, шляхтой с панцерными боярами, слугами путными, людьми куничными и тяглыми, со всеми вещами ... нажитыми. Слуцкие же владели имениями и в Короне).

3) Сыновей — вдова должна сейчас же отправить за границу для получения, необходимого, людям высоких домов, рыцарского воспитания. К ним должен быть приставлен человек честный, умелый и бывалый. Заграничное воспитание должно продолжаться 2—3 года.

4) Жениться сыновья не должны без согласия матери.

5) По достижении совершеннолетия сыновья должны поделиться следующим образом:

Старший — Юрий получить: замок Слуцкий со Старым городом и им. Иванъ.

Семен — Новый город Слуцк (Заречье с им. Новый Двор под Случью).

Александр — Новый город «Островъ» и двор Новоостровский.

Мыта же со всех городов, как великое — главное, горелочное, мясное, делятся на три равные части и распределяются между 3 сыновьями.

Остальные же имения записываются вдове, т. к. Юрий Юрьевич получил за нею в вено 50 т. зл. пол., т. е. 20 т. коп. грошей лит., а так как Екатерина была всегда хорошей женой, то завещатель прибавляет к этой сумме еще 10 т. зл. пол., т. е. 4 т. коп. гр. лит., и эту сумму записывает на имениях, перешедших к нему от Семена Юрьевича в повете Бельском, на Турце, старом Селе, на Ионвах и Скирмунтове в повете Минском.

Кроме того вдова получает в Слонимском повете им. Озерищи, Ближняя и Промеж в Ковенском, так как эти имения пришлись Слуцким от Горностаевой, дочери Тенчинской.

6) Вдову же свою Олелько поручает опеке Острожского, Вишневицкого и Кишки.

7) Дети, под страхом отеческого проклятия, должны всегда оставаться верными православию. При нарушении воли завещателя, лишаются права на наследство.

8) Служащим по смерти князя должно быть распределено 1000 коп. грошей.

Писано в Новом дворе, 1578 г. 15 Октября.

Минская старина (Трайчанский архив). 1913. Вып. 4. Т. XXIV. С. 2—3.

Гісторыя невядомага партрэта

...У XVI ст. мясцовымі майстрамі былі створаны партрэты слуцкіх князёў. На жаль, не ўсе яны дайшлі да нашага часу. Яшчэ ў пачатку XX ст. у Слуцку захоўваліся (спачатку ў Троіцкім, потым у Івана-Багуслаўскім манастыры, пераведзеным з Грозава) партрэты некалькіх князёў Алелькавічаў (у тым ліку ўсіх апошніх з гэтага роду). Фотаздымкі партрэтаў Алелькі Уладзіміравіча і Юрыя Юр'евіча былі змешчаны ўпершыню ў кнізе «Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края» (СПб., 1890).

У нацыянальным музеі ў Варшаве пад інвентарным нумарам 128854 захоўваецца невядомы дагетуль у Беларусі партрэт слуцкай княгіні Кацярыны, выкананы алеем на палатне. Подпіс пад партрэтам: «Слуцкая Катажына з Тэнчынскіх, нарадзілася каля 1545 г. Нявызначаны польскі мастак 2-й пал. XVI ст.».

Слуцкая княгіня Кацярына, аб якой ідзе размова, паходзіла з даўняга польскага магнацкага роду графаў Тэнчынскіх, прадстаўнікі якога займалі высокія пасады ў Польшчы. Напрыклад, бацька Кацярыны Станіслаў Тэнчынскі быў ваяводам кракаўскім. Нарадзілася Кацярына ў 1544 г. У 14-гадовым узросце яе выдалі замуж за слуцкага князя Юрыя Юр'евіча, хоць яна была каталічка, а ён праваслаўны (гэта часта здаралася сярод магнатаў). У наступным годзе яна нарадзіла першага сына, Юрыя, потым яшчэ двух — Сымона і Аляксандра.

Праваслаўныя слуцкія князі займалі адно з першых месцаў у дзяржаве дзякуючы свайму багаццю і паходжанню. Мужу Кацярыны кароль Стэфан Баторый даў месца ў сенаце Рэчы Паспалітай. Такім чынам, княгіня Кацярына належала да вярхоў пануючага класа.

У 1578 г. князь Юрый Юр'евіч Алелькавіч памёр, і ўдава распараджалася княствамі і іншымі маёнткамі да паўналецця сваіх сыноў. Муж па тастаменту пакінуў княгіні 60 тыс. злотых і ў пажыццёвае ўладанне маёнткі Турэц (Навагрудскі павет), Старое Сяло, Тонвы і Скірмантава (Мінскі павет), а таксама маёнткі

Наследие слуцкого края



Слуцкая княгіня Кацярына. Партрэт невядомага мастака. 1580 г.

ў Бельскім павеце з ваеннаслужылай шляхтай, панцырнымі баярамі, путнымі слугамі і сялянамі (чыншавымі і прыгоннымі). У 1579 г. удава атрымала ад караля яшчэ і багатае Магілёўскае староства.

У час, калі Ватыкан вёў у Літве і Беларусі шырокі наступ, каб акаталічыць насельніцтва, вядомы езуіцкі прапаведнік Пётр Скарга па даручэнні агента рымскага папы Пасевіна прыехаў у Слуцк да княгіні з лістамі ад папы Грыгорыя XIII і ўгаварыў яе перавесці ў каталіцтва сыноў, каб лягчэй было акаталічваць насельніцтва Слуцкага княства. Два малодшыя сыны Кацярыны выехалі ў Рым, дзе і перайшлі ў каталіцтва. Адзін з іх, Аляксандр, у 1580 г. вучыўся ва універсітэце ў баварскім горадзе Інгальштаце. Толькі старэйшы сын Юрый застаўся праваслаўным.

У 1581 г. 37-гадовая багатая ўдава выйшла замуж таксама за багатага ўдаўца, але маладзейшага за яе, гетмана польнага літоўскага, князя Крыштафа Мікалая Радзівіла (1547—1603), які ажаніўся ўжо трэці раз. Радзівіл неўзабаве стаў віленскім ваяводам і вялікім гетманам літоўскім. Княгіня Кацярына мела другім шлюбам яшчэ дваіх дзяцей. Яе сын Крыштаф Радзівіл (1585—1640) быў таксама вялікім гетманам літоўскім, а дачка выйшла замуж за вядомага дзяржаўнага дзеяча Льва Сапегу. Памерла княгіня Кацярына 19 сакавіка 1592 г. у Вільні ва ўзросце 48 гадоў...

Партрэт Кацярыны вытрыманы ў цёмных тонах. Слуцкая княгіня паказана амаль у поўны рост, у багатым і адначасова строгім удовіным адзенні, з вуаллю, крыху спушчанай на твар. Каштоўнасцей амаль няма, толькі пярсцёнкі на пальцах. Мастак пісаў парадны партрэт удавы. На твары княгіні — не толькі смутак, але і гонар, стрыманасць, уладнасць, ганарыстасць. Падкрэслены выпешчаныя рукі, тонкія пальцы арыстакраткі.

На падставе біяграфіі жонкі беларускага магната можна даволі дакладна вызначыць час напісання партрэта — паміж смерцю першага мужа і другім замужжам, г.зн. ад канца 1578 г. да сярэдзіны 1581 г. І лацінскі надпіс на карціне гаворыць: «Год пански 1580. Кацярына, графіня з Тэнчына, божай міласцю княгіня слуцкая, свайго ўзросту 35 гадоў».

Праўда, на карціне княгіня Кацярына мае выгляд больш чым на 35 гадоў. Але адзенне ўдавы і смутак на твары стараць яе. Да таго ж у XVI ст. жанчыны рана выходзілі замуж і рана старыліся.

...Можна з упэўненасцю сказаць, што партрэт 1580 г. быў выкананы ў Слуцку. З дакументаў відаць, што княгіня ў тым годзе не выязджала са Слуцка і займалася справамі па кіраванні княствам, у той час як малодшыя сыны былі за мяжой, а старэйшы — на вайне. Можна таксама з пэўнай доляй верагоднасці меркаваць, што аўтарам партрэта быў адзін з мясцовых, беларускіх мастакоў, паколькі пры дварэ слуцкіх князёў тады складвалася традыцыя маляваць партрэты ў рэалістычным стылі.

А.П.Грыцкевіч.

Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1976. № 3. С. 25—26.

Наследие слуцкого края

З дыярыуша Еўлашоўскага

Еўлашоўскі (Еўлашэўскі) Фёдар Мікалаевіч, беларускі грамадскі дзеяч і пісьменнік канца XVI – пач. XVII ст., пакінуў з літаратурнай спадчыны дыярыуш — самы ранні помнік мемуарнага жанру ў беларускай літаратуры гэтага часу. Друкуюцца асобныя ўрыўкі, якія тычацца Слуцка.

Року 78, того ж (1578. — *Рэд.*), в листопаде дня 9, в день недельный, умрал княже его милость Юрей Слуцкий, пре[з] велке богатства и скарбы собраные славный пан.

Року того ж 80... ... ... В Слуцку на тот час были 4 докторы: сандомирский Бартолян, краковский Мартин Фоксос, любелский Лаврэнцыуш, слуцкий, тэж старый и добрый. Там се веле панов, пань и розного стану люди были на лекарство зъехали. И яко кому пан бог здарил отправовалисе...

Року 1589, стычня 31... ... Того ж дня княже Семен Слуцкий короля витал пред покоем з орацыею наготованою, а яком ведял, от его милости пана Миколая Криштофа Радивила, воеводы троцкого, написанною. Мел при собе зэ двестя особ ланцужно, але у пана Александра было тэж нас также веле, а вшистко стары слуги ... сивцов болшей, в жалобе по паней виленской. Тэды кроль и панове болшей очи до нас обрацали и кролеви указовано, же то вшистко слудзы небожчика пана виленского, отца его. Аж нам мило было того щастя заживать, бо зкгола и пан и мы вшистцы зналисмы велкон милость од вшистских люди.

...В том року 1595 Наливайко, козак, собравши войско козаков, первей се указоввал на Подолю, у Волощех, кусилсе был и о турецке замки. Потом, врацаючисе до Полски, сплендровал маетности пана Калиновского, мстечисе за обешене некгдысь отца его наливайкового, и еще, снать, от отца Калиновского. Там же заюшоный, шедл до Луцка, в ярмарк, праве, где бискуп, с преднейшими шляхтою выехавши, упоминал и еднал кго за мястэм и купцами. И зложили килка тисячей злотых, а не могло быть без збытков и шкод.

Оттуль, юж лепей заюшоный, удался на Полесе аж до Петрыкович. Юж так своволне все починаючи и вколо обсылаючи, подарки собе давать заказуючы. Яко ж и давано. Одно з Слуцка помешкано было. И прето ж убекгл[у] Слуцк новэмбра 6 дня и был там немало. Заварлисе были на замку з двема сынами, детми малыми пана виленского Яронима Ходкевича. А пан виленский, воевода новгородский пан Скумин и инше панове и шляхта зъехалисе до Клецка. Не ведали, што почать, услышавши, же се и в замэк слуцкий [казакі] добыли юж.

В тым [часе] послал был Наливайко полковника Мартинка, о котором веле трымал, яко ж и был чловек сэрца велкекго, до Копыля с пентюсэт козаков. Которым с прикгоды там, потрафивши гайдуков их [міласці] пана воеводы виленского, впадши до млына и испусту под мястэм, бронили преештя до мяста и так спросне козаков настреляли, и Мартинка забили, же сила их на пляцу [засталося]. А иншие назад се цофнувши, по дродзе и хростох зоставили. А инше, постреленымі юж будучи, в огонь скакали и кгорели, бо были стайне дворовую тут, у того млынка будучую, запалили, же се барзо их мало до Слуцка вротило.

Наливайко, стрвожоный тым нещестем а розумеючи, же затым з Клецка зэбрани панове куситьсе мели, онь у Слуцку зараз тэй же годины, яко тых в Копылю бито, новэмбра 25, а он третего дня, новэмбра 27, з вечора выбравшисе з Слуцка до Омгович, знову ку Полесен вытегнул.

Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1990. С. 244, 247, 254, 255—256.

Паход Севярына Налівайкі на Беларусь

Таго году ўкраінскі казацкі атаман Севярын Налівайка з двухтысячным аддзелам хадзіў у багатыя землі Трансільваніі ды Малдавіі. Вяртаючыся, атаман павярнуў на ўладанні польскага канцлера Яна Замойскага ды спустошыў іх. За гэта Замойскі накіраваў на Налівайку вялікае войска рэестравых казакоў гетмана Рыгора Лабады. Вось тады, ратуючыся, Налівайка мусіў кудысьці ўцякаць. Узняўшы 7 тысяч казакоў, ён рушыў на Беларусь.

Ужо ў кастрычніку 1595 г. Налівайка заняў першы беларускі горад — Петрыкаў. Адтуль накіраваўся на Слуцк. Па

Наследие слуцкого края

шляху казакі ўсё рабавалі і чынілі гвалт. Атаман меў сувязь з маскоўскім паслом. Нарабаваўшыся, ён планаваў, відаць, сыходзіць у Маскоўскую дзяржаву.

6 лістапада Налівайка ўвайшоў у Слуцк. Як ён авалодаў гэтым горадам — дасюль застаецца загадкай. Захапіць такую фартэцыю казакам было не пад сілу. Найверагодней, нехта ім адкрыў гарадскую браму, бо Налівайка напісаў ліст мяшчанам, каб упусцілі ў горад.

Прастаяўшы тры тыдні, атаман садраў з мяшчан вялізную суму — 5 тысяч коп літоўскіх грошай, набраў дабра і, прыхапіўшы амаль увесь слуцкі арсенал (12 гармат, 80 гакаўніц, 700 ручніц), пакінуў горад. Казакі пайшлі на Амгавічы, адтуль накіраваліся да Бабруйска, але не дайшлі і павярнулі на багаты і блізкі да мяжы Магілёў...

У.Арлоў, Г.Сагановіч.
Беларуская мінуўшчына. 1995. № 2. С. 15—16.

Вызваленчая барацьба супраць феадалаў Рэчы Паспалітай

У вызваленчай вайне беларускага народа супраць феадалаў Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVII ст. прымалі ўдзел і сяляне прылеглых да Слуцка мясцін. Штуршком да пачатку масавага народнага руху ўлетку 1648 г. на Беларусі было паўстанне ўкраінскага народа супраць гнёту польскіх феадалаў.

Дзеянні казацкіх атрадаў, якія прыйшлі з Украіны, захапілі тэрыторыю паўднёвай і ўсходняй частак Беларусі. Паўстанцы ваявалі і каля Слуцка. Гараджане падтрымлівалі паўстаўшае сялянства. Але хваляванні ў самым горадзе не перараслі ў паўстанне, бо ў Слуцку адсутнічаў гарнізон.

23 жніўня 1648 г. вялікі казацка-сялянскі атрад падышоў да горада і спрабаваў узяць яго. Артылерыйскім агнём атакі былі адбіты. Атрад, узмоцнены сялянамі з прылеглых да Слуцка мясцовасцей, пачаў асаду горада. На чале паўстанцаў быў Іван Сакалоўскі, дробны беларускі шляхціц родам са Случчыны, які ўцёк раней да казакоў і быў прысланы Багданам Хмяльніцкім у Беларусь. У Слуцк для сувязі з жыхарамі горада і для дапамогі ім у падрыхтоўцы паўстання пракрадваліся разведчыкі казакоў. Становішча ў горадзе было напружаным, шырокія масы гараджан чакалі сігналу для выступлення.

Княжацкі намеснік у Слуцку Ян Сасноўскі папрасіў падмацавання ў гетмана польнага літоўскага Януша Радзівіла і падканцлера Казіміра Лявона Сапегі.

Гарадская беднота і сярэднія слаі мяшчан рыхтаваліся да выступлення. Але ў горадзе былі і іншыя групоўкі. Праваслаўнае духавенства і паны-мяшчане займалі хісткую пазіцыю, чакалі далейшага ходу падзей, хаця і ўдзельнічалі ў змове супраць княжацкага намесніка і ўлад.

У поўдзень 23 жніўня ў Слуцк прыбылі тры казакі-парламенцёры з пісьмом ад кіраўніка казацка-сялянскага атрада, што асаджаў горад, Івана Сакалоўскага, які называў сябе гетманам касцёрскім. Ён прапаноўваў слуцкаму намесніку добраахвотна ўпусціць казацка-сялянскі атрад у горад. За гэта казакі абяцалі адплаціць ласкай «хлеб за хлеб оддаты». Іван Сакалоўскі хацеў пазбегнуць страт у час штурму Слуцка.

Аддаўшы пісьмо Сасноўскаму, казакі-парламенцёры сустрэліся са слуцкім пратапопам і перадалі яму другое пісьмо. Адзін з казакоў пайшоў на рынак і сустрэўся з гараджанамі. Пры такіх напружаных абставінах Сасноўскі, чакаўшы падмацавання, уступіў у перагаворы з асаджаўшымі, сілы якіх налічвалі некалькі тысяч чалавек. Ваенныя дзеянні былі прыпынены.

У перагаворах прайшло некалькі дзён. Польны гетман літоўскі Януш Радзівіл (яго фігура выведзена ў рамане Г.Сянкевіча «Патоп» і ў аднайменным фільме) паслаў на падмогу асаджанаму гарнізону Слуцка чатыры харугвы (эскадроны). Акрамя таго, прыбылі яшчэ 6 эскадронаў конніцы. Гэтыя падмацаванні падышлі да горада ноччу патаемна, так што казакі і паўстанцы-сяляне не ведалі аб іх прыбыцці, а спачуваючыя паўстанцам гараджане не паспелі паведаміць ім аб гэтым.

Раніцай Сасноўскі аб'явіў казакам, што спыняе перамір'е і адмаўляецца весці далейшыя перагаворы. Тады казацкія кіраўнікі кінулі свой атрад на штурм

Наследие слуцкого края

гарадскіх умацаванняў. Першая атака асаджаючых, разлічваючы на хуткі поспех, была адбіта з вялікімі стратамі для іх: было забіта 600 чалавек. Другая атака таксама не прынесла поспеху. У трэці раз казакі і сяляне штурмавалі горад, схаваўшыся за вазы, якія перасоўвалі перад сабою (свайго роду штучныя рухомыя крэпасці). Але і гэта атака была адбіта гарнізонам. Казакі і сяляне пацярпелі вялікія страты, загінула больш за тысячу паўстанцаў. Потым Сасноўскі адчыніў гарадскую браму і кінуў на вылазку з горада 600 коннікаў, якія нанеслі значныя страты асаджаючым і прымусілі іх адступіць. Праследаванне казацка-сялянскага атрада прадаўжалася на працягу трох міль літоўскіх (літоўская міля — 7798 км). Нарэшце 3 верасня каля Пагоста (за 36 кіламетраў на поўдзень ад Слуцка) казацкі атрад быў прыціснуты да Случы і вымушаны прыняць бой у неспрыяльных умовах. У баі каля Пагоста загінуў кіраўнік атрада Іван Сакалоўскі (па другіх даных, ён быў цяжка паранены), быў забіты казацкі пісар вайсковы Турчыновіч. У баі загінула звыш 2 тысяч казакоў і сялян і было ўзята нямала палонных. Шляхецкія харугвы праследавалі паўстанцаў да Турава. Знявідзе асады Слуцка дало магчымасць феадалам выслаць атрады для падаўлення сялянскіх паўстанняў у княстве.

Гарадскія вярхі і праваслаўнае духавенства перасталі займаць хісткую пазіцыю і сталі актыўна супрацоўнічаць з феадаламі.

Друкуецца ў перакладзе з кн.: Г р и ц к е в и ч А.П. Древний город на Случи. Мн., 1985. С. 19—20.

В начале 1708 г. русские войска оставили Слуцк и ушли на восток. Войско Карла XII вернулось в Белоруссию. В январе —феврале 1708 г. в Слуцке разместились отряды союзника Петра I, литовского войска во главе с Князевичем. 5 марта ночью внезапно напало 15 полков литовского войска Крышпина, подчиненного королю Станиславу Лещинскому. Войско Князевича было наголову разбито, а сам он попал в плен. Слуцк был разграблен.

В апреле и мае 1708 г. город снова занят шведскими войсками. На жителей города наложена «вторая шведская контрибуция», которую шведы немедленно взыскали. Летом Карл XII пошел на Могилев, а оттуда на Украину, где 27 июня 1709 г. потерпел полное поражение под Полтавой.

Во время Северной войны население Слуцка понесло значительный материальный ущерб, хотя и не такой, как горожане многих других городов Белоруссии. Часть жителей Слуцка и Слуцкого княжества бежала за Днепр, под Киев, на Украину, особенно много в 1709—1710 гг.

Несмотря на разорение, в 1-й половине XVIII в. Слуцк оставался крупным по тому времени экономическим центром Белоруссии.

Друкуецца па кн.: Г р и ц к е в и ч А. П. Древний город на Случи. Мн., 1985. С. 23—24.

Аб знаходжанні цара Пятра I у Слуцку ў гады Паўночнай вайны

«...Отправляя армию к южным границам, Петр не имел деятельного плана компании. Составление его стало предметом забот конзилии, состоявшейся в Слуцке 12—13 апреля 1711 г. На военном совете присутствовало кроме Петра два военных (Шереметьев и генерал Алларт) и два гражданских лица (канцлер Головкин и посол в Польше князь Григорий Долгоруков). В соответствии с выработанным планом Петр велел Шереметьеву не позже 20 мая достичь Днестра, имея трехмесячный запас продовольствия. Указ Петра заканчивался словами: «Сие все исполнить, не отпуская времени, ибо ежели умедлим, то все потеряем».

* * *

«Немало невзгод на пути из Москвы в действующую армию выпало на долю царя, а также его спутников в апреле—мае 1711 г. Екатерина в письме Меншикову из Слуцка объясняла задержку ответа «злым пу-

Наследие слуцкого края

тем, которы... до здешнего места имели, так и за болезнию господина контр-адмирала». Кстати, болезнь «контр-адмирала», т.е. Петра, по заключению медиков, «случилась от студеного воздуха и от трудного пути».

То же самое сообщил и Макаров Ф.М. Апраксину, но уже в следующем отрезке пути. Кабинет-секретарь, как и Екатерина, оказался неисправным корреспондентом «ради двух причин: первое, что от злого пути нимало себе не имели времени, ибо от Слуцка до Луцка с 60 миль ехал, и не было такова дня, в которой бы по горло в воде на переправах не были», вторая причина — болезнь царя».


Друкуецца па кн.: Павленко Н.И. Птенцы гнезда Петрова. М., 1984. С. 79, 81.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

У канцы XVIII ст. Случчына ў выніку другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай адышла да Расійскай імперыі. Істотных змен, якія б маглі паўплываць на агульны ход народнагаспадарчага жыцця, не адбылося. Так было на працягу першага паўстагоддзя. Тое ж прыгоннае права, якое абаранялася цяпер усёй сілай магутнай дзяржавы, і значыць тое ж гаротнае становішча працоўнага люду, тая ж рабская праца на карысць памешчыкаў. Агульны фон гаспадарчага жыцця Случчыны нават пабляк у тое пяцідзесяцігоддзе.

Прымітыўнай заставалася «аграномія» сельскагаспадарчай працы, заснаваная на векавых забабонах: гарох можна сеяць у панядзелак, пятніцу і суботу, «каб яго не з'елі рамакі». Ведалі, што трэба сеяць на святую Ілью, што лён трэба сеяць у дзень святой Алены і г. д. Праўда, прагрэс прабіваў сабе шлях. Укаранялася трохпольная сістэма земляробства, у некаторых памешчыкаў Слуцкага павета пачалі дзейнічаць конныя заводы, развівацца танкарунная авечкагадоўля і гадоўля ўкраінскай буйной рагатай жывёлы.

Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі азначала ўсталяванне на гэтых мясцінах новага тэрытарыяльна-адміністрацыйнага падзелу. Былі ўтвораны Полацкая (з 1802 г. Віцебская), Магілёўская, Мінская і Гродзенская губерні. У сваю чаргу губерні падзяляліся на паветы, кожны прыблізна па 20—30 тыс. чалавек падатковага або рэвізскага насельніцтва. Паветы складаліся з валасцей. Дата ўзнікнення Слуцкага павета — 23 красавіка 1793 г. Ён займаў тэрыторыю сённяшніх Слуцкага, Капыльскага, Нясвіжскага, Клецкага, а таксама большай часткі Салігорскага, Ганцавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў.



План Слуцка. Канец XVIII ст.

Наследие слуцкого края

На Случчыне, як і ў час Рэчы Паспалітай, працягвалася прадваранская палітыка. У тое першае пяцідзесяцігоддзе ўласна шляхта падзялялася на ваколічную, чыншавую і неаселую. Ваколічная шляхта сялілася асобнымі засценкамі, адрубамі, валодала зямлёй і рэдка — сялянамі. Чыншавая, без сялян, арандавала зямлю ў памешчыкаў, дзяржавы ці духавенства. Неаселая шляхта займалася дробнымі промысламі, наймалася на гаспадарча-адміністрацыйныя пасады, батрачыла. Па свайму сацыяльна-эканамічнаму становішчу яна паступова збліжалася з працоўным сялянствам, страчвала былыя фармальна-юрыдычныя пазіцыі (вызваленне ад рэкруцкіх набораў, падушнага падатку і г.д.).

Асноўная маса памешчыцкіх сялян карысталася зямельным надзелам, які на рубяжы XVIII—XIX ст. складаўся прыблізна з дзвюх аднолькавых частак: цяглай і прыёмнай доляў. За цяглую сяляне адбывалі прыгон, за прыёмную — плацілі грашовы аброк. У



Герб Слуцка. 1795 г.

працэсе пашырэння фальварачна-паншчыннай гаспадаркі абедзве часткі надзелаў спалучаліся, і з сялян сталі спаганяць, у асноўным, адработачныя павіннасці.

Хоць памеры паншчыны фіксаваліся інвентарамі, памешчыкі пастаянна парушалі іх як у форме павелічэння падатковай павіннасці, так і ў форме ўскладання паншчыны на ўсё новыя катэгорыі насельніцтва. Гэта сустракала супраціўленне. Напярэдадні адмены прыгоннага права антыфеадальныя выступленні сялян адбыліся ў вёсках Агароднікі, Бранавічы, Варкавічы, Лучнікі, Сярагі, Падзеры. Яны завяршыліся толькі 7 лютага 1834 г., калі цар Мікалай I зацвердзіў рашэнне аб прызнанні жыхароў гэтых вёсак, так званых выбранцаў, вольнымі людзьмі, але павіннымі плаціць за карыстанне зямлёй чынш.

Сельская гаспадарка не забяспечвала селяніна Случчыны. Сялянская worная зямля не давала дастатковага збожжа для пракорму. Яго недахоп часткова пакрываўся бульбай. Вядома, пры такіх умовах самы нязначны неўраджай ставіў многіх вясковых жыхароў перад праблемай выжывання. Менавіта таму многія з іх ішлі зімой на дапаможныя заработкі. Галоўным з іх было возніцтва, потым нарыхтоўка дроў, лясных матэрыялаў, дубовай кары. Случане цяслярылі, будавалі баржы, займаліся пілаваннем лесу, вырабам гонты. Іншыя накіроўваліся арцелямі, з сякерай і рыдлёўкай, з убогім знешнім выглядам, часам за сотні вёрст у пошуках лепшай долі.

Імкненне да вызвалення ад прыгонніцкага ўціску ўсё больш станавілася адметнай рысаю сялянскага руху. Прадстаўнікі мясцовай улады на Случчыне ўсё часцей адзначалі ў сваіх паведамленнях, што падбухторшчыкамі сялян да выступленняў станавіліся прадстаўнікі разначыннай інтэлігенцыі. Расла колькасць арыштаваных «за сачыненне просьбаў сялянам на сваіх

Наследие слуцкого края


уладальнікаў». Калі раней найбольш пашыранай формай супраціўлення прыгонніцтву была адмова ад выканання павіннасцей, што выклікалася, звычайна, павелічэннем памераў панщчыны, або аброку, то ў 40-х—50-х гадах повадам для большасці выступленняў служылі чуткі пра свабоду, якія распаўсюджваліся сярод сялян, гарадской беднаты.

19 лютага 1861 г. Аляксандр II падпісаў адобраныя Дзяржаўным Саветам «Палажэнні», якія складаліся з «Агульнага палажэння», «Мясцовых палажэнняў» і дадатковых правіл, а таксама Маніфест аб адмене прыгоннага права.

У Мінскай губерні землеўпарадкаванне праводзілася па «Мясцовых палажэннях». У Слуцкім павеце за сялянамі захоўваліся прысядзібныя і палявыя надзелы, якімі яны карысталіся да рэформы. Адрэзкі дапускаліся толькі ў тых выпадках, калі памер сялянскага надзелу перавышаў устаноўлены інвентаром або калі пасля рэфармавання заставалася менш як 1/3 часткі асушаных зямель. Аднак памешчыкі павінны былі выплаціць сялянам за пабудовы, якія знаходзіліся на адрэзанай зямлі. Сялянскі надзел нельга было зменшыць больш як на 1/6.

Паводле «Палажэння» селянін мог звярнацца ў дзяржаўныя ўстановы, заключаць гандлёвыя і іншыя здзелкі, пераязджаць у горад, запісвацца ў саслоўі мяшчан і купцоў, паступаць на службу ці ў навучальную ўстанову (Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994. С. 303). Сяляне аб'ядноўваліся ў абшчыны, атрымлівалі права займацца промысламі і гандлем, неслі адказнасць за выплату падаткаў, мірскіх збораў, а таксама за рэкруцкія павіннасці. Паводле «Палажэнняў 19 лютага» ўся зямля маёнткаў абвяшчалася ўласнасцю памешчыка. Пры раздзеле зямлі землеўладальнікі выбіралі сабе лепшыя ўчасткі, лясы заставаліся ў распараджэнні памешчыкаў. Сяляне апынуліся ў такіх умовах, пры якіх нельга было самастойна весці сваю гаспадарку.

На асобных умовах адмянялася прыгоннае права для дваровых людзей. Яны вызваляліся праз два гады пасля апублікавання Маніфеста, без зямельнага надзелу, фактычна ж ператвараліся ў батракоў. Наогул пасля рэформы 1861 г. сяляне трапілі з адной кабалы ў другую, эканамічна яшчэ больш жорсткую. А ўсе цэнтральныя і мясцовыя органы для правядзення рэформы складаліся з памешчыкаў (дваран) і абаранялі свае інтарэсы. Незадаволенасць сялян зямельнай рэформай прыводзіла нярэдка да бунтаў. Для іх уціхамірвання царскі ўрад уводзіў у асобныя маёнткі войскі. У рапарце ўпраўляючага Слуцкімі маёнткамі К.Вагнера Галоўнаму ўпраўленню маёнткамі адзначаецца, што ў маёнтку Горкі арандатар увёў «в деревне казаков по 2 чел. на одну избу и переводит их произвольно на постой из одной деревни в другую». Сяляне маёнтка Шастакоў В.А.Чэркас, С.К.Чэркас і К.С.Новік аб'явілі байкот увядзенню статутных грамат. За гэта кожны з іх быў пакараны 20 розгамі і штрафам у 5 рублёў серабром. Арганізаванае супраціўленне па-



План Слуцка. 1866 г.

Наследие слуцкого края

мешчыку К.Вайніловічу аказалі сяляне маёнтка Макраны. Каля 500 чалавек адмовіліся выплаціць штраф за самавольны выпас жывёлы ў вёсцы Навасёлкі. Селянін І.Сянкевіч з жонкай Фёклай збілі паліцэйскага ўрадніка Андрушкевіча. Сяляне Р.Верабей, Р.Камандантаў былі арыштаваны. Але раніцай, калі іх спрабавалі адправіць з Кіявіцкага валаснога ўпраўлення ў слуцкую турму, каля 40 сялян напалі на фурманку і вызвалілі аднавяскоўцаў.

З адменай прыгоннага права значна палепшыліся ўмовы для развіцця сельскагаспадарчай прамысловасці. На змену натуральнай феадальнай сельскай гаспадарцы прыйшлі таварна-грашовыя адносіны. У 2-й палове XIX ст. далейшае развіццё атрымалі дробныя прадпрыемствы па перапрацоўцы мясцовай сыравіны, а сярод мяшчан і сялян — саматужныя промыслы. Вінакурныя заводы былі ў Рачкавічах, Рудні, Красным Радкове, Івані, Клярмонтах, мукамольныя і крупяныя — у Слуцку, лесаапрацоўчыя прадпрыемствы — у Старэве, Любянцы, Кучыне, Вераб'ёве. У 1897—1925 гг. у вёсцы Старэва дзейнічаў шклозавод. У 1908 г. на міжнароднай выстаўцы ў Марселі (Францыя) крышталёвы посуд і лямпы, выраблены на заводзе, былі ўдастоены вышэйшай узнагароды — Гран-пры.

Пашырэнне таварна-грашовых адносін, рост прамысловасці, класавая дыферэнцыяцыя ўнеслі істотныя змены ў матэрыяльную культуру беларусаў, перш за ўсё яны закранулі традыцыйную планіроўку сялянскага двара і жылога комплексу, сельскагаспадарчую тэхніку. Са з'яўленнем новых відаў прылад працы, мэблі, посуду і іншых прадметаў хатняга ўжытку, а таксама мастацкіх вырабаў у быт случан, як і іншых жыхароў Беларусі, паступова ўваходзілі і прамысловыя рэчы паўсядзённага карыстання.

У 1869 г. у Слуцку дзейнічалі 6 гарбарных, 2 цагельныя і 3 ганчарныя заводы, якія выпускалі прадукцыі на суму 3850 рублёў. У той жа час у павеце працавала 17 гарбарных, 14 вінакурных, 1 смаляны, 15 ганчарных, 1 суконны, 1 цукраварны і 4 цагельныя заводы, кошт вырабу якіх складаў 151 814 рублёў.

Усё дарослае насельніцтва Слуцка складала 9875 чалавек, у тым ліку дваране — 856, духавенства — 177, купцы — 246, мяшчане — 7180 чалавек. У павеце пражывала 128 541 чалавек, у тым ліку дваран — 9356, духавенства — 445, купцоў — 72, мяшчан — 11 104 чалавекі.



Рыначная плошча ў Слуцку. Пачатак XX ст.

Наследие слуцкого края

Тое, што тагачасныя статыстычныя звесткі называлі фабрыкамі і заводамі, у пераважнай частцы былі больш развітымі рамеснымі майстэрнямі. У сярэднім на кожную такую фабрыку і завод прыпадала 5—6 рабочых.

У канцы XIX ст. у павеце налічвалася 4850 рамеснікаў. Сярод іх: хлебнікі, булачнікі, мяснікі, кандытары, шаўцы, краўцы, капялюшнікі, ткачы, друкары, печнікі, цесляры, бондары, слесары, кавалі, меднікі, ружэйнікі, гадзіншчыкі, рэзчыкі, рымары, фатографы, рамізнікі і інш.

Колькасць рамеснікаў паменшылася па той прычыне, што многія з іх з-за невялікай заработнай платы перайшлі ў іншыя губерні, некаторыя нават адправіліся ў Амерыку.

Тагачасны случанін, прыстасоўваючыся да рынку, імкнуўся атрымаць найбольшую колькасць даброт за сваю працу. Калі яму не хапала хлеба, ён лёгка яго купляў, таму што цераз Случчыну праходзілі гандлёвыя шляхі, па якіх правозіліся масы таннага збожжа.

Водныя шляхі, як і раней, выкарыстоўваліся для перавозак. У межах Мінскай губерні па шматлікіх яе рэках тавары сцягваліся да Прыпяці, Случы, Верхняга Нёмана, Бярэзіны і Дняпра. У 1846 г. у Слуцку пабудавана першая паштовая станцыя. Праз горад прайшла адметная для таго часу Маскоўска-Варшаўская шаша, якая значна палепшыла гандлёвыя сувязі Случчыны з іншымі эканамічнымі і культурнымі цэнтрамі Беларусі, Расійскай імперыі.

Сістэма школьнай адукацыі Беларусі ў XIX—пачатку XX ст. была часткай расійскай, у якую ўваходзілі: элементарныя пачатковыя школы, класічныя і ваенныя гімназіі, кадэцкія карпусы, ліцэі, інстытуты, універсітэты, акадэміі і інш. Сістэма рыхтавала спецыялістаў для абслугоўвання дзяржавы ў сферы адміністрацыйнага і ваеннага кіравання, культуры, ідэалогіі. На тэрыторыі Случчыны, у адпаведнасці з яе статусам, дзейнічалі пачатковыя, сярэднія і няпоўнасярэднія школы, прыватныя і дзяржаўныя жаночыя вучылішчы, духоўныя вучылішчы і інш. Царкоўнапрыходскія школы яшчэ нараджаліся. У пачатку XX ст., асабліва пасля рэвалюцыі 1905 г., з'явілася значная колькасць школ, асабліва сярэдніх, дзякуючы адкрыццю прыватных гімназій. У 1912 г. на 1000 жыхароў Мінскай губерні прыпадала 51,3 навучэнца.

У 1803 г. у складзе чатырох факультэтаў — маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычнага, медыцынскага, літаратурнага і вольных мастацтваў — утвараецца Віленскі універ-



Кірмаш у Слуцку. Пачатак XX ст.

Наследие слуцкого края



Лірнікі на слуцкім базары. Пачатак XX ст.

сітэт. Ён з'яўляўся цэнтрам Віленскай навучальнай акругі, куды ўваходзіла і Беларусь, распрацоўваў для яе школ навучальныя праграмы, падручнікі. Адукацыя, атрыманая ў яго сценах, не саступала той, якую давалі лепшыя тагачасныя універсітэты Еўропы. Сярод яго першых выпускнікоў ураджэнцы Случчыны: Каржанеўскі Іосіф (медыцынскі факультэт), Шэмеш Адам (жывапісец-партрэтыст і мастацтвазнавец) і інш. Іншыя маладыя случане атрымлівалі дыпломы пасля заканчэння Маскоўскага (Белабоцкі Браніслаў, Цэраскі Вітольд), Пецярбургскага (Слупскі Аляксандр), Кіеўскага (Плуг Адам), Дэрпцкага (Залескі Браніслаў) універсітэтаў, Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі (Равіч Іосіф). Значная іх частка прайшла праз Слуцкую гімназію. На жаль, з-за незапатрабаванасці іх ведаў мясцовымі ўладамі іх праца праходзіла за межамі роднай зямлі.

Беларусь, якая не мела тады вышэйшай школы, магла пасылаць у той час у Пецярбургскі і Маскоўскі універсітэты, з назначэннем казённых стыпендый, толькі 50 добранадзейных выхаванцаў.

Падаўленне паўстання 1863—1864 гг. і масавыя рэпрэсіі да яго ўдзельнікаў, жорсткі рэжым выключных законаў, фактычная забарона беларускага друку надоўга затрымалі развіццё нацыянальнага і ў цэлым вызваленчага руху. Апошні з'явіўся ў перыяд другой рэвалюцыйнай сітуацыі, калі ў барацьбу ўступіла новае пакаленне рэвалюцыйных дэмакратаў.

Перадавая беларуская моладзь, найперш з ліку навучэнцаў, уключылася ў дзейнасць расійскіх народніцкіх арганізацый: «Зямля і воля», «Народная воля», «Чорны перадзел». У навучальных установах Пецярбурга, Масквы, Кіева і іншых гарадоў утвараліся гурткі студэнтаў-беларусаў. Падпольна, на гектографе, яны выдалі адозвы «Да беларускай моладзі», «Да беларускай інтэлігенцыі» і інш.

У публікацыях упершыню абвяшчалася існаванне самастойнага беларускага этнасу, давалася тэарэтычнае абгрунтаванне гэтага тэзіса. У іх змяшчаўся пратэст супраць паланізацыі і русіфікацыі.

Маладзёжны рух існаваў і на Случчыне. Нацыянальна-вызваленчыя ідэі падтрымлівалі навучэнцы гімназій, у тым ліку і Слуцкай. У пачатку 70-х гадоў яе навучэнцы атрымлівалі з Пецярбурга і Масквы працы Маркса, Ласаля, Дарвіна, некаторых расійскіх рэвалюцыйных дзеячаў. У 1863 г. са Слуцкай гімназіі быў выключаны 281 навучэнец за рэвалюцыйную дзейнасць.

Уступленне Случчыны ў першае дзесяцігоддзе новага веку было бурлівым. Вясной 1905 г. утвараецца слуцкая арганізацыя Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. У 1905—1908 гг. адбыліся сялянскія хваляванні ў вёсках Слуцкага павета. Прайшлі мітынгі, дэманстрацыі, забастоўкі па ўсёй Случчыне.

У вёсцы працягваліся выступленні сялян, звязаныя з пазямельнымі адносінамі сялян і памешчыкаў (захопы ворнай зямлі, лугоў і пашаў, барацьба за сервітуты, супраціўленне пры размежаванні зямель, патравы, высечкі лесу і г. д.). Самавольныя высечкі былі ў 1905 г. у Вялікай Духаўшчыне, Бялевічах. Сяляне Сноўскай воласці

Наследие слуцкого края

ўкралі гатовыя дровы з участкаў Гусакоўскай лясной дачы. Байкатавалася выкананне судовых рашэнняў, пастаноў і распараджэнняў розных адміністрацыйных устаноў. У 1908 г. успыхнула паўстанне ў вёсцы Заграддзе, паўстанне задушылі рэгулярныя войскі. Былі забіты браты Фама і Ціхан Ганчары, Міхаіл Ясінскі, Сцяпан Дробыш і іншыя. Шмат было параненых.

Пралетарыят, які перайшоў да адкрытай палітычнай барацьбы з царызмам, вызначаўся як галоўная сіла знішчэння царскага самадзяржаўя, ператварэння Расійскай імперыі ў дэмакратычную рэспубліку, ліквідацыі памешчыцкага землеўладання, ажыццяўлення нацыямі права на самавызначэнне. Такія патрабаванні вызначалі бліжэйшыя мэты бальшавіцкіх арганізацый. Да іх прымыкалі мясцовыя арганізацыі Бунда, сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Беларускай сацыялістычнай грамады і інш.

Палітычнае жыццё Случчыны ў час першай расійскай рэвалюцыі перадае рапарт слуцкага павятовага спраўніка мінскаму губернатару ад 30 лістапада 1905 г.: «В городе Слуцке, как и в некоторых других поселениях уезда (Копыль, Клецк, Ляховичи), имеются местные группы социал-демократической и социал-революционной партий. Организация «Бунда» насчитывает здесь в своих рядах значительное число чинов из рабочей еврейской молодежи. До 17 октября чуть ли не ежедневно этими организациями устраивались в Слуцке демонстрации, сопровождавшиеся нарушением общественной тишины и спокойствия, криками и залпами револьверных выстрелов. Партийная молодежь вела себя вызывающе, стесняла движение по тротуарам в центре города, ежедневно с 6—7 часов пополудни и до поздней ночи, наполняя улицы толпами своих сочленов и причиняя постоянное беспокойство жителям.

Все это, разумеется, вызывало неудовольствие элементов населения, не причастных к движению, давало почву мнениям о необходимости применения сильных мер к обузданию своеволия партийной молодежи. Высказывались мнения, что единственной такою мерою могло бы быть расквартирование в городе казаков, как легкоподвижной и наилучшей для подавления уличных беспорядков части войск.

В целях пресечения этих беспорядков неуклонно применялись такие меры, как разъяснения толпе демонстрантов, задержание праздношатающихся и иногородних, высылка их на ра-



Царква і Троіцкі манастыр у Слуцку. Пачатак XX ст.

Наследие слуцкого края

боту по месту приписки и привлечение к судебной или административной ответственности.

Такие меры вызывали, в свою очередь, со стороны партий против полиции всевозможные обвинения, вплоть до инсинуаций в печати с преувеличением и искажением фактов, как, например, корреспонденция из Слуцка в № 140—142 «Нашей жизни» на тему о том, что в городе бьют и бьют (полиция и войска)».

Па-свойму ўвайшла ў жыццё Случчыны знакамітая сталыпінская рэформа. З мэтай інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі, павышэння культуры земляробства і жывёлагадоўлі, іх тэхнічнай аснашчанасці ў Мінскай губерні землеўпарадкавальнымі камісіямі і земствамі былі прыняты меры па ўзмацненні аграномічнай, зоатэхнічнай і ветэрынарнай справы, арганізацыі продажу і арэнды сельскагаспадарчых прылад і машын, стварэнню складаў для насення, вывазу племянной жывёлы.

Пашырылася навукова-даследчая і асветніцкая дзейнасць Мінскай балотнай станцыі, адкрытай у 1911 г. Пры ёй дзейнічалі рэгіянальныя трохмесячныя сельскагаспадарчыя курсы, задачай якіх з'яўлялася падрыхтоўка спецыялістаў па вырошчванні кармавых раслін, асушэнні балот і лугаводстве. З 1911 г. па 1914 г. у Мінскай губерні вырасла колькасць зернеачышчальных пунктаў і пракатных станцый. На Случчыне пры дапамозе губернскага земства рабіліся пэўныя захады па арганізацыі вогнеўстойлівага будаўніцтва, ствараліся майстэрні па вырабе чарапіцы, цэглы і інш. матэрыялаў у мэтах барацьбы са спусташальнымі пажарамі, якія былі нярэдкімі гасцямі Случчыны і суправаджаліся вынішчэннем цэлых вёсак. Аб тэмпах і маштабах гэтай работы сведчаць затраты Мінскага губернскага земства, якія ў тыя гады выраслі з 22 тыс. да 150 тыс. рублёў.

У гады Першай сусветнай вайны Случчына ўпершыню стала прыфрантавым краем. У Слуцку размяшчаліся штабы спачатку 3-й, а потым 2-й рускай армій. Вайна абвастрыла яе эканамічнае і дэмаграфічнае становішча. З 1914 па 1917 год тут было мабілізавана больш за палову працаздольнага мужчынскага насельніцтва.

У крытычнае становішча трапілі і многія памешчыцкія гаспадаркі. Пасяўныя плошчы на прыватнаўласніцкіх землях да пачатку 1917 г. скараціліся амаль на 70 працэнтаў.

Велізарныя страты несла жыццё ад бясконцых рэквізіцый на патрэбы фронту: коней, буйной рагатай жывёлы, збожжа, мукі, фуражу. Тысячы людзей адрываліся на фартыфікацыйныя работы, ахову чыгунак, мастоў.

З пачаткам вайны былі адменены ўсе абмежаванні на працяг рабочага дня, выкарыстанне жаночай і дзіцячай працы, на выхадныя і святочныя дні.



Вуліца Шашэйная (цяпер вуліца Леніна) у Слуцку. Пачатак XX ст.

Наследие слуцкого края

У той жа час змяншэнне заробку ў 1915 г. склала болей як 11 працэнтаў. Іх узровень захоўваўся толькі на прадпрыемствах па вырабе ваеннай прадукцыі.

Населеныя пункты Случчыны перапоўнілі патокі бежанцаў з Гродзенскай, Віленскай губерняў. У пачатку 1916 г. іх колькасць у Мінскай губерні склала 157 тыс. чалавек. Многія з іх апынуліся амаль на вуліцы — на ўскраіне лесу, на падводах, каля вогнішчаў для абагрэву і прыгатавання ежы. Случане дапамагалі жыллём, вопраткай, лекамі. На Случчыне працавала медыцынская камісія, створаная штабам рускай арміі для правядзення прафілактыкі заразных захворванняў. Дзякуючы прынятым мерам бежанскі рух быў узяты пад арганізацыйны і санітарны кантроль, значная частка «навасёлаў» была адпраўлена па чыгунцы цераз Мінск, Асіповічы, Оршу далей на ўсход, у глыб Расіі.

Слуцк і жыхары павета ўспрынялі вестку аб складанні Мікалаем II з сябе ўлады як нешта доўгачаканае. Пераконваюць у гэтым успаміны І.Р.Басінкевіча, ураджэнца г. Слуцка, яго жыхара ў 1917—1918 гг.: «Напачатку лютага 1917 г. з палітычных партый у г. Слуцку была толькі арганізацыя Бунда, аб'ядноўваўшая некалькі дзесяткаў рамеснікаў. Ад іншых партый — бальшавікоў, меншавікоў, эсэраў былі толькі адзіночкі, галоўным чынам, ад ваенных. Вуліцы горада, звычайна ціхія і мала чым адметныя, сталі шматлюднымі і прынялі незвычайны для вачэй выгляд. На кожным кроку можна было сустрэць афіцэраў і генералаў размешчанага ў Слуцку штаба 2-й царскай арміі. Мала было салдат. Найбольш рэвалюцыйныя пяхотныя часці знаходзіліся ў раёне Нясвіжа, бліжэй да акопаў.

Успамінаю першы мітынг на базарнай плошчы, непадалёку ад базара. Ён быў скліканы па ініцыятыве меншавікоў і эсэраў са штаба арміі. Была нядзеля. Сонечная веснавая раніца. У горад наехала шмат сялян з навакольных вёсак. Каля трыбуны, па-скораму зробленай з дошак, стаяла група афіцэраў, гімназістаў — сынкоў мясцовай буржуазіі і памешчыкаў. З'яўляецца першы аратар. Невялікага росту, каржакаваты, у салдацкай шынелі, з нашыўкамі на пагонах. Гэта быў Збарскі — член партыі эсэраў. Ён заклікаў да вернасці Часоваму ўраду, гаварыў аб неабходнасці весці вайну «да перамогі» і неадкладна пачаць наступленне на фронце, каб дапамагчы саюзнікам. Са злобнай нянавісцю ён абрушыўся на бальшавікоў, называю-



Лагер бежанцаў у Слуцку. 1915 г.

Наследие слуцкого края

чы іх нямецкімі шпіёнамі, здраднікамі радзімы. Выступае другі аратар, меншавік, ваенны доктар Лабенз. Ён таксама заклікае падтрымаць Часовы ўрад і ваяваць да пераможнага канца.

Яшчэ адзін афіцэр падымаецца на трыбуну. Гэта — ваенны доктар Крэйнес. Ніхто з прысутных на мітынгу не сумняваўся, што ён нічога новага не скажа. Але з першых жа слоў аратара стала ясна, што выступае прадстаўнік бальшавікоў, той партыі, якая сумела заваяваць сімпатыі рабочых, бяднейшых сялян і салдат. Горача і натхнёна, з вялікай даказальнасцю тав. Крэйнес раскрываў здрадніцкую, антынародную палітыку Часовага ўрада, гаварыў аб неабходнасці пакончыць з вайною, перадаць фабрыкі і заводы рабочым, зямлю — сялянам. Група афіцэраў і контррэвалюцыйна настроеных гімназістаў спрабавала спыніць яго прамову выкрыкамі: «Далоў, нямецкі шпіён, здраднік радзімы». Потым рэакцыянеры кінуліся да аратара, каб сцягнуць яго з трыбуны. З вялікімі намаганнямі Крэйнес закончыў сваю прамову».

Восенню 1917 г. на Случчыне пачаўся пераход улады з рук органаў Часовага ўрада ў рукі мясцовых Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў.

Я.І.Бараноўскі, Б.В.Ульянка.

По дарозе ад Мінска да Слуцка

По дороге к Слуцку нам пришлось ехать с опытным евреем Янкелем... Отъехавши на далекое расстояние от Минска, мы встречали несколько еврейских буд, наполненных всеми возрастами евреев. Некоторые их них были прилично одетые, а другие в обыкновенных своих грязных будничных костюмах. Спрашиваю Янкеля, куда собрались его соплеменники? Да надо полагать, отвечал он, что это еврейская свадьба. У нас иногда случается так, что если жених из одного города, а невеста из другого, то съезжаются поезды жениха и невесты на пол-пути, чтобы каждому из них не было обидно при свадебных издержках, — и венчаются где либо возле корчмы или просто на открытом поле, под балдахином. Жених привозит свои закуски, со стороны невесты тоже идет угощение, ну, и веселятся день-другой, пока выгрузят из буд все съедомое. Что же, говорю ему, и раввина с собой берут? Да, если он родственник или хороший знакомый жениху или невесте, а то и без него дело обходится. У нас обряд венчания свадеб может совершить каждый еврей.

Мы ехали с Янкелем в самую рабочую летнюю пору и потому на полях, засеянных хлебом, постоянно встречали народ, занятый уборкой посевов, — и чем ближе подъезжали к Слуцкому уезду, тем хлеб попадался рослый и зернистый. Янкель говорил, что Слуцкий уезд вообще хлебороднее других уездов Минской губернии, и мужики ничего себе, живут хорошо. Когда были господские, то жались и скрывали свои деньги во избежание лишних на них налогов от владельцев, а теперь начали скот покупать и лишнюю землю засевать.

Слуцкий уезд лежит в западной части губернии. Пространство его 141,57 кв. км. (6850 кв. верст) по месторасположению своему площадь может быть подразделена на две части: северную и южную. Северная, небольшая, представляет холмистую полосу, составляющую водораздел между системами рек: Немана и Припяти. Южная часть входит в состав так называемого Минского полесья. Почва в северной части преимущественно суглинистая, отчасти глинистая и супесчаная с глинистою подпочвою; на юге же песчаная и местами суглинистая. Площадь уезда орошается двумя системами рек: Немана и Припети. Болота и непроходимые болотистые леса южной части Слуцкого уезда служат продолжением Пинских. В отношении лесов, которые сосредотачиваются в южной части, уезд принадлежит к неособенно обильным. Жителей 163 954 душ. Жители размещаются в разных поселках. По роду занятий жителей уезд принадлежит к числу таких, в которых развиты одни сельские промыслы. Кроме хлеба, в значительном количестве раз-

Наследие слуцкого края

водят лен, который также служит предметом сбыта.

По хлебородию своему Слуцкий уезд считается лучшим. Поверхность его с северо-западной части возвышена, а в южной болотиста и низменна. Почва первой плодородна, а потому сторона эта более населена, имея прекрасные луга по верховьям разлива рек; а южная часть представляет полесье с редким населением. Главная река Случь с притоками Морочь и Лань, приток Припети. Верховья реки Щары и других притоков Немана имеют богатые луга. Поверхность уезда делится московско-варшавским шоссе, на две противоположные местности. Сторона от шоссе принадлежит к низменным, а северная к плодородным. Самое шоссе проходит по более населенным местностям. По пути к Слуцку нам попадались казенные фермы, а также конфискованные и секвестрованные имения. Последние мы и прежде встречали, проезжая другие уезды Минской губернии, и потому я с Янкелем повел о них речь. А что, говорю ему, есть хорошие из этих имений. «Да как тебе, барин, сказать, были между ими хорошие имения; да теперь стали плохи. Когда паны жили в них и труд был обязательный, а не вольно-наемный, помещики и благодушествовали в них; а потом, как пришлось нанимать народ для обработки полей, пошло иное дело. ...Имения эти погубила последняя польская завируха. Ты слыхал ли, барин, о податках, собиравших в былые времена на пресловутое повстанье? ...Правда, сначала паны, отуманенные отчизной, сами совали эти податки без расчету, а когда нечего было давать, а пресловутый фонд начал требовать этих податков, что называется с ножом к горлу, то дело пошло иное. У кого были лишние деньги, тем еще ничего, кое-как отделывались от этих тяжких налогов; а у кого их не было, должны были спускать за ничто все, что было в наличности; лес, скот и разную движимость, а теперь сочтите-ка когда в такое имение вламывалась банда; тут уж много не разсуждай, а что есть в печи, все на стол мечи. Как бы ни было хорошо устроено имение, но оно не могло выдержать тех расходов, какие требовались на разные податки да на угощение банд. Ну, а потом последовала конфискация и секвестр имений, принадлежащих лицам, участвовавшим в повстаньи. Это уже привело к окончательному разорению землевладельцев и их имений.

Мы приехали на станцию и расположились с Янкелем пить чай. Пока прислуга хлопотала с самоваром, я вышел из комнаты и пошел вдоль небольшого селения. Жар был нестерпимый. На улицах села как будто все вымерло, не было видно ни одного живого существа, и только подходя к концу села, я услышал ленивый лай собаки, а вслед за сим выскочила из ворот группа мальчиков и девочек в одних рубашенках, запачканных до нельзя. Это были единственные хозяева деревни, за отлучкою отцов и матерей их на полевые работы. Выйдя за деревню, я присел на дороге у густо-раскинувшейся березы. Нужно сказать, что в западном крае большая часть дорог обставлена высоко-растущими деревьями, под которыми всякому путнику, во время жаров и летнего зноя, приятно отдохнуть.

Друкуецца па кн.: В о и н о в Ф.Д. Путевые заметки ст. советника Ф.Д.Воинова. СПб., 1891. С. 31—34.

Айчынная вайна 1812 года

У ноч на 12(24) чэрвеня 1812 г. без абвяшчэння вайны французская армія пераправілася цераз пагранічны Нёман. Напалеон спадзяваўся разбіць рускія войскі ў прыгранічных раёнах і прымусіць Расію заключыць ганебны мір. У пачатку вайны рускае камандаванне на нарадзе ў Дрысенскім лагеры прыняло рашэнне не ўступаць у рашаючую бітву да аб'яднання 1-й і 2-й армій. Армія Барклая дэ Толі адыходзіла праз Вільню — Свянцяны — Дрысу — Полацк на Віцебск. Для прыкрыцця Пецярбургскага напрамку ў Дрысенскім лагеры быў пакінуты корпус П.Х.Вітгенштэйна. 2-я армія, якая адступала ў напрамку Ваўкавыск — Слонім — Навагрудак — Нясвіж — Слуцк — Бабруйск — Магілёў, апынулася ў асабліва цяжкім становішчы.

Адступаючы, рускія войскі ўпарта супраціўляліся, праявілі мужнасць і адвагу. У чэрвені — ліпені на тэрыторыі Беларусі адбыліся баі часцей 1-й і 2-й армій з напалеонаўскімі войскамі каля в. Вораны,

Наследие слуцкого края

Закрэўшчына, Гудзявічы Гродзенскай губерні, пад мястэчкамі Вішнева, Карэлічы Віленскай губерні, паблізу мястэчак Мір і Раманава Мінскай губерні і ў іншых месцах.

* * *

Другая армія князя Баграціёна прыбыла 1-га ліпеня ў Слуцк, дзе атрымана было паведамленне аб тым, што непрыяцельскія раз'езды з'явіліся ў Свіслачы, за 40 вёрст ад Бабруйска. Гэта быў корпус Пажаля, якога Даву паслаў з Мінска, а сам пайшоў на Магілёў. Баграціён вырашыў таксама ісці прама да Магілёва, спадзеючыся папярэдзіць непрыяцеля. Раздзяліўшы армію на дзве калоны, ён паслаў Раеўскага з 7-м корпусам і некалькімі кавалерыйскімі палкамі, каб атакаваць ворага, у выніку заняцця ім Бабруйскай дарогі. Сам жа з корпусам Барадзіна і 2-га Кірасірскага дывізіёна ішоў у адным маршы за Раеўскім для падтрымкі Платава, які пры Раманаве адбіў авангард караля Вестфальскага, у якім было 7 палкоў конніцы, і ўзяў у яго ў палон 16 афіцэраў і 300 чал. ніжэйшых чыноў. Абозы, параненыя і хворыя былі адпраўлены ў Мазыр.

Далей Раманава непрыяцель не праследаваў 2-й арміі.

Літаратура:

Война русского народа с Наполеоном. 1812. СПб., 1910. С. 47.

* * *

Во время Отечественной войны 1812 г. на территории Белоруссии происходили бои между русскими войсками и французскими армиями. Наполеон, собрав большие силы, значительно превышавшие численность русских войск, вел наступление. 2-я русская армия отступала, чтобы объединить свои силы с 1-й. Ее фланг прикрывал летучий отряд, которым командовал М.И.Платов.



М.І.Платаў.

1(13) июля 1812 г. 4-й французский кавалерийский корпус генерала В.Н.Латур-Мобура занял Несвиж. 2-я русская армия отступила на Слуцк, а сам Багратион был уже в городе. Он приказал арьергарду остановиться в местечке Романово (ныне Ленино) и задержать французские войска. Частями из донских казаков и кавалерии Васильчикова командовал генерал Платов. 2(14) июля 1812 г. 7 полков французской армии — кавалерийская дивизия Каменьского, бригада вестфальских гусар Гамерштайна, кирасиры, пехота и артиллерия — атаковали русские войска. Платов принял бой. Казаки отбили атаку и контратаковали. Они отогнали врага на 5 верст. Части французского корпуса получили подкрепление и остановили казаков, которые вернулись в Романово. Платов приказал сжечь мост через Марочь, этим укрепил свою оборону. Латур-Мобур бросил в бой 3 кавалерийские дивизии. Тогда в действие вступил весь арьергард. От ураганного огня пушек и фланговых атак казаков противник нес большие потери. Больше часа продолжалась битва. Французский корпус вынужден был отойти к местечку Тимковичи. Победа была полной. В этом бою отличился командир 1-го батальона Ахтырского гусарского полка подполковник Денис Васильевич Давыдов.

Битва под Романовым дала возможность 2-й армии отдохнуть в Слуцке и затем отойти к Бобруйску и дальше на восток.

Слуцк был занят французскими частями в середине июля 1812 г. Захватчики реквизировали у населения для армии продукты питания и фураж. Во главе администрации стоял генерал, который руководил всеми делами в уезде. Основной обязанностью местной администрации было собирать подати с населения, реквизировать продукты и фураж и обеспечивать ими французскую армию.

При отступлении французской армии в начале ноября 1812 г. дивизия, которая стояла возле Слуцка, отошла к Борисову, куда стягивались силы захватчиков. Слуцк был занят без боя русскими войсками корпуса Эртеля.

Друкуецца па кн.: Г р и ц к е в и ч А. П. Древний город на Случи. Мн., 1985. С. 32.

Наследие слуцкого края

* * *

... — Итак, мы в восьми верстах от Слуцка, а французы уже в Несвиже...

Багратион коротко подумал о чем-то и, словно передвинув одну мысль на место другой, продолжал говорить:

— Что ж? Так и должно быть. Однако и нам свои меры взять необходимо. Господа генералы Платов и Васильчиков! После славной победы вашей под Миром полную на вас имею надежду. Матвей Иваныч! Ларивон Васильич! Французы на хвосте у нас к Бобруйску ползут. Арьергарда долг — крепче прикрывать армию. Смотрите, други: коль скоро от Романова отойдете, — весь обоз армии сгинет. Нельзя скоро отходить! Через ночь войска в Уречьи будут. А вам и завтра и послезавтра весь день надлежит у Романова держаться. И лишь третьего июля близ вечера дозволяю отойти на Слуцк. Хоть вся сила адова ринет на вас, — ни шагу!

...Прикрывая отступление Второй армии, Платов и Васильчиков разбили второго июля у местечка Романово передовой кавалерийский отряд маршала Даву под начальством генерала Пшепендовского. Это было второе крупное арьергардное дело армии Багратиона, не менее блестящее, чем первое — под Миром, но еще более значительное по результатам. Теперь армия могла без опасения двигаться на Бобруйск, а оттуда к Могилеву. А до боя под Романовым каждый шаг ее сопровождался риском быть настигнутой и окруженной. Багратион вздохнул свободно.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Голубов С. Багратион. М., 1947. С. 54, 58.

Аб тым, як прадавалі Слуцк

Царское правительство стремилось купить у помещиков частновладельческие города Белоруссии, так как в России таких городов не было: все были государственными. Еще в указе Екатерины II от 3 мая 1793 года о властях в Минской губернии говорилось о намерении правительства купить у помещиков Слуцк.

Началась длительная канцелярская переписка. Еще в мае 1800 г. в город приехал минский губернатор З.Э.Корнеев с чиновниками, чтобы вести переговоры и оценить его. Но три опекуна малолетнего Доминика Радзивилла нарочно в Слуцк не приехали. Они сами взялись за оценку, долго подсчитывая все доходы с города. Наконец, опекуны предложили правительству продать Слуцк за 3736 тысяч злотых (560 400 рублей). Сенат Российской империи 20 октября 1803 года принял указ о покупке Слуцка государством.

В 1806 г. в Слуцк приезжал губернский стряпчий (помощник прокурора) и вместе со слуцким городничим осмотрели город. Они (а вслед за ними и губернатор) считали, что город покупать не надо, ибо жители его бедные, дома старые и государство не получит необходимой прибыли. Тогда Д.Радзивилл обратился к министру внутренних дел А.Б.Куракину с просьбой отложить срок выплаты большого радзивилловского долга казне на 15 лет и предложил купить у него город. Куракин подал докладную записку царю, что следует согласиться с предложением Радзивилла по политическим мотивам: все уездные города в Белоруссии должны быть государственными, а не помещичьими.

Но и на этот раз покупка Слуцка не произошла. Д.Радзивилл был сторонником Наполеона. Он выехал за границу и поступил на службу к французскому императору. В 1812 г. участвовал в войне против России, а в ноябре 1813 г. умер от ран во Франции. Но еще летом 1813 г. на все имения Радзивилла был наложен секвестр (временное запрещение пользования собственностью), они были взяты в управление государственными властями. Однако царским указом от 24 февраля 1814 г. секвестр был снят, и все радзивилловские имения были поделены между его родственниками — Антонием Радзивиллом, получившим Несвиж, Мир и много других владений, и дочерью Д.Радзивилла — Стефанией (1809—1832), получившей Слуцк, Копыль и другие имения. Над ней и ее владениями из-за ее малолетства была установлена опека. Однако радзивилловские долги были такими большими, что царским указом от 6 апреля 1815 г. создали специальную комиссию с правом юридических решений.

Вопрос о покупке Слуцка правительством после Отечественной войны 1812 г.

Наследие слуцкого края

некоторое время не поднимался. Только в 20-х годах XIX в. министерство финансов предложило купить Слуцк в счет радзивилловских долгов. Дальнейший ход этому делу дали выступления жителей города против попытки закрепощения мещан помещичьей администрацией и введения новых податей. Слуцкие мещане добивались окончательного освобождения от помещичьей власти. Через своего адвоката они в 1812 г. подали в радзивилловскую комиссию документ, где изложили свои претензии. 29 декабря 1821 г. комиссия признала слуцких мещан свободными людьми, но землю Слуцка — помещичьей. Горожане, как и раньше, вынуждены были выполнять повинности. В 1822 г. они подали апелляцию в сенат, желая получить и городскую землю. Потянулись долгие годы разбирательства дела.

Наконец комитет министров царской России принял решение купить Слуцк с околицами. Николай I утвердил это решение 7 февраля 1828 г. Для оценки стоимости города и окрестностей в Слуцк была направлена комиссия министерства финансов с представителем помещицы. Были рассмотрены многочисленные документы, приложены статистические сведения, составлен обзор юридических документов и старинных грамот за несколько столетий.

Однако и в 1828 г. продажа Слуцка не состоялась. Хотя министерская комиссия и оценила город и его окрестности со всеми доходами в 616 375 рублей 83 копейки серебром, правительство сочло эту сумму высокой и не утвердило.

Стефанией Радзивилл занялся царский двор. Императрица выдала ее в 1829 г. замуж за молодого графа Льва (Людвига) Витгенштейна (с 1834 г. — князя), сына русского генерал-фельдмаршала. Между мужем и женою был заключен договор, по которому в случае смерти одного из них все имущество становилось собственностью оставшегося в живых.

Указом сената от 30 июня 1831 г. Слуцк со всеми помещичьими доходами был закреплен за С.Радзивилл-Витгенштейн, а мещане окончательно признаны вольными людьми.

В 1832 г. 23-летняя владелица Слуцка умерла, и ее муж после уплаты долгов стал владельцем города и других ее имений. В 1834 г. Л.Витгенштейн выплатил долги умершей жены и проект покупки Слуцка был сдан в архив.

Новый толчок этому делу дало окончание судебного спора выбранцев в 1834 г. Когда проект переселения выбранцев на Украину был отклонен правительством, оно предложило помещику продать государству земли выбранецких деревень. Витгенштейн согласился в 1834 г. продать земли вместе со Слуцком за 417 738 рублей 331/3 копейки серебром, но виленский военный губернатор Ф.Я.Миркович, который вел переговоры, снизил цену до 342 821 рубля 662/3 копейки серебром. Снова пошли переписка и переговоры, пока Витгенштейн не согласился на эту сумму.

Торги тянулись до 10 декабря 1846 г., когда по положению комитета министров царской России, утвержденному Николаем I, Слуцк, его околицы и земля выбранецких деревень были куплены правительством за 342 821 рубль серебром. В апреле 1847 г. состоялась передача города государственным властям на месте.

Так закончилась более чем пятидесятилетняя история покупки уездного города Слуцка царским правительством.

Друкуецца па кн.: Г р и ц к е в и ч А.П. Древний город на Случи. Мн., 1985. С. 33—35.

Паўстанне 1863 года

Революционно-демократическое движение в Белоруссии в 60-х годах XIX века являлось составной частью общероссийской борьбы против царизма. Оно было тесно связано с польским национально-освободительным движением. В России сложилась и развивалась революционная ситуация. Программа национально-освободительной борьбы в Белоруссии и Литве предусматривала буржуазно-демократические свободы, равноправие всех граждан, республиканскую форму правления, независимость края.

В Слуцке, как и в некоторых других городах Белоруссии, в 1861—1862 гг. происходили тайные сходки сторонников освободительного движения, накопление оружия и продуктов питания для буду-

Наследие слуцкого края

щих повстанческих отрядов, пение недозволенных гимнов и песен. Минский гражданский губернатор 7 февраля 1862 г. доносил виленскому генерал-губернатору, что «революционный дух» больше всего «проявляется в Слуцком, Новогрудском и Минском уездах». Начались диверсионные действия: неизвестные уничтожали телеграфные столбы, линии. Подозревали в этом слуцких гимназистов. Начались репрессии и высылка жителей из города.

В 1862—1863 гг. происходили волнения учеников Слуцкой гимназии. Гимназисты составляли рукописные прокломации и расклеивали их в городе, тренировались в стрельбе.

В Белоруссии и Литве восстание против царизма готовил Литовский провинциальный комитет, который создал местные революционные организации: гродненскую (возглавлял Калиновский), минскую (Антон Трусов). Минская организация имела связь со Слуцком.

1 февраля 1863 г. подпольное временное провинциальное правительство Литвы и Белоруссии во главе с Кастусем Калиновским обратилось к населению с манифестом о восстании против царизма. В манифесте провозглашалась демократическая программа. В каждую губернию революционное правительство назначило военных начальников, которые одновременно возглавили наиболее крупные повстанческие отряды.

Царские власти усилили репрессии. В Слуцке в феврале 1863 г. были произведены аресты. Значительную часть арестованных выслали из города. Началось массовое исключение учеников из гимназии. В 1863 г. было исключено или «демонстративно подали прошение об увольнении их из гимназии» 281 человек. Около 30 гимназистов старших классов приняли участие в вооруженной борьбе против царизма.

Виленский генерал-губернатор распоряжением от 22 февраля 1863 г. объявил Слуцк и уезд на военном положении. Вся полнота власти была передана военному начальнику, командиру 33-го Донского казачьего полка полковнику Астахову.

В конце февраля 1863 г. в уезде начали действовать повстанцы. Сюда с запада дошел отряд Р.Рогинского. Царские войска смогли достать и разбить его уже в Мозырском уезде.

Слуцкие повстанцы начали действовать весною 1863 г. В уезде образовалось четыре отряда общей численностью до 500 человек. На подавление повстанцев были брошены большие силы. В уезде, кроме казаков, действовали части 31-й пехотной дивизии, штаб которой разместили в Слуцке.

21 апреля 1863 г. возле деревни Озеричи часть Великолукского полка разбила отряд повстанцев в 120 человек во главе с Вендорфом и военным руководителем отряда бывшим штабс-капитаном В.Машевским. Во время боя было убито 3 повстанца, в том числе Машевский, 14 ранено, 35 взято в плен.

Еще один бой произошел 26 июня возле деревни Мокраны. Здесь рота Черниговского полка с 80 казаками разбила отряд повстанцев Нарбута из 80 человек. В Слуцком уезде действовали отряды Лукашевича, Хмаровича, Юндзилла. Летом 1863 г. они также были разбиты царскими войсками.

Зимой 1864 года царские власти раскрыли подпольную революционную организацию Минской губернии. Было арестовано 80 человек, среди них начальники организации Слуцкого уезда — учитель математики Слуцкой гимназии Миладовский, которого сослали в Томск, и Могильницкий. Захваченных в боях повстанцев судил военный суд. Их осуждали на каторжные работы в рудниках или крепостях — бессрочно или на 12, 10, 8 лет. Имущество их конфисковывали. У крестьян и мещан Слуцка, участвовавших в восстании 1863 г., было конфисковано имущество, они были высланы в арестантские роты на 2—4 года. Часть повстанцев или просто подозреваемых лиц была выселена в Сибирь или «далекие губернии». Всего из города было выселено более 400 человек.

Царизму удалось подавить восстание, но, несмотря на репрессии, в Белоруссии, в том числе и среди слуцкой интеллигенции, учеников Слуцкой гимназии, продолжали распространяться революционно-освободительные идеи.

Друкуецца па кн.: Г р и ц к е в и ч А.П. Древний город на Случи. Мн., 1985. С. 36—39.

Наследие слуцкого края

Дакументы сведчаць

РАПАРТ КІРАЎНІКА СЛУЦКІМІ МАЁНТКАМІ АБ ЗНАХОДЖАННІ Ў ІМ КАЗАКОЎ І ЖОРСТКАЙ ЭКСПЛУАТАЦЫІ СЯЛЯН АРАНДАТАРАМІ

17 жніўня 1861 г.

Получив указание е. св. князя и Главного управления имениями о том, чтобы не допускать ввода в княжеские имения войск и полиции, после возвращения в Слуцк я предупредил об этом арендаторов, чтобы по всем вопросам они обращались к Управлению имениями и только через него добивались удовлетворения. Почти все арендаторы не уклоняются от этого и только в крайнем случае обращаются через Управление к посреднику, хотя поскольку возможно, взаимные недоразумения разрешаются на месте.

Однако я сталкиваюсь с нарушителями этого условия, самовольно идущими к беспорядкам. В им. Горки давно имеются злоупотребления: ограничивались только расчетами с крестьянами, злоупотребления со стороны имения приостановлены. В настоящее время арендатор ввел в деревни казаков по 2 чел. на одну избу и переводит их произвольно на постой из одной деревни в другую, так что крестьяне действительно начали роптать и жаловаться. А когда эти жалобы дошли до меня и когда я убедился в том, что вымышленного бунта нет, я попросил командира полка удалить казаков, что и произошло.

Но через несколько дней пани Околова от имени своего мужа подала заявление посреднику и полиции о том, что у нее крестьяне бунтуют и порядок нарушен. На проверку прибыл посредник, затем исправник, которые, не найдя ни бунта, ни недоимок барщины, осмотрели лишь по жалобам крестьян хлеб, выдаваемый из имения слугам, и признали его несоответствующим и негодным. Если этим закончится все дело, было бы еще ничего. Но мне кажется, что здесь будет больше скандалов, которые ни к чему иному не приведут, кроме раздражения крестьян и вмешательства властей.

Второй скандалисткой является пани Булгаринова. Как это видно из прилагаемого отношения посредника, арендаторша, не взирая ни на что, велела 2 раза сечь крестьян за опоздание на работу и за медлительность в работе. После первого случая посредник взял с нее обязательство не нарушать правил, а во втором случае послал отношение администрации, после чего был выслан контролер для удовлетворения крестьян. Но когда в тот же день в Радков прибыл и сам посредник, он занимался и эти делом, и хотя он обязал, чтобы арендаторша заплатила (каждому) наказанному крестьянину по 2 руб. серебром, однако крестьяне от денег этих отказались и намеревались жаловаться высшим властям, но этого до сих пор не сделали, а посредник своего решения не отменил. Подобные действия отрицательно влияют на налаживание взаимоотношений в будущем, а т. к. без решения Главиого управления в подобных случаях не знаю, как поступать, считаю своей обязанностью Вам об этом доложить и просить распоряжения.

Управляющий слуцкими имениями К.Вагнер.

Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861—1862 гг.). Мн., 1959. С. 322—323.

Настаўнік гімназіі за якую-небудзь правіннасць спачатку абкладваўся грашовым штрафам, а затым яму выносілася вымова ад імя абшчыны. Ролю назіральнікаў і выхавальнікаў выконвалі вучні старэйшых класаў. Гэты парадак захоўваўся да XIX стагоддзя.

ПЕРАЎТВАРЭННЕ ВУЧЫЛІШЧА Ў ГІМНАЗІЮ

У 1620 годзе Януш VI Радзівіл завяшчаў свайму брату Хрыстафору адкрыць у Слуцку гімназію (на аснове вучылішча). Хрыстафор Радзівіл выканаў яго волю. Спецыяльнай граматай ён абвясціў у 1630 годзе аб адкрыцці ў Слуцку грамадскай гімназіі.

У XVII—XVIII ст. курс навучання ў гімназіі быў то 10, то 8, то 6 гадоў. Вучні размяркоўваліся па трох класах (у некаторыя перыяды існавалі IV і V класы): III (малодшы клас), II і I (самы старэйшы). У кожным класе тэрмін навучання быў разлічаны на два гады. Спосаб навучання быў класны, а не прадметны. На кожны клас прыходзілася па аднаму настаўніку.

У той час у Слуцкай гімназіі выкладаліся наступныя прадметы: Закон Божы, мовы (польская, лацінская, грэчаская, нямецкая), этыка, рыторыка, гісторыя, заканадаўства і матэматыка. Для тых, хто рыхтаваўся да прапаведніцкай дзейнасці, чыталася яшчэ старажытнаяўрэйская мова. Выкладанне вялося на польскай мове, але ў старэйшых класах прывучалі свае думкі выказваць па-лацінску. Урокі праводзіліся кожны дзень, за выключэннем нядзелі і свят, з 9 да 11 гадзін раніцы і з адной да 3—4 гадзін дня... Кожнае паўгоддзе праводзіліся публічныя экзамены, на якіх прысутнічалі прадстаўнікі вышэйшых улад, мясцовага грамадства і бацькі вучняў. (Заўважым: так было і ў школе Коменскага.) ...Пасля экзамену ганаровыя асобы, што прысутнічалі на ім, заносілі свае прозвішчы ў спецыяльны альбом. Ён вёўся ў Слуцкай гімназіі на працягу 142 гадоў і фактычна з'яўляўся яго рукапіснай гісторыяй: сюды запісвалі ўсе важныя падзеі з жыцця гэтай навучальнай установы, асоб, якія працавалі тут у якасці рэктараў і выкладчыкаў, а таксама тых, хто скончыў школу.

У пачатку навучальнага года праводзіліся ўступныя іспыты, у выніку якіх гімназія штогод папаўнялася новымі вучнямі (ад 10 да 25, бывала і менш). Той, хто канчаў курс гімназіі, меў даволі грунтоўныя для свайго часу веды. Паступова Слуцкая гімназія заваявала сабе славу далёка за межамі Беларусі. Педагогі лічылі за гонар узначальваць яе.

КАЛЬВІНІСЦКАЯ НАВУЧАЛЬНАЯ ЎСТАНОВА Ў 1775—1826 ГАДАХ

Пасля першага раздзелу Рэчы Паспалітай польскі ўрад увёў шэраг рэформ. Была створана спецыяльная адукацыйная камісія з найбольш адукаваных людзей тагачаснай Польшчы.

Кальвінісцкія вучылішчы і гімназіі ад нагляду камісіі ўхіліліся, але дух часу зрабіў сваю справу: літоўскі сінод, якому падпарадкоўвалася Слуцкая гімназія і які яе часткова фінансаваў, стварыў сваю Адукацыйную камісію. У яе склад увайшлі тры свецкія і тры духоўныя асобы.

Для кіраўніцтва сінод выдаў камісіі інструкцыю. Згодна з гэтай інструкцыяй, у гімназіі заставаліся тры класы, але раілася змяніць парадак выкладання прадметаў. У першым і другім класах павінны былі паперманна працаваць два настаўнікі ў залежнасці ад таго, хто з іх будзе адчуваць больш здольным да выкладання тых ці іншых навук. Такім чынам, камісія вырашыла ліквідаваць «пакласны» метад вы-

Наследие слуцкого края

кладання, калі адзін выкладчык вёў у класе ўсе прадметы. Гэта павінна было палепшыць якасць вучнёўскіх ведаў.

Кожны дзень на ўроках адводзілася па шэсць гадзін: тры раніцай і тры пасля абеду. Многія рэлігійныя святы ў гімназіі не адзначаліся. У гэтыя дні павінны былі праводзіцца заняткі.

Кола навук, якія вывучаліся ў гімназіі, пашыралася... Было ўведзена чыстапісанне і пачаткі геаграфіі, геаметрыя, трыганаметрыя і пачаткі фізікі.

...Рэформа гімназіі, распачатая ў 1775 годзе, завяршылася к 1778 году. З гэтага часу кальвінісцкая гімназія пачала называцца публічным евангелічным вучылішчам. Закончаны сярэдняй адукацыі з 1778 года яно не давала. У той перыяд пры Берлінскім, Лейдэнскім і іншых універсітэтах былі адкрыты акадэмічныя гімназіі. Выпускнікі Слуцкага і іншых евангелічных вучылішчаў спачатку займаліся ў акадэмічных гімназіях, а потым ва універсітэтах.

У канцы XVIII стагоддзя адбылася важная гістарычная падзея ў жыцці Слуцка: у 1793 годзе па другому падзелу Рэчы Паспалітай ён быў далучаны да Расіі. У той час у горадзе існавалі дзве навучальныя ўстановы: кальвінісцкае і каталіцкае павятовае вучылішчы.

У 1802 годзе ў Расіі было ўтворана міністэрства асветы. У гэтым жа годзе ўпершыню ў курс Слуцкага вучылішча ўключылі рускую мову (па дзве гадзіны на тыдзень у кожным класе). З 1803 года вучылішча пачало падпарадкоўвацца Віленскаму універсітэту.

...З 1809 года Слуцкая евангелічная навучальная ўстанова стала называцца «публічным павятовым вучылішчам». Сярод вучняў наглядаецца змяншэнне колькасці асоб кальвінісцкага веравызнання. У гэты перыяд вучылішча фінансавалася з дзвюх крыніц: з фондаў сінода і міністэрства асветы. Такім чынам, вучылішча, якое да 1809 года было прыватнай навучальнай установай, паступова пачало ператварацца ў звычайную ўрадавую навучальную ўстанову. Змена назвы «евангелічнае вучылішча» на «павятовае» змяніла і крыніцы фінансавання. Вучылішча ўтрымлівалася ў асноўным на сродкі дзяржавы...

ГІМНАЗІЯ Ў 1827—1863 ГАДАХ

У 1824 годзе была закрыта Кейданская (у Літве) кальвінісцкая гімназія. Кальвіністы Беларусі і Літвы такім чынам страцілі апошнюю сваю сярэднюю навучальную ўстанову. Віленскі кальвінісцкі сінод і слуцкае дваранства звярнуліся да міністра асветы Расіі з просьбай пераўтварыць Слуцкае павятовае вучылішча ў гімназію. Па прадстаўленню міністра цар дазволіў гэта зрабіць. Так, амаль праз паўстагоддзя кальвінісцкая навучальная ўстанова зноў стала гімназіяй. Яна ў той час складалася з трох класаў павятовага вучылішча і трох гімназісцкіх класаў.

...У 1829 годзе пачалося будаўніцтва мураванага будынка гімназіі, у якім зараз размяшчаюцца майстэрня і музей слуцкай сярэдняй школы № 1. Яно працягвалася да 1840 года, бо не было сродкаў.

Яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя Слуцкая кальвінісцкая навучальная ўстанова пачала страчваць свой рэфарматарскі характар. У гэты перыяд на некаторы час у ёй узмацняецца польска-каталіцкі ўплыў. Спрадвеку выкладанне тут вялося на польскай мове. У вучылішчы вялікае месца займала вывучэнне рыторыкі і паэзіі, якія фактычна з'яўляліся курсамі польскай мовы і гісторыі польскай літаратуры. Аб моцным польскім уплыве ў сценах вучылішча сведчыць і той факт, што выкладчык польскай мовы лічыўся старшым, а рускай — малодшым.

Паступова ў сценах гімназіі пачала разгортвацца барацьба паміж прадстаўнікамі польскай і рускай культур. Яна дасягнула свайго кульмінацыйнага пункту ў 1862—1863 гадах. Прычыны гэтай барацьбы зразумелыя. Пасля далучэння Слуцка і яго акругі да Расіі на «новых землях» руская культура сутыкнулася з польскай. Прыхільнікі польскай культуры лічылі Слуцк сваім горадам. Беларуская мова і культура ў разлік не прымаліся. Узмацненне каталіцкага ўплыву ў кальвінісцкай навучальнай установе тлумачылася і тым, што колькасць кальвіністаў у краі значна паменшылася, а значыць, стала менш іх дзяцей у вучылішчы. Гэтыя месцы занялі дзеці польскіх магнатаў і аналячанай шляхты. (Далучэнне Слуцка і яго акругі да Расіі не адразу вызвалілі Случчыну ад польскага ўплыву, бо доўга яшчэ многія маёнткі

Наследие слуцкого края

Случчыны і іншых рэгіёнаў Беларусі заставаліся ў руках польскіх магнатаў.) Акрамя таго, узмацненне польскага ўплыву ў гімназіі было своеасаблівай рэакцыяй прыхільнікаў польскай культуры на царскую палітыку русіфікацыі, якую яно праводзіла ў Беларусі.

У 1809—1836 гадах Слуцкая навучальная ўстанова двойчы рэфармавалася: уводзіліся новыя прадметы, упершыню быў прызначаны свецкі дырэктар; паступова школа пачала пераходзіць з польскай на рускую мову выкладання. Прыхільнікі польскай культуры вялі то тайную, то адкрытую барацьбу супраць рэформ. Аб гэтым сведчаць многія факты. Вось адзін з іх: 24 верасня 1833 года вучні-каталікі ў час богаслужэння ў касцёле ўхіліліся ад паўтарэння малітвы, у якой заключалася маленне аб здароўі і мнагалецці «яго імператарскай вялікасці і ўсяго аўгусцейшага дома.

...Вышэйшае начальства прыняло рашэнне рэфармаваць школу. Сутнасць гэтай рэформы заключалася ў тым, каб Слуцкую гімназію яшчэ больш наблізіць да ўрадавых навучальных устаноў.

У справу ўмяшаўся нават сам цар. Міністр асветы Уараў падаў тады ў камітэт міністраў спецыяльную запіску аб пераўтварэнні Слуцкай гімназіі. Цар 3 ліпеня 1855 года на гэтай справе наклаў рэзалюцыю: «Слуцкую гімназію па ўладкаванню наблізіць да іншых гімназій у заходніх губернях, прызначыўшы ў яе асобнага свецкага дырэктара з прызначэннем яму 600 рублёў у год і 150 рублёў серабром на кватэру і канцылярскія прыпасы».

...На падставе рашэння цара на гімназію быў распаўсюджаны статут 1828 года, якім кіраваліся ў той час навучальныя ўстановы... Беларуская акруга абавязала выкладчыкаў гімназіі «ўсе навукі выкладаць на рускай мове і па рускіх кніжках». Пераход на рускую мову адбываўся павольна.

...У перыяд паміж 1835 і 1863 гадамі ў жыцці гімназіі адбываліся і іншыя пераўтварэнні, бо рэформа 1836 года была не поўнай. У гэты перыяд увялі плату за навучанне, якая паступова павялічвалася. Таму лік гімназістаў з простых людзей змяншаўся, а з панскіх — павялічваўся.

...У асяроддзі выкладчыкаў барацьба паміж прыхільнікамі польскай культуры, з аднаго боку, і рускай з другога — знайшла сваё адлюстраванне нават у пратаколах пасяджэнняў педагагічнага савета.

27 сакавіка 1862 года педагагічны савет, абмяркоўваючы чарговы праект статута агульнаадукацыйных навучальных устаноў, у першым пункце рашэння выказаў патрабаванне: «увесці ў народныя вучылішчы і настаўніцкія інстытуты Жмудзі і ўласна Літвы навучанне чытанню і пісьму на польскай і літоўскай мовах, а ў заходніх губернях — на польскай, прадстаўляючы гэта жаданню мясцовых жыхароў». (Пад мясцовымі жыхарамі члены педсавета, што галасавалі, мелі на ўвазе польскіх паноў і апалячаных беларусаў.)

У другім пункце было запісана: «Выратаваўчыя і цудоўныя пастановы новага



Новы будынак Слуцкай гімназіі. Архітэктар К.Падчашынскі.

Наследие слуцкого края

праекту па мясцовых умовах Остзейскага краю не распаўсюджвающца на Дэрпцкую акругу. Чаму ж Віленская навучальная акруга... пазбегла такога лёсу?».

Формула «Выратаваўчыя і цудоўныя пастановы новага праекту» — гэта ўсяго толькі дымавая заслона слуцкіх педагогаў, за якой хаваецца ўзмоцненая русіфікатарская палітыка царызму ў Беларусі. Калі эстонцам і многім іншым так званым «інародцам» у нейкай меры дазвалялася пры навучанні дзяцей карыстацца роднай мовай, то беларусы і ўкраінцы былі пазбаўлены такой магчымасці. Парадаксальна, але факт: самыя блізкія па крыві да рускага народа беларусы і ўкраінцы ставіліся царызмам у самыя цяжкія ўмовы. Пазней рэакцыйны міністр асветы Д.А.Талстой у пункце трэцім сваіх правіл «О мерах к образованию населяющих Россию инородцев» беларусаў, украінцаў і некаторыя іншыя народы аднёс да групы «народаў, якія дастаткова абруселі». Дзякуючы гэтых народаў Талстой патрабаваў вучыць толькі на рускай мове. Гэты ж міністр-рэакцыянер сфармуляваў тады такую думку: «Канчатковай мэтай адукацыі ўсіх іншародцаў, якія жывуць у межах нашай айчыны, бясспрэчна, павінна быць абрусенне іх і зліццё з рускім народам».

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Родчанка Р.В. Старэйшая школа Беларусі. Мн., 1985. С. 6—10, 17—19, 23—25, 27—29, 30, 31—33.

СТАТУТ СЛУЦКАЙ ШКОЛЫ. СА «ЗВАРОТУ ДА ЧЫТАЧА»

У 1628 годзе ў Любчы на лацінскай мове быў выдадзены статут Слуцкай школы. Аўтары яго — педагогі-гуманісты Рэйнгальд Адамі, Андрэй Музоніус і А.Дабранскі, якія выкладалі ў гэтай установе.

...У гэтай школе ёсць усё, што неабходна для дасягнення найвышэйшай ступені ўдасканалення. Тое, што іншым ліцэям здабыло славу і значэнне, ёсць у дастатку і ў нас. Чысціня неба, урадлівасць глебы, багацце лясоў, садоў, рэк, лугоў у гэтым ласкавым клімаце настолькі вялікія, што можна падумаць, бышцам шчодрымі рукамі самой прыроды, музамі і грацыямі ўсё гэта ад самага пачатку было выхавана і ўпрыгожана. Да гэтага трэба дадаць таленавітасць жыхароў..., якая ні ў чым не саступае харству і замілаванню мясцовасці. Вельмі чалавечныя іх адносіны да чужаземцаў... І яны гатовы ў любы час і ў любым месцы прыйсці на дапамогу як вучням, так і настаўнікам. Гэтую гуманнасць насельніцтва яшчэ больш дапаўняюць іншыя незлічоныя годнасці, якімі добрае неба абдарыла гэты край. У такіх умовах лёгка развіваюцца вялікія таленты, а ім часцей за ўсё спадарожнічаюць бязлітасныя багіні Галеча або Беднасць...

У школе ажыццяўляецца рух наперад не толькі для знешніх даброт жыцця, але, галоўным чынам, да ўнутранага, духоўнага развіцця. Да гэтага заклікае стараннасць вучоных: яны трывала стаяць на дазорнай школьнай вежы, пастаянна рупліва і зорка сочаць за бестурботнай і санлівай моладдзю, клапоцячыся аб яе карысці... Прыходзьце ж усе, каму дарагая радзіма, хто правільна ацэньвае мэтанакіраванасць сваіх учынкаў! Нікому не зыкрыты шлях! Адчынены дзверы, што вядуць да нашых грацый і муз, для ўсіх сумленных і шчырых людзей. Узрост, становішча, веравызнанне не маюць для нас ніякай розніцы. Месца на гэтых школьных зэдлях прадстаўляецца бедняку не менш, чым прыхільніку Рэфармацыі. І ўрэшце, хай нікога не адштурхне ад нашага парога разыходжанне ў рэлігіі, хай не адарве ад валодання даступным шчасцем з-за беспадстаўнага страху... Мы ўжо даўно навучаны вопытам, што рэлігія — прадмет пераканання, а не насілля, і што замахваюцца на нябесныя замкі з безразважнай дзёрзкасцю тыя, хто распаўсюджвае зман сваёй веры на свядомасць і на закон.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кн.: Антология педагогической мысли Белорусской ССР. Мн., 1986. С. 95.

З гісторыі Слуцкай гімназіі

У фондах Слуцкага краязнаўчага музея захоўваецца брашура «Справаздача аб стане Слуцкай гімназіі ў 1901/02 навучальным годзе». Складальнікам яе з'яўляецца сакратар педсавета Ф.І.Гейнцэ, а выдадзена яна ў друкарні Я.Х.Яброва ў 1903 г. у Слуцку.

У справаздачным навучальным годзе гімназія складалася з 8 нармальных класаў і падрыхтоўчага. Апошні быў адкрыты з дазволу Міністэрства народнай адукацыі ў 1898 г. і ўтрымліваўся за кошт сумы збору з навучэнцаў (45 руб. у год з вучня) і субсідый ад Слуцкага гарадскога ўпраўлення. Астатнія класы ўтрымліваліся на сумы з Дзяржаўнага казначэйства і са

Наследие слуцкого края

збору за навучанне. Узначальваў гімназію дырэктар — стацкі саветнік Міхаіл Міхайлавіч Іваноўскі, які выкладаў лацінскую мову, быў класным кіраўніком, старшынёй гаспадарчага камітэта і праўлення Таварыства дапамогі вучням гімназіі, якія жывуць у нястачы, сябрам старшыні Слуцкага камітэта апякунства і членам Мінскага епархіяльнага вучылішчнага савета. У штаце гімназіі было 19 настаўнікаў, 3 памочнікі класных настаўнікаў, доктар А.В.Більдзюкевіч, дантыст І.Эпштэйн, 2 пісьмаводы.

У той час месца размяшчэння гімназіі было своеасаблівым гарадком: 5 жылых пабудоў, двухпавярховы мураваны будынак і халодныя прыбудовы. Усе класы, апрача гімнастычнага і падрыхтоўчага, размяшчаліся ў мураваным, апошнія два — у драўляным будынках, тут жа былі канцылярыя і карцэр. Са справаздачы відаць, што будынак не зусім адпавядаў патрабаванням сярэдняй навучальнай установы, бо не было асобнага памяшкання для бібліятэкі, пакоя для захавання верхняй вопраткі, памяшкання для прыёму бацькоў вучняў, асобных класаў для малявання. Вельмі малы клас для заняткаў фізікай. Выкладчыкі жылі ў дамах на тэрыторыі гімназіі. Вучні — хто дома, а хто на кватэрах.

Пры гімназіі былі бібліятэкі — фундаментальная (8217 экзэмпляраў) і 9 вучнёўскіх (3308 тамоў). Літаратура набывалася штогод. Якія ж набыткі лічыліся самымі каштоўнымі? Гэта — Поўны збор прамоў у рускім перакладзе Цыцэрона, творы ў вершах і прозе В.А.Жукоўскага, «Юнацкія гады Пушкіна», «Расія ў канцы XIX ст.» і іншыя. Для бібліятэкі выпісваліся газеты і часопісы — «Фізіялагічныя запіскі», «Рускі архіў», «Веснік доследнай фізікі», «Пытанні філасофіі і псіхалогіі», «Веснік выхавання», «Мінскія губернскія ведамасці» і іншыя. Усяго 27 назваў.

У 1902 г. у гімназіі навучалася 250 чалавек. Для вучняў былі зацверджаны стыпендыі: барона Нолькіна — 100 руб., Настассі Пратапопавай — 20 руб., стацкага саветніка Пратапопава — 66 руб., Вольгі Багушэўскай — 72 руб., імператара Аляксандра — 20 руб. Вывучаліся наступныя прадметы: руская, лацінская, грэчаская, нямецкая, французская мовы, руская славеснасць, логіка, Закон Божы, матэматыка і касмаграфія, геаметрыя і трыганаметрыя, гісторыя і геаграфія, музыка, спевы, маляванне і чыстапісанне. Яўрэйскія дзеці вывучалі Закон яўрэйскай веры.

У актавай зале праводзіліся літаратурныя, вакальна-музычныя вечары, чытанне па светлавых малюнках, урачыстае ўручэнне атэстатаў сталасці. Два разы ў год, у добрае надвор'е, вучні разам з настаўнікамі пад гукі аркестра накіроўваліся на прагулкі па шашы ў напрамку да станцыі Ляхавічы.

Са справаздачы відаць, што школа мела на сваё ўтрыманне 42 997 руб. З іх казначэйствам было адпушчана больш за 26 тысяч, а ахвяраванні прыватных асоб і розных таварыстваў складалі больш як 3 тысячы руб. Грошы прызначаліся на рамонт будынкаў, афармленне класаў, набыццё інвентару,



Жаночая гімназія. Пачатак XX ст.

Наследие слуцкого края

выдачу ўзнагарод і стыпендый, аплату працы ніжэйшым служачым, урачу.

Асобнай главой вылучана справаздача аб стане народных чытанняў пры гімназіі. Усяго за год іх праведзена 14, прысутнічала 3839 чалавек. У гімназіі былі 33 калекцыі светлавых карцін для чытання па брашурах, зацверджаных Камісіяй па наладжванні народных чытанняў. Сярод іх — «Императрица Екатерина II Великая», «Народная война 1812 года», «Начало христианства на Руси и Св. Владимир», «Великий пост», «Белорусский край», «Полтава. Поэма Пушкина», «Краткий очерк о жизни и деятельности генералиссимуса русской армии гр. Суворова» і іншыя. Чытанні праводзілі настаўнікі І.А.Глебаў, В.А.Берсянёў, М.Н.Туманаў, Ф.І.Гейнцэ, Я.В.Васільеў, В.С.Львовіч і В.С.Вагін. Плата за наведванне чытанняў не бралася.

Падрыхтавала В.С.Відлога.

Дакументы сведчаць

НОВЫЯ СТЫПЕНДЫІ Ў СЛУЦКАЙ ГІМНАЗІІ

1) Капитал в 500 руб., находящийся в 4% бумагах, пожертвованный бывшим и. д. инспектора Слуцкой гимназии, статским советником Н.Д.Протопоповым, в память 25-летия царствования в Бозе почившего Государя Императора Александра II, на стипендию имени Анастасии Протопоповой. Высочайшее соизволение на учреждение стипендии последовало 4 июня 1880 года, причем Его Императорскому Величеству благоугодно было повелеть благодарить жертвователя. Положение о стипендии было утверждено управляющим министерством народного просвещения 9 июня 1880 года.

2) Находящийся в 4% бумагах капитал в 500 руб., собранный служащими и учащимися в Слуцкой гимназии, в память избавления драгоценной жизни в Бозе почившего Государя Императора Александра II 19 ноября 1879 года. Высочайшее соизволение на такую стипендию последовало 29 ноября 1880 г., причем Государю Императору благоугодно было повелеть: «благодарить жертвователей». Проект положения о стипендии утвержден управляющим министерством народного просвещения 3 декабря 1880 года.

3—4) Две стипендии на капиталы, завещанные отставным лейб-гвардии Литовского полка полковником Карлом Станиславовичем бароном фон-Нолькеном, в 1000 руб. по акту, состоявшемуся в Варшаве 15—27 июля 1848 г., и на капитал в 2000 руб. по завещанию в Эмсе 25 июля—6 августа 1868 года. Высочайшее соизволение на учреждение стипендий имени барона Карла фон-Нолькена последовало 22 апреля 1880 года. Положение о стипендии утверждено управляющим министерством народного просвещения 27 апреля 1880 года.

5) Капитал в 1400 руб., собранный в 1881 году на пожертвования чиновников г. Слуцка и некоторых дворян Слуцкого уезда, на стипендии имени б. и. д. инспектора Слуцкой гимназии, статского советника Николая Даниловича Протопопова. Высочайшее соизволение последовало 5 декабря 1881 года, и положение о стипендии было утверждено министром народного просвещения 15 ноября 1883 года.

6) Капитал в 500 руб., собранный служащими в Слуцкой гимназии, с тем, чтобы проценты с него, в виде премии, были выдаваемы один раз в год тому из учеников VIII и VII классов Слуцкой гимназии, кто на особую тему патриотического содержания представит лучшее сочинение по русской словесности или русской истории, в память Священного Коронования Их Императорских Величеств 15 мая 1883 года. Высочайшее соизволение на учреждение таковой премии последовало 10 июля 1883 года. Положение о стипендии утверждено министром народного просвещения 6 января 1886 года, на основании Высочайшего повеления, от 30 декабря 1885 года.

Историческая записка о Слуцкой гимназии... Составил Иван Глебов. Вильно, 1903. С. 156—157.

ДАНЯСЕННЕ КІРАЎНІКА ВІЛЕНСКАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ АКРУГІ Ў МІНІСТЭРСТВА НАРОДНАЙ АСВЕТЫ АБ СТАНОВІШЧЫ Ў СЛУЦКАЙ ГІМНАЗІІ

15 красавіка 1906 г.

Директор Слуцкой гимназии донес Управлению учебного округа, что бывшая в этой гимназии ученическая демонстрация произошла при следующей обстановке:

Наследие слуцкого края

Еще с утра 16 марта, на первых двух уроках, было заметно выжидательное и неспокойное настроение учеников некоторых классов; на переменах перед третьим уроком из VI класса вышла группа учеников, к которым примкнули преимущественно евреи из других классов; эта группа, загородив нижний коридор, сосредоточилась у лестницы, ведущей на второй этаж. Ученик VI класса Баранчик Иван внезапно развернул надетый на палку черный флаг, длиною 11/2 аршина и шириною в аршин, с красными каймами и полосой по диагонали; на этой полосе черными буквами было напечатано: «Долой смертную казнь», а на самом флаге белыми буквами: «Память павшим борцам за свободу». Раздалось громкое пение революционного марша: «Вы жертвою пали в борьбе роковой» со стороны учеников, сгруппировавшихся у флага. И. об. инспектора Пряникова, удерживая учеников, хлынувших с другого конца нижнего коридора, немедленно послал к директору служителя на верхний этаж в учительскую комнату, у дверей которой стоял директор, наблюдая в то же время за порядком в актовом зале. Спускаясь по лестнице и с трудом направляя скучившихся на ней учеников по классам, директор пришел в нижний коридор уже после того, как ученик VII класса Ратнер успел прокричать следующие слова: «Товарищи, мы протестуем против смертной казни Шмидта, Пулихова и прочих, против всяких стеснений свободы... Да здравствует русское революционное движение». Эти слова были подхвачены криком «Ура» и пением демонстрантов. Громкие приказания директора ученикам прекратить пение и идти по классам были заглушены еще более громким пением демонстрантов и шумом, поднятым любопытствующими учениками; тем не менее ученики не решились противиться настоянию директора, поддержанному г. Пряниковым, и после непродолжительного колебания и суматохи, разошлись по классам, куда немедленно направились и приглашенные директором через помощника классных наставников преподаватели. Вся описанная сцена длилась не более пяти минут. В коридоре осталась небольшая группа учеников V и VI классов, которая активно противодействовала демонстрантам и не хотела теперь вступать с ними, в виду их буйной несдержанности, в какие-либо объяснения. В VI классе демонстранты-евреи и Баранчик еще продолжали петь марш; директор вместе с преподавателем г. Шабаком вошел туда, заставив прекратить пение и направив на места учеников Кохановича, Барановского и Петрашкевича Владислава, противившихся демонстрации. При их входе Гецов, Иохельсон, Слободский и Баранчик начали громко говорить: «подлецы, изменники, черносотенцы», но те дали им в приличном виде дружный отпор, и только присутствие директора не позволило разгореться крупной перебранке. Замечательно то, что ученики VI класса Барановский и Петрашкевич Владислав, которые за участие в октябрьских беспорядках прошлого года были 14 января сего года подвергнуты выговору директора, 16 марта оказались настойчивыми противниками демонстрации. Вообще, об этой демонстрации, подготовленной, по словам председателя комитета родителей г. Костецкого, уволенными из Минской гимназии учениками (из таковых к директору являлся еще 11 марта с просьбою о принятии в VIII класс Фрумкин, которому директор отказал), накануне знала довольно малочисленная группа учеников, не более 30-ти; прочие из склонных к подобным демонстрациям в другое время, может быть, и примкнулись бы к певшим революционный марш 16 марта, но теперь, будучи обижены, что их не спросили раньше, не поддержали демонстрантов, которые остались в одиночестве. Как только был водворен порядок на 3-м уроке, директор немедленно пригласил г. Костецкого для ознакомления с происшедшим и отца ученика VII класса Ратнера; в конце 3-го урока явился Ратнер, которому был сдан на руки сын его; затем были приглашены родители прочих демонстрантов, опрошенных директором в присутствии г. Пряникова при родителях. Вина каждого из демонстрантов тут же была доказана и подтверждалась их сознанием; некоторые пытались оправдаться стихийным увлечением, но вместе с тем заявляли, что считали своим нравственным долгом выразить протест против смертной казни; другие, как Ратнер, Карпман Бенециан и Пупко Исаак, старались умалить свою вину: Ратнер говорил, что произнес слова: «Да здравствует русское революционное движение», лишь потому, что на него пал жребий на ученической сходке, бывшей накануне; Карпман Бенециан заявлял, будто он не пел марша, а только стоял возле певших, и будто упомянутая сходка имела место в гимназии на коридоре в конце большой перемены; Пупко Исаак, пытавшийся доказать свое алиби, прямо лгал: он был замечен г. Пряниковым в числе демонстрантов; кроме того, классный наставник г. Барбье, дежуривший 16 марта на верхнем коридоре у I и IV классов, видел, как Пупко и Исаак, возвратившись в свой класс вместе с Карпманом Эммануилом, продолжал сам петь революционный марш и подстрекал к тому других. Что же касается учеников VII класса Ратнера Самсона и Карпмана Бенециана, то они, по наблюдениям директора и г. Пряникова, были главными ру-

Наследие слуцкого края

ководителями агитации между учениками, относились к ученическим обязанностям, как и прочие демонстранты, небрежно, часто опаздывали, иногда манкировали уроками, постоянно выходили из класса, заводя какие-то секретные разговоры с выходившими, видимо по предварительному уговору, из других классов, а на уроках занимались безцеремонно то писанием записочек к соседям, то чтением посторонних книг. Об изложенных дефектах их поведения было своевременно сообщено их родителям. Кроме того, Карпман Бенецыан, как сообщил директору, отношением от 16 минувшего марта, за № 1027, Слуцкий уездный исправник, являвшийся в гимназию по приглашению директора во время четвертого урока 16 того же марта, был задержан 11 марта в 9 часов вечера полицейскими надзирателями города Слуцка на тайной сходке в доме Деревенского с другими 14-ю молодыми людьми и, по выяснению личности, освобожден с привлечением к ответственности по пункту 1-му обязательных постановлений Начальника губернии от 10 декабря 1905 года. После опроса 14 учеников, замеченных на коридоре директором и г. Пряниковым у флага, который по приказанию директора, был взят у лестницы и отнесен служителю в комнату инспектора, в 21/2 часа пополудни началось экстренное заседание педагогического совета, а в 8 часов вечера г. Костецкий созвал на заседание комитета родителей.

В последующие дни, особенно 17 и 18 марта, среди учеников была замечена агитация: даже ученики VIII класса волновались, постоянно отпрашивались выйти с урока и заходили на переменах в другие классы; усиленный надзор за агитировавшими доставил много хлопот инспекции и директору. Тем не менее благоразумие одержало верх: агитаторы не встретили поддержки у более спокойных товарищей, и до самого роспуска на пасхальные вакации после уроков 24 марта порядок учения в гимназии, хотя и не без усилий со стороны педагогического персонала, был соблюден. Проявлялись отдельные случаи нарушения порядка, но после принятия соответствующих мер порядок был немедленно восстановлен. В IV классе на перемене 20 марта ученик Гродзицкий незаметно для преподавателя Даляка швырнул в классную доску хлопушку со взрывчатой смесью, которая произвела сильный треск на подобие пистолетного выстрела; в III классе, по вине дежурного ученика Тельшовта и по сговору прочих учеников, были уничтожены 22 марта тетради по рисованию; виноватые, по обнаружении их, подвергнуты взысканиям. Вообще, с 14 января по 24 марта учение не прекращалось, 3-я четверть учебного года, продленная до 23 марта, с прибавлением к ней первой недели великого поста, дала достаточный материал для оценки успехов учеников; курсы предметов, положенные по программе, пройдены от начала года более, чем на половину, а по некоторым предметам близятся к концу.

Фонды Слуцкага краязнаўчага музея. Копія.

Слуцкая духоўная семінарыя

Слуцкая духоўная семінарыя была заснавана паводле ўказа Кацярыны II ад 15.5.1785 г. На ўтрыманне гэтай установы з расійскай казны штогод адпускалася 2000 рублёў асігнацыямі. Дзякуючы намаганням епіскапа Віктара Садкоўскага заняткі пачаліся ўжо 15.9.1785 г., праўда, толькі ў двух, ніжэйшых, класах, якія мелі назвы «низшаго и высшаго грамматических».

Першыя гады дзейнасці семінарыі былі нялёгкімі па розных прычынах. Нежаданне свяшчэннаслужыцеляў адпраўляць сваіх дзяцей у семінарыю ўскладняла камплектаванне класаў. Як правіла, бедныя святары не маглі аплаціць навучанне сваіх дзяцей у семінарыі, не хацелі пазбаўляць сваю сям'ю лішняга работніка, ды і на вучобу ў семінарыі глядзелі, як на муштру. Таму з кансісторыі адпраўляліся ў аддаленыя прыходы «нарочные», якія прымусам забіралі дзяцей святароў і везлі іх у семінарыю.

Да 1798 г. семінарыя не мела свайго будынка. Семінарысты займаліся ў трапезнай Слуцкага Троіцкага манастыра, некалькі класаў адначасова. Не хапала вопытных і дастаткова падрыхтаваных настаўнікаў.

Пад час паўстання Т.Касцюшкі, 18.4.1789 г., епіскап В.Садкоўскі быў арыштаваны, у ліпені 1790 г. семінарыя прыпыніла работу. Толькі праз два з палавінай гады, пасля вызвалення В.Садкоўскага, дакладней, 8.1.1793 г., заняткі былі адноўлены. З 13.4.1793 г. епархія перайменавана ў Мінскую, гэту ж назву атрымала і семінарыя, хоць да 1840 г. яна заставалася ў Слуцку.

Праз штрафы і пагрозы адхілення ад свяшчэннаслужэння і высылкі дзяцей у

Наследие слуцкого края

салдаты за непаслушэнства, а таксама арганізацыю ў семінарыі казённакоштных вакансій, новы епіскап Іоў Пацёмкін дабіўся таго, што колькасць вучняў семінарыі значна павялічылася і дасягнула ўжо ў 1800 г. 80 чалавек; вучні цяпер своечасова вярталіся з вакацый. Атрымалі магчымасць вучыцца ў семінарыі дзеці псаломшчыкаў і сіроты духоўнага звання, для падрыхтоўкі якіх былі адкрыты «заправныя» класы з элементарнымі курсамі лацінскай, польскай, рускай граматы. У той жа час «праздные» дзеці святароў, якія не жадалі вучыцца, былі прызначаны на псаломшчыцкія месцы.

Клапаціўся Іоў і аб правільным ходзе навучальнага працэсу ў семінарыі. Так, у 1799 г. ён выдаў распараджэнне (аналагічнае выдаў яшчэ В.Садкоўскі ў 1787 г.), якое абавязвала святароў пад пагрозай пазбаўлення месца і штрафаў навучаць дзяцей перад паступленнем у семінарыю асновам польскай і рускай моў. Паступова былі адкрыты і вышэйшыя класы: у 1803 г. — філасофскі і ў 1806 г. — багаслоўскі. У выніку завяршылася ўпарадкаванне семінарыі і яна стала «полною» з усімі класамі. Фактычна семінарыя сумяшчала курсы ніжэйшай і сярэдняй духоўнай школы. Былі пабудаваны і першыя семінарскія будынкі: у 1798 г. «училищный» дом для класаў, а ў 1799 г. «сиротский» дом для пражывання «казённых» вучняў.

Палепшылася матэрыяльнае становішча навучальнай установы: з 1799 г. адпускалася з казны на семінарыю ўжо па 3000 рублёў асігнацыямі, а з 1807 г. — па 6000 рублёў. Тым не менш умовы быту вучняў і настаўнікаў семінарыі з прычыны хуткага росту іх колькасці аставаліся цяжкімі. У 1800 г. на поўнае ўтрыманне казённакоштнага вучня ў год траціла толькі 35 рублёў. Таму новы архірэй Мінскай епархіі архіепіскап Серафім (Глагалеўскі) многа зрабіў для паляпшэння матэрыяльнага побыту вучняў і настаўнікаў з мэтай спыніць як ухіленне вучняў ад вучобы, так і пераход настаўнікаў на свецкую, больш аплачваемую службу. Ён павялічыў колькасць казённакоштных вакансій для вучняў, прымусіў Дзятловецкі манастыр пастаўляць значную колькасць разнастайных прадуктаў харчавання настаўнікам і вучням.

Усё гэта дало магчымасць мірнаму працвітанню і шырокаму развіццю семінарыі, але вайна 1812 г. прывяла яе да поўнага разарэння. Французы пад час вайны 3 тыдні жылі ў семінарскіх будынках. У выніку гэтыя будынкі хоць і захаваліся, але былі значна пашкоджаны, бібліятэка разрабавана і часткова спалена, семінарскі архіў страчаны. Аднак 20.2.1813 г. семінарыя была адноўлена, адрамантаваны найбольш пашкоджаныя памяшканні. Але на прывядзенне семінарыі ў ранейшы парадак спатрэбіліся гады.

Канчатковае аднаўленне супала з поўным і карэнным пераўтварэннем семінарыі, якое адбылося 20 верасня 1817 г. — на падставе зацверджанага імператарам даклада асобага камітэта ад 1807 г. аб пераўтварэнні ўвогуле ўсіх семінарый. Семінарыя распалася на тры духоўна-вучэбныя ўстановы: уласна семінарыю, павятовае і прыходское вучылішчы. Да семінарыі адышлі чатыры старэйшыя класы ранейшай змешанай школы: піітыка, рыторыка (зліліся ў адзін), філасофія і багаслоўе; з двух граматычных класаў утварылася павятовае, а з двух «заправных» — прыходскае вучылішчы. Курс семінарскага навучання быў размеркаваны так: два гады прызначаліся для славесных навук, да якіх дадавалася ўсеагульная гісторыя; два гады — для філасофскіх навук, з дабаўленнем матэматыкі і фізікі, і два гады — для класа багаслоўскіх навук, а таксама царкоўнай гісторыі. Па трох асноўных групах навук семінарскага курса і самі класы, дзе яны выкладаліся, называліся: вышэйшае аддзяленне, або багаслоўскі клас, сярэдняе, або філасофскі, і ніжэйшае, або клас славеснасці. Акрамя гэтых дысцыплін вучні вывучалі і мовы — грэчаскую, французскую, нямецкую, яўрэйскую і польскую. Выкладанне галоўных навук вялося на лацінскай мове. Праверка і ацэнка вучнёўскіх ведаў праводзілася шляхам экзаменаў, якіх было два на год: адзін — у другой палавіне снежня, а другі — гадавы, пасля якога праводзіўся і агульны публічны, на якім прысутнічалі госці і архірэі.

14.9.1840 г. семінарыя пераехала ў Мінск. У Слуцку ж засталося толькі мужчынскае духоўнае вучылішча, якое існавала да пачатку XX ст.

Сярод выпускнікоў семінарыі былі вядомыя вучоныя, краязнаўцы, гісторыкі, дзяржаўныя дзеячы. Так, І.П.Барычэўскі-Тарнава зарэкамендаваў сябе як археолаг,

Наследие слуцкого края

гісторык, этнограф, фальклярыст, быў членам савета міністра шляхоў зносін, рэдактарам 5-га тома выдання «Акты Заходняй Расіі», аўтар шэрагу публікацый і артыкулаў па розных галінах ведаў; адзін з першых пачаў вывучаць гісторыю і старажытнасці народаў Вялікага княства Літоўскага. І.А.Гашкевіч — дырэктар Азіяцкага дэпартамента, першы расійскі консул у Японіі, адзін з першых іншаземцаў, якому дазволілі наведаць унутраную Японію, даследчык Японіі і Кітая, адзін з сааўтараў першага ў Расіі «Японска-рускага слоўніка», адзначанага медалём Пецярбургскай АН і Дзямідаўскай прэміяй; яго імем названы заліў у Паўночнай Карэі і невядомыя раней віды насякомых (першым іх апісаў). Ф.І.Салаўевіч — пракурор «Белорусской коллегии» пад час уз'яднання уніятаў з праваслаўнай царквой.

С.М.Васовіч.

З гісторыі музычнага жыцця

Якім было музычнае жыццё Слуцка ў сярэдзіне мінулага стагоддзя? Мяркуючы па артыкуле Аляксандра Жалезняка (Аляксандра Баліцкага) «Мінская губерня ў музычных адносінах», апублікаваным у 49, 50 і 52 нумарах часопіса «Рух музычны» за 1858 год, — гэта жыццё не было такім ужо і бедным.

...Што ж датычыцца Слуцка, то ў яго ваколіцах найбольш славіўся Пётра Карафа-Корбут. «Гэта быў музыка вышэйшага разраду. Іграў на ўсіх інструментах і многа пісаў. Некаторыя яго кампазіцыі друкаваліся. Пераважна гэта былі танцы, паланезы, мазуркі, англезы. У свой час яны карысталіся поспехам. А некаторыя з іх — і цяпер».

Сярод слуцкіх музыкантаў Жалязняк называе надзвычай здольнага гітарыста Кароля Стрэлку, які вучыўся ў самога Джульяні, выпускніка Пражскай кансерваторыі, чэха родам Яна Каляшоўскага, настаўнікаў ігры на скрыпцы і фартэпіяна Антона Лінкевіча і Францішка Лапату, флейтыста, віяланчэліста і мастака Яна Гесе. У рэпертуары настаўніка гісторыі Слуцкай гімназіі віяланчэліста Мікалая Бакушэўсага былі «амаль усе творы Ромберга, Серве, Пляцці, Шуберта». Мясцовыя і прыезджыя артысты давалі ў Слуцку сольныя канцэрты. Сярод гастралёраў названы і дзеці В.Дуніна-Марцінкевіча Міраслаў і Каміла.

У іншых карэспандэнцыях для варшаўскага часопіса «Рух музычны» А.Жалязняк паведамляў аб выступленнях у Мінску і Слуцку К.Трапянскага, які выканаў на скрыпцы і кларнеце творы Шуберта, Аляб'ева і Давіда.

Друкуецца па кн.: Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974. С. 136—137.

Скарбы продкаў

Упершыню прозвішча Бергеля сустрэлася мне год з дзесяць назад у брашуры беларускага пісьменніка-ліберала Аляксандра Ельскага. Называлася яна «Паведамленне пра бібліятэку Юльяна Бергеля, пастара ў Слуцку». Брашура пісалася ў 1883 г. Ельскі падрабязна апісвае і падарожжа са свайго маёнтка Замосце ў Слуцк, якое зрабіў ён з дачкой Аляксандрай, жонкай вядомага этнографа З.Глогера, і вонкавы выгляд Слуцка, і гісторыю горада. ...Але найбольшай славутасцю Слуцка Ельскі лічыў бібліятэку Бергеля, у якой захоўваліся рэдкія выданні — усяго каля тысячы тамоў. Асабліва ганарыўся Бергель сваімі рукапісамі, напрыклад, успамінамі аб пакаранні смерцю Казіміра Лышчынскага, якія ў 1690 г. накідаў на паперу цесць беларускага філосафа-атэіста.

Спачатку брашура Ельскага звярнула маю ўвагу зусім не з поваду бібліятэкі Бергеля. Тысяча тамоў? У XIX ст. у Беларусі былі прыватныя бібліятэкі куды большыя!..

Імя ж Бергеля тады выклікала зусім іншыя асацыяцыі: адкуль у яго рукі трапіла такая бібліятэка? Ці не прысвоіў

Наследие слуцкого края

ён пасля 1863 г. сабе бібліятэку вядомай Слуцкай кальвінісцкай гімназіі?

Але працы віленскага даследчыка гісторыі пратэстанцкіх бібліятэк Вацлава Гізберта-Студніцкага неўзабаве рэабілітавалі ў маіх вачах Бергеля.

Апісваючы зборы бібліятэкі Віленскага сінода, Вацлаў Студніцкі паведамляў, што пачатак кнігазбору Слуцкай гімназіі паклаў у XVII ст. Андрэй Дабранскі. Усе свае зберажэнні ён траціў на рэдкія выданні. Пасля яго смерці, у 1640 г., гэты прыватны збор, ацэнены ў баснаслоўную суму 5000 злотых, быў набыты Багуславам Радзівілам для Слуцкай гімназіі. Гімназічная бібліятэка папаўнялася ў XVIII ст., але асаблівы яе росквіт наступіў у першай палове XIX ст., калі сюды па розных прычынах былі перавезены унікальныя бібліятэкі Віленскага сінода і Кейданскай гімназіі. Прыбаўляліся і прыватныя падарункі. Так, у 1829 г. Юрый Аколаў ахвяраваў бібліятэцы звыш 1000 тамоў, частка якіх паходзіла са збораў Браніцкай, сястры польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

Аднак, працягвае Студніцкі, пасля 1863 г., калі адзіная ў Беларусі і Літве кальвінісцкая гімназія перайшла ў рукі ўрада, усю гімназічную бібліятэку сінод забраў са Слуцка і перавёз у Вільню. Больш таго, у другой палове XIX ст. сінадальныя зборы папаўняліся за кошт прыватнага збору Бергеля. Такім чынам, мае падазрэнні па адрасу слуцкага пастыра аказаліся беспадстаўнымі. І яго імя згубіла для мяне асаблівую цікавасць.

Прайшоў час. І раптам неяк у Львове мне выпадкова трапілі ў рукі тры вельмі цікавыя крыніцы.

Першая — рахунак слуцкай друкарні, зроблены для князя Радзівіла ў 1687 г. Там былі (у скарочаным выглядзе) пералічаны назвы твораў, якія выйшлі ў Слуцку ў 1673—1679 гг., указана колькасць экземпляраў, кошт друку, цана і г. д. Прытым з 23 назваў толькі тры былі вядомы такому дасведчанаму бібліёграфу, як І.Палькоўскі. А вось хто хаваецца, скажам, за наступнымі запісамі: «Тэорый рускіх» — экз. 80, «Дзённікаў» — 2020, «Школак» — 3091, «Працэсаў» — 1006, «Гаспадароў» — 1000, «Формулак» — 414, «Табліц гарызантальных» — 100, «Аб злучэнні рэк» — 640, «Хрысціянскіх заўваг» — 250, «Лемантароў» — 3389?! На якой мове ўсё гэта друкавалася? І ці не тояцца тут невядомыя сёння творы старажытнай беларускай літаратуры?

У артыкуле Юзафа Корвіна «Пастар Юльян Бергель і яго бібліятэка ў Слуцку», надрукаваным у XII томе часопіса «Тыгоднік ілюстраваны» за 1881 г., паведамлялася, што ў пакоі Бергеля, чалавека энцыклапедычнай адукацыі, усе сцены застаўлены кніжнымі паліцамі. Тут былі такія рэдкія кнігі, як «Кодэкс Юстыніяна» 1480 г. выдання, любчанскія старадрукі XVII ст. на лацінскай і польскай мовах (напрыклад, «Меч нябеснага арсенала на пахаванні Яна Пуцяты» Міхаіла Мацісевіча, Любча, 1649 г.; «Хрысціянская смерць Яроша Еўлашэўскага» Яна Зыгровіча, Любча, 1619 г., і інш.). Корвін пісаў, што па просьбе Ю.Крашэўскага ён занатоўваў назвы найбольш рэдкіх кніг. Некаторыя з іх былі невядомы нават такому славутаму бібліёграфу, як К.Эстрэйхер.

У 3-м томе часопіса «Бібліётыка Варшаўска» за 1885 г. пісалася: «Бібліятэка, што заставалася пасля пастара мясцовага збору Ю.Бергеля, які памёр 2 месяцы назад у Слуцку, перайшла ва ўласнасць горада Слуцка, публічна запісаная ўладальнікам у тастаменце. Пра гэта пісалі ўжо штодзённыя газеты. Як запэўніваюць відавочцы, у выдатным зборы рэдкіх кніг, размешчаным у 12 каменных шафах у касцельным бабінцы і належным чынам упарадкаваным, быў камплект старадаўніх любчанскіх, ракаўскіх, торуньскіх, слуцкіх, нясвіжскіх, астрожскіх, брэсцкіх, іўеўскіх, упіцкіх, кейданскіх, заблудаўскіх, супрасльскіх, кнышанскіх, луцкіх, віленскіх, пачаеўскіх і іншых друкаў. Да таго ж разнастайны збор многіх цікавых старых рукапісаў».

Відаць, Бергель збіраў не бібліятэку ўвогуле, а бібліятэку ўсходнеславянскіх старадрукаў. Магчыма, меў і тыя, што пералічаны ў рахунку Слуцкай друкарні.

І быў патрыётам, бо завяшчаў свае багацці роднаму гораду.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974. С. 22—25.

Наследие слуцкого края

Жамчужына майстэрства

Слуцкія паясы... Жамчужына высокага майстэрства беларускіх ткачоў, гонар беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Далёка за межамі Слуцка былі вядомы яны і славіліся сваёй прыгажосцю ўжо ў 2-й палавіне XVIII ст.

У тыя далёкія гады за р. Случ па вуліцы Сенатарскай, у невялікім двухпавярховым будынку і заснаваў князь Міхаіл Казімір Радзівіл фабрыку паясоў — персіярню. Для работы на ёй князь прывёз персаў і туркаў. Праз некаторы час мясцовыя маладыя рабочыя Ян Гадоўскі і Томас Хаецкі былі накіраваны ў г. Станіслаў (цяпер г. Івана-Франкоўск, Украіна) для навучання. У той час горад славіўся вытворчасцю паясоў. Адтуль было завезена і абсталяванне для фабрыкі — 28 станкоў. Пазней тут працавала каля 60 чалавек. Праз 10—15 гадоў на фабрыку прыйшлі ў асноўным мясцовыя жыхары — гараджане са Слуцка і Нясвіжа, сяляне з вёсак. Да нашых дзён дайшлі іх імёны — Іосіф Барсук, Міхаіл Баранцэвіч, Лойка, Канчыла і іншыя.

Асаблівага росквіту фабрыка дасягнула ў тую пару, калі яе ўпраўляючым стаў таленавіты майстар Ян Маджарскі, які пераехаў у Беларусь у 1757 г. і кіраваў мануфактурай да 1776 г. Менавіта пры ім узнік той тып пояса, які атрымаў назву слуцкага.

У адной з даўніх калыханак спяваецца:

Пайшоў Лёнік у лясок,
Знайшоў сабе паясок
Слуцкае работы...

Для слуцкага пояса характэрны высокая якасць і непаўторнасць. Яны ткаліся з шаўковых, сярэбраных і залатых нітак. Даўжыня пояса была ад 3 да 4 метраў, шырыня ад 20 да 30 сантыметраў. Паясы, вытканыя з золата і серабра, пракатваліся на спецыяльных катках, якія тайна па частках былі прывезены Янам Маджарскім з Канстанцінопаля (пазней іх устройства было асвоена слуцкімі майстрамі). Паясы ўпрыгожваліся шыкоўным арнаментам: поле звычайна запаўнялася папярэчнымі палоскамі альбо лускавым малюнкам, канцы — гірляндамі з кветак і лісця. Сустракаліся і такія паясы, канцы якіх абшываліся махрамі. З часам слуцкі пояс набыў гарманічныя суадносіны частак. Выпрацавалася выразная структура арнаменту, усё часцей у яго пачалі ўключацца кветкі мясцовай флоры — гваздзікі, валошкі, незабудкі, жалуды і дубовае лісце. Так мянялася ўсходняя стылізацыя і арнаментацыя пояса, набывала рэалістычныя рысы. На абодвух канцах пояса была метка на лацінскай мове ці кірыліцы: «Мяне зрабілі ў Слуцку», «Зроблены ў Слуцку», «Слуцк», «Во градзе Слуцку». Калі мануфактурай кіраваў сын Яна Маджарскага, з'явіўся надпіс «Лео Маджарскі». У слуцкага пояса звычайна адзін бок быў святлейшы, а другі цямнейшы, ці зусім чорны. Гэта давала магчымасць насіць яго на абодва бакі. Такі пояс называлі двухбаковым (двухліцавым). А былі яшчэ чатырохбаковыя. У год выпускалася звычайна да 200 паясоў. Каштавалі яны дорага: ад 5 да 50 чырвоных злотых, а пасля далучэння Беларусі да Расіі 50—100 рублёў. Слуцкія паясы былі раскошай і абавязковым упрыгожаннем касцюма магната і багатага шляхціца.

Вялікай папулярнасцю карысталіся шаўковыя паясы сярод беларускай, польскай шляхецкай знаці, казацкай старшыны, насілі іх на верхнім адзенні: па стане, вышэй стану, або ніжэй, туга ці свабодна завязваліся вузлом, канцы аднолькавай даўжыні спускаліся па баках. Карысталіся імі ў самых розных выпадках жыцця. Былі яны святочнымі, будзённымі, вясельнымі і жалобнымі. У гэтым і заключалася своеасаблівасць майстэрства Слуцкай персіярні. Попыт на слуцкія паясы быў такі вялікі, што выклікаў з'яўленне падобных персіярняў у розных частках Рэчы Паспалітай — у Кабылках, Ліпкаве, Кракаве і інш. гарадах. Але ўсе гэтыя прадпрыемствы знаходзіліся пад моцным уплывам Слуцкай фабрыкі і іх паясы звычайна ішлі пад назвай «слуцкі». Растучы попыт на паясы прыцягнуў увагу купцоў і прамыслоўцаў. Вытворчасцю паясоў тыпу «слуцкіх» заняліся шаўкаткацкія прадпрыемствы Францыі. Такія паясы стала выпускаць фабрыка ў Ліёне.

У Слуцку фабрыка праіснавала да 1846 г. Але ў апошні час прадукцыя яе змянілася. Пасля Яна Маджарскага ўпраўляючым стаў яго сын Леан. У гады яго

Наследие слуцкого края

кіравання вытворчасць спачатку развівалася, але рэформы 90-х гадоў XVIII ст. у Рэчы Паспалітай адбіліся як на становішчы самога Леана Маджарскага, так і на прадукцыі. Пасля далучэння Беларусі да Расіі ў пачатку XIX ст. было забаронена насіць кафтаны (кунтушы). У сувязі з гэтым адпала неабходнасць у слуцкіх паясах. Іх вытворчасць скараціласа, а фабрыка пачала выпускаць узорыстыя і залатныя тканіны ў асноўным для патрэб царквы. Так страцілі паясы сваё практычнае значэнне.

У 1807 г. Леан Маджарскі перастаў арандаваць Слуцкую фабрыку і яна пачала прыходзіць у заняпад. У час вайны 1812 г. фабрыка была зусім разрабавана, потым пачаў працаваць толькі адзін станок. Арэнда пераходзіла з рук у рукі, і ў 1846 г. па загадзе князя Л.Вітгенштэйна мануфактура была зачынена. Аднак мастацкая каштоўнасць слуцкіх паясоў засталася нязменнай. У XIX ст. яны становяцца прадметам збору сярод аматараў-антыквараў, пачынаецца навуковае збіранне і іх вывучэнне як вырабаў мастацкага ткацтва. На паясы зноў з'явіўся попыт.

Самая багатая калекцыя слуцкіх паясоў мелася ў Нясвіжы, у князёў Радзівілаў. Пазней гэта калекцыя з 32 паясоў была перададзена ў Беларускую дзяржаўную карцінную галерэю. У гады Вялікай Айчыннай вайны яна страчана. Цяпер буйнейшыя калекцыі слуцкіх паясоў знаходзяцца ў Маскве ў Гістарычным музеі, у Санкт-Пецярбургу ў Эрмітажы і ў Расійскім этнаграфічным музеі, шмат іх на Украіне, у Літве, Польшчы і інш. краінах. І зусім мала засталося ў Беларусі. Экспануюцца слуцкія паясы ў музеях Мінска, Гродна, Маладзечна і ў Слуцку.

Крыніцы:

1. Грицкевич А.П. Древний город на Случи. Мн., 1985.
2. Якуніна Л.І. Слуцкія паясы. Мн., 1960.

В.С.Відлога.

ЗАЛАТОЙ СПРАВЫ МАЙСТРЫ

Баранцэвіч Міхаіл, ткач слуцкіх паясоў.

Барсукі (Случчына — ?), беларускія майстры мастацкага ткацтва Слуцкай мануфактуры, 2-я палавіна XVIII — 1-я палавіна XIX ст.

Іосіф, майстар-ткач. У 1750-я гады вучыўся майстэрству ў Я.Маджарскага.

Васіль, у 2-й палавіне XVIII ст. галоўны майстар Слуцкай мануфактуры.

Фама, кіраўнік Слуцкай мануфактуры ў 1807 — 1844 гг. Пры ім акрамя слуцкіх паясоў ствараліся ўзорыстыя і залататканыя тканіны.

Гадоўскі Ян, ткач. Майстэрству ткацтва ўсходніх паясоў вучыўся ў г. Станіслаў, куды быў пасланы князем Радзівілам. Сумесна з Т.Хаецкім творча перапрацавалі арнамент пояса і ўвялі ў яго элементы беларускага расліннага арнамента.

Канчыла, ткач.

Лойка, ткач.

Маджарскія, майстры-ткачы і арандатары Слуцкай фабрыкі князёў Радзівілаў.

Я н, вытворчасць паясоў пачаў у 1740-я гады ў г. Станіслаў. У сярэдзіне 1750-х гадоў запрошаны князем М.К.Радзівілам кіраваць арганізаванай у Слуцку фабрыкай паясоў, у 1776 — 1778 гг. арандатар фабрыкі.

Л е а н, сын Яна. Арандаваў фабрыку ў 1778 — 1807 гг. У 1792 г. на 48 ручных станках працавала каля 100 чалавек, за год выпускалася да 200 залататканых паясоў.

Хаецкі Томас, ткач. Майстэрству ткацтва разам з Я.Гадоўскім вучыўся ў г. Станіслаў.

СЛУЦКІЯ ТКАЧЫХІ

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.
А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна, —
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам зззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага ўзора,
Цвяток радзімы васількa.

М.Багдановіч, 1912 г.

Наследие слуцкого края

Першыя аптэкі

Упершыню пра аптэкі ўпамінаецца ў летапісах XV ст. У Расіі аптэчная справа пачала развівацца пры Іване IV. Але першая аптэка абслугоўвала толькі цара і яго блізкіх. У 1672 г. у Маскве была адкрыта аптэка, якая стала «прадаваць спірты, гарэлкі і ўсялякія лякарствы людзям». Гэта была, як многія лічылі, першая агульнадаступная аптэка. Але ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь знаходзяцца матэрыялы, якія сведчаць, што такая аптэка ў Беларусі з'явілася амаль на тры дзесяцігоддзі раней, чым у Маскве. І з'явілася яна ў Слуцку. У архіве ў адной са спраў ёсць выпіска з актавай кнігі Слуцкага гарадскога суда, дзе засведчана грамата князя Багуслава Радзівіла кандыдату медыцыны Крыштофу Вінклеру, аптэкару і цырульніку Маціяшу Валяр'яну Ботлігеру ад 29 студзеня 1648 г. на абсталяванне аптэкі ў горадзе Слуцку.

У той час Слуцк быў даволі буйным горадам і, атрымаўшы яго ва ўладанне, Багуслаў Радзівіл даў гараджанам шэраг прывілеяў. У горадзе былі ўведзены штотыднёвыя рынкі, абсталявана аптэка «для паратавання здароўя людскога».

Грамата і іншыя дакументы сведчаць, што Радзівілам быў набыты для аптэкі за 700 злотых дом з зямельным участкам у цэнтры горада на Ілынскай вуліцы, насупраць гасцінага двара і перададзены ў пажыццёвае карыстанне аптэкарам Вінклеру і Ботлігеру. Аптэкары вызваляліся ад нясення гарадскіх і замкавых павіннасцей. Крамнікам з гэтага часу забаранялася прадаваць у сваіх крамах аптэчныя тавары і атруту, акрамя малярскіх фарбаў. Не дазвалялася ствараць аптэкі іншым асобам.

Слуцкаму гарадскому ўпраўленню прапанавалася прытрымлівацца ўстаноўленага ў грамаце парадку. Вінклер з Ботлігерам трымалі аптэку з 1648 г. па 1652 г. Затым Ботлігер, у сувязі з выездам са Слуцка, уступіў сваю частку аптэкі Вінклеру за 3640 злотых. Пасля гэтага аптэка, дом, маёмасць перайшлі ў поўнае валоданне Вінклера. У снежні 1668 г. ён звярнуўся да Радзівіла з просьбай пабудаваць новае памяшканне для аптэкі.

Вінклер загадваў аптэкай да канца свайго жыцця, завяршаўшы яе пасля смерці разам з усімі лякарствамі, інструментамі і аптэкарскімі кнігамі Слуцкай евангелісцкай лютэранскай царкве. Пастаяннага загадчыка не было. Яна перыядычна здавалася ў арэнду розным асобам. Акрамя правізара пры аптэцы былі 1—2 вучні.

Сярод знойдзеных у архіве спраў ёсць пералік лякарстваў, інструментаў і аптэкарскага посуду, акты агляду, кантракты на здачу аптэкі ў арэнду і г. д.

Цікавай з'яўляецца кніга аптэкі, у якой пералічваюцца медыкаменты, аптэкарскія інструменты, звесткі аб іх колькасці, а таксама спіс літаратуры па медыцыне і фармакалогіі.

У маі 1843 г. будынак аптэкі згарэў. Яна размяшчалася ў наёмных памяшканнях.

У 80-я гады XIX ст. аптэка адпускала лякарствы на 3 тысячы рэцэптаў у год, не лічачы ручны продаж, а ў асобныя гады колькасць водпуску лякарстваў па рэцэптах даходзіла да 4 тысяч.

Акрамя агульнадаступнай аптэкі ў 1746 г. у Слуцку была адкрыта прыдворная аптэка, якая абслугоўвала толькі князя, яго сям'ю і блізкіх. Усе матэрыялы для аптэкі адпускаліся з казны князя. Аптэкару ў год плацілі 616 злотых 20 грошаў, акрамя таго яму яшчэ ішла плата натурай.

Аўтобус у Слуцку

Да пачатку інтэнсіўнага чыгуначнага будаўніцтва ў XIX ст. такія гарады, як Бабруйск і нават Мінск, нічым не пераўзыходзілі Слуцка. Але Слуцку не пашанцавала: да 1915 г. чыгункі яго абыходзілі. У Мінску ж яшчэ ў 1874 г. стварыўся чыгуначны вузел, што спрыяла шпаркаму развіццю горада.

З-за адсутнасці чыгункі Слуцк перажываў значныя цяжкасці з прывозам і вывазам тавараў. Ролю грузавога транспарту выконвалі слуцкія «балаголы» на сваіх біцюгах, запрэжаных у велічэзныя кары (павозкі). Пасажыру, які выязджаў са Слуцка, патрэбна было ехаць па шашы да бліжэйшай чыгуначнай станцыі на ўсход — да Старых Дарог, або на захад да станцыі Ляхавічы. Да першай станцыі было 48 вёрстаў, а да другой — 73. Маскоўска-Варшаўская шаша была пабудавана адной з пер-

Наследие слуцкого края



Аўтамабільны рух у Слуцку. Пачатак XX ст.

шых у Расійскай імперыі яшчэ ў 1830 г. Яна будавалася са здробненага каменю, прыкатанага катком, але нічым не склеенага. Вядома, пад жалезнымі шынамі на шашы хутка ўтвараліся каляіны, асабліва ў час веснавога разводдзя. Пасажыраў вазілі на конных дыліжансах. Так адбывалася да 1909 г., пакуль адна камерцыйная кампанія не выкарыстала гэтых абставін для куплі ў Германіі на заводзе «Бэнц і Даймлер» трох аўтобусаў.

Дзякуючы гэтаму ў Слуцку была створана цэнтральная станцыя з аўтобусным гаражом. Тэхнічны стан аўтобусаў быў даволі прымітыўны. Перш за ўсё — шыны былі не пнеўматычныя, а проста вобад, з налітай гумавай масай. Ужо ад першага рэйса на ёй з'яўляліся трэшчыны. У аўтобусе вельмі трасло, хоць і былі рысоры. Спіцы ў колах былі дубовыя, насаджаныя часта, і пад цяжарам кузава ў сухое надвор'е моцна рыпелі. Не было карданнага вала і дыферэнцыяльнай каробкі. Матор прыводзіў у рух трансмісію, на якой былі насаджаны дзве малыя зубчаткі. Ад гэтых зубчатак рух перадаваўся ланцугом Галя на вялікія зубчаткі, наглуха змацаваныя з заднімі коламі. Кузаў быў перагароджаны на тры кабіны: пярэдняя для двух шафёраў, за ёй другая — для васьмі пасажыраў 1-га класа, трэцяя кабіна — для дваццаці пасажыраў 2-га класа. Пасажыры 3-га класа ехалі на даху, абгароджаным парэнчамі. На дах таксама грузілі і багаж пасажыраў. Праезд у кабіне 1-га класа каштаваў 2 рублі 20 капеек, 2-га — 1 рубель 80 капеек, 3-га класа — 1 рубель (да станцыі Старыя Дарогі). Рэальна гэты кошт выражаўся ў тым, што рубель мог зарабіць за дзень толькі кваліфікаваны рабочы.

Пазней сталі прыбываць большыя аўтобусы з коламі, літымі са сталі. Кампанія праіснавала да восені 1915 г.

Н.Маглыш.

Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Случчыны

Вытокі прамысловасці Случчыны адносяцца да глыбокай старажытнасці, калі ў нашых продкаў з'явіліся і з цягам часу ўдасканальваліся прылады працы, з дапамогай якіх ажыццяўлялася перапрацоўка прыроднай сыравіны. У натуральнай гаспадарцы існавалі хатнія промыслы: сваімі сіламі сяляне выраблялі розныя віды прадукцыі для патрэб сваёй жа гаспадаркі. З развіццём абмену частка вырабаў з мясцовай сыравіны паступала і на продаж, аддавалася землеўладальніку ў выглядзе натуральнага аброку. Былі пашыраны і адыходныя промыслы. Найбольш распаўсюджаны былі лесанарыхтоўкі, на якіх сяляне займаліся цэлымі вёскамі і нават валасцямі. Да найбольш старажытных промыслаў беларускіх сялян адносіцца перапрацоўка драўніны: смалакурэнне, выганка дзёгцю, выраб драўнянага вугалю

Наследие слуцкого края

і паташу. На Случчыне сяляне займаліся апрацоўкай скуры для абутковай вытворчасці (у горадзе), у вёсках — для пашыву адзення (кушнерскі промысел). Выраблялі таксама хамуты, сёдлы, лейцы, сядзёлкі і інш. Займаліся таксама апрацоўкай ільну і пянькі, вырабам сукнаў для верхняга адзення.

У дарэформенай Случчыне рамяство было сялянскім, вотчынным і мяшчанскім. У горадзе і мястэчках пераважала мяшчанскае цэхавае рамяство. Па развіцці рамяства ў 1800 г. Слуцк быў другім горадам у Мінскай губерні. 30% насельніцтва складалі рамеснікі — 479 чалавек, у тым ліку майстроў — 194, падмайстроў — 157, вучняў — 128. Найбольшую колькасць сярод рамеснікаў прадстаўлялі: 84 шаўцы, 75 ткачоў, 52 кушняры, 50 пекараў, 43 краўцы, 36 гарбароў. Значная частка насельніцтва займалася гандлем. У горадзе ў той час было 75 купцоў.

З пачатку XIX ст. пад уплывам росту капіталістычных адносін і канкурэнцыі мануфактурнай і фабрычнай вытворчасці рамесніцкія цэхі пачалі распадацца. З 1860 г. да 1900 г. паскорыўся працэс перарастання рамяства ў дробнакапіталістычную вытворчасць, асабліва ў сілікатнабудаўнічай і дрэваапрацоўчай. У гэтыя часы ўсё большую сілу набывалі мануфактуры — прадпрыемствы, заснаваныя на падзеле працы і ручной рамеснай тэхніцы.

Першыя прадпрыемствы мануфактурнага тыпу ўзніклі ў пачатку XVIII ст. Амаль усе яны былі вотчынныя, пераважная большасць іх рабочых — прыгонныя. Сярод найбольшых — мануфактура шаўковых паясоў у Слуцку.

У Слуцкім павеце ў XIX і пачатку XX ст. працавала 9 прадпрыемстваў, на якіх было занята не менш чым 50 рабочых. Сярод іх:

Акімаўскі завод сельскагаспадарчага інвентару. Дзейнічаў з 1907 г. у маёнтку Акімаўскае. Выпрабляў дробны сельскагаспадарчы інвентар. Збываў прадукцыю па ўсёй Беларусі. У 1921 г. рэарганізаваны ў сельскагаспадарчую майстэрню.

Бабаўнянская суконная мануфактура. Дзейнічала ў 1769—1806 гг. у мястэчку Бабоўня (цяпер Капыльскі раён). У 1797 г. працавала 110 прыгонных. Было 6 майстроў. У 1800 г. выпрабляла сукны, байку, вігонь. Недахоп сыравіны і нізкая якасць прадукцыі прывялі да закрыцця прадпрыемства.

Дзяніскавіцкая лесапільна-бандарная мануфактура. Дзейнічала ў 1910—1914 гг. у маёнтку Дзяніскавічы (цяпер вёска ў Ганцавіцкім раёне). Працавала 148 рабочых.

Ельненскі шклозавод. Дзейнічаў у 1897—1916 гг. у в. Ельня (цяпер Ганцавіцкі раён). Выпускаў аконнае і люстраное шкло. У 1900 г. працавалі 42 рабочыя, у 1916 г. — 63, выпушчана высакаякасных вырабаў на 120 тыс. руб.

Іванскі цукровы завод. Дзейнічаў у 1838—1881 гг. у маёнтку Івань (цяпер вёска ў раёне). Цукар вараблялі з буракоў, якія вырошчвалі ў маёнтку і суседніх вёсках. У 1877 г. устаноўлены паравы рухавік. Дзейнічалі 2 гідраўлічныя прэсы, цёрка. У 1861—1862 гг. за суткі перапрацоўвалася 700 пудоў буракоў, выхад цукру складаў 4%. У 1868 г. працавала 105 рабочых. Заработная плата іх складала 8 руб. у месяц. Прадукцыю збывалі ў Мінску і Слуцку. У 1878 г. узоры вырабаў завода былі выстаўлены ў Мінскім губернскім музеі. У 1882 г. у яго будынках быў адкрыты броварны завод.

Ляхавіцкая цукерачная фабрыка. Дзейнічала ў м. Ляхавічы (цяпер г. Ляхавічы Брэсцкай вобл.). Мела аддзяленні: варыльнае, карамельнае, сушыльнае, упаковачнае. Працавала больш за 50 чалавек. У час 1-й сусветнай вайны разбурана немцамі, была адноўлена ў савецкі час. Пасля Вялікай Айчыннай вайны пераабсталявана ў кансервавы завод.

Мураваная коркавая фабрыка. Дзейнічала ў 1893—1913 гг. у маёнтку Мураванка. Працавала 140—199 рабочых. Мела 2 лакамабілі. Выпускала коркавыя вырабы і ізаляцыйны матэрыял.

Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў (1736—1844 гг.). Належала князям Радзівілам і Віттенштэйнам. Выпускала да 200 паясоў у год. Выпрабляла таксама шаўковыя пакрывалы і махры, залатыя і сярэбраныя галуны, падвязкі, стужкі, нашыўкі, габелены, дываны. У 1793 г. было 29 станкоў, працавала 60 майстроў. З 1832 г. выпрабляліся царкоўныя рызы. У пачатку XIX ст. мануфактура заняпала. Працаваў толькі адзін станок.

Старэўскі шклозавод. Дзейнічаў у 1897—1925 гг. у в. Старэва Бабруйскага павета (цяпер вёска ў Слуцкім раёне). У 1913—1916 гг. належаў «Таварыству Старэўскага хрустальнага і лесапільнага заво-

Наследие слуцкого края

даў». Выраблялiся лямпы дутыя і прасаваныя, лямпавае шкло, чарнiлiцы, бутэлькі, слоікі, хрустальныя вырабы. У 1910 г. меў паравыя рухавік і кацёл. Працавала 108 рабочых. У 1908 г. на міжнароднай выстаўцы ў Марселі (Францыя) хрустальны посуд і лямпы, выраблены на заводзе, былі ўдастоены вышэйшай узнагароды. Пад уплывам амерыканскага мастака па шкле Луі Камфара Цiфані завод выпрабляў разнастайныя рэчы з пакрыццём серабрыстай плёнкай (бакалы, кілішкі, вазы для кветак, цукарніцы і інш.). Працавалі мясцовыя майстры, сярод якіх былі нашчадкі ўрэцкага роду гравіроўшчыкаў XVIII ст. Рымашэўскіх — Іосіф Іванавіч са сваім сынам, а таксама чэхі, немцы, бельгійцы.

* * *

У Случкім павеце налічвалася 38 прадпрыемстваў, на якіх працавала менш чым 50 чалавек.

Бабаўнянскае вінакурнае ў маёнтку Бабоўня ў 1900—1914 гг. (цяпер вёска ў Капыльскім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 8 рабочых.

Будскае лесапільнае ў вёсцы Буды ў 1905—1914 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 40 чалавек

Вераб'ёўскае лесапільнае, ва ўрочышчы Вераб'ёва. Дзейнічала ў 1908—1913 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 35 рабочых.

Востраўскае лесапільнае ў маёнтку Востраў. Дзейнічала ў 1906—1913 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 27 рабочых.

Грушаўскае вінакурнае ў в. Грушаўка ў 1875—1914 гг. (цяпер вёска ў Ляхавіцкім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 7 рабочых.

Доктаравіцкае вінакурнае ў маёнтку Доктаравічы ў 1898—1913 гг. (цяпер вёска ў Капыльскім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 7 рабочых. У 1910 г. было выпушчана 30 тыс. вёдзер прадукцыі.

Дунайчыцкае вінакурнае ў маёнтку Дунайчыцы ў 1895—1913 гг. (цяпер вёска ў Клецкім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 7 рабочых.

Іванскае вінакурнае ў маёнтку Івань у 1894—1913 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 11 рабочых.

Каралінскае вінакурнае ў маёнтку Каралін у 1907—1913 гг. (цяпер вёска ў Нясвіжскім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 8 рабочых.



Вырабы Старэўскага шклозавода і Урэцкай шкляной мануфактуры, якія захоўваюцца ў Слуцкім краязнаўчым музеі.

Клярмонцкае вінакурнае ў маёнтку Клярмонты ў 1867—1913 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 12 рабочых.

Краснарадкаўскае вінакурнае ў маёнтку Красны Радкаў у 1894—1913 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 8 рабочых.

Круговіцкае лесапільнае ў вёсцы Круговічы ў 1888—1898 гг. (цяпер вёска Вялікія Круговічы ў Ганцавіцкім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 18 рабочых.

Кунцаўшчынскае вінакурнае ў маёнтку Кунцаўшчына ў 1883—1913 гг. (цяпер вёска ў Клецкім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 19 рабочых.

Кучынскае лесапільнае на хутары Кучын у Бабруйскім павеце ў 1897—1903 гг. (цяпер у межах пасёлка Кучын у Слуцкім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 35 рабочых.

Любянецкае лесапільнае ў маёнтку Любянец у 1900—1913 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 20 рабочых.

Мяцявіцкае вінакурнае ў маёнтку Мяцявічы ў 1879—1913 гг. (цяпер вёска ў Салігорскім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 9 рабочых.

Нясвіжскае дывановае ў м. Нясвіж у 1752—1780 гг. Працавала 30 рабочых.

Нясвіжскае спіртавое ў г. Нясвіж у 1897—1900 гг. У 1900 г. выпусціла 35 тысяч вёдзер прадукцыі.

Нясвіжская друкарня ў г. Нясвіж у 1897—1913 гг.

Наследие слуцкого края

Пагосцкае вінакурнае ў маёнтку Пагост у 1902—1913 гг. (цяпер вёска ў Салігорскім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 8 рабочых.

Паласнянскае суконнае ў засценку Паласня ў 1736—1890 гг. (цяпер вёска ў Стаўбцоўскім раёне). Працавала 30 рабочых.

Пернаўшчынскае вінакурнае ў маёнтку Пернаўшчынскае (Пупцаўшчынскае) у 1892—1893 гг.

Радзівілімонцкае вінакурнае ў в. Радзівілімонты ў 1870—1913 гг. (да 1969 г. вёска ў Клецкім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 7 рабочых.

Рачкавіцкае вінакурнае ў маёнтку Рачкавічы ў 1891—1913 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 12 рабочых.

Руднянскае вінакурнае ў маёнтку Рудня ў 1901—1913 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 8 рабочых.

Слуцкае мукамольнае ў Слуцку ў 1884—1905 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 17 рабочых. Уладальнік — купец Лацэнберг. У 1896 г. вышушчана 150 тыс. пудоў мукі.

Слуцкае мукамольнае ў Слуцку ў 1896—1914 гг. Меўся лакамабіль, працавала 15 рабочых. Уладальнік — купец Лянда. У 1913 г. вышушчана 110 тыс. пудоў мукі.

Слуцкае мукамольнае ў Слуцку ў 1900—1914 гг. Мелася 6 паставаў, працавала 15 рабочых. Уладальнік — купец Гутцайт. У 1913 г. вышушчана 350 тыс. пудоў мукі.

Слуцкае спіртаачышчальнае ў Слуцку ў 1897—1908 гг. Меўся паравы рухавік, працавала 39 рабочых.

Слуцкае суконнае ў Слуцку ў 1738—1823 гг. Працавала 30 рабочых. Уладальнік — князь Радзівіл.

Слуцкае суконнае ў Слуцку ў 1828 г. Працавала 35 рабочых. У гэтым жа годзе было вышушчана 5 тыс. аршынаў сукна. Уладальнік — купец Каменамосцкі.

Слуцкая друкарня ў Слуцку. Канец XVI ст. Уладальнікі — кальвіністы.

Слуцкая друкарня ў Слуцку ў 1877—1898 гг. Уладальнік — мешчанін Яброў.

Слуцкая друкарня ў Слуцку ў 1895—1913 гг. Працавала 5 рабочых. Уладальнік — дваранін Тамашоў.

Старыцкае вінакурнае ў маёнтку Старыца ў 1902—1914 гг. (цяпер вёска ў Капыльскім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 11 рабочых.

Старэўскае лесапільнае ў в. Старэва ў 1897—1913 гг. Меўся лакамабіль, працавала 35 рабочых.

Тучанскае вінакурнае ў в. Туча ў 1840—1914 гг. (цяпер вёска ў Клецкім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 6 рабочых.

Цімкавіцкае вінакурнае ў маёнтку Цімкавічы ў 1876—1914 гг. (цяпер вёска ў Капыльскім раёне). Меўся паравы рухавік, працавала 6 рабочых.

Выкарыстаны матэрыял з кн.: Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988.

Падрыхтавала В.С.Відлога.

Знакамітыя землякі

БЕЛАБЛОЦКІ Браніслаў, рэвалюцыянер, сацыёлаг, літаратурны крытык, перакладчык. Нарадзіўся ў 1861 г. у в. Астрашын Слуцкага павета. Закончыў Мінскую гімназію. Вучыўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта і адначасова ў Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. Удзельнічаў у рабоце гурткоў «Народнай волі». З 1882 г. у Варшаве супрацоўнічаў з дзеячамі польскай рэвалюцыйнай партыі «Пралетарыят», вёў рэвалюцыйную прапаганду. Друкаваўся ў газеце «Przegląd Tygodniowy» («Штотыднёвы агляд») і часопісе «Ateneum» («Атэнэум»). У літаратурна-крытычных творах падкрэсліваў класавы характар літаратуры, патрабаваў рэалістычнага адлюстравання жыцця працоўных. У сацыялагічных даследаваннях крытыкаваў так званую арганічную тэорыю грамадства Г.Спенсера, лічыў, што рухальнай сілай развіцця грамадства з'яўляюцца сацыяльныя супярэчнасці. Адзін з перакладчыкаў «Капітала» К.Маркса на польскую мову. Памёр 14.4.1888 г.

ГРАТКОЎСКІ Табіяш (?—1822), паэт, педагог. Вядома, што нарадзіўся на Случчыне. Закончыў Слуцкую гімназію. Потым прадоўжыў вучобу ў Кёнігсбергскім і Лейдэнскім (Нідэрланды) універсітэтах. У 1758 г. карабель, на якім ён плыў з Антверпена ў Гданьск, пацярпеў крушэнне. Выратаваўшыся і вярнуўшыся ў Слуцк, апісаў гэтае здарэнне ў паэме «Марское падарожжа» (1760). З 1761 г. быў рэктарам Слуцкай гімназіі.

Наследие слуцкого края

КАРЖАНЕЎСКІ Іосіф Іванавіч, беларускі вучоны ў галіне хірургіі і інфекцыйных хвароб, доктар медыцыны (1829), прафесар (1835). Нарадзіўся ў Слуцку 19.3.1806 г. Закончыў Нясвіжскую гімназію, потым медыцынскі факультэт Віленскага універсітэта і там працаваў. У 1831 г. пакінуў службу і накіраваўся ў Брэст-Літоўск і Віцебск, дзе прымаў удзел у барацьбе з халерай. У 1832 г. працаваў памочнікам прозектара хірургічнай клінікі Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі. У 1837—1839 гг. практыкаваў у лепшых універсітэцкіх клініках за мяжой і па вяртанні ў 1840 г. прызначаны экстраардынарным прафесарам і дырэктарам акадэмічнай клінікі. Пасля закрыцця акадэміі ў 1843 г. застаўся па-за штатам і займаўся практычнай дзейнасцю па хірургіі ў Вільні. З'яўляўся аўтарам шэрагу навуковых прац па пытаннях лячэння сыпнога тыфу, пераломаў, артапедыі, дэсмургіі. Памёр 21.5.1870 г.

МЛАДЗЕЦКІ Іпаліт Іосіфавіч, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Расіі канца 70—пачатку 80-х гадоў. XIX ст. Нарадзіўся ў лістападзе 1855 г. у Слуцку ў сям'і дробнага гандляра. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі, але быў выключаны з вышускнога класа. Зарабляў на жыццё прыватнымі ўрокамі, быў пісьмаводам. Па палітычных поглядах Іпаліт Іосіфавіч Младзецкі далучаўся да рэвалюцыянераў-нарадавольцаў. Летам 1879 г. пераехаў у Пецярбург, дзе зблізіўся з нарадавольцамі, але ў арганізацыю не быў прыняты, бо палічылі яго чалавекам выпадковым. У студзені 1880 г. І.І.Младзецкі быў высланы з Пецярбурга ў Мінск, дзе знаходзіўся больш тыдня пад арыштам, але яму ўдалося ўцячы. У хуткім часе зноў з'яўляецца ў Пецярбургу, сустракаецца з адным з кіраўнікоў выканаўчага камітэта «Народнай волі» Міхайлавым і прапануе сябе ў якасці выканаўца тэрарыстычнага акта супраць генерала Лорыс-Мелікава, які ўзначаліў урад у Расіі і быў надзелены дыктатарскімі паўнамоцтвамі. На прапанову Младзецкага нарадавольцы адказ не паспелі даць. А выбар ужо быў зроблены — забіць дыктатара Расіі.

Вечарам 20 лютага 1880 г., калі Лорыс-Мелікаў вяртаўся дамоў, да яго падбег малады чалавек і выстраліў. Але ў гэты момант Лорыс-Мелікаў адхіснуўся і куля праляцела міма. Младзецкі, а гэта быў ён, кінуўся наўцёкі. Яго схапілі.



К.А.Петрусевіч.

Справу І.І.Младзецкага вырашылі вельмі хутка. 21 лютага адбыўся ваенна-акруговы суд, які прыгаварыў яго да смяротнай кары.

Пісьменнік В.Гаршын спрабаваў заступіцца за жыццё Младзецкага. Ён напісаў пісьмо Лорыс-Мелікаву, просячы яго аб літасці. Але ўсё гэта было дарэмным.

22 лютага 1880 г. на Сямёнаўскім плацы прыгавор быў выкананы. І.І.Младзецкі трымаўся па-геройску. Каля шыбеніцы ён выкрыкнуў у натоўп: «Я паміраю за вас».

ПЕТРУСЕВІЧ Казімір Адамавіч, удзельнік I з'езда РСДРП. Член РСДРП з 1898 г. Нарадзіўся 21.2(4.3).1872 г. у в. Новіны Слуцкага павета Мінскай вобласці. Пасля заканчэння юрыдычнага факультэта Кіеўскага універсітэта — памочнік прысяжнага павераната. У рэвалюцыйным руху з 1897 г., член кіеўскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа». За ўдзел у палітычнай дэманстрацыі высланы з Кіева ў Екацярынаслаў, адзін са стваральнікаў екацярынаслаўскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа». За ўдзел у I з'ездзе РСДРП на 2 гады пасаджаны ў турму і на 5 гадоў сасланы ў Валагодскую губерню З 1906 г. у Мінску, адвакат, абараняў Я.Коласа, якога судзілі за ўдзел у арганізацыі з'езда беларускіх настаўнікаў. У пачатку 1920-х гадоў у Варшаве, з 1923 г. у Вільні, прафесар універсітэта, адвакат, на судовым працэсе 56-і (1928) абараняў членаў Беларускай сялянска-работніцкай грамады, у 1934 г. — М.Танка, зняволенага за рэвалюцыйную дзейнасць. Звольнены з універсітэта за арганізацыю пратэсту па справе Брэсцкага працэсу 1931—1932 гг. над прадстаўнікамі левай апазіцыі парламентарыяў. У 1945—1948 гг. суддзя Вярхоўнага суда ПНР. Памёр 11.8.1949 г.

Наследие слуцкого края



А.А.Пяткевіч.

ПІСЬМЕННІК, ВЫДАВЕЦ І ПЕРАКЛАДЧЫК

У літаратуру ён увайшоў пад псеўданімам Адам Плуг. Сапраўднае ж імя — Антон Антонавіч Пяткевіч. Нарадзіўся 23.10.1823 г. у в. Замосце ў шляхецкай сям'і. У 1831 г. бацька будучага пісьменніка прадаў свой маёнтак і ўся сям'я пераехала жыць у фальварак Жукаў Барок (цяпер Стаўбцоўскі раён), дзе ён служыў у князя Радзівіла падлоўчым.

У 1842 г. Антон Пяткевіч закончыў Слуцкую гімназію і паступіў у Кіеўскі універсітэт. У гімназіі ён напісаў сваё першае апавяданне «Пра тое, як людзі час марнуюць». Пасля вучобы настаўнічаў на Украіне і ў Бесарабіі. Доўгі час жыў у Жытоміры. Там пісьменнік выдаў першы том 6-томнага збору сваіх твораў, а таксама творы ўдзельнікаў паўстання 1863 г. За гэта выданне і за непасрэдны ўдзел у паўстанні Адам Плуг разам з жонкай быў пасаджаны ў астрог.

У 1870-я гады пісьменнік выязджае ў Варшаву, дзе актыўна займаецца літаратурна-асветніцкай дзейнасцю: становіцца членам многіх дабрачынных, навуковых і літаратурных таварыстваў, з'яўляецца адным з арганізатараў беларускага літаратурна-асветніцкага гуртка. У 1879—1890 гг. Адам Плуг працаваў рэдактарам часопіса «Kłosy» («Каласы»), у 1891—1893 гг. галоўным рэдактарам «Вялікай усеагульнай ілюстраванай энцыклапедыі», літаратурным кіраўніком часопіса «Wędrowiec» («Вандроўнік», 1894—1899), уваходзіў у склад рэдакцыі газеты «Kurjer Warszawski» («Варшаўскі веснік», 1899—1903). Варшавяне за беларускі акцэнт лічылі Антона Антонавіча «прышлым», хоць і пісаў ён у большасці на польскай мове. Але ёсць звесткі, што пісьменнік не цураўся і беларускай мовы, ведаў яе і любіў. Напрыклад, апавяданне «Кручаная баба», у аснову якога пакладзены бытавы вясковы анекдот, напісана на беларускай мове.

Вядомы беларускі літаратуразнавец Адам Мальдзіс у кнізе «Падарожжа ў XIX стагоддзе» піша: «Але нават у тым выпадку, калі б Адам Плуг наогул не пісаў па-беларуску, яго імя ўсё роўна варта нашай памяці, бо ён нарадзіўся на беларускай зямлі, узнімаў у польскай літаратуры беларускую тэматыку, папулярызаваў здабыткі маладой беларускай літаратуры і сябраваў з яе вядучым прадстаўніком Дуніным-Марцінкевічам».

Адам Плуг быў патрыётам свайго роднага краю. У сваёй аповесці «Споведзь. Урывак з жыцця майго сябра» ён пісаў: «Я заўсёды буду ўздыхаць па Палессі... па тых адвечных пушчах, балотах і пясках, лугах і азёрах».

Большасць твораў пісьменніка звязана з Беларуссю і ў сваёй творчасці ён часта абапіраўся на яе фальклор. Прыкладам служыць выдадзены ў 1856 г. зборнік «Каласы роднай нівы». Асобныя раманы А.Плуга геаграфічна прывязаны да Случчыны (раман «Нянька», 1857), на беларускіх паданнях і ўражаннях маладосці напісаны вершаваныя гутаркі «Жукаў Барок» (1849), «Родная песенька» (1856) і інш.

У лепшых сваіх творах «Афіцыяліст», «Бакалаўры», «Сарока» пісьменнік малюе рэалістычную карціну тагачаснага жыцця, аддае вялікую ўвагу апісанню беларускіх краявідаў. Адам Плуг напісаў шэраг артыкулаў і нарысаў пра культурнае жыццё Беларусі: «Некалькі ўражанняў з падарожжа на Літву», «Уладзіслаў Сыракомля», «Манюшка ў Мінску» і інш. Займаўся пісьменнік не толькі выдавецтвам, але і перакладамі на польскую мову. Адзін з першых ён пераклаў творы Дуніна-Марцінкевіча, Г.Гейнэ, В.Гюго, А.Мюсэ, А.Пушкіна, У.Шэкспіра. І ўсё ж асноўным заняткам пісьменніка была выдавецкая праца. Памёр 2.11.1903 г.

Крыніцы:

1. Исторический вестник. Т. XIV. СПб., 1903.
2. Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мн., 1969.
3. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1987.

Падрыхтавала В.С.Відлога.

Наследие слуцкого края

Апавяданне А.Плуга «Кручаная баба»

Жыў на свеце адзін гаспадар, ды такі бедны — ажно страх, ніхай Бог крыя; але працавіты, справядлівы, цвярозы і калі б ня жонка, дык бы шчаслівы; на нішчасце ў жонцы яго цэлае ліхо сядзело, як гэта, ня тут кажучы, часценька і бывае ў людзей...

Во гэтае ж цэлае ліхо і сядзело ў жонцы, але і была ж яна шэльмай з пад цёмнай зоркі! Не кажу ўжо таго, што грызла яго, бытцам соль у воку, што сакатала яму ў дзень і ў ноч над галавою, на гэта ж бабы і родзюцца. Але глаўнае: ніякага сакрэту, крый Божэ, утрымаць ні магла. Што толькі муж зрабіў, што толькі пастанавіў зрабіць, нават што памысліў, яна ўжо ўсё ведала ды зараз жа бегла ад хаты ў хату ды ўсім аб гэтым сакатала, дабаўляючы ў чатыры разы больш, чым папраўдзі было. Гэтак і сама мужу прынасіла навіны ды малола ўсялякія брэдні: пры сакатлівасці сваёй была яна і надзвычай легкавернай.

Здарылося неяк адзін раз, што гаспадар наш, аручы поле, пусціў валоў пасвіцца на мяжы, а сам пад кусцікам прылёг крыху адпачыць. Глядзіць, ажно надыходзіць нейкі дзядок з вялікім гаршчком пад палою сярмягі ды з рыдлёўкай у руцэ. Гаспадар ляжыць бы мёртвы, толькі вочы, бытцам рак, вытарашчыў ды вушы наставіў, як заяц. Вось дзядок выкапаў ямку, паставіў у ёй гаршчок дый пайшоў закапываць, кладзючы лапатай хрэсты і балмочучы: «Той хай зможэ ўзяць усе грошы, хто тут узложыць сем галоў». Закапаў, пашэптаў ды і пайшоў.

Гаспадар з гэткаго дзіва прызадумаўся моцна, а затым стаў чухаць галаву. «Гэй, — і думае сабе, — скуль бы мне ўзяць гэтыя сем галоў? Вось калі б гэтак жонка мая мела іх і семдзесят сем, дык не пажалеў бы іх, а ў яе толькі адна галава, ды і тая дурная. Як бы тутака парадзіць?».

Доўга гэтак думаў, лежаўшы дагары пузам ды лічучы хмаркі на небе, а над ім лётала цьма авадней. Як толькі які з авадней сядзе яму на нос, ён зараз яго ухопіць, адарве галоўку авадню, саломку ў хвосцік, пусціць яго ды смяецца вясёла, гледзючы, як авадзень ляціць бы ашалелы, высока-высока, пакуль ня прападзе пад небам. Шмат галоў ужо адарваў, многа саломак ужо ўсадзіў авадням, думаючы ўсё аб сямі галавах; ажно неяк добрая думка ўвайшла яму ў галаву. Скочыў на ногі дыў давай лавіць авадней: злавіўшы іх сем, пайшоў туды, дзе дзядок закапаў свае грошы, выкапаў іх з зямлі, а кідаючы ў яму адна за другой галавы, якія адарваў авадням, прыгаварываў: «Вось адна галава, вось і другая галава!» І гэтак ажно да сямі. Кінуўшы ўсе, забраў гаршчок, дзе былі адны дукаты-чырвонцы, схаваў пад палу світкі і шчасліва ўцёк да хаты. Здурэўшы з радасці, сказаў жонцы аб сваім шчасці, а як прыпомніў сабе, што зрабіў глупства, кажучы аб гэтым жонцы, падумаў сабе: «А ліха ж яе мацеры! Селі пяцігорцы макам, кабыла порах з'ела! Што я нарабіў? Як цяпер на гэта парадзіць?»

Думаў дый выдумаў. Пайшоў у мястэчка, накупіў пірагоў больш за чатыры капы дый прынёс у хату. Капу рассыпаў на дварэ, капу кінуў на страху, панатыкаў крыху ў плецень, дый рэшту ўзяў у хату, шыбкі ў вакнах пабіў, а пірагі параскідаў па ўслонах ды па палу. Жонкі не было ў хаце, апаведала яна ўжо ў другім канцы сяла, як гэта муж яе чатыры катлы грашэй знайшоў, чаму, вядома, ніхто веры і не даваў. Аблітая потам, прыбегаець яна ў хату; глядзіць, цэлы двор усланы пірагамі, пірагі на страсе, пірагі ў плетню, а хата з пабітымі шыбкамі ў вакнах.

— Што гэта? — пытаецца з дзівам.

— Ці ты не бачыла, — адказвае ёй муж, — як ішла хмара з пірагамі замест граду? Збірай хуценька, каб суседзі не бачылі.

Пазбіралі ўсё дый у клеці. Жонка зараз жа пабегла з хаты ў хату дый давай апаведаць людзям, як над іх падворкам лопнула хмара з пірагамі, каторых і назбіралі поўную клець. Варочаецца баба дамоў, ажно па дарозе сустрачаець мужа з гаццю на рыбы, ды вось дзіва, у гаці чатыры шчукі ды два маладыя зайцы.

— Што гэта? — ізноў пытаецца.

— А што, — адказвае муж, — паставіў я гаць на рыбы, а Бог даў рыбы ды зайцоў.

— Ов-ва! — крыкнула жонка. — Вось дзіво так дзіво!

Зараз і пабегла хваліцца ў сяле, што муж злавіў гаццю ў рэчцы дзесяць шчук ды пяць зайцоў. Вярнуўшыся позна ўвечэр, бачыць, што мужа німа ў хаце; урэшця прыбегае ён мокры ад поту, бытцам рудая мыш, а ў руцэ трымае здор сала.

— Што гэта? — пытае ў яго жонка.

— Маўчы дурная! — кажэ ёй муж на

Наследие слуцкого края

вуха: — Пан улез у клець дый краў сало, я, дагнаўшы, адабраў ды шэльму выхвастаў, як сабаку. Ды глядзі ж мне, не расказывай нікому, бо была бы бяда!

Прайшоў адзін тыдзень, другі, гаспадар пабіў сваю жонку за нейкае там ліха. Злуючы на яго, жонка і кажэ:

— Пачэкай жэ, гадзюка! Пайду я да пана, усё чыста скажу, як ты знайшоў грошы.

— Ідзі к чортавай мацеры!

Яна тыкі і пабегла. Пан прысылае за мужыком. Калі яго спыталіся аб знойдзеных грашах, здрыгануў ён плечыма, пачаў хрэсціцца ды клясціся, адказваючы:

— Далібог ані чуў, ані бачыў!

— Хлусіць, паночку, брэшэць! — крычала заўзятая баба. — Знайшоў, далібог знайшоў, у той самы дзень, як хмара ішла з пірагамі.

— Ашалела баба! — кажэ здзіўлены пан.

— Скруцілася, паночку! — адказаў муж, уздыхаючы.

— Сам ён скруціўся! — дзіка крыкнула баба. — Знайшоў, далібог, знайшоў, у той самы дзень, як два зайцы да чатыры шчукі у гаць улезлі.

— Што табе, баба, упілася ці ашалела? — пытаўся пан ад смеху, трымаючыся за пузо, каб не лопнуць.

— Кручаная, паночку! — сказаў муж, ламаючы рукі. — Вось і доля мая, доля нешчасная!

— Сам ты кручаны! — крычала, бытцам ашалеўшы, баба, грозючы свайму мужу кулакамі: — Знайшоў, паночку, каб я счарнела, як зямля, калі не праўда! Знайшоў у той самы дзень, выбачай паночак, як пан сало краў!

— Нешчасная мая доля, горкае мае жыццё! — крыкнуў мужык са страхам.

А пан, смяючыся, як ніколі ў жыццю, прыказаў бабу звясці да студні ды выліць ёй колькі вёдзер на галаву, каб ёй глузды прыўраціць.

Сноў. 1849.

РАВІЧ Іосіф Іпалітавіч, вучоны-ветэрынар, педагог. Сапраўднае прозвішча Гіршовіч Мойша. Нарадзіўся 16.4.1822 г. у Слуцку. У 1850 г. закончыў курс ветэрынарнага аддзялення са ступенню ветэрынара. У 1856 г. абараніў дысертацыю, атрымаў званне магістра ветэрынарных навук. Па выніках конкурсу ў 1859 г. быў прызначаны прыватдацэнтам акадэміі на кафедры зоапаталогіі і зоафізіялогіі, а ў наступным годзе накіраваны на 2 гады на вучобу за мяжу. Пасля вяртання быў выбраны экстраардынарным, а ў 1867 г. ардынарным прафесарам. У 1871 г. узначаліў створаны па яго ініцыятыве часопіс «Архив ветеринарных наук». У 1872 г. прызначаны загадчыкам ветэрынарнага аддзялення акадэміі. Галоўныя навуковыя працы: «Агульная зоапаталогія» (1861), «Курс вучэння пра павальныя і заразныя хваробы свойскай жывёлы», «Поўны курс іпалогіі» і інш. Шэраг яго артыкулаў надрукаваны ў тагачасным перыядычным друку. Памёр 9(21).9.1875 г.

СЕЎРУК Леанід Сафоніевіч, педагог, аўтар шэрагу падручнікаў па прыродазнаўстве. Нарадзіўся ў 1870(?) г. у засценку Сорагі Слуцкага павета. У 1885 г. з залатым медалём закончыў Слуцкую гімназію і паступіў у Пецярбургскі універсітэт. Пасля яго заканчэння працаваў выкладчыкам у Пецярбургскім сіроцкім інстытуце. Многія складзеныя ім падручнікі ў дарэвалюцыйны час перавыдаваліся па некалькі разоў. Склаў кніжку па батаніцы на беларускай мове, аказваў матэрыяльную дапамогу выдавецкай суполцы «Загляне сонца і ў наша аконца». Менавіта Л.Сеўрук, якому некалі аказваў матэрыяльную дапамогу настаўнік Слуцкай гімназіі М.Д.Прата-попаў, са сваімі сябрамі прывёз з Пецярбурга і паставіў на слуцкіх могілках помнік настаўніку з эпітафіяй «Подзвігам была твая дзейнасць. Настаўніку-чалавеку».

СЛУПСКІ Аляксандр Іванавіч, беларускі і рускі літаратар, гісторык і археолаг. Нарадзіўся 16.4.1864 г. у Слуцку. Закончыў Мінскую гімназію, Пецярбургскі універсітэт (1887). У «Паўночна-заходнім календары» на 1888 год апублікаваў гістарычны нарыс «Ізяслаўль і Тураў...». Пад яго рэдакцыяй у Мінску выдадзены «Паўночна-заходні каляндар» на 1892 г. і 1893 г., дзе А.І.Слупскі змясціў і свой народны каляндар, складзены на аснове народных прыкмет беларусаў, тэкстаў беларускіх абрадавых песень і прыказак, а таксама свае артыкулы «Гісторыя Мінска» і «Легенда пра Магілёў». У 1880—1890-я гады друкаваў гісторыка-краязнаўчыя і літаратурна-крытычныя артыкулы ў перыядычных выданнях Мінска.

Наследие слуцкого края

У артыкуле «Стары Мінск» (газ. «Минский листок», 5.5.1895) прывёў біяграфічныя звесткі пра В.Дуніна-Марцінкевіча. З 1893 г. працаваў на Урале. У 1901—1905 гг. — член Пермскай губернскай архіўнай камісіі. Вывучаў архітэктуру і археалогію Паўночнага Урала («Архітэктурныя помнікі Салікамска», 1902, «Падземныя хады Салікамска», 1904, «Да пытання аб маскоўскім і наўгародскім уплыве ў архітэктурных помніках Салікамска і Чэрдыні», 1905). Памёр на Урале каля 1907 г.

ТАЯМНІЧЫ АЎТАР

У польскім горадзе Гнезна, што ля Познані, нехта Б.І.К. выдаў у 1905 годзе ананімныя «Успаміны аб Слуцку». Ва ўступным слове сказана, што ўспаміны напісаны ўраджэнцам Слуцка, высокім царскім чыноўнікам, імя якога было нямецкім, душа ж — «літоўскай» (г.зн. беларускай). Апошнія гады свайго жыцця гэты чыноўнік правёў у горадзе, звязаным з імем Міцкевіча (г.зн. у Навагрудку або ў Вільні), дзе ў 1886 годзе і ўзнавіў па памяці падзеі паўвекавой даўнасці.

«Нямецкае імя» аўтара «Успамінаў аб Слуцку» расшыфравана ў часопісе «Пшэводнік бібліёграфічны». Гэта быў барон Сталь, або Стаэль. Нягледзячы на сваё арыстакратычнае паходжанне і пасаду слуцкага гараднічага, ён прытрымліваўся даволі перадавых поглядаў, спачуваў беларускім сялянам і выступаў за тое, каб вызваліць іх ад прыгону.

Барон Сталь расказвае аб гістарычным мінулым Слуцка і яго стане ў пачатку XIX стагоддзя. «Першымі жыхарамі Слуцка і ўсяго гэтага краю былі русіны беларускага племені, набожныя, сумленныя і працавітыя». У 1116 годзе горад цалкам спалілі наезнікі. Потым, у XV стагоддзі, сюды прыйшлі першыя палякі і літоўцы. Каля 1750 года Ян Маджарскі заснаваў тут майстэрню, у якой ткаліся слуцкія паясы.

У пачатку мінулага стагоддзя горад меў каля 7000 жыхароў і належаў буйному магнату князю Вітгенштэйну. У Слуцку было тады ўсяго 15 мураваных будынкаў. Сярод іх вылучаліся праваслаўная семінарыя, кальвінская гімназія і царква святой Тройцы на Трайчанах, пры якой у свой час перапісваліся кнігі, накіраваныя супраць акаталічвання. Цікава, што абліччы святых на царкоўных абразах былі падобны да твараў мясцовых сялян. Успаміны Сталя пацвярджаюць меркаванне некаторых даследчыкаў, што ў пачатку XIX стагоддзя беларускай мовай шырока карысталася духавенства, асабліва уніяцкае. Велікодная цырымонія ў Слуцку, гаворыцца ва ўспамінах, завяршалася «казаннем кс. Шантыра на народнай беларускай мове; сяляне слухалі тое казанне з вялікай увагай».

У пачатку мінулага стагоддзя Слуцк жыў даволі інтэнсіўным эканамічным і культурным жыццём. Праз чатыры брамы горада вёўся гандаль з Вільняй, Гародняй, Кіевам і Масквой. У партыкулярным доме быў тэатр, дзе выступала трупа Клакоцкага. Мясцовы цырульнік Зэлік арганізаваў музычную капэлу і нават напісаў для яе марш. А шавец Болбут хадзіў па святах з батлейкай.

...Сталь цытуе словы модных сярод слуцкай моладзі макаранічных песенак. Польскія словы ў іх пераплятаюцца з беларускімі:

Ой, на моры, на акрэнце
Панна з туркем у карты грае
І, граючы, ліст пісае.

А вось і чыста беларускі тэкст. Злодзей у карчме падае раду сваім кампаньёнам наступнай прынеўкай:

А кароўку-астрарожку
Выведзіце на дарожку.
Правядзіце за гару, за гару,
А я вас даганю, даганю.

У заключэнне мемуарыст расказвае аб падарожжах у Мазыр, Навагрудак і Слонім...

Да «Успамінаў аб Слуцку» прыкладзены бібліяграфічны нарыс пра Людвіка Развадоўскага. Магістр філасофіі, выпускнік Віленскага універсітэта, ён адкрыў у Балочыцах ля Слуцка сялянскую школу. Пасля смерці Развадоўскага (1869) застаўся рукапіс «Філасофія паводле сістэмы Канта», які пры жыцці Сталя захоўваўся ў Слуцкай гімназіі.

Друкуецца па кн.: Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мн., 1969. С. 186—188.

ЦЭРАСКІ Вітольд Карлавіч (9.5.1849—29.5.1925), астраном, педагог. Нарадзіўся ў Слуцку ў сям'і настаўніка геаграфіі. Бацька яго памёр, пакінуўшы

Наследие слуцкого края



В.К.Цэраскі.



М.М.Чудоўскі.



А.Ф.Чэскі.

сям'ю ў складаным матэрыяльным становішчы. Дзякуючы намаганням маці Цэраскі пасля заканчэння Слуцкай гімназіі, дзе ён паказаў выдатныя вынікі і схільнасць да дакладных і прыродазнаўчых навук, асабліва да астраноміі, паступіў на вучобу ў Маскоўскі універсітэт. Ужо з 2-га семестра ён працаваў ва універсітэцкай абсерваторыі назіральнікам. Закончыў універсітэт у 1871 г. і быў залічаны на пасаду пазаштатнага асістэнта, а з 1878 г. — астранома абсерваторыі. У 1882 г. Цэраскі абараніў дысертацыю на ступень магістра астраноміі і пачаў выкладаць гэты прадмет у Маскоўскім універсітэце. У 1883 г. практыкаваўся ў абсерваторыях Германіі, слухаў лекцыі нямецкага прыродазнаўца Гельмгольца і іншых вучоных. У 1887 г. абараніў у Пецярбургскім універсітэце ступень доктара астраноміі, а ў 1889 г. стаў прафесарам. Праз год Цэраскі прызначаны дырэктарам астранамічнай абсерваторыі Маскоўскага універсітэта і працаваў на гэтай пасадзе да 1916 г. Член-карэспандэнт Расійскай АН (1914) і член многіх астранамічных таварыстваў Расіі. З-за пагаршэння здароўя Цэраскі пакінуў работу ў абсерваторыі і пераехаў у Крым, дзе яго і застала Кастрычніцкая рэвалюцыя. Не маючы падтрымкі з боку ўлад, Цэраскі апынуўся ў вялікай нястачы і існаваў выключна за кошт невялікіх дапамог ад сяброў з-за мяжы. У 1922 г. яму назначылі дзяржаўную пенсію. У 1923 г. ён пераехаў да сына ў Падмаскоўе. У маі 1924 г. навуковая грамадскасць Расіі шырока адзначыла 75-годдзе Цэраскага, які да апошніх дзён не спыняў навуковай дзейнасці.

Цэраскі быў адным з пачынальнікаў інструментальнай фотаметрыі і заснавальнікам маскоўскай школы фотаметрыстаў, ён распрацаваў методыку фотаметрычных назіранняў і дамогся высокай для свайго часу дакладнасці вызначэння бляску зорак. На працягу 1875—1903 гг. ён дакладна вымераў бляск больш як 500 зорак, адным з першых вызначыў у 1903 г. зорную велічыню Сонца. У 1885 г. ён адкрыў існаванне т.зв. серабрыстых воблакаў, якія свецяцца, і сумесна з А.А.Белапольскім устанавіў, што яны знаходзяцца на вялікай вышыні над Зямлёй (каля 80 км). Па яго ініцыятыве з 1895 г. распачата сістэматычнае фатаграфаванне неба з мэтай адшукання і даследавання пераменных зорак на атрыманых фотаздымках. У 1895 г. на аснове доследаў з плаўленнем металаў у фокусе ўвагнутага люстэрка Цэраскі ўпершыню ўстанавіў ніжнюю мяжу тэмпературы Сонца 3500 °С. Цікавіўся гісторыяй астраноміі, асабліва XVI і XVII ст., спецыяльна наведаў мясціны, дзе жылі і працавалі М.Капернік (апублікаваў пра яго артыкул) і Ц.Браге. Лекцыі Цэраскага як вучонага і педагога вызначаліся высокім прафесіяналізмам і даходлівасцю. Ён па-бацькоўску ставіўся да сваіх вучняў, быў спагадлівым да людзей.

ЧУДОЎСКІ Мікалай Мікалаевіч, рэвалюцыянер, адзін з арганізатараў сацыял-дэмакратычнай групы РСДРП у 1905 г. у Слуцку. Нарадзіўся ў 1885 г. у Слуцку ў сям'і выкладчыка гімназіі. Закончыў Слуцкую гімназію, вучыўся ў Юр'еўскім (Тарту) універсітэце, з якога быў выключаны за ўдзел у рэвалюцыйным руху студэнтаў. У 1904—1905 гг. у Рызе ўдзельнічаў у баявых дружынах, у Мінску прымаў удзел у дэманстрацыях супраць курлоўскага расстрэлу, у Слуцку займаўся рэвалюцыйнай дзейнасцю. У 1907 г. у Германіі, член сацыял-дэмакратычнай партыі, у 1914 г. у гру-

Наследие слуцкого края

пе «Спартак», супрацоўнічаў з нямецкімі рэвалюцыянерамі Р.Люксембург, К.Ліб-кнехтам, К.Цэткін. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі вярнуўся на радзіму, прымаў удзел ва ўстанаўленні ўлады ў Літве, Беларусі, на Кубані, у Растове, Баку. Працаваў у Маскве ў Камісарыяце знешняга гандлю. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр у 1966 г.

ЧЭСКІ Аляксандр Фёдаравіч, актыўны ўдзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг. Нарадзіўся ў Слуцку. Закончыў Слуцкую гімназію, вучыўся ў Маскоўскім універсітэце на прыродазнаўчым факультэце. Зарэкамендаваў сябе таленавітым хімікам. Удзельнічаў у падрыхтоўцы баявых дружын, непасрэдна праводзіў інструктаж па ваенна-баявой справе. У 1906 г. член Маскоўскага ваенна-тэхнічнага бюро РСДРП, працаваў сумесна з рэвалюцыянерамі М.Праабражэнскім і П.Штэрнбергам. У 1907 г. у Пецярбургу арганізаваў інструктарскую школу-лабараторыю, якая ў хуткім часе пераводзіцца ў Каакалу (Фінляндыя), займаецца зброевай справай. Арыштаваны і ў 1908 г. змешчаны ў Трубецкі бастыён Петрапаўлаўскай крэпасці, дзе і памёр яшчэ да пачатку суда ў сакавіку 1909 г.

Мастакі XIX ст. — нашы землякі

ВЯРОЎСКІ Васілій, іканапісец. Нарадзіўся ў Слуцку. Распісваў у XIX ст. Слуцкі праваслаўны сабор, які па знешнім выглядзе нечым нагадваў славуты Ісакіеўскі сабор у Пецярбургу. Па расказах відавочцаў, малюнкі былі выкананы з вялікім майстэрствам, на высокім прафесійным узроўні. На жаль, спадчына яго не захавалася.

ЗАЛЕСКІ Браніслаў Францавіч, беларускі і польскі мастак, пісьменнік. Нарадзіўся ў 1819 г. у маёнтку Рачкавічы Слуцкага павета. Першапачатковую агульную і мастацкую адукацыю, магчыма, атрымаў у Вільні. У 1840 г. закончыў гістарычны факультэт Дэрпцкага універсітэта. За ўдзел у нелегальных рэвалюцыйных гуртках быў арыштаваны і ў 1847 г. сасланы ў Арэнбург, потым у Хіву, Туркестан. У ссылцы пасябраваў з Т.Р.Шаўчэнкам. Разам з ім удзельнічаў у экспедыцыях па Аральскім краі і ў горы Каратау. З 1856 г. жыў у Рачкавічах, падарожнічаў па Беларусі. У пачатку 1860-х гадоў эмігрыраваў за мяжу, падтрымліваў паўстанне К.Каліноўскага. Член-карэспандэнт Кракаўскай акадэміі навук (1873). Жыў у Парыжы, Дрэздэне, Рыме. Пахаваны ў Ментане.

Аўтар жывапісных і графічных пейзажаў, сюжэтна-тэматычных кампазіцый, прадстаўнік акадэмічнага кірунку. Свае малюнкі змяшчаў у «Віленскім альбоме». Стварыў шэраг малюнкаў пра паўстанне 1863—1864 гг. («Серакоўскі ў турме» і інш.). Выпусціў ілюстраванае (22 афорты) выданне «Жыццё кіргізскіх стэпаў». Стварыў афорты «Калізей у Рыме» (1864), «Від Сан-Мало».

Аўтар шэрагу публіцыстычных твораў і мемуараў, у тым ліку: «Польскія выгнанніки ў Арэнбургу» (1866), «Адмена прыгоннiцтва ў Літве» (1868), «З жыцця літвінкі» (пра мастачку А.Скірмунт, 1876). Захавалася яго перапіска з Т.Р.Шаўчэнкам, перапісваўся з А.І.Герцэнам. Памёр 2.1.1880 г.

Урыўкі з лістоў Б.Ф.Залескага да ўкраінскага паэта Т.Р.Шаўчэнкі

18 верасня 1856 г.

«...Што мне сказаць табе сёння? Я шэсць тыдняў жыву ўжо сярод сваіх, дыхаю родным паветрам, гляджу на родныя лугі і лясочкі, на ўсё дарагое і на твары сяброў і блізкіх, даражэй за ўсё — я шчаслівы, як не быў шчаслівы ніколі, але хіба я магу гаварыць аб гэтым шчасці табе, беднаму пакутніку? Гэта азначала б здалёку паказваць хлеб галоднаму. Ах, дружа мой! Як бы мне хацелася падаць і табе гэтага ж хлеба! Бачыць і цябе на мілай радзіме — сярод сваіх, якіх ты так шчыра любіш...».

«Маці мая ... гаворыць, што хацела б пацалаваць цябе, як роднага свайго. Усе мае любяць цябе шчыра і калі Бог дазволіць табе развітацца таксама з зауральскім стэпам, то па дарозе на радзіму заязджай, дружа, у мой куток; не багата, але шчыра (лісты Б.Залескі пісаў па-руску, але слова «шчыра» напісана ім самім. — *А.М.) і ўсім сэрцам сустрэнуць цябе...».*

2 сакавіка 1857 г.

«...Летам, магчыма, я здзейсню падарожжа па Віліі — «маці літоўскіх рэк», з алоўкам і мальбертам. Ствараецца для

Наследие слуцкого края

гэтага прыватная экспедыцыя, якая мяркуе зрабіць апісанне ракі ў яе гістарычных, археалагічных, тапаграфічных і іншых адносінах. Мяне запрашаюць для складання альбома краявідаў...».

Канец мая 1857 г.

«...Жыццё ў вёсцы ва ўсіх адносінах надзіва цудоўнае, я даўно, вельмі даўно не бачыў падобнай вясны, не пражыў такога мая, як цяпер. Як цудоўна спяваюць салаўі! Як пахнуць гаі! Садок у Рачкавічах так квітнее, што на дрэвах не ўбачыш лісціка — усё напоўнена жыццём і любоўю, і чалавек бліжэй да прыроды, і неяк бліжэй да вялікага Бога, грудзі становяцца цяплейшымі і сэрца як быццам мацней б'ецца... Я ўзяў з сабою шмат арэнбургскіх эскізаў і думаў тады, што іх выкарыстаю, але пражыўшы вясну ў цудоўнай Літве, я бачу, што не дакрануся да іх. Малюю і вывучаю нашы дрэвы. Я, дружа мой, не магу стварыць «Блуднага сына», напрыклад, але б мне хацелася вывучыць гэты куток зямлі — для мяне святы і, у крайнім выпадку, на некалькіх малюнках красу яго паказаць...

Калі заехаць у Рачкавічы не дазволяць табе акалічнасці, то я прыеду ў Пецярбург, а пасля калі-небудзь, накіроўваючыся пакланіцца старому Кіеву і Дняпру, ты заедзеш і ў мой куточак, памолімся ў «Восточной браме», і старыя мае са слязамі бласлаўляць цябе будуць...».

2 чэрвеня 1859 г.

«...Я жанюся, мой мілы Тарасе... Нявеста мая, гадоў 25-ці».

Дадае, што Алена Скірмунт некалькі гадоў жыла за мяжой, вучылася жывапісу, і абое збіраюцца з'ездзіць за мяжу разам — «любавацца творамі мастацтва і вучыцца».

Згаданы ліст стаў апошнім, пасланым Залескім Шаўчэнку з Рачкавічаў. Правільней, апошнім з тых, што захаваліся. Перапіска, бадай, працягвалася і пасля гэтага, хоць, магчыма, не так рэгулярна. І прычына не толькі ў тым, што Залескі часта выязджаў з Рачкавічаў. І ў 1857—1859 гадах Браніслаў Францавіч некаторы час жыў і ў Дараве непадалёку ад Баранавічаў, і ў Мінску, і пад Гроднам. Тым не менш, ён пастаянна вяртаўся ў Рачкавічы. Па-ранейшаму цешыў сябе надзеяй — абавязкова наведаецца любы Тарас сюды, дзе яго даўно чакаюць як самага дарагога і блізкага чалавека. Гэтым спадзяваннем заканчваецца і пісьмо ад 2 чэрвеня 1859 года: «Лісты твае знойдуць мяне заўсёды, дзе б я ні быў, калі іх адрасаваць будзеш праз Слуцк у маёнтак Рачкавічы».

Друкуецца па кн.: Марціновіч А. Хто мы, адкуль мы... Мн., 1996. Кн. 1. С. 452, 454—456, 463—464.

КАРСАЛІН Кандрат Ільіч, нарадзіўся 9.3.1809 г. у Слуцку ў небагатай мяшчанскай сям'і. Пэўнай адукацыі ў дзяцінстве не атрымаў. З 12 гадоў захапіўся іканапісам, у 14 гадоў — ён ужо памочнік у мясцовых іканапісцаў, працаваў разам з імі над іканастасамі для гарадскіх цэркваў. Акрамя абразоў, пачаў займацца партрэтным жывапісам. Першыя прафесійныя парады ў асваенні партрэтнага мастацтва ён атрымаў ад Т.Гесэ, выкладчыка малявання мясцовай гімназіі.

У 1830 г. Карсалін пакінуў Слуцк і пераехаў у г. Арол. Тут ён займаўся галоўным чынам партрэтным жывапісам. Выстаўляў свае творы на гарадской выстаўцы 1835 г. З 1838 г. — слухач Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў, а ў 1839 г. за «Аўтапартрэт» і «Мужчынскі партрэт» атрымаў званне пазакласнага мастака. Савет акадэміі прапанаваў яму працу мастака пры Рускай духоўнай місіі ў Пекіне. У Кітаі Карсалін прабыў каля трох гадоў. З-за хваробы, не дапрацаваўшы абумоўлены тэрмін, вярнуўся ў Расію. Спачатку жыў у Іркуцку, а ў пачатку 1850-х гадоў прыехаў у Санкт-Пецярбург. 6.10.1855 г. савет акадэміі за партрэт обер-свяшчэнніка арміі і флоту Кутневіча, які быў напісаны з натуры, прысвоіў яму званне акадэміка партрэтнага жывапісу. Пазней ён стаў членам савета акадэміі.

На працягу 1854—1867 гг. мастак стварыў шмат абразоў і іканастасаў, пісаў карціны на біблейскія сюжэты. Займаўся пейзажным жывапісам. Вядомы твор гэтага жанру — «Від на загарадны палац у ваколіцах Пекіна» (1860).

У 1879—1883 гг. К.Карсалін жыў у Слуцку. Верагодна, што ў апошнія гады свайго жыцця, як і ў ранні перыяд творчасці, пісаў партрэты жыхароў Слуцка і абразы. Дата смерці невядома.

КРАНІКОЎСКІ, іканапісец. Напісаў абразы для іканастаса Слуцкага Свята-Мікалаеўскага сабора.

СТРАЛКОЎСКІ Павел, іканапісец 2-й палавіны XIX ст. Вядома, што жыў ён

Наследие слуцкого края

на «Востраве». У Слуцкім Свята-Міхайлаўскім саборы знаходзяцца яго творы, якія былі напісаны ў 1889 г.: абразы Найсвяцейшай Багародзіцы і Святой Тройцы.

ТАРАСЕВІЧ Адам, іканапісец 1-й паловы XIX ст. У 1825 г. напісаў абразы для іканастаса саборнай царквы Свята-Ільінскага манастыра ў Слуцку.

ШЭМЕШ Адам, жывапісец і мастацтвазнавец. Нарадзіўся ў 1808 г. у Слуцкім павеце. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Літвы. Мастацкую адукацыю атрымаў у Віленскім універсітэце (1826—1831). За антыўрадавую дзейнасць ён высланы ў Расію. У 1846 г. вярнуўся ў Мінск, з 1852 г. жыў у Вільні. Вядомы як партрэтыст (аўтапартрэт, партрэты У.Сыракомлі, С.Манюшкі, І.Янушкевіча, Е.Фялінскай і інш.). Стварыў кампазіцыі на рэлігійныя тэмы, па непацверджаных звестках — на гістарычныя і бытавыя. Рабіў ілюстрацыі да твораў А.Міцкевіча, прымаў удзел у афармленні драматургічных пастановак В.Дуніна-Марцінкевіча. Аўтар «Успамінаў пра Віленскую мастацкую школу», «Успамінаў пра Дамеля» і інш., апублікаваных у віленскім часопісе «Атэнэум».

І.Ціткоўскі, В.Відлога.

Шляхі жыцця праходзілі праз Слуцк

ГРАФ БАНДЫНЭЛІ

1840 год... На адыходзе лета ў радавітай памешчыцкай сям'і Рышарда і Караліны Абуховічаў нарадзіўся хлопчык, будучы пісьменнік. Маёнтак іх быў у Калацічах, што непадалёку ад Глуска. Калі Альгерд падрос, бацькі аддалі вучыцца яго ў Слуцкую гімназію. Але бацькам, відаць, хацелася, каб іх сын атрымаў адукацыю за мяжой, таму і адправілі Альгерда за навукай у Швейцарыю. Пасля Жэневы быў Парыж. Юнак быў здольны да навук — ён добра валодаў французскай, англійскай, італьянскай, нямецкай і іспанскай мовамі.

У Францыі Альгерд прабыў нядоўга. Яго вяртанне ў родную Беларусь супала з рэзкім узмацненнем сялянскага руху, выкліканага грабежніцкім характарам рэформы 1861 г. У многіх паветах Гродзенскай, Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай і іншых губерняў сяляне адмаўляліся плаціць аброк, адрабляць паншчыну, падпісваць устаўныя граматы. У выніку ўсё гэта вылілася ў магутнае паўстанне 1863—1864 гг., якім у Беларусі і Літве кіраваў беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат Кастусь Каліноўскі. Па сваіх поглядах, адносінах да сялян Абуховіч не мог заставацца ў баку ад гэтых падзей. І яшчэ... «ён быў нашчадак славутай рэвалюцыйнымі традыцыямі сям'і». Сотні змагароў загінулі ў баях, многія былі кінуты ў турмы, сасланы на катаргу, у Сібір быў высланы і Альгерд Абуховіч.

Тытулаваны памешчык, катаржанін, мужыцкі пісьменнік — ён стаў «белай варонай у сваім асяроддзі, якое яго выракла, аб'явіла вар'ятам». І ў асабістым жыцці было мала радасці. Аб чым і піша Абуховіч у сваіх празаічных «Мемуарах» у раздзеле «Мая жонка»: «...яна была асоба гожая, вельмі мілая і ветлівая з людзьмі. Вартая лепшай долі...». Праз няпоўных сем гадоў сумеснага жыцця ў Пецярбургу ад сухотаў памерла жонка Абуховіча. Засталася глуханямая дачка, якую ўзяла да сябе гадаваць, там жа ў Пецярбургу, цётка.

Апошнія гады жыцця Альгерд Абуховіч правёў у Слуцку, працаваў рэпетытарам. Тут жа ў 1894 г. ён і напісаў свае «Мемуары» — празаічны твор біяграфічнага характару. У іх склад увайшло дванаццаць своеасаблівых па жанры і невялічкіх па аб'ёме раздзелаў. Пра гэты твор вядомы літаратуразнавец Адам Мальдзіс пісаў, што «мемуары Абуховіча напісаны яркай, сакавітай мовай... Яны



А.Р.Абуховіч.

Наследие слуцкого края

стаяць ля вытокаў мастацкай прозы». Акрамя «Мемуараў» на сённяшні дзень вядомы верш «Дума», байкі «Ваўкалак», «Воўк і лісіца», «Суд», «Старшына». На жаль, спадчына пісьменніка дрэнна захавалася. У друку Абуховіч падпісваўся Граф Бандынэлі. Як псеўданім ён выкарыстоўваў дзявочае прозвішча сваёй бабулі, якая была графіняй з Італіі.

На мастацкае развіццё беларускай літаратуры другой палавіны XIX ст. уплыў зрабіла яе ўзаемадзеянне з іншымі літаратурамі. Менавіта ў гэты час выраслa колькасць перакладаў на беларускую мову. Вялікі ўклад у гэту справу зрабіў і Альгерд Абуховіч, які своеасаблівую ўвагу аддаваў перакладам. Здольны і вельмі працавіты, на мову сялян ён пераклаў творы Петраркі, Гётэ, Шылера, Гюго, Байрана, Пушкіна, Лермантава, Міцкевіча, Сыракомлі і іншых. Некалькі гадоў таму ў Польшчы адшукаліся ў перакладзе Абуховіча дзве байкі Крылова.

А што ж знешне ўяўляў сабой пісьменнік? Па словаапісанні мастак Міхаіл Вецік стварыў партрэт А.Абуховіча, а мастак Ф.Янушкевіч у сваім палатне «Паўстанне 1863 года» адлюстраваў вобраз пісьменніка (карціна знаходзіцца ў Слуцкім краязнаўчым музеі) як паўстанца. Памёр 10.8.1898 г.

В.С.Відлога.



Помнік А.Р.Абуховічу на слуцкіх могілках.

З творчасці А.Р.Абуховіча

СТАРШЫНА

Хоць які парадак дай,
Адно тое, братка, знай,
Што крутнёю ўсё пакруціш
І найлепшэ збаламуціш.
Льва-манарха воўк прасіў,
Каб вайтом яго зрабіў.
Бо авечкі скрозь у бязладдзі,
Шкодзяць вельмі ў панскім садзе.
Ды і самі прападаюць,
Бо, як жыць, яны не знаюць.
І ліса за ім прасіла
(Яе жонка льва любіла).
Воўк з лісіцаю звязаўся
І, як можна, так стараўся:
Дзе прасілі, дзе ўздыхнулі,
Дзе гасцінца падаткнулі,
Каб дабіцца да медалі,
І плацілі, і прасілі, і стагналі...
Леў гаворыць: — Ходзяць толкі,
Што авец з'ядаюць воўкі.
І сазваць сказаў народ
На звярыны вольны сход,
Паспытаць усіх звярат:
— Воўк ці добры, ці ён гад?
Чыны важна ўсе прыйшлі,
Усё начальства тут было.
Ды прычыны не знайшлі,
Зла аб воўку не чутно:
Пад судом ён, бач, не быў
І з начальствам добра жыў,
Дык медаль пан войт надзеў
На авечы цэлы хлеў.
А авечкі што сказалі? —
Іх на сход зусім не звалі,
А ўпісана ў пратаколе,
Што «авечкам дана воля».

СУД

Там, дзе пушча, за прасёлкам,
Калісь ліс жыў з шэрым воўкам
І, як весць людская кажа,
Жыло згодна племя ўража;
Ды да часу.
Хутка сварка там пайшла:
Укрыўдзіў нечым ліс ваўка.
Дайшло дзела да суда.

Наследие слуцкого края

Можа, праўда, можа, не, —
Адвакаты — два сабакі на судзе.
Кожны брэша, на праціўніка вядзе.
А суддзёю быў глушэц,
Ён разумны ці глупец,
Тое трудна разгадаць,
Адно толькі, як чуваць,
Што рашыў ён дзела так:
Выгнаў з суду ўсіх сабак,
А воўк з лісам плоцяць штраф.
Воўк — бо хлусіць ён напрасна,
Ліс — бо злодзей.
Гэта ясна:
Круцялёў чым разбіраць,
Лепш абодвух пакараць.

АРЦЕМІЙ (?—1570), рускі царкоўны дзеяч і публіцыст, прадстаўнік рэлігійнага вальнадумства, прыхільнік несцяжацеляў. З 1536 г. манах у Парфір'евай пустыні каля Кірыла-Белазерскага манастыра, у 1551 г. ігумен Тройца-Сергіева манастыра, у 1554 г. абвінавачаны ў ерасі, адлучаны ад царквы і сасланы ў Салавецкі манастыр. Каля 1554—1555 гг. уцёк у Вялікае княства Літоўскае. Спачатку жыў у Віцебску, потым у Слуцку пры двары князя Юрыя Алелькі. Займаўся літаратурнай дзейнасцю, вёў барацьбу супраць каталіцызму і лютэранства ў абарону праваслаўя. Асабіста быў знаёмы з С.Будным, К.Каладынскім, І.Зарэцкім. Арцемій аўтар 16 пасланняў, 9 з якіх напісаны ў Слуцку. Зарэкамендаваў сябе таленавітым публіцыстам, адстойваў ідэі духоўнага самаўдасканалення, чалавекалюбства, разумнага пераканання, любові да «кожнага слова», цярпімасці да «ератыкоў».

АСКЕРКА Міхаіл Андрэевіч (1836, Мінск—28.4.1864), удзельнік паўстання 1863—1864 гг. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі. Пасля яе заканчэння паступіў на медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта, потым працаваў у Магілёве урачом. У 1862 г. пакінуў дзяржаўную службу, удзельнічаў у стварэнні рэвалюцыйных арганізацый у Магілёўскай губерні. Належаў да партыі «чырвоных», трымаў сувязь з віленскім паўстанцкім цэнтрам, з К.Каліноўскім. Як камісар Магілёўскага ваяводства разам з Л.Звяждоўскім узначаліў узброенае паўстанне. Летам 1863 г. прызначаны камісарам Мінскага ваяводства. Па заданні К.Каліноўскага ў кастрычніку разам з І.Ямантам рэарганізаваў паўстанцкую адміністрацыю на Міншчыне. Ратуючыся ад рэпрэсій, выехаў у Пецярбург. Арыштаваны 22.10.1863 г. на ст. Востраў Пскоўскай губерні. Расстраляны ў Магілёве па прыгаворы ваеннага суда.

АСКЕРКА Сцяпан Міхаіл (12.9.1712, Навагрудчына—?), эканаміст, юрыст. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі. Працягваў адукацыю ў Кёнігсбергу і Берліне, але з-за ганенняў езуітаў на яго бацькоў вымушаны вярнуцца на радзіму і прыняць каталіцкую веру. З 1733 г. зноў у Прусіі, саветнік юстыцыі караля Фрыдрыха II. У 1760 г. напісаў эканамічны трактат «Неабавязковы план хутчэйшага асваення абложных зямель Брандэнбургскай маркі» (захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу), які ў 1995 г. выдадзены ў беларускім перакладзе. Упершыню ўвёў у навуковы ўжытак слова «план».

АСТРОЖСКІ Канстанцін (Васіль) Канстанцінавіч (1527, Тураў—21.3.1608), палітычны і культурны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, магнат, абаронца праваслаўя. Яго маці Аляксандра паходзіла з дома слуцкіх князёў Алелькавічаў, бацька — Канстанцін Іванавіч — найвышэйшы гетман Вялікага княства Літоўскага. К.Астрожскі атрымаў добрую хатнюю адукацыю, з 1540 г. выконваў розныя гаспадарскія даручэнні («службы»), з 1550 г. — староста ўладзімірскі, маршалак валынскай шляхты, з 1559 г. і да канца жыцця — кіеўскі ваявода, валодаў землямі на Валыні, Кіеўшчыне, Падоллі, Галіччыне. З'яўляўся заснавальнікам школ у Слуцку, Тураве (1572), школы і друкарні ў Астрогу, дзе знаходзіўся яго радавы маёнтак, і інш. месцах. Падтрымліваў дзеячаў беларускай, рускай і ўкраінскай культуры. Пад яго апекай знаходзіліся многія праваслаўныя брацтвы на Беларусі, у Літве і на Украіне. Варожа ставіўся да сялянска-казацкіх выступленняў Касінскага і Налівайкі. Адзін з ініцыятараў канфедэрацыі праваслаўных і пратэстантаў у 1599 г. у Вільні супраць каталіцкай царквы.

АЧАПОЎСКІ Станіслаў Уладзіміравіч (22.2.1878, в. Ёдчыцы былога Слуцкага павета—1945, Краснадар), вучоны, доктар медыцынскіх навук, хірург, акуліст. У 1896 г. закончыў Слуцкую гімназію з залатым медалём, потым Ваенна-медыцынскую акадэмію. Працаваў у Краснадарскай вайсковай бальніцы (пазней —

Наследие слуцкого края

краявой). За сваю практыку зрабіў 35 тысяч аперацый. Краснадарская краявая бальніца носіць яго імя. Тут яму пастаўлены помнік.

БАРТАШЭВІЧ Антоній (1723, Віленшчына — 1768), педагог, доктар філасофіі. Выкладаў граматыку, рыторыку і гісторыю ў езуіцкім калегіуме ў Слуцку.

БЕЛАБОЦКІ (магчыма, БЕЛАБЛОЦКІ) Андрэй (да праваслаўнага хрышчэння **Ян**) **Хрыстафоравіч** (2-я палавіна XVII — пачатак XVIII ст.), усходнеславянскі паэт і філосаф. Закончыў Слуцкую кальвінісцкую гімназію, вучыўся ў Францыі, Італіі, Іспаніі, дзе авалодаў многімі мовамі. Быў кальвінісцкім прапаведнікам у Слуцку, настаўнікам у Магілёве. З прычыны ганенняў езуітамі вымушаны быў пераехаць у Смаленск, потым у Маскву, дзе прыняў праваслаўнае веравызнанне. Як перакладчык з лацінскай мовы з пасольствам Ф.Галавіна наведаў Кітай. Галоўны паэтычны твор — паэма «Пентатэугум, або Пяць кніг кароткіх», напісаны на стараславянскай мове, у якой адчуваецца ўплыў беларускай. Пісаў філасофскія трактаты, рабіў пераклады.

БЖАЗОЎСКІ Тадэвуш (24.10.1749, Польшча — 1820, Полацк), дзеяч каталіцкай царквы, генерал ордэна езуітаў, педагог. Вучыўся ў езуіцкіх школах у Слуцку і Нясвіжы, закончыў Віленскую духоўную семінарыю. Быў настаўнікам, займаўся перакладамі, стаў вядомы як прапаведнік.

БРЖАЗОЎСКІ Антон Рыгоравіч (20.12.1870, былы Бабруйскі павет, цяпер Любанскі раён — 10.2.1961, Куйбышаў), вучоны, хірург, педагог. У 1889 г. закончыў Слуцкую гімназію, потым медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта. У 1922 г. прыват-дацэнт Саратаўскага універсітэта, прафесар шпітальнай хірургічнай клінікі Астраханскага медыцынскага інстытута. Выдадзены яго працы «Рак і барацьба з ім», «Курс прыватнай хірургіі» і інш.

БРЭТЦАР Якуб (1690 — 11.8.1733), жывапісец. Працаваў на Беларусі. У 1715 — 1717 гг. жыў у Слуцку, дзе зрабіў размалёўку інтэр'ера касцёла езуітаў.

ВАЙНІЛОВІЧ Антоній (1773 — 1885), маршалак шляхты Слуцкага павета.

ВАЙНІЛОВІЧ Тадэвуш (1804 — 1878), маршалак шляхты Слуцкага павета. Пахаваны на слуцкіх могілках.

ВАЙНІЛОВІЧ Эдвард Адам (13.10.1847, Сляпянка, цяпер у межах Мінска — 16.6.1928), гаспадарчы і палітычны дзеяч Беларусі. Адзін з самых багатых памешчыкаў у Мінскай губерні (маёнткі Савічы, Пузаў Цімкавіцкай воласці Слуцкага павета і інш.). У 1865 г. закончыў Слуцкую гімназію, у 1869 г. — Пецярбургскі тэхнічны інстытут, працаваў інжынерам, займаўся сельскай гаспадаркай. З 1878 г. быў членам, віцэ-старшынёй Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, у 1906 г. — членам Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі. На працягу 35 гадоў быў ганаровым суддзёй Слуцкага павета. У доме Э.Вайніловіча ў Слуцку праходзіў 1-ы беларускі з'езд Случчыны (1920). За свае сродкі ў Мінску пабудаваў касцёл св. Сымона і Алены, так званы Чырвоны касцёл.

ВАЛІЦКІ Аляксандр (1826, Вільня — 1893), удзельнік грамадскага і культурнага руху на Беларусі ў 1860-я гады. Закончыў Слуцкую гімназію, Маскоўскі (па іншых звестках Харкаўскі) універсітэт. Вучыўся музыцы ў Слуцку і Вільні, выступаў у канцэртах як спявак, выконваў песні С.Манюшкі. У Мінску заснаваў кнігарню, быў хавальнікам фондаў бібліятэкі і архіва М.Радзівіла ў Нясвіжы.

ВАПЛЕР (ВЕПЛЕР) Андрэй (? — ?), музыкант, капельмайстар і кампазітар XVIII ст. Каля 1736 г. паступіў на службу ў прыдворную капэлу князя М.К.Радзівіла Рыбанькі ў Нясвіжы. У 1740 — 1750-я гады працаваў у аркестры князя Г.Ф.Радзівіла ў Слуцку. Выязджаў з аркестрам у Белае (цяпер Бяла-Падляска, Польшча) і Нясвіж.

ВАШЧАНКА Максім Ярмалініч (2-я палавіна XVII ст. — 1708), беларускі гравёр па медзі, друкар. Адзін з заснавальнікаў Магілёўскай школы гравюры. Вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі, дзе атрымаў ступень бакалаўра філасофіі і вольных мастацтваў, званне магістра навук. Друкарская дзейнасць звязана са Слуцкам. Выканаў медзярыты для кніг «Манархія Турэцкая, апісаная Рыко» (1678), «Акафісты і каноны» (1693), якія былі выдадзены ў Слуцку.

ВІТМАН Францішак (Франц), музыкант і капельмайстар XVIII ст. У 1749 — 1760 гг. капельмайстар прыдворнага аркестра князя Г.Ф.Радзівіла ў Слуцку і Белым

Наследие слуцкого края

(цяпер Бяла-Падляска, Польшча). У Слуцку выступаў у драматычных спектаклях, вядома, што выконваў ролю Багацея ў адной з п'ес, пастаўленай у 1752 г. У 1756 г. выязджаў з групай музыкантаў у Нясвіж, у 1760 г. быў запрошаны М.К.Радзівілам Рыбанькай узначаліць Нясвіжскую капэлу.

ВІХЕРТ Ян (2.7.1737, Беларусь — 1791), драматург і педагог. У 1756—1758 гг. вучыўся ў Слуцкай езуіцкай калегіі. Выкладаў рыторыку ў Бабруйскай і Полацкай езуіцкіх калегіях, аўтар трагедый на польскай мове.

ГАЎСМАН Міхаіл Антонавіч (1817—1889), беларускі гісторык, краязнавец, археолаг. Калекцыяніраваў прадметы старажытнасці, археалагічных раскопак, побыту беларусаў, пячаткі, медалі. Быў у Слуцку з археалагічнай экспедыцыяй. У 1877—1878 гг. апублікаваў шэраг гістарыка-краязнаўчых нарысаў, у тым ліку і пра Слуцк, аўтар рукапіснага нарыса «Гістарычны вопіс губернскага горада Мінска і губерні» (вядомы як «Рукапіс Гаўсманскі»).

ГЕСЭ Тамаш (Іван Хрыстафоравіч), мастак-партрэтыст і педагог. Выхаванец мастацкай школы, вучань Я.Рустэма. На працягу 1837—1868 гг. (мáгчыма, з 1834) працаваў выкладчыкам малявання ў Слуцкай мужчынскай гімназіі. У сярэдзіне 1830-х гадоў пад яго кіраўніцтвам рабіў першыя крокі па асваенні партрэтнага мастацтва К.Карсалін — будучы акадэмік партрэтнага жывапісу.

ДАЛЕНГА-ХАДАКОЎСКІ Зарыян Якаўлевіч (сапраўднае **ЧАРНОЦКІ Адам**, 24.12.1784, в. Гайна Лагойскага раёна — 17.11.1825, Цвярская губерня), славянаznавец, пачынальнік беларускай, польскай, рускай і ўкраінскай археалогіі, фальклярыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Пачатковае навучанне праходзіў у хатняга настаўніка ў м. Лецяшын на Случчыне, потым два гады вучыўся ў Слуцкім каталіцкім вучылішчы. З усіх навук, што выкладаліся тут, больш за ўсё любіў гісторыю і геаграфію, захапляўся кнігамі па старажытнай гісторыі. У 1801 г. закончыў вучылішча і пераехаў у Мінск. Падарожнічаў па Польшчы, Галіцыі, Палессі, жыў у Расіі. З'яўляўся членам-карэспандэнтам варшаўскага Таварыства сяброў навук (1819), членам пецярбургскага Вольнага таварыства аматараў расійскай славеснасці (1819), маскоўскага Таварыства гісторыі і старажытнасцей расійскіх (1820).

ДАЎКША Эдуардас Якубас (1836, Літва — 1890), літоўскі пісьменнік-дэмакрат. У 1851 г. закончыў Слуцкую гімназію. Ад імя літоўскага народа выступаў на жалобным мітынгу пры пахаванні беларускага і польскага пісьменніка У.Сыракомлі ў 1862 г.

ДЗЮПРЭ Луі Максіміліян (?—?), танцоўшчык, балетмайстар, педагог. Адзін з заснавальнікаў мужчынскага сцэнічнага танца. Вучыўся ў Французскай акадэміі мастацтваў, саліст «Каралеўскай акадэміі» ў Парыжы. Гастраліраваў у Лондане, Варшаве, Дрэздэне, Вене. У 1756 г. запрошаны Г.Ф.Радзівілам у яго прыдворны тэатр у Слуцку, разам з А.Пуціні стаў стваральнікам мясцовага балета. У 1756—1758 гг. выкладаў у Слуцкай балетнай школе, выступаў у Слуцку і ў Белым (цяпер Бяла-Падляска, Польшча). Пазней пераехаў у Нясвіж.

ЕЛЬСКІ Аляксандр Карлавіч (псеўд. Бацян з-над Пцічы, Літвін-грамадзянін; 16.6.1834—10.9.1916), беларускі пісьменнік, гісторык, этнограф, краязнавец, перакладчык, публіцыст. Нарадзіўся ў в. Дудзічы Ігуменскага павета (цяпер Пухавіцкі раён). Некаторы час жыў у Слуцку. Падрабязна апісваў вонкавы выгляд і гісторыю горада. Найбольшай славутасцю Слуцка лічыў бібліятэку Бергеля, у якой захоўваліся рэдкія выданні — усяго каля тысячы тамоў. Выйшла яго брашура «Напамін пра бібліятэку Юльяна Бергеля, пастара ў Слуцку». Выдаў «Гістарычныя звесткі пра радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку» (1893), «Гістарычныя звесткі пра фабрыку шкла і аздобленых люстэрак у радзівілаўскім Урэччы на Літве» (1899).

ІЛЬІН Уладзімір Мікалаевіч (1891, Украіна — 1974, Парыж), вучоны, прыватдацэнт Кіеўскага універсітэта, выкладаў гісторыка-філасофскія дысцыпліны, літургіку ў рускім праваслаўным Багаслоўскім інстытуце св. Дзіянісія. З 1919 г. у эміграцыі, выкладаў у Канстанцінопалі, Берліне, з 1925 г. у Парыжы. Закончыў Слуцкую гімназію.

КАЗАЧЫНСКІ Эмануіл (Міхаіл) Аляксандравіч (каля 1700, м. Ямпаль на

Наследие слуцкого края

Украіне — 1755, Слуцк), царкоўны дзеяч, літаратар, педагог. Закончыў Маскоўскую славяна-грэка-лацінскую акадэмію, шмат падарожнічаў па Заходняй Еўропе. Працаваў выкладчыкам у школах Кіева (1720—1733), у Сербіі, дзе заснаваў школу і займаўся літаратурнай дзейнасцю. Вярнуўся ў Кіеў і пастрыгся ў манахі. У верасні 1748 г. прыехаў у Слуцк, заняў пасаду архімандрыта. У жніўні 1749 г. у Кіеве ў Сафійскім саборы адбыўся спецыяльны малебен у гонар прызначэння Казачынскага на пасаду слуцкага архімандрыта і замежнага намесніка кіеўскага мітрапаліта. У Слуцку паспяхова вёў барацьбу з езуітамі, заваяваў давер да сябе і павагу з боку князя Г.Радзівіла. У час жыцця і дзейнасці ў Слуцку (1748—1755) Казачынскі напісаў некалькі твораў, у тым ліку «Респос...».

КАПІЕВІЧ (КАПІЕЎСКІ) Ілья Фёдаравіч (каля 1651, Брэстчына ці Случчына — 1714, Мсціслаўшчына), пісьменнік, перакладчык, кнігавыдавец, асветнік, энцыклапедыст. Закончыў Слуцкую кальвінісцкую школу, дзе атрымаў добрыя веды і вывучыў замежныя мовы. Зведаў ганенне езуітаў, вымушаны быў выехаць у Галандыю. У 1697 г. у час прыбыцця ў Галандыю расійскага пасольства пад кіраўніцтвам Пятра I быў кандыдатам-пастырам пры Амстэрдамскім саборы. Як знавец многіх моў быў настаўнікам Пятра I і іншых удзельнікаў пасольства. Актыўны прыхільнік пятроўскіх рэформаў, вітаў імкненне славянскіх народаў да аб'яднання. Склаў і выдаў каля 20 кніг, у т. л. «Введение краткое во всякую историю», «Грамматика латинская», «Прытчи Езоповы», «Святцы, или Календарь», «Руководение в грамматику славено-российскую» і інш.

КАРПОВІЧ Пётр Уладзіміравіч (3.10.1874, Гомель — 1917), рэвалюцыянер-тэрарыст. Закончыў Слуцкую гімназію, Маскоўскі і Юр'еўскі універсітэты. У 1896—1898 гг. вёў рэвалюцыйную агітацыю ў Гомелі, зблізіўся потым з эсэрамі. У 1901 г. смяротна параніў міністра асветы М.П.Багалепава за рэпрэсіі супраць рэвалюцыйнага студэнцтва. Асуджаны на 20 гадоў катаргі. У 1907 г. уцёк за мяжу, ад рэвалюцыйнага руху адышоў. Загінуў у 1917 г., вяртаючыся з Англіі ў Расію на параходзе, які падарваўся на міне.

КАРПОВІЧ Станіслаў (24.2.1864 — 16.6.1921, Польшча), педагог, грамадскі дзеяч, асветнік. Нарадзіўся ў в. Хацішча каля Баранавіч. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі. Пасля займаўся самаадукацыяй, распрацаваў асновы самаадукацыі і склаў дапаможнік «Што чытаць». Працаваў настаўнікам. У 1892 г. пераехаў у Варшаву, дзе ўзначаліў маладзёжныя гурткі самаадукацыі, супрацоўнічаў з мясцовымі выданнямі, друкаваў свае артыкулы. Заснаваў у Варшаве кнігарню, а ў хуткім часе і ўласнае выдавецтва нот і школьнай літаратуры. Яго асноўныя творы па асвеце моладзі: «Навука аб выхаванні», «Скарбы чалавецтва», «Наша літаратура для моладзі» і інш.

КАРЫЦКІ Міхал [7.9.1714, в. Дзітрыкі Лідскага павета — 10.3.1781, г. Мінск (паводле іншых звестак у 1784 або 1791)], грамадскі дзеяч, паэт і педагог. У 1733 г. закончыў Слуцкую семінарыю, вучыўся ў Віленскай акадэміі на курсе філасофіі. Атрымаў званне доктара філасофіі, выкладаў у калегіумах Мінска і Драгічына, у Віленскай акадэміі. Быў рэктарам Мінскай ваяводскай школы. Найбольш вядомы яго творы «Дэматас і Дафніс», «Казка», «Птушыны сейм» і інш.

КЕРСНІЦКІ Анастаз Людвік (1678, Гальшаны Ашмянскага павета — 1733), педагог, каталіцкі публіцыст на Беларусі. Вучыўся ў Вільні і Пінску. Выкладаў у езуіцкіх калегіумах у Слуцку, Гродне, Варшаве, а таксама ў Віленскай акадэміі. Сучаснікі за красамоўства называлі яго Перыклам. Вядомы як непрымірымы праціўнік культуры гуманізму і ідэалогіі рэфармацыйнага руху. Заклікаў падданых цярпець нягоды і праводзіў ідэю боскага ўмяшання ў дзейнасць людзей. Найбольш значныя творы: «Ключ да скарбаў сардэчных» (выдадзены ў Слуцку ў 1723; у Вільні ў 1725) і «Вольны голас нядзельных прамоў» (Варшава, 1727).

КЛАКОЦКІ Казімір Крыштоф (каля 1625, Міншчына — 1684), дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, заснавальнік друкарні, збіральнік кніг. У 1663 г. па пратэкцыі князя Б.Радзівіла стаў губернатарам Слуцкага і Капыльскага княстваў. Вучыўся ў акадэміі ў Арлеане. Па яго ініцыятыве ў 1665 г. у Слуцку была заснавана друкарня для патрэб мясцовых кальвіністаў. Для гэтай друкарні ён набыў у Варшаве неабходнае абсталяванне, і з 1672 г. тут пачалося выданне кніг. Найбольш

Наследие слуцкого края

інтэнсіўная друкарская дзейнасць прыпадае на 1673—1678 гг., калі пасля смерці Б.Радзівіла (1669) Клакоцкі як апякун непаўналетняй дачкі Радзівіла Людвікі Караліны набыў значную самастойнасць. Вядомы 29 выданняў Слуцкай друкарні, частка з якіх мела на тытульных лістах надпіс «Gypis stucensibus» або «Drukarnia Słucka» («Слуцкая друкарня»).

У Клакоцкага была цудоўная ўласная бібліятэка, якую ён збіраў на працягу свайго жыцця. Тут меліся рэлігійныя, навуковыя, гістарычныя, юрыдычныя выданні на польскай, французскай, нямецкай, лацінскай мовах; кнігі паступалі з Круляўца, Гданьска, Франкфурта-на-Одэры. Былі сярод іх і апісанні падарожжаў. Пасля смерці рукапісы з гэтага збору сын ахвяраваў бібліятэцы Слуцкага езуіцкага калегіума, але яны пазней былі адпраўлены ў Вільню, а адтуль трапілі ў Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве.

КЛЕЙНБАРТ Леў Максімавіч (15.10.1875, Капыль—20.11.1950), рускі крытык і публіцыст. Закончыў Слуцкую гімназію ў 1896 г. Да рэвалюцыі супрацоўнічаў у часопісах «Образование», «Мир божий», «Современный мир» (Пецярбург), кіраваў літаратурнымі студыямі. Друкаваўся з 1902 г. Напісаў «Нарысы народнай літаратуры», «Нарысы рабочай журналістыкі», кнігу «Маладая Беларусь». Садзейнічаў выхаду ў свет зборніка вершаў Я.Купалы «Шляхам жыцця».

КНЯЖЭВІЧ Гжэгаж (Рыгор) (1737, Беларусь—?), перакладчык, гісторык, эканаміст, матэматык. Выкладаў паэтыку, рыторыку і гісторыю ў Слуцкай гімназіі. Напісаў падручнік па матэматыцы і кнігу аб громаадводах.

КНЯЗЬНІН Францішак Дыянізы (1750, Віцебская губерня—25.8.1807), польскі паэт, драматург, перакладчык. У 1764 г. закончыў клас рыторыкі ў Віцебскай езуіцкай калегіі, у 1764—1770 гг. вучыўся ў Полацку, Нясвіжы і Слуцку. З 1770 г. у Варшаве. Пісаў паэмы, ідыліі, элегіі, оды, байкі. Цікавіўся беларускім фальклорам і выкарыстоўваў яго ў сваіх творах, збіраў беларускія прыказкі, перакладаў заходнееўрапейскую паэзію.

КРАСОЎСКІ Антон Якаўлевіч [1822(?), м. Грозаў Слуцкага павета—1898, Пецярбург], рускі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі, заснавальнік навуковага акушэрства і гінекалогіі ў Расіі, прафесар (1858). Закончыў Слуцкую гімназію.

КУЛАКОЎСКІ Генрых (?—?), вучоны ў галіне медыцыны, прафесар, заснавальнік першай у Расіі клінікі па хваробах скуры. Вядома, што жыў у Слуцку і ў 1825 г. закончыў Слуцкую гімназію.

МУЖЫЛОЎСКІ Андрэй (у манастве Антоній; 1580-я гады—1640-я гады), пісьменнік-палеміст, рэлігійны дзеяч. Біяграфічных звестак амаль не захавалася, але вядома, што ён быў прэсвітэрам, а з канца 1620-х гадоў слуцкім пратапопам, жыў у Слуцку, прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі паездкі на Украіну і Беларусь іерусалімскага патрыярха Феафана, у выніку тут была адноўлена праваслаўная іерархія.

МУЗОНІЙ Андрэй [XVII ст., Італія (?)—?], педагог. Біяграфічных звестак няма. Вядома, што выкладаў у Слуцкай школе разам з Адамам Рэйнальдам, Андрэем Дабжанскім. Утрох склалі статут школы, расклад заняткаў, праграму. Статут выдадзены ў 1628 г. у Любчы.

НАБАРОЎСКІ (НЕБАРОЎСКІ) Даніла (1573, Кракаў—1640), паэт, урач, перакладчык, дыпламат. Вучыўся ва універсітэтах Вітэнберга (Германія), Базеля (Швейцарыя), Арлеана (Францыя). Слухаў лекцыі Галілея ў Падуі (Італія), быў прыхільнікам яго вучэння. У Слуцку жыў, верагодна, пасля 1602 г. Напісаў два медыцынскія трактаты, рабіў пераклады на польскую мову. У вершах і вершаваных пісьмах са Слуцка і іншых мясцін паказаў сацыяльныя супярэчнасці на Беларусі ў XVI—XVII ст. Высмейваў рэакцыйную шляхту, езуітаў, духавенства.

НЕЗАБІТОЎСКІ Станіслаў Ян (1641, Навагрудчына—1717), беларускі мемуарыст. Служыў у Б.Радзівіла і кіраваў яго адміністрацыяй у Слуцкім княстве. Доўгі час жыў у Слуцку. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам сесіі Трыбунала Вялікага княства Літоўскага. Выконваючы абавязкі адміністратара, зрабіў шэраг паездак па Беларусі, Літве, Польшчы, Прусіі і Сілезіі. У 1682—1700 гг. сістэматычна вёў дзённік, у які запісваў свае назіранні, факты, апісваў падзеі на Случчыне і Навагрудчыне гэтага перыяду. Дыярыуш (дзённік) з'яўляецца багатай крыніцай для вывучэння жыцця, звычаяў і культуры шляхты Вялікага княства Літоўскага. Пасля сябе

Наследие слуцкого края

пакінуў вялікую эпісталярную спадчыну (больш за 600 лістоў ад розных асоб), якая зберагаецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве (архіў Радзівілаў).

НЕПАКАЙЧЫЦКІ Артур Адамавіч (1813, Мінская губ. — ?), генерал ад інфантэрыі (вышэйшы генеральскі чын у пяхотным войску), начальнік штаба Паўднёва-Дунайскай арміі, герой руска-турэцкай вайны. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі.

НЯШКОЎСКІ Іван, доктар медыцынскіх навук. Вядома, што ў 1851 г. закончыў Слуцкую гімназію.

ПАПРОЦКІ Францішак (1723, Беларусь — 1790), выдавец, перакладчык, географ, гісторык і педагог. Вучыўся ў Слуцкім езуіцкім калегіуме, у Польшчы. Выкладаў філасофію, гісторыю і геаграфію ў Варшаве і Віленскай акадэміі. Выдаў «Палітычныя каляндарыкі», «Віленскія календары», аўтар падручніка па геаграфіі «Еўропа — найлепшая частка свету», энцыклапедычных даведнікаў «Дамашнія весці аб Польскім Каралеўстве», «Дамашнія весці аб Вялікім княстве Літоўскім» і інш.

ПАЎЛОВІЧ Эдвард Баніфацы Францавіч (псеўд. Эдвард з-над Свіцязі, Ясенчык; 7.6.1825 — 10.2.1909), мемуарыст, мастак, асветнік. Нарадзіўся ў мястэчку Тургелі (цяпер Літва). Вучыўся ў Слуцкай гімназіі, пасля яе заканчэння ў Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. Працаваў выкладчыкам у Навагрудку, актыўны ўдзельнік культурна-грамадскага жыцця Літвы, Беларусі, Польшчы і Украіны, удзельнік паўстання 1863 — 1864 гг. Вядомы мемуарныя творы «Успаміны з-над Вілii і Нёмана», «Успаміны. Навагрудак — турма — выгнанне», «З падарожжа па Літве» і інш. Як мастак працаваў пераважна ў жанры партрэта, рабіў замалёўкі Навагрудка і яго ваколіц, маляваў абразы. Яго архіў, у т.л. перапіска з жыхарамі Беларусі, зберагаецца ў бібліятэцы Польскай АН (Вроцлаў).

ПАЧОБУТ-АДЛЯНІЦКІ Марцін (30.9.1728, в. Сламянцы Гродзенскага павета — 20.2.1810, Вільня), беларускі асветнік, астраном. Вучыўся ў Гродне, уступіў насуперак волі бацькоў у ордэн езуітаў, дзесьці ў 1747 г. паступіў у Слуцкую педагагічную семінарыю.

ПАШАКОЎСКІ (Пашкоўскі) Ян (1684, Літва — 3.6.1757, Нясвіж), педагог, выдавец. Пасля заканчэння Віленскай акадэміі выкладаў там філасофію, граматыку і тэалогію. З 1736 г. працаваў выкладчыкам у Слуцку, потым стаў рэктарам Нясвіжскай езуіцкай калегіі, адначасова быў выхавальнікам сыноў М.К.Радзівіла Рыбанькі. Шмат падарожнічаў. Пісаў трактаты і сачыненні багаслоўскага характару, выдаў 20 «Палітычных каляндарыкаў».

РЫСІНСКІ Саламон Фёдаравіч [1560(?) — 13.11.1625], філосаф, паэт, педагог, вучоны-фальклярыст і этнограф. Нарадзіўся ў в. Рысін на Полаччыне (цяпер Себежскі раён Пскоўскай вобласці). Працаваў настаўнікам у аддаленых вёсках. Невядома, у якім узросце і ў якасці каго ўпершыню трапіў за мяжу. У адным са сваіх лістоў ён паведамляў, што ў 1582 г. прыбыў у Лейпцыг, дзе меў зносіны з вучонымі. У наступныя гады, да 1587 г., жыў у вёсках паўднёвай Польшчы, настаўнічаў у Гданьску, вандраваў, працуючы выхавацелем шляхецкіх дзяцей, па гарадах Германіі. У 1585 — 1586 гг. знаходзіўся ў Альтдорфе з сынамі польскага дыпламата Я.Бучынскага. Пасля 1600 г. служыў у князёў Радзівілаў. Праца прыдворным паэтам і выхавацелем княжацкіх дзяцей знайшла адлюстраванне ў яго творчасці. У вершаванай форме ён апісваў ваенныя паходы Радзівілаў, складаў эпітафіі для членаў княжацкай сям'і і некаторых знатных асоб, займаўся перакладамі. Пераклаў псалмы Давіда на польскую мову (першыя радкі перададзены на старасловянскай мове).

З творчасці Саламона Рысінскага

ЭПІТАФІЯ САФІІ АЛЕЛЬЧЫЦ, КНЯГІНІ СЛУЦКАЙ, ПАХАВАНАЙ У СЛУЦКІМ МАНАСТЫРЫ Ў 1612 г.

О! Ненадежной судьбы мановение неоспоримо!
О! Никому не избегнуть плачевного жизни конца!
Смерть презирает и прадедов честь, и родителей дело,
Племени блеск уважать не умеет и разума мощь.
Кучей сокровищ пренебрегает и золотом ярким,
Тирской парчи одеяние ценное ей нипочем
Юности цвет иль прекрасные годы ее не задержат,
Как не взволнует и богу подобная дев красота.
Славные брачные узы — клочок для нее лишь дешевый,

Наследие слуцкого края

Сердце печальное мужа-вдовца — лишь насмешки предмет.
Смехом жестокая хлещет, злословить, унизить умеет
Полубожественный замок, обитель полулюдей.
Вот она топчет, бесчестная, землю с радостным плясом,
Выдрав добычу из княжьей груди, и победой горда.
О! Приносящая счастье душа, изобилье достоинств
Тех, что лелеет Юнона и в женщины теле растит,
Звездочка! Ты сохранилась в созвездии Слуцком едина
Между литовскими славой ярчайшая первая дочь!
Разве ты менее рыцарь, чем гордый супруг твой великий?
Сила какая, нагрянув нежданно, тебя унесла?
Многие солнца с супругом тебе проводить предстояло,
Нестора долгие дни полагалось по жребию жить,
Шло тебе клады считать, драгоценность сокровищ отцовских,
Ими делиться с тобой и порадовать жаждал супруг.
И полагалось отцом его сделать детишек прелестных.
В доме ж осиротевшем покинула ты одного.
Если б страдальцу осталась надежда наследника рода,
Меньше бы мучило бедствие, грустно терзала печаль.
Горестно сердце заныло двойной неутешною болью,
Слезы соленой росой увлажнили морщины ланит.
Небу угодно иначе: коль с неба падают звезды,
Разве не скажешь: «чудесно», безумному лишь невдомек.
Луч суетливо врываясь и вспыхнув мерцающим светом,
Матери гасит светло, и гаснет в утробе дитя.
Смерть, свирепея, с размаху косой ударяет жестоко,
Мать и потомство убить для нее еще больший триумф.
Ах! Замолчи, быстролетная, смехом грядущим пытаешь,
Пусть и отсюда потащишь останки замученных жертв,
Вечно ли смехом позволено будет тебе наслаждаться?
Слезы, лицо оросившие, бог милостивый сотрет!
Сломлено не было мужество князя ни вражеским строем,
Ядрами, сталью, огнем и угрозами он не сражен,
Меч не поверг или копий ужасных нещадные жала,
Тлением не испугала, в глазах промелькнувшая смерть.
Хворь испытанием на ложе его не сломила.
Разве печали враждебная сила доспехи пронзит?
Вот же, когда собирается силы героя ослабить,
Темная мощь Либитины ведь зря раздувает свой гнев.

Друкуецца па кн.: П о р е ц к и й Я.И. Соломон Рысинский. Конец XVI — начало XVII века. Мн., 1983. С. 67—68.

СКАНДРАКОЎ Сяргей Вячаслававіч (9.10.1876, г. Мглін Бранскай вобласці — 2.8.1953), вучоны, журналіст. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі, закончыў Маскоўскі сельскагаспадарчы інстытут. Працаваў дырэктарам аграномічнай станцыі ў Цэнтральным бюро краязнаўства, Беларускім навукова-даследчым інстытуце сельскай і лясной гаспадаркі. З 1931 г. на педагагічнай рабоце ў Расіі, Казахстане, у гарадах Беларусі. Быў добра знаёмы з Я.Купалам і Я.Коласам.

СМАКОЎСКІ Вінцэнт (?—?), жывапісец і скульптар. Вучыўся ў Віленскім універсітэце і Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. Працаваў у Віленскім універсітэце. У 1826 г. выкладаў маляванне ў Слуцку.

СТРЫЙКОЎСКІ Мацей [1547(?), Польшча — 1593(?)], гісторык і паэт. Пачатковую адукацыю атрымаў у парафіяльнай школе, вучыўся ў Кракаўскім універсітэце, атрымаў званне бакалаўра. З 1570 г. жыў на Беларусі — у Слуцку, Сямячыцах, — потым у Літве. Пісаў на польскай і лацінскай мовах. Аўтар вершаванай хронікі «Ганец цноты...» (1574), прысвечанай гісторыі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, антытурэцкага гістарычнага твора «Пра вольнасць Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага...» (1575), шэрагу вершаў і паэм. Сярод яго твораў асобнае месца займае празаічна-вершаваная хроніка «Пра пачатак, паходжанне, мужнасць, рыцарскія і грамадзянскія справы славутага народа літоўскага, жамойцкага і рускага» (1575—78; надрукавана ў Варшаве), прысвечаная князю Юрыю Слуцкаму. Яна ахоплівае перыяд ад легендарных часоў да ўтварэння Вялікага княства Літоўскага.

Наследие слуцкого края

СЯРЖАНІН Іван Мікалаевіч (1898, Любань — 1973, Мінск), беларускі вучоны ў галіне заалогіі пазваночных жывёл. Член-карэспандэнт АН БССР, доктар біялагічных навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі БССР. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі.

ТУПТАЛА Даніла Савіч (РАСТОЎСКІ Дзмітрый; снежань 1651, Кіеўская вобласць — 1709, Растоў), рускі царкоўны дзеяч і пісьменнік. Упершыню ў Слуцк іераманах Дзмітрый наведаўся ў жніўні 1677 г. Потым жыў у Вільні. У кастрычніку зноў вярнуўся ў Слуцк і пасяліўся ў келлі Праабражэнскага брацкага манастыра. Тут вывучаў лацінскую і польскую мовы, выступаў з пропаведзямі ў Старцавіцкім, Грозаўскім манастырах. Сваімі поглядамі падтрымліваў беларускага епіскапа Феадосія Васілевіча (былы архімандрыт Слуцкага Троіцкага манастыра) у яго імкненні зрабіць беларускую царкву аўтакефальнай. Аб гэты сведчыць і двухрадкоўе, якое Дзмітрый напісаў і выразаў на верхняй дошцы зруба калодзежа:

«Почто нам въ Самарію за водой ходити,
Егда и зде, въ Случеске, лепо её пити?».

Гэты калодзеж быў выкапаны самім Дзмітрыем на тэрыторыі Трайчанскага манастыра. У радках верша закладзены вялікі сэнс — імкненне слуцкіх царкоўнікаў і іх кіраўніка епіскапа Васілевіча да незалежнасці, а з другога боку — вада ў Слуцку такая ж святая, як і ў Самарыі. (Самарыя — горад у Палесціне, куды веруючыя людзі хадзілі за святой вадой.) Дз.Растоўскі быў стараннікам рэформаў Пятра I, але і праціўнікам умяшання дзяржавы ў царкоўныя справы. У Слуцку ён прабыў да 1679 г. У сваім дзённіку (дыярыушы) апісаў Слуцк.

ТЫЦ Ян Фрэдэрык (?, Саксонія — ?), нямецкі мастак-жывапісец і штукатур. Вядома, што быў нейкі час дырэктарам радзівілаўскіх тэатраў у Слуцку і Нясвіжы.

ТЫШКЕВІЧ (? — ?), жывапісец радзівілаўскіх тэатраў у Слуцку і Нясвіжы.

ТЫШКЕВІЧ Яўстафій Піевіч (18.4.1814, Лагойск — 8.9.1873), беларускі археолаг, гісторык, этнограф і краязнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай археалогіі. Ганаровы член Пецярбургскай і Стакгольмскай акадэмій навук, Лонданскага археалагічнага інстытута. У 1855 г. заснаваў Віленскі музей старажытнасцей, якому перадаў калекцыі ўласных збораў, арганізаваў і ўзначаліў Віленскую археалагічную камісію. Правёў раскопкі курганоў у розных паветах, раскапаў таксама некалькі курганоў пад Слуцкам, дзе выявіў жаночыя ўпрыгожанні. Акрамя вывучэння курганоў вучоны зрабіў і апісанне старажытнага замка ў Слуцку.

ЦЫБУЛЬСКІ Стафан, мастак-жывапісец. Вучыўся ў Гданьску ў Якуба Веслы. Працаваў у радзівілаўскіх маёнтках, у т.л. у 1772, 1775, 1779, 1789 гг. — у Слуцку. Для Радзівілаў пісаў і капіраваў партрэты, стварыў алтарныя карціны. У 1859 г. напісаў партрэт Г.К.Радзівіл.

ЧАРНОЦКІ Напалеон Казіміравіч [13.7.1866, маёнтак Нача-Брындзоўская Слуцкага павета (цяпер Ляхавіцкі раён) — 14.2.1937, Лідскі павет], публіцыст і перакладчык. У 1887 г. закончыў Слуцкую гімназію, быў членам самаадукацыйнага гуртка ў Слуцку. Сумесна з гурткоўцамі пераклаў на беларускую мову брашуру «Дзядзька Антон», якая гектаграфічным спосабам была выдадзена ў Слуцку, у 1885 г. і ў 1892 г. у Тыльзіце. У 1894 г. закончыў медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта. Пераклаў на польскую мову апавяданне У.Караленкі «У дрэннай кампаніі», на беларускую мову п'есы «Сватанне» А.Чэхава і «Пашыліся ў дурні» М.Крапіўніцкага, аўтар брашуры «Як будзе з зямлёю», пісаў пра творчасць Я.Коласа.

ШПІЛЕЎСКІ Павел Міхайлавіч [псеўданімы Драўлянскі, Знаёмы чалавек, Барон Ікс; 31.10(12.11).1823 — 17(29).10.1861], беларускі этнограф, пісьменнік, публіцыст і тэатральны крытык. Нарадзіўся ў в. Шыпілавічы Бабруйскага павета ў сям'і святара. З 1837 г. вучыўся ў Мінскай духоўнай семінарыі, якая да 1840 г. знаходзілася ў Слуцку. Затым закончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію са званнем кандыдата багаслоўя. Працаваў у Варшаве, Пецярбургу, быў знаёмы з М.А.Дабралюбавым. Аўтар нарысаў і артыкулаў «Беларускія народныя павер'і» (1846—1852), «Даследаванне пра ваўкалакаў» (1853), «Падарожжа па Палессі і Беларускім краі» (1853—1855) і інш.

Падрыхтавала В.С.Відлога.

Наследие слуцкого края

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

УСТАНАЎЛЕННЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

Рэвалюцыйныя падзеі на Беларусі развіваліся пад уплывам спецыфічных умоў, што склаліся ў ходзе 1-й сусветнай вайны. Беларусь падзялялася лініяй фронту на заходнюю і ўсходнюю часткі, паміж якімі ўсе сувязі былі спынены. Слуцк і ўвесь Слуцкі павет аказаліся ў прыфрантавой паласе. Лінія фронту, якая праходзіла за Ляхавічамі, захавалася да лютага 1918 г. У Слуцку і акрузе бальшавікі, сацыялісты-рэвалюцыянеры, меншавікі з ліку салдат і афіцэраў Заходняга фронту праводзілі сярод насельніцтва значную агітацыйную работу. У выніку ў пачатку сакавіка 1917 г. рэвалюцыйна настроеныя рабочыя і салдаты арганізавалі ў Слуцку Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Асноўную частку дэпутатаў складалі беспартыйныя, якія не мелі цвёрдых пазіцый і знаходзіліся пад уплывам некаторых партый, у прыватнасці меншавікоў. Гэта адбілася на рашэнні Слуцкага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, прынятага ў дні красавіцкага крызісу 1917 г., які падтрымаў згодніцкую пазіцыю Петраградскага Савета ў адносінах да Часовага ўрада. Бальшавікі ж Случчыны праводзілі агітацыйна-прапагандысцкую і арганізацыйную



На адной з вуліц Слуцка пасля паведамлення аб перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Наследие слуцкого края



Я.Л.Аскольдаў (Калмановіч).

работу сярод насельніцтва павета і салдат, што ўрэшце ўмацавала іх пазіцыі ў Савеце. У ліпені ў горадзе арганізавалася самастойная балышавіцкая арганізацыя.

Рэгулярна ў памяшканні гарадскога клуба, які размяшчаўся ў былым будынку Дваранскага сходу (цяпер будынак краязнаўчага музея), адбываліся мітынгі, пасля якіх аб'яўляўся запіс у партыю балышавікоў. Запісваліся салдаты, моладзь, працаўнікі горада. З цягам часу дала плён агітацыйная работа балышавікоў і ў сельскай мясцовасці. Слуцкі павет з'яўляўся адным з першых у Беларусі па колькасці сялянскіх выступленняў супраць памешчыкаў. Уплыў балышавікоў на сялян узрастаў. І калі ў ліпені 1917 г. праходзіў сялянскі з'езд, работай яго кіравала Слуцкая арганізацыя балышавікоў. На з'ездзе было прынята рашэнне аб утварэнні павятовых зямельных камітэтаў і Савета сялянскіх дэпутатаў.

У гэты час у Петраградзе адбыліся падзеі, якія знайшлі водгук і на Беларусі: ліпеньскі расстрэл дэманстрантаў. Па Беларусі, не абмінаючы Слуцка, пракацілася хваля сходаў, дзе выказваўся недавер Часоваму ўраду. Крызіс у краіне паглыбляўся і нежыццяздольнасць урада была відавочная.

У канцы жніўня адданыя генералу Карнілаву часці з фронту рушылі на Петраград, каб скінуць Часовы ўрад, ліквідаваць Саветы і ўстанавіць ваенную дыктатуру. Для барацьбы з карнілаўшчынай пры Саветах былі сфарміраваны ваенна-рэвалюцыйныя камітэты і чырвонагвардзейскія атрады. У выніку рашучых дзеянняў рэвалюцыйных сіл змова Карнілава была ліквідавана.

Слуцкая арганізацыя балышавікоў у выніку гэтых падзей значна выраслa. У верасні яна налічвала ўжо 200 членаў партыі. Балышавікі Случчыны прымалі актыўны ўдзел у арганізацыі партыйнага цэнтра Беларусі і Заходняга фронту. На нарадзе дэлегатаў Заходняй вобласці і фронту, якая адбылася 1—3 верасня, былі прадстаўнікі Слуцкай партыйнай арганізацыі.

У час перавыбараў, што праходзілі ў другой палавіне верасня, фракцыя балышавікоў складала ў Слуцкім Савеце больш за палавіну дэпутатаў. Слуцк стаў другім у Беларусі горадам пасля Мінска, дзе Савет стаў балышавіцкім яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Старшынёй Савета выбралі Івана Ксенафонтавіча Ксенафонтава, члена РСДРП з 1903 г., старшыню Слуцкага камітэта партыі балышавікоў. Вялікую работу сярод працоўных праводзілі балышавікі І.Крэйнес, Хірын, Я.Аскольдаў (Калмановіч) і інш.

З 15 па 18 верасня 1917 г. у Мінску праходзіла абласная канферэнцыя РСДРП(б). На ёй прысутнічалі 67 дэлегатаў, сярод якіх былі 2 дэлегаты ад Слуцкай балышавіцкай арганізацыі.

Да восені эканамічны крызіс на Беларусі яшчэ больш паглыбіўся, што пацягнула за сабой новую хвалю забастовак, якая не абмінула і Слуцкага павета. Больш за 2 тыдні баставалі рабочыя Старэўскага шкляного завода (на той час Бабруйскі павет), сяляне самавольна захоплівалі памешчыцкія землі і пасевы. Супраць забастоўшчыкаў было накіравана нават войска, гэта выклікала яшчэ большае супраціўленне сялян. Сялянская беднота поўнасцю перайшла на бок рабочага кла-

Наследие слуцкого края

са. Бальшавікі Слуцка актыўна выступалі за дэмакратычныя і сацыялістычныя пераўтварэнні. У гэты час актыўную работу ў горадзе праводзілі бальшавікі І.Крэйнес, Я.Аскольдаў (Калмановіч), І.Багдановіч і інш.

5 кастрычніка 1917 г. у Мінску адбылася II Надзвычайная Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б). У яе рабоце прынялі ўдзел і дэлегаты ад Слуцкай партыйнай арганізацыі. Канферэнцыя лічыла бліжэйшай задачай устанаўленне савецкай улады і прапанавала мясцовым арганізацыям партыі бальшавікоў забяспечыць выбранне дэлегатаў на I Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Пасля канферэнцыі 14 кастрычніка ў Слуцку адбыўся сход членаў РСДРП(б), на якім была прынята рэзалюцыя аб перадачы ўлады ў краіне Саветам.

Рабочыя горада і салдаты гарнізона пад кіраўніцтвам Слуцкага камітэта партыі бальшавікоў пачалі падрыхтоўку да ўзброенага паўстання.

16 кастрычніка ў Мінску праходзіла канферэнцыя Савета Заходняй вобласці, у рабоце якой прынялі ўдзел і дэлегаты ад Слуцкага Савета. На II Усерасійскім з'ездзе Саветаў 2 дэлегаты-бальшавікі ад Слуцка перадалі патрабаванні сваіх выбаршчыкаў аб пераходзе ўсёй улады Саветам як у цэнтры, так і на месцах.

24 кастрычніка ў Петраградзе пачалося ўзброенае паўстанне. Да раніцы наступнага дня Часовы ўрад быў звергнуты. Вестка аб гэтым была атрымана ў Слуцку раніцай 26 кастрычніка, і адразу адбылося экстраннае пасяджэнне Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Большасцю галасоў была прынята прапанаваная бальшавікамі і падтрыманая дэпутатамі-салдатамі рэзалюцыя: «...цалкам і поўнасцю прызнаць і падтрымаць Савецкі ўрад на чале з У.І.Леніным». Меншавікі і эсэры, якія не пагадзіліся з гэтай рэзалюцыяй, выйшлі са складу Савета. Дэпутаты Савета звярнуліся да працоўных горада і павета, да салдат падтрымаць Савецкі ўрад. Члены Савета былі накіраваны ў вайсковыя часці, дзе правялі сходы. Салдаты прымалі рэзалюцыі аб падтрымцы новага рэвалюцыйнага ўрада. Мітынгі і сходы працоўных адбыліся на прадпрыемствах горада, дзе таксама прымаліся рэзалюцыі аб падтрымцы Савецкага ўрада. Па горадзе была распаўсюджана адозва «Да грамадзян Расіі», напісаная Леніным, якая заканчвалася заклікам: «Няхай жыве рэвалюцыя рабочых, салдат і сялян!», а таксама тэксты дэкрэтаў Савецкага ўрада і заклік Слуцкага Савета аб падтрымцы Саўнаркома.

У хуткім часе ў горадзе быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт пад кіраўніцтвам бальшавікоў, які ўзяў уладу ў свае рукі. У нядзелю, 29 кастрычніка 1917 г., на базарнай плошчы адбыўся агульнагарадскі мітынг, удзельнікі якога аб'явілі аб пераходзе ўсёй улады ў Слуцку да Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. Пасля мітынгу чырвонаармейцы занялі пошту, тэлеграф, памяшканні павятовай управы, міліцыі. Замест камісара Часовага ўрада Р.Астроўскага камісарам горада быў прызначаны матрос Балтыйскага флоту Пётр Барцэвіч. Пачаў стварацца атрад Чырвонай гвардыі. За некалькі дзён у яго запісалася каля сотні добраахвотнікаў.

У першыя дні існавання Савецкай улады ў горадзе быў ліквідаваны так званы Камітэт выратавання радзімы і рэвалюцыі, афіцэры, якія ўваходзілі ў яго, былі раззброены і адпраўлены ў Сібір.

Савецкая ўлада на Случчыне, такім чынам, была ўстаноўлена мірным шляхам. Гэта стала магчымым таму, што сілы контррэвалюцыі былі невялікімі, Слуцкі Савет стаў бальшавіцкім яшчэ да кастрычніцкіх падзей, 2-я армія была пад моцным уплывам бальшавікоў, сяляне падтрымалі рэвалюцыю.

Наследие слуцкого края

У ГАДЫ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ І ІНТЭРВЕНЦЫІ

СУПРАЦЬ ЛЕГІЯНЕРАЎ ДОЎБАР-МУСНІЦКАГА

Пасля ўстанаўлення савецкай улады Слуцкі Савет прыступіў да гаспадарчага будаўніцтва. Пад кантроль бралі памешчыцкія маёнткі, землі, лясы. Першыя крокі дзейнасці ўлады былі нялёгкімі: не хапала кваліфікаваных кадраў для ажыццяўлення нават самых простых сацыялістычных мерапрыемстваў, многія дзеянні ўлады байкатаваліся, пашыраліся спекуляцыя, п'янства, грабяжы маёнткаў, распаўсюджваліся розныя чуткі. Для прадухілення гэтых негатыўных з'яў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту даў указанне ніжэйшым ВРК без суда і следства расстрэльваць усіх пагромшчыкаў і марадзёраў, прыцягваць да адказнасці парушальнікаў парадку. Гэта, безумоўна, адкрывала шляхі для злоўжыванняў уладай, беспадстаўных рэпрэсій. Становішча



Члены бальшавіцкага камітэта ў 1918 г.: Багдановіч, Басінкевіч, Цымбал.

ўскладнялася тым, што антысавецкую лінію праводзіла камандаванне 1-га польскага корпуса генерала Доўбар-Мусніцкага.

12 студзеня 1918 г. Доўбар-Мусніцкі афіцыйна аб'явіў вайну Савецкай Расіі. З гэтага моманту тэрыторыя, на якой знаходзіліся часці польскага корпуса — Рагачоў, Жлобін, Бабруйск, — фактычна аказалася пад акупацыяй. Пасля ўзяцця Бабруйска легіянеры накіраваліся на Мінск і Слуцк. У Слуцкім павеце па рашэнні Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў была аб'яўлена ўсеагульная мабілізацыя, сфарміраваны баявыя дружыны Чырвонай гвардыі. Камітэт аб'явіў павет у стане аблогі. Спешна эвакуіраваліся з горада савецкія ўстановы і іх супрацоўнікі.

Слуцкі атрад Чырвонай гвардыі, у якім на пачатку студзеня 1918 г. налічвалася 100 чалавек, узначаліў член ВРК ураджэнец горада Якаў Аскольдаў (Калмановіч). Атрад Аскольдава выступіў насустрач легіянерам корпуса. Па дарозе ў атрад уліваліся добраахвотнікі. Праз некалькі дзён колькасць яго байцоў вырасла амаль удвая. Упарты бой паміж атрадам чырвонагвардзейцаў і легіянерамі Доўбар-Мусніцкага адбыўся 24 студзеня каля чыгуначнай станцыі Ясень (паміж Асіповічамі і Бабруйскам). Перавага аказалася на баку легіянераў. У выніку атрад вымушаны быў адступіць да Слуцка. У лютым легіянеры занялі горад, пачалі арыштоўваць людзей, якія падтрымлівалі Савецкую ўладу.

У ГАДЫ ІНТЭРВЕНЦЫІ

16 лютага 1918 г. скончыўся тэрмін перамір'я паміж Германіяй і Савецкай Расіяй. 18 лютага германскія войскі пачалі наступленне па ўсім рускагерманскім фронце. Праз некалькі дзён Слуцк занялі германскія войскі, легіянеры здалі горад без бою.

3 сакавіка 1918 г. паміж Савецкай Расіяй, Германіяй і яе саюзнікамі быў заключаны Брэсцкі мір. Згодна з яго

Наследие слуцкого края

ўмовамі пад германскай акупацыяй апынулася большая частка Беларусі, у тым ліку і Слуцк. Акупанты адмянілі усе дэкрэты савецкай улады, пачала аднаўляцца памешчыцкая ўласнасць на зямлю, закрываліся прадпрыемствы, абсталяванне і сыравіна вывозіліся ў Германію, заработная плата рабочых паменшылася, а кошт на прадукты харчавання павялічыўся. Цяжкая ноша акупацыйнага парадку выклікала супраціўленне жыхароў горада і павета. Вясной 1918 г. у Слуцку быў арганізаваны падпольны бальшавіцкі камітэт, старшынёй якога стаў А.М.Вендраў, сакратаром Басінкевіч. У склад камітэта ўвайшлі Багдановіч і Цымбал. Спачатку падпольная арганізацыя бальшавікоў налічвала 15 чалавек, а да канца года ў яе радах было ўжо 50 камуністаў. На барацьбу з германскімі акупантамі разам з рабочымі паднялося сялянства павета. Паступова выступленні сялян выліліся ва ўзброеную партызанскую барацьбу. Смелы налёт зрабілі слуцкія партызаны на артылерыйскую батарэю акупантаў у в. Лютавічы. Слуцкі партызанскі атрад дзейнічаў да канца 1918 г.

Між тым у Германіі пачалася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. Савецкі ўрад, выкарыстаўшы новыя ваенна-палітычныя абставіны, 13 лістапада 1918 г. ануляваў Брэсцкі мірны дагавор з Германіяй. Чырвоная армія перайшла ў наступленне супраць германскіх войскаў па ўсім фронце. Падпольны бальшавіцкі камітэт у Слуцку прыняў на сябе абавязкі Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. Узначаліў ВРК А.М.Вендраў. Немцы яшчэ былі на Случчыне, калі ВРК вырашыў выйсці з падполля і ўзяць уладу ў горадзе ў свае рукі. Да каменданта горада, нямецкага генерала, быў накіраваны прадстаўнік рэўкома для перагавораў аб перадачы ўлады. У выніку камендант падпісаў указ аб вывадзе часцей германскага войска з горада. 8 снежня 1918 г. у Слуцк увайшлі часці 17-й стралковай дывізіі, а праз два дні прыбыў камуністычны атрад на чале з І.І.Ланге. Слуцкі рэўком быў рэарганізаваны. Старшынёй яго стаў І.І.Ланге, які прабыў у горадзе да канца студзеня 1919 г. Потым яго накіравалі ў Гомель. На чале ВРК стаў Трафімаў.

На І з'ездзе Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі, дзе было аб'яўлена аб утварэнні БССР, прысутнічалі і дэлегаты са Слуцка А.М.Вендраў і Р.Нэймарк. З 1 студзеня 1919 г. Слуцк у складзе БССР, а з 27 лютага 1919 — у складзе Літоўска-Беларускай ССР.

12 красавіка 1919 г. у Слуцку была створана камсамольская арганізацыя з 25 чалавек. Узначаліў яе павятовы камітэт камсамола на чале са старшынёй І.Равічам і сакратаром А.Шэйнманам. У склад камітэта ўвайшлі Л.Нэйман, Дарасінскі, Новік, М.Шэйнман, Л.Розаў і інш. У маі адбыўся 1-ы павятовы з'езд камсамола, на якім ад ячэек горада і валасцей прысутнічалі 70 дэлегатаў.

У канцы лютага 1919 г. войскі Польшчы пачалі наступленне ў напрамку Вільня — Ліда — Маладзечна, Баранавічы — Мінск, Кобрын — Пінск. У сакавіку польскае войска прарвалася на Слуцкім напрамку. У горадзе быў сфарміраваны атрад камуністаў, які не даў магчымасці ворагу захапіць горад. Пасля гэтага Слуцкая, Бабруйская і Навагрудская каравульныя роты былі аб'яднаны ў Слуцкі зводны добраахвотніцкі батальён і адпраўлены на Заходні фронт. У красавіку і маі 1919 г. са Слуцка на фронт была адпраўлена яшчэ значная частка камуністаў.

Калі ў ліпені 1919 г. інтэрвенты пачалі новае наступленне, Слуцкі камітэт партыі бальшавікоў аб'явіў новую мабілізацыю. З жыхароў горада і павета быў сфарміраваны батальён, які разам з чырвонаармейцамі абараняў подступы да горада, але часцям 8-й чырвонаармейскай дывізіі, якая трымала абарону на захад ад Слуцка, давялося адступіць, і 10 жніўня 1919 г.,

Наследие слуцкого края



І.І.Бачко.



М.В.Юшкевіч.

пасля двухдзённага бою на рыначнай плошчы, інтэрвенты захапілі горад. Пачалі аднаўляцца былыя парадкі: вярталіся памешчыкам маёнткі, капіталістам — фабрыкі і заводы, быў уведзены каменданцкі час, пачаў дзейнічаць ваенна-палявы суд і г.д.

Барацьбу супраць ворага ўзначаліла Слуцкая падпольная бальшавіцкая арганізацыя. Быў створаны яе падпольны камітэт, які ўзначалілі І.І.Бачко і М.В.Юшкевіч. Адначасова дзейнічала і падпольная камсамольская арганізацыя. У вёсках павета пачалі стварацца падпольныя бальшавіцкія ячэйкі, партызанскія атрады. Партызанская барацьба з кожным днём разгаралася. У пачатку красавіка ў горадзе праходзіла павятовая нарада, на якую сабралася група падпольшчыкаў і партызан, каб абмеркаваць падрыхтоўку паўстання ў час наступлення Чырвонай арміі. Але жандарам стала вядома месца правядзення нарады, і ўсе яе ўдзельнікі былі арыштаваны. 24 красавіка адбыўся ваенна-палявы суд, які прыгаварыў 14 чалавек да пакарання смерцю, 12 партызан — да катаржных работ, 9 чалавек — да 10 гадоў зняволення. Пакаранне смерцю адбылося публічна 25 красавіка на гарадскіх могілках.

Жандары лічылі, што з супраціўленнем пакончана, але напады партызан, наадварот, рабіліся ўсё больш частымі, яны псавалі тэлефонную сувязь, чыгуначныя камунікацыі і г.д.

Чырвоная армія набліжалася да Беларусі. Узнікла патрэба ў каардынацыі дзеяння армейскіх часцей і партызан. У пачатку чэрвеня 1920 г. М.Юшкевіч быў накіраваны ў Смаленск у штаб Заходняга фронту. Там ён атрымаў інструкцыі, як дзейнічаць партызанам пры падыходзе часцей Чырвонай арміі да Слуцка. Пасля яго вяртання падпольны павятовы камітэт партыі бальшавікоў пачаў рыхтаваць 2-ю павятовую канферэнцыю, якая адбылася 12 чэрвеня. Праходзіла яна ў полі каля в. Варкавічы. Удзельнікі канферэнцыі прынялі рашэнне: пры набліжэнні Чырвонай арміі напасці на варожыя фарміраванні, не даць спаліць горад пры адступленні.

Калі пачалося ліпеньскае наступленне Чырвонай арміі ў Беларусі, партызаны рушылі да Слуцка. Усю ноч з 14 на 15 ліпеня праз горад спешна адступалі польскія войскі. Яны падпалілі памяшканне камерцыйнага вучылішча, мост цераз раку Случ, жылыя дамы, узарвалі вакзал і ўчасткі чыгункі.

Раніцай 15 чэрвеня ў горад увайшлі часці 6-й брыгады 2-й чырвонаармейскай дывізіі. У той жа дзень быў створаны часовы павятовы Ваенна-рэвалюцыйны камітэт на чале з І.Бачко, з 21 чэрвеня дзейнічаў пастаянны рэўком на чале са старшынёй С.А.Несцерам, з канца чэрвеня яго змяніў І.Уладзіміраў.

31 ліпеня 1920 г. у Мінску зноў была абвешчана БССР. У яе склад увайшоў Слуцк і павет. Случане прыступілі да мірнай працы, але яна была нядоўгай. Войскі Польшчы, атрымаўшы новыя падмацаванні з краін Антанты, перайшлі ў контрнаступленне. Чырвоная армія вымушана была адступіць. У кароткі тэрмін фронт з-пад Варшавы перамясціўся да Мінска. 17-я дывізія 16-й арміі Заходняга фронту 5 кастрычніка адышла на лінію Грэск — Бранава — Селішча — Пагост. Слуцк абаранялі 49-я і 55-я брыгады гэтай дывізіі. Аднак пасля вулічных баёў 11 кастрычніка 1920 г.

Наследие слуцкого края

Слуцк зноў быў заняты польскімі акупантамі.

Як Польшча, так і Савецкая Расія не мелі магчымасці працягваць вайну, і 12 кастрычніка ў Рызе быў заключаны дагавор аб перамір'і, пачаліся перагаворы аб міры. У выніку перагавораў Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь адышлі да Польшчы. Ваенныя дзеянні спыніліся ў 24 гадзіны 18 кастрычніка. Устанавілася нейтральная зона. У гэты час не без удзелу Польшчы і Найвышэйшай рады БНР рыхтавалася яшчэ адна акцыя, якая ў пэўных колах атрымала назву «Слуцкае паўстанне».

Перад адыходам польскага войска Найвышэйшая рада рашыла сфарміраваць вайсковыя атрады, каб аказаць узброенае супраціўленне Чырвонай арміі, якая павінна была заняць горад і павет на падставе дагавора аб перамір'і. 15—16 лістапада 1920 г., калі польскія войскі былі яшчэ ў Слуцку, па ініцыятыве суддзі Пракулевіча адбыўся з'езд, на якім прысутнічала 127 чалавек. З'езд вырашыў сфарміраваць брыгаду з двух палкоў. Была выбрана таксама Слуцкая рада з 17 чалавек і выказаны пратэст супраць уступлення ў межы павета, адпаведна з умовамі перамір'я, часцей Чырвонай арміі. Удзельнікі з'езда не пратэставалі супраць акупацыі Заходняй Беларусі Польшчай, а наадварот, выступалі за перадачу ёй Слуцкага павета, патрабавалі пакінуць яго ў межах Польшчы.

14 лістапада ў Рызе было падпісана пагадненне аб вывадзе войскаў інтэрвентаў з савецкай тэрыторыі. Аднак польскія акупанты пакінулі Слуцк толькі 24 лістапада, а 29 лістапада 1920 г. часці Чырвонай арміі ўвайшлі ў горад. У гэты час створаная слуцкая брыгада разам з Радай Случчыны адышла ў нейтральную зону. Пасля 28 снежня палкі Слуцкай брыгады склалі зброю і былі інтэрніраваны.

18 сакавіка 1921 г. быў падпісаны савецка-польскі Рыжскі мірны дагавор, па ўмовах якога заходнія часткі Украіны і Беларусі адышлі да Польшчы. 6 паветаў Мінскай губерні, у тым ліку і Слуцкі, засталіся ў складзе БССР. Да 1939 г. дзяржаўная граніца БССР з Польшчай праходзіла за 30—40 км на захад і паўднёвы захад ад Слуцка.

У 1922 г. паўсюдна ў БССР абмяркоўвалася пытанне аб стварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік — СССР. 7 снежня ў Слуцку адбыўся 6-ы павятовы з'езд Саветаў, які падтрымаў праект стварэння новай формы саюзнай дзяржавы. 30 снежня 1922 г. у Маскве на I Усебеларускім з'ездзе Саветаў былі прыняты дэкларацыя аб стварэнні СССР і Саюзны дагавор, БССР увайшла ў склад СССР. У ліку дэлегатаў на з'ездзе прысутнічаў старшыня Слуцкага павятовага выканкома М.В.Уладзіміраў.



Чырвонаармейцы — удзельнікі вызвалення Слуцка ад польскіх акупантаў на адной з вуліц горада. Ліпень 1920 г.

Наследие слуцкого края

ГАСПАДАРЧАЕ БУДАЎНІЦТВА

Пасля грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі перад працоўнымі горада і павета паўсталі складаныя і цяжкія задачы. Трэба было аднаўляць разбураную гаспадарку, будаваць новае жыццё. Спроба бальшавіцкай партыі перайсці да сацыялістычнага метаду гаспадарання ў форме ваеннага камунізму прывяла да эканамічнага крызісу, які дапоўніўся крызісам палітычным. У вайну эканоміка прыйшла ў заняпад, панавалі беспрацоўе, бандытызм. У выніку паліўнага крызісу многія прадпрыемствы не працавалі, сур'ёзныя разбурэнні былі ў чыгуначнай гаспадарцы. Старэўскі шклозавод, напрыклад, не працаваў па 4—6 месяцаў, поўнасцю была разабрана вузкакалейка Слуцк—Ляхавічы. Як выратавання, людзі чакалі каардынальных перамен. Вынікам іх з'явілася новая эканамічная палітыка. З 1922 г. у Слуцку пачала наладжвацца работа невялікіх прамысловых прадпрыемстваў, што дало магчымасць паступова ліквідаваць беспрацоўе. У 1923 г. у горадзе была пабудавана невялікая прыватная маслабойня, працавалі 3 млыны, некалькі майстэрань. Значная ўвага надавалася развіццю дробнай вытворчасці, промыслам. Адкрыліся швейныя, слясарныя, шавецкія і дрэваапрацоўчыя майстэрні, пякарні, лаўкі — усё гэта спрыяла хуткаму росту вытворчасці і тавараабароту. У 1924 г. у горадзе арганізаваны арцелі «Чырвоная зорка», «Чырвоны работнік», імя Крупскай. Яны аб'ядноўвалі саматужнікаў — металістаў, бляхароў, рымароў, швейнікаў, пекараў.

У 1924—1925 гг. на базе прыватнага млына Мышалава быў створаны завод па выпуску абознага абсталявання «Аб'яднаны металіст», які ў 1930-я гады атрымаў назву «Пралетарый» (цяпер — вытворчае металаапрацоўчае аб'яднанне).

Са студзеня 1925 г. пачаў працаваць гарбарны завод, пры ім — шавецкая майстэрня, была адкрыта невялікая каўбасная фабрыка. Майстэрні бляхароў і кавалёў былі рэарганізаваны ў сельскагаспадарчыя. Пазней яны былі сканцэнтраваны на вул. Камсамольскай і склалі аснову ліцейна-механічнага завода, які з часам пераўтварыўся ў сучасны завод «Эмальпосуд». У строй была ўведзена электрастанцыя.

У сувязі з аднаўленнем прамысловасці выросла патрэба ў кваліфікаваных рабочых. Для гэтага была адкрыта прафесійна-тэхнічная школа з вытворчымі майстэрнямі двух кірун-



Святочная дэманстрацыя ў Слуцку 7 лістапада 1922 г.

Наследие слуцкого края

каў — падрыхтоўка металістаў і дрэваапрацоўшчыкаў. У горадзе аднавілі будынак былога камерцыйнага вучылішча, у якім размясціліся школа-сямігодка, камітэты прафсаюзаў і Дом культуры. Сталі ўпарадкоўвацца вуліцы. У 1924 г. адкрылася аўтобусная лінія Слуцк — Цімкавічы.

У ліпені 1924 г. у БССР было ўведзена новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне, па якім Слуцк з цэнтра павета (у яго ўваходзіла 16 валасцей) стаў цэнтрам акругі, куды ўвайшло 7 раёнаў: Слуцкі, Грэскі, Старадарожскі, Старобінскі, Любанскі, Чырвонаслабодскі і Капыльскі. Колькасць сельскіх Саветаў у іх — 88, колькасць насельніцтва ў акрузе — 273 146 чалавек. Слуцкі раён быў утвораны 17 ліпеня 1924 г. Паводле перапісу 1923 г. у горадзе пражывала 13 708, у 1927 г. — 15 988 чалавек.

У снежні 1924 г. у Слуцку адбылася першая акруговая канферэнцыя Камуністычнай партыі, на якой быў выбраны акруговы камітэт.

Значныя перамены адбыліся ў сельскай гаспадарцы, якая пасля ваеннага ліхалецця знаходзілася ў заняпадзе. Адным з першых крокаў улады была замена харчовай і сыравіннай раскладкі натуральным падаткам. Сяляне прынялі яго станоўча, бо пасля выплаты падатку яны маглі распараджацца рэшткамі прадукцыі, прадаваць яе на рынку. Аднаўленне сельскагаспадарчай вытворчасці ў гэты перыяд адбывалася на базе дробных сялянскіх гаспадарак. У 1923 г. быў прыняты Зямельны кодэкс БССР, які замацаваў нацыяналізацыю ўсёй зямлі. Становішча сельскай беднаты палепшылася. Гэтаму спрыяла ліквідацыя памешчыцкага землеўладання, падзел зямлі паміж беззямельнымі і малазямельнымі, падатковая і сацыяльная палітыка Савецкай дзяржавы, яе дапамога. Значная частка малазямельных узнялася да ўзроўню сераднякоў. Усе гэтыя змены склалі ўмовы для развіцця розных формаў кааперацыі ў вёсцы: таварыстваў па апрацоўцы зямлі, камун, сельскагаспадарчых арцелей.

У красавіку 1921 г. у в. Пуцяты арганізавалася першая камуна — імя К.Маркса. Стваралася яна на матэрыяльнай базе памешчыцкага маёнтка. Першымі камунарамі Случчыны былі Пётр Кашанскі, Даніла Атліванчык, Міхаіл Турбан, Фёдар Цяцерскі і Мікалай Каманскі. Кіраўніком камуны выбралі Пятра Сільвестравіча Кашан-



Агульны выгляд тэрыторыі ліцейна-механічнага завода. 1924 г. (цяпер завод «Эмальпосуд»).

Наследие слуцкого края



П.С.Кашанскі.

скага. У 1925 г. камуна была рэарганізавана ў калгас імя К.Маркса, які меў 140 гектараў сельгасугоддзяў, у т.л. 80 гектараў ворнай зямлі. У калгаснай гаспадарцы налічвалася 15 кароў, 11 коней, 45 галоў свіней; з інвентару — 8 плугоў, 12 барон, касілка, конная малатарня, жняярка.

У 1921 г. пад Слуцкам арганізаваўся саўгас «Пралетарый». Ён узнік, як і камуна, на матэрыяльнай базе памешчыцкага маёнтка Сузоўчыцы. У тым жа годзе, што і камуна, ён быў таксама рэарганізаваны ў калгас. Першым старшынёй яго стаў Васілій Захаравіч Корж. У 1926 г. дзве гаспадаркі аб'ядналіся ў адзін калгас — імя К.Маркса. Агульная плошча іх склала 410 гектараў зямлі, у т.л. 280 га ворнай. У аб'яднаны калгас уваходзілі 32 сялянскія гаспадаркі.

Да пачатку масавай калектывізацыі ў Слуцкім раёне было 14 калектыўных гаспадарак. У 1925 г. былі арганізаваны калгасы імя Вінічэўскага Казловіцкага, «Вольны труд» Беліцкага, «Прагрэс» Сярэдніцкага, «Чырвоны Кастрычнік» Велікасліўскага, «1 Мая» Прошчыцкага сельсаветаў. Актывізаваўся калгасны рух на Случчыне ў 1927—1928 гг.

У прамысловасці за кароткі час новая эканамічная палітыка дазволіла дабіцца аднаўлення вытворчасці, стабілізаваць эканоміку і фінансы, палепшыць матэрыяльнае становішча працоўных. Значныя змены адбыліся ў сельскай гаспадарцы. Да 1925 г. у асноўным адноўлены даваенныя пасяўныя плошчы, ураджайнасць і валавы збор сельскагаспадарчых культур дасягнулі даваеннага ўзроўню, добрыя вынікі былі і ў жывёлаводаў. Склаліся спрыяльныя ўмовы для далейшага развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

У горадзе разгарнулася будаўніцтва новых прадпрыемстваў. У 1926 г. пабудавана новая электрастанцыя, што дало магчымасць электрыфікаваць поўнас-



Аўтамабілі 5-га дарожнага ўчастка. Слуцк. 1927 г.

Наследие слуцкого края

цю гарадскія ўскраіны і прыгарадныя вёскі. Пачалося масавае пераабсталяванне прадпрыемстваў. Новыя станкі атрымалі заводы: мукамольныя «Прагрэс» і «Эканоміка», цагельны. Павялічыўся выпуск прадукцыі на гарбарным заводзе, саматужна-рамесных прадпрыемствах — швейнай, панчошнай, дрэваапрацоўчай, у картанажнай прамысловасці. У 1929 г. адкрылася мармеладная фабрыка, пры якой з 1933 г. пачаў працаваць вінаробны цэх, быў рэканструяваны мукамольны завод «Прагрэс», які стаў даваць у суткі да 50 т мукі. Развіваліся прамысловыя арцелі. Усё гэта спрыяла росту праслойкі рабочых і служачых.

У 1930 г. на базе старой маслабойні і млына створаны плодаагароднінны прадпрыемства і арцель па вырабе мэблі — сталоў, кушэтак, канцылярскіх шафаў і матрацаў. Былі пабудаваны новыя прадпрыемствы — рамонтна-механічны завод, масласыразавод, завод па вырабе дахоўкі.

Развіццё калгасаў паставіла перад прамысловасцю новыя задачы. На ўскраіне горада адкрылася машынна-трактарная майстэрня, дзе працавалі 50 чалавек. Тут шліфаваліся каленчатыя валы трактарных рухавікоў, цыліндры блокаў, выпускаліся некаторыя дэталі сельскагаспадарчых машын. У канцы года была арганізавана машынна-трактарная станцыя (МТС). У в. Вялікая Сліва дзейнічалі трохмесячныя курсы трактарыстаў, на якіх займаліся 42 чалавекі.

У 1934 г. на 7-м акруговым з'ездзе Саветаў былі адзначаны вялікія поспехі працоўных горада і раёна. Валавая прадукцыя прамысловых прадпрыемстваў выросла ў 1931 — 1934 гг. на 48%, павялічылася колькасць рабочых на 256%, калгасы раёна аб'ядноўвалі 79% сялянскіх двароў. За гэтыя гады значна змянілася і аблічча горада. У сярэдзіне 1930-х гадоў на месцы рынку быў разбіты сквер, замошчаны вуліцы Пралетарская, Ленінская, Калгасная, Сацыялістычная і іншыя. Горад быў радыёфікаваны. У 1936 г. на добраўпарадкаванне Слуцка выдаткаваны 1 мільён рублёў. У 1938 — 1940-я гады пачаў ажыццяўляцца план генеральнай рэканструкцыі горада. Паводле перапісу 1939 г. у Слуцку пражывала 21 947 чалавек.



Удзельнікі 3-й Слуцкай акруговай канферэнцыі КП(б)Б. 1926 г.

Наследие слуцкого края

Новая электрастанцыя магутнасцю 1600 кВт уступіла ў строй у пачатку 1940-х гадоў, былі пабудаваны мясакамбінат, аўтамайстэрня, торфазавод, працягнута чыгуначная лінія Слуцк — Цімкавічы, пабудаваны Дом Саветаў. У горадзе налічвалася 17 прадуктовых і 15 прамтаварных магазінаў.

У раёне дзейнічалі 93 калгасы, плошча зямель якіх складала 98 393 гектары, 40 калгасаў былі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, а ў 1939 г. на ёй быў прадстаўлены ўвесь раён. У калгасах налічвалася каля 20 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, каля 9 тысяч коней. У раёне працавалі 3 МТС, якія мелі 150 трактароў і камбайнаў. У 1938 г. сярэдняя ўраджайнасць зерневых склала звыш 10 цэнтнераў з гектара, бульбы — 150, ільну — 4 ц з гектара. Для таго часу гэта былі добрыя паказчыкі.

КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ

Добрыя змены адбыліся і ў культурным жыцці Случчыны. З 1929 г. у горадзе працавала цэнтральная бібліятэка, 8 рабочых клубаў і пры іх бібліятэкі, клуб піянераў, два кінатэатры. З 1936 г. у горадзе дзейнічаў калгаснасаўгасны тэатр, у рэпертуары якога былі спектаклі вядомых драматургаў: А.Астроўскага «Позняе каханне» і «Не ўсё кату масленіца», М.Горкага «Васа Жалязнова», К.Крапівы «Хто смяецца апошнім» і інш. Рэжысёрам тэатра быў А.Ф.Аржанаў. Поспехам карысталіся ў гледачоў артысты К.Ф.Мамыкіна, Л.М.Марцьянава, Г.М.Мітрына, В.Г.Гецаў і інш.

З 1938 г. да 1941 г. тры разы на тыдзень выходзіла раённая газета «За сацыялістычную Радзіму». А да гэтага, з лістапада 1921 г. да студзеня 1922 г., выходзіла мясцовая газета «Плуг і молат» (тыраж 800 экзэмпляраў), са снежня 1924 г. да лютага 1926 г. — два разы на тыдзень — газета «Вясковы будаўнік», з красавіка 1930 г. — раённая газета «Ленінскі шлях», з 1935 г. да 1938 г. — замест раённай выпускалася акруговая газета «Праўда на рубяжы».

Пачынаючы з 1920-х гадоў, забяспечвалася ўсеагульная адукацыя, праводзілася работа па ліквідацыі непісьменнасці, падрыхтоўцы кадраў. У 1922 г. у рэспубліцы была праведзена рэформа школьнай сістэмы. Асноўную дзевяцігадовую замяніла сямігадовая працоўная агульнаадукацыйная школа. Аднак узнікалі складанасці са сродкамі і кадрамі. У гэты перыяд у Слуцку адкрылася прафесійна-тэхнічная школа, былі наладжаны агульнаадукацыйныя курсы, на якіх



Дзіцячыя яслі калгаса імя Дзяржынскага. 1936 г.

Наследие слуцкого края

у 1923 г. чытаў лекцыі Якуб Колас. У 1924 г. дзейнічалі 2 тэхнікумы — сельскагаспадарчы і будаўнічы, пункты ліквідацыі малапісьменнасці і непісьменнасці, дзе займаліся 215 чалавек. З 1926 г. працавалі 2 вячэрнія школы для дарослых, з 1927 г. педагагічныя кадры рыхтаваў педтэхнікум, пазней перайменаваны ў педвучылішча. Да 1934 г. у раёне былі 34 няпоўныя сярэднія школы (сямігодкі), дзе займаліся 17 835 дзяцей. У 1939 г. у горадзе дзейнічала 14 школ, сярод іх 4 сярэднія з колькасцю вучняў 4053 чалавекі, працавала 5 дзіцячых садоў на 400 месцаў. Раслі выдаткаванні сродкаў на ўтрыманне навуковых устаноў, у 1939 г. яны склалі 2,2 млн. руб.

На пачатку 1938 г. у БССР было ўведзена новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне: замест акругоў арганізаваны вобласці. У сувязі з гэтым Слуцкая акруга была ліквідавана, а Слуцкі раён увайшоў у склад Мінскай вобласці, Слуцк стаў горадам абласнога падпарадкавання.

ДА ГІСТОРЫІ ПАЛІТЫЧНЫХ РЭПРЭСІЙ

1930-я гады — час складаны і супярэчлівы. У гісторыю Савецкай Беларусі яны ўвайшлі як адны з найбольш цяжкіх і змрочных. З аднаго боку, жыццё праходзіла ў мірных умовах і характарызавалася самаадданай працай народа, сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным развіццём у кірунку пабудовы сацыялізму, з другога — вялася жорсткая барацьба з лепшымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі, рабочага класа, сялянства, нават з апорай улады: партыйнымі і савецкімі работнікамі, кіраўніцтвам арміі. Праяўленнем сталінскай дыктатуры з'явілася барацьба з так званым нацыянал-дэмакратызмам, якая праходзіла ў канцы 1920-х — пачатку 1930-х гадоў. Адным з вынікаў яе з'явілася «выяўленне» ў 1931 г. фактаў нацыянал-дэмакратызму ў Слуцкім педагагічным тэхнікуме, якія праявіліся ў зместах куплетаў і вершаў пра негатыўныя бакі жыцця.

Абвінавачванне ў прыналежнасці да так званых нацдэмаўскіх, контрэвалюцыйных, антысавецкіх арганізацый «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ), Беларускай сацыялістычнай грамады было прад'яўлена 184 чалавекам. Па гэтых справах праходзілі ўраджэнцы Слуцкага павета і Слуцка: П.Я.Жаўрыд, рэдактар газеты «Звязда» (расстраляны), Я.Л.Дыла, былы нарком працы і пісьменнік, вучоны сакратар Інбелкульта (зняволены на 5 гадоў і высланы за межы Беларусі), Ю.П.Гаўрук, пісьменнік (зняволены на 10 гадоў), А.В.Карачун, журналіст (зняволены на 5 гадоў) і іншыя.

Яшчэ большы размах пачаў набіраць пошук «ворагаў народа» ў час і пасля маскоўскага працэсу над членамі так званага паралельнага антысавецкага трацкісцкага цэнтра ў 1937 г. У цэнтральнай і мясцовай прэсе з'явіліся артыкулы аб выкрыванні «ворагаў народа», заклікі да пільнасці, бо «...вораг умела маскіруецца, праводзячы сваю гнусную работу...». У чэрвені гэтага года ў слуцкай акруговай газеце «Праўда на рубяжы» была змешчана падборка матэрыялаў «працоўныя акругі аднадушна патрабуюць расстрэлу фашысцкіх шпіёнаў». Рэзалюцыі такога зместу былі прыняты ўдзельнікамі сходаў і мітынгаў у арцелях імя Молатава і «Пралетарый», калектывах бальніцы і школ.

Усё часцей і часцей пачалі выяўляць «ворагаў народа» на Случчыне. 29 ліпеня 1937 г. на пленуме ЦК КП(б)Б быў выключаны, затым арыштаваны, а ў 1938 г. расстраляны старшыня акруговага выканаўчага камітэта К.М.Жалудоў, які абвінавачваўся ў прыналежнасці да «антысавецкай тэрарыстычнай дыверсійна-шкодніцкай арганізацыі правых». У шкоднай дзейнасці былі абвінавачаны і старшыня раённага выканкома Адамчук, сакратар акруговага і раённага камітэтаў камсамола

Наследие слуцкого края

Галкоўскі і Коган, член акруговага суда Вішнеўскі. Была арыштавана вялікая колькасць святароў, работнікаў чыгункі (14 чыгуначнікаў расстраляны). Хваля арыштаў пракацілася па вёсцы. Так, без суда і следства былі расстраляны калгаснікі А.І.Лясун, А.К.Жываглод і шмат іншых бязвінных людзей, якія быццам бы вялі антысавецкую прапаганду.

Жыццё народа ў гэты перыяд праходзіла ва ўмовах ўсталявання культу асобы І.В.Сталіна, узмацнення адміністрацыйна-камандная сістэмы. Безумоўна, гэта наклала адбітак на ўсе бакі грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця. Аднак праца случан давала свой плён. У пачатку 1940-х гадоў былі дасягнуты новыя рубяжы ў сацыяльна-эканамічным развіцці.

Крыніцы:

1. Грицкевич А.П. Древний город на Случи. Мн., 1985.

2. Жук А. Трыццаць сёмы... // Шлях Ільіча, 1991. № 81–83.

3. Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. Мн., 1995.

4. Праўда на рубяжы. 1937. 31 сак.

В.С.Відлога.

Дакументы сведчаць

ПАСТАНОВА СЛУЦКАГА ПАВЯТОВАГА СЯЛЯНСКАГА З'ЕЗДА АБ СТВАРЭННІ ВАЛАСНЫХ ЗЯМЕЛЬНЫХ КАМІТЭТАЎ І ПАВЯТОВАГА САВЕТА СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ

2(15) ліпеня 1917 г.

1. Волостные земельные комитеты образовать в каждой волости.

2. Образовать Совет крестьянских депутатов Слуцкого уезда из 50 чел. (по 2 от каждой волости), которые должны быть выбраны крестьянским населением каждой волости и командированы 9 июля 1917 года в гор. Слуцк для избрания исполкома из 3 лиц.

Эти 3 лица должны постоянно находиться в Слуцке. Совет крестьянских депутатов и его исполком должны по-прежнему работать совместно с Советом солдацких, рабочих депутатов и его исполкомом, но в исполкоме Совета солдатских, рабочих и крестьянских депутатов специально крестьянским вопросом должны ведать исключительно 3 постоянных представителя от крестьян.

Вестник Минского губернского комиссариата. 1917. 8(21) июля.

З РЭЗАЛЮЦЫІ АГУЛЬНАГА СХОДУ ЧЛЕНАЎ РСДРП(б) СЛУЦКА

14(27) кастрычніка 1917 г.

...Измученному народу нужен мир, хлеб и свобода. Буржуазно-соглашательная власть не могла удовлетворить этих требований, а поэтому мы, революционные рабочие, солдаты и крестьяне, требуем:

1) Передачи власти революционной демократии в лице Советов.

2) Немедленной передачи всех земель без выкупа земельным комиссиям и Советам крестьянских депутатов впредь до решения Учредительного собрания и снабжения беднейших крестьян инвентарем.

3) Введения рабочего контроля над производством и распределением продуктов производства, контроля над банками и национализации важнейших отраслей промышленности, обложения крупных капиталов и имуществ, конфискации военных прибылей.

4) Объявления тайных договоров недействительными и предложения всем воюющим государствам всеобщего мира.

5) Обеспечения прав наций, населяющих Россию, на самоопределение и отмены репрессивных мер против Финляндии и Украины.

6) Превращения репрессий против революционной демократии и её организации, отмены смертной казни, смены контрреволюционного командного состава.

7) Выборность комиссаров и других должностных лиц местными организациями.

8) Всеобщего вооружения рабочих.

9) Роспуска Государственной думы и Государственного Совета и немедленный созыв Учредительного собрания.

Наследие слуцкого края

10) Уничтожения всех сословных преимуществ, чинов их орденов и полного равноправия граждан.

11) Введения 8-часового рабочего дня, всестороннего социального страхования.

Буревестник. 1917. 14(27) окт.

Слуцкі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў

З успамінаў П.Варкуева, члена Слуцкага Савета ў 1917 г.

У 1917 г. я быў салдатам аўтамабільнай каманды пры штабе 2-й дзеючай арміі, які ў той час знаходзіўся ў Слуцку. Пасля ліпеньскіх падзей 1917 г. у Петраградзе мы разгарнулі вялікую работу сярод салдат гарнізона па растлумачэнні і падтрымцы Красавіцкіх тэзісаў У.І.Леніна аб перарастанні буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную. У большасці воінскіх часцей былі арганізаваны партыйныя ячэйкі і групы, у рабоце якіх мне прыходзілася прымаць непасрэдны ўдзел.

Калі 15 кастрычніка (7 лістапада) залпы «Аўроры» апавясцілі свет аб перамозе Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, неадкладна быў скліканы Слуцкі Савет, які аднагалосна прыняў рашэнне цалкам і поўнасцю падтрымліваць Савет Народных Камісараў на чале з У.І.Леніным. Мы, члены Савета, пасля гэтага накіраваліся да салдат і правялі сярод іх сходы. Салдаты выносілі рэзалюцыі аб падтрымцы новага рэвалюцыйнага ўрада.

Слуцкі Савет неадкладна выпусціў адозву аб падтрымцы новага ўрада, да якой далучыліся ўсе воінскія часці. Але памятаю такі выпадак. На другі дзень пасля выпуску адозвы раніцой, калі ў Савеце мы былі ўдвух з Ксенафонтавым, да будынка пад'ехала казацкая сотня. Казакі заявілі, што яны не падтрымліваюць пераварот у Петраградзе. Пасля доўгай гутаркі настрой большасці казакаў змяніўся, і яны паехалі ў сваю часць, заявіўшы, што будуць займаць нейтральнае становішча.

Памятаю яшчэ адзін выпадак. На II Усерасійскі з'езд Саветаў у Петраград ад Слуцка былі пасланы 2 дэлегаты-бальшавікі. Калі яны ехалі назад, то ў Магілёве ва вакзале выступілі на мітынгу перад салдатамі і паведамілі аб звяржэнні Часовага ўрада і перамозе рэвалюцыі. Прадстаўнікі Магілёўскага Савета арыштавалі нашых дэлегатаў, бо Савет іх быў меншавіцкім. Пасяджэнне Слуцкага Савета камандзіравала мяне ў Магілёў з мандатам, у якім патрабавала вызвалення нашых людзей. Гэта выканаў я паспяхова.

Фонды Слуцкага краязнаўчага музея.

Першы ваенком Слуцкага павета

Васемнаццацігадовым юнаком Ціхан Цярэнцьевіч Карака паступіў працаваць на Вярхуцінскі лесазавод. Ад цямна да цямна цягаў цяжкія бярвенні, а за гэта атрымліваў грашы.

...1906 год. Рэвалюцыя ішла на спад. Але паўстанні сялян, забастоўкі рабочых у краіне працягваліся. Хваля рэвалюцыйных падзей дакацілася і да закінутага ў глухамані Вярхуцінскага лесазавода. Рабочыя забасталі. Некалькі дзён на лесазаводзе ніхто не выйшаў на работу. Далучыўся да забастоўшчыкаў і Ціхан Карака.

Царскія жандары жорстка расправіліся з бастуючымі. Многія былі арыштаваны, а яшчэ больш звольнены з работы. Апынуўся за варотамі і Ціхан Карака.

1-я сусветная вайна застала Ціхана Цярэнцьевіча ў царскай арміі. Ён удзельнічаў у баях ва Усходняй Прусіі. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях, Караку ўзнагародзілі Георгіеўскім крыжам. Але хутка руская армія папала ў акружэнне. Разам з тысячамі салдат Ціхан Цярэнцьевіч аказаўся ў палоне. Пачаліся жудасныя дні. Палонных салдат не лічылі за людзей, утрымлівалі пад адкрытым небам у ямах, абнесеных калючым дротам. Іх збівалі да смерці, усяляк здзекаваліся. У лагеры, дзе знаходзіўся Ціхан Цярэнцьевіч, з 25 тысяч палонных праз год засталася палавіна. Астатнія загінулі ад набояў і хвароб.

Два разы ўцякаў Ціхан Цярэнцьевіч з нямецкага палону, і два разы яго лавілі і варочалі назад. Толькі на трэці раз уцёк увянчаўся поспехам.

Наследие слуцкого края



Ц.Ц.Карака.

У 1917 г. Ціхана Цярэнцьевіча выбралі старшынёй палкавога камітэта ў г. Мазыры. Да гэтага часу ён зарэкамендаваў сябе як актыўны прапагандыст бальшавіцкіх ідэй у салдацкіх масах.

1917 г. стаўся памятным для Ц.Каракі і тым, што па даручэнні Слуцкага рэўкома ён арганізоўваў атрады Чырвонай гвардыі.

Люты 1918 г. Слуцк часова акупіравалі часці польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага. Ціхана Цярэнцьевіча Караку пакінулі ў Слуцку для падпольнай работы. Неўзабаве яго арыштавалі і кінулі ў турму, адкуль ён уцёк і зноў узяўся за падпольную работу па арганізацыі партызанскага атрада.

Летам 1918 г. у в. Ісерна і сумежных вёсках Карака сфарміраваў узброены атрад з 250 чалавек. У чаканні заданняў партызаны знаходзіліся па дамах. Але вось надышоў час рашучых дзеянняў. У снежні 1918 г. атрад са зброяй у руках выступіў супраць акупантаў, дапамог рэгулярным часцям Чырвонай арміі вызваліць Слуцк.

Пасля выгнання акупантаў Ц.Караку прызначылі першым ваенным камісарам Слуцкага павета. Ён праводзіў мабілізацыі ў рады Чырвонай арміі, змагаўся з дэзерцірамі.

Але падзеі тых гадоў на Беларусі былі вельмі складанымі. Вясной 1919 г. палякі, пачаўшы наступленне на маладую рэспубліку, захапілі Слуцк. Ціхан Цярэнцьевіч стварыў баявую групу партызан. Група нападала на акупантаў, адбівала ў іх нарабаванае дабро. Так, на станцыі Слуцк партызаны адбілі ў палякаў 11 вагонаў з хлебам і пагналі іх на ўсход. Неўзабаве Ціхан Цярэнцьевіч пайшоў на фронт. Каля трох гадоў змагаўся ён за вызваленне маладой савецкай рэспублікі.

У 1927—1948 гг. Ц.Ц.Карака працаваў на розных участках савецкай і гаспадарчай работы. У 1927 г. ён з'яўляўся старшынёй Пагосцкага сельгаставарыства, потым — старшынёй калгаса «Батрак» Амговіцкага сельсавета, пазней працаваў у Покрашаўскай МТС. Ужо ва ўзросце 60 гадоў яго прызначылі загадчыкам хаты-чытальні, дзе працаваў ён да 1954 г. Апошнія гады Ц.Ц.Карака пражыў у сваёй роднай в. Ісерна.

А.Пыка.

Зары насустрач

З успамінаў М.І.Караля

КАРОЛЬ Міхаіл Іосіфавіч, удзельнік трох войнаў: 1-й сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай. Нарадзіўся ў 1896 г. у в. Лядна. У 1918 г. чырвонагвардзеец Слуцкага атрада, член партыі бальшавікоў. У грамадзянскую вайну змагаўся на Туркестанскім фронце. У гады Вялікай Айчыннай вайны — камісар асобнага кулямётна-артылерыйскага батальёна. Пасля вучобы працаваў у Беларускім інстытуце народнай гаспадаркі, дацэнт кафедры гісторыі КПСС гэтага інстытута, кандыдат гістарычных навук. Памёр у 1970 г.

Мы стояли, вытянувшись, не сводя глаз с командира учебной команды конных разведчиков поручика Протопопова. Набычившись, он шел вдоль строя. На голенищах его хромовых сапог сияло холодное солнце. Ржали кони, гремела артиллерийская канонада. Пахло дымом и порохом.

Протопопов приблизился ко мне и стал молча натягивать на правую руку лайковую перчатку. Я вздрогнул, весь напрягся. Вся учебная команда знала: если Протопопов натягивает перчатку — ожидай беды.

Офицерский кулак ударил меня в челюсть. Я пошатнулся, но устоял на ногах. Солдаты недовольно загудели. Протопопов замахнулся второй раз.

Я перехватил руку поручика, и не успели солдаты опомниться, как Протопопов, по-бабьи взвизгнув, грохнулся на землю. Подняв его за грудь, я еще раз саданул ему между глаз. Строй онемел.

Наследие слуцкого края

Протопопов подхватился с земли и, вобрав голову в плечи, кинулся в сторону офицерской землянки.

Я ринулся к лошадям. Наперерез мне кинулись унтер-офицеры и фельдфебель...

В тюремной камере слышалось бормотание, всхлипывание. Кто-то закричал во сне. Люди ворочались, стонали. Я лежал с открытыми глазами, смотрел, как по серому потолку ползало желтое пятно света, которое пробивалось через решетку. На пятне отражались тени от ветвей дерева, росшего где-то за каменной стеной на улице.

Бухали тяжелые шаги надзирателя в коридоре. Вспомнилось перекошенное лицо Протопопова, его истерический крик: «Сгною! Расстреляю! Повешу!» Снова наплыла и завладела мной ярость на этого гнилозубого дворянского сынка. Я не жалел, что выбил ему два зуба, которые он принес следователю трибунала в качестве вещественного доказательства. Я знал, что царский суд меня за это по головке не погладит, все, на что я мог надеяться, — это расстрел. Шла империалистическая война. Если свободолюбивые солдаты не погибали на фронте, они попадали под безжалостный приговор военного трибунала.

Меня почему-то поместили в камеру, где сидели большевики, эсеры и анархисты. Что мне здесь делать? Неужели меня также считают политическим?

Пятно на потолке бледнело, исчезали на нем тени подвижных веток. Реже гремел коваными сапогами надзиратель в коридоре. Светало.

Как теперь на моей Слутчине? В нашей деревушке Лядно? Может, в этот самый час мать тупает по хате, разжигая щепки в печи, чтобы поставить туда черный чугунок с картошкой. Если, конечно, осталась еще картошка... Жива ли мать...

Припомнилось, как я, восьмилетний мальчишка, собирался на заработки. На востоке только начало светлеть небо. На всю деревню горланят петухи. Мать стоит на подгнившем крылечке и крестит меня: «Иди, сынок, иди. Пусть тебе Бог поможет». Но Бог не помог. Из стада коров, которое я пас, волк зарезал телку кулака-соседа. Едва живого вырвали меня односельчане из его рук...

...Мне четырнадцать лет. Я уже бывалый батрак у зажиточного крестьянина Ильи Гутько в деревне Невязцы. Тяжелая



М.І.Кароль.

до черных кругов в глазах работа. Год... второй...

В августе 1915 года меня одевают в военную форму. И вот он, Западный фронт. Окопы. Огонь и смерть. Всюду убитые, искалеченные, истекающие кровью солдаты... Опустошенные поля и деревни...

...С улицы через решетку долетели винтовочные выстрелы. Камера мгновенно проснулась, загудела. От могучих взрывов вздрогнули стены. Заключенные замолчали. Выстрелы слышались уже совсем рядом. И вдруг повисла глухая тишина. По тюремному коридору пробежал надзиратель. Подошвы его сапог гремели, будто пистолетные выстрелы.

— Что-то стряслось, — сказал мой сосед.

— Анархия — мать порядка, — спокойно ответил ему матрос и зевнул. — Надзиратель в гальюн подался. С перепугу.

В камере нервно засмеялись. В коридоре грохнул выстрел, затупали десятки ног.

— Полундра! — взревел матрос. — Братки, это за нами! Хватай все, что можно! Будем защищаться!

Все вскочили на ноги. Остался сидеть на нарах только один мой сосед. Он дрожащими пальцами крутил цигарку.

Коридор стонал от криков и топота. Загремел засов камеры. Двери широко открылись. В камеру влетел матрос и солдат с винтовками.

— Товарищи! Революция! — крикнули оба и кинулись нас обнимать. — Свернули царю шею!

С минуту мы стояли онемевшие, ошарашенные этой новостью.

Вдоль жилых заборов, приплюснутых хаток серошинельная солдатская масса двинулась к станции Молодечно. Сжимая

Наследие слуцкого края

только что полученные винтовки, мы, бывшие заключенные-смертники, вместе со всеми бежали по узким улочкам. Революционные солдаты и матросы только что окончили аресты реакционных, монархически настроенных царских офицеров и генералов. Воинские части Западного фронта захлестнула волна митингов. Эсеры тянули свою песню, меньшевики свою, анархисты опровергали и тех и других, выставляя свои лозунги. Солдаты же шли за большевиками, боролись с ненавистными офицерами, учились в своих комитетах самоуправлению. События надвигались грозно, неумолимо.

— На сходку-у!..

Блестели на солнце штыки. Сверкали глаза. Толпа гудела, бурлила.

— Тих-ха-а!

Многоголосое гудение постепенно стихло. Над толпой поплыл махорочный дым.

— Граждане свободной России! — взвился чей-то писклявый голосок. — Наша Родина в опасности. Те, у кого есть гражданская совесть, кому дороги завоевания революции, должны не жалея жизни бороться! Бороться до последнего дыхания...

Толпа взорвалась.

— Снова воевать?! Да гори оно гаром!

— Этот крикун крутит языком, как собака хвостом!

— Иди сам, очкарик, повоюй! Увидишь, как война людей жрет, а кровью запивает!

— Товарищи! Меньшевики и эсеры продали нас! Долой войну! Что она нам даст, кроме смерти?..

Последний крик поразил меня до глубины души. Я оглянулся. Это кричал мой сосед по нарам Никита Суворов.

Через несколько дней мы ехали на фронт. Меньшевики и эсеры, которые сидели в Советах, во многих местах захватили фронтовые комитеты, предали народ. Временное правительство мгновенно использовало это.

Снова окопы. Ревели орудия. Шрапнель целовала огненными поцелуями голубое небо. Как злые цепные собаки, тявкали пулеметы. Мы застывали над телами погибших, молча снимали шапки.

Юго-Западный фронт напрягся в ожидании великих событий.

— Керенский приехал! — молнией пронеслось по окопам.

— Ента хто таков?

— Главный над Временным правительством.

— А-а...

На массовом митинге Керенский призвал защищать революционную Россию до последней капли крови, до последнего солдата. По его словам, каждый солдат и офицер должны идти в наступление и отдать свои жизни за Временное правительство.

— Правильна-а! — заревел рядом со мной здоровенный фельдфебель. — Живота своего за гражданина министра не пожалеем!

— Ідзі плюнь свайму міністру ў вочы, ды не кажы, што я паслаў, — насмешливо осадил его усатый солдат — мой земляк белорус.

Вокруг засмеялись, начали крутить цигарки. Интерес к Керенскому угасал на глазах.

Вечером мы были на собрании в лейб-гвардии Кексгольском полку. Выступал солдат — большевик Лопатин.

— Солдаты! Я только что вернулся из Петрограда, где участвовал во Всероссийской конференции фронтовых и тыловых военных организаций РСДРП(б), — Лопатин на минуту умолк, откашлялся. — На конференции, товарищи, выступал Владимир Ильич Ленин...

— Вот что Ильич просил передать вам. — Лопатин поднес к глазам бумажку. — Чужая земля нам не нужна. У нас достаточно своей земли. Солдаты! Объединяйтесь сами крепче и тесней сливайтесь с рабочими и крестьянами. Ясно? — Лопатин обвел взглядом притихших солдат. — А еще Ленин призывает вас не отдавать своей вооруженной силы разным прихвостням. Только тогда народ получит землю и избавиться от помещиков. Слышали? Оружие нельзя выпускать. Оно нам потребуется для защиты новой социалистической революции... Керенский опять приказал начать наступление. Мы должны его сорвать. Как сказал Ильич, нам не нужна чужая земля...

И сразу на опушке леса, где размещался полк, заметались грозные лозунги. Взлетали и падали тяжелыми камнями проклятия, адресованные офицерам и Временному правительству.

Солдаты бушевали.

...Над окопами висела глухая тишина.

Наследие онуйкого края

Мы молча переглядывались, дымили цигарками. Только что все весело смеялись, добродушно подтрунивали один над другим. Теперь наше беззаботное веселье уступило место какому-то напряженному состоянию. Это не были боязнь, растерянность или малодушие — это была психологическая подготовка к будущему серьезному делу.

Командир батареи штабс-капитан Нечаев взглянул на часы и нервно подошел к тяжелому орудию.

— Готовьсь! Сейчас начнется!

Мы лениво поднялись, заняли свои места. Командир батареи, не сводя глаз с часов, начал медленно поднимать руку.

— Огонь!

Никто не шевельнулся.

Молчала и соседняя батарея. Штабс-капитан побелел, начал губами ловить воздух.

— Б-бунт?! Р-расстреляю! Всех под трибунал! Предатели!

Мы молча повернулись к нему спиной, полезли в карманы за махоркой. С соседней батареи долетел разъяренный голос офицера:

— Морды раскровяню-у! Скоты-ы!

— Тише, тише, господин офицер, — ответил ему спокойный хриплый голос. — А то вот с этой штуковины как жахну, так родичей своих вспомнить не успеете. Некогда будет.

Мы засмеялись.

Задуманное Керенским новое наступление провалилось. Солдаты пошли за большевиками.

* * *

В Слуцке по дороге шагала колонна солдат. Впереди — рядовой с черной густой бородой. На рукаве его была красная повязка. Офицеры, которые проходили мимо, иронически улыбались.

Возле хлебной лавки стояла унылая очередь. Некоторые сидели на табуретках, принесенных с собой. В центре города я остановился возле солдатской толпы. Человек в рыжем сюртуке стоял на импровизированной трибуне и что-то выкрикивал.

— Граненым штыком в глотку кайзеру! — донеслось до меня.

«Старая песня», — подумал я, но все же протиснулся поближе к оратору. А тот говорил о революции, о счастье народа, о свободе. Весь полный самовлюбленности, он готов был так говорить часами.

* * *

Бездонное чистое небо нависло над головой, будто перевернутое озеро. Оно светилось холодной голубизной. Я отошел от окна. В помещении Совдепа было накурено. Дым медленно прогибался под потолком. Ежеминутно хлопала дверь. Иван Ксенофонтов, член Военно-революционного комитета 2-й армии Западного фронта, сидел за столом и охрипшим от усталости голосом беседовал с посетителями. Вскоре они вышли. Я глянул в ту сторону. Ксенофонтов спал, сидя за столом.

Внезапно громыхнула смежная дверь.

— Ур-ра-а!

Ксенофонтов вскочил, невольно схватился за маузер. На пороге стоял телеграфист.

— Революция! В Питере — социалистическая революция! Временное правительство арестовано.

— Наконец, — спокойно сказал Ксенофонтов. — Но все же так кричать мне над ухом не следует. Революция должна была свершиться. Товарищи! Поднимайте членов Совдепа. Будем восстанавливать нашу власть по всему Слуцкому уезду...

Большевики-армейцы составляли основное ядро Слуцкого комитета РСДРП(б). Иван Ксенофонтов вступил в партию еще в 1903 г. Сам бывший солдат, он хорошо знал жизнь, очень отзывчиво реагировал на просьбы товарищей, спокойно и убедительно давал ответы на волнующие вопросы. Из революционных солдат старой армии, которых репрессировало Временное правительство за политическую неблагонадежность, Ксенофонтов неутомимо создавал Красную гвардию. В один из ее отрядов вступил и я со своими друзьями-фронтовиками Тимофеем Махуном, Степаном Лебедем и Федором Лобаном.

Этой же ночью Иван Ксенофонтов издал приказ о переходе всей власти в руки Советов. Слуцкий отряд Красной гвардии через несколько часов после этого двинулся на железнодорожную станцию. Она была захвачена без единого выстрела. Оставив там для охраны несколько десятков человек, мы направились на почту, захватили телеграф. В Минский Совет полетела те-

Наследие слуцкого края

леграмма: «Слуцкий Совет взял власть в свои руки». Тем временем мы уже окружили здание воинского начальника и арестовали офицеров. На рассвете красногвардейцы контролировали все значительные объекты города. Полицейские, жандармы и урядники бежали.

Взошло солнце. По улицам сновали солдаты с красными флажками на штыках. Люди выходили из своих домов и долго не могли понять, что произошло. У одних весть о социалистической революции вызывала радостную улыбку на лицах, другие же кривились, будто от полынной настойки, и поспешно закрывались на замки и запоры.

Над зданием Слуцкого комитета РСДРП(б) и Совета рабочих и солдацких депутатов полыхал красный флаг. На объединенном заседании выступил Иван Ксенофонтов.

— Товарищи! — взволнованно говорил он. — Я предлагаю одобрить решение второго Всероссийского съезда Советов. Мы должны высказать свою поддержку Совету Народных Комиссаров во главе с Владимиром Ильичем Лениным.

Ответом ему были дружные аплодисменты.

— Друзья! — продолжал Ксенофонтов. — Предлагаю на 28 октября созвать съезд крестьянских депутатов Слуцкого уезда. Крестьяне не должны стоять в стороне от революции. Давайте обсудим, как нам лучше провести этот съезд. Надо выделить проверенных членов нашей партии для организаторской работы среди крестьян...

Съезд крестьянских депутатов заявил, что он признает только Советскую власть во главе с Советом Народных Комиссаров и единогласно обещал ему полную поддержку.

Закрепление Советской власти в крупнейших городах и населенных пунктах Беларуси вызвало яростное сопротивление контрреволюции. Один из штабов этих контрреволюционных сил назывался «Комитетом спасения Родины и революции». Он сформировался 27 октября 1917 года в Минске и опирался на реакционные части, которые находились на стороне Временного правительства: батальоны ударников, батальон георгиевских кавалеров, национальный польский корпус Довбор-Мусницкого. Самой же надежной у «комитета спасения» была Кавказская дивизия. Ее еще называли «дикой дивизией».

Мы сидели на лавках и слушали, как Иван Ксенофонтов разговаривал по телефону. Положив трубку, он начал рассказывать:

— Из Минска неплохие вести. Разогнан меньшевистско-эсеровский «комитет спасения» и арестованы его главари. Взят под стражу комиссар фронта, распущен меньшевистско-эсеровский фронтовой комитет. Главнокомандующий Западным фронтом генерал Балуев получил по шапке. Вместо него назначен большевик Каменщиков.

— Значит, штаб Западного фронта в наших руках? — спросил кто-то.

— Да, — кивнул головой Ксенофонтов. — Нам поставлена задача — срывать продвижение реакционных воинских частей через станцию Слуцк на Минск, Москву, Петроград.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: В борьбе за Советскую власть. Мн., 1967. С. 141—159.

За шчасце простага чалавека

З успамінаў І.Р.Басінкевіча

БАСІНКЕВІЧ Ісак Раманавіч, нарадзіўся ў 1899 г. у Слуцку. Удзельнік рэвалюцыйных падзей, член партыі бальшавікоў з 1917 г. Агітатар сярод салдат Заходняга фронту. У 1918 г. сакратар Слуцкага падпольнага камітэта партыі. З 1919 г. па 1923 г. у радах Чырвонай Арміі. Пасля працаваў у апараце ЦК УКП(б), інструктарам ТАСС, у Прафвыдавецтве. У гады Вялікай Айчыннай вайны на фронце, палітработнік. Жыў у Маскве.

На долю Слуцкой партийной организации после Октябрьской социалистической революции выпали серьезные испытания. На отдельных моментах борьбы с внешними и внутренними врагами я и остановлюсь, попытаюсь с помощью документов и по памяти восстановить картину тех дней.

В начале 1918 года войска корпуса под командованием генерала Довбор-Мусницкого, расположенные в Могилеве и Бобруйске, подняли мятеж против Советской власти: разгоняли Советы, арестовывали большевиков и сочувствующих им трудя-

Наследие слуцкого края

щихся, творили расправу над тысячами белорусов. Этот корпус в Первую мировую войну как польское национальное соединение входил в состав царской армии.

Мятежные войска, находившиеся в Бобруйске, двинулись к станции Осиповичи, поставив перед собой цель захватить этот важный железнодорожный узел, а потом занять Слуцк, который по тому времени являлся важнейшей житницей Беларуси. Создалось крайне напряженное положение. Ведь на западе нам угрожали немецкие войска. А тут еще мятеж корпуса — как нож в спину.

Учитывая сложность обстановки, Слуцкий Совет рабочих, крестьянских и солдацких депутатов переименовал себя в Военно-революционный комитет. Было принято решение двинуться навстречу мятежным войскам, то есть не обороняться, а наступать. Приходилось рассчитывать на местные силы, так как Красная Армия еще не была создана, а на войска, расположенные вблизи города, надежда была слабая.

Военно-революционный комитет оповестил население о грозящей опасности и призвал трудящихся уезда к оружию. Везде прошли митинги и собрания, призывавшие к защите завоеваний Октября, к разгрому мятежников.

Сразу же откликнулись добровольцы. Был сформирован отряд из трехсот человек. Командование принял один из руководителей Военно-революционного комитета, большевик Яков Аскольдов. Основное ядро отряда составили бывшие солдаты царской армии, охранявшие Военно-революционный комитет. Велико было желание солдат, прошедших через окопы всей империалистической войны, вернуться домой, к семьям. Но вместе с тем они понимали, что только при полной победе революции можно будет получить землю и мирно ее обрабатывать. И солдаты добровольно пошли на борьбу с мятежниками. Плечом к плечу с ними стали молодые случане и пожилые рабочие города. Отряд двинулся навстречу врагу. По пути следования в него вливались новые добровольцы из местечек Уречье, Верхутино, Старые Дороги. Под ружье становились деревенские парни из бедноты.

Первый бой с контрреволюционными войсками Довбор-Мусницкого разгорелся 24 января 1918 года под станцией Ясень. Со стороны мятежников в нем участвовало 1500 солдат и офицеров всех родов войск. Под красным знаменем стояло 500 революционных бойцов.

Наступали красногвардейцы, мятежники оборонялись. Бой был упорным и кровопролитным. Несмотря на численное превосходство противника, отряду удалось выбить мятежников с занимаемых позиций, захватить станцию Ясень. И все же силы были неравные. Противник подтянул подкрепления и перешел в контрнаступление. До последнего патрона отстреливались пулеметчики, ученик Слуцкого коммерческого училища тов. Прищепа и другие бойцы. Но слишком большие были потери отряда. Отдельные группы его стали пробиваться через леса и овраги в сторону Орши.

Между тем мятежные войска, рассеяв наш красногвардейский отряд, заняли станцию Осиповичи, а затем вступили в Слуцк. Коммунистам пришлось уйти в глубокое подполье.

Начались массовые обыски и аресты. Враги знали, что оказавший им упорное сопротивление отряд сформировался в Слуцке. Поэтому они применяли к заключенным самые утонченные пытки. Из деревянного здания во дворе мужской гимназии, где располагалась дефензива, на весь квартал разносились стоны и крики истязуемых. Но никто не выдал членов комитета, коммунистов. Отдельные товарищи были схвачены просто случайно, при облавах. Вел допрос и руководил истязаниями полковник Войнилович. Иногда он показывался на улицах. В нем быстро узнали помещика, который владел имениями в Слуцком уезде. Не случайно свирепствовал Войнилович, он хотел вернуть реквизированные в итоге революции имущество и земли.

Беларусь была лакомым куском и для немцев. Они никому не хотели уступать ее. И вот из района Баранович, где проходила линия фронта, на восток двинулись кайзеровские солдаты. Легионеры Довбор-Мусницкого не сопротивлялись. Они рассчитывали разделить власть с германскими оккупантами и восстановить буржуазный порядок. Однако немцы приказали полякам сдать оружие.

По городу был расклеен приказ, в котором говорилось: «Жители города при встрече с немецкими офицерами обязаны

Наследие слуцкого края

приветствовать их снятием головного убора и поклоном». Многие граждане, особенно молодежь, не хотели сносить такого унижения и не выполняли приказа. За это они подвергались арестам и жестоким избиениям.

Через некоторое время война террора несколько спала. Оккупанты, видимо, считали, что в основном с операцией по вылавливанию неблагонадежных справились их предшественники — легионеры.

Скрывавшиеся подпольщики начали показываться на улицах. Возобновились встречи, восстановились прерванные связи, партийная работа наладилась.

Вскоре был организован Слуцкий подпольный большевистский комитет. Его секретарем товарищи избрали меня. Основное внимание комитет сосредоточил на создании в городе и уезде большевистской организации, на формировании партизанских отрядов в деревнях, на разложении и подрыве боеспособности немецкой армии.

На первых порах подпольная организация насчитывала всего пятнадцать человек. Но все это были боевые, преданные делу революции люди, готовые, если это потребуется, отдать и жизнь для торжества ленинских идей. Такие, как Иосиф Богданович, который значительную часть времени проводил в разъездах, восстанавливал связи между подпольщиками в уезде, организовал вместе с другими товарищами партизанские отряды в Копыле, Клецке, Тимковичах и прилегающих к ним деревнях.

Собрания подпольщиков проводились каждый раз на новом месте. Только в кузнице, расположенной в глубине одного из дворов по Копыльской улице, провели несколько собраний. Уж очень удобное и укромное было место. Днем здесь шумело пламя, гремел молот о наковальню, а вечером собирались подпольщики.

Протоколы или какие-нибудь записи по условиям конспирации не велись. Все откладывалось в памяти. Организация охраны собраний была поручена члену подпольного комитета столяру Водоносову.

Много мы поработали с немецкими солдатами. Стоит немецкий часовой на посту или сидит на завалинке, греется на солнышке, и тут к нему подсаживается большевистский агитатор, угощает папиросой, завязывает разговор. Потом, смотря по настроению солдата, агитатор говорит об оккупации, о том, что немцы находятся на чужой земле, а белорусы борются за землю и волю, за раскрепощение трудового человека, о возможной революции в Германии. Немецкие солдаты охотно беседовали с агитаторами, многие из которых хорошо знали немецкий язык. Да и воевать немцам уже здорово надоело. А возраст солдат, находившихся в Слуцке, в основном был солидный — император Вильгельм «подскреб» все имевшиеся резервы.

*Падобныя абвесткі ў красавіку 1920 г. былі парасклейваны па ўсёй Беларусі. Некаторыя прозвішчы ў дакуменце адрозніваюцца ад іх правільнага напісання.

Наследие слуцкого края

У барацьбе супраць захопнікаў

З успамінаў П.Н.Грыцкевіча


ГРЫЦКЕВІЧ Пётр Навумавіч, нарадзіўся ў 1897 г. у в. Варкавічы Слуцкага павета. У 1912 г. закончыў Лучнікоўскае двухкласнае і прадоўжыў вучобу ў Слуцкім вучылішчы. З 1916 г. па 1917 г. у царскай арміі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі вярнуўся ў родную вёску, дзе працаваў сакратаром валаснога рэўкома. У 1918 г. здаў экзамен на званне настаўніка народнай школы. У гады польскай акупацыі (1919—1920) — член валасной падпольнай партыйнай ячэйкі, партызан Слуцкага партызанскага атрада. Удзельнік абедзвюх падпольных слуцкіх павятовых канферэнцый. З 1920 г. член Камуністычнай партыі. Прымаў удзел у вызваленні Слуцка ад польскіх акупантаў.

Дэлегат X, XII, XIV з'ездаў КП(б)Б. Быў членам ЦВК БССР. З 1921 г. па 1941 г. на партыйнай і педагагічнай рабоце ў Слуцку і Мінску. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце: камісар асобнага сапёрнага батальёна. Загінуў на Заходнім фронце на пераправе цераз Дняпро каля в. Салаўёва ў кастрычніку 1941 г.

Десятого августа 1919 года поляки заняли Слуцк. Для нелегальной работы в городе была оставлена группа партийцев и создан уездный подпольный комитет Коммунистической партии. В деревнях Слуцкого уезда начали создаваться подпольные большевистские ячейки. Осенью 1919 года и в нашей деревне Варковичах организовалась волостная ячейка партии. Нас было всего несколько человек. Руководил нами член уездного комитета Иван Иванович Бочко. Наша волостная ячейка охватывала деревни: Варковичи, Лучники,



Помнік 14 слуцкім партызанам. 1926 г. Знішчаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



Помнік 14 слуцкім партызанам. Пастаўлены на вул. Камсамольскай у 1970 г. замест знішчанага.

Наследие слуцкого края



П.Н.Грыцкевіч.

Серяги, Безверховичи, Подлипцы, Ушаловичи, Василинки, Бокшицы, Браново. Мы призывали население не давать наглым захватчикам ни продовольствия, ни денег, ни людей для работы. Наши призывы находили живой отклик у крестьян, которые уже испытали все ужасы хозяйничания польских панов.

На окраине Слуцка в маленьком домике девушка-коммунистка печатала на пишущей машинке воззвания, листовки. Члены ячейки расклеивали эти воззвания на видных местах в окружающих деревнях, разбрасывали листовки и в городе, особенно по базарным дням. Волостная ячейка поднимала и организовывала крестьян на вооруженную борьбу против поляков.

Как мы работали? Сперва мы находили надежных людей. Мы объясняли такому надежному человеку наши задачи, затем давали ему винтовку, обязывали хорошо спрятать ее и быть готовым в любую минуту выступить. Таким образом в Варковичах и Серягах организовался партизанский отряд — 28 партизан, вооруженных винтовками и имевших к ним по нескольку десятков патронов. Желающих уйти в партизаны в окрестных деревнях было много, но на всех не хватало оружия.

В начале 1920 года в Слуцке состоялась 1-я уездная подпольная конференция большевиков. Она проходила в доме на углу Болотной и Копыльской улиц. Съехались представители со всего уезда. К тому времени почти во всех волостях уже существовали подпольные ячейки. На конференции все делегаты заявили, что крестьяне поддержат открытое выступление против оккупантов. Один из партизан-партийцев говорил на конференции:

— Народ подготовлен. Дайте только приказ, мы соберем крестьян и возьмем Слуцк.

Уездная конференция дала указание усилить работу по подрыву тыла польской армии. Делегаты вернулись в свои отряды, и с весны 1920 года участились случаи порчи военного имущества оккупантов, разрушения железнодорожных путей, взрыва мостов.

Помню, наш отряд получил задание повредить телеграфную линию. Нам удалось перерезать провода и повалить столбы на расстоянии двух-трех километров. Польское командование прислало в Варковичи карательную экспедицию. Каратели забрали у крестьян скот, дочиста ограбили деревню и наложили большую контрибуцию. Это вызвало возмущение крестьян не только в Варковичах, но и в других деревнях.

В апреле 1920 года в Слуцке произошел большой провал. В домике сторожихи театра Соловейчика шло уездное совещание партизан. О нем пронюхали жандармы. Сторожка была окружена, и участники собрания арестованы.

Мы, в Варковичах, узнали об этом на другой день. Уездный комитет партии предложил отряду быть наготове. Боясь провала, мы предложили партизанам вместе с молодежью уйти в воробьевские леса. Партизаны перешли на нелегальное положение, спали не дома, а на гумнах и в лесу.

После слуцкого провала нашей ячейке было поручено перенести оружие в более надежное место. На потайном складе в Слуцке были запрятаны винтовки, патроны, бомбы, литература. И вот однажды ночью человек десять коммунистов и партизан направились в Слуцк и всю ночь переносили свой опасный груз. Оружие и литература были спрятаны по деревням, в огородах, на гумнах. Польские власти считали, что они покончили со слуцкими большевиками. Но уже к 1 мая почти по всему уезду и по городу были расклеены воззвания коммунистической партии и разбросана литература.

В июне 1920 г. состоялась 2-я Слуцкая уездная конференция большевиков. Место для нее было выбрано километрах в пяти от Слуцка, на болоте. Кругом, во ржи, стояла охрана: несколько партизан, вооруженных винтовками. На конференции

Наследие слуцкого края

присутствовал представитель ЦК Коммунистической партии Литвы и Белоруссии.

Поздно ночью, поодиночке собрались в указанное место человек двадцать делегатов от волостных партийных организаций. Далеко от места сбора встречали их члены уездного комитета и надежные партизаны. На конференции стоял вопрос о подготовке к открытому выступлению против поляков при приближении Красной Армии к Слуцку. Мы уже знали, что на Украине конница Буденного гонит поляков. Недаром оккупанты с таким озлоблением и остервенением набрасывались на крестьянство, отыскивали партизан, подвергая уничтожению целые деревни.

На случай выступления мы заранее заготовили из материи красные звездочки, чтобы иметь в этот момент отличительные знаки. Звездочки хранились на гумне, под соломой.

Когда началось июльское наступление Красной Армии, из уездного комитета пришел Бочко и предложил отряду немедленно собраться.

— Ну, товарищи, мы двигаемся на Слуцк, нужно выбить оттуда поляков и защитить город от полного разрушения, — сказал он.

Партизаны вышли на улицу с винтовками и выстроились в колонну. Крестьяне, женщины, дети плакали от радости, целовали и обнимали партизан. Матери говорили сыновьям: «Идите, сынки, бить поляков, чтобы они больше не вернулись!»

Наш отряд под командой Бочко вошел в Лучники. Здесь мы убили полицейских и солтыса и направились к Слуцку. Оккупанты жгли и разрушали город. Население попряталось на чердаки и в подвалы. Всю ночь с 14 на 15 июля через город спешно отступали польские части, все грабя и поджигая на своем пути. Они подожгли коммерческое училище — трехэтажное здание. Был взорван и подожжен вокзал, разрушены пути. Некоторые дома были облиты смолой и подожжены. Расположившись на другом берегу, враг начал обстреливать горящие кварталы.

Огнем было уничтожено более 150 домов по улицам Володарского, Комсомольской и Юрьевской, жертвами огня становились и люди.

Увидев партизан на улицах города и узнав от своей разведки и подходе частей Красной Армии, польские войска отступили к Пинску. Наш отряд занял учреждения, железнодорожную станцию. Был выделен начальник по охране складов. В город вступили части 2-й дивизии. Впереди шел броневик. Красноармейцев и партизан радостно встречали, ликование охватило всех трудящихся Слуцка. Мы не могли продвигаться вперед: нас обнимали, слезы радости катились по лицам.

2-я дивизия двинулась дальше преследовать отступающего врага. Партизаны к ней присоединились. Члены уездной партийной организации отправились по волостям Слуцкого уезда для организации ревкомов.

Друкуецца па кн.: Белоруссия в борьбе против польских захватчиков в 1919—1920 гг. Мн., 1940. С. 133—137.

Варкавіцкая ячэйка дзейнічала

З успамінаў М.К.Шыловіча, удзельніка барацьбы з польскімі акупантамі ў 1919—1920 гг.

ШЫЛОВІЧ Міхаіл Кузьміч, нарадзіўся ў в. Варкавічы ў 1900 г., член КПСС з 1920 г., вучыўся ў Маскве ў Пятроўскай (Ціміразеўскай) акадэміі (1925), абараніў кандыдацкую дысертацыю (1937), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Працаваў і жыў у Маскве.

У канцы жніўня 1919 г. да мяне ў вёску наведаўся Міхаіл Юшкевіч, якога я добра ведаў па гімназіі, і прапанаваў прыняць удзел у рабоце падпольнай камуністычнай арганізацыі супраць польскіх захопнікаў. Пры гэтым сказаў, што ў Варкавічах ужо дзейнічае падпольная камуністычная ячэйка, а яе арганізатарам з'яўляецца Іван Цімафеевіч Валетка. Я даў згоду. Усяго ў Варкавіцкай ячэйцы было восем чалавек, акрамя мяне: Іван Цімафеевіч Валетка, Дзмітрый Цімафеевіч Валетка, Хрысанф Лаўрэнцьевіч Дубалека, Пётр Навумавіч Грыцкевіч, Дзмітрый Навумавіч Грыцкевіч, Іван Мікалаевіч Басалыга, Пётр Іванавіч Лістапад, Рыгор Мацвеевіч Чуйко. У сусед-

Наследие слуцкого края

няй в. Сярагі таксама была падпольная ячэйка, арганізатарам і кіраўніком якой быў А.І.Шклярэўскі. Павятовую падпольную камуністычную арганізацыю ўзначальваў камітэт у складзе старшыні І.І.Бачко, сакратара М.В.Юшкевіча і члена У.Баглаева.

Камітэт арганізаваў барацьбу супраць ворагаў, а таксама друкаванне і распаўсюджванне лістовак. Помню, найбольш масавым і актыўным было распаўсюджванне іх у пачатку красавіка 1920 г. перад Вялікаднём. Да нас у вёску з горада лістоўкі дастаўляў В.В.Паповіч. Але у тым жа месяцы польскай дэфензіве ўдалося напасці на след Слуцкай падпольнай арганізацыі. Была арыштавана машыністка Маня Ярха, зроблены аблавы на многіх явачных кватэрах. М.В.Юшкевіч прапанаваў на гэты час камітэту перабрацца ў Варкавічы. Явачнай кватэрай фактычна тут стала старое гумно, да якога было зручна дабірацца, асабліва ноччу.

У многіх вёсках павета былі створаны партызанскія атрады, якія ажыццяўлялі дыверсіі — рвалі тэлефонную сувязь, грамілі паліцэйскія ўчасткі, падпальвалі склады і масты і г.д. Так, на мінскім гасцінцы паміж вёскамі Васілінкі і Хранова, варкавіцкімі і сяражскімі партызанамі на вялікай адлегласці былі зрэзаны тэлеграфныя слупы, правады.

У канцы мая М.В.Юшкевіч быў накіраваны павятовым падпольным камітэтам для асабістай сувязі і атрымання дырэктыў у штаб Заходняга фронту. Пасля вяртання ён мне сказаў, што ў бліжэйшы час патрэбна правесці 2-ю павятовую канферэнцыю і выбраць для яе прывядзення месца. Разам з ім мы агледзелі месца ў 2 км на захад ад вёскі, на забалочаным лузе. Канферэнцыя была прызначана на першую палавіну чэрвеня. І вось настаў той дзень. Сабраліся члены падпольнага павятовага камітэта і прадстаўнікі ваенных партыйных арганізацый. Удзел прынялі і камуністы партыйных ячэек вёсак Варкавічы і Сярагі. Праходзіла канферэнцыя пад аховай мясцовых партызан. М.В.Юшкевіч расказаў прысутным аб сваім наведванні штаба, паснаёміў з атрыманымі там інструкцыямі, расказаў, якімі павінны быць дзеянні партызан пры падыходзе Чырвонай арміі.

Хутка пасля канферэнцыі па даручэнні Юшкевіча мною са Слуцка ў Варкавічы быў дастаўлены сцяг, які знаходзіўся ў Баглаева. На чырвоным палотнішчы былі нашыты чорнымі літарамі словы «Смерць паразітам». Крыху пазней на часовае захоўванне мне былі перададзены чырвоныя зорачкі. З Жукава ў Варкавічы Дз.Грыцкевічам і І.Басалыгам былі дастаўлены вінтоўкі, а Дз.Валетка і Х.Дубалека прывезлі тры скрынкі патронаў.

У пачатку ліпеня 1920 г. польскія акупанты асабліва лютавалі ў сувязі са сваімі няўдачамі на фронце. Палілі вёскі, адбіралі ў насельніцтва коней, забівалі людзей і г.д. Нам, партызанам, быў дадзены загад — знаходзіцца ў баявой гатоўнасці, несці ўзброеную ахову вёскі ў начны час, а пры спробе падпаліць яе даць адпор. Ноччу з 14 на 15 ліпеня ў многіх месцах віднеліся сполахі пажараў, у Слуцку — таксама. Назаўтра да нас прыскакаў на кані сувязны Ваданосаў і перадаў, каб мы накіроўваліся ў Слуцк. Хуценька прышылі мы на левыя рукавы зорачкі і, узброеныя, накіраваліся ў горад. Набліжаліся да горада часці Чырвонай арміі, партызаны захапілі станцыю і другія ўстановы. Вораг спешна адступаў. У гэты ж самы дзень у гасцініцы «Брыстоль» быў арганізаваны рэвалюцыйны камітэт на чале з І.І.Бачко.

Гэта было ў дваццатым

...15 ліпеня 1920 года 1-ы і 23-ы аўтабронеатрады, сфарміраваныя ў Петраградзе напярэдадні Кастрычніцкага ўзброенага паўстання, прайшлі тысячы кіламетраў франтавымі дарогамі па Украіне, Паўночным Каўказе, лясах і балотах Пскоўшчыны, падышлі да ракі Случ. Мост цераз раку быў спалены.

Аляксандр Манахаў і Мікалай Сяргееў вылезлі з машын, памыліся, прыселі, пачалі абдумваць, як фарсіраваць раку.

Падышоў селянін з суседняй вёскі. Ён і паказаў драўляны мост, па якім чырвоныя байцы маглі прайсці на браневіках.

Зараўлі маторы, браневікі папаўзлі поплавам. З вёскі навыперадкі беглі хлапчукі.

— А ну, хлопцы, падсабляйце! — весе-

Наследие слуцкого края

ла гукнуў Аляксандр Манахаў, загадаўшы дзецям кідаць усялякае ламачча на мост. Работа кіпела. Аляксандр скінуў прамаслены камбінезон, працаваў у адной цяльняшцы (памяць аб Балтыцы, дзе служыў матросам на кананерцы).

Браневікі пачалі асцярожна перапраўляцца на другі бераг, а селянін ішоў наперадзе, рукамі паказваў вадзіцелю, як лепей праехаць. Хлапчукі весела пасаблялі сталёвым машынам і запіхвалі за шчокі перасыпаны тытунём, прапахлы машынным маслам сіняваты цукар — частунак дзядзькі ў «паласатай кашулі».

Зноў знаёмы гасцінец. Апусцелі вуліцы Слуцка. Дзе ж вораг?.. За ўзгоркам жаўцеў пыл: вораг адступаў. У бінокль было відаць, як пагойдваліся гарматы: атакаваць у лоб нельга — можна было напароцца на агонь артылерыі.

Прынялі рашэнне: дзвюм машынам абысці калону з левага флангу, машыне Манахава — з правага, а ў раёне вёскі Бязверхавічы ўдарыць з двух бакоў.

— Па машынах! — прагучала каманда.

Бранявік Манахава звярнуў управа і пакаціўся па пыльным прасёлку. Абапал даспявала збажына, у небе не змаўкалі жаўранкі. Аляксандр адкрыў люк машыны, з асалодай уздыхнуў водар палеткаў. Голас вадзіцеля Мікалая Самета вывеў яго з задумення.

— Таварыш камандзір, бачу калону.

— Я таксама бачу, — адказаў Манахаў, закрываючы люк машыны і кладучы далоні на рукаяткі кулямёта.

А па гасцінцы кіламетры на два расцягнулася чужая, варожая пяхота, кавалерыя, абозы — пілсудчыкі везлі нарабаванае барахло.

Задрыжаў у руках Манахава «максім», па сталёвым корпусе машыны градам забарабанілі стрэляныя гільзы. А на гасцінцы ўсчаўся вэрхал: коні ўздыбіліся, пачалі перакульваць павозкі, вырывацца з рук жаўнераў, кідацца ў поле. Салдаты падалі ў дарожны пыл, вялі беспарадкавы агонь па браневіку, а бранявік біў і біў з кулямёта бясконцымі чэргамі.

Захапіўшыся боем, Манахаў не заўважыў, як пілсудчыкі павярнулі ў яго бок гарматы. Зусім побач разарваліся снарады, па машыне забарабанілі асколкі. Прамым



Аляксандр Манахаў.



М.М.Сяргееў.

пападаннем снарада развярнула матор, шыбанула полымя. Экіпаж пакінуў машыну, стаў адпаўзаць у жыта.

Калі рассеяўся дым і пыл, Манахаў ляжаў ніцма, па яго шырокай спіне расплывалася чырвоная пляма. Асколак снарада скасіў байца напавал. Сябры падхапілі камандзіра, вынеслі з поля бою. З другога боку нарастала яшчэ больш частая страляніна — гэта падышлі два другія браневікі: яны завяршылі разгром калоны.

М.Сяргееў пісаў у сваіх успамінах: «Хавалі Манахава на другі дзень, 16 ліпеня 1920 года. Паставілі труну з целам нябожчыка на бранявік «Вораг капіталу», які папрасілі ў камандавання суседняга, 1-га аўтабронеатрада. Гэта быў той самы легендарны бранявік, з якога 3 красавіка 1917 года, пасля вяртання з эміграцыі, Уладзімір Ільіч Ленін выступаў перад рабочымі, салдатамі і матросамі на Фінляндскім вакзале. Цяпер на ім везлі ў апошні час баявога таварыша. Тым красавіцкім днём семнаццатага года ён таксама быў на вакзале, слухаў Ільіча, пакляўся выканаць яго запаветы і загінуў як герой рэвалюцыі...

Іграў палкавы аркестр, уздоўж вуліцы Шасейнай (цяпер вуліца імя У.І.Леніна) стаялі сотні гараджан. Многія плакалі. Жалобны картэж накіраваўся да гарадскога саду, дзе Манахава і пахавалі. Пазней мне стала вядома, што па рашэнні гарадскіх улад сад назвалі імем героя. На другі дзень наш бронеатрад працягваў наступленне ў бок Баранавіч...

М.Кутнявецкі.

Літаратура і мастацтва. 1970. 20 лют.

Наследие слуцкого края

Падзеі на Случчыне ў 1920 г.

(Слуцкае паўстанне)

КАНЕЦ САВЕЦКА-ПОЛЬСКАЙ ВАЙНЫ 1919—1920 гг.

Слуцкае паўстанне адбылося ў самым канцы грамадзянскай вайны ў лістападзе—снежні 1920 года. У гэты час яшчэ не скончылася савецка-польская вайна. 12 кастрычніка 1920 года ў сталіцы Латвіі Рызе быў заключаны дагавор аб перамір'і і прэлімінарных (папярэдніх. — *А.Г.*) умовах міру паміж РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай — з другога. Але фармальна стан вайны яшчэ працягваўся. А ў сталіцы Латвіі працягваліся перагаворы, каб заключыць канчатковы мір.

Кіраўнік савецкай расійска-ўкраінскай дэлегацыі ў Рызе А.А.Іофэ не дапусціў прадстаўніка БССР А.Чарвякова да перагавораў, сказаўшы яму, што калі спатрэбіцца, то савецкі бок перадасць усю тагачасную тэрыторыю Беларусі (шэсць паветаў былой Мінскай губерні — да Барысава, Бабруйска і Мазыра ўключна) Польшчы. І сапраўды, А.Іофэ, згодна з інструкцыяй урада РСФСР, пранаваў Польшчы гэтую тэрыторыю, каб толькі спыніць наступленне польскіх войск на ўсход. Аднак старшыня польскай дэлегацыі Ян Домбскі адмовіўся ад гэтага падарунка, бо Польшча лічыла немэтазгодным уключаць вялікую (разам з Заходняй Беларуссю) тэрыторыю з беларускім насельніцтвам у склад Польскай дзяржавы.

Паводле дагавора ад 12 кастрычніка 1920 года Заходняя Беларусь перадавалася Польшчы. Дзяржаўная мяжа вызначалася па Заходняй Дзвіне, потым праходзіла на захад ад Ветрына, Ушачаў, Бягомля, Плешчаніц, Заслаўя, Негарэлага, Капыля, Цімкавічаў, Семежава, Вызны (цяпер Чырвоная Слабада), Старобіна і Турава. За гэтую лінію павінны былі адысці польскія войскі пасля ратыфікацыі (зацвярджэння) дагавора аб перамір'і.

Аднак, паводле дагавора, ваенныя дзеянні спыняліся толькі праз шэсць дзён пасля падпісання дагавора, гэта значыць 18 кастрычніка. А за гэты час польскія войскі ўзмацнілі тэмп наступлення, якое працягвалася пасля паражэння савецкіх армій пад Варшавай у жніўні 1920 года. У сярэдзіне кастрычніка 1920 года польскія войскі наступалі ўжо на ўсход ад дзяржаўнай граніцы. Яны 15 кастрычніка часова занялі Мінск, 11 кастрычніка — Слуцк і прасунуліся на ўсход ад яго на 25 кіламетраў. На поўдні захапілі Тураў.

Паводле ўмоў перамір'я, савецкія войскі пасля спынення ваенных дзеянняў, гэта значыць у 24 гадзіне 18 кастрычніка, павінны былі яшчэ адысці ад лініі фронту на 15 кіламетраў, каб стварыць нейтральную зону.

Такім чынам, значная частка тагачаснай БССР была або ў зоне польскай акупацыі («другая польская акупацыя», першая была ў 1919—ліпені 1920 года), або ў нейтральнай зоне і не кантралявалася савецкай уладай. Але па ўмовах перамір'я польскія войскі пасля ратыфікацыі дагавора павінны былі адысці, у сваю чаргу, за лінію дзяржаўнай граніцы.

НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ НА СЛУЧЧЫНЕ

Слуцк і Слуцкі павет былі асяродкам дзейнасці беларускага нацыянальнага руху. Тут і раней была моцная нацыянальна-вызваленчая традыцыя, якая падтрымліваліся ідэямі незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі. Яшчэ ў 1918 годзе ў Слуцку быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт, адкрыта беларуская гімназія. Частка інтэлігенцыі займала актыўныя патрыятычныя пазіцыі.

Трэба адзначыць і палітычную пазіцыю беларускага сялянства, якое было падманута палітыкай бальшавікоў у аграрным пытанні. Як гэта ні парадаксальна гучыць, аграрная палітыка, у тым ліку і ў галіне падаткаабкладання, якую праводзілі нямецкія (у 1918 годзе) і польскія акупанты (у 1919—1920 гг.) была не такой жорсткай, як палітыка ваеннага камунізму з амаль поўнай канфіскацыяй ураджаю і жывёлы (харчразвёрстка). Усе гэтыя абставіны толькі абвастралі сітуацыю і незадаволенасць беларускага сялянства, якое не прызвычаілася да гэтай палітыкі савецкай улады. Сялянства Случчыны таксама займала патрыятычныя пазіцыі.

Асноўнай сілай Слуцкага паўстання было сялянства. А актыўным элементам, які

Наследие слуцкого края

падняў сялянства на барацьбу за нацыянальную незалежнасць і супраць сацыяльнага прыгнёту, была свядомая беларуская нацыянальная інтэлігенцыя. З лета 1920 года ў Слуцку дзейнічаў камітэт партыі беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў), якая не мела аніякага дачынення да расійскай партыі асэраў, бо выйшла з Беларускай сацыялістычнай грамады.

Адразу пасля заняцца Слуцка ў кастрычніку 1920 года польскімі войскамі («другая польская акупацыя») Беларускі нацыянальны камітэт узнавіў сваю дзейнасць. Аднак сярод беларускіх нацыянальных дзеячаў у Слуцку не было адзінства. Тут існавалі групы розных палітычных поглядаў.

Адна з гэтых груп, схільная да супрацоўніцтва з польскімі ўладамі, 2 лістапада 1920 года арганізавала сход («прадстаўнікоў горада» і двух чалавек з вёскі), на якім да старога складу камітэта было дададзена яшчэ сем сяброў. Але стары склад камітэта, у які ўваходзілі ў асноўным беларускія эсэры, не прызнаў паўнамоцтваў некаторых абраных членаў, абвінаваціўшы іх у тым, што яны «русіфікатары».

Нават старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта ў Слуцку лекар А.Паўлюкевіч быў абвінавачаны ў тым, што ён дрэнна гаворыць па-беларуску, а дагэтуль наогул пагардліва ставіўся «да ўсяго беларускага». Гэтая групоўка дзеячаў у камітэце арыентавалася на супрацоўніцтва з польскімі ўладамі і генералам Булак-Балаховічам, да якога беларускія эсэры ставіліся непрыхільна.

Гэта рознагалоссе адмоўна адбілася на далейшым ходзе падзей, бо быў страчаны час для лепшай арганізацыі беларускага войска.

Польскія вайсковыя ўлады даволі позна, толькі ў лістападзе 1920 года, перадалі цывільную ўладу ў Слуцку і павеце Беларускаму нацыянальнаму камітэту. У горадзе былі паднятыя бел-чырвона-белыя сцягі Беларускай Народнай Рэспублікі. Адміністрацыя і гаспадарка перадаваліся ў рукі беларусаў. Але польскія вайсковыя ўлады не дазволілі стварыць нацыянальнае войска, спасылаючыся на ўмовы Рыжскага дагавора. Толькі пачала фарміравацца беларуская міліцыя з пяці тысяч чалавек: 500 чынных, астатнія — у рэзерве міліцыі.

У валасцях Слуцкага павета замест прызначаных польскімі ўладамі войтаў былі створаны беларускія камітэты. Потым такія ж камітэты былі створаны ў вёсках замест прызначаных польскімі ўладамі солтысаў. Такім чынам была выкарыстана дэмакратычная форма мясцовага самакіравання.

З'ЕЗД СЛУЧЧЫНЫ І РАДА СЛУЧЧЫНЫ

Прадстаўнікі беларускіх эсэраў у Слуцку і на Случчыне займалі незалежныя пазіцыі ў дачыненні як да Польшчы, так і да Расіі. Яны вырашылі склікаць з'езд Случчыны, каб устанавіць легальную ўладу. Былі праведзены выбары на з'езд: па пяць прадстаўнікоў ад кожнай воласці і па аднаму прадстаўніку ад беларускіх культурна-асветніцкіх гурткоў, якія існавалі ў горадзе і ў вёсцы.

Першы беларускі з'езд Случчыны адбыўся 14—15 лістапада 1920 года ў Слуцку ў вялікай зале дома Э.Вайніловіча, фундатара Чырвонага касцёла ў Менску. На з'езд сабралася 107 прадстаўнікоў горада Слуцка і 15 валасцей Слуцкага павета з правам пастанаўляючага голасу і 10 прадстаўнікоў — з правам дарадчага.

Кіравалі з'ездам беларускія эсэры. Старшынёй з'езда быў абраны Васіль Русак, а віцэ-старшынёй — Уладзімір Пракулевіч.

14 лістапада з'езд прыняў рэзалюцыю, у якой вітаў Найвышэйшую раду Беларускай Народнай Рэспублікі і заявіў катэгарычна пратэст супраць савецкай улады ў Беларусі «як чужацкай». У рэзалюцыі змяшчаўся заклік «да ўсяго свету і Лігі Нацый аб дапамозе ў стварэнні нашай вайсковай сілы». Асноўным зместам гэтай рэзалюцыі было рашэнне падняць паўстанне «супраць акупацыі» за «незалежную Беларусь».

З'езд Случчыны выбраў раду Случчыны Беларускай Народнай Рэспублікі ў складзе 17 чалавек на чале з У.Пракулевічам, даверыў ёй цывільную ўладу і даручыў арганізацыю нацыянальнага войска. Рада Случчыны лічылася часовым урадавым органам аж да ўтварэння выбранага органа на Беларусі.

На з'ездзе былі абвешчаны патрыятычныя лозунгі, якія адлюстравалі інтарэсы беларускага народа: аб «вольнай, незалежнай дэмакратычнай Беларускай Народнай

Наследие слуцкого края

Рэспубліцы ў яе этнаграфічных граніцах», аб беларускай арміі і беларускім устаноўчым сойме, аб братэрстве ўсіх славянскіх народаў.

Ад 16 лістапада пачалі сваю дзейнасць рада Случчыны з 17 сяброў і яе прэзідыум з пяці чалавек. Старшынёй рады быў абраны Уладзімір Пракулевіч. У складзе рады было восем беларускіх эсэраў — У.Пракулевіч, В.Русак, Асвяцімскі і іншыя. Да іх прымыкалі спачуваючыя ім, такія, як Ю.Лістапад. Другой групай у радзе Случчыны былі прыхільнікі Булак-Балаховіча — А.Паўлюкевіч, паручнік Мацэля і іншыя. Урэшце былі і прадстаўнікі «нейтральных груп».

Першачарговай справай рады Случчыны з'яўлялася фарміраванне войска, дзеля чаго была створана вайсковая тройка з сяброў рады — П.Жаўрыда, капітана Анцыповіча і паручніка Мацэлі, якія спешна пачалі збіраць узброеныя атрады. Іншыя сябры рады займаліся арганізацыяй розных цывільных устаноў.

Слуцкая рада 21 лістапада выдала дэкларацыю, якая заклікала сялянства на барацьбу за «незалежную Беларусь у яе этнаграфічных граніцах» і за «інтарэсы сялянства».

Пры актыўнай патрыятычнай падтрымцы сялянства і гараджан Слуцка рада Случчыны за тры дні сфарміравала з добраахвотнікаў «1-ю Слуцкую брыгаду стральцоў войск Беларускай Народнай Рэспублікі» ў складзе двух палкоў: 1-га Слуцкага і 2-га Грозаўскага.

Фарміраванне войска рабілася паспешна, бо, паводле ўмоў прэлімінарнага мірнага дагавора, польскія войскі павінны былі хутка адысці за лінію граніцы. Вывад польскіх войск пачаўся толькі пасля падпісання спецыяльнага пагаданення (14 лістапада) — з 22 лістапада. У раёне Слуцка гэты адвод войск адбываўся ў апошняй дэкадзе лістапада 1920 года.

24 лістапада 1920 года польскія войскі пакінулі Слуцк. 29 лістапада савецкія часці выйшлі на новую для іх дэмаркацыйную лінію: мястэчка Вызна — мястэчка Леніна, заняўшы горад Слуцк. Паміж дзяржаўнай граніцай і дэмаркацыйнай лініяй савецкіх войск утварылася 15-кіламетровая нейтральная паласа. Такая ж 15-кіламетровая нейтральная зона была і на польскім баку. Дэмаркацыйныя лініі і нейтральная зона існавалі да падпісання канчатковага мірнага дагавора ў сакавіку 1921 года.

Слуцкая брыгада разам з радай Случчыны адышла на захад, у мястэчка Семежава, якое знаходзілася ў нейтральнай зоне (прыкладна ў 8-мі кіламетрах ад граніцы). Тут да канца лістапада 1-ы Слуцкі полк быў сфарміраваны, а фарміраванне 2-га Грозаўскага палка ўжо амаль закончылася.

Колькасны склад Слуцкай брыгады, як сведчыла гродзенская газета «Беларускае слова» (27 лістапада 1920 года), складаў чатыры тысячы чалавек. Лічба ж дзесяць тысяч улічвала і рэзерв, разам з брыгадай.

На ўсіх зброі не хапала. У пачатку паўстання ў Слуцкай брыгадзе налічвалася ўсяго 300 карабінаў, якія былі перададзены польскімі ўладамі, і 500 вінтовак, што прынеслі самі паўстанцы. Потым, праўда, выявілася, што польскія карабіны былі перададзены са збітымі прыцэламі і для баёў аказаліся непрыдатнымі.

Пасля пачатку паўстання праз Беларускую вайсковую камісію ў Польшчы брыгадзе былі перададзены яшчэ вінтоўкі і кулямёты. Частка зброі была атрымана ад дэзерціраў або ўзята ў баях як трафеі. Усяго ў снежні 1920 года брыгада мела ўжо 2000 вінтовак і дзесяць кулямётаў. Аднак зброі на ўсіх не хапала. Артылерыі ў паўстанцаў наогул не было. Забеспячэнне спачатку, дзякуючы добраахвотным ахвяраванням сялян, было наладжана добра, але потым, па меры скарачэння тэрыторыі пад іх кантролем, пачало пагаршацца.

Камандзірам брыгады рада Случчыны прызначыла аднаго са сваіх сяброў — капітана Анцыповіча. Камандзірам 1-га Слуцкага палка быў прызначаны капітан генеральнага штаба рускай арміі П.Чайка (ураджэнец Случчыны), які да другой польскай акупацыі працаваў на пасадзе памочніка ваеннага кіраўніка Слуцкага павятовага ваенкамата. Камандзірам 2-га Грозаўскага палка стаў капітан Семянюк, які з лютага 1920 года быў камандзірам першага беларускага партызанскага атрада (створанага Беларускай вайсковай камісіяй у Мінску).

Брыгада была пяхотнай, палкі яе падзяляліся на батальёны і роты. У яе складзе знаходзіліся конны атрад, палкавыя абозы і зброевая майстэрня. Быў сфарміраваны і асобны ад брыгады атрад

Наследие слуцкого края

з дзвюх рот. У палках былі створаны свае штабы. Арганізаваны штаб брыгады, аддзелы разведкі і контрразведкі пры ім, а таксама палявы шпіталь і вайсковы суд.

ПАЎСТАННЕ

У канцы лістапада 1920 года 1-ы Слуцкі полк заняў ужо франтавы ўчастак ад мястэчка Семежава да мястэчка Вызна, працягласцю прыкладна 20 кіламетраў.

Баявыя дзеянні слуцкіх паўстанцаў пачаліся 27 лістапада 1920 года. У гэты дзень падраздзяленні 1-га Слуцкага палка рабілі налёты на размяшчэнне часцей 8-й дывізіі Чырвонай Арміі, на яе палявыя каравулы і заставы на дэмаркацыйнай лініі. У наступныя дні паўтараліся безупынныя атакі з нейтральнай зоны не толькі на фронце 1-га Слуцкага палка, але і на ўчастку размяшчэння 2-га Грозаўскага палка. Гэтыя атакі былі асабліва моцныя на фронце Капыль — Цімкавічы — Вызна, ужо працягласцю 60 кіламетраў.

Тады камандаванне 16-й арміі савецкіх войск вырашыла ачысціць нейтральную зону ад паўстанцаў. Польскія ўлады далі дазвол на ўваход 4 снежня савецкіх войск у зону на тры дні. Такім чынам, і польскія ўлады адносіліся адмоўна да паўстанцаў.

Аднак гэтая карная аперацыя Чырвонай Арміі дала мізэрны вынік: было затрымана каля 50 дэзерціраў і 15 перабежчыкаў. Камандаванне Слуцкай брыгады, карыстаючыся падтрымкай мясцовага насельніцтва, вывела свае асноўныя сілы з-пад удару чырвоных войск. Толькі ў раёне Семежава частка атрадаў паўстанцаў была разбіта і 7 снежня перайшла польскую граніцу. Пры гэтым польскія ўлады раззброілі 30 афіцэраў і 400 салдат Слуцкай брыгады.

У гэты час у кіраўніцтве паўстанцаў рознагалоссі прывялі да змены камандавання брыгадай. Камандзір 1-га Слуцкага палка капітан П.Чайка быў арыштаваны па абвінавачванні ў здрадзе. Ён спрабаваў перадаць пакет з сакрэтнымі дакументамі на савецкі бок. Здолеў збегчы з-пад арышту ў Слуцк. Аднак там ён быў таксама арыштаваны за здраду і пасля прыгавору ваенна-палявога суда чырвоных расстраляны.

Рада Случчыны сабралася на надзвычайнае пасяджэнне і пастанавіла змяніць камандзіра брыгады і начальніка контрразведкі. Камандзірам 1-й Слуцкай брыгады 3 снежня 1920 года быў прызначаны штабс-капітан Антон Сокал-Кутылоўскі, а камандзірам 1-га палка — палкоўнік Гаўрыловіч. Камандзіру брыгады рада Случчыны часова перадала дыктатарскія паўнамоцтвы.

Пасля вяртання з нейтральнай зоны на дэмаркацыйную лінію савецкіх часцей паўстанцы зноў пачалі нападаць на перадавыя часці Чырвонай Арміі. Звычайна гэта былі



Сяг 1-га Слуцкага палка. Злева направа: Лявон Вітан-Дубейкаўскі, невядомая, Антон Сокал-Кутылоўскі. Вільня. 1921 г.

Наследие слуцкого края

начныя налёты. Так, у ноч на 10 снежня быў зроблены напад на вёскі Крывасёлкі і Навасёлкі, у ноч на 12-е — на вёску Старынь. Потым паўстанцы зрабілі спробу адцясніць перадавыя часці Чырвонай Арміі з займаемых ёю пазіцый. Быў распачаты наступ на мастэчкі Семежава і Вызна.

У ноч на 13 снежня паўстанцы зноў занялі Семежава, але потым з боем адышлі. Штаб Слуцкай брыгады перамясціўся ў вёску Морач (у 20-ці кіламетрах на захад ад Вызны). У наступных баях у ноч на 18 снежня атрады паўстанцаў зноў занялі Семежава, а ў наступную ноч — Вызна і пасунуліся на ўсход ад яе.

Сабраўшы значныя сілы, раніцай 19 снежня войскі Чырвонай Арміі пачалі свой наступ, каб ліквідаваць узброенае паўстанне. У гэты ж дзень чырвонымі было адбіта мястэчка Вызна. Паўстанцы пачалі адыходзіць на захад да вёскі Смолічы (у 10-ці кіламетрах на захад ад Вызны). 20 снежня яны былі выцеснены да ракі Морач. У той жа дзень чырвоныя выбілі іх і з Семежава.

Зноў польская дэлегацыя ў Рызе дала савецкай згоду на ўвядзенне савецкіх войск у нейтральную зону, нават на польскай тэрыторыі, каб праследаваць паўстанцаў і там.

Штаб Слуцкай брыгады вымушаны быў перабрацца ў вёску Заастравечча (Клецкі раён) каля ракі Лань, за якой стаялі польскія войскі. Сюды збіраліся часці паўстанцаў, якім было нанесена паражэнне. Рада Случчыны прыняла рашэнне перайсці праз Лань.

Перад самым адыходам 1-ы Слуцкі полк за ўдзел у баях атрымаў ад рады палкавы сцяг залацістага колеру. На ім быў надпіс: першы Слуцкі полк Беларускай Народнай Рэспублікі.

Пасля пераходу на тэрыторыю, кантралюемую польскімі войскамі, салдаты Слуцкай брыгады былі раззброены і інтэрніраваны спачатку ў часовым лагеры ў мястэчку Сіняўка (Клецкі раён), потым у лагеры ў Беластоку, а пасля гэтага ў лагеры ў Дарагуску. Яны былі вызвалены з лагера толькі ў маі 1921 года (пасля падпісання канчатковага расійска-польскага мірнага дагавора ў Рызе, у сакавіку 1921 года).

Але са складу брыгады адзін батальён (каля 400 чалавек) на чале са сваімі афіцэрамі застаўся ў нейтральнай зоне для працягу ваенных дзеянняў партызанскага характару асобнымі групамі. Яны працягвалі барацьбу яшчэ доўгі час.

Анатоль Грыцкевіч.

Слуцкі край. 1992. № 93—96.

Гісторыя газетным радком

Газета «Молат», 1917, № 5

Агульны сход Слуцкай арганізацыі РСДРП(б), пасля заслухоўвання даклада аб бягучым моманце, вынес рэзалюцыю, у якой патрабуе перадачы ўлады рэвалюцыйнаму пралетарыяту і бяднейшаму сялянству, перавыбараў Саветаў, захавання на сваіх пастах рэвалюцыйных камітэтаў, якія забяспечаны паўнатой улады ў барацьбе з контррэвалюцыяй, узбраення рабочых, змены контррэвалюцыйнага камандна-га саставу і замены яго выбарным, перадачы зямель памешчыкаў валасным камітэтам і Саветам...

Газета «Плуг і молат», 1919, 17 ліпеня

У сувязі з ажыўленнем баявых дзеянняў на нашым фронце, буржуазія і яе ахвосце распускаюць правакацыйныя і контррэвалюцыйныя чуткі, якія адбіваюцца на абароне Чырвонага фронту. Нашы ворагі — памешчыкі, якія ідуць адбіраць зямлю ў сялян, і капіталісты, якія ідуць адбіраць заводы, фабрыкі і жыццё ў рабочых, імкнуцца да адной мэты: унесці паніку ў нашы рады, раз'яднаць нас, а потым нанесці нам рашучы ўдар. Слуцкі павятовы выканаўчы камітэт, вамі ж выбраны, звяртаецца да вас з заклікам: Не верце гэтым правакацыйным чуткам!

Таварышы, Слуцкі павятовы выканаўчы камітэт заклікае вас пільна сачыць за ўсімі правакатарамі і контррэвалюцыянерамі. Арыштоўвайце іх і накіроўвайце ў Надзвычайную Камісію. Абараняйце вашы правы, вашы інтарэсы, ваша жыццё... Савецкая ўлада моцная і непераможная.

* * *

На ўсходзе мы прагналі Калчака! На поўдні б'ём дзянікінскія банды! Чарга за

Наследие слуцкого края

польскімі легіянерамі! Рабочыя і сяляне! За зброю і — на фронт!

... Мы адкрыта заяўляем усім цёмным сілам, што ў рабочых і сялян хопіць сіл, каб задушыць нікчэмныя рэшткі буржуазіі і яе прыхвасняў. Рабочыя і сяляне ў жорсткай барацьбе са сваімі ворагамі выкавалі волю да перамогі. У той момант, калі абараняюцца правы ўсіх працоўных, калі мы ўступілі ў апошні і рашучы бой, ніякай літасці белагвардзейцам!

Таварышы, Слуцкі павятовы выканаўчы камітэт заклікае вас пільна сачыць за ўсімі правакатарамі і контррэвалюцыянерамі. Арыштоўвайце іх і накіроўвайце ў Надзвычайную камісію. Ахоўвайце вашы правы, вашы інтарэсы, ваша жыццё.

Няхай жыве рабоча-сялянскае права!

Няхай жыве Савецкая ўлада!

Слуцкі павятовы выканаўчы камітэт.

• • •

Адчуваецца недахоп урачоў, медыкаментаў... За чэрвень месяц дэзінфекцыйным атрадам прадэзінфікавана ў Слуцку пасля хваробы тыфам і воспай 77 кватэр, аб'ёмам 477 кубічных сажняў... Атрымана 5000 воспенных прышчэпак, якія размеркаваны па павеце...

• • •

ПРАТАКОЛ АБ'ЯДНАНАГА СХОДУ ПРАЛЕТАРСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ гор.СЛУЦКА

Заслухаўшы даклад аб бягучым моманце і ўлічваючы цяжкае становішча Слуцкага павету, а таксама пагрозу белагвардзейскіх банд гораду, сход членаў пралетарскіх арганізацый гор. Слуцка прызнае безумоўна неабходным падрыхтавацца да адпору белагвардзейшчыне, а таму пастанаўляе:

Неадкладна прыступіць да работы па арганізацыі баявой адзінкі з усіх здольных насіць зброю членаў пралетарскіх арганізацый горада.

Кожны, хто ўхіляецца ў такі цяжкі момант ад выканання гэтай пастановы, лічыцца дэзерцірам з усімі вынікамі.

Усе на барацьбу з белагвардзейшчынай!

Усе на работу па ўмацаванню заваёў рэвалюцыі!

Прэзідыум Выканкама

ПАРТЫЙНАЯ РАБОТА І РАБОТА СЯРОД МОЛАДЗІ СЛУЦКАГА ПАВЕТУ

У павеце ідзе арганізацыйная работа. Утварыліся групы адказных партыйных і савецкіх работнікаў, якія наладжваюць савецкі механізм. Камітэтам Слуцкай арганізацыі рассылаюцца інструктары і многія адказныя работнікі для наладжвання мітынгаў і арганізацыі ячэек па вёсках і валасцях. Сярод моладзі ідэі камунізму сустракаюць значна больш водгукаў. Саюзы моладзі робяць самае добрае ўражанне сваімі высокімі ідэаламі і самаахвяраваннем. Усяго ячэек Саюза Моладзі ў Слуцкім павеце ёсць каля 20 з 400 членамі, прычым лік ячэек расце...

Газета «Советская Белоруссия», 1920, 30 верасня

СООБЩЕНИЕ ОБ ОКАЗАНИИ ПОМОЩИ СЕМЬЯМ КРАСНОАРМЕЙЦЕВ В СЛУЦКОМ УЕЗДЕ

В Слуцком уезде по оказанию помощи семьям красноармейцев всю неделю работало 265 подвод и 578 рабочих. Вспаханы и засеяны поля 577 семей красноармейцев.

Газета «Вясковы будаўнік», 1924, № 1

ЯЧЭЙКА ХАРЧАВІКОЎ

Наша ячэйка налічвае 9 членаў. У сваёй рабоце ячэйка ўзяла правільны курс на работу сярод рабочай моладзі саюзаў. Сходы ячэйкі наведваюць беспартыйныя маладыя рабочыя. Іх бывае 20—30 і больш чалавек.

Асабліва жыва абмяркоўваюцца пытанні, якія закранаюць жыццё і быт рабочага падлетка.

Моладзь раскачалася. Будзем чакаць далейшых вынікаў. Бюро ячэйкі ўважліва сочыць за ўсімі рухамі і ўсё гэта ўлічвае.

Газета «Вясковы будаўнік», 1924, № 2

ЗА ВУЧОБУ

З наступленнем зімы наш камсамол дзейна ўзяўся за арганізацыю вучобы. Гэта работа набывае асабліва важнае значэнне ў сувязі з тым, што больш палавіны нашай арганізацыі складаюць навічкі. Уся вучоба павінна ўключаць тры асноўныя моманты: 1) ліквідацыя непісьменнасці і

Наследие слуцкого края



Б.В.Алешка.



М.Д.Алешка.

малапісьменнасці, 2) палітычная, 3) сельскагаспадарчая адукацыя камсамольцаў.

Лозунг VI з'езда РЛКСМ — «Да XI Міжнароднага юнацкага дня ніводнага непісьменнага камсамольца» — павінен быць выканан.

• • •

ЗМЫЧКА ГОРАДА З ВЁСКАЙ

Гарадская ячэйка шэфствуе над ячэйкай вёскі Шулякі. Спачатку вясковая ячэйка была зусім малалікая. Агульнымі намаганнамі работа шулякоўскай ячэйкі наладзілася. Яна напалавіну выросла за лік батрацкай і бядняцкай моладзі не толькі вёскі Шулякі, але і бліжэйшай вёскі Хранова. Дрэнна толькі адно — ячэйка не мае свайго клуба, і заняткі прыходзіцца праводзіць на прыватных кватэрах. Але ўсё ж мы спадзяёмся, што з нашай дапамогай шулякоўская ячэйка яшчэ больш вырасце, умацуецца і ў свой час будзе заслужана насіць імя ленінскай.

Т.Санюта.

Удзельнікі 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, рэвалюцыйных падзей на Случчыне

Камісія па падрыхтоўцы хронікі «Памяць» правяла вялікую работу па пошуку ўдзельнікаў 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, рэвалюцыйных падзей на Случчыне. Людзі адышлі з жыцця, а дакументаў захавалася мала ці наогул адсутнічаюць. Але з выхадам у свет кнігі «Памяць» не закончваецца пошукавая работа. Безумоўна, будуць новыя адкрыцці, з'явяцца і новыя імёны.

АДЗЯРЫХА Дзмітрый Фёдаравіч, н. у в. Навабелічы, баец 25-й Чапаеўскай дывізіі.

АЛЕШКА Барыс Васільевіч, н. у в. Балотчыцы.

АЛЕШКА Лявонцій Цімафеевіч, н. у 1885 у в. Балотчыцы.

АЛЕШКА Мікалай Дарафеевіч, н. у 1897 у в. Балотчыцы.

АЛЕШКА Нічыпар Мікалаевіч, н. у 1887 у в. Балотчыцы, змагаўся ў 150-м Атаманскім палку пад Дзвінскам, Рыгай, у Літве, дзе быў паранены. У грамадзянскую вайну — кулямётчык 220-га Івана-Вазнясенскага палка 25-й Чапаеўскай дывізіі.

БАГЛАЕВА Аляксандра Іосіфаўна, н. у 1896.

БАНДАРЭВІЧ Якаў, н. у в. Вясея.

БАРДАЧЭЎСКІ Афанасій Іванавіч, н. у 1900 у в. Сярагі.

БАРКОЎСКІ Аляксандр.

БАРОДЗІЧ Гаўрыла.

БАРОДЗІЧ Макар Апісімавіч, н. у 1898 у в. Белічы.

БАРЦЭВІЧ Пётр Паўлавіч, н. у в. Кухты, удзельнік грамадзянскай вайны. У 1917 салдат Слуцкай каравульнай роты, у 1919 начальнік участка міліцыі, у перыяд польскай акупацыі змагаўся ў палку чырвоных камісараў на фронце.

БАСАЛЫГА Дзмітрый Яўхімавіч, н. у в. Сярагі, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне ў 1919—1920. У 1922 старшыня сельсавета, актыўны ўдзельнік калектывізацыі.

БАСАЛЫГА Іван Мікалаевіч, н. у в. Варкавічы.

БАЧКО Іван Іванавіч, н. у 1898 у в. Лапацічы.

БЕРАСНЁЎ Памфіл Емяльянавіч.

БОГДАН Сцяпан Пятровіч, н. у в. Рачкавічы, поўны Георгіеўскі кавалер. Служыў у 99-м пяхотным Іванагародскім палку. У 1914 закончыў школу падпрапаршчыкаў, стаў камандзірам узвода. Узнагароджаны Георгіеўскім крыжам 4-й (1914), 3-й і 2-й (1915), 1-й (1916 за бой каля Смаргоні) ступеней. Памёр у 1964.

БРАНАВЕЦ Пётр Пятровіч.

БУЛАТ Уладзімір.

БУРАК Васіль Мітрафанавіч, н. у 1900 у в. Гольчыцы.

БЫКОЎСКІ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1898 у в. Цалевічы.

БЫКОЎСКІ Іван Мікалаевіч, н. у 1892 у в. Цалевічы.

БЫЧОК Н.А.

БЯЛЬКЕВІЧ, н. у в. Стары Гуткоў.

ВАДАП'ЯН Пётр Данілавіч, н. у в. Старасселле, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случ-

Наследие слуцкого края

чыне, актыўны ўдзельнік арганізацыі калгаса ў в. Шышчыцы. Забіты 9.1.1930. Пахаваны ў Слуцку на гарадскіх могілках.

ВАЙЦАХОВІЧ Цімафей Сяргеевіч, н. у 1896 у в. Цараўцы. Памёр у 1985.

ВАЛЕТКА Дзмітрый Цімафеевіч, н. у в. Варкавічы.

ВАЛЕТКА Іван Цімафеевіч, н. у в. Варкавічы.

ВАРАБ'ЁЎ Пётр.

ВЕНДРАЎ А.М., н. у Слуцку, старшыня РВК у 1918, дэлегат I з'езда КП(б)Б, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне ў 1919–1920.

ВІЧЫК М., н. у Слуцку, загінуў на Паўднёвым фронце ў баях з Урангелем.

ВІШНЯКОЎ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1896 у Саратаўскай губ.

ГАНЧАР Рыгор.

ГАРБАЦЭВІЧ Дзям'ян Пятровіч, н. у в. Чыжоўка.

ГАРБАЦЭВІЧ Фядос Пятровіч, н. у в. Чыжоўка.

ГАРБАШЭВІЧ Аляксандр.

ГАРКАВЫ Антон Іосіфавіч, н. у 1897 у в. Бялевічы.

ГАЎРУК Павел Сямёнавіч, н. у 1873 у в. Шалавічы. Памёр у 1946.

З аўтабіяграфіі вядомага беларускага пісьменніка і перакладчыка Юрыя Паўлавіча Гаўрука

Бацька мой, Павел Сямёнавіч, сялянскага паходжання, з вёскі Шалавічы, кіламетраў дваццаць ад Слуцка... Апроч бацькі ў дзеда майго было яшчэ сямёра дзяцей, а ўсяго — пяць сыноў і тры дачкі. Дочкі павыходзілі замуж, а сыны, за выключэннем малодшага Якава, распаўзліся па свеце шукаць свайго шчасця... на дробненькім сялянскім надзеле пракарміцца яны не маглі. Павел Гаўрук быў забраны ў армію і даволі доўга служыў звыштэрмінова, а потым, вярнуўшыся ў Слуцк, прыстаў у прымы да Еўдакіі Максімаўны Маскаленка, маёй маці... У 1914 годзе бацьку мабілізавалі на вайну ратнікам апалчэння, і вярнуўся ён у Слуцк аж у канцы 1917 года пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1915 годзе маці, кінуўшы хату, паехала ў бежанцы да бацькі ў горад Пскоў. Там я вучыўся ў другім класе Пскоўскай гімназіі. Першыя страхі ўлягліся, і ў 1916 годзе, па новай, толькі што пабудаванай чыгунцы ад станцыі Урэчча да Слуцка прывезла мяне маці назад у роднае сяло. Пабывалі ў Слуцку і немцы, далася ў знакі і польская акупацыя з рабункамі, падпаламі і гвалтоўным насаджэннем польскасці...

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Пра час і пра сябе: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Мн., 1966. С. 96–97, 99.



Н.М.Алешка.



А.І.Баглаева.



П.П.Барцэвіч.



С.П. Богдан.

П.П.Бранавец.

А.Гарбашэвіч.



А.І.Гаркавы.



Я.П.Голец.

Наследие слуцкого края



П.П.Грэчыц.



В.І.Гук.

ГІЛЬ Фёдар Мартынавіч, н. у 1898 у в. Бязверхавічы.

ГЛАЗУНОЎ Аляксей Абрамавіч, н. у 1892 у с. Міхайлаўскае.

ГОЛЕЦ Якаў Піліпавіч, н. у 1893 у в. Рачкавічы.

ГРАК Дзмітрый Нічышаравіч, н. у в. Ніва.

ГРАК Тарас, н. у в. Гарадзішча.

ГРЫЦКЕВІЧ Дзмітрый Навумавіч, н. у в. Варкавічы.

ГРЫШКОЎ Арсеній Рыгоравіч, н. у 1901 у м. Грэск.



П.С.Гаўрук з жонкай і сынам Юрыем.

ГРЭЧЫЦ Пётр Пракопавіч, н. у 1894 у в. Танежыцы. Змагаўся на Заходнім фронце, потым быў начальнікам пагранзаставы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, медалямі.

ГУБЧЫК П.І.

ГУЗ Марк Рамановіч, н. у Слуцку.

ГУК Васілій Іванавіч, н. у в. Бокшыцы.

ГУК Рыгор Іванавіч, н. у в. Бокшыцы.

ГУРЫНОВІЧ Лука В., н. у в. Кухты.

ГУРЫНОВІЧ Рыгор Пятровіч, н. у в. Кухты.

ГУТКОЎСКІ Валерый Іосіфавіч, н. у 1895 у в. Гольчыцы, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

ГУТКОЎСКІ Мікалай Макаравіч, н. у 1886 у в. Забелы.

ДАМАНСКІ Цімафей Іванавіч, н. у 1898 у в. Малая Падзер.

ДЗЕХЦЯРОВІЧ Іван Іосіфавіч, н. у 1895.

ДЗЯРЭЧА Міхаіл Кірылавіч, н. у в. Варкавічы.

ДУБАЛЕКА (КАРАНЕВІЧ) Іван Еўдакімавіч, н. у 1892 у в. Лучнікі. У 1913 быў прызваны на службу на флот. Узнагароджаны Георгіеўскім медалём, Георгіеўскімі крыжамі 4-й і 3-й ступеней.

ДУБАЛЕКА Хрысанф Лаўрэнцьевіч, н. у в. Варкавічы.

ДУБІНА Трафім Ціханавіч, н. у 1898 у в. Ісерна.

ДУБІНА Ціхан, н. у в. Ісерна.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Ігнат Міхайлавіч, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. За ўдзел у ліквідацыі банды Каратквіча ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Жыў у Слуцку.

ЖАЛУНОВІЧ, жыхар в. Амговічы.

ЖУК Іван, н. у Слуцку.

ЗАЛОГА Андрэй Васільевіч, н. у 1901 на Брэстчыне, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Жыў у Слуцку.

ЗЕНЧЫК Клімянцій Пятровіч, н. у 1898, загінуў.

ЗІНЬКОВІЧ Ігнат Сільвестравіч, н. у 1899 у в. Буда Грэская.

ЗУБАРЫК Аляксандр Тарасавіч, н. у 1895.

ІЛЬІН Фама Іванавіч, н. у 1898 у Варонежскай вобласці, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі. Жыў у Слуцку. Памёр у 1989.

ІЛЬЮКЕВІЧ Іван Мікалаевіч, н. у 1898 у в. Ячава.

КАВАЛЕВІЧ Піліп Цімафеевіч, н. у в. Ніва.

КАЗАК Аляксандр, н. у в. Еўлічы ў 1900.

КАКОЦЬКА Апанас, н. у в. Старцавічы (цяпер в. Знамя).

КАКОЦЬКА Сцяпан Апанасавіч, н. у в. Старцавічы (цяпер в. Знамя).

КАЛБАСНІК Мендзель Пейсахавіч.

КАЛМАНОВІЧ (АСКОЛЬДАЎ) Якаў Лаза-

Наследие слуцкого края

равіч, н. у 1893 у Слуцку. У 1918 камандзір Слуцкага чырвонаармейскага атрада. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга. Жыў у Маскве.

КАЛМАНОВІЧ Яўгенія Карлаўна, н. у Слуцку.

КАЛЯДКА Мікалай, н. у в. Лясуны.

КАЛЯДКА Самуіл, н. у 1893 у в. Лясуны, загінуў у 1919 у баі з Дзянікіным.

КАЛЯДКА Трафім, н. у 1893 у в. Лясуны.

КАПАЧЭНЯ Павел Яўхімавіч.

КАПЛАН Міхаіл Майсеевіч, н. у 1902 у Слуцку, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне ў 1919–1920. Закончыў Маскоўскі лясны інстытут. У Вялікую Айчынную вайну змагаўся на фронце, прымаў удзел у Сталінградскай бітве. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Маскве. Памёр у 1950.

КАПЛАН Хаім Рувінавіч, н. у Слуцку, удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1980.

КАРАКА Ціхан Цярэнцьевіч, н. у 1888 у в. Ісерна.

КАРАНЕВІЧ Іван, н. у в. Цараўцы (цяпер в. Кірава).

КАРОЛЬ Данііла Іосіфавіч, н. у 1894 у в. Лядна.

КАРПОВІЧ Павел Антонавіч, н. у 1903 у в. Стары Гуткоў.

КАСЦЮК Пётр Андрэевіч, н. у в. Кальчыцы.

КАХАНОВІЧ Аляксандр Іларыёнавіч, н. у 1891 у Слуцку.

КАХАНОВІЧ Міхаіл Іларыёнавіч, н. у 1896 у Слуцку.

КОЗАК Кузьма Іванавіч.

КОЗІНЦАЎ-ПРАКОПЧЫК Яўгеній Сцяпанавіч, н. у 1889 у в. Калцэвічы Мінскай губ., удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Камісар першага працоўнага атрада Балтыйскага флоту. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны — упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па эвакуацыі прамысловасці і сродкаў вытворчасці сельскай гаспадаркі. Пасля вайны на партыйнай і савецкай рабоце. У 1950–1959 — старшыня Слуцкага гарвыканкома. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны 1-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі. Жыў у Слуцку. Адна з вуліц горада носіць яго імя. Памёр у 1977.

КРАКАСЕВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1890 у в. Сярагі.

КРАСУЦКІ Мікалай Пятровіч, н. у в. Васілінкі, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, чатырма ордэнамі Айчыннай вайны. Палкоўнік. Памёр у 1975.

КРАЎЧЭНЯ Міхаіл, н. у в. Старцавічы (цяпер в. Знамя).

КРУПКО Адам Сцяпанавіч.

КРЫСЬКО Васіль Максімавіч, н. у в. Еўлічы, бацька беларускага пісьменніка В.Віткі. Закатаваны фашыстамі ў студзені 1943.

КРЭЙНЕС Іосіф Вульфавіч, н. у 1891 у Слуцку, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, дэлегат II



І.Е.Дубалека (Караневіч).



І.М.Емяльянаў.



А.В.Залога.



Ф.І.Ільін.

П.Я.Капачэня.

М.М.Каплан.



Я.С.Козінцаў-Пракопчык.



М.П.Красуцкі.

Наследие слуцкого края



І.В.Крэйнес.



К.Я.Лосік.



І.С.Любачка.



А.П.Махлай.



А.І.Кахановіч (сядзіць справа) з сябрамі-землякамі, удзельнікамі 1-й сусветнай вайны.

Усерасійскага з'езда Саветаў у Петраградзе. Загінуў у 1917 у Маскве.

КУНЦЭВІЧ, н. у в. Стары Гуткоў.

ЛАПЕЦ Малаш Міхайлавіч, н. у в. Ніва.

ЛЕАНОВІЧ Л.П., н. у в. Іграева, прымаў удзел у падаўленні паўстання польскіх легіянераў генерала Доўбар-Мусніцкага.

ЛЕМЕШ Ілья Фёдаравіч.

ЛЕМЕШ Рыгор Іванавіч, н. у 1895 у в. Падлессе.

ЛЕШЧАНКА.

ЛЕШЧАНКА Казімір, н. у в. Покрашава, загінуў.

ЛІСТАПАД Пётр Іванавіч, н. у в. Варкавічы.

ЛОСІК Кузьма Якаўлевіч, н. у 1894 у м. Грэск.

ЛЮБАЧКА Іларыён Сямёнавіч.

ЛЯСКАВЕЦ Сямён Дзмітрыевіч, н. у 1893, дэлегат III Усерасійскага з'езда Саветаў.

ЛЯТКОЎСКІ Аляксей Аўдзеевіч, н. у в. Падліпцы.

ЛЯХАВІЦКІ Аляксандр Лук'янавіч, н. у в. Танежыцы, загінуў.

МАГІЛЯВЕЦ Васіль.

МАЛЕЦКІ Андрэй Якаўлевіч, н. у 1887 у в. Вясея.

МАЛІНОЎСКІ Васіль Якаўлевіч, загінуў.

МАРТЫНАЎ Аляксандр Аляксандравіч.

МАРЦІНОВІЧ Ігнат Кузьміч, н. у в. Кальчыцы.

МАХЛАЙ Арцём Пятровіч, н. у 1892 у в. Васілінкі, удзельнік штурму Зімняга палаца, грамадзянскай вайны. З 1913 па 1918 служыў матросам на крэйсеры «Аўрора». З 1918 змагаўся супраць белагвардзейцаў Каледзіна, быў старшынёй атраднага камітэта. Да канца 1919 ваяваў на Паўднёвым фронце на браняносцы «Палтава». Пасля вярнуўся ў родную вёску, прымаў удзел у калектывізацыі. Працаваў у калгасе. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Спяга, медалямі. Памёр у 1978.

МАХУН Цімох.

МІХЕЙКІН Навум Пейсахавіч, н. у Слуцку, загінуў.

МУРАШКА Мікалай Данілавіч, н. у в. Бязверхавічы, загінуў у 1922.

МЯЦЕЛЬСКІ Міхаіл Фаміч.

НЕВАРКА Канстанцін Іванавіч, н. у 1890.

НЭЙМАРК Рафаіл Вольфавіч, н. у 1900 у Слуцку, змагаўся з легіянерамі генерала Доўбар-Мусніцкага. У 1919 г. закатаваны ў палоне.

НЯРОНСКІ Якаў Сафронавіч, н. у 1888 у в. Сярагі.

ПАПОВІЧ Віктар Васільевіч.

ПАСЮКЕВІЧ Мікалай Цімафеевіч, удзельнік савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ПРАКАПОВІЧ Рыгор Міхайлавіч.

ПРАТАСЕНЯ Купрыян Андрэевіч, н. у 1884 у в. Вялікае Быкава, на фронце змагаўся да 1917. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне ў

Наследие слуцкого края

1919—1920. У гады Вялікай Айчыннай вайны з 1943 змагаўся ў партызанскім атрадзе. Потым працаваў у калгасе.

ПРАТАСЕНЯ Сцяпан, загінуў.

ПРАТАСЕНЯ Фёдар, н. у в. Старцавічы (цяпер в. Знамя).

РАДЗЮК Максім Лукіч, н. у 1895 у в. Лесуны.

РАК Пілін Мікалаевіч, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

РАМАНОВІЧ МікалайАнуфрыевіч, загінуў.

РАТНЕР Раіса, н. у Слуцку.

РОСМАН Якаў Герцавіч, н. у Слуцку, загінуў.

РУБІС Ганна Пятроўна, н. у 1893 у в. Раманава (цяпер в. Леніна).

РУДЭНЯ Арцём, н. у в. Балотчыцы, баец 25-й Чапаеўскай дывізіі, загінуў у 1919.

РУСАК Пётр Сцяпанавіч, загінуў.

САВАНОВІЧ Пётр Ксенафонтавіч, н. у 1897 у в. Лучнікі, на фронце з 1916. Закончыў вучэбную радыёкаманду Заходняга фронту і быў радыёінструктарам. У 1917 — радыст Заходняга фронту радыёстанцыі штаба вярхоўнага галоўнакамандуючага М.В.Крыленкі. У 1918 дэлегат Усесаюзнага з'езда работнікаў ваеннага радыётэлеграфа ў Маскве, увайшоў у склад Цэнтральнага савета ваеннага радыётэлеграфа. У сакавіку 1918 ваенны камісар радыётэлеграфа Заходняга фронту. У 1919 пераведзены на Паўднёвы фронт, потым — Туркестанскі. Пасля працаваў у радыёпрамысловасці. Жыў у Маскве.

САЛАВЕЙ Рыгор, за баі з польскімі акупантамі пад Бабруйскам узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

СІНЯГУБ Іван Данілавіч, н. у 1892 у в. Ячава, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, арганізатар партызанскай ячэйкі ў Ячаве. Памёр у 1927.

СКІБРА Мікалай Антонавіч, н. у в. Лядна.

СКІБРА Павел Сцяпанавіч, н. у 1880 у в. Лядна.

СУХАМІЛЬ Рамуальд, н. у 1878 у Слуцку.

СУХАМІЛЬ Эрнст Вільгельмавіч, н. у Слуцку, расстраляны палякамі 15.8.1920.

СУЧОК Ф.П.

СЫЦЬКО Савасцьян.

ТАТАРЫНАЎ, камандзір атрада 17-й дывізіі, загінуў каля в. Замошша ў кастрычніку 1920.

ТРАФІМОВІЧ Антон Іванавіч.

УЛАСЕВІЧ М.А.

УСОВІЧ С.К., н. у в. Лядна, у 1-ю сусветную вайну радавы лейб-гвардыі Фінляндскага палка, прымаў удзел у баях каля г. Збараж Каменец-Падольскай губ., быў паранены. З 1918 у радах Чырвонай арміі, удзельнік грамадзянскай вайны, быў тэлефаністам у Авіяпаветрафлоце (1918—1922).

ФЕРАПОНТАЎ Ю.С., н. у Слуцку, расстраляны 15.8.1919 у Слуцку.



М.Д.Мурашка.



Р.В.Нэймарк.



К.А.Пратасеня.



П.М.Рак.



Г.П.Рубіс.



П.К.Савановіч.



Рамуальд Сухаміль.



М.А.Уласевіч.

Наследие слуцкого края



А.Д.Хацько.



П.Дз.Холад.



Ф.Ф.Чуйка.




М.У.Чыж.



А.С.Шарэшык.



А.С.Шырын.



А.М.Шэйнман.

Брацкая магіла чырвонаармейцаў у в. Белічы, якія загінулі ў 1920 г.

ФІЛІПОВІЧ В., н. у в. Малышэвічы.

ФІЛІПОВІЧ Пётр Мікітавіч, н. у 1896 у в. Малышэвічы, удзельнік трох войнаў, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і 8 медалямі. Памёр у 1983.

ФІСЕНКА, н. у м. Грэск, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

ФУРС Васілій Уласавіч, н. у 1900.

ХАРОШКА Сяргей, н. у в. Балотчыцы.

ХАЦЬКО Аляксандр Дамінікавіч, н. у 1898 у в. Замосце, баец 25-й Чапаеўскай дывізіі.

ХОЛАД Павел Дзянісавіч, н. у 1893.

ХОМІЧ Мікалай Васільевіч, загінуў.

ЦІМІНСКІ (ЦІАМІНСКІ) Аляксандр Канстанцінавіч, загінуў.

ЦІШКЕВІЧ Раман.

ЦЫБУЛЬКА Павел Нічыпаравіч, н. у 1895 у в. Белічы.

ЦЫБУЛЬКА Пётр Кузьміч, н. у 1880 у в. Белічы.

ЦЫБУЛЬСКІ Васіль Гаўрылавіч, н. у 1898 у в. Белічы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЧУБРЫК Іван Дзмітрыевіч, н. у 1899, узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі. Памёр у 1979.

ЧУЙКА Рыгор Мацвеевіч, н. у в. Варкавічы.

ЧУЙКА Філімон Фёдаравіч, н. у 1897 у в. Сяргі.

ЧУМАКОЎ Іван Рыгоравіч, н. у 1902 на Брэстчыне. Памёр у 1978.

Наследие слуцкого края

ЧЫГІР Аляксей Захаравіч, загінуў.

ЧЫГІР ІванАнуфрыевіч, загінуў.

ЧЫЖ Макар Уладзіміравіч, н. у 1886 у в. Вялікая Сліва. Памёр у 1941.

ЧЫЖ Сямён Аляксандравіч, н. у Слуцку. Памёр у турме ў Польшчы ў 1920.

ЧЫРСКІ Якаў Фёдаравіч, н. у в. Рабак.

ШАПІРА Якаў.

ШАРЭШЫК Аляксандр Самуілавіч, н. у в. Прошчыцы.

ШКЛЯРЭЎСКІ Антон Іванавіч.

ШУМАНСКІ Рыгор Раманавіч.

ШЫЛОВІЧ Міхаіл Кузьміч, н. у 1900 у в. Варкавічы.

ШЫРЫН Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1898 у в. Працавічы. Памёр у 1989.

ШЭЙНМАН Абрам Маркавіч, н. у Слуцку, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЭПШТЭЙН Янкель Хаімавіч, н. у Слуцку, загінуў.

ЮРКЕВІЧ Раман Пілішавіч, н. у м. Грэск у 1900.

ЯРОНСКІ Павел Максімавіч, н. у 1896 у в. Малышэвічы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Памёр у 1987.

ЯРХА Марыя, н. у Слуцку, удзельніца барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне ў 1919–1920.

«Папараць-кветка»

«Папараць-кветка», беларускае культурна-асветніцкае таварыства на Случчыне ў 1917–1920 гг. Утворана ў верасні 1917 г. па ініцыятыве С.Бусла і Я.Ракуцькі (першы старшыня таварыства) навучэнцамі Слуцкай земскай гімназіі. Мела 3 секцыі: краязнаўчую, літаратурную і драматычна-харавую. Паводле свайго статута ставіла за мэту прапаганду беларускай мовы, культуры і мастацтва. Знаходзілася пад уплывам беларускіх эсэраў (А.Бараноўскі, М.Асвяцімскі, А.Каўпак, П.Жаўрыд і В.Русак уваходзілі ў кіруючае ядро БПС-Р). У час нямецкай і польскай акупацыі праводзіла падпольную работу. Намаганнямі членаў «Папараць-кветкі» ў Мінску былі выдадзены 2 нумары часопіса «Наша каліна». У 1920 у Слуцку члены таварыства заснавалі беларускі кааператыў «Зара», бюро для беспрацоўных, у сакавіку – ліпені спрыялі арганізацыі беларускіх павятовых настаўніцкіх курсаў. У час польскай акупацыі ў мястэчках і вёсках Слуцкага павета былі ўтвораны 8 беларускіх школ, некалькі сельскагаспадарчых і спажывецкіх кааператываў, чытальні, заснаваны філіі-гурткі. У кастрычніку 1917 г. у Слуцку адбылася першая тэатральная вечарына таварыства, на якой была паказана п'еса Я.Купалы «Паўлінка». За час існавання таварыства на Случчыне ставіліся п'есы Ф.Аляхновіча, У.Галубка, К.Каганца і іншыя; адбыліся канцэрты беларускай народнай песні; дэкламацыі вершаў беларускіх паэтаў. У чэрвені – ліпені 1920 г. драматычны гурток таварыства ўзначальваў У.Галубок. Летам 1920 г. таварыства налічвала больш за 300 чалавек. У ліпені дзейнасць «Папараць-кветкі» была прыпынена польскімі акупацыйнымі ўладамі, адноўлена ў лістападзе 1920 г. Члены таварыства прынялі ўдзел у арганізацыі і рабоце беларускага з'езда Случчыны, на якім была абрана Беларуская рада Случчыны. Актывісты «Папараць-кветкі» ўвайшлі ў 1-ю Слуцкую брыгаду войскаў БНР у час Слуцкага паўстання 1920 г. Таварыства спыніла сваю дзейнасць у снежні 1920 г. з усталяваннем на Случчыне савецкай улады*.

ЛІТАРАТУРА:

1. Беларуская справа пад час польскай акупацыі 1919–1920 гг. // Спадчына. 1994. № 6.

2. Лістапад Юрка. Узбіліся на свой шлях // Там жа. 1998. № 1.

Уладзімір Ляхоўскі.

Друкуецца па кн.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1999. Т. 5. С. 404.

РЭПАРТАЖ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА ПРА ЯГО ПАЕЗДКУ Ў СЛУЦК

З ПАЕЗДКІ Ў СЛУЦАК

Як і ў даўныя часы, Слуцак лічыўся адным з найвыбітнейшых гарадоў Беларусі, так і цяпер у Слуцку грамадзянская справа вельмі бойка пашыраецца і нацыянальная сьвядомасьць паміж сялян і мяшчан далёка вышэй стаіць, чымсь у Менску і па-за межамі яго. [...]

Было 11 ч. ночы, калі я быў ля дзьвярэй Нацыянальнага К-ту.

Беларускі сьцяг і пагоня сьведчылі мне, што тут сяліба слуцкіх беларусаў.

*Паводле алошніх архіўных звестак таварыства «Папараць-кветка» дзейнічала да 1922 г.

Наследие слуцкого края



Сяргей Бусел.

Увайшоўшы ў памяшканьне К-ту, у чытальні я ўбачыў вялікі партрэт Я.Купалы, нарысованы вядомым слуцкім мастаком, Праатцавым, і шмат плякатаў нацыянальнага характару. Усё гэта сьведчыла, што тут працуюць беларусы.

Назаўтра пазнаёміўся з працоўнікамі К-ту, а праз некалькі дзён, убачыў і жыцьцё іх. Аказалася — усе яны безработные і жывуць у вельмі цяжкім становішчы. Працаўнікоў досыць вялікі лік, і, на радасьць, між імі ёсьць два юрысты і археалёг.

Штадня раніцаю ўсе яны зьяўляюцца ў К-т і працуюць, а праца разнахарактарная: выдача кніжак і газэт у чытальню, выдача справак аб ваеннапалонных (задарма), дапамога сялянам у справах юрыдычных і ў справах вызваленьня беларусаў з вастрогу, статыстыка безработных, грашовая дапамога безработным, справа тэатральная, хоральная і інш. Поруч з мужчынскім пэрсоналам удзел у працы прымаюць кабеты і паненкі, каторые гэтак сама бязупыннa працуюць у К-це.

Пры мне быў скарбоначны збор для безработных.

Случчане вельмі прыхільна аднесьліся, і такім чынам сабралі нешта больш за 2000 р.

Раздаваць меліся каталіком, праваслаўным беларусам і жыдом — усім тым, хто зарэгістраваўся ў К-це.

Праца слуцкіх беларусаў вельмі цяжкая, праходзіць пры холадзе і голадзе; ні дроў на апал К-ту ні грошаў ніадкуль ня маюць. Усе тые грошы, каторые зьмятаюць з усіх куткоў, выдаюць за арэнду памяшканьня К-ту (300 руб. у месяц) і на ўтрыманьне некалькіх вучняў гімназістаў (беларусаў), каторые, будучы сіратамі, ня маюць мажлівасьці плаціць за право навукі.

Польская ўлада добра наглядае за беларусамі. Ёсьць і прыхільнікі беларусаў, каторые заўжды стараюцца не перасоліваць; такім зьяўляецца павятовы староста і інш. Слуцкіе беларусы вельмі шануюць іх і рады бываць у іх, верачы ў іх шчырасьць.

У вялікай пашане ў случчан свой тэатр.

У дзень спэктаклю (29 лютага «Праменчык шчасьця») білеты былі раскуплены ўсе. Збор быў 2000—2500 р. Тэатр сам па сабе невялікі — дэкорацыі бедные.

Пьеса ставілася пасьля 3 рэпэтыцый, і праўду кажучы, прайшла нядрэнна. Пэрсонал тэатральны падбіраецца, але брак жаночых сіл. Між іншым пры трупе ёсьць хор, арганізатарам каторага зьяўляецца п. Русак. Хор шмат завучыў песень і часта выступае на сцэне.

Вялікая заслуга п. Русака ў тым, што ён, жывучы пры Слуцку ў вёсцы, запісвае там на ноты песьні і штадня прыходзіць у горад кіраваць хорам.

Запісаных на ноты песень вялікі лік і гэта для тэатру і музыкі беларускай вялікі скарб. Вельмі пажаданым было-б, каб Слуцкіе дзеячы парупіліся аб музэі, і як найхутчэй пачалі-б збор этнаграфічных, археолёгічных і розных гістарычных рэчаў Беларускай зямлі, а Слуцкая зямля гэтым багата.

Гэту справу лёгка можна распачаць, прымаючы пад увагу, што пры Камітэце ёсьць вельмі пажаданы шчыры дзееч К-ту юрыст-археолёг п. Фёдараў, каторы ў імя дарагой бацькаўшчыны не адмовіцца папрацаваць у гэтым кірунку.

Са сьветлымі і дарагамі ўспамінамі я пакінуў Слуцак і лепшых сыноў Бацькаўшчыны.

Беларусь. 1920. 10 сак.

РЭПАРТАЖЫ КАРЭСПАНДЭНТАЎ МІНСКАЙ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСЬ» СА СЛУЧЧЫНЫ ЗА ЧЭРВЕНЬ 1920 г.

10 чэрвеня

КУРСЫ БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА Ў СЛУЦКУ

26-га красавіка сёлетняга году ў Слуцку, для вучыцялёў адчыніліся курсы беларусазнаўства. Вучыцялёў і вучыцялек зьехалася больш за 400 чалавек, з каторых акуратна слухала лекцыі чалавек 350. Апрача вучыцялёў быў невялічкі процэнт на курсах і, так званых, вольных слухачоў —

Наследие слуцкого края

вучняў апошняе клясы сярэдніх школ м. Слуцку (гімназій, рэальнае і камэрцыйнае школы), каторые, згодна з існуючым цяпер правам, могуць быць сапраўднымі вучыцялямі, праслужыўшы, як памочнікі, 3 месяцы пры дазваным вучыцялю. Амаль ня ўсе слухачы былі з Слуцкага пав. І толькі пакрысе было з паветаў Мазырскага, Бабрускага і Баранавіцкага. Склад слухачоў нагул быў добры як з боку пэдагагічнага, так і з беларускага нацыянальнага боку. Відаць было, што людзі запраўды сабраліся, каб пазнаёміцца з сваім родным і скарыстаць з гэтага ў працы на ніве роднае Бацькаўшчыны. На курсах вучыцельскіх беларускае мовы, гісторыі, беларускае літаратуры, польскае мовы, гісторыі Беларусі, геаграфіі Беларусі, пяяньне, тэатр. З лектараў былі Я.Станкевіч, проф. Б.Тарашкевіч, Фр. Аляхновіч, проф. музыкі Іваноўскі і інш. Кіраўніком курсаў быў Я.Станкевіч. Заняткі на курсах адбываліся вельмі акуратна. (...) Для слухачоў быў зроблены інтэрнат у манастырскай будоўлі.

У канцы курсаў быў зроблены экзамен беларускае і польскае мовы. Тыя, што выдзержалі, дасталі пасьведчаньне. Курсы скончыліся 29-га мая.

Перад канчаткам ацец протаіерэй Шамяціла адслужыў малебен, пры гэтым тут жа склалі вельмі добры хор. Пасьля малебну протаіерэй Шамяціла меў па-беларуску да слухачоў і пропаведзь, у каторай сказаў, што Беларусь радзілася ў буру і навальніцу, што яна шмат перацярпела, але выжыла і адраджаецца. Што асабліва цяпер, калі ўсе народы адраджаюцца, павінна і Беларусь адрадзіцца да свайго дзяржаўнага жыцьця. Кожны народ дзяржыцца трыма рэчамі — зямлёю, на каторай жыве, моваю, каторая гамоніць, і верою, што дастаў ён ад продкаў сваіх. Гісторыя Беларускага Народу прайшла ў барацьбе за тры гэтыя рэчы і Беларускі Народ дагэтуль захаваў усе гэтыя сьвятыя для яго рэчы. Мы-ж павінны іх захаваць і перадаць непашкоджанымі новым пакаленьням. Ня ўсе маюць шчасьце працаваць паміж народу. Вучыцялём выпала гэтае шчасьце. Адны з іх увойдуць у Сьвятое, другіе — у Сьвятое Сьвятых свайго народу, але няхай усе помняць, што народ толькі тагды іх прыме, калі яны будуць шчырымі сынамі свайго Беларускага Народу.

Пасьля прамоў курсы скончыліся беларускім гымнам «Не пагаснуць зоркі ў небе, пакуль неба будзе, не загіне край наш родны, пакуль будуць людзі!»

На курсах ня была забыта ім організацыйная праца. Важнейшаю работаю ў гэтым кірунку трэба лічыць арганізаваньне «Беларускага Вучыцельскага коопэратыву Случчыны». (...) Уступная плата 10 мар., паст. — 100 мар. У коопэратыве будуць гмінные (харчавые) і іншые тавары. Адно з галоўных месц зоймуць у іх беларускіе кнігі і пісьменные матэр'ялы і прылады для школ. (...)

Беларускі народны тэатр, каторы ад якогась часу так борзда пашыраецца на Беларусі адбіўся і на курсах у Слуцку. За кароткі час слухачы згулялі ажно тры спэктаклі. Першы раз гулялі «Ня розумам сьцяміў, а сэрцам» — Вясёлага; другі раз «На дарозе жыцьця» і «Антось Лата» — Тараса Гушчы і трэці раз «Бутрым Няміра» і «Янка і Маланка» Фр.Аляхновіча. Апошні спэктакль адбыўся пад рэжысурай самога аўтара (...), каторы прыезджаў з Менску ў Слуцак прачытаць лекцыі аб тэатры.

З працаўнікоў у курсавай адміністрацыі трэба адзначыць сябру Школьнае Рады Случчыны А.Бараноўскага — адзінага мясцовага супрацоўніка ў адміністрацыі. Ён быў загадчыкам гаспадаркі курсаў і шмат палажыў шчырай ідэйнай працы. (...)

В.Я.

22 чэрвеня

ДОПІСЫ З СЛУЧЧЫНЫ

На апошнім пасяджэньні сяброў Беларускага Нацыянальнага Камітэту Случчыны К-т быў падзелен на аддзелы — Адміністрацыйна-арганізацыйны з Юрыст-консульскім Бюро, Школьны, Эконамічкі і Аддзел дапамогі бедным жыхарам і дзецям. Кожным аддзелам кіруе адзін з сяброў прэзідыуму па спэцыяльнасьці. Утворана асобная тэатральная камісія, якая цяпер вядзе рэгістрацыю лепшых тэатральных сіл Слуцку. Дзеля наладжаньня тэатральнай справы, магчыма, што ў хуткім часе выядзе ў Слуцак п. Галубок.

А.Б. [Андрэй Бараноўскі].

24 чэрвеня

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР У ПРОВІНЦЫІ

У суботу 26-га чэрвеня ў Слуцак выязджае вядомы беларускі пісьменнік і арты-

Наследие слуцкого края

ста У.Галубок, гдзе думае прабыць 3 тыдні. За гэты час ён мае з'арганізаваць у Слуцку моцную аматарскую трупу і паставіць 5—6 найвыдатнейшых пьес.

24 чэрвеня ў лікі 40 асоб хор Тэраўскага, які, даўшы ў Слуцку 3 канцэрты, выедзе на павет па маршруту — Рамапава, Нясьвіж, Заміры, Менск. Па дарозе ў мястэчках і вялікіх вёсках будзе даваць канцэрты.

Падрыхтаваў У.В.Ляхоўскі.

Мой лёс

З успамінаў А.Ц.Барысаўца

На Случчыне, як і ў многіх іншых раёнах Беларусі, настаўніцтва складае значную частку мясцовай інтэлігенцыі. Да такой катэгорыі вясковых жыхароў амаль паўстагоддзя належаў і Аляксандр Цімафеевіч Барысавец, які нарадзіўся 2 лістапада 1893 г. у в. Бранава Сяражскага сельсавета ў сям'і селяніна-серадняка і пражыў больш за 80 гадоў.

Акрамя мяне бацькі выхоўвалі яшчэ 6 дзяўчынак. Усяго ж у нашай хаце нарадзілася 11 дзяцей. Чацвёра (дзяўчынкі) памерлі ў раннім узросце. Мы жылі ў канцы вёскі, дзе шырокая раўніна з таямнічымі курганамі ўпіралася ў невялікі лясны масіў. Вясной і летам наша наваколле пакрывалася шматкаляровым раслінным дываном, а зімой — бясконцай белай коўдрай.

Званне настаўніка народных вучылішчаў я атрымаў 1 мая 1913 г. пасля заканчэння экстэрнату пры аўтарытэтнай навучальнай установе — Слуцкай гімназіі. Званне давала права не толькі на працу, але і на нашэнне прыгожай настаўніцкай формы. У час 1-й сусветнай вайны служыў у Царыцыне ў 141-м пяхотным палку пісарам. У 1916 г. горад на Волзе наведаў цар Мікалай II. Так здарылася, што ў тыя дні мяне за маю нядрэнную каліграфію прызначылі перапісваць спісы ўзнагароджаных салдат. Цар з'явіўся ў штаб нашага палка неяк раптоўна. Усе сталі спалохана бегаць, а я працягваў спакойна займацца сваёй справай. Тут і адбылася мая сустрэча з Мікалаем. Ён папрасіў мяне прачытаць на памяць малітву «Ойча наш». Калі я скончыў дэкламаваць, цар падзякаваў за маю набожнасць і падарыў мне пазалочаную шкатулку з гавайскімі цыгарамі. З таго часу я яшчэ помню Керанскага, Леніна, Троцкага. Керанскага многія ў арміі паважалі, бо пры ім змяніліся ў лепшы бок адносіны да салдат. Яго аўтарытэт стаў падаць пасля ўвядзення на фронце пакарання смерцю.

Як сёння, бачу будынак першай Слуцкай школы летам 1925 г. Там адбылася мая сустрэча з Канстанцінам Міхайлавічам Міцкевічам (Якубам Коласам), які прыехаў у Слуцк чытаць лекцыі па методыцы на курсах беларусізацыі. Чытаннем урыўкаў са сваіх паэм «Новая зямля» і «Сымон-музыка» Канстанцін Міхайлавіч тонка паэтызаваў манатоннае вясковае жыццё. Ён напаўняў нашы настаўніцкія душы пачуццём нацыянальнай годнасці.

З 1923 г. па 1929 г. я працаваў настаўнікам і загадчыкам Бранаўскай пачатковай школы. Гэта быў час беларусізацыі, якая супала з увядзеннем новых школьных праграм па мове, гісторыі, матэматыцы, фізіцы, спевах, фізкультуры і г.д. У іх скла-



А.Ц.Барысавец (2-і справа) з настаўнікамі. Случчына. 1914 г.

Наследие слуцкого края

данні прымаў удзел і я. Новыя праграмы спалучалі ў сабе тэарэтычныя веды з практычнымі навыкамі, гэта асабліва выяўлялася ў праграмах для вясковых школ, дзе гэтыя ўстановы з'яўляліся цэнтрамі рашэння і рознага роду земляробчых, культурных і выхаваўчых праблем. Некалькі слоў аб зменах наогул у школьнай адукацыі. Адукацыйная сістэма да Кастрычніка мела нямала станоўчага. Наш Слуцкі павет па колькасці школ і ахопе дзяцей быў у Беларусі адным з лепшых. Перад вайной Мінскае губернскае земства выношвала нават план поўнага ахопу дзяцей школай. У пачатку 1920-х гадоў больш за 30% школьных будынкаў у Слуцкім павеце былі разбураны. І вось у гэтых умовах савецкая ўлада прыступіла да ўвядзення ўсеагульнай школьнай адукацыі. Такая задача пры дапамозе саюзнага ўрада была вырашана ў пачатку 1930-х гадоў.

У 1929 г. я пераехаў з сям'ёй у Цараўцы, дзе працаваў дырэктарам мясцовай няпоўнай сярэдняй школы і выкладаў матэматыку ў 5—7 класах гэтай навучальнай установы. У 1920-я гады я нават і дадумацца не мог да таго, што прыйдзе час, калі беларусізацыя стане адной з прычын крымінальнага абвінавачання людзей у «нацыянал-дэмакратызме», скажэнні нацыянальнай палітыкі, у патаемных сувязях з польскай дэфензівай. Амаль кожныя дзверы нядзелі мы выкрэслівалі каго-небудзь з падручнікаў як ворага народа. Настаўніцтва з сімпатыяй адносілася да старшыні ЦВК БССР А.Чарвякова і старшыні СНК БССР М.Галадзеда. Чарвякоў не аднойчы бываў у Слуцку. Усе добра ведалі яго намаганні палепшыць фінансавае становішча настаўнікаў. І тут раптоўна ўрадавае паведамленне аб яго самазабойстве летам 1937 г., пасля якога з раённага цэнтра прыйшоў загад аб вынясенні партрэтаў Чарвякова са школьных памяшканняў. У памяці назаўсёды застаўся прыезд Галадзеда ў Цараўцы на сход, прысвечаны ўтварэнню калгаса. Сяляне не падтрымалі прапановы ўрада БССР аб абагуленні жывёліны, сельскагаспадарчага інвентару. Аб гэтым нават пісала газета «Звязда». Мікалай Мацвеевіч не толькі не абурыўся на вяскоўцаў, а нават паабяцаў дадаткова разгледзець пытанне на пасяджэнні ўрада. Па невядомых нам тады прычынах гэтыя два чалавекі аказаліся ворагамі народа «за вядзенне контррэвалюцыйнай дзейнасці». Самагубствам скончыў жыццё і Мікалай Мацвеевіч. Аднойчы адна наша маладая настаўніца, вяртаючыся зімой у завею з пасяджэння мясцовага метадычнага аб'яднання, нечакана збілася з дарогі і перайшла савецка-польскую мяжу. Палякі вярнулі яе, нядрэнна пакарміўшы, на нашу тэрыторыю, а мясцовыя ўлады прысудзілі ей некалькі гадоў турмы.

У 1930-я гады завяршылася адзяржаўленне школьнай справы на аснове саюзных праграм. У іх беларускай нацыянальнай культуры, нацыянальнаму духоўнаму жыццю, нацыянальным дзеячам усё больш адводзілася перыферыйнае месца. Складаным пытаннем з'яўлялася праблема працягласці агульнай асветы і часу пераходу да асветы прафесійнай. Народны камісарыят асветы СССР вывучаў гэта пытанне ў Заходняй Еўропе і ў Амерыцы, дзе агульная асвета працягвалася амаль 12—13 гадоў. Прыняцце такой сістэмы для СССР было спрэчным, бо вучні, якія заканчвалі сярэднюю агульнаадукацыйную школу, не заўсёды траплялі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Таму ў аснову рэформы была пакладзена школа-сямігодка. У даваенныя гады аснову адукацыі складалі: дашкольныя ўстановы, чатырохгадовыя пачатковыя школы, сямігадовыя працоўныя школы, школы сялянскай моладзі, школы фабрычна-заводскага вучнёўства, тэхнікумы, вышэйшыя навучальныя ўстановы, навукова-даследчыя кафедры і навукова-даследчыя інстытуты. Безумоўна, у сістэме існавалі і слабыя месцы. Але патрэбен быў час, каб іх ліквідаваць.

Трэба было перажыць Вялікую Айчынную вайну, у час якой я быў сувязным партызанскага атрада, якім камандаваў загадчык Слуцкага райана Змітровіч. Пры абароне Ленінграда загінуў мой старэйшы сын Аляксандар, студэнт аднаго з ленінградскіх ВНУ.

Удзельнічаў у аднаўленні адукацыйнай сістэмы ў пасляваенны перыяд, быў настаўнікам матэматыкі, алгебры, геаметрыі ў Васілінкаўскай НСШ, школе № 1 Слуцка.

Мой настаўніцкі лёс — гэта жыццё і справы маіх шматлікіх вучняў, сярод якіх рабочыя, сяляне, інжынеры, настаўнікі, літаратары, вучоныя, афіцэры і нават адзін генерал.

Запісаў Я.І.Бараноўскі.

Наследие слуцкого края

Каспяровіч на Случчыне*

...У верасні 1922 г. у Слуцкім аддзеле народнай асветы з'явіўся юнак, якому было на той час 22 гады. Накіраванне атрымаў у Наркамаце асветы БССР, дзе сам Усевалад Ігнатоўскі выказаў яму свае пажаданні — стварыць беларускую школу ў павеце. Інспектар сацвыху, па сённяшняй тэрміналогіі — школьны інспектар, такую пасаду атрымаў Каспяровіч. І з незвычайнай энергіяй узяўся за справу.

За тыя паўтара года, што Каспяровіч працаваў на Случчыне, ён зрабіў незвычайна многа, а 1923 год стаўся ці не самым багатым на падзеі як для настаўніцтва, так і для інспектара сацвыху.

Найпершым клопатам было стварэнне матэрыяльнай базы навучання, заключэнне калектыўных дагавораў на частковае ці поўнае ўтрыманне школ насельніцтвам, павышэнне аплаты настаўнікам, забеспячэнне школ падручнікамі, мэбляй, прыладамі, адшукванне сродкаў, прыстасаванне пад школьныя будынкі былых маёнткаў, каб «школы не парыліся ў сялянскіх хатах». Не зусім уласцівая для інспектара праца, але абставіны вымушалі займацца ёй...

Шмат сіл ён прыкладаў для пашырэння беларускай культуры і вывучэння пытанняў краязнаўства, паколькі разумеў, што трэба пачынаць са школы, з настаўнікаў, вучыць іх, дапамагаць, накіроўваць.

У снежні 1922 г. пры Слуцкім АНА была арганізавана камісія беларусазнаўства, якая мела на мэце распрацоўку метадычных пытанняў выкладання беларусазнаўчых дысцыплін у школе, вывучэнне і даследаванне Беларусі, а найперш Слуцкага павета.

За час існавання камісія зрабіла велізарную на той час працу, якая шырока асвятлялася ў друку, найчасцей у газеце «Савецкая Беларусь», куды рэгулярна дасылалі свае допісы мясцовыя карэспандэнты, у тым ліку і інспектар Каспяровіч. Камісар народнай асветы Усевалад Ігнатоўскі пад час наведвання Слуцка ўхваліў працу гэтай камісіі. Яна праводзілася ў двух накірунках: асветнага беларусазнаўства і краязнаўства наогул. У першым накірунку дзейнасць камісіі выявілася ў скліканні сходаў, гарадскіх і павятовых беларусазнаўчых канферэнцый. У краязнаўчым накірунку дзейнасць Слуцкай павятовай камісіі беларусазнаўства выяўлялася ў падрыхтоўцы дакладаў па школьным кнігазнаўстве, выпрацоўцы анкет і праграм, стварэнні музеяў, наладжванні экскурсій і папулярызацыі ідэй краязнаўства. «Усебакова ведаць Случчыну дзеля будавання яе новага жыцця», — такім быў асноўны дэвіз камісіі.

Для выканання гэтых мэт наладзілі цэлы шэраг літаратурных і навуковых лекцый і дакладаў, стварылі лектарскае бюро, арганізавалі гурток самаадукацыі і кароткатэрміновыя курсы.

«Гаворачы аб карыснай дзейнасці камісіі беларусазнаўства, нельга не адзначыць, што ўсю справу арганізацыі камісіі вынес на сабе інспектар школ Слуцкага павета т. Каспяровіч. Кіруючыся заўсёды мэтай уцягнуць настаўніцтва ў жывую творчую працу, ён няспынна склікаў розныя сходы, канферэнцыі, арганізоўваў даклады, лекцыі і наогул гуртаваў настаўніцтва вакол розных навуковых і педагагічна-літаратурных пытанняў. Вынікам яго няспыннай працы мы і бачым ужо акрыяўшы жывы арганізм камісіі беларусазнаўства», — такую ацэнку даў аўтар допісу ў «Савецкую Беларусь» у маі 1923 г.

Значным крокам у распрацоўцы метадычных аспектаў выкладання беларусазнаўчых прадметаў стала павятовая канферэнцыя 15—17 студзеня 1923 г., розгалас аб якой разнёсся па іншых паветах. Асаблівую цікавасць выклікалі інфармацыі з месцаў, у якіх адзначалася, што прадметы беларусазнаўства і выкладання наогул на беларускай мове як вучнямі, так і бацькамі сустракаюцца вельмі прыхільна. Выкладанне прадметаў на роднай мове спрыяе лепшаму засваенню матэрыялу ў параўнанні з выкладаннем па-руску. Школьнікі-небеларусы таксама з ахвотай успрымаюць прадметы беларусазнаўства і часта нават «выпярэджваюць» беларускіх дзетак у гэтым...

На канферэнцыі былі заслуханы выступленні прадстаўнікоў савецкай улады і кампартыі, якія выказалі прыхільныя адносіны да беларусізацыі школы. І настаўніцтва паверыла таму, што, «карыстаючыся роднай мовай, яно здолее падняць куль-

*Мікалай Іванавіч Каспяровіч (9.5.1900, в. Ізабалёва Пухавіцкага раёна — 26.12.1937), беларускі краязнавец, лексікограф, мастацтвазнавец і літаратуразнавец, з 1922 г. інспектар Слуцкага раённага аддзела народнай асветы.

Наследие слуцкого края

туру працоўнага народа, злучыць горад з вёскай і ўсёй сваёй дзейнасцю прыблізіць панаванне камунізму». Але, як паказала жыццё, надзеі былі марнымі. Большасць тых, хто актыўна закладваў падмурак беларусізацыі, былі пазней рэпрэсіраваны, у тым ліку і інспектар Каспяровіч.

Акрамя таго, Каспяровіч загарэўся ідэяй стварэння краязнаўчага музея. «Камісія працерабіла поле існаванню музея радзімазнаўства ў Слуцку», — адзначалася ў газеце. «Сваёй упартасцю ён, дзе толькі мог, разварушваў згуртаванае беларускае настаўніцтва, клічучы іх узяць на сябе ініцыятыву арганізацыі музея», — гэта таксама радкі з допісу. У рэшце рэшт была створана музейная падкамісія пад кіраўніцтвам Каспяровіча.

Перш за ўсё звярнулі ўвагу на ахову помнікаў старасветчыны і мастацтва, якімі была багатая Случчына. З месцаў, дзякуючы разасланым патрабаванням, паступалі звесткі аб старажытнасцях і цікавых з археалагічнага боку мясцовасцях. Ставілася задача збірання і захоўвання тых рэчаў, якія маглі знікнуць. Напрыканцы 1923 г. Слуцкі музей краязнаўства стаў рэальнасцю, а камісія беларусазнаўства была рэарганізавана ў павятовае таварыства краязнаўства.

Але на дасягнутым Каспяровіч не спыніўся. «Трэба абудзіць інструкцыяй і падштурхнуць загадам арганізацыю школьных музеяў радзімазнаўства, грунт для якіх створаны», — пісаў ён у адным з артыкулаў.

Для прыродазнаўчага і гістарычнага вывучэння краю наладжваліся экскурсіі. У шматлікіх паведамленнях адзначалася «няўпыннае старанне», «уважлівыя адносіны» да арганізатара: «Трэба шчырае дзякуй сказаць таварышу Каспяровічу, што ён дабіўся жывой дзейнасці школ павета».

Летам 1923 г. Беларусь рыхтавалася да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве. Заданне збіраць экспанаты атрымалі Інбелкульт і павятовыя камісіі. Інспектары Каспяровіч і Саковіч тэрмінова выехалі ў экспедыцыю. Было сабрана многа экспанатаў: тканіны, вопратка, прылады працы. Зроблены замалёўкі народнага арнаменту. Значную колькасць экспанатаў далі сямігодкі. Ленінская сямігодка атрымала першую прэмію за падрыхтоўку экспанатаў. Сабраны матэрыял скарысталі для арганізацыі павятовай сельскагаспадарчай выстаўкі з багатым этнаграфічным аддзелам.

У допісе «Случчына на выстаўку» М.Каспяровіч пісаў: «Далейшы збор экспанатаў для другой чарговай адпраўкі ідзе. Згоджан лірнік, які, апрача сваіх духоўных вершаў, спявае і свецкія песні: беларускую «Марсельезу», «Жаніўся верабей» і гэтак далей. Рыхтуецца група валачобнікаў, калядоўшчыкаў і інш., адзежа касца, жняі і г.д. Усе экскурсанты са Случчыны маюць быць адзеты ў нацыянальныя вопраткі (беларускія)».

Намаганнямі Каспяровіча была створана паказальная школа на чале з настаўнікам Грозаўскай сямігодкі І.Пратасевічам. Многа хваляванняў выклікала наладжванне быту, падбор памяшканняў. Узнагародай за ўсё была згода Якуба Коласа выкладаць беларускую мову і методыку. Лепшыя «пісоўныя работы» — сачыненні курсантаў — друкавала газета «Савецкая Беларусь». Пераважная колькасць заняткаў вялася на беларускай мове.

Усхвалявана і радасна праводзілі слухачы свята 11 ліпеня — дзень вызвалення ад польскай акупацыі. Яны хадзілі са спевамі па вуліцах, на мітынг, на адкрыццё помніка ахвярам, а ўвечары ставілі спектакль «Страхі жыцця» Ф.Аляхновіча. Перад спектаклем Якуб Колас чытаў аўдыторыі паэму «Новая зямля», чым вельмі задаволіў курсантаў.

А 29 ліпеня на развітальным вечары ў гонар Якуба Коласа Мікола Каспяровіч вітаў песняра — педагога, які яшчэ ў 1905 г. пачаў барацьбу за прынцып навучання дзяцей на матчынай мове, і аўтара першай і адзінай методыкі роднай мовы, што на той час была падрыхтавана да друку.

«На гэтых курсах, — адзначаў адзін са слухачоў П.Зянюк, — першы раз цвёрда і практычна пастаўлена пытанне аб беларускай мове».

Мікалай Улашчык, малады паплечнік Міколы Каспяровіча, у сваёй «Хроніцы», якая, на жаль, друкуецца яшчэ толькі ва ўрыўках, успамінае пра Каспяровіча як пра надзвычайную асобу. Ён меў шмат талентаў, у тым ліку і «талент дзелавітасці»: «умеў неяк лёгка арганізаваць, «прабіць» самую цяжкую справу». І слуцкія старонкі жыцця Міколы Каспяровіча — лепшы таму доказ.

Аляксандра Гесь.

Чырвоная змена. 2000. 16 сак.

Наследие слуцкого края

Краязнаўчы рух на Случчыне

1920-я гады на Беларусі — час, калі адбываўся незвычайны ўздым і росквіт асветніцтва ва ўсіх галінах навукі і культуры.

Надзвычай шырокі размах набыў і краязнаўчы рух. І гэта не было ініцыятывай «зверху». Наадварот, у розных гарадах і мястэчках Беларусі стыхійна ўзнікалі краязнаўчыя гурткі і таварыствы. Краязнаўчая праца на Случчыне пачалася са стварэннем культурна-асветнага таварыства «Папараць-кветка» ў 1918 г.[1]

Таварыства мела 150 сяброў у г. Слуцк і 2 філіі ў павеце — у вёсках Старыцы, Ліпнікі. Магчыма, звестак пра гэта таварыства ў М.Каспяровіча на той час не было, бо ён называе ў якасці першай краязнаўчай арганізацыі на Случчыне Слуцкую павятовую камісію (1922), якая ў яго на другім месцы пасля Смалярскага гуртка (1918)[2]. Атрымліваецца, што «Папараць-кветка» і Смалярскі гурток утвораны ў адным годзе і з'яўляюцца першымі краязнаўчымі арганізацыямі.

У 1921 г. таварыства «Папараць-кветка» прыпыніла сваю дзейнасць. У гэты час быў арганізаваны Слуцкі павятовы аддзел народнай асветы, які даручыў сябру «Папараць-кветкі» А.Бараноўскаму распачаць працу па збіранні і захаванні рэчаў культурна-краёвага значэння, для чаго адвёў пакой у будынку былой гімназіі. Такім чынам быў пакладзены пачатак заснаванню ў Слуцку краязнаўчага музея[3].

У 1922 г. была заснавана Слуцкая павятовая камісія беларусазнаўства (з 1923 г. Слуцкае павятовае таварыства краязнаўства), якая складалася пераважна з асветнікаў.

За час свайго існавання таварыства прарабіла велізарную працу, якая выклікала водгукі на старонках «Полымя», «Савецкай Беларусі» і інш. Народны камісар народнай асветы У.Ігнатоўскі пад час свайго візіту ў Слуцк ухваліў працу камісіі і даручыў павятоваму аддзелу народнай асветы і надалей дапамагаць пашырэнню гэтай працы, якая адбывалася ў двух напрамках: асветнага беларусазнаўства і краязнаўства ўвогуле[4].

Пра плённую працу слуцкіх краязнаўцаў сведчыць артыкул у «Полымі» за 1923 г. «У Слуцку адчыніўся мясцовы музей», у якім распавядаецца пра унікальныя экспанаты музея, такія, як Берасцейская Біблія, надрукаваная Мікалаем Радзівілам Чорным у XVI ст. Выданне было скуплена каталікамі і спалена ў Вільні (таму кніга — вялікая рэдкасць).

Адным з накірункаў дзейнасці камісіі — скліканне сходаў і беларусазнаўчых канферэнцый. Адна з іх адбылася 15—17 студзеня 1923 г. Бралі ў ёй удзел выкладчыкі беларусазнаўства Слуцкага павета, прадстаўнік Камісарыята асветы, інструктары сацыяльнага выхавання і інш.

Былі абмеркаваны наступныя даклады: пра выкладанне геаграфіі Беларусі, пра метады выкладання гісторыі Беларусі, беларускай мовы.

Канферэнцыя мела водгук у рэспубліканскай прэсе. Часопіс «Полымя» цёпла адклікаецца пра слуцкіх настаўнікаў: «...спакойна, але непарушна цвёрда перакананы ў тым, што робяць вялікую, разумную і карысную працу, і перакананы ў тым, што толькі праз мацярынскую мову, праз радзімазнаўства патрапіць працоўная школа стаць на цвёрды і пэўны грунт...»

Настаўнікі паводзяць сябе годна, не звяртаючы асаблівай увагі на тыя злосныя выпады, якія робяць часта з-за вугла праціўнікі беларушчыны, прыхільнікі старых русіфікатарскіх традыцый — «истинно—русские»[5].

На канферэнцыі настаўнікі таксама абмяркоўвалі праблемы, з якімі сутыкнуліся пры выкладанні новага прадмета — вуснай народнай творчасці. Выкладчык літаратуры Ю.Лістапад так вырашае праблему недахопу падручнікаў: настаўнік з вучнямі сам павінен збіраць фальклор сваёй мясцовасці.

Настаўнікі Случчыны першымі паслалі просьбу ў Наркампрос надрукаваць «падручнік па беларускай народнай славеснасці, а таксама і хрэстаматыю да яго»[6].

У галіне краязнаўства дзейнасць камісіі выявілася ў заслухоўванні дакладаў па школьным краязнаўстве, выпрацоўцы анкет і праграм, пашырэнні музея, наладжванні экскурсій і папулярызацыі ідэй краязнаўства.

З прычыны недастатковай вывучанасці Случчыны камісія наладжвала экспедыцыі для збірання патрэбных матэрыялаў.

Пачаткам «падарожніцкай» дзейнасці трэба лічыць 1923 г., калі была наладжана першая экспедыцыя па вывучэнні і зама-

Наследие слуцкого края

лёўцы народнага арнаменту. Вынікам яе было звыш 200 замалёвак, якія былі прадстаўлены на Усесаюзную сельскагаспадарчую і саматужна-прамысловую выстаўку[7].

Наступныя «падарожы», якія наладжвала Слуцкае акруговае таварыства, уражваюць сваімі лічбамі. За 14 дзён, практычна пехатою, было пройдзена 232 вярсты! За гэтую «падарож» (1927) было сабрана безліч матэрыялу, запісана 150 нумароў фальклору, зроблена 70 фотаздымкаў краявідаў, тыпаў насельніцтва, паселішчаў і розных іншых прадметаў: помнікаў старасветчыны. Справаздачай гэтай вандроўкі з'явіўся артыкул актывістаў слуцкага таварыства У.Мікіцінскага, Р.Пяцэвіча, П.Ажэўскага ў часопісе «Наш край»[8].

Сябрам таварыства ўдалося запісаць шмат старых звычаяў, сярод іх абрад провадаў масленкі ў в. Чапялі: «У сані запрагаюць каня, а ззаду прывязваюць ступку, садзяцца на яе, таўкачом паганяюць. Часам замест ступкі прывязваюць маленькія санкі («сучку»), на якіх едуць з чырвоным сцягам, а часам да санак прывязваюць «ляльку масленкі».

У в. Саковічы быў запісаны унікальны абрад сватання, паводле якога хлопец, перш чым ісці ў сваты, павінен быў наплесці столькі лапцей, колькі душ сям'і ў нявесты.

У в. Дамановічы быў запісаны першабытны спосаб здабывання агню. Гэты ўрачысты абрад адбываўся штогод. З самага ранку ў хатах тушылі агонь. Каля дванаццаці чалавек дзядоў ішлі ў лес, ссякалі ясень пры дапамозе розных прыстасаванняў, трэннем здабывалі агонь, які разносілі па хатах. Такі агонь, лічылася, прыносіў шчасце і адганяў усякую пошасць ад жывёлы. Агонь гэты кабеты імкнуліся захаваць цэлы год.

Улетку 1988 г. было здзейснена чатыры «падарожы» па Случчыне (пешшу 449 і па чыгунцы 18 вёрст), пад час якіх была зроблена 351 замалёўка (узоры народнага арнаменту, схематычныя планы замчышчаў, гарадзішчаў, сядзіб, будоўляў, прыватных і культавых паселішчаў, вёсак, адзення, прылад працы, краявіды і г.д.). У.Мікіцінскі апісаў адно з падарожжаў у «Нашым краі»[9].

Праца Слуцкага краязнаўчага таварыства была рознабаковая. Пра гэта сведчыць таксама грунтоўны артыкул саміх слуцкіх краязнаўцаў, знакамітай «тройцы» — Р.Пяцэвіча, У. Мікіцінскага, П.Ажэўскага — «Краязнаўчы рух на Случчыне», дзе падводзяцца вынікі пяцігадовай дзейнасці таварыства. Розныя накірункі дзейнасці слуцкіх краязнаўцаў часткова пададзены ў назвах раздзелаў гэтага артыкула: «Асвятленне ў друку краязнаўчай дзейнасці», «Падарожніцтва», «Музеябудаўніцтва» і інш.

Да імёнаў слуцкіх краязнаўцаў належыць і імя Рыгора Бахты. І хоць ён з'яўляўся адказным сакратаром часопіса «Рунь», а гэта выданне Свіслацкай краязнаўчай камісіі, усё ж гэта наш зямляк. Гэта адзначае М.Каспяровіч, характарызуючы часопіс «Рунь»: «Пераважная большасць яго матэрыялу належыць аднаму краязнаўцу (Р.Бахце) і паходзіць з радзімы апошняга (Случчыны)...[10] М.Каспяровіч называе часопіс «Рунь» (1924) першым краязнаўчым выданнем на Беларусі. Магчыма, у яго не было іншых звестак, бо нам вядома больш ранняе выданне «Наша каляіна» (1918), выданне Слуцкага культурна-асветнага таварыства «Папараць-кветка».

Вяртаючыся да асобы Р.Бахты, мы адзначым, што гэта быў не толькі краязнаўца, але і пісьменнік, і перакладчык. На жаль, і ў новай Беларускай энцыклапедыі (Т. 2, 1996) няма звестак пра дату і месца нараджэння, як і пра яго работу ў часопісе «Рунь».

У пачатку 1930-х гадоў плённая праца краязнаўцаў Беларусі прыпыняецца. У часопісе «Наш край» пачалі з'яўляцца артыкулы «правільных савецкіх вучоных»: «Супраць контррэвалюцыйных нацдэмаўскіх тэорый у этнаграфіі». З 1931 г. часопіс «Наш край» стаў называцца «Савецкая краіна».

Трагічны лёс напаткаў многіх краязнаўцаў, а потым і іх матэрыялы, адасланыя ў Інбелкульт (яны згарэлі пры пажары ў час Вялікай Айчыннай вайны). Але нават тое, што захавалася для нас тагачасным друкам, уражвае, дае панятце аб велізарнай самаадданай працы, здзейсненай краязнаўцамі. Яны і сёння маюць вялікую каштоўнасць.

КРЫНІЦЫ:

1. Наш край. 1928. № 12.
2. Тамсама. № 2.
3. Тамсама. № 12.
4. Тамсама.
5. Полымя. 1923. № 2.
6. Тамсама.
7. Наш край. 1928. № 12.
8. Тамсама.
9. Тамсама. 1929. № 1.
10. Наш край. 1928. № 6—7.

Н.В.Матыліцкая.

Наследие слуцкого края

Гісторыя Случчыны на старонках часопіса «Наш край»

1926 г. № 2.

У.Мікіцінскі, Р.Пяцэвіч і П.Ажэўскі

ПАДАРОЖ ПА СЛУЧЧЫНЕ

(Матар'ялы краязнаўчай экскурсіі Слуцкага Краязнаўчага Таварыства, якая адбылася ў 1927 годзе на працягу часу з 6—21 ліпня)

...Экскурсія мела сваёй мэтай кароткае абсьледваньне самага глухога закутку Слуцкае акругі — возера Князь з яго ваколіцамі ў прыродна-географічных, грамадзка-эканомічных і культурна-гістарычных адносінах, з беглым вывучэньнем тэрыторыі, па якой адбывалася экскурсія.

За 15 дзён экскурсанты прайшлі пехатой усяго 232 вярсты. У склад экскурсіі ўваходзілі наступныя таварышы: Пяцэвіч Рыгор — старшыня Праўленьня Т-ва, Мікіцінскі Ўсевалад — загадчык музэю, Ажэўскі Піліп — кіраўнік культурна-гістарычнай сэкцыі, Карп Шатэрнік — сябра Т-ва і фотограф-аматар, Нерапеня Сільвестар — сябра Т-ва...

Першая вёска, праз якую праходзілі, — Журава, на рэчцы Лакнеі, сярод невялічкіх узвышшаў, мае досыць прыемны выгляд і адзначаецца добрымі сенажацямі па Лакнеі. Праходзячы каля Цараўцаў, з дарогі заўважылі некалькі курганоў, якія былі абгледжаны пры звароту экскурсіі назад. Далей каля вёскі Квасыніч, сярод жыта заўважылі могілкі, пабудаваныя на вялікіх курганох. У пасёлку «Навабелічы», які пабудованы ў 1922 г. на зямлі б. маёнтку Белічы, спыніліся адпачыць. Пасёлак заселены былымі батракамі маёнтку, якія дасюль яшчэ неабжыліся: ня маюць будоўлі ў поўнай патрэбе, няма садоў, нават гароды не агароджаны і нядобра апрацаваны. Праходзячы праз вёску Млынку, на могілках заўважылі вялікі курган. На млынкоўскіх палёх добрая пшаніца і ячмяні, чаго дасюль не наглядалася.

1926 г. № 8—9.

Я.Зянюк

З КІЕМ ПА РАЁНУ

(Грозава, Слуцкай акругі)

Шмат размоў выклікае паміж сяброў Грозаўскага Краязнаўчага Т-ва экскурсія па раёну, вызначаная плянам управы на ліпень месяц.

Група настаўнікаў у 5 чалавек 22 ліпеня з кіямі ў руках, з торбамі за плячыма, хто босы, хто ў сандалях, рушылі з Грозава...

Сьпяшаемся ў Грэзак. Тут старавечнае замчышча на высокай высьпе паміж раўчука й лагоў, што засталіся на месцы даўнейшага возера, прыцягвае нашу ўвагу. Цяпер вапнякі капаць грашчанам (жых. м. Грэску) забаранілі на «Замку», а раней капалі і выкопвалі з пяску косьці чалавечыя, шаблі, шпоры ды іншыя рэчы, захаваныя тут ад мінулых часоў. Дакопваліся да нейкіх лёхаў, што ідуць у глыбіню. «Падземныя ходы», кажуць аб іх сяляне. Мясцовыя таварышы падносяць нам два чарапы чалавечых галоў, якія вельмі добра захаваліся ў пяску, нават з поўным лікам зубоў. Выгляд выспы псуюць крыху акопы часоў імпэрыялістычнае вайны, схованыя паміж высокіх векавых вязаў. Аглядаем сьляды былых сьцен (там цэглу раней даставалі грашчане), месца былое грэблі й мосту, што быў над ровам для злучэньня з мястэчкам...

Раніцаю бадзёра сыцігаем далей. Аблічылі, аглядзелі, а наш саматканы мастак і замаляваў курганы ў полі паміж вёскамі — Марозы і Забелы. Іх усяго 35, відаць, вайсковага пахаджэньня, завуць іх «Магілкі».

У вёс. Шышчыцах, перш, чым дайсьці да школы, дзе сьнедаць думалі, забрылі ў капліцу, што стаіць пры вёсцы. На сьцяне прыгожага пісьма вобраз «божай маці». Тут-жа запыленая «канпаня» ў куточку. З аднаго боку на ёй вобраз хрыста, на ім надпіс славянскімі літарамі: «року 1791 сен образъ брацкі до цекви насвшеі панны маріи забелскоі в память вѣчную», а на другім баку — «пакланеньне валхвоў» з надпісам «Epiрnania Domini»...

1928 г. № 12.

Р.Пяцэвіч, У.Мікіцінскі, П.Ажэўскі

КРАЯЗНАЎЧЫ РУХ НА СЛУЧЧЫНЕ

(Да пяцігодзьдзя Слуцкага Краязнаўчага Таварыства)

Агульны гістарычны агляд і сучасны стан

Пачатак краязнаўчае працы на Случчыне трэба аднесьці да 1918 году, калі тут

Наследие слуцкого края

заснавалася Культурна-Асьветнае Таварыства «Папараць-кветка». Праца Т-ва хутка пашырылася: яно мела ў самым Слуцку звыш 150 сяброў, апрача таго дзьве філіі на павеце: «Крыніцу» ў Старыцы і «Зорку» ў Ліпнікох. Таварыства выдавала часопіс «Наша Каляіна». Дзейнасьць яго выявілася ў зьбіраньні фольклёру, популярызацыі ведаў пра Беларусь і распаўсюджваньні кніжак на беларускай мове, якіх за кароткі час снаваньня таварыства было пашырана праз філіі звыш 10 000.

У 1921 годзе таварыства «Папараць-кветка» зачынілася. У гэты час быў арганізаваны Слуцкі Павятовы Аддзел Народнае Асьветы, які ставіў сабе мэтай пашырэньне беларускай культуры і вывучэньне пытаньняў краязнаўства. Зараз-жа Аддзел даручыў аднаму з сяброў Таварыства «Папараць-кветка» Андрэю Бараноўскаму распачаць працу па зьбіраньні і захаваньні рэчаў культурна-краёвага значэньня, для чаго адвёў пакой у будынку былой гімназіі і палажыў яму зарплату па стаўцы настаўніка. Такім чынам быў паложаны пачатак заснаваньню ў Слуцку краязнаўчага музэю. Але ў хуткім часе выявілася, што Павятовы Аддзел, які ў тыя часы меў шмат працы, ня можа аддаць належнага часу і сродкаў на пашырэньне чыста краёвай працы, таму ён стаў клапаціцца аб заснаваньні асобнай камісіі, з шырокім удзелам у ёй зацікаўленых асоб, па прынцыпу дабраахвотнасьці. У выніку ўсяго гэтага ў верасьні 1922 г. і была заснавана Слуцкая Павятовая Камісія Беларусазнаўства, пры Павятовым Аддзеле Народнае Асьветы; яна праіснавала год, да верасьня 1923 г., калі і была рэарганізавана ў Слуцкае Павятовае Таварыства Краязнаўства.

Камісія мела мэтаю: 1) апанаваньне ведамі пра Беларусь, якія былі назапашаны да часу заснаваньня камісіі, 2) распрацоўку мэтодычных пытаньняў выкладаньня комплексу ведаў аб Беларусі, гэта значыць, беларусазнаўства ў школах, і 3) вывучэньне і дасьледваньне Беларусі, асабліва былога Слуцкага Павету. Камісія складалася пераважна з асьветнікаў, выкладчыкаў беларусазнаўства ў школах, інспэктароў соцыяльнага выхаваньня і іншых. За час свайго існаваньня яна прарабіла вялізарную, для таго часу, працу, якая выклікала водгукі на старонках «Полымя», «Савецкай Беларусі» і інш. Гэтаму спрыяла тое, што праца камісіі мела сваім прадметам пераважна заданьні сучаснасьці.

Камісар Народнае Асьветы Беларусі Ў.Ігнатоўскі, у часе свайго побыту ў Слуцку, ухваліў працу камісіі і даручыў Павятоваму Аддзелу Народнае Асьветы і надалей дапамагаць пашырэньню гэтай працы. Адбывалася яна ў двух кірунках: асьветнага беларусазнаўства і краязнаўства наогул. У першым кірунку дзейнасьць камісіі выявілася ў скліканьні сходаў і агульнагарадзкіх і павятовых беларусазнаўчых конфэрэнцый. На іх, адпаведна вымаганьням часу і патрэбам асьветнай працы Случчыны, заслухоўваліся даклады, якія мелі



Актыў Слуцкага раённа-гарадскога таварыства краязнаўства. 1928 г. Сядзяць (злева направа): С.Куровіч, Ю.Саляновіч; Т.Бахановіч, Р.Пяцэвіч, К.Касцюк, У.Мікіцінскі, В.Нямковіч; стаяць: К.Пражога, К.Аўгусцінскі, В.Мікіцінскі, П.Кацярыніч, І.Крыцкі, Б.Русак, А.Крываль.

Наследие слуцкого края

дапамагаць выкладчыку беларусазнаўства ў яго школьнай працы: аб творчасьці М.Чарота, аб прозе Гартнага, аб стане Беларусі пасьля Люблінскае вуніі, аб рэволюцыйным руху на Беларусі, а таксама даклады аб спосабах і задачах выкладаньня беларусазнаўства ў школе.

Паваротнымі ў апошняй галіне былі агульна-гарадзкая беларусазнаўчая конфэрэнцыя — 18 кастрычніка 1922 г. і павятовая — 15—17 студзеня 1923 г.

У галіне краязнаўчай дзейнасьць Слуцкай павятовай камісіі беларусазнаўства выявілася ў заслухоўваньні дакладаў па школьным краязнаўстве, выпрацоўцы анкет і програм, пашырэньні музэю, наладжваньні экскурсіі і популярызацыі ідэй краязнаўства. З прычыны адсутнасьці ў Слуцку патрэбных архіваў і бібліотэк, а таксама неабходнасьці ўсебакова ведаць Случчыну, дзеля беспамылковага будаваньня яе новага жыцьця, камісія ўсю сваю ўвагу сконцэнтравала на вывучэньні сучаснага яе становішча ў самых разнастайных галінах. Адпаведна гэтаму на сходах камісіі абмяркоўваліся наступныя даклады: школа на Случчыне, Слуцкія паясы, соцыяльнае выхаваньне на Случчыне, вывучэньне беларускага мастацтва наогул і народнага мастацтва Случчыны, організацыя і плян Слуцкага музэю радзімазнаўства і школьныя радзімазнаўчыя музэі. Кароткі зьмест гэтых дакладаў пазьней друкаваўся ў газэце «Савецкая Беларусь». Для зьбіраньня патрэбных матар'ялаў камісія організоўвала экспэдыцыі. Фактычнае кіраўніцтва Слуцкай павятовай сельска-гаспадарчай выстаўкай з этнографічным аддзелам у 1923 г. наладжана таксама камісіяй беларусазнаўства. Запісваньне фольклёру рабілася настаўнікамі і вучнямі на мясцох, якія прысылаліся ў камісію. Рассылаліся таксама анкеты, на якія атрымоўваліся з месц адказы. Камісіяй організоўваліся экскурсіі з розных месц павету ў Слуцак і са Слуцку на павет. Для пашырэньня музэйнай працы была вылучана асобная падкамісія, якая ў першую чаргу занялася зьбіраньнем і захоўваньнем тых рэчаў, якія маглі зьнікнуць. Пад кіраўніцтвам падкамісіі пачаў засноўвацца шэраг валасных радзімазнаўчых музэяў. Апрача таго падкамісія клапацілася аховаю мясцовых помнікаў старасьветчыны, якімі так багата Случчына. Для пашырэньня пропаганды ідэі і ведаў аб сваім краі было ўтворана асобнае лектарскае бюро камісіі, якое наладзіла шэраг лэкцый у горадзе, а таксама некалькі па розных кірмашох у Слуцку. На ўсім працягу сваёй дзейнасьці камісія трымала моцную сувязь з Павятовым зямельным аддзелам, мясцовым земляробчым тэхнікумам і іншымі ўстановамі, што значна паляпшала яе працу. Аб працы камісіі ў свой час друкавалася ў розных пэрыодычных выданьнях.

У верасьні 1923 г. дзякуючы таму, што пільная патрэба вырашэньня тэрміновых пытаньняў асьветнага краязнаўства была задаволена працай камісіі, яна рэорганізавалася ў навукова-дасьледчую організацыю — Слуцкае Павятовае Таварыства Краязнаўства. Глеба для існаваньня Таварыства была настолькі падрыхтавана, што ў першым месяцы ў склад яго ўвайшло больш за 100 чалавек розных працаўнікоў. Статут Таварыства быў зацьверджаны Аддзелам Народнай Асьветы, і праца, распачатая папярэдняй камісіяй, значна ажывілася. Але хутка падышоў перапынак яе. Да лістапада месяца ўсе асобы, якія стаялі на чале праўленьня, у тым ліку і загадчык музэю, пакінулі Слуцак. Краязнаўчая праца зусім спынілася да вясны 1925 г., калі адбыўся сход зацікаўленых асоб, які і заснаваў Слуцкае Акруговае Таварыства Краязнаўства. Летам праца зноў спынілася і аднавілася толькі 22 лістапада 1925 г., калі зацьверджаны быў АВК сталы статут таварыства, апрацаваны ЦБК. З гэтага часу і да ліквідацыі Слуцкае Акругі дзейнасьць Таварыства была вельмі жвавай, дзякуючы ўважлівым адносінам Акрвыканкому, які дапамагаў таварыству матар'яльнымі сродкамі, асыгноўваючы іх на розныя мэты: экскурсіі, конфэрэнцыю, таксама водпускам сродкаў у каштарысным парадку; так у 1926 годзе было асыгнавана 100 р. на экскурсіі, а ў 1926—1927 бюджэтным годзе адпушчана па каштарысу на ўтрыманьне музэю і на краязнаўчую працу 1000 руб. Апрача гэтага Акрвыканком дапамагаў вярбоўцы сяброў Таварыства, і быў час, калі ўсе працаўнікі яго цалкам уваходзілі ў склад Акруговага Таварыства Краязнаўства. Вынікам гэтага было тое, што ў 1925—26 годзе агульных сходаў Т-ва, на якіх прысутнічала ад 40 да 100 сяброў, было 6, а пасяджэньняў праўленьня 27. Усяго сяброў таварыства лічылася 100 чалавек: бе-

Наследие слуцкого края

ларусоў 60, яўрэяў 35, палякаў 5; партыйных 7, беспартыйных 93. Настаўнікаў — 45, вучняў — 40 і іншых — 15. Сябры таварыства падзяляліся на сэкцыі і вялі працу паводле распрацаванага пляну. Усіх сэкцый было 5: а) музэйная — 32 сяброў, б) прыродна-географічная — 20 сяброў, в) культурна-гістарычная — 21 чалавек, г) этнаграфічна-эканомічная — 27 асоб, д) юнсэкцыя з бягучым лікам асоб; апрача таго працавала слоўнікавая камісія — 37 асоб. На раёнах былі краязнаўчыя гурткі: Чырвона-Слабодзкі, Грозаўскі, Копыльскі і Стара-Дароскі, з агульным лікам 120 сяброў. Гурткі таксама працавалі пры школах-сямігодках: Любаньскай, Пагосцкай, Старобінскай, Ленінскай і пры Слуцкіх агульна-адукацыйных курсах.

На агульных сходах і сходах праўленьня заслухоўваліся даклады і вырашаліся наступныя пытаньні: мэты краязнаўства, пабудова музэю і музэйная праца, гісторыя гор. Слуцку, слоўнікавая праца і праца іншых сэкцый, краязнаўчыя экскурсіі, популярызацыя працы па раёнах праз інструктароў і організаваны плян вывучэньня Капыльскага раёну. Па сэкцыях праца выканана наступная: этнаграфічна-эканомічная сабрала 300 песень і казак Случчыны, кароткі нарыс Случчыны ў этнаграфічным, географічным і эканомічным напрамку, экзэмпляр яго быў адасланы ў Інбелкульт для часопісу «Наш Край». Прыродна-географічная сэкцыя апрацавала 100 відаў расьлін Случчыны, вывучала жывёлы і расьліны Случчыны. Культурна-гістарычная сэкцыя здабыла і перамалявала плян гораду Слуцку 1780 г., агледзела і ўзяла на вучот помнікі старасьветчыны Слуцку, вывучала гісторыю гораду і рэвалюцыйнага руху сярод сялянства ў 1905 г. і таксама вывучала жыцьцё яўрэяў на Случчыне. Музэйная сэкцыя дабілася адводу памяшканьня пад музэй, перавязла архіў Кальвінскага касьцёлу, сабрала і пашырыла бібліотэку, злажыла і распаўсюдзіла адозву па акрузе аб ахвяраваньні музэйных рэчаў. Слоўнікавая камісія сабрала 1000 слоў мясцовай мовы. Акруговае Т-ва мела бюджэт 430 рублёў, якія злажыліся з асыгнаваньняў Інбелкульту 300 рублёў, Акрвыканкому — 100 р. і сяброўскіх узносаў 30 руб. Галоўны выдатак гэтых сродкаў пайшоў на абсталяваньне музэю, 150 р. на Акруговую конфэрэнцыю, якая адбылася 23 і 24 кастрычніка 1926 г. На гэтай конфэрэнцыі, якая праводзілася пры ўдзеле прадстаўніка ЦБК тав. Казака, прысутнічалі 41 дэлегат Т-ва. На ёй абгаварваліся пытаньні: 1) Справаздача Акруговага Праўленьня і двух раённых таварыстваў: Грэскага, Любаньскага і аднаго гуртка пры Пагосцкай сямігодцы. 2) Задачы і мэты краязнаўства і аб далейшай працы па акрузе. 3) Краязнаўства і школа. 4) Выбары Праўленьня. 5) Рознае.

Конфэрэнцыя ўхваліла плян працы Т-ва на 1926—1927 г., які быў вельмі вялікі, не адпавядаў сілам і ўмовам працы і быў выкананы толькі часткова. Плян будаваўся па трох галінах: 1) Організацыя Т-ва. 2) Популярызацыя працы яго. 3) Дэталізацыя самой працы. Па першаму моманту прадбачылася організацыя сэкцыі, наладжваньне пасяджэньняў праўленьня і агульных сходаў, організацыя раённых таварыстваў і гуркоў па сельсаветах і школах. Значная ўвага адводзілася ўцягненьню сяброў у Т-ва, як па Саюзе Працасьветы, так і па іншых. Популярызацыяй працы прадбачылася асьвятленьне перад працоўнымі масамі ідэй краязнаўства на сходах сяброў саюзаў шляхам дакладаў, лекцый, друкаваньнем вестак аб краязнаўчай працы на мясцох у газэтах і пэрыодычных выданьнях, як часопіс «Наш Край», папаўненьне краязнаўчых бібліотэк, выдзеліць лектарскае бюро, прасіць Інбелкульт камандыраваць з цэнтру лектароў па навучна-краязнаўчых пытаньнях, уцягнуць у працу ЛКСМ з мэтаю скарыстаць маладыя, актыўныя сілы дзеля вывучэньня краю.

У напрамку конкрэтызацыі даваліся заданьні праўленьню лікам 7 і кожнай сэкцыі ня менш як па 7. Заданьні былі такога характару, што поўнага выкананьня за год немагчыма было чакаць нават і пры лепшых умовах. Вось напрыклад сьпіс заданьняў прыродна-географічнай сэкцыі: 1) Пабудаваць у Слуцку мэтэоролёгічную станцыю і стала весьці мэтэоролёгічныя і фэнолёгічныя нагляданьні. 2) Злажыць карты расьлінных згуртаваньняў глеб вадазбораў. 3) Паставіць шырока пытаньне аб заснаваньні дасьледчага ботанічнага надзелу. 4) Зьбіраць колекцыі розных жывёл, расьлін у іх зімовым стане. 5) Складаць дэндролёгічную колекцыю мясцовых дрэўных парод. 6) Паставіць на сходах сэкцый і публічна шэраг дакладаў аб флёры, фаўне, клімаце і

Наследие слуцкого края

прыродных асаблівасьцях акругі. 7) Вывучыць і пісьмова злажыць шляхі зносін сухаземных і водных.

А тым часам умовы для працы сталі зьмяняцца к горшаму. У 1927 г. паўстала пытаньне аб ліквідацыі Слуцкай акругі, што выклікала адліў са Слуцку актыўных і працаздольных сяброў. З другога боку пераход на раённае становішча пагражаў і зьмяншэньнем матар'яльных сродкаў. Праца прымала меншы, раённы маштаб; усё гэта не давала магчымасьці шчыра ўзяцца за працу, вынікам чаго мы маем наступную справаздачу 25 верасьня 1927 г. аб дзейнасці Слуцкага Акруговага Т-ва краязнаўства за 1926—1927 гг.

Сяброў Т-ва з 100 зьменшылася на 50, вышлі, як адзначана вышэй, карысныя для працы асобы. Праўда, што партыйнае ядро павялічылася з 7% на 43%. У папярэднім годзе было 7, у гэтым годзе дайшло да 21, ды яшчэ адзін комсамолец, але парыву таго да працы, як раней, ня было. Па нацыянальнасьці сябры падзяляліся наступным чынам: беларусоў — 41, яўрэяў — 9. Па прафэсіі: настаўнікаў — 34, вучняў — 7, інспэктароў нарасьветы — 2, дактароў — 7, загадчыкаў розных устаноў — 3, дзелаводаў — 3.

Праўда, праўленьне працавала старэнна, зрабіўшы за гэты год 35 пасяджэньняў і організаваўшы 1 сталую экскурсію на возера Князь.

Сэкцыі зрабілі наступную працу. Музэйная: прыняла рад крокаў да замацаваньня выдаткаў на ўтрыманьне музэю ў 1927—28 гг. за кошт бюджэту гораду, вынікам чаго было асыгнаваньне па бюджэту 300 р. на памянёную справу. Зроблена аднавярстовая топографічная карта Слуцкага раёну, як прадпасылка да ўсебаковага вывучэньня раёну. Набыты тыповыя ўзоры глеб (у монолітах) з ваколіц воз. Князь. Набыты чучалы птушак ад цімкавіцкага настаўніка Шахлевіча, апрацаваны матар'ялы, набытыя ў экскурсіі, якія ўзбагацілі музэй колекцыямі ботанічнымі, дэндролёгічнымі і геолёгічнымі. Набыты павялічаныя фотоздымкі тыпаў жыхароў Случчыны і фотоздымкі Слуцкага поясу. Прыняты вельмі каштоўныя статыстычныя матар'ялы ад ліквідаванага акруговага Статыстычнага Бюро.

Культурна-гістарычная сэкцыя зьбіралася 4 разы. Былі заслуханы даклады на тэмы: 1) апісаньне гор. Слуцку на аснове пляну 1780 г. 2) Слуцкая старасьветчына, у прыватнасьці Ражэсьцьвенская царква. 3) Аб паншчыне на Случчыне.

Прыродна-географічная сэкцыя зьбіралася 4 разы. Заслуханы даклады аб прыродных фарбах, якія ўжываюцца на Случчыне, і аб зьбіраньні кузурак. Сабрана колекцыя шасьціножак у ліку 82, расьлін — 26, па орнітолёгіі 17 чучал і разаслана анкета аб шляхох зносін.

Грамадзка-эканомічная сэкцыя зьбіралася 2 разы, заслухала даклад на тэму: «Дзяды на Случчыне».

Агульны сход Т-ва ў ліку 25 асоб, які адбыўся 25 верасьня 1927 г., падвёў вынікі працы за мінулы год, рэарганізаваў Слуцкае Акруговае Таварыства ў Слуцкае Раённа-Гарадзкое, адпаведна адміністрацыйнаму прынцыпу краязнаўчага раёнаваньня БССР і злажыў больш сьціслы плян працы на 1927—1928 год. Пры гэтым сход, прыняўшы пад увагу зьмяншэньне краязнаўчых сіл, ня лічыў потрэбным браць стаўку на вялікую колькасць працы, абмежаваўшыся наступным плянам: а) па організацыйных пытаньнях: 1) Весьці працу па ўцягненьні большага ліку сяброў. 2) Даставіць краязнаўчыя бібліотэкі і часопіс «Наш Край» у кожны гурток і весьці нагляд за працай апошніх. 3) Імкнуцца да організацыі гурткоў пры кожным сельсавеце і школе, якая налічвае ня менш 2 настаўнікаў. 4) Клапаціцца аб пабудове мэтэоролёгічнай станцыі. 5) Прыняць удзел у сустрэчы 10-е гадавіны Кастрычнікавае рэволюцыі. 6) Сабраць слоўнікавы матар'ял і адаслаць у Інбелкульт. Вытворчая праца: а) Па музэйнай сэкцыі: 1) Узяць на вучот усю маёмасьць па музэі. 2) Імкнуцца да пашырэньня будынку пад музэй. 3) Даставіць музэйныя рэчы з Цімкавіч. 4) Прыняць крокі да пашырэньня прыродна-географічнай і грамадзка-эканомічнай частак музэю. б) Па прыродна-географічнай сэкцыі: 1) Весьці сталыя метэоролёгічныя і фэнолёгічныя назіраньні. 2) Злажыць раённыя карты для гурткоў. 3) Прыняць удзел у сельска-гаспадарчай выстаўцы. в) Па культурна-гістарычнай сэкцыі: 1) Складьці карту і апісаньне курганоў і помнікаў старасьветчыны раёну. 2) Па грамадзка-эканомічнай сэкцыі: 1) вывучыць прадпрыемствы Случчыны. 2) Сумесна з культурна-гістарычнай сэкцыяй правесьці вывучэньне

Наследие слуцкого края

сучаснага стану так званых Слуцкіх выбранцаў з гістарычным аглядам.

Як ні малы гэты плян, але цалкам выканаць яго не ўдалося, галоўным чынам з прычыны пераарганізацыі акругі, а таксама таварыства і малай зацікаўленасьці сяброў гэтаю справай.

Зрабіла Т-ва да часу 1 лістапада 1928 г. наступнае: 1) Па ўсіх сельсаветах, сямігодках, хатах-чытальнях таварыства разаслала адносьнікі са статутамі аб неабходнасьці заснаваньня гурткоў і аб іх карысьці, з далучэньнем прыкладнага пляну працы. Вынікамі было тое, што краязнаўчая сетка пашырылася. К пачатку 1928 г. яна складалася з раённа-гарадзкога Т-ва і 2 гурткоў пры сямігодках з агульным лікам 100 сяброў. У сучасны момант акрамя раённагарадзкога Т-ва ёсць 9 гурткоў, з якіх 8 пры школах гораду і раёну і адзін пры Кастрычнікаўскім сельсавеце, з агульным лікам сяброў 500 чалавек. Адносна пабудовы мэтэоролёгічнай станцыі, праўленьне клапацілася шмат, але сытуацыя ў гэтым годзе зьмянілася, бо зацікаўленыя ўстановы знайшлі больш карысным пабудаваць гэткую ў саўгасе Мар'іна, на балотах, дзе вядзецца мэліорацыя. Фэнолёгічныя назіраньні вядуцца сыстэматычна і ўстаноўлены вадамерны пункт для назіраньня рэжыму вод. Садоўніцтва вывучаецца шляхам заданьняў вучням школ, але вынікі гэтае працы пакуль што слабыя.

У сэнсе апрацоўкі карты помнікаў старасьветчыны справа стаіць здавальняюча. Атрымана значная колькасць матар'ялаў і ў канцы году будзе складзена трохвярстовая карта. Павялічылася падпіска на часопіс «Наш Край» з пашырэньнем краязнаўчай сеткі. Вядзецца вывучэньне эканомічнага і культурнага становішча раёну.

Павялічэньне музэю ідзе шпаркa. У гэтым годзе набыта значная колькасць матар'ялаў як прыродна-географічнага, так і грамадзка-эканомічнага зьместу. У прыватнасьці апрацаваны 2 гэрбарыі, — адзін дрэўных пародаў, якія рэдка сустракаюцца, другі — звычайных мясцовых расьлін; апрацавана невялічкая дэндролёгічная колекцыя і колекцыя птушыных яек. Набыты 11 моделяй рыбацкіх прылад, якія ўжываюцца на Князь-возеры. Паступілі модэлі ткацкіх прылад; апрацавана больш за 100 фотоздымкаў, якія зьяўляюцца вынікамі падарожы на Князь-возера.

У сучасны момант апрацоўваюцца матар'ялы, набытыя ў часе падарожаў, якіх сёлета адбылося 4, з якіх тры з мэтай вывучэньня свайго раёну і адна па сумежных раёнах.

У сэнсе выкананьня даручэньняў ІБК сабрана некаторая колькасць матар'ялаў аб прыродных фарбах, якія ўжываюцца на Случчыне; сабраны ў нязначным ліку весткі аб фарбаваньні яек-пісанак; зложаны сьпіс паселішч Слуцкага раёну з адзначэньнем націскаў, выканана шмат апытальнікаў аб словах: волаты, ваўкі, асілкі.

Апрача пералічанага, у гэтым годзе Слуцкае Т-ва Краязнаўства прыняла ўдзел у часопісу «Наш Край», надаслаўшы матар'ялы, якія і былі надрукаваны.

Т-ва таксама прыняла ўдзел і ў выстаўцы краязнаўчых фотографій і зарысовак, якая была організавана ЦБК у Менску, на якой экспонавала 90 фотоздымкаў. Сябрам таварыства Ў.Мікіцінскім зложаны нарыс гісторыі Слуцку з часоў дагістарычных і да канца XIX ст., а другім сябрам П.Ажэўскім апрацавана «вясельле на Случчыне». Акрамя пералічанага, адаслана ў ЦБК 150 нумароў фольклёру.

У сучасны момант Таварыства складаецца з 125 сяброў, праўленьне — з 9 асоб. З іх членаў і кандыдатаў КПБ — 13 чал., ЛКСМ — 29, беспартыйных — 83 ч., беларусоў — 103, яўрэяў — 19, расійцаў — 2, іншых — 1, настаўнікаў — 33, політасьветпрацаўнікоў — 2, аграномаў — 2, дактароў — 1, коопэратараў — 1, статыстыкаў — 1, служачых у іншых установах — 1, студэнтаў пэдкурсаў і пэдтэхнікуму — 76.

За гэты час адбылося 5 агульных сходаў, на якіх зачытаны два даклады: 1) Аб вытворчасьці Слуцкае фабрыкі паясоў XVIII ст., 2) Аб падарожы па Случчыне. Апошні сход быў прысьвечаны пытаньням, зьвязаным з 10-гадовым юбілеем краязнаўчага руху на Случчыне і 5-годзьдзем дзейнасці Краязнаўчага Таварыства. Адбылася яшчэ конфэрэнцыя краязнаўчых гурткоў.

Праўленьне працуе, робячы пасяджэньні досыць рэгулярна, амаль штотыднёва, хаця і пры нязначным ліку членаў праўленьня.

Да недахопаў трэба аднесьці слабую працу сэкцый, а таксама неакуратнае наведваньне пасяджэньняў праўленьня некаторымі яго членамі.

Да перашкод адносіцца немагчымасць

Наследие слуцкого края

набыць памяшканьне пад музэй, які ўжо страціў сваё значэньне, набываючы характар складу музэйных рэчаў. Клопаты Праўленьня перад Гарсаветам не даюць ніякіх вынікаў. Збоку асоб, якія стаяць на чале кіруючых органаў, не наглядаецца зацікаўленасьці да спраў краязнаўства.

Зрабіўшы агульны агляд, неабходна спыніцца больш дакладна на асобных момантах з дзейнасьці Таварыства Краязнаўства.

Асьвятленьне ў друку краязнаўчае дзейнасьці на Случчыне

Краязнаўчая дзейнасьць на Случчыне не магла прайсьці неадзначанай. Калі дагэтуль няма значных друкаваных прац, якія змаглі б азнаёміць грамаду з дасягненьнямі ў справе дасьледваньня краіны, то гэтага нельга сказаць у адносінах да асьвятленьня ў друку культурнае дзейнасці організацыі.

Слуцкая павятовая Камісія Беларусазнаўства досыць шырока карысталася друкам, каб гэтым шляхам знаёміць шырокія колы працоўных з краязнаўчай працай і яе вынікамі.

Матар'ялы аб гэтай дзейнасьці (пастановы конфэрэнцыі) былі часткова апублікаваны адным з піонэраў краязнаўчага руху на Случчыне М.Касьпяровічам, у верасьні 1924 г. у № 3—7 «Бюлетэні офіцыяльных загадаў і паведамленьняў Віцебскага аддзелу Нарасьветы». Затым кароткі зьмест дакладаў, якія маюць краязнаўчы характар, друкаваліся ў газэце «Савецкая Беларусь» №№ 116, 150, 151 і інш. за 1923 г. і №№ 105, 197, 198 і інш. за 1924 г., №№ 219 і інш. за 1925 г. Популярызацыя ідэй краязнаўства і працы камісіі рабіліся членамі яе праз пэрыодычны друк. Аб працы камісіі друкавалася ў «Полымі» (Менск 1923 г. № 2 ст. 133), «Савецкай Беларусі» за 1922 г. № 243, 282 і інш. і 1923 г. № 24, 27, 72, 114, 115, 124, 138, 149, 181, 290 і інш. З выхадам у сьвет з 1925 г. спэцыяльнага краязнаўчага часопісу «Наш Край» справа значна паляпшаецца: тут ужо, побач з матар'яламі інформацыйнага характару, пачынаюць прасочвацца невялічкія арыгінальныя працы мясцовых краязнаўцаў. Гэтак у 1926 г. у № 8—9 (11—12), жнівень — верасень, час. «Наш Край» зьмяшчаецца першы артыкул Зянюка (Грозава) «З кіем па раёну» (краязнаўчая падарож па Грэшчыне), затым у № 12 (15) за сьнежань зьмешчана інформацыя аб першай Слуцкай Акруговай Краязнаўчай Конфэрэнцыі і дзейнасьці Таварыства.

1927 г. быў значна бяднейшым, толькі ў № 8—9, жнівень—верасень («Наш Край») была зьмешчана заметка І.Рушкевіча «Рэшткі старасьветчыны». Здабываньне агню ў в. Даманавічах, Старобінскага раёну. 1928 г. у справе зьмяшчэньня матар'ялаў трэба лічыць самым багатым. Гэтак у № 1 (28) «Наш Край» за студзень месяц надрукаваны невялічкі артыкул У.Мікіцінскага «Слуцкі раённы краязнаўчы музэй» (кароткае апісаньне). У № 2 (29) за месяц люты У.Мікіцінскі, Р.Пяцэвіч, П.Ажэўскі — «Падарож па Случчыне». № 3 (30) сакавік У.Мікіцінскі, Р.Пяцэвіч, П.Ажэўскі — «Падарож па Случчыне» (канец). У гэтам-жа нумары, М.Касьпяровіч — «З гісторыі краязнаўства» № 5 (32) май. У.Мікіцінскі — «Аб організацыі групавых падарожаў з мэтай пазнаньня і вывучэньня краю». № 6—7 (33—34) чэрвень—ліпень. — Інформацыя аб дзейнасьці Слуцкага Т-ва Краязнаўства за 5 месяцаў 1928 г.».

Акрамя гэтага за 1925—28 г. было зьмешчана да 40 корэспондэнцый у газ. «Савецкая Беларусь», «Зьвязда», «Вясковы Будаўнік», у якіх адзначалася як краязнаўчая дзейнасць на Случчыне, гэтак і кароткія заметкі краязнаўчага характару.

Падарожніцтва ў дзейнасьці Слуцкага Т-ва Краязнаўства

Падарожніцтва, як спосаб пазнаньня і вывучэньня краю, у дзейнасьці Слуцкага Таварыства Краязнаўства займае досыць пачэснае месца. Пачаткам гэтае дзейнасьці трэба лічыць 1923 г., калі Слуцкая Павятовая Камісія Беларусазнаўства наладзіла першую экспэдыцыю па вывучэньні і зарысоўваньні народнага орнамэнту. На жаль, нам невядомы ні маршрут, ні іншыя падрабязнасьці экспэдыцыі. Вынікам яе было звыш 200 зарысовак, якія прадстаўляліся на Ўсесаюзную сельскагаспадарчую і самату жна-прамысловую выстаўку. Зразумела, што гэтая першая падарож насіла вузкаспэцыяльны характар, але тым часам, побач з выкананьнем спэцыяльнага заданьня азнаёміла ўдзельнікаў з жыцьцём і асаблівасьцямі краіны.

Наследие слуцкого края

У далейшым, з заснаваньнем Акруговага Т-ва Краязнаўства, падарожніцкая справа прымае іншы характар. Тут яна робіцца тэмай спэцыяльнага абгаварэньня, у вініках чаго ёй дадаецца характар асобнага віду дасьледчай працы да ўсебаковага вывучэньня краіны. Так абстаяла справа ў 1926 г., калі Таварыствам было высунута пытаньне аб наладжаньні вялікае падарожы па Случчыне, ласьне ў самую глухую частку акругі на воз. Князь і яго ваколіцы. Адсутнасьць практыкі, навізна справы выклікала жвавую дзейнасьць у гэтым напрамку. Трэба было вызначыць маршрут, каб захапіць больш цікавыя, мала дасьледваныя месцы, азнаёміцца з адпаведнай літаратурай, выпрацаваць шэраг пытаньняў, на якія патрэбна было атрымаць адказ на месцы, правілы для ўдзельнікаў, потым паклапаціцца аб сродках. Але з некаторых прычын і адсутнасьці патрэбнай сумы грошай, падарож не адбылася. Праробленая праца зьявілася тым грунтам, на якім у 1927 г. Т-ва зьдзейсьніла намечаную програму пры дастатковых грашовых сродках. Падарож адбылася пры ўдзеле пяцёх асоб і аднае фурманкі пад прылады і маёмасьць падарожнікаў. Маршрут быў наступны: Слуцак — Журава — Белічы — Млынка — Чапялі — Бранчыцы — Жабіна — Іздрашава — Забродзкія хут. — Кулакі — Стамагілы — Тычыны — Лістападавічы — Старобін — Саковічы — воз. Сьвятое — Мількавічы — Гадзінскія хут. — Махнавічы — Дамановічы — Пісаравічы — Восаў — Князь-Вазерская — Ляхавічы — Пухавічы — Дзякавічы — Пасталы — Буды — Сосны — Сальцо — Юркавічы — Шыпілавічы — Обчынарачэнь — Вакальнае — Цёсава — Пагост — Быкава — Цараўцы — Журава — Слуцак, — працягам 232 вярсты. Заняла падарож 14 дзён. Было сабрана шмат апісальнага матар'ялу, запісана 150 нумароў фольклёру, зроблена 70 фотоздымкаў-краявідаў, тыпаў насельніцтва, паселішчаў, розных будоўлі і помнікаў старасьветчыны. Замалёвана 10 плянаў, сабраны гэрбарыі расьлін, набыты ўзоры глеб і некаторых выкапняў. Кароткае апісаньне падарожы было зьмешчана ў часопісу «Наш Край» (№ 2—3, люты — сакавік 1928 г.). Трэба сказаць, што падарож была старанна падрыхтавана. Аб ёй гаварылася па радыё з Менску, газэта «Савецкая Беларусь» у сваёй рэцэнзіі на № 3 «Наш Край» вельмі цёпла адазвалася аб зьмешчаных матар'ялах.

Набыты вопыт 1927 г. быў пакладзены ў аснову далейшае дзейнасьці Таварыства ў гэтым напрамку. У програму на летні час 1928 г. былі ўведзены 4 падарожы, з якіх тры прызначаліся вывучэньню Слуцкага раёну і адна для азнаямленьня і дасьледваньня часткі тэрыторыі былое Слуцкае акругі.

Намечаныя падарожы адбыліся пешшу на працягу чэрвеня, ліпня і жніўня месяцаў па наступных маршрутах.

Першая падарож (па Слуцкім раёне. Паўночна-ўсходняя частка). Маршрут: Слуцак — Мелешкавічы — Бярозаўка — Папоўцы — Сораг — Міргара — Красная гара — Волашава — Рыжыца — Мелітонава — Вілы — Амговічы — Гутніца — Старэва — Весея — Міхейкі — Слуцак, — працягам 102 в. Патрачана 6 дзён.

Другая падарож (па Слуцкім, Грэскім, Пухавіцкім, Стара-Дароскім раёнах). Маршрут (скарочаны): Слуцак — Васілінкі — Докшыцы — Ушаловічы — Шулякі — Грэск — Маразы — Забелы — Шышчыцы — Замосьце — Вераб'ёва — Вежы — Неспадзянка — Рудзіца — Круглае — Асавец — Шчыткавічы — Леўкі — Дражна — Парэчча — Омельна — Суцін — Жыцін — Крымок — Юравічы — Масеевічы — воз. Скачальскае — Фалічы — Старыя Дарогі — Солан — Горкі — Амговічы — Слуцак, — працягам 267 вёрст. Патрачана 12 дзён.

Трэцяя падарож (па Слуцкім раёне. Паўднёва-ўсходняя частка). Маршрут: Слуцак — Б.-Сьліўскія хут. — Волаты — Саўгас Некрашы — Панічы — Дарасіно — Княжа — Магіла — Урэчча — Слуцак, — працягам 61 вярста. Патрачана 5 дзён.

Чацьвёртая падарож (па Слуцкім раёне. Паўночна-Заходняя частка). Маршрут: Слуцак — Івана Агароднікі — Саўгас Івань — м. Леніна — Шэлавічы — Лапацічы — Сяроднікі — Старцавічы — Падліпцы — Бязьверхавічы — Слуцак, — працягам 46 в. Патрачана 3 дні. Такім чынам чатыры падарожы ў 1928 г. занялі часу 26 дзён.

За гэты тэрмін пройдзена пешшу 449 в. і па чыгунцы 18 в., разам 467 в. Апрача вялікага ліку апісальнага матар'ялу, зроблена 351 замалёўка, з якіх: 265 узораў народнага орнамэнту, 8 схэматычных плянаў замчышч, гарадзішч, сядзіб, будоўляў; 43 краявіды, 22 малюнкі будоўлі прыватных, культавых, заводаў; 7 агульных відаў вёсак, 6 — адзеньня, с.-г. прылад, вопраткі і

Наследие слуцкого края

інш. Набыты некаторыя рэчы для музэю.

З пералічанага відаць, што за час свайго існаваньня Слуцкае Т-ва Краязнаўства шляхам падарожай дасьледвала 699 вёрст тэрыторыі, сабраўшы шмат каштоўных матар'ялаў аб сваім краі.

Музэябудаўніцтва на Случчыне


Дзейнасьць у галіне краязнаўчага музэябудаўніцтва распачалася разам з краязнаўчым рухам на Случчыне. Першы камень у гэтай справе быў пакладзены Слуцкай павятовай камісіяй беларусазнаўства ў 1922 г., якая, ня гледзячы на кароткі час свайго існаваньня, шмат зрабіла ў гэтым напрамку. Камісіяй былі абгавораны даклады аб організацыі і пляну Слуцкага музэю радзімазнаўства, а таксама як організаваць школьныя радзімазнаўчыя музэі. Для ажыцьцяўленьня намечанай програмы была складзена асобная камісія, якая і прыступіла да зьбірання матар'ялаў. З 1923 г. працяг дзейнасьці камісіі ў справах музэябудаўніцтва перайшоў да Павятовага Т-ва Краязнаўства. Гэты пэрыод да 1925 г. можна характарызаваць пэрыодам накапленьня багатых каштоўнасьцяй, пераважна гістарычнага і мастацкага характару. Складалася ядро, з якога мелася на ўвазе разгортваньне краёвага музэю. Побач з набыцьцём музэйных экспонатаў, была шырока пастаўлена справа па організацыі бібліотэкі пры музэі. Набыты кніжны скарб складаўся па большасьці з кніжок гістарычнага зьместу і каштоўных старадрукаў. Пад кіраўніцтвам музэйнай падкамісіі быў пакладзены пачатак заснаваньню валасных радзімазнаўчых музэяў, з якіх вядомы ў Грозаве і Леніне 1925 г. трэба лічыць паваротным у справе музэябудаўніцтва. Дзякуючы таму, што галоўная частка музэйнага скарбу складалася з рэчаў, якія маюць агульнадзяржаўнае значэньне, музэй быў пазбаўлены гэтых каштоўнасьцяй, таксама была забрана лепшая частка бібліотэкі. Такія прадметы, як портрэты князей Слуцкіх Алелькавічаў, рукапіснае евангельле XVI ст., епітрахіль і посах XVI ст., срэбная рыза XVI ст., малюнкі вядомага мастака Катарбінскага, — апынуліся ў Менскім Дзяржаўным музэі, а кніжнае багацьце — у Дзяржаўнай Бібліотэцы; засталіся рэчы другараднага і трэцяраднага значэньня, якія і паслужылі для пачатку новага музэябудаўніцтва, разам з заснаваньнем Акруговага Т-ва Краязнаўства. Спадчына, якая засталася ад Павятовага Т-ва Краязнаўства, складалася з 200 музэйных экспонатаў і бібліотэкі з 560 кніжок. Трынаццатага сьнежня 1925 г. на другім агульным сходзе Акруговага Т-ва, прысьвечаным пытаньням організацыйнага характару, быў зачытаны даклад на тэму: краязнаўчы музэй, музэйная праца і першыя крокі ў справе яго складаньня. Думкі, выказаныя дакладчыкам, былі пакладзены ў аснову новага музэябудаўніцтва, па якіх музэй павінен будавацца па прынцыпу 3-х аддзелаў: культурна-гістарычнага, прыродна-географічнага і грамадзка-эканомічнага. Быў узяты напрамак на організацыю музэйнай сэкцыі, у абавязак якой уваходзіла: 1) Распрацоўка пытаньняў у справе зьбіраньня музэйных матар'ялаў. 2) Прыёмка экспонатаў, кніжок, архіўных скарбаў. 3) Апрацоўка і сыстэматыка музэйных матар'ялаў. 4) Складаньне каталёгаў, інвэнтарных опісаў. 5) Выдача кніжок і іншых матар'ялаў для прац сябром Т-ва. 6) Складаньне протоколаў пасяджэньняў і іншых папер, зьвязаных з музэйнай працай. 7) Зьбіраньне выпісак аб сваім краі з розных выданьняў і пэрыодычнага друку. 8) Нагляданьне за парадкам у часы наведваньня і інш.

У музэйную сэкцыю запісалася 32 асобы, пераважна моладзі. Праца была распачата энэргічна: набыта памяшканьне пад музэй, у якое перавезены рэшткі музэйнага і кніжнага матар'ялаў. У справе зьбіраньня экспонатаў быў узяты наступны напрамак: складзена і надрукавана адозва да ўсіх партыйных, савецкіх, грамадзкіх устаноў і грамадзян Слуцкае акругі аб дараваньні матар'ялаў, якія маюць музэйны характар; затым па розных установах разасланы адносьнікі з пералічэньнем тых рэчаў, якія карысна было б атрымаць дзеля адлюстраваньня дзейнасьці ўстаноў. Вынікі атрымаліся досыць здавальняючыя. Таварыству быў адданы архіў Кальвінскае царквы, у якім захоўвалася больш 400 кніжок, пабольшасьці рэлігійнага характару, сярод якіх знайшлося шмат старадрукаў, а таксама некаторая колькасьць рукапісаў, якія адносяцца да гісторыі кальвінізму на Случчыне з паловы XVII ст. Паміж кніжнага багацьця знаходзілася вядомая Кальвінская біблія, надрукованая ў Берасьці 1563 г. Мікалаем Радзівілам Чорным, якая здадзена ў ІБК.

Наследие слуцкого края

Праца ў музэі праходзіла інтэнсыўна: апрацоўваліся гэрбарыі, прыводзілася ў парадак бібліятэка па карткавай сыстэме, складаліся каталёгі. За гэты час музэй павялічыўся на 468 прадметаў і 630 кніжок, так што к 26 кастрычніку, ласьне да дня першай акруговай краязнаўчай конфэрэнцыі, была організавана часовая выстаўка апрацаваных і напалову апрацаваных матар'ялаў. Дзейнасьць музэйнай сэкцыі была адзначана конфэрэнцыяй. Да гэтых часоў трэба аднесьці заснаваньне па акрузе краязнаўчых музэяў у Копылі, Любані, Старых-Дарогах і Старобіне. З 1927 году праца па музэябудаўніцтву ў Слуцку яшчэ больш узмацнілася. Праўленьнем Т-ва былі асыгнаваны 100 руб. на абсталяваньне, каб зрабіць яго даступным да агляду шырокіх мас працоўных. На асыгнаваныя грошы былі заказаны вятрыны, скрынкі, шчыты і некаторая мэбля. Такім чынам к 28 сакавіка, да дня акруговага зьезду Саветаў, музэй быў адчынены раней для агляду дэлегатаў, а потым і для грамады. З гэтага часу праца музэю пачынае ўваходзіць у звычайную калею — ён рэгулярна адчыняецца па два разы на тыдзень для агульнага агляду, праца сэкцыі ня спыняецца, паступленьне экспонатаў пашыраецца. На працягу 1927 г. паступіла 760 розных музэйных рэчаў і 144 тамы літаратуры. Дараваны яны былі наступнымі ўстановамі: 1) Слуцкім Акрвыканкомам — 145 пр.; Слуцкай электрастанцыяй — 14; Акрздравам — 54; Акрземаддзелам — 23; Рабоча-партыйным клюбам — 28; Аграномічным пунктам Слуцкага раёну — 11; Саўгасам Старчыцы — 6; Любаньскім раённым таварыствам краязнаўства — 9; разам 298 прадметаў і 16 прыватнымі асобамі 462 прадметы. Затым паступіла 135 прадметаў ад краязнаўчай падарожы па Случчыне, якія за недахопам сродкаў, нейкі час знаходзіліся не апрацаванымі. Музэй карыстаўся шырокай папулярнасьцю. За час з 23 сакавіка і да 25 верасьня прайшло 7254 гледачы, сярэднім па 150 асоб у музэйны дзень і 12 організаваных экскурсій, з агульным лікам 559 чалавек. Канец 1927 г. прынёс нейкі застой у працы. Ліквідацыя Слуцкай акругі значна адбілася і на справе музэябудаўніцтва; пераход на палажэньне раёну скараціла сродкі Т-ва, дзякуючы чаму прышлося скараціць на адзін дзень агляд музэю, але тым часам павялічэньне яго працягваецца. Спачатку 1928 г. паступіла 317 новых экспонатаў і 11 кніжок краязнаўчае літаратуры. К сучаснаму моманту музэй налічвае 1766 экспонатаў, якія разьмешчаны па трох аддзелах: 1) Культурна-гістарычным — 654 пр. 2) Прыродна-географічным — 859 пр. 3) Грамадзка-эканомічным — 523 пр.

Бібліятэка складаецца з 1354 кніжок, з якіх 255 па Беларусазнаўству і краязнаўству, 260 старадрукаў і 830 рознага зьместу. Ёсьць некаторая колькасьць рукапісаў, якія адносяцца да XVII—XVIII—XIX ст. Негатыўны архіў складаецца з 115 негатываў. Пры музэі ёсьць прэсы для сушкі расьлін, компас і інш. прылады. З пэрыодычнага друку выпісьваецца «Наш Край» і газэта «Савецкая Беларусь».



У адным з залаў Слуцкага музея. Фота з часопіса «Наш край».

Наследие слуцкого края

1929 г. № 1.
Усевалад Мікіцінскі

ДВАНАЦЦАЦЬ ДЗЁН КРАЯЗНАЎЧАГА ВАНДРАВАНЬНЯ

(Матар'ялы з падарожы па Слуцкім, Грэскім, Пухавіцкім і Стара-Дароскім раёнах)

Ад Слуцку да Грэску

...Ад Васілінкаўскіх хутароў даходзім да Бокшыцкіх пасёлкаў. Відаць, што гаспадары жывуць нішто сабе: будова добрая, некаторыя пазаводзілі невялічкія садочкі, у якіх пануючым дрэвам з'яўляецца вішня. Адсюль зьвярнуўшы ўбок, пайшлі на вёску Ушаловічы, да якой і даходзім збожжавымі палямі. Вёска невялічкая, уся ў дрэвах, гэта значна яе прыхарошвае. Характэрнай асаблівасцю трэба лічыць багацьце ўзораў орнамэнту, якімі аздоблены вокны і шчыты на хатах. Тут упяршыню прышлося заўважыць сучасныя мотывы ў аздабленьнях: часта сустракаюцца пяцікутныя зоркі, сярпы, малаткі, усё гэта скампанавана досыць удала.

Шулякі вёска досыць значная, налічвае 103 хаты, з надворнага боку нічым не адзначаецца. Жыхарства жыве бедна з прычыны дрэннае глебы; частка іх аб'яднана ў малочную арцель, якая вырабляе сыры. У Шулякох знаходзіцца сельсавет, школа, прыпынак пошты. Недалёка, на так званым Хрэнаўскім полі, раскідана каля 10 курганоў, у большасьці раскопаных, дзе траплялiся знахадкі каменных малаткоў. У адлегласьці 1 кілёмэтру дарогу прарэзвае невялічкая рачулка, з чыстай вадой і берагамі парослымі алешнікам. Далей праходзім балотлівай нізінай, хмызьнякамі, якія паступова пераходзяць у значны алешнік і бярэзнік. Трохі прайшоўшы, мясцовасьць прымае іншы характар, пераходзячы ў больш узвышаную і пяшчаную. Тут мэтрах у 60 ад дарогі раскідана каля 6 вялікіх курганоў, а ля самае дарогі прытуліўся ветраны млын; значна далей, сярод купін дрэў відаць хутары. Не даходзячы кілёмэтры 4—5 да Грэску, мінуўшы вёску Боркі, знаходзяцца былыя торпараспрацоўкі і цагельня, якія ў сучасны момант не працуюць...


Мястэчка Грэск

...Грэск лічыцца адміністрацыйным і культурным цэнтрам Грэскага раёну Менскай акругі. З надворнага боку ён не падобен да нашых мястэчак, якія маюць свой спэцыфічны твар, гэта хутчэй будзе вялікая вёска. Распаложана мястэчка на значных узгорках, што надае яму харство. Вуліц ёсць 8: Лава, Крывая, Краўцовая, Замагільная, Шышчыцкая, Сьцяпкоўская, Аселіца і Куток. Пры ўваходзе ў мястэчка стаіць ветраны млын. Прайшоўшы троху далей, вуліцу перасякае безназоўны ручай, ад якога, праз мост, дарога досыць крута падымаецца ўгору. Па левы бок маста, над ручаём узвышаецца аграмадная гара, пад назвай «Замчышча». Тут, у далёкім мінулым, стаяў замак, аб якім сярод жыхарства захаваліся розныя паданьні. Прайшоўшы яшчэ троху, да верхавіны ўзгорку, трапляем на вялікую плошчу, дзе пры ўваходе з правага боку знаходзіцца школа і коопэратыў, а з левага — аптэка і амбуляторыя. Наўкол плошчы разьмешчаны: Райком комсамолу, інтэрнат для служачых розных устаноў, пара піўных, другі коопэратыў, райміліцыя і пошта; потым ідуць некалькі прыватных крамак дробнага гандлю. Амаль пасярэдзіне плошчы знаходзіцца царква з каменнай брамай, досыць цікавай архітэктуры. Абнесена царковішча парканам з цэглы і абсаджана вялізарнымі ліпамі. Недалёка царквы стаіць каменная капліца, каля якой знаходзіцца мясная крама. Праз нейкі завулак, або двор, трапляем на другую плошчу, дзе ў вялікім будынку зьмяшчаецца РВК, каля якога ў прыгожым памяшканьні знаходзіцца сельсавет і клюб, які мае бібліотэку і радыё. Прыватныя дамы нічым не адрозьніваюцца ад звычайных сялянскіх хат, крыты яны ў большасці саломай. Двары пазавалены розным сьмецьцем і толькі сям-там пры дварох ёсць невялічкія сады з пладовымі дрэвамі. Насельніцтва ў Грэску налічваецца каля 2000 чалавек, з якіх сямействаў 15 яўрэяў, якія займаюцца дробным гандлем, саматужніцтвам і земляробствам. Беларускае насельніцтва выключна земляробскае; сеюць: жыта, авёс, ячмень, картоплі, але з прычыны дрэннае глебы ўраджаі бываюць нязначныя, што прымушае некаторую частку насельніцтва шукаць пабочнага заробку, асноўным з якіх і зьяўляецца здабыванне вапняку і апальваньне вапны...

Азнаёміўшыся з мястэчкам, накіраваліся для агляду помнікаў старасьветчыны, выдатнейшым з якіх трэба лічыць замчышча. Трэба адзначыць, што Грэск мае сваю

Наследие слуцкого края

значную гісторыю. Першыя весткі аб ім сустракаюцца пад 1558 г., з якіх відаць, што ў гэтыя часы ён належаў да Мартына Валатковіча, прычым паміж апошнім і кн. Слуцкім Юр'ем і Сымонам Алелькавічамі вяліся спрэчкі з прычын захопу Алелькавічамі зямлі Валатковіча ў м. Грэску. У 1570 г. прывілеем караля Жыгімонта Аўгуста Грэск атрымоўвае правы мястэчка, і ў ім засноўваюцца штотыднёвыя таргі. У пачатку XVIII ст., ласьне ў 1723 г., Грэск зьяўляўся маемасьцю кн. Радзівіла-Гітнэра. У часы ўвядзеньня уніі Грэская царква была абернута ў уніяцкую. Яшчэ ў канцы XIX ст. наўкола Грэску і нават на двары папа было шмат курганоў, якія мясцовае насельніцтва зьвязвае з часамі мангольскіх нападаў. Трэба адзначыць, што ў Грэску ўсе гістарычныя паданьні гавораць аб гэтых часох, што сьцьвярджаецца некаторымі знаходкамі, пры частковых раскопках на замчышчы. Але перш, чым гаварыць аб іх, спынімся на апісаньні гэтага выдатнага помніку. Знаходзіцца замчышча ў адлегласьці 150 мэтраў ад моста і мае па верхняй плошчы ў даўжыню 100 мэтраў і шырыню 85 м. Узвышаецца яно над роўнем вады ў ручаі прыблізна мэтраў на 15, абкружана глыбокім і шырокім ровам, дзе працякае ручай, які, злучаючыся з ровамі, забясьпечваў ад подступаў да замку. У сваю чаргу ручай быў зьвязаны з возерам, ад якога засталіся адзнакі ў выглядзе балотца, пад назвай «Азярышча». Знаходзіцца апошняе ў адлегласьці 1 ½ в. ад замчышча. Равы калісьці былі глыбокімі і шырокімі, бо зараз на іх дне і часткова па схілах распаложаны гароды, палеткі і паасобныя сядзібы. Пасярэдзіне замчышча захавалася ўзвышэньне, на якім, мабыць, стаяў замак. Уся плошча замчышча была абкружана нейкімі акопамі ў выглядзе ламаных ліній, якія ў некаторых мясцох добра захаваліся. Да якіх часоў яны адносяцца, — невядома. Схілы замчышча стромкія, акрамя месца з боку моста. На паўночным усходзе засталіся рэшткі нейкіх слупоў і каменьня, як відаць былога моста, па якім замчышча злучалася з тэрыторыяй. Уся паўночна-ўсходняя частка замчышча парасла вялізарнымі грабамі і вязамі, якія выцягнуліся ланцугом. Паўночны бок зрыты значнымі ямамі, з якіх насельніцтва брала вапняк. На замчышчы таксама захаваліся акопы часоў імпэрыялістычнае вайны. Тутэйшыя людзі апавядаюць, што ў даўнія часы на гары стаяў княжыцкі замак, наўкол якога, на нязначнай адлегласьці, былі распаложаны слобады замкавых людзей, прызначаных для абароны замку; апошні быў зьнішчаны ў часы мангольскага нападу. Гэтае паданьне сьцьвярджаецца некаторымі фактычнымі матар'ялами, здабытымі пры капаньні вапняку і досьледамі мясцовага настаўніка-краязнаўцы Сасноўскага. Апошнім у 1927 г. на паўночна-ўсходняй частцы замчышча была раскопана магіла, на якой ляжаў намагільны камень у форме сэрца. У магіле знайшлі добра захаваны касьцяк, галавой на захад. Пры шкілеце ляжаў мэталёвы значок, які, паводле меркаваньняў мясцовых знаўцаў, адносіцца да вайскова-началь-



Мястэчка Грэск. Агульны від з замчышча. Малюнак з часопіса «Наш край».

Наследие слуцкого края

ніцкай адзнакі. Чэрап быў старанна дасьледваны доктарам, які прызнаў яго бязумоўна мангольскім. Сярод касьцякоў, якіх шмат знаходзілі на замчышчы, трапляліся дзіцячыя і жаночыя. Гадоў 6 таму назад сяляне, капаючы вапняк, трапілі на нейкія падземныя лёхі, вылажаныя цэгламі, пры ўваходзе ў якія былі складзены запасы яе, цэглу насельніцтва пазабірала; дасьледваць лёхі пабаяліся, так яны паступова засыпаліся, і месца гэтае цяжка знайсьці. На верхняй плошчы замчышча ў часе раскопваньня наткнуліся на нейкую вузкую, круглую трубу, вымураваную цэглай, мабыць студню, у якую апускалі доўгую жардзіну, але дна не дасталі. Гэтае месца і зараз можна пазнаць па дзьвюх упадзінах, якія кожны год патроху асядаюць.

Гісторыю недалёкага мінулага Грэску лепш за ўсіх памятуе селянін Сямён Вітка, ён самы стары чалавек у мястэчку. Паводле слоў, каля Грэску было шмат лесу. Грэск быў тады нязначным мястэчкам у 100 двароў. На ўсё мястэчка было 10 коняй, зямлю апрацоўвалі на валох. Ён казаў, што выпальваньне вапны вядзецца з даўных часоў, яшчэ дзяды яго бацькоў займаліся гэтым. Пры абшарніку за права выпальваньня вапны плацілі падатку 10 р. у год. У Грэскіх лясох вадзілася шмат зьвярыны, лясы-ж служылі прытулкам хлопцам, якія ўцякалі ад набору ў рэкруты, хаваючыся ў іх ад Пакрава да Раства. Царква не захавала ніякай старажытнасьці, пабудавана яна замест згарэўшае ў 1848 г. З боку архітэктуры досыць цікавая...

Калісьці у Грэску было Краязнаўчае Т-ва ў 48 асоб, старшынёй якога быў тав. Сасноўскі, але паступова праца замірала і, ня гледзячы на гэроічныя меры апошняга, зусім спынілася, існуе цяпер толькі на паперы. Як адзнакі былое дзейнасьці захаваліся пры школе некаторыя музэйныя рэчы і апісальныя матар'ялы. Азнаёміўшыся з мястэчкам і па мажлівасьці дасьледваўшы, зайшлі на разьвітаньне да тав. Сасноўскага, які параіў нам заглянуць у мясьціны, цікавыя з краязнаўчага боку. Такім чынам 26 ліпня а 10 гадзіне раніцы пакінулі Грэск і накіраваліся на Вераб'ёўскія лясы.

Ад Грэску да Вераб'ёўскіх лясоў

Выходзячы з мястэчка, праходзілі каля паравога млына, які не працаваў. Дарога да вёскі Маразоў ідзе сярод розных пасеваў; лясы да якіх мы так імкнуліся, яшчэ далёка, ледзь адзначаюцца на небасхіле сіняй стужкай. Маразы — вёска маленькая, хат 25, але мае сваю асаблівасьць: хаты ў ёй стаяць па адзін бок вуліцы, а гаспадарчыя — насупраць па другі бок. Дамы ў адносінах да вуліцы расплянаваны парознаму, то шчытамі да яе, то бокам. Наступная вёска Забелы ня больш дзьвюх вёрст ад Маразоў. Паміж гэтымі вёскамі ў паўднёва-ўсходнім напрамку, каля дарогі раскідана група курганоў да 40 штук. Забелы — нязначнае паселішча, двароў ня больш 25. У вёсцы ёсьць цікавая з архітэктурнага боку царква, багата аздобленая рознымі орнамэнтамі. Час не дазваляе доўга затрымлівацца ў вёсцы, таму рушым далей у вёску Шышчыцы, да якой і даходзім збожжавымі палямі.

Шышчыцы зьяўляюцца адміністрацыйным пунктам Шышчыцкага сельсавету... Вёска мае дзьве вуліцы, адна з якіх распаложана на ўзгорку, а другая праходзіць часткова па нізіне, дзе працякае маленькая рачулка Жалезьніца, якая ўпадае ў Случ. У часе вясновае павадкі, а таксама пасьля значных дажджоў, яна выходзіць з берагоў, залівае нізінную частку вуліцы, наносячы шмат страт і клопату. Вёска мае двароў каля 105, будова ня дрэнная, хаця сялянства жыве бедна. Вуліцы гразкія, з прэтэнзіяй на брукаваньне, якое выяўляецца ў тым, што сяляне без усякае сыстэмы кідаюць на іх каменьні. Абапал вуліц пракопаны канаўкі, над якімі з розных дручкоў і кавалкаў дошак змайстраваны саматужныя тротуары, небясьпечныя для пешаходаў. Сярод будынкаў кідаецца ў вочы значны лік новых хат, гэта вынікі пажару 1921 году.

Глеба ў сялянства дрэнная — пяшчаная за выключэньнем невялікага кавалку па нізіне ля рэчкі, дзе распаложаны гароды. Сяляне з нецярплівасьцю чакаюць таго часу, калі іх расплянуюць на пасёлкі, а тым часам вёска ўсё расьце і расьце. Неўрадлівая глеба вымагае шукаць пабочных заробкаў, якімі і зьяўляюцца лесарубства і возка. У вёсцы знаходзяцца наступныя ўстановы: сельсавет, 2-х комплектная школа, спажывецкая крама, пажарная дружына. Пры сельсавеце ёсьць ложак для маючых патрэбу пераначаваць, утрымоўваецца ложак чыста, коўдра і падушкі добрыя...

Адзначаюцца Шышчыцы некаторай старасьветчынай: пры ўваходзе ў вёску,

Наследие слуцкого края

збоку Забел, на могілках стаіць старая капліца ў выглядзе 2-х скрынак, з якіх адна меншая, стаіць на большай, з нейкай цыбулінкай замест купалу, але, не зважаючы на простую архітэктуру, яна захоўвае значныя вартасьці ў якасьці вобраза «божай маці», прыгожага пісьма і пераноснага вобраза з подпісам 1791 г. Таксама сяляне апавядаюць, што на значнай адлегласьці ад ручаю Жалезьніцы знаходзяцца рэшткі нейкіх слупоў з жалезнымі ланцугамі і колцамі. Па іх думцы, на гэтым месцы была калісьці прыстань нейкай буйной у мінулым рэчкі.


Разьвітаўшыся пабратэрску з працаўнікамі сельсавету, пайшлі далей. Праходзячы праз вёску, заўважаем у аздабленьні хат орнамэнты на сучасныя мотывы, скомпанаваныя з пяцікутных зорак.

У вёску Замосьце ідзем не па дарозе, а па вузкай сьцежцы сярод жытняга мора. Вёска Замосьце, як і Шышчыцы, распаложана на значным узгорку. Мае адну вялікую і тры невялічкія вуліцы. Адна з якіх досыць крута падымаецца ў гору, на якой стаіць касьцёл. Налічвае вёска 124 хаты. Насельніцтва ў пераважнай частцы каталікі, як і ў вакольных засьценках і хутарох. Жыве насельніцтва бедна, глеба пяшчаная, неўрадлівая. Падсобным заробкам для жанчын служыць зьбіраньне грыбоў і ягад, па якія яны ходзяць грамадой вёрст за 10—15, у самыя гушчары грэскіх лясоў. Ягады і грыбы яны праменьваюць у бязьлесных вёсках на лён. Цікава адзначыць, што каміны тут лепяць з гліны, беляць іх і ўтыкаюць дробнымі каменчыкамі. Як касьцёл, так і званіца адзначаюцца простасьцю архітэктуры. Абнесены касьцёл парканам і абсаджаны дрэвамі, каля якіх прыкметна некалькі курганоў. Ад Замосьця да славутых грэскіх лясоў зусім блізка.

Вераб'ёўская пушча

З Замосьця кіруемся на Вежы, дзе ў гушчыні Вераб'ёўскае пушчы, як мядзьведзь у бярлозе, зарыўся ўсім вядомы гр. Міхась Шклярэўскі, аб якім ходзяць самыя фонтастычныя чуткі. Завуць яго дзікім чалавекам; вось туды і ідзем, каб пазнаёміцца з Шклярэўскім...

На другі дзень чуць золак усхапіліся і пайшлі аглядаць Вераб'ёва. Пасёлак невялічкі. Раскінуўся сярод лесу. Тут калісьці была лесапілка, спаленая бандытамі ў 1921 г. Працавала яна вельмі жвава. Ад яе і да ст. Рудзенск была пракладзена вузкакалейка для вывазу лесаматар'ялаў, але ў сучасны момант ад яе нічога не засталося, затое атрымалася добрая дарога. Пасёлак складаецца з памяшканьняў лясьніцтва і пасобных дамоў, у якіх калісьці зьмяшчаліся рабочыя заводу. Пасьля пажару пільні частка рабочых засталася на месцы, заарэндавала зямлю і дамы ад лясьніцтва. Канторa лясьніцтва, а таксама кватэры служачых зьмяшчаюцца ў вялікім будынку, абсажаным наўкол бэзам, тут-жа ёсьць пладовы сад. Каля саду і будоўлі праходзяць прысады, абсаджаныя лісьцьвеніцамі, клёнамі і елкамі. Пасёлкавыя дамкі параскіданы



Хутар Вежы гр. Міхася Шклярэўскага (Грэскі раён). Малюнак з часопіса «Наш край».

Наследие слуцкого края

сярод лесу нібы дачы, даглядаюцца яны, відаць, ня вельмі добра. У кожным доме жыве па некалькі сямействаў. Насельніцтва займаецца земляробствам, хаця ўмовы для гэтага няспрыяючыя з прычыны глыбокіх пяскоў. Апрача земляробства, людзі насьць служыць у лясьніцтве, альбо так ці іначай зьвязана з ім, працуючы ў лесе.

Трэба адзначыць, што некаторыя жыхары жывуць ніштo сабе: маюць сенажаці, трымаюць жывёлы. Праз Вераб'ёва працякае рачулка Жалезьніца. У пасёлку ёсьць смалярня, якая вырабляе смалу і неачышчаны шпігінар.

Лясьніцтва займае плошчу ў 53 000 дзесяцін, пераважна лесу, сярод якога галоўнай пародай з'яўляецца хвоя і елка з падмешкай дубу, бярозы і алешніку.

Агледзеўшы Вераб'ёва, на разьвітаньні з гаспадаром пытаем бліжэйшую дарогу на Вежы, што выклікае з боку апошнага сьмех, бо там жыве ўсім вядомы дзік-Шклярэўскі.

Па прыгожай лясной дарожцы пасунуліся ў Вежы; час праходзіць няпрыкметна, але на скрыжаваньні некалькіх дарог прышлося спыніцца і паразважаць куды ісьці. Параіўшыся паміж сабой, абіраем наўгад прасеку, па якой і пайшлі. Праблыталіся па карэньнях, валежніку і ямах, нечакана наткнуліся на нейкую сядзібу сярод лесу, абкружаную жардзёвым досьць высокім плотам. Спачатку думалі, што гэта нейкі загон для жывёлы, але хутка пераконваемся, што тут жывуць людзі. Падыходзім бліжэй, становімся на бярвеньне, што ляжыць па наш бок, заглядаем у двор. Прысутнасць нашу пачулі сабакі, паднялося выцьцё, з якім яны кінуліся ў дзіркі плоту. На гэты гвалт вышла маладая, прыгожая дзяўчына, якая, супакоіўшы сабак, моўчкі падышла да нас. Вітаемся і пытаем бліжэйшае дарогі на Вежы. Яна зьдзіўлена глядзіць і адказвае, што гэта і ёсьць Вежы. Далей зноў запытаньне: дзе жыве Шклярэўскі? Зноў адказ: тут і жыве! Такім чынам мы неспадзявана трапілі ў самае логава так званага дзікуна. Просім дазволу ўвайсьці ў двор, на што атрымоўваем поўную згоду зусім няпужлівае дзяўчыны. Але трапіць туды не так проста, бо прыбор у фортцы вельмі складанай сістэмы, адным Шклярэўскім вядомай, але нарэшце пры дапамозе маладой гаспадыні ўваходзім у двор. Вось тут ёсьць на што паглядзець! Запраўдны музэй рознай старажытнасьці быту, якой месца ў этнаграфічным музэі. Доўга ня думаючы, прымаемся за справу, валім свае скруткі і торбы на бярвеньне і пачынаем замалёўваць.

Гаспадыня кудысьці пайшла, і мы засталіся адны ў варожым абкружэньні сабак, якія, негасьцінна пазіраючы на нас, бурчэлі.

Раптам пачулі нейкі гоман, адчыніліся вароты і ў двор, як хваля, хлынула стада розных жывёлін: тут было галоў 15 рагатае жывёлы, сьвіньні, авечкі, цяляты і два прыгожыя крутарогія валы. Далей пачынаем агляд «музэю».

Двор, як было заўважана раней, абгароджаны з чатырох бакоў досьць высокім парканам з жэрдак. Трапіўшы ў двор праз фортку, зьдзіўлена глядзіш, чаго тут толькі няма: бярвеньне, дручкі, сукі, калодкі, жэрдкі, хвораст, гной, карыты; усё гэта параскідана па ўсім двары, — адным словам нейкі гармідар. Хата ад двара аддзяляецца нявысокім плотам без форткі, і, каб трапіць у хату, трэба пералазіць праз плот. Сама хата — маленькі зруб з 2 маленечкімі вакенцамі, знаходзіцца пад аднэй страхой з хлевам, у якім ёсьць толькі адна сьценка, адкуль зроблены выхад у лес. Шчытоў у хаце няма, вецер вольна гуляе пад дахам; няма таксама сенцаў.

Заглядаем пад дах, — коміну нідзе ня відаць, замест яго над дзіркай у столі стаіць калода, на якую наўскос пакладзена дошка, прызначаная служыць комінам. Дым і іскры, выходзячы з печы праз дзірку, трапляюць у дошку, па якой выходзяць з хаты. Тут-жа, каля хаты па-за плотам стаіць маленькае, як грыбок, гуменца, каля якога градкі гародзіны, студня, палеткі збожжа і бульбы.

У часе агляду зьявіўся і сам гаспадар, які касіў на балоце траву. Глядзім на яго, шукаючы адзнак дзікуна, але пераконваемся, што гэта звычайны чалавек гадоў за 45, сярэднага росту, досьць плячысты, з загарэлым тварам, з блакітнымі вачыма, якія глядзяць з нейкім сумам. Апрануты ён у звычайную сялянскую вопратку. Тут мы вітаемся, кажам, што прышлі паглядзець яго цікавую гаспадарку. На ўсе запытаньні гаспадар адказвае ахвотна, гаворачы, што жыве бедна, але скардзіцца толькі на тое, што зямля яго параскідана кавалкамі на розных мясцох, што перашкаджае гаспадарцы.

Наследие слуцкого края

Затым гаспадар запрашае ў хату, што нам было і патрэбна. Увайшоўшы, не адразу арыентуешся, вочы разьбягаюцца, усё цікава. Падлога ў хаце земляная, у розных ямінах, хата складаецца з аднаго пакойчыку, значную частку якога займае печка дапатопнага тыпу, комін якой даходзіць толькі да столі, дзе зроблена дзірка, праз якую выходзіць дым.

Не хаціла цэглы! — кажа гаспадар. — Усё ніяк не зьбяруся з грашыма і часам!

Пад печкай выкапана глыбокая яма, у якую Шклярэўскі хавае бульбу на зіму. Каля печкі на жардзінках збудаваны палаці, пад якімі змайстраваны з негабляваных дошак невялічкія дзьверцы ў хлеў да жывёлы. У адным куце стаіць стол і лаўка, на стале парасстаўлена гліняная і драўляная пасуда, сярод якой чаротказая міска ўласнага вырабу. Уся хата пазастаўлена кадушачкамі і цэбрыкамі з жытам. У другім куце прытуліліся маленькія кросенцы, а на жардзінах пад стольлю вісяць маткі нітак. У трэцім куце зьмяшчаюцца жоранцы, на якіх гаспадар сам меле для сябе і жывёлы. Вырабляецца мліва такое грубое, што сьпечаны хлеб рассыпаецца на грудкі, у якіх сустракаюцца неразмолатыя часткі зерняў. У часе гутаркі ўвайшоў у хату хлопчык гадоў 13 — сын Шклярэўскага, якога ён сам выхоўвае. З размовы з Шклярэўскім выяўляецца, што ён прыхільнік натуральнае гаспадаркі, яго прынцып ня купляць таго, што можна зрабіць самому. І запраўды — гэта універсальны чалавек. Ён сам усё вырабляе: аўчыны, з якіх шые кажухі, дубіць скуры, шые боты, тчэ палатно, шые вопратку, вырабляе пасуду, гаспадарчыя прылады і г.д. Купляе ён толькі соль ды сярнічкі, а замест газы ўжывае карчы, якія паліць на прыпечку. Коней Шклярэўскі ня трымае, зямлю апрацоўвае на валох, якія, кажа, больш выносьлівыя і патрабуюць менш дагляду; езьдзіць ён таксама на валох. На запытаньне, што прымушае яго весьці так прымітыўна гаспадарку і жыць жыцьцём першабытнага чалавека, ён адказвае, што так лепш, бо так жылі нашыя дзяды, а я чалавек стары, так няхай усё будзе пастарому...

Аглядаючы гаспадарку, спыняемся на нейкай невядомай для нас прыладзе, якая складаецца з дзьвюх калодак, некалькіх дошак і кліноў. Пытаем аб прызначэньні іх, аказваецца, што гэта алейны завод Шклярэўскага. Тут ён засыпае насеньне паміж дзьвюх дошак, заганяе кліны і зажымае так моцна, што выціскае алей.

Гэта што, — кажа гаспадар, — вось у мяне ёсьць плужок, якога вы зараз нідзе ня сустрэнеце!

І запраўды, — рэч вельмі цікавая! Зрабіла яе сама прырода, а Шклярэўскі дапасаваў да сваіх патрэб. Плужок гэты ня больш, як дубовы сук, адзін канец якога зацёсаны і, к сораму Шклярэўскага, абабіты жалезам; да другога канца, у якасьці ручак, прымацаваны два кіёчкі. Вось і ўся прылада, якая служыць для абгону бульбы.

Але час пакінуць гэты цікавы куток, складаем свае падарожніцкія прылады... Адышлі досыць далёка, а лясны жыхар усё яшчэ махаў рукамі, накіроўваючы нас на адны яму вядомыя сьцежкі праз сухія балотцы і праз канаўкі.

Ідзем пакуль моўчкі, уражаньне засталося вельмі моцнае, выплывае шэраг пытаньняў, на якія стараешся даць адказ, каб зразумець, што прымусіла яго, Шклярэўскага, да такога прымітыўна-першабытнага жыцьця. Адно мы зразумелі, што гэта ня дзікун, які ходзіць у скурах, як нам казалі, а звычайны чалавек, якога нейкая жыццёвая прыгода прымусіла замкнуцца думкамі, схавацца ад людзей, каб у цяжкай працы, сярод лесу і зьвярыны знайсьці супакой.

З гутарак з ім, а таксама паводле слоў сялян вакольных вёсак шмат чаго прышлося даведацца аб яго жыцьці. Родам Шклярэўскі з вёскі Варкавіч, што ля самага Слуцку, дзе ён меў зямлю і хату. Потым раптам кінуў гаспадарку ў Варкавічах, купіў 17 дзесяцін пяску ў лесе. Пасяліўся ён спачатку ў зямлянцы, больш падобнай да нейкай зьвярынай бярлогі. Гаспадарка спачатку была маленькая, але потым, дзякуючы ўпартай працы, пашырылася. Збудаваў сабе з дапамогай людзей хату, у якой і жыве. Людзі апавядаюць шмат дзіўнага і жудаснага пра яго жыцьцё. Кажуць, прыкладам, што ён за нязначныя правіннасьці жорстка караў сваю жонку: распранаў яе і зьвязаную голую саджаў на некаторы час у раскапаны мурашнік. Анэгды, гадоў 10 таму назад, жонка ня вытрымаўшы зьдзеку, уцякла ад яго, пакінуўшы яму малую дзяўчынку і хлопчыка 1 ½ гадоў, а сама са старэйшай дачкой пайшла

Наследие слуцкого края

жыць у Варкавічы. Шклярэўскі сам гадаваў і даглядаў дзяцей. Цяпер дачка выросла ў прыгожую і здаровую дзяўчыну, а хлопчык дапамагае ў гаспадарцы. Шклярэўскі сам вучыць сына грамаце, прычым замест паперы яны крэйдай на завэндзанай столі выводзяць літары і лічбы. Людзі кажуць, што ён скончыў гарадзкое вучылішча...

Падрыхтавала Н.В.Матыліцкая.

З публікацый пра даследаванне Случчыны ў газеце «Савецкая Беларусь»

16 снежня 1928 г.

СЛУЦКАЯ СТАРАСЬВЕТЧЫНА

Мінуўшчына досыць багата адзначыла Слуцкі райён памяткамі сівых часоў, даўнасьць якіх пачынаецца з так званага каменнага веку (нэоліту). Да гэтых часоў адносяцца знаходкі каменных сякер, малаткоў, цеслаў, кліноў. Самую значную колькасьць помнікаў нам пакінуў курганны пэрыяд. Дагэтуль зарэгістравана па райёну да 400 курганоў. Вёскі — Агароднікі, Падзеры, Цараўцы, Гарадзішча, Княжа-Магіла, Нежараўскія хут., вёска Сорагі, ваколіцы Мір-Гары, Краснае Гары, в. Бязьверхавічы, Лесішча, Бранава, Еўлічы, Бакшыцы, Казловічы і інш. групуюць каля сябе цэльныя курганныя могілкі, часамі значныя па ліку пахаваньняў; гэтак каля вёскі Княжа-Магіла знаходзіцца 127 курганоў, а ў ваколіцах Сорагаў — 69. Некаторыя паселішчы атрымалі свае назвы з прысутнасьці таго ці іншага помніку: такімі зьяўляюцца вёскі Курганы, Княжа-Магіла, Гарадзішча. Мясцовае жыхарства шмат апавядае розных паданьняў і лягенд, складзеных наўкол помнікаў; вось прыкладам, курган-вялікан «Княжа-Магіла» (вышынёй 4 мэтры і наўкол 65 мэтраў), па іх думцы, гэта — магіла князя, забітага на вайне, са слоў іншых з рэўнасьці другім князем, тут быццам закопана залатая шапка. Яшчэ зусім нядаўна сяляне насілі ахвяры, драўляныя саблі і стрэльбы, якія вешалі на дрэве.

У мястэчку Леніна (Раманава) з існаваньнем вялікага Замчышча зьвязана імя князя Рамана, які з дружынай рабіў разбойныя напады на праяжджаўшых купцоў. У палове кілёмэтру ад в. Амговіч знаходзіцца гарадзішча, на якім трапляюцца чарапкі глінянае пасуды самай прымітыўнай апрацоўкі. Далей, каля савгасу Івань, ёсьць кальцавы насып «Замачак», у якім, па паданні, зьмяшчаўся стан Пятра 1-га ў часы вайны са швэдамі. Каменныя крыжы захоўваюцца на могілках вёсак Падзеры, Варкавічы і Стэфанаўскіх — каля гораду. Нарэшце, г. Слуцак, якога гісторыя ў 1116 годзе застае ўжо горадам, зьяўляецца сапраўдным музэем гістарычных помнікаў і вартасьцяй. Аграмаднае замчышча ў самым цэнтры гораду, рэшткі цытадэлі, равоў і земляных крэпасных узмацаваньняў кідаюцца ў вочы; але, галоўным чынам, Слуцак захаваў шмат помнікаў архітэктуры, пераважна ў культавых будовах, з якіх 10 помнікаў узяты дзяржавай пад ахову.

Дзяржаўны музэй у Менску, а таксама слуцкі краёвы музэй часткова адлюстроўваюць у сваіх калекцыях культуру старых часоў Случчыны.

У.

25 ліпеня 1929 г.

АРХЕОЛЁГІЧНЫЯ ДОСЬЛЕДЫ НА СЛУЧЧЫНЕ

З 10 па 18 ліпеня ў г. Слуцку і яго ваколіцах працавала археолёгічная экспэдыцыя БАН.

За гэты тэрмін ускрыта 27 курганоў, 2 гарадзішчы, абсочана да 300 курганоў і выкрыта стаянка бронзавага веку.

Асаблівую цікавасьць прадстаўляюць досьледы Слуцкага гарадзішча, з якіх відаць, што апошняе пабудована на невялікім узгорку пры р. Случы і ўтоку ў яе ручая Бычка.

Тоўшча культурнага слою і розныя знаходкі паказалі, што гарадзішча ўзьнікла не пазьней 6—7 веку.

У першы пэрыяд гістарычнага жыцьця яно, акрамя непасрэднага свайго прызначэньня як умацаваньне, служыла месцам культавых абрадаў.

Знойдзены кавалкі лепнае пасуды, косткі і зубы бабра, быка, лася, дзіка і хатніх жывёлін.

Прыблізна ў X—XI ст. гарадзішча было перабудавана падсыпкай краёў і ўмацавана дубовай сьцяной.

У верхнім слоі яскрава выражана культура X—XIII ст.

Наследие слуцкого края

З прадметаў памянёных часоў цікавы шыферныя прасьліцы Балынскага пахаджэньня і рознакаляровыя шкляныя бранзэлеты з Візантыі.

Памянёнае гарадзішча лічылася першапачатковым умацаваньнем г. Слуцку.

Прыблізна к XIII — XIV ст. гарадзішча стала цесным, яго пашырылі, такім чынам узьнік ніжні замак, які захоўвае нязначныя культурныя напластаваньні.

Да падобнага тыпу ў Слуцкім райёне адносяцца гарадзішчы каля вёсак Надзеры і Амговічы.

Усе дасьледаванні курганоў выявілі звычайныя формы пахаваньняў X—XII ст. тыпова Дрыгавіцкія.

Знойдзены гаршкі, жаночыя аздобы, пацеркі сэрдалікавыя, шкляныя, з горнага хрусталю, бронзавыя-філігранавыя, вісочныя кольцы, нажы, пярсьцёнкі.

У Нежароўскіх хутарох, у кургане трапілася цікавая знаходка гаршка з 2 вушкамі і арнамэнтам у выглядзе абручоў. Гэта першая знаходка такога тыпу пасуды на Беларусі. На тых самых Нежароўскіх хутарох выяўлена пахаваньне з адзнакамі трупаспаленьня, што ўвязваецца з ранейшымі гарадзішчамі Случчыны.

Упяршыню на верхавінах Случы, каля вёскі Агароднікаў Падзерскіх, выкрыта стаянка чалавека канца часу бронзы і пачатку жалеза, даўнасьцю тысячы 2 з паловай гадоў назад.

Знойдзены фрагменты арнамэнтаванай пасуды, крамнёвыя стрэлкі, скрабкі і інш.

За час працы экспэдыцыя трымала цесную сувязь з краязнаўчым таварыствам, з якім падзялілася знаходкамі. Аб выніках раскопак праведзены 2 гутаркі-лекцыі.

Са Слуцку экспэдыцыя накіравалася ўніз па Случы да Турава, па маршруту: Івань, Балыпая-Сьліва, пагост і далей.

У.М.

Памяць зямлі

Пісьменнік Ян Скрыган нарадзіўся ў 1905 г. у в. Труханавічы Капыльскага р-на (былы Слуцкі павет), але ўсё жыццё сваёй радзімай лічыў Случчыну.

На маёй радзіме ёсць невялікі гарадок Слуцк. Як і кожны горад з паважанай біяграфіяй, ён меў тое месца, якое было асяродкам эканамічнага і гандлёвага жыцця акругі — рыначны пляц на самай сярэдзіне. Гэта была даволі вялікая, выцягнутая паабапал Маскоўска-Варшаўскай шашы, выбрукаваная плошча і звалася ў нас местам. На адной палавіне яе размяшчаліся будкі гандляроў гузікамі, пернікамі, карункамі ды стужкамі, на другой — стаялі фурманкі з сёл. Тут панаваў тлум, пах конскага поту, ішоў гандаль гуркамі, цыбуляю, садавіною, збожжам, бандарнымі і сталярнымі вырабамі.

Асабліва тлумна і маляўніча было ў кірмашовыя дні, калі цвілі рознымі колерамі дзявочыя даматкаиыя строі і на цвінтары каля сабора хлопцы як мага больш набок збівалі свае шапкі, каб выпусціць чуб. На дарожцы да сабора сядзелі старцы — сляпыя, бязрукія, бязногія, з лямцаватымі бародамі, з тонкімі шыямі, што выцягваліся з перахопленых жычкаю каўняроў зрэбных кашуль, з паднятымі ў неба невідушчымі тварамі. Часамі разам з імі сядзелі і хлапчукі-павадыры і тонкімі дзіцячымі галасамі цягнулі песні, такія балючыя і беспрасветныя, што ад іх разрывалася сэрца.

У 1923 г. на гэтай плошчы, на той палавіне, дзе стаялі фурманкі, каля самай дарогі работнікам сувязі спатрэбілася выкапаць яму пад тэлеграфны слуп. Два чалавекі ламамі ўзадралі брук, пачалі ўзбіваць цвёрдую, стагоддзямі ўтлясканую, конскай жыжкай набрынялую рудую зямлю. Менш як на метровай глыбіні грабары наткнуліся на дамавіну. Каб не чапаць яе, грабары згрэблі з века зямлю, адступілі трошачкі ўбок і паўз яе пачалі прабівацца далей уніз. І якое ж было дзіва, калі пад гэтай труной паказаліся яшчэ дзве: яны ляжалі наўскасяк пад першай, вытыркаючы набрыклымі земляной вільгаццю дошкамі.

І тады здалося цяжкім грахом трывожыць прах продкаў — грабары засыпалі дол і пачалі ўзрываць брук на новым месцы.

Там жа, у Слуцку, на Падвальнай вуліцы, гаспадыня, у якой я стаяў на кватэры, увесну ў кутку свайго саду захацела выкапаць яму, каб схаваць нечыстоты, як гэта было заведзена ў гарадскіх гаспадароў. Рыдлёўка наткнулася на нешта непадаткае і зашархацела: пад першым чорным, урадлівым пластом слуцкай зямлі

Наследие слуцкого края

ляжала вуголле — знак далёкіх, датла вынішчаных пажарам сядзіб. Пасля пачалі пападацца струхлелыя косці, і нарэшце ў кутку гэтага саду быў выкапаны зямлёю забіты ў сваіх пустотах чалавечы чэрап.

Вось гісторыя твая, Беларусь. Па землях тваіх праходзілі з агнём і мячом тэўтонскія рыцары, шведы караля Карла XII, палкі Напалеона; разбуралі і нішчылі цябе свае ж князі ды магнаты, аддаючы твае гарады і сёлы ў пасаг ці прагульваючы ў карты, а пасля адваёўваючы і дзелячы іх зноў між сабою. Не пыталі ў цябе, у народа твайго, з кім жа хоча ён быць, а палілі, спусташалі, знішчалі аж да таго, што ад гарадоў і сёл тваіх не заставалася й знаку. Гэта ж, напэўна, што толькі пасля карэннага вынішчэння, калі ад паселішчаў заставаліся адны папялішчы, можна было на месцы колішніх могілак рабіць базарную плошчу, не баючыся граху перад Богам, а на касцях людзей высаджваць сады. А колькі па землях тваіх прайшло вялікіх і малых войнаў нават на людской памяці ўжо, калі крамсалі і рвалі цела тваё на кавалкі. І кожны прышэлец стараўся скарыць цябе. Колькі ж сыноў тваіх згублена з пахаваннем і без пахавання, невядома кім і калі, колькі сцерлася іх слядоў, колькі іх касцей прыняла і ўкрыла ад гора людскога ты ў зямлі сваёй!..

І я люблю цябе, маці мая. І схіляю галаву перад усімі тваімі папялішчамі. Перад усімі курганамі. Перад магіламі. І тымі старадаўнімі, і ўчарашнімі, што асталіся як памяць найлюцейшага змагання з самай страшнай пачварай — чорнай свастыкай. Гэтыя ахвяры — святыя. Лепшыя людзі твае прынялі смерць, каб жыць нам далей...

* * *

...Я памятаю, як паявіліся легіянеры Доўбар-Мусніцкага, у казакінках з англійскага сукна, аблямаваных смушкаю, на сытых, выкармленых конях і з крывымі шаблямі. Памятаю немцаў васемнаццатага года: яны прыйшлі ў ціхі, пакінуты чырвонымі войскамі горад на саменькім ранку. Іхнія грузавыя машыны з шэразялёнымі салдатамі, што стаялі адзін пры адным за бартамі, прайшлі па галоўнай вуліцы вельмі паволі, дэманструючы сілу; ад шырокіх касак, насунутых на самыя вочы, і ад цесакоў, панадзяваных на вінтоўкі, што пабліскваліцьмяным металам, рабілася жудасна.

Але найбольш раз'юшана і драпежна трымалі сябе жаўнеры Пілсудскага. Лёгка, з нейкай бессаромнай зухаватасцю, яны маглі рабаваць, катаваць, падпальваць і арудаваць бізуном, гаворачы пры гэтым «проша пана», як бы рабілі паслугу. У легіянерах гэтай арміі былі смаркачы гадоў па чатырнаццаць, насілі не вінтоўкі, а карабіны, пад свой рост, і па сваёй блазноце аднолькава лёгка маглі і пагуляць у цацкі і пальнуць з карабіна. У Слуцк пілсудчыкі прыйшлі не мірна, а зрашэціўшы горад кулямі; доўга на вуліцах ад гэтых куль не загойваліся раны на дрэвах і папрабіванымі дзіркамі свяціліся аканіцы. За легіянерскімі спінамі гойсалі булак-балахоўскія банды ў вялікіх авечых шапках і таксама ў заморскіх зялёных сукнах. Па нядзелях, калі было асабліва людна, на пляцы яны гаварылі крыклівыя прамовы і ў гэты ж час, за сотню крокаў ад прамоўцы, рабавалі крамы.

Памятаю нямую сцяну людзей уздоўж Бабруйскай вуліцы, калі вялі на могілкі расстрэльваць чатырнаццаць слуцкіх паўстанцаў. Якая гэта была страшная карціна: вязні ідуць на расстрэл сярод натоўпу, што кідае ім кветкі, і спяваюць «Вы жертвою пали в борьбе роковой». Натоўп маўчыць, і толькі гэтыя кветкі гараць агнём...

* * *

...Гэта быў, можна сказаць, ужо край горада, і называўся ён Калоніяй. Крута спусціўшыся з узгорка, шырокая гарадская вуліца нечакана канчалася і разбівалася на завулкі і вулачкі. Пакручаста яны разбягаліся то ўлева, то ўправа, ішлі то ўздоўж, то ўпоперак, так, што цяжка было разабрацца. Аднак да аднаго будынка, нізкага, шырокага і прасторнага, як гамарня, што рассунуў сабе даволі ладнае месца сярод гэтай мітусні, вёў драўляны тратуар, насланы на тоўстых лежаках. Ён таксама выкручваўся то ўлева, то ўправа, але ясна паказваў, што будынак гэты стаіць тут як бы выпадкова, што ён — гарадскі. Нават двор яго, таксама шырокі і прасторны, быў аслонены маладымі таполямі і абсаджаны кустамі бэзу.

Гэта была наша гімназія. Лепш кажучы, не наша, бо мы былі ў падсуседзях. Мы, рэалісты, не мелі свайго будынка, дый наогул мы не ведалі, што мы за школа. То былі часы першых гадоў рэвалюцыі... Пры кожнай новай уладзе школы ператасоўваліся, мяняліся назвы, ператасоўваліся і вучні. Не

Наследие слуцкого края

ведаю, якія школы на гэты раз былі зліты і як дакладна мы называліся, але займацца нам прыйшлося на Калоніі. Цяпер тут асталявалася новая навучальная ўстанова — Слуцкая беларуская гімназія...

...І як не дзіва, але скончыўшы школу другой ступені, я падаўся ў сельскагаспадарчы тэхнікум. Чаму? Проста ў Слуцку больш не было куды.

Тэхнікум адкрыўся толькі нядаўна, размяшчаўся на Трайчанах, у былых манастырскіх будынках. Ух, якія ў іх былі тоўстыя сцены і якія змрочныя скляпенні! Бывала, калі ідзеш па каменнай падлозе, не замірае глухі, нейкі халодны і жудасны гул. Там жа мы і жылі ў колішніх келлях, мясціліся чалавекі па чатыры, у жалезных чорных круглых грубках па чарзе варылі кашу; калі яна была на сале — пах разносіўся па ўсіх памяшканнях.

Паўз манастыр працякала Случ. На яе беразе, пад вербамі я ўпершыню ўбачыў Якуба Коласа.

На цвінтары былі пахаваны знакамітыя духоўныя асобы, тут расло многа язміну, бэзу. Наогул, увесь бераг быў у зеляніне, начамі спявалі салаўі... Калі стала вядома, што з чацвёртага курса сельскагаспадарчы тэхнікум з Слуцка пераязджае ў Красны Бераг, я не паехаў.

* * *

У газету «Вясковы будаўнік» паслаў свае вершы. І неўзабаве атрымаў запрашэнне з'явіцца ў рэдакцыю. Што ж там такое? З'явіўся. На мяне паглядзелі, пагаварылі. Запрасілі на работу.

У маленькім пакойчыку, на другім паверсе дома на Пралетарскай вуліцы, якраз над кіно «Эдысон», я ўпершыню ўбачыў, як робіцца газета.

...Рэдактар Паўлюк Шукайла арганізаваў слуцкую філію «Маладняка». Часамі мы рабілі калектыўныя чыткі, наладжвалі вечары, і тады збіраліся ўсе маладнякоўцы — Апанас Атава, Язэп Сукала, Іда Чырвань. Паўлюк Шукайла быў чалавек агнявой натуры, добрага, шчырага сэрца, партызанскай зухаватасці і бунтарства. І ў вершах ён прызнаваў толькі бунт і таму адразу пачаў кіраваць нас на футурызм... Шукайла з'ездзіў у Мінск і дамогся, каб выдаць у кніжцы «Маладняка» слуцкіх філіяльцаў. Што ў нас ёсць сілы, і не абы-якія, — запрасіў прыехаць і паглядзець. І аднойчы пад восень прыехалі два знакамітыя пісьменнікі... Абодва маладыя, абодва невысокага росту, у чорных паліто. Памятаю, як яны распраналіся ў вузенькім калідорчыку на кватэры ў Шукайлы, доўга прымайстроўваючы шапкі, бо тыя ўсё падалі, не трымаючыся на кароткіх цвіках.

— О, дык у цябе, браце мой, кватэра нішто сабе, — сказаў Кузьма Чорны, увайшоўшы ў пакой. — Жывеш ты, можна сказаць, як слуцкі князь... Калі ў цябе такая важнецкая гаспадарка ў доме, браце Паўлюк, то, мабыць, і літаратура ў случакоў павінна быць нішто сабе, — сказаў ён, як бы падаючы знак, што можна пачынаць гаворку.

І гаворка пачалася адразу са спрэчак. Шукайла вельмі хацеў паказаць, што і ўсе мы, тутэйшыя маладнякоўцы, яго паслядоўнікі, самыя чыстакроўныя футурысты. Сам сябе ён лічыў правадыром новай плыні ў маштабе ўсяго «Маладняка» і цяпер меў выпадак пахваліцца гасцям, што і мы ў Слуцку не лыкам шыты...

Язэп Пушча сядзеў у крэсле каля стала, склаўшы адна на адну свае прыгожыя рукі. Кузьма Чорны — каля задняй сцяны на канапе; ён сядзеў, адкінуўшы галаву назад і раскінуўшы рукі, як бы проста адпачываў. Ён, здаецца, нават не глядзеў, як ходзіць па пакоі Шукайла, чытаючы свае вершы, жэстыкулюючы і то гнеўна падымаючы голас, то спускаючыся да ледзьве чутнага шэпту. Нічога нельга было разабраць на твары ў Чорнага: думаў ён ці папраўдзе адпачываў, падабаецца яму гэта ці не. Поўны спакой у вачах, у чутачку адстаўленай ніжняй губе, у круглаватым падбародку. І ўсё ж такі па нечым другім, невядомым і нераспазнаным, было відаць, што ён слухае.

Пасля не раз я пераконваўся, як хораша ўмеў слухаць Кузьма... Мы, чалавек колькі, запрошаных сюды для паўнаты аўдыторыі, — маладнякоўка Іда Чырвань, дзяўчына з Надрэчнай вуліцы Стася Шпакоўская (што стала Пушчавай жонкаю), — моўчкі сядзелі па кутках і заміралі ад шчасця, што нам давялося пабыць на такой сапраўднай літаратурнай гаворцы.

...Пасля мы ездзілі ў Мінск на першы з'езд «Маладняка». ...Але ўсё гэта нечакана скончылася. Акругу скасавалі, закрылася і газета. Шукайла паехаў у Расоны сакратаром партыі... Філія сама сабою распалася.

Друкуецца паводле кн.: Скрыган Я. Кругі. Мн., 1975. С. 6—7, 51, 70, 76—77, 83—86.

Наследие слуцкого края

Слуцк 1920-х гадоў

З успамінаў Н.Маліноўскай, жыхаркі Слуцка (запісана ў 1974 г.)

Мне ўжо семдзесят, але я часта ўспамінаю Слуцк 1920-х гадоў, бо з гэтага часу я жыву ў гэтым горадзе. Люблю яго, на маіх вачах ён рос і шырыўся, мужнеў.

Які быў транспарт у Слуцку ў 1920-м? Коні з балаголамі і рамізнікамі. Крыху пазней на вуліцах з'явіўся «фордзік» і яшчэ грузавая машына. Грузавік стаяў у двары школы. І дырэктар прасіў шафёра не прыязджаць на стаянку днём, бо ўсе дзеці выбягалі з класаў на двор глядзець «цуда». У такія дні ўрокі зрываліся.

Першае радыё ў Слуцку было ў памяшканні педтэхнікума. Памятаю, як студэнты хадзілі па ўстановах горада і прапаноўвалі платныя білеты на праслухоўванне апошніх навін. І людзі ішлі, слухалі, запісвалі ў сшыткі ўсё пачутае з навушнікаў і потым расказвалі аб гэтым у калектывах. Я тады працавала ў міліцыі справаводам і сама хадзіла слухаць радыё.

Мне ніколі не забыць адзін момант. Атрымалі ў райвыканкоме часопіс «Агонек». Са старонак на нас глядзелі пяціпавярховыя дамы. Я тады сказала адказнаму работніку райвыканкома:

— Вось бы Слуцку дзесятак такіх дамоў, можна было б засяліць усіх жыхароў.

Ён пранізліва паглядзеў на мяне і сказаў:

— Вы пры сваім розуме? Калі пабудаваць некалькі такіх дамоў, то Слуцк пагрузіцца ў балота...

І вось цяпер мне смешна. Дамы стаяць, аўтобусы ходзяць, а горад не правальваецца ў багну.

Якуб Колас і Случчына

ПАЭТ І НАСТАЎНІК

Летам 1923 г. Канстанцін Міхайлавіч, адмовіўшыся ад законнага адпачынку, прыняў прапанову Наркамата асветы Беларусі паехаць у Слуцк і прачытаць на палітыка-педагагічных курсах методыку і граматыку роднай мовы. З 4 па 29 ліпеня ён прабыў у Слуцку: да 14 ліпеня чытаў методыку, а з 16 ліпеня — граматыку.

Праца на слуцкіх настаўніцкіх курсах захапіла паэта. Курсы былі добра арганізаваны: у гэтым вялікая заслуга загадчыка іх Сяргея Антонавіча Бярозкі.

4 ліпеня Канстанцін Міхайлавіч пачаў чытаць лекцыі. У лісце да сваёй жонкі Марыі Дзмітрыеўны ён дзяліўся незвычайнымі ўражаннямі ад курсаў і расказваў аб сваёй першай лекцыі на іх: «Чытаў я дзве гадзіны: першая гадзіна была адведзена пад граматыку; другая — пад методыку.



Я.Колас (сядзіць другі злева) сярод выкладчыкаў і слухачоў беларускіх настаўніцкіх курсаў у Слуцку. 1921 г.

Наследие слуцкого края

Методыку я пачаў чытаць з сярэдзіны, з таго месца, дзе гутарка ідзе аб тым, як трэба даваць практычныя лекцыі. Такое чытанне выклікана тым, што курсанты даюць практычныя лекцыі і, каб аднавіць у памяці педагагічныя прынцыпы, прыйшлося з гэтага пачаць. Слухалі надзвычайна ўважліва. Я вельмі рад, што захапіў з сабою методыку. Курсы тут пастаўлены надзвычай грунтоўна. Дысцыпліна самая строгая. Курсантаў 150 чалавек, і ходзяць усе да аднаго. Курсы пачынаюцца роўна ў 10 гадзін. Да 12 гадзін практычныя лекцыі, практыкуюць самі курсанты. Кожны дзень даецца 4 лекцыі. А 12-й гадзіне прыходзяць лектары. Чытаюцца лекцыі па 4 гадзіны. У 6 гадзін ідуць гуртковыя заняткі палітычнага зместу. У сем — канферэнцыі наконт пробных лекцый. Заканчваюцца курсы ў 8 гадзін вечара. Курсанты так заняты, што не маюць часу пайсці ў горад. Я паспеў сёння па граматыцы зрабіць дыктоўку. Сшыткаў 70 ужо прагледзеў. Няграматна напісана ў двух. Чатыры напісалі зусім граматна. Большасць — здавальняюча, многа — добра. Раней месяца я ніяк не ўпраўлюся... Сёння ў мяне такое самапачуццё, што я не каюся, прыехаўшы сюды».

Слухачы курсаў не былі аднолькавымі па ўзросце і сацыяльным паходжанні, і па сваіх поглядах. Некаторыя з іх адкрыта выступалі супраць беларускасці. І вось аднойчы адзін з такіх слухачоў, даволі ўжо пажылы чалавек, падыходзіць да Якуба Коласа ды і кажа: «Вось Вы, Канстанцін Міхайлавіч, усё чытаеце і чытаеце нам беларускую мову, гаворыце, каб мы яе вывучалі і любілі, а на ёй не напісалі ніводнага твора, ну... скажам, як «Яўгеній Анегін». Якуб Колас уважліва паглядзеў на яго і сказаў: «Пачакайце!.. Не ўсё адразу... Пройдзе колькі часу, і на нашай мове будуць напісаны выдатныя рэчы!». Потым задумаўся на некалькі хвілін і дадаў: «Не ўсё адразу...»

А назаўтра, 8 ліпеня, на літаратурным вечары Якуб Колас прыступіў да чытання «Новай зямлі». І калі ён пачаў:

«Мой родны кут, як ты мне мілы!
Забыць цябе не маю сілы!» —

слухачы адразу неяк насцярожыліся, а потым усталявалася мёртвая цішыня... Чытанне першага раздзела было закончана. Пачуліся бурныя воплескі. Усе крычалі: «Яшчэ!... Яшчэ!..» Канстанцін Міхайлавіч, уважліва абвёўшы вачыма залу, працягваў, не спяшаючыся:

«Дзень быў святы. Яшчэ ад рання
Блінцы пякліся на сняданне...»

Аб гэтым памятным вечары і сваіх незабыўных уражаннях паэт расказваў у лісце да Марыі Дзмітрыеўны ад 9 ліпеня: «Учора вечарам чытаў першы раз «Новую зямлю». Адзін слухач курсаў, непрыхільнік беларускасці, зазначыў беларусу: «Я не ведаў, што па-беларуску можна так пісаць. Заразжце мяне, калі я не навучуся беларускай мове».



Дом у в. Новы Двор, у якім жыў Я.Колас пад час выкладання на настаўніцкіх курсах у Слуцку.

Наследие слуцкого края

Якуб Колас за час прабывання ў Слуцку прачытаў на курсах усю паэму «Новая зямля». Ды не толькі на курсах чытаў ён яе, але і на агульнагарадскіх вечарах. І ўсюды слухачы з вялікай прыхільнасцю ставіліся да яе.

Як успамінае Язэп Лявонавіч Дыла, на курсах быў яшчэ і такі выпадак. У час адной з лекцый па методыцы роднай мовы Канстанцін Міхайлавіч атрымаў запіску, у якой адзін са слухачоў пытаўся ў яго, чаму да гэтага часу няма падручнікаў па методыцы беларускай мовы. Якуб Колас адказаў, што такі падручнік хутка будзе.

І паэт стрымаў сваё слова. Яго «Методыка роднае мовы» выйшла з друку ў 1926 годзе...

М.Базарэвіч.

Шлях Ільіча. 1972. 2 ліст.

З успамінаў Андрэя Якаўлевіча Лешчанкі, былога настаўніка, жыхара Слуцка

У 1934 годзе ў Мінску адбыўся першы Усебеларускі з'езд настаўнікаў-ударнікаў. Я быў удзельнікам гэтага з'езда ў якасці дэлегата ад настаўнікаў былой Старобіншчыны (цяпер Салігорскі раён). У тыя часы я працаваў дырэктарам пачатковай Равецка-Лескай школы.

Нас, дэлегатаў з'езда, прынялі ў Мінску ветліва, гасцінна. На другі дзень усе сабраліся ў памяшканні Беларускага дзяржаўнага тэатра, дзе і адбыўся з'езд.

У склад рабочага прэзідыума ўваходзілі прадстаўнікі ЦК КПБ і Беларускага ўрада, а таксама дэлегаты з'езда. На з'ездзе прысутнічаў народны паэт рэспублікі Якуб Колас. Ён уваходзіў у склад прэзідыума і сядзеў у другім радзе за сталом. Я.Колас не выступаў у спрэчках, але з цікавасцю сачыў за ходам з'езда. У перапынках паміж пасяджэннямі нас знаёмілі з памятнымі мясцінамі сталіцы. Пабывалі мы і ў Доме пісьменнікаў Беларусі. Там нас ветліва і пачціва сустрэлі стваральнікі беларускай савецкай літаратуры.

Сярод пісьменнікаў быў і Якуб Колас. Ён па-сяброўску і па-бацькоўску прывітаўся з намі і ўступіў у цікавую гутарку.

— Рад вас бачыць, мае калегі, настаўнікі. Расказвайце свае навіны, — пачаў Я.Колас.

Пісьменнік расказаў нам, як ён яшчэ да рэвалюцыі пачынаў сваю настаўніцкую дзейнасць на Палессі. Затым пацікавіўся, хто з нас працуе ў гэтым краі.

— Гэта ўжо не тое Палессе, што было калісьці, — з задавальненнем зазначыў паэт, — але нам трэба правесці там вялікую асветніцкую і культурную работу, каб гэты край стаў перадавым у рэспубліцы.



Я.Колас (сядзіць у 2-м радзе ў цэнтры) сярод удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Слуцк. 1923 г.

Наследие слуцкого края

Я прызнаўся, што настаўнічаю на Старобінщчыне. Колас пацікавіўся, ці ўсе дзеці наведваюць школу, як вучацца, якія ўмовы ў школе для заняткаў, ці хапае падручнікаў.

Былі і яшчэ пытанні да нас. Не забыў пісьменнік запытаць, хто з нас піша вершы або іншыя творы. Я яму прызнаўся, што займаўся крыху імі, калі яшчэ вучыўся ў сямігодцы і педтэхнікуме, а затым стала не да вершаў: работы многа, як школьнай, так і грамадскай.

Якуб Колас станоўча ацаніў такую працу, але рэкамендаваў паглыбляць педагагічныя веды і вывучаць скарбонку нашай мастацкай літаратуры — народныя песні, казкі, прымаўкі, выслоўі і іншыя народныя творы.

З намі, дэлегатамі, гутарылі і іншыя пісьменнікі.

Цёпла развіталіся мы з народным паэтам і запрашалі яго прыехаць ў нашы школы.

З успамінаў Васілія Цімафеевіча Мяцельскага, былога настаўніка Маяцкай сярэдняй школы

1948 год. Канец сакавіка. Мы, сем студэнтаў Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага і нашы выкладчыкі — У.Л.Важнік, У.М.Вярбіла, А.С.Карзон і М.І.Жыркевіч, сабраліся ў Акадэміі навук БССР на першую беларускую дыялекталагічную канферэнцыю.

Калідор другога паверха. Стаім цеснай групкай. З намі Пятро Фёдаравіч Глебка, энергічны, вясёлы. Дасціпна жартуе. Ён адчувае, што нам тут не зусім прывычна. Акадэмія!

Потым чуем:

— Канстанцін Міхайлавіч!

— Канстанцін Міхайлавіч!

Усе прыціхлі, падцягнуліся. Мы не адразу ўцямілі, чаму гэтыя словы аказалі такое ўздзеянне на людзей. Аглянуўся я асцярожна — і ўсё стала ясна: ідзе Якуб Колас. Усе павярнуліся да яго. Вось ён ужо побач, працягвае руку!

— Добры дзень! — гаворыць спакойна, але з вялікім цяплом і задавальненнем. Па чарзе абыходзіць усіх, вітаючыся з кожным.

Мы пасмялелі. Запытаў, ці ўсе сабраліся, выказаў падзяку нам за тое, што прыйшлі, заспяшаўся ў канферэнцзалу. Пайшлі і мы: праз колькі хвілін пачатак канферэнцыі...

Яму было тады 66 гадоў. Паэт хварэў. Але і будучы хворым, прадаўжаючы працу над апошняй, трэцяй, кнігай трылогіі «На ростанях», пішучы і іншыя мастацкія творы, выконваючы навуковую работу, праводзячы вялікую грамадскую работу, адказваючы на тысячы пісем, Якуб Колас знаходзіў час і энергію, каб даць штуршок, пачатак важнейшай справе вывучэння жывой роднай мовы, а значыць і нацыянальнай культуры...

...Мы ўважліва слухалі Якуба Коласа. Ён хутка закончыў выступленне і, сказаўшы пра сваё няважнае здароўе, перадаў старшынства К.К.Крапіве, а сам пакінуў залу.

Канферэнцыя працягвалася. Перад намі выступалі вучоныя, выкладчыкі інстытута, студэнты.

Так ствараліся калгасы

Калгас «Белічы». Цэнтр гаспадаркі — в. Белічы. Арганізаваны ў 1929 г. Тады калгас называўся «Чырвоная перамога». Першым яго старшынёй стаў Барыс Іванавіч Бародзіч. У навакольных вёсках узніклі калгасы «Чырвоны праменнік», «Пражэктар», «Вольная праца», «Нова-Белічы», «Нова-Млынка». У 1946 г. аб'ядналіся тры калгасы: «Чырвоная перамога», «Чырвоны праменнік», «Нова-Белічы». Праз год да іх далучыўся калгас «Пражэктар», а ў 1950 г. — «Вольная праца» і «Нова-Млынка». Так арганізаваўся калгас «Белічы».

Калгас «Гігант». У в. Грэск у 1929 г. быў створаны калгас «Перамога». Спачатку ў яго ўступіла 11 чалавек. Першым старшынёй быў А.Цішкевіч. У 1930 г. у вёсцы арганізавана арцель па нарыхтоўцы вапны. Затым яны аб'ядналіся. У 1950 г. да яго далучыліся невялікія гаспадаркі: «Прагрэс», «Чырвоны партызан», «Камбайн», імя Чапаева, «Радзіма». Аб'яднаную гаспадарку назвалі калгасам «Гігант».

Калгас імя Карла Маркса. Гэта самы старэйшы калгас у раёне. Ён бярэ свой пачатак з камуны імя Карла Маркса, якая была створана ў 1921 г. у в. Пуцяты. Амаль адначасова ў былым памешчыцкім маёнтку Сухаўчыцы быў створаны саўгас. Першым яго дырэктарам быў Бязручкін. У

Наследие слуцкого края

1926 г. камуна стала калгасам імя Карла Маркса, а саўгас — калгасам «Пралетарый». Старшынёй выбралі героя грамадзянскай вайны Васіля Захаравіча Каржа. У 1926 г. яны аб'ядналіся ў адзін — калгас імя Карла Маркса. У 1929 г. да калгаса далучыліся сяляне населеных пунктаў Славінск, Заляддзе, Дубкі і частка сялян з в. Кажушкі. У 1929 г. у в. Леніна створаны калгас імя Леніна. Праз год у в. Кажушкі створаны асобны калгас «Чырвоны араты». Першым старшынёй быў Іосіф Вечар. У гэтым жа годзе ў пасёлках Ульянаўка і Маргі быў створаны калгас «Чырвоная Ульянаўка». Старшынёй выбралі К.Канановіча. У 1933 г. гэтыя гаспадаркі аб'ядналіся ў калгас імя Карла Маркса.

Калгас імя Кірава. У пас. Грады ў 1927 г. была створана арцель імя Вілічэўскага, пазней перайменавана ў калгас «Вольная Беларусь». У 1929 г. у в. Казловічы арганізаваўся калгас «Чырвоная ніва». У 1934 г. яны аб'ядналіся ў адзін калгас імя Кірава. Першым старшынёй стаў Фёдар Ільіч Жываглод.

Калгас імя Красіна. У в. Вялікая Слабада ў 1929 г. быў створаны калгас «Чырвоны працаўнік», у суседніх вёсках — калгасы імя Красіна і «Кастрычнік». У 1933 г. калгасы імя Красіна і «Кастрычнік», а пасля і «Чырвоны працаўнік» аб'ядналіся. Першым старшынёй узбуйненага калгаса быў Антон Папоўскі.

Калгас «Краіна Саветаў». Створаны ў 1930 г. у в. Амговічы. Да яго далучыліся сяляне вёсак Сліўка і Ляхава. Першым старшынёй быў Дзмітрый Тарап. Пазней дробныя калгасы вёсак Амговічы, Ляхава і Сліўка аб'ядналіся ў адзін — «Краіна Саветаў».

Калгас «Маяк». У в. Маяк у 1929 г. была створана сельгасарцель. Спачатку ў яе ўступіла 7 аднаасобных гаспадарак. Пазней у яе аб'ядналіся 50 гаспадарак. У 1930 г. арганізаваны калгасы ў вёсках Дзюдзева, Шулякі, Ветка, Боркі. Пасля аб'яднання новая гаспадарка стала называцца калгас «Маяк».

Калгас «Мір». Арганізаваны ў 1929 г. з сялянскіх гаспадарак вёсак Апаліны, Нівішчы, Навінкі і Пільня. Гэта быў калгас імя Варашылава. Старшынёй выбралі Вячаслава Савіча Тарасевіча. У 1934 г. на палях працаваў адзін трактар. У в. Палікараўка стварылі калгас імя Сталіна. Кіраваць ім даручылі селяніну-бедняку Г.П.Дземідовічу. У гэтым жа годзе ў вёсках Жылін Брод і Шантароўшчына арганізаваўся калгас «8 Сакавіка», у в. Страхава — «Чырвоны гай». Першымі старшынямі калгасаў выбіраліся Н.А.Карповіч і А.Д.Лешчанка. Пазней гаспадаркі аб'ядналіся ў калгас «Мір».

Калгас «Праўда». Створаны ў 1929 г. у в. Балотчыцы. Спачатку ў калгас імя Чапаева ўступіла 12 сем'яў. Узначаліў калгас



Першы трактар у в. Рабак (злева трактарыст А.П.Няронскі). 1930-я гады.

Наследие слуцкого края

былы ўдзельнік грамадзянскай вайны Лявон Цімафеевіч Алешка. Пазней калгас быў перайменаваны ў калгас «Праўда». Першымі кіраўнікамі калгаса былі Завістовіч, Амяльковіч, Галавацкі, Дзяменцьеў.

Калгас «Радзіма». У вёсках Ржаўка і Таколішча ў 1930 г. быў створаны калгас «Чырвоная Ніва» (старшыня П.Н.Палазнік), праз год — у вёсках Жылінка і Ніва — калгасы імя Дзяржынскага, «Пралетарская Ніва» (старшыні В.А.Язвінскі, Д.І.Пісарык). Усе гаспадаркі аб'ядналіся ў калгас «Радзіма».

Калгас імя Тэльмана. У 1929 г. у в. Загарадзе сяляне аб'ядналіся ў кааператыў «1 Жніўня». У 1930 г. у в. Рабак арганізаваўся калгас «Чырвоны бор» (старшыня Сцяпан Арастовіч). У гэтым жа годзе быў створаны калгас у в. Паўстынь (старшыня Васіль Пятровіч Жук), пазней — у вёсках Мерашыно, Кублішча. У 1950 г. гаспадаркі аб'ядналіся ў калгас імя Тэльмана.

Калгас імя Энгельса. «Вольным жыццём» назвалі сяляне в. Падлессе калгас, арганізаваны ў 1930 г. з 9 бядняцкіх гаспадарак. Яго ўзначаліў Рыгор Іванавіч Лемеш. У гэтым жа годзе былі створаны калгасы ў вёсках Шалавічы, Нявязцы, праз два гады — у в. Цяраспаль. Дробныя калгасы аб'ядналіся ў адзін — калгас імя Энгельса.

Фонды Слуцкага краязнаўчага музея.

Развіццё прамысловасці

З успамінаў былога старшыні арцелі «Чырвоны працаўнік» М.Б.Зуніна (запісана ў 1968 г.)

У пачатку 1920-х гадоў у Слуцку акрамя трох млыноў было некалькі майстэрань, многа саматужнікаў. У той час неабходна было працаўладкаваць інвалідаў імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў. Савецкі ўрад з гэтай мэтай стаў арганізоўваць арцелі інвалідаў.

Памятаю, у 1924 г. былі арцелі «Чырвоная зорка», «Чырвоны працаўнік», імя Крупскай і інш. У арцелі аб'ядноўваліся таксама саматужнікі: металісты, бляхары, хлебапёкі, рымары. Я быў старшынёй арцелі «Чырвоны працаўнік», а затым — «Чырвоная зорка». Спачатку працавала тут чалавек па 15—20, крыху пазней — больш за сотню. 80% усіх працуючых былі інвалідамі вайны або працы.

Вытворчыя працэсы выконваліся ўручную. У першыя гады арганізацыі ў Слуцку прамысловых арцелей майстры прыносілі ў цэх свае швейныя машыны, шаўцы прыходзілі на работу са сваімі малаткамі і іншым інструментам. Так было прыблізна да 1927—1928 гг. Затым сталі ствараць арцелі прамысловай кааперацыі — швейныя, бляшчаныя, мэблевыя. У Слуцку з'явіліся арцелі вышывальная, вяровачная, харчовая. Выпускалі за дзень па 200—300 кілаграмаў цукерак, да 500 кілаграмаў хлебабулачных вырабаў.

Працаваў у горадзе сельтэрскі завод, які ў летні перыяд даваў за дзень да 140 сіфонаў газіраванай вады (па 20—40 літраў кожны), да 1500 бутэлек безалкагольных напіткаў.

З 1929 г. арцелі прамкааперацыі сталі развівацца. Арцелі інвалідаў існавалі да Вялікай Айчыннай вайны, а арцелі прамкааперацыі — і пасля вайны, пакуль на іх базе не былі створаны дзяржаўныя прадпрыемствы.

Некалькі слоў хачу сказаць аб гісторыі кансервавага завода. Ад многіх старажылаў чуў, што да рэвалюцыі на гэтым месцы быў маслабойны завод. У гады савецкай улады завод рэарганізавалі ў мармеладную фабрыку. З 1933 г. пачаў працаваць вінаробны завод. Крыху пазней адкрыўся пладовавінзавод, а ў 1953 г. на яго базе створаны кансервавы завод.

З успамінаў ветэрана прамысловасці Я.А.Расамахі (запісана ў 1969 г.)

Наш горад славіўся кавалямі і саматужнымі майстэрнямі. Адна з вуліц Слуцка і цяпер называецца Каляснiцкай. Тут пераважна жылі стэльмахі і кавалі. Некаторыя з іх мелі свае невялікія майстэрні па вырабе калёс, кузні.

На тых месцах, дзе цяпер узвышаюцца сучасныя жылыя шматкватэрныя дамы, у першай палавіне дваццатых гадоў стаялі аднапавярховыя драўляныя хаты. У некаторых з іх размяшчаліся майстэрні ці працавалі саматужнікі-адзіночкі. На месцы, дзе цяпер пяціпавярховы дом з магазінам

Наследие слуцкого края

«Вясна», у 1922 г. быў домік, у якім арганізавалі першы на Случчыне калектыў кавалёў з былых беспрацоўных. Майстэрня бляхароў размяшчалася там, дзе сёння трохпавярховы прыгожы будынак Дома сувязі. Побач тады знаходзілася хлебапякарня.

У першай палавіне 1920-х гадоў на тэрыторыі, якая з правага берага р. Случ прылягае да вуліцы Карла Лібкнехта, былі ўтвораны рамонтныя майстэрні: аб'ядналіся саматужнікі-металісты. У майстэрнях рамантавалі галоўным чынам сельгасінвентар і рэчы хатняга ўжытку: конныя малатарні, саламарэзкі, веялкі, плугі, швейныя машыны, прымусы, веласіпеды. У першай пяцігодцы майстэрні мелі такарныя і свідравальныя станкі. Затым абсталяванне папоўнілася вагранкай (спецыяльны агрэгат для плаўкі металу). Пачала развівацца ліцейная вытворчасць. Да 1937 г. майстэрні называліся сельскагаспадарчымі. У іх працавала прыкладна 40—50 чалавек. Вытворчасць майстэрань складалася з ліцейнага і механічнага цэхаў. Летам 1938 г. слуцкія сельскагаспадарчыя майстэрні былі перамешчаны на вуліцу Камсамольскую, дзе раней знаходзіўся гарбарны завод.

Ружовыя пялёсткі

— Шышчыцы! — аб'яўляе кандуктар. — Выходзіць хто?

— Выходзім, — адказвае жанчына з маршчыністым тварам. Асцярожна абапіраючыся на кій, сыходзіць яна з аўтобуса і ідзе праз вуліцу за вёску, дзе на ўзгорку раскінуўся сад калгаса «16 партз'езд».

Сустрэчныя вітаюцца з жанчынай як з добра знаёмай, хоць і жыве яна ў Слуцку. Калгасніцы заўважаюць: «Пайшла Вадап'яніха свайго праведаць. Кожны год так...»

Матрэна Іванаўна ідзе да адзінокай магілы, што прытаілася пад галінастымі яблынямі, і кладзе ля гранітнага помніка (калі гэта ўлетку) букецік чырвоных руж ці палявых кветак. І доўга сядзіць у задуменні. Тут пахаваны чырвоны партызан Пятрусь Вадап'ян, забіты 10 студзеня 1930 г. за справу калектывізацыі вёскі групай кулацкіх агентаў.

Вятры і дажджы за трыццаць гадоў сцерлі пазалоту літар на помніку, і яны ледзь-ледзь прыкметныя. Але час не ў сілах сцерці з памяці жыхароў в. Шышчыцы ўспаміны пра Петруся Вадап'яна.

...Ён прыйшоў у хату Матрэны Іванаўны незадоўга да калектывізацыі. Прынёс чамаданчык, а ў ім загорнуты ў чысты ручнік партрэт Леніна ў рамцы і некалькі кніжак. Ды яшчэ меў пару дужых рук, вясёлы нораў.

Не ігралі музыкі на іх вяселлі, госці не крычалі «горка» маладажонам, але Матрэна і Пятрусь Вадап'яны зажылі дружна, душа ў душу. Таго вяселля не было за што спраўляць. Бацька Петруся яшчэ ў 1910 г. пакінуў сям'ю, падаўся за акіян ў заробкі. З год прысылаў зрэдку «даляры», як гаварылі ў вёсцы, потым і пісьмы перастаў слаць. Прыйшлося маці ісці ў пральню пры Грэскай бальніцы, каб пракарміць трох малых дзяцей. Нявеста Петрусёва таксама была з тых беднякоў, у каго хлеба да каляд не хапае.

Позняй восенню 1929 г. Пятрусь вярнуўся дахаты, калі спявалі ўжо трэція пеўні. Ад парога, не распранаючыся, узрадавана сказаў:

— У калгасе мы ўжо, Матрэна. Запісаўся! Ведаеш, як назвалі? «Колас». Добрая назва, а?

— Назва-то нядрэнная, але ж зярнятак у каласку, мабыць, малавата? — перапытала жонка.

— Дзевяць чалавек уступілі: Уладзімір Корбут, Васіль Пісарык, а Дзяніса Гурыновіча старшынёй выбралі. На вясну «Колас» паўнюткі будзе, вось пабачыш...

— Ой глядзі, Пятруська, точаць на цябе зубы кулакі. Вельмі ўжо гарачы ты.

— Нічога, неяк справімся.

Ён успомніў гады грамадзянскай вайны, партызанскія сцежкі, якія прайшоў са зброяй у руках. За яго галаву немцы ў 1918 г. абяцалі некалькі тысяч марак. Пятрусь уласнаручна забіў тады з засады каменданта нямецкага гарнізона ў Грэску. Люта ваў гад у навакольных вёсках.

З кожным днём рос і мацнеў «Колас». Як член партыйнай ячэйкі Пятрусь часта ездзіў па вёсках, выступаў на сходах, агітаваў сялян у калгас. Дамоў вяртаўся з падпухшымі ад бяссонніцы вачыма, але, як заўсёды, вясёлы.

Наследие слуцкого края

— Эх і жыццё будзе, Матрэна Іванаўна, гадоў праз дзесяць — пятнаццаць. Электрычнасць, радыё — калі ласка. Трэба табе, скажам, у Слуцак — садзіся ў аўтобус і праз паўгадзіны там. Дзеці ў сад пойдуць, у школу.

— Не верыцца, Пятруська, калі гэта і будзе. Мабыць, не дажывём мы да гэтага. Неспакойна ў вёсцы стала. Кулакі зубы паказваюць.

— Дажывём, вось пабачыш.

...Шышчыцкія кулакі рашылі падарваць «Колас» знутры. З дапамогай старшыні сельсавета Віктара Пісарыка, які дзейнічаў у згодзе з кулакамі, у партячэйку прабраўся былы балаховец Іван Вітка.

Аднойчы пасля чарговага сходу Пятрусь выйшаў на вуліцу пакурыць і пачуў у цемры галасы сялян. Яны гучалі гнеўным папрокам.

Дык вось, Пятрок, каго вы пачалі прымаць у ячэйку! Балахоўцаў, кулацкіх сынкоў. Падумаць толькі, Івана Вітку прынялі ў партячэйку! Гэтыя словы, нібы агнём апяклі сэрца камуніста. Праверка пацвердзіла выказванне сялян. Пазней на сходзе пасля прамовы Петруся аб гэтай справе камуністы выказалі свой недавер Вітку. Кулакі затаілі на яго звярыную злосць і чакалі зручнага моманту, каб адпомсціць.

У ноч на 10 студзеня 1930 г. сход ў в. Швяды кончыўся позна. Зноў выступаў перад сялянамі-аднаасобнікамі Пятрусь Вадап'ян. «Колас» папоўніўся яшчэ добрым дзесяткам гаспадарак.

Пасля сходу старшыня сельсавета запрасіў Вадап'яна зайсці павячэраць у хату Паўла Віткі. Дамовіліся потым разам ехаць дамоў у Шышчыцы.

Калі Пятрусь зайшоў у хату, удар сякеры зваліў яго на зямлю... Яшчэ жывога яго кінулі ў калодзеж.

Усю ноч над халоднай магілай камуніста спявала жалобную песню завіруха. Раніцай Петруся дасталі. У левай кішэні гімнасцёркі і знайшлі акрываўленую картку кандыдата ў члены ВКП(б).

Суд пакараў забойцаў. Івана Вітку расстралялі, яго саўдзельнікаў, у тым ліку І.В.Пісарыка, прыгаварылі да розных тэрмінаў зняволення.

...Ён марыў аб зямлі, на якой будзе шмат садоў. Першыя калгаснікі «Коласа» яшчэ восенню 1929 г. заклалі фруктовы сад на плошчы ў дзесяць гектараў. Садзіў дрэўцы і Пятрусь. Таму і пахавалі яго ў садзе, побач з яблынькамі-двухгодкамі. Прыжыліся дрэўцы, глыбока пусцілі карэнне ў зямлю. А колькі такіх садоў вырасла на Случчыне — і не злічыш!

...Мне давялося быць у гэтым садзе летась, у канцы мая. З палеткаў вецер нёс пах падагрэтай сонцам зямлі, маладой траўкі. У блакітным бяздонні не змаўкаў званок вясны і радасці — жаўранак. Праз поле да вёскі роўнай шарэнгай выстраіліся слупы электралініі. Недалёка быў чутны рокат «ДТ-54». А далей, за садам, серабром адлівала роўная стужка асфальтаванага шасэ Мінск—Слуцк, па якім адна за другой імчалі аўтамашыны.

Вецер зрываў з яблынь ружовыя пялёсткі, і яны паволі апускаліся долу. Пад вечар пялёсткі так густа ўслалі зямлю ля помніка, што здавалася, быццам магіла накрыта ружовым палотнішчам.

М.А.Тычына.

Мінская праўда. 1958. 16 мая.

У год масавага калгаснага руху

З успамінаў Героя Сацыялістычнай Працы В.П.Козела, ветэрана калгаснага будаўніцтва на Случчыне

Рух за калектывізацыю сельскай гаспадаркі, які пачаўся ў 1920-я гады, да 1930 г. перарос у суцэльную калектывізацыю. У калгасы следам за беднякамі і батракамі, пайшоў серадняк. Да канца 1930 г. у раёне ў калгасы ўступіла ўжо 1753 сялянскія гаспадаркі, якія мелі больш за 20% усёй зямельнай плошчы раёна. Калгасы сталі стварацца адзін за адным амаль у кожнай вёсцы. Вядома, гэта былі яшчэ слабыя і малалікія калектыўныя гаспадаркі. Многага ў іх не хапала, але яны смела ўступалі ў новае жыццё.

Перыяд гэты быў цяжкі. Чаго толькі не прадпрымалі кулакі, каб перашкодзіць новаму ладу ў вёсцы. Яны запужвалі тых, хто ўступіў у калгас, з-за вугла стралялі ў актывістаў. У снежні 1929 г. арганізаваўся калгас ў в. Кляпчаны. 18 гаспадарак спачатку ўступілі ў яго. Свой калгас мы

Наследие слуцкого края

назвалі «Камбайн». Праўда, гэтай машыны мы тады і ў вочы не бачылі, але верылі — будуць камбайны ў калгасе. А пакуль у гаспадарцы было 12 плугоў, 16 барон і 8 рабочых коней. Вось з гэтага мы пачалі.

Усю зіму 1930 г. рыхтаваліся да веснавых работ. Першая калгасная вясна! Зрабілі пробны выезд у поле. Гэта было сапраўднае свята. Граў духавы аркестр, прыехалі прадстаўнікі з раёна. З канца ў канец праехалі на конях. Я як старшыня ішоў упераднзе, на падводах везлі плугі, бароны. Выехалі ў поле, запрэглі коней у плугі, праверылі збрую і астатні інвентар. Атрымалася добра. Сяўбу ў тую першую калгасную вясну мы правялі паспяхова.

Восенню 1930 г. у калгас уступілі ўсе жыхары в. Кляпчаны. Добрая слава пайшла аб нашай сельскагаспадарчай арцелі.

Жанчына з вёскі Ісерна

КАПАЦЭВІЧ Вольга Цімафееўна, нарадзілася ў в. Ісерна ў сям'і сялян. Грамадскі дзеяч БССР. Змагалася супраць бандаў Булак-Балаховіча. Удзельніца 1-й Усерасійскай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве (1923), дэлегатка міжнароднага кангрэса жанчын-камуністак (1924). Намеснік наркома сацыяльнага забеспячэння БССР (1925), член ЦВК БССР (1924—1925). У Вялікую Айчынную вайну партызанская сувязная. Адна з гераінь беларускага хранікальна-дакументальнага фільма «Арліная крыніца» (1966, рэж. В.Сукманаў, сцэнарый А.Вялюгіна) і дакументальнага фільма «Наша біяграфія. Год 1923». Памерла ў 1967 г.

Ёй было трыццаць пяць гадоў. Рухавая, працавітая сялянка, маладая і зграбная — за якую работу ні бралася, усё ў яе атрымлівалася. Ці ведаў хто, што ў хуткім часе яе імя стане вядомым не толькі ў Слуцкім павеце, але і ва ўсёй Беларусі і за яе межамі.

1917 год. Кастрычніцкая рэвалюцыя, устанаўленне савецкай улады... Менавіта гэтыя падзеі змянілі лёс жанчыны. Вольга прымала актыўны ўдзел у новым жыцці: сустракалася з сялянамі і словам заклікала іх умацоўваць Саветы, пераходзіць да калектыўнага вядзення сельскай гаспадаркі, вяла барацьбу з бандытамі. А калі пачалася грамадзянская вайна, змагалася супраць бандаў Булак-Балаховіча. Безумоўна, не кожная жанчына магла адважыцца на такое. З павагай адносіліся землякі да Вольгі. У мірны час пачала займацца сельскай гаспадаркай. І вось надышоў 1923 год. Той дзень запамятала яна на ўсё жыццё. Яе пасылалі ў Маскву на Усерасійскую выстаўку.

Вольгу Цімафееўну Масква сустрэла гасцінна. У першы дзень з ёй доўга гутарылі Н.К.Крупская і К.Цэткін. На выстаўцы далі выступіць. А затым яе правялі да У.І.Леніна, які цёпла прывітаў жынчыну і пачаў распытваць, адкуль яна, якая сям'я, на каго пакінула дзяцей, як



В.Ц.Капацэвіч (у цэнтры) з аднавяскоўцамі.

Наследие слуцкого края

жыццё ў вёсцы. Вольга Цімафееўна ўсё расказала. На развітанне ёй падаравалі хустку, чаравікі, спадніцу, бо была яна ў андараку сялянскім ды ў лапцях. Гэтая паездка выклікала ў Вольгі Цімафееўны новы прыліў сіл і энергіі. Неўзабаве яе выбралі членам ЦВК Беларусі. З сакавіка 1924 г. па май 1925 г. з'яўлялася В.Ц.Капацэвіч супрацоўнікам народнага камісарыята БССР па сацыяльным забеспячэнні.

З 1925 г. па 1932 г. Вольга Цімафееўна працавала старшынёй сялянскага камітэта ўзаемадапамогі і адначасова вяла падрыхтоўчую работу па стварэнні калгасаў. Потым яе выбралі старшынёй калгаса. Многа сіл прыклала яна для ўмацавання гаспадаркі. А колькі было няўдач, цяжкасцей, небяспечных момантаў. Сярод белага дня ворагі спалілі яе хату, не раз з іх боку чуліся пагрозы. Але не змаглі яны звярнуць Вольгу Цімафееўну з выбранага шляху.

Некалькі гадоў перад самай вайной працавала Вольга Цімафееўна загадчыцай птушкафермы. У гады вайны была сувязной партызанскага атрада.

Прайшлі гады, непадалёку ад вёскі шуміць сасновы бор, які калісь, яшчэ ў 1920-я гады, пасадзіла Вольга Цімафееўна з аднавяскоўцамі. Шуміць бор, ускалыхваючы памяць аб мінулым.

В.С.Відлога.

Па жыцці крочылі з песняй

10 красавіка 1921 года адбыўся другі Слуцкі павятовы гарадскі з'езд камсамола. На ім прысутнічаў член бюро ЦК КСМ Беларусі А.М.Крамнеў. У прэзідыуме з'езда камсамола былі выбраны: А.Крамнеў, Вейняровіч — удзельнік грамадзянскай вайны, Пракопчык — з сялянскай моладзі, Павел Штыцко, які загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Камітэт камсамола г. Слуцка і павета, выбраны на з'ездзе, вёў работу па выкананні рашэнняў IV з'езда РКСМ і па ўцягненні моладзі ў камсамол, стварэнні новых камсамольскіх арганізацый. У вёсцы Леніна галоўнымі арганізатарамі камсамола былі І.В.Ярмола, М.Ф.Дарашэвіч і іншыя. У Ленінскую валасную партыйную ячэйку звярнуліся Т.Н.Паляшчук, Г.Хмель, Е.В.Сулкоўская, А.Д.Туравец, П.І.Штыцко з просьбай прыняць іх у члены Камуністычнай партыі. Старшынёй камсамольскай ячэйкі ў в. Леніна быў выбраны М.А.Багдановіч, сакратаром — І.В.Ярмола. Камсамольцы арганізоўвалі вечары, на якіх ставілі рэвалюцыйныя п'ескі, развучвалі і спявалі новыя песні.

Камсамольцы карысталіся ў сялян-беднякоў і сераднякоў вялікай павагай за ўсе тыя мерапрыемствы, якія праводзілі ў той час. Дастаткова прывесці такі прыклад. У 1925 годзе вясковага хлопца Лемеша выбралі намеснікам старшыні Ленінскага сельсавета.

У 1924 годзе па ленінскім закліку ў камсамол уступіла вялікая група моладзі. Гэта У.Лемеш, які цяпер працуе ў Віцебскім ветэрынарным інстытуце, М.А.Торык — цяпер віцэ-адмірал. Першы быў сакратаром Ленінскай камсамольскай арганізацыі, а затым паехаў па камсамольскай пуцёўцы на вучобу. Сакратаром камсамольскай арганізацыі выбралі М.А.Торыка, а ў 1928 годзе ён стаў сакратаром Слуцкага райкома камсамола. Ленінская камсамольская арганізацыя выхавала такіх камсамольцаў, як А.П.Гладкі — цяпер дацэнт, выкладчык другога Ленінградскага інстытута, А.М.Невяроўскі — цяпер палкоўнік і інш.

Камсамол вёў паход за ліквідацыю непісьменнасці. У вышэйшых навучальных установах адкрыліся рабочыя факультэты. Расла сетка школ ФЗН. У 1920 годзе было рамеснае вучылішча ў Слуцку, якое рыхтавала спецыялістаў для прадпрыемстваў горада. У вучылішчы стварылі камсамольскую ячэйку, сакратаром выбралі т. Прыму.

Разам з партыйнай арганізацыяй камсамол горада і раёна актыўна змагаўся за будаўніцтва новай вёскі. Сельскія камсамольцы стваралі камуны, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі, рыхтавалі першыя кадры механізатараў. Уся гэтая работа праводзілася ў напружанай класавай барацьбе.

У снежні 1925 года ў Слуцкім раёне было каля 200 камсамольцаў. У Васілінкаўскай камсамольскай арганізацыі яшчэ ў 1922 годзе налічвалася 7 членаў камсамола. Першым сакратаром ячэйкі быў Пётр Басалыга, які працаваў старшынёй сельсавета. Сярод камсамольцаў былі

Наследие слуцкого края



Т.Ц.Шахлевіч.

А.Яцук, П.Маглыш, У.Шарамет, В.Капарыха, Ф.Бурак, Г.Барцэвіч. Збіраліся яны ў доме Паўла Маглыша. Тут абсталявалі чырвоны куток, развесілі плакаты, лозунгі. Кожны тыдзень абавязкова праводзілі камсамольскія сходы. На іх запрашалі моладзь. Камсамольцы арганізавалі палітвучобу, чыталі лекцыі і даклады перад канцэртамі мастацкай самадзейнасці. Кожнаму камсамольцу было даручана падрыхтаваць даклад і выступіць з ім. Арганізоўвалі платныя вечары. Сабраныя сродкі ішлі на абсталяванне клуба. Як пацяплела, камсамольцы зрабілі летні клуб, яны растлумачвалі насельніцтву законы і палітыку Савецкай улады, ЦК камсамола заклікаў камсамольцаў ехаць на новабудоўлі. Са Слуцкага раёна паехалі Пётр Басалыга, Дзям'ян Махлай, Фёдар Бурак і яго жонка Кацярына Бурак.



Першыя камсамольцы Бокшыцкай ячэйкі: Рудзяк, П.П.Басалыга, К.Д.Бурак, А.М.Яцук.

Вялікую ролю адыграў камсамол у барацьбе за калектывізацыю сельскай гаспадаркі і ліквідацыю кулацтва як класа. Першая калектыўная гаспадарка была арганізавана ў вёсцы Пуцята Ленінскага сельсавета на памежчыцкай зямлі. Старшынёй калгаса выбралі члена партыі з 1905 года П.С.Кашанскага.

Райком камсамола паслаў у кожную вёску па групе камсамольцаў для арганізацыі калектыўных гаспадарак. З вёскі Дзюдзева 4 камсамольцы — М.Ф.Мяцельскі, І.П.Кіршчэня, У.Ф.Кірчэня, У.Ф.Мяцельскі паехалі для арганізацыі камуны ў вёску Хранова (цяпер Ветка). 23 лютага 1929 года тут была арганізавана камуна «Чырвоны маяк». Старшынёй яе стаў М.Ф.Мяцельскі, які ў 1927 годзе ўступіў у камсамол.

У вёсцы Ізбудзішча быў арганізаваны калгас «КІМ». Туды накіравалі камсамольцаў з усяго раёна. У вёсцы Немча арганізавалі калгас «Батрак», куды ўвайшлі выключна адны беднякі.

Адначасова працягваўся паход за культуру. У 1929/1930 навучальным годзе камсамол накіраваў у вёску для ліквідацыі непісьменнасці 100 тысяч культармейцаў, а ў наступным годзе — 250 тысяч. У ліку іх у вёску Бокшыцы была паслана Т.Ц.Шахлевіч.

Прамысловасць для калектыўнай сельскай гаспадаркі дала тэхніку. Трэба было падрыхтаваць кваліфікаваных спецыялістаў. За гэту справу ўзяўся камсамол. У калгасе «Колас» (вёска Бокшыцы) з'явіўся першы трактар. На ім працаваў камсамолец Васіль Капарыха.

Гераічная праца савецкіх людзей дала станоўчыя вынікі. За гады даваенных пяцігодак у горадзе і раёне пабудавалі рад буйных прамысловых прадпрыемстваў:

Наследие слуцкого края

электрастанцыю, мясакамбінат, торфазавод, масласырзавод, плодавінзавод, сельгасмайстэрні. Да Вялікай Айчыннай вайны на Случчыне налічвалася 17 прамысловых прадпрыемстваў і 16 прамарцелей. У 1937 годзе прамысловасць горада выпусціла прадукцыі на некалькі мільёнаў рублёў.

Вялікія змены адбываліся ў вёсцы. З году ў год умацоўвалі і развівалі свае гаспадаркі калгасы і МТС. Да вайны ў раёне было 3 МТС і 32 калгасы. Была створана шырокая сетка школ і культурна-асветных устаноў. У Слуцку працавалі педвучылішча, медыцынская школа, 10 агульнаадукацыйных школ і 3 школы рабочай моладзі. У тым, што непазнавальна мянялася жыццё працоўных Случчыны, вялікая роля камсамольцаў. Яны былі на пярэднім краі.

У 1940 годзе раённая камсамольская арганізацыя ўмацавалася арганізацыйна і значна выросла. Яна налічвала ў сваіх радах 1300 юнакоў і дзяўчат. Сакратаром райкома быў т. Парашчанка.

Камсамольцы працягвалі паход за далейшы ўздым прамысловасці і сельскай гаспадаркі, культуры Случчыны.

Шлях Ільіча. 1970. 10 вер.

Гартаю лісткі календара...

...1929 год у Бокшычах быў годам нараджэння новага жыцця. Колішнія панскія землі, раскупленыя кулакамі, былі адабраны і аддадзены пад калгас. На агульным сходзе калгасу далі сімвалічнае імя: «Колас». Няхай красуе, няхай наліваецца.

Першым старшынёй калгаса абралі камуніста Мікалая Цімафеевіча Акуловіча. Членамі першага калгаснага праўлення сталі вясковыя актывісты: Сяргей Ілюкевіч, Сцепаніда Басалыга, Кацярына Бурак, Васіль Гук, Таццяна Шахлевіч, Ляксей Семяновіч, Сцяпан Шарамет, Афрасыня Шарамет — камуністка, член першага жаночага савета. Цяпер гэта ўсё паважаныя і заслужаныя пенсіянеры. А тады... Тады, на першым часе, калгас толькі і трымаўся на моладзі, на камсамольцах. Камсамольцы першыя пайшлі на фермы, першыя селі на трактар, камсамольцы зажыналі першы калгасны сноп.

Васіль Арсенцьевіч Капарыха многа гадоў ужо настаўнічае у сваёй жа Бокшыцкай дзесяцігодцы. А ў тым 1929 годзе ён быў першым камсамольцам-трактарыстам. Першую калгасную баразну араў на амерыканскім «фардзоне». Жанкі баяліся падступіцца да «нячыстае сілы», што сама арала іх палеткі. А тыя, што адважваліся рукой дакрануцца да яе гарачага лба — радыятара, паспешліва хрысціліся...

Ні на адзін крок не адставала ад Васіля Капарыхі і маладзенькая прыезджая настаўніца Таццяна Шахлевіч. Абое хораша спявалі, абое скакалі ўдала, у абаіх быў невычарпальны запас маладой весялосці і энтузіязму — і не дзіва, што вакол іх заўсёды збіралася ўся вясковая моладзь. Не дзіва, што бокшыцкія калгасныя «артысты» неўзабаве сталі вядомыя на ўсю акругу... А пазней, калі Таццяна Цімафееўна і Васіль Арсенцьевіч пажаніліся і абое пачалі ўжо рабіць у школе, захапленне мастацкай самадзейнасцю паступова зрабілася іх другім прызваннем. Абое яны і да гэтага часу, пагадаваўшы ўжо даўно дзяцей, не



Камсамольская дэлегацыя Случчыны на VIII Усебеларускім з'ездзе ЛКСМБ. 5 лютага 1926 г.

Наследие слуцкого края

адступаюць ад маладых: на ўсіх абласных і рэспубліканскіх аглядах славяць яны сваю школу, свой калгас і ўсю Случчыну таксама.

Летапіс калгаса імя Дзяржынскага (гэтак цяпер называецца былы «Колас») захавае для гісторыі не адно слаўнае імя.

У Бокшычах і цяпер яшчэ жывуць чапаеўцы — некалі ўвесь прызыў з Бокшыч трапіў у Чапаеўскую дывізію. І цяпер любяць успамінаць старыя чапаеўскія арлы свайго легендарнага камандзіра. Успамінаюць, як прыязджаў да іх у дывізію Фрунзе, як загадаў ён выдаць усім чапаеўцам каракулевыя папахі... Адна такая папаха-чапаеўка вярнулася нават і ў Бокшычы. Пра яе і цяпер яшчэ ходзіць успамінак.

Былі і аўтараўцы з «Дзяржынскага» — Арцём Пятровіч Махлай і Фёдар Паўлавіч Барцэвіч. У штурме Зімняга прымаў удзел Ціхон Іванавіч Салавей...

...Славутая бокшыцкая племянная конная ферма (сам Будзённы некалькі разоў прыязджаў да вайны і ўручаў дзяржынцам пераходны сцяг) уся да апошняга каня была вывезена ў Германію. Курыную ж ферму немцы ў вайну зжэрлі за некалькі гадзін, толькі пух і пер'е ляцелі па навакольлі.

...У 1953 годзе, калі дробны яшчэ «Колас» аб'яднаўся з «Працаўніком» і «Чырвонымі Васілінкамі», старшынёй калгаса астаўся Антон Іванавіч Козак. Ён прайшоў усю грамадзянскую вайну. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі там арганізоўваў калгасы. У Вялікую Айчынную вайну ваяваў пад Сталінградам. Цяпер Антон Іванавіч персанальны пенсіянер. Але ён не ў адстаўцы — пад яго клопатам калгасны сад. У гэтым годзе сад урадзіў як ніколі. Як ніколі ўрадзіла і пшаніца, вымахалі льны, непрыступнай сцяной загарадзіла камбайну дарогу кукуруза. І ўсё гэта на тых землях, на тых колішніх палосках, дзе некалі колас за коласам ганяўся...

Друкуецца паводле кн.: Васілевіч А. Мыс добрай надзеі. Мн., 1977. С. 224—226.

Каля вытокаў самадзейнага тэатра

З успамінаў А.Ярашэвіча, жыхара в. Вялікая Сліва

У 1923 г. я навучаўся ў Цараўскай (цяпер Кіраўская) сямігадовай школе. У вёсцы была хата-чытальня. Загадваў ёй Рыгор Мурашка, які потым стаў вядомым беларускім пісьменнікам. Быў створаны драматычны гурток, які развучваў і ставіў спектаклі. Мы, вучні, таксама хацелі ставіць спектаклі, і настаўнік беларускай мовы Янка Каўпак развучваў з намі дзіцячую п'еску «Пастушок». Аб усім гэтым я расказаў у сваёй в. Вялікая Сліва старэйшым таварышам. Яны загарэліся жаданнем аб тэатральнай дзейнасці. Я звярнуўся да Мурашкі за п'есай, і ён з задавальненнем



Слуцкі драмкалектыў клуба імя Крэйнеса. 1925 г.

Наследие слуцкого края

даў мне п'есу «Модны шляхцюк» М.Чарота.

Калі я прынёс, то радасці моладзі не было канца. Пачаліся рэпетыцыі. Ролі былі перапісаны.

Пасля доўгай і карпатлівай падрыхтоўкі п'еса была гатова для пастаноўкі. І вось у мясцовай школе з сабраных дошак і іншых матэрыялаў была пабудавана сцэна з суфлёрскай будкай. Спектакаль меў нечаканы поспех. Уваход быў платны, за што сабралі звыш паўтоны збожжа, якое прадалі дзяржаве, за грошы купілі бібліятэчку, грым і інш.

Росквіту самадзейнае мастацтва ў Вялікай Сліве дасягнула ў 1927 г. і пазней, калі ў вёсцы з'явіліся студэнты і інтэлігенцыя. У час зімовых і летніх канікул і водпускаў прыязджалі студэнты і інтэлігенцыя і разам з вясковай моладдзю рыхтавалі спектаклі, канцэрты. У рэпертуары былі такія п'есы, як «Пінская шляхта», «Лес шуміць», «Мікітаў лапаць», «Чырвоныя кветкі Беларусі» і іншыя, якія ішлі на сцэне прафесіянальных драматычных калектываў таго часу.

У выніку ўсёй гэтай работы вырас актыў вясковай моладзі. Асабліва трэба вызначыць такіх, як Антон Самусевіч, Яўхім Чыжык, Ганна Тупік, Соня Самусевіч, Аляксандр Курдзюк, Рыгор Лысы і інш.

Сустрэча з С.М.Будзённым

Быў цёплы асенні дзень. Жанчыны з кошыкамі ішлі на палетак. Тут ужо з самага ранку араты падганяў парку коней:

— Но-о, малыя. Пашавельвайцеся хутчэй.

Калгасніцы выбіралі бульбу, якую толькі што выаралі з радкоў. Праз агароды напрасткі імчаліся хлапчукі з расшпіленымі каўнярамі кашуль. Яшчэ здалёк наперабой крычалі:

— Будзённы прыехаў!

— Сямён Міхайлавіч у Бокшыцах!

Жанчыны кінуліся ў вёску. Каля канюшні сабралася многа людзей. Сюды на аўтамашыне прыехаў С.М.Будзённы. Сямён Міхайлавіч прывітаўся, моцна паціскаючы рукі калгаснікам.

— Мы ж толькі з поля, — пачала вінавата адна калгасніца і стала выціраць аб фартух рукі.

— Нічога, нічога. Трэба ганарыцца працавітымі рукамі, — заўважыў Сямён Міхайлавіч.

Завітаў С.М.Будзённы ў Бокшыцы, каб паглядзець конегадоўчую племянную ферму. Старшыня калгаса даў знак конюху Сяргею Крывалю:

— Выводзь, Яфімавіч, на двор жарабцоў. Пакажы, чым ты тут займаешся.

Сяргей Крываль са сваім напарнікам Васілём Кабцэвічам умомант прывязалі да канявязі 12 жарабцоў. Чыстапародныя коні капытамі грэблі зямлю, дугой трымалі шыі.

Легендарны палкаводзец з задавальненнем браўся за грыву кожнага стаенніка, аглядаў коней.

— Для сельскай гаспадаркі выдатныя коні. А вось для кавалерыі цяжкаватыя. Нам бы рысакоў, — заўважыў Сямён Міхайлавіч.

Доўга размаўляў С.М.Будзённы з конюхам Сяргеем Крывалём, раіў, якія пароды коней заводзіць. Было гэта ў 1933 годзе...

У.М.Цішкевіч.

Г.К.Жукаў у Слуцку

ЖУКАЎ Георгій Канстанцінавіч (1896–1974). Маршал Савецкага Саюза, чатыры разы Герой Савецкага Саюза (1939, 1944, 1945, 1956). Лёс Георгія Канстанцінавіча Жукава ў 1940-я гады быў цесна звязаны з Беларускай ваеннай акругай. У 1926–1931 гг. ён выкладаў ваенна-дапрызыўную падрыхтоўку ў БДУ. З 1930 г. камандзір 2-й кавалерыйскай брыгады 7-й дывізіі (штаб у Мінску), у 1933–1937 гг. камандзір 4-й кавалерыйскай дывізіі імя К.Варашылава, якая базіравалася ў Слуцку, потым — 3-га кавалерыйскага корпуса (штаб у Мінску). У 1938–1939 гг. нам. камандуючага войскамі Беларускай асобай ваеннай акругі па кавалерыі.

У 1930-я гады Слуцк знаходзіўся ў памежнай зоне і таму не меў вялікага стратэгічнага значэння. З 1932 г. у Слуцк з Ленінградскай ваеннай акругі была перадыслацыравана 4-я кавалерыйская дывізія, якая ўваходзіла ў састаў 3-га кавалерыйскага кор-

Наследие слуцкого края

пуса Чырвонай Арміі. З 1933 г. па 1937 г. камандзірам дывізіі быў Г.К.Жукаў. Увесь гэты перыяд ён разам з сям'ёй жыў у Слуцку, дзе яго імем названа вуліца і ўстаноўлены помнік.

З успамінаў Г.К.Жукава

... В Слуцк мы попали в период весенней распутицы. На станции была непролазная грязь, и пока добрались до тачанки, жена не раз оставляла свои галоши в грязи. Сидя у меня на плечах, Эра спросила:

— Почему здесь нет тротуара, как у нас в Сокольниках?

Я ей ответил:

— Здесь тоже будет тротуар и красивая площадь, но только позже...

Мне с семьей пришлось временно приютиться в 8-метровой комнате у начальника химслужбы дивизии В.М.Дворцова, который был так любезен, что сам с семьей остался в одной небольшой комнате, уступив нам эту комнатушку. Все мы понимали трудности с жильем, и никто не претендовал на лучшее, пока это «лучшее» мы сами не построили.

Через полчаса я был уже в штабе дивизии, который располагался тут же во дворе. Командира дивизии Г.П.Клеткина в штабе не было: он сообщил, что нездоров и принять меня не может. Я, конечно, понимал его душевное состояние и не настаивал на немедленной встрече.



Помнік Г.К.Жукаву ў Слуцку.

С положением дел меня подробно ознакомили заместитель командира по политической части Николай Альбертович Юнг и начальник штаба дивизии Александр Иванович Вертоградский. Я был признателен им за то, что они сумели все быстро и обстоятельно изложить. Однако мне предстояло главное: самому досконально разобраться в обстановке непосредственно в частях и подразделениях, определить недостатки, найти их причины и вместе с командирами и политработниками наметить пути их ликвидации...

Благодаря усилиям всего личного состава дивизии в 1935 году было завершено строительство: все части получили хорошие квартиры, учебно-материальную базу. Значительно улучшился и конный состав дивизии.

К этому времени были достигнуты неплохие рузельтаты и во всех видах политической и боевой подготовки. Имелись высокие показатели по дисциплине, службе и общей организованности частей и подразделений.

1935 год ознаменовался для нас большими событиями. Во-первых, на инспекторских смотрах все части дивизии получили высокие оценки, в том числе и по самому трудному виду боевой подготовки конницы — по огневой подготовке. Во-вторых, дивизия была награждена за свои успехи в учебе высшей правительственной наградой — орденом Ленина.

Орденами был награжден большой ряд командиров, младших командиров и красноармейцев. Орденом Ленина был награжден и я. Все это волновало меня до глубины души. Я крепко задумался над тем, что мы должны сделать, чтобы еще выше поднять боевую подготовку и общее состояние дивизии...

Большим событием был приезд в дивизию Семена Михайловича Буденного... Для вручения ордена Ленина дивизия была собрана в конном строю на одном из плацев города. Весь личный состав в приподнятом настроении, на флангах каждой части развевались боевые знамена, под которыми старые бойцы ходили в бой с белогвардейцами и белополяками.

В торжественной тишине после встречного марша и рапорта С.М.Буденный поднялся на трибуну. По его знаку подъезжаю с ассистентами, держа боевое знамя

Наследие слуцкого края

дивизии. С.М.Буденный прикрепляет к нему орден Ленина, и мы со знаменем скачем полевым галопом перед строем.

В многотысячном «ура», мощном артиллерийском салюте слышалась самая сердечная благодарность всего личного состава дивизии партии и правительству, отметившим высокой наградой успехи дивизии в учении и боевой подготовке в мирное время.

После объезда строя с кратким словом к дивизии обратился Семен Михайлович. Было заметно его волнение. Да и как же не волноваться! Это выпестованная им дивизия получила самую высокую награду... В заключение состоялось торжественное прохождение частей. После парада у командира дивизии был обед, на котором Семен Михайлович и старые конармейцы вспоминали эпизоды гражданской войны, походы и отважных героев, которым не довелось дожить до наших дней...

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Ж у к о в Г. К. Воспоминания и размышления. М., 1974. Т. 1. С. 130–142.

З успамінаў А.Дз.Фаміна, былога жыхара Слуцка, які служыў у дывізіі пад камандаваннем Г.К.Жукава

Спешна перакінутая дывізія была ў вельмі складаным становішчы. Не было закончана будаўніцтва казармаў, канюшняў. Дывізію праверыў камандуючы войскамі БВА Убарэвіч, які далажыў наркому абароны Варашылаву аб стане спраў. Пасля гэтага і назначылі камдывам Г.К.Жукава, якія пачаў наводзіць адразу ж парадак у палках. У сваіх выступленнях ён заяўляў, што дывізія павінна стаць і будзе перадавой сярод конніцы Чырвонай Арміі. Асабіста мне даводзілася з Жукавым сустракацца многа разоў, асабліва, калі дзяжурыў па палку і суправаджаў яго па казармах і канюшнях. Сустракаўся і пры іншых абставінах. У лютым 1935 г. я быў у яго ў рэзерве ў якасці пасрэдніка, які па трывозе ноччу паднімаў палкі. Былі сустрэчы яшчэ і восенню 1936 г. на гарнізонным стрэльбішчы, дзе праводзілася інспектарская праверка па стральбе з ручной зброі на 3000 м. Я быў дзяжурным і на працягу дня знаходзіўся з Жукавым, выконваў яго распараджэнні. У 1936 г. сталі прысвойваць вайсковыя званні: каму давялося прыбаўляць знакі адрозненя, а каму — убаўляць. Узніклі пытанні, на якія Жукаў смела адказаў: «Я таксама зняў адзін ромб, але буду Маршалам Савецкага Саюза».

З успамінаў В.Ф.Золатавай, жыхаркі Слуцка, маці якой, Фёкла Дзмітрыеўна Скібра, была хатняй работніцай у сям'і Г.К.Жукава

Маці мяне часта брала з сабой да Жукавых. Шмат яго памятаю сама, многае расказвала маці. Жылі Жукавы ў двухпавярховым доме па вул. Талстога. Абстаноўка была простая, як ва ўсіх у той час. У маці быў свой пакой. Старэйшая дачка Жукавых Эра вучылася ў СШ № 1, малодшая, Эла, нарадзілася ў Слуцку. Жонка Г.К.Жукава Аляксандра Дзееўна была вельмі добрая і прыгожая жанчына. Мама мая была ціхая, бясхітрасная, нават саромелася есці разам з сям'ёй Жукавых. Але Георгій Канстанцінавіч папрасіў, каб у час яды яна была заўсёды з імі за адным сталом. Быў ён вясёлы, добры, чулы, строгі, але справядлівы. Ён вельмі хацеў, каб маці ад цёткі забрала мяне да сябе жыць. Але яна саромелася, а я баялася, бо не зусім добрыя поспехі былі па рускай мове. Жукаў нават прапанаваў наняць настаўніка і сам абяцаў плаціць за навучанне. Мама адмовілася.

Георгій Канстанцінавіч любіў ранкам займацца спортам. Бегаў, абліваўся халоднай вадой, выконваў практыкаванні на турніку. Многа часу праводзіў на службе. У вольны час любіў чытаць. У доме было шмат кніг. Хадзіў на прагулкі з сям'ёй, добра фатаграфаваў і яшчэ любіў танцаваць. У старым будынку Дома афіцэраў па суботах і нядзелях збіраліся на вечары адпачынку сем'і ваеннаслужачых. Танцы пачынаў сам Жукаў. Яго любімы танец — вальс. У 1937 г. Г.К.Жукава перавялі ў Мінск. Перад ад'ездам сям'я Жукавых падарыла нам кнігі, фотаздымкі, якія, на жаль, у гады вайны згарэлі.

У той час, калі Жукаў служыў у Слуцку, ён выбіраўся ў мясцовыя партыйныя і савецкія органы. Так, VII з'езд Саветаў раёна ў 1934 г. выбраў яго членам райвыканкома і кандыдатам у члены прэзідыума райвыканкома. У час святкавання 1 Мая і Кастрычніка на цэнтральнай плошчы горада адбываліся ваенныя парады, якімі камандаваў Г.К.Жукаў.

В.С.Відлога.

Наследие слуцкого края

Вернутыя імёны

За невялікую гісторыю існавання Савецкай дзяржавы некалькі дзесяцігоддзяў прыпадаюць на найбольш змрочныя яе часы — перыяд сталінскага таталітарызму. Рэпрэсіі, якія бальшавікі прымянялі спачатку супраць палітычных і ідэалагічных праціўнікаў, паступова перакінуліся на саму партыю, а потым і на ўсё грамадства. Ва ўмовах, калі не тое што адкрытая крытыка існуючых парадкаў, але і простая незадаволенасць імі расцэньваліся як злачынства, калі падаўляліся элементарныя чалавечыя правы, а атмасфера падазронасці і страху ўсё больш ахоплівала грамадства, махавік масавых рэпрэсій набіраў абароты і працаваў, як адладжаны механізм. І ўсё гэта адбывалася на фоне выказванняў аб перамозе сацыялізму, аб клопатах партыі пра чалавека працы і г.д.

Не абмінулі рэпрэсіі і Случчыну. Ніжэй прыводзіцца спіс ураджэнцаў і жыхароў Слуцка і Слуцкага раёна — ахвяр палітычных рэпрэсій. Праз некалькі дзесяткаў гадоў справядлівасць у дачыненні да гэтых людзей была адноўлена: іх рэабілітавалі. Публікацыя гэтага сумнага мартыралога ў кнізе «Памяць» — адзін са шляхоў вяртання з нябыту чэсных імён нашых сучаснікаў. Безумоўна, гэты спіс далёка не поўны: у яго ўвайшлі толькі тыя прозвішчы, што сталі вядомымі стваральнікам кнігі пад час збору і апрацоўкі матэрыялаў для яе. Пошукавая работа ў горадзе і раёне працягваецца.

Ураджэнцы і жыхары Слуцка і Слуцкага раёна, якія падверглісь палітычным рэпрэсіям і пазней былі рэабілітаваны

ГОРАД СЛУЦК

АДАМОВІЧ Антоній, н. у 1890, іераманах-абнаўленец. Арыштаваны 1.4.1933, зняволены на 5 гадоў у ППЛ. Далейшы лёс невядомы.

АДАСЬ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1901, старшы дарожны майстар 13-й дыстанцыі пуці чыгункі. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

АПШАР (АНШАР) Майсей Залманавіч, н. у 1888. Асуджаны 17.5.1933 на высылку ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 20.7.1959.

АКУЛІЧ Васіль Фёдаравіч, н. у 1897, шавец арцелі. Прыгавораны 11.10.1938 да ВМП. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны 5.1.1971.

АЛЬФЯРОВІЧ Баніфацый Герасімавіч, н. у 1882, справавод канцылярыі пошты. Асуджаны 7.6.1933, паўторна ў 1934 на пазбаўленне права пражывання ў пэўных населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 31.3.1989.

АНТАШЭЎСКІ Апанас Фёдаравіч, н. 18.12.1887. Упаўнаважаны Камітэта нарыхтовак СНК БССР па Капыльскім р-не Слуцкай акругі. Асуджаны 17.12.1937. Расстраляны 21.1.1938. Рэабілітаваны 21.6.1989.

АРЦЮШЭЎСКІ Канстанцін Фаміч, н. у 1876 у м. Койданава, санітар Слуцкага ветэрынарнага ўчастка. Асуджаны 20.12.1937. Расстраляны 28.12.1937. Рэабілітаваны 17.8.1962.

АС Меер Абрамавіч, н. у 1890, рахункавод торфаарцелі. Асуджаны 26.5.1938. Расстраляны 22.7.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 21.12.1959.

АСВЯЦІМСКІ Марк Аляксандравіч (1886–1938). Ураджэнец Слуцка. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі ўдзельнік з'ездаў прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацыяй і партый у Мінску ў сакавіку і ліпені 1917, адзін з кіраўнікоў слуцкай павятовай міліцыі пры мясцовым камісарыяце Часовага ўраду. У 1918 сябар партыі беларускіх эсэраў, адзін з кіраўнікоў Слуцкага беларускага нацыянальнага камітэта. У 1919–1920 член ЦК Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р), да 1924 узначальваў яе павятовы камітэт у Слуцку. Удзельнічаў у культурніцкіх акцыях арганізацыі «Папарацькветка». Прыхільнік збліжэння з бальцавікамі. Двойчы, у 1919 і 1921, часова арыштоўваўся ЧК як эсэраўскі актывіст. У 1924, пасля ліквідацыі БПС-Р, адышоў ад палітычнай дзейнасці. У 1930-я гады працаваў эканамістам Гомельскага тлушчкамбіната. Арыштаваны 11.2.1938, па прыгавору «тройкі» расстраляны 1.11.1938. Рэабілітаваны 13.7.1960.

АСІПОВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1896, памочнік начальніка сувязі 86-га стралковага палка. Прыгавораны да ВМП 25.7.1921. Расстраляны 27.7.1921. Рэабілітаваны 18.11.1992.

АХРАМОВІЧ Іосіф Людвігавіч, н. у 1889, пячнік. Прыгавораны 28.9.1938 да ВМП. Расстраляны 9.10.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 7.5.1958.

АЧАПОЎСКІ Нічыпар Сямёнавіч, н. у 1863, псаломшчык Свята-Міхайлаўскай царквы. Арыштаваны 14.3.1933. Высланы на 3 гады. Лёс невядомы.

БАГДАШЫЦ Пётр Іванавіч, н. у 1889, планавік Слуцкага лесадрэўсаюза. Асуджаны 3.11.1937. Рас-

Наследие слуцкого края



І.П.Баглаеў.

страляны 16.11.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 2.12.1961.

БАГЛАЕЎ Іван Піліпавіч, н. у 1892, удзельнік барацьбы з польскімі акупантамі на Случчыне ў 1919–1920. У 1937 рэпрэсіраваны, у 1938 расстраляны.

БАРАНАЎ Іван Фаміч, н. у 1905 у Магілёве, начальнік 921-га дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 25.8.1958.

БАРАНАЎ Фама Сцяпанавіч, н. у 1893 у Заслаўскім р-не, аператар Слуцкай паштовай канторы. Асуджаны 4.6.1933, паўторна 19.2.1934 на пазбаўленне права пражывання ў пэўных населеных пунктах СССР. Рэабілітаваны 31.3.1989.

БАРАНОЎСКАЯ Ганна Паўлаўна, н. у 1907 у в. Машчыцы, мовазнаўца, працавала мал. навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры і мовы АН БССР. Арыштавана 24.8.1937, прыгаворана 29.10.1937 да ВМП. Рэабілітавана 13.9.1966.

БАРАНОЎСКАЯ Марыя Пятроўна, н. у 1882, хатняя гаспадыня. Асуджана 26.9.1938. Рэабілітавана 31.3.1989.

БАРАНОЎСКІ Лаўрэнцій Фёдаравіч, н. у 1890, калгаснік. Асуджаны 17.5.1933 на высылку ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 20.7.1959.

БАРАНОЎСКІ Мікалай Сямёнавіч, н. у 1912, рабочы будаўнічай канторы. Асуджаны 17.12.1937. Расстраляны 21.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 19.12.1956.

БАРТАШЭЎСКІ Аляксандр Эдуардавіч, н. у 1882 у в. Бязверхавічы, цясляр Слуцкага леспрамгаса. Асуджаны 10.3.1938. Расстраляны 7.4.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 26.12.1959.

БАТАЛІН Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1871, протаіерэй, настаяцель Свята-Міхайлаўскай царквы. Арыштаваны 14.3.1933. Высланы на 3 гады ў Казахстан.

БЕЙНЕР Іосіф Станіслававіч, н. у 1906, брыгадзір 13-й дыстанцыі пуці чыгункі. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

БЕЛЬСКІ Сяргей Сцяпанавіч, н. у 1900, начальнік чыгуначнай станцыі Слуцк. Асуджаны 15.2.1938. Расстраляны 28.2.1938. Рэабілітаваны 23.4.1957.

БЕРАЗІНСКІ Франц Якаўлевіч, н. у 1880, брыгадзір 13-й дыстанцыі пуці чыгункі. Асуджаны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

БОНДАРАЎ Ігнат Іванавіч, н. у 1911, брыгадзір 9-га акалодка 13-й дыстанцыі пуці. Асуджаны 14.10.1944 на 8 гадоў пазбаўлення волі і на 3 гады пазбаўлення правоў. Рэабілітаваны 23.6.1964.

БОРТНІК Леанід Мацвеевіч, н. у 1925, вальцоўшчык млына «Прагрэс». Асуджаны 30.11.1944 на 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Рэабілітаваны 28.1.1958.

БРЖАЗОЎСКІ Арсеній Пятровіч, н. у 1906, камандзір узвода 11-га сп. Асуджаны 25.11.1939 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.7.1960.

БРОСЕЛЬ Вера Генрыхаўна, н. у 1882 у Пінску, хатняя гаспадыня. Асуджана 18.3.1930 на пазбаўленне права пражывання ў пэўных населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітавана двойчы: 13.7.1989 і 29.10.1992.

БРОСЕЛЬ Міхаіл Вікенцьевіч, н. у 1879 у Гродзенскай губ. Асуджаны ў 1930 на 3 гады пазбаўлення волі. Рэабілітаваны двойчы: 13.7.1989 і 29.10.1992.

ВАЙШВІЛА Леанід Якаўлевіч, н. у 1902, дарожны майстар чыгункі. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ВАРАНЕЦКІ Іосіф Рыгоравіч, н. у 1873. Прыгавораны 26.7.1920 да ВМП. Рэабілітаваны 13.11.1992.

ВЕЙГУЛЬ Іосіф Ягоравіч, н. у 1890 у Латвіі, загадчык Слуцкай нафтабазы. Асуджаны 28.9.1938. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 15.11.1961.

ВІЛЕНЧЫК Меер Міхелевіч, н. у 1905, рабочы па найме. Асуджаны 10.6.1925 на высылку на Урал на 3 гады. 20.1.1928 пазбаўлены права пражывання ў пэўных населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 28.5.1992.

ВІШНЕЎСКАЯ Марыя Фамінічна, н. у 1895 у Польшчы, хатняя гаспадыня. Асуджана 17.12.1937. Расстраляна 22.1.1938 у Слуцку. Рэабілітавана 15.6.1959.

ВІШНЕЎСКІ Іосіф Ігнатавіч, н. у 1891 у Польшчы, член Слуцкага акруговага суда. Асуджаны 17.12.1937. Расстраляны 26.12.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 15.6.1959.

ВОЛАТ Соф'я Іванаўна, н. у 1871 у в. Замосце, хатняя гаспадыня. Асуджана 9.12.1937. Расстраляна 22.1.1938 у Слуцку. Рэабілітавана 30.3.1989.

ВОЛКАВА (ВОЛК) Дзіянісія Ксавер'еўна, н. у 1883, піяністка кінатэатра. Расстраляна 29.11.1937 у Слуцку. Рэабілітавана 26.6.1959.

ВУСАЎ Уладзімір Паўлавіч, н. у 1899 у Барысаве, начальнік ДЭУ-921. Асуджаны 1.7.1938. Расстраляны 1.7.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 27.2.1958.

ГАПАНОВІЧ Міхаіл Пятровіч, н. у 1904 у в. Сяроднікі, загадчык справаводства аўтатранспартнай

Наследие слуцкого края



П.Я.Жаўрыд.

роты ў Слуцку. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 11.12.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 28.2.1962.

ГАЎРУК Юрый Паўлавіч, н. у 1905 у Слуцку, дацэнт кафедры мовы і літаратуры Магілёўскага педінстытута. Арыштаваны 8.2.1935. Рэабілітаваны 27.2.1958.

ГАЎРЫЧЭНКА Аляксей Сямёнавіч, н. у 1904 у в. Ямнае Кіраўскага р-на, майстар 2-га прарабскага пункта чыгуначнай ст. Слуцк. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 10.12.1937. Рэабілітаваны 4.3.1958.

ГАШЭЎСКАЯ Дар'я Сідараўна, н. у 1900 у Бесарабіі, прачка в/ч 6355, якая дыслацыравалася ў Слуцку. Асуджана двойчы: 26.9.1938 на 5 гадоў ППЛ і 11.7.1949. Рэабілітавана 20.3.1989.

ГЕРАСІМОВІЧ Анатоль Дзмітрыевіч, н. у 1911 у в. Устрань. Асуджаны 17.5.1933 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 5.3.1960.

ГЕРАСІМОВІЧ Арсеній Дзмітрыевіч, н. у 1913 у в. Устрань. Асуджаны 17.5.1933 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.3.1960.

ГІРЭЛЬ Васіль Васільевіч, н. у 1901, рабочы чыгункі. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ГРОМАЎ (ГРОМ) Васіль Рыгоравіч, н. у 1902 у в. Семурадцы Тураўскага р-на, рабочы камунальнага аддзела Слуцкага гарсавета. Асуджаны 14.10.1937. Расстраляны 26.10.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 27.3.1989.

ГРУШЭЎСКІ Уладзімір Лявонцьевіч, н. у 1893, працаваў галоўным бухгалтарам Бабруйскага мясакамбіната. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 15.11.1937. Рэабілітаваны 21.11.1957.

ГРЫЦКЕВІЧ Іосіф (Іван) Адамавіч, н. у 1895 у Польшчы, загадчык ларка арцелі інвалідаў у Слуцку. Асуджаны 26.5.1938. Расстраляны 22.7.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 4.12.1958.

ГУСЕВА Таццяна Сігізмундаўна, н. у 1883 у Мазырскім р-не, повар Слуцкага ваеннага шпіталя. Асуджана 17.12.1937. Расстраляна 21.1.1938 у Слуцку. Рэабілітавана 19.12.1956.

ДАБРАВОЛЬСКІ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1895 у в. Обруб Гродзенскай вобл., завуч слуцкай СШ № 1. Асуджаны 7.12.1937. Расстраляны 23.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 9.5.1957.

ДАРАШКЕВІЧ Іосіф Францавіч, н. у 1894, рахункавод. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ДОЎБІК Алена Аляксандраўна, н. у 1892 у в. Грыцэвічы Клецкага р-на, сакратар 2-га ўчастка народнага суда г. Слуцк. Асуджана 17.12.1937. Расстраляна 21.1.1938 у Слуцку. Рэабілітавана 19.12.1956.

ДУБОЎСКІ Фадзей Аляксеевіч, н. у 1889, грузчык чыгуначнай ст. Слуцк. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ДУБОЎСКІ Фёдар Пятровіч, н. у 1898 у в. Барсукі Полацкага пав., упаўнаважаны Слуцкага акруговага АДПУ НКУС БССР. Асуджаны 1.7.1938. Расстраляны 16.9.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 8.3.1958.

ЖАЎРЫД Павел Якаўлевіч, н. у 1889 у фальварку Цецяроўка Слуцкага пав., у 1909 закончыў Слуцкую гімназію, у 1917 — Віленскае ваеннае вучылішча. Працаваў юрысконсультам Слуцкага земаддзела, быў арыштаваны за «сувязь з Дзянікіным». Вызваліўся ў 1919 па амністыі і вярнуўся ў Слуцк, дзе яго абралі старшынёй Слуцкага беларускага нацыянальнага камітэта (БНК). Праводзіў актыўную работу па арганізацыі Беларускай рады Случчыны. Быў адным з кіраўнікоў Слуцкага паўстання 1920. Пасля пераехаў у Вільню, дзе прымаў актыўны ўдзел амаль ва ўсіх беларускіх арганізацыях. У 1923 атрымаў грамадзянства БССР і пераехаў у Мінск, дзе ўладкаваўся на працу ў Белсельпрамсаюз, пазней быў карэктарам у Інбелкульце, з 1929 — стыльрэдактарам газеты «Звязда». 18.7.1930 арыштаваны па справе «Саюза вызвалення Беларусі». Асуджаны 10.4.1931 на 3 гады ППЛ. У 1937 асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Пакаранне адбываў у Комі АССР. Памёр у лагеры. Рэабілітаваны 10.6.1988.

ЖДАНКО Аляксандр Паўлавіч, н. у 1902 у Слуцку, электраманцёр. Асуджаны 25.10.1938 на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.7.1957.

ЖОЛУДАЎ Карнілій Максімавіч, н. у 1892 у Віцебску, старшыня Слуцкага акрвыканкома. Асуджаны 28.6.1938. Расстраляны 28.6.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 29.12.1966.

ЗАБЕЛА Фёдар Іванавіч, н. у 1865 у в. Боркі. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 8.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 14.4.1989.

ЗАСІМОВІЧ Саваційй, ігумен Слуцкага Свята-Троіцкага манастыра. Арыштаваны 1.4.1933, высланы на 3 гады ў Казахстан. Лёс невядомы.

ЗАХАРЭВІЧ Генадзь, н. у 1868, протаіерэй, з 1926 настаяцель Слуцкага Свята-Успенскага сабора. Арыштаваны 14.3.1933, сасланы ў Казахстан на 3 гады. Лёс невядомы.

ЗАЯЦ Вікенцій Якаўлевіч, н. у 1905 у в. Выніцы, каваль. Асуджаны 5.11.1936. Расстраляны 11.11.1937 ў Слуцку. Рэабілітаваны 20.11.1959.

Наследие слуцкого края

ЗАЯЦ Парфірый Парфір'евіч, н. у 1879, манеўровы машыніст ст. Слуцк. Асуджаны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ЗДАНКО Пракоп Яўхімавіч, н. у 1879, дыякан Слуцкага сабора. Асуджаны 20.11.1929 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 26.3.1992.

ЗІБЕРТ Вітольд Вячаслававіч, н. у 1895 у Польшчы, тэхнік-наглядчык Слуцкай трыкатажнай фабрыкі. Асуджаны 3.1.1938. Расстраляны 23.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 5.5.1988.

ЗІНДА Цыля Ізраілеўна, н. у 1901 у Мінску, справавод Слуцкага рэўкома. Асуджана 23.9.1921 на высылку за межы Беларусі на 1 год. Рэабілітавана 6.6.1992.

ІАСЯЛЕВІЧ Ліза Шлёмаўна, н. у 1906. Асуджана 10.6.1925 на 3 гады высылкі. 21.8.1925 выслана ў Палесціну. Рэабілітавана 28.5.1992.

ІАХЕЛЬСОН Рахіль Іосіфаўна, н. у 1893, артыстка народнага тэатра г. Слуцк. Асуджана 23.9.1921 на высылку за межы Беларусі на 1 год. Рэабілітавана 6.6.1992.

КАБЫЛЕЎСКІ Міхаіл Карлавіч, н. у 1885, да рэвалюцыі служыў у паліцыі. Прыгавораны 25.7.1920 да ВМП. Звестак аб выкананні прыгавору няма. Рэабілітаваны 26.3.1992.

КАЛЯДА Васіль Захаравіч, н. у 1911, машыніст вадакачкі. Асуджаны 27.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КАМЕНШТЭЙН Саламон Давыдавіч, н. у 1895 у Беластоцкім пав., сакратар Слуцкага акруговага камітэта КП(б)Б. Асуджаны 30.10.1937. Расстраляны 31.10.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 14.11.1956.

КАРАЛЕЎСКІ Канстанцін Аляксеевіч, н. у 1907. Арыштаваны 30.6.1937. Асуджаны 19.12.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.4.1957.

КАРАСІК Мойша-Міхель Іцкавіч, н. у 1901 у Асіповічах, бухгалтар слуцкай тарфяной арцелі «Энергія». Асуджаны 26.5.1938. Расстраляны 22.7.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 30.3.1989.

КАРАЧУН Аляксандр Васільевіч, н. у 1904, журналіст. Асуджаны 4.11.1933 на 5 гадоў ППЛ з заменай на высылку ў Заходнюю Сібір на той жа тэрмін. Рэабілітаваны 24.8.1956.

КАЎШУЛЬ Анатоль Эрнэставіч, н. у 1908 у Германіі, баец 11-га сп, які дыслацыраваўся ў Слуцку. Асуджаны 28.10.1932 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.5.1992.

КЕДЫШ (КЕНДЫШ) Яўхім Паўлавіч, н. у 1877 у в. Белічы, вартаўнік сяннай базы ў Слуцку. Асуджаны 10.3.1938. Расстраляны 7.4.1938.

КЕНДЫШ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1900 у Польшчы, загадчык канцылярыі Слуцкага райвыканкома. Асуджаны 9.12.1937. Расстраляны 22.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 22.9.1958.

КІРЭЕВА Таццяна Паўлаўна, н. у 1925, сакратар Слуцкага райвыканкома. Асуджана 14.8.1945 на 5 гадоў ППЛ з пазбаўленнем правоў тэрмінам на 2 гады. Рэабілітавана 22.7.1969.

КІСЕЛЬ Адольф Мікалаевіч, н. у 1883 у в. Барок, кур'ер Слуцкага гарсавета. Асуджаны 10.11.1933 на 10 гадоў высылкі, якую адбываў у Мінусінску. Памёр у 1949 у Слуцку. Рэабілітаваны 31.5.1989.

КІСЯЛЁЎ Мітрафан Васільевіч, н. у 1906, дзяжурны па чыгуначнай ст. Слуцк. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

КІУЛА Венядзікт Сідаравіч, н. у 1864, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 14.2.1938. Расстраляны 13.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 6.5.1989.

КЛІМ Іван Іванавіч, н. у 1903 у Дрысенскім р-не, рабочы. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 25.8.1958.

КЛІМАЎ Абрам Аляксандравіч, н. у 1899 у Пінскім пав., старшыня праўлення Слуцкага жакта. Асуджаны 17.12.1937. Расстраляны 21.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 2.6.1958.

КЛІМАЎ Раман Абрамавіч, н. у 1924 у Слуцку, кладаўшчык арцелі «1 Мая». Асуджаны 16.7.1949 на 25 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.10.1966.

КЛЯШЭВІЧ Фёдар Васільевіч, н. у 1874 у Слуцку, касір паштовай канторы. Асуджаны двойчы: 7.6.1933 і 19.2.1934 на пазбаўленне права пражывання ў пэўных населеных пунктах СССР тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 31.3.1989.

КОБЫЗЕЎ Уладзімір Іванавіч, н. у 1895 у г. Грозны, начальнік дарожнага ўчастка. Асуджаны 19.10.1940 на 8 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 28.7.1942. Рэабілітаваны 1.6.1965.

КОЗЫР Надзея Ільінічна, н. у 1908 у Літве, касір чыгуначнай ст. Слуцк. Асуджана 27.5.1945 на 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Рэабілітавана 29.8.1956.

КОХАН Ігнат Герасімавіч, н. у 1888, іерэй, клірык Слуцкага Свята-Успенскага сабора, арыштаваны 14.3.1933. Высланы ў Паўночны край на 5 гадоў. Лёс невядомы.

КОХАН Іосіф Васільевіч, н. у 1905 у в. Лапацічы, возчык арцелі інвалідаў «Чырвоная Зорка». Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 20.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 19.5.1961.

КРЫВАДУБСКІ Ігнат Ігнатавіч, н. у 1894, псаломшчык Слуцкага Свята-Успенскага сабора з 1925. Асуджаны на 3 гады зняволены ППЛ. Лёс невядомы.

КУДЗІНОЎСКІ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1860 у засценку Смолева Слуцкага пав. Прыгавораны 27.7.1920 да ВМП. Звестак аб выкананні прыгавору няма. Рэабілітаваны 18.9.1922.

КУЛАН Іван Майсеевіч, н. у 1898 у Ганцавіцкім р-не, вартаўнік Слуцкага гарсавета. Асуджаны 19.3.1952 на высылку ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 7.1.1960.

КУЛІКОЎСКІ Пётр Паліектавіч, н. у 1896 у Слуцку, бляхар. Асуджаны і расстраляны ў 1938.

КУР'ЯНОВІЧ Якаў Фядотавіч, н. у 1891, камендант Слуцкай будаўнічай канторы. Асуджаны

Наследие слуцкого края

26.9.1938. Расстраляны 7.10.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 19.7.1958.

ЛАЗАРЭВІЧ Антон Кліменцьевіч, н. у 1882 у Нясвіжы. Асуджаны 14.11.1938 на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у зняволенні 26.2.1942. Рэабілітаваны 29.1.1959.

ЛАПІЦЬКО Міхаіл Канстанцінавіч, н. у 1896, загадчык склада канторы культтавараў. Асуджаны 11.10.1938. Расстраляны 31.11.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 12.3.1954.

ЛЕШЧАНКА Марцін Людвігавіч, н. у 1884 у в. Замосце, вартаўнік панчошнай фабрыкі. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 1.11.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 21.7.1958.

ЛІСОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1872, псаломшчык. Арыштаваны 14.3.1933, зняволены на 3 гады ў ППЛ. Лёс невядомы.

ЛІХАДЗІЕЎСКІ Іосіф Іванавіч, н. у 1909 у в. Гароҳаўка. Асуджаны 12.6.1945 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.4.1960.

ЛОБАН Міхаіл Лявонцьевіч, н. у 1896 у Капыльскім р-не, загадчык базы. Асуджаны 25.9.1938. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 20.9.1961.

ЛУКАШЭВІЧ Міхаіл Лаўрэнцьевіч, н. у 1870 на Навагрудчыне, святар. Асуджаны 17.6.1927 на пазбаўленне права пражывання ў пэўных населеных пунктах СССР тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 21.4.1992.

ЛУК'ЯНЧЫК Мікалай Мікітавіч, н. у 1913 у в. Старцавічы, трактарыст Слуцкага райдараддзела. Асуджаны 15.11.1937. Расстраляны 24.11.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 24.4.1959.

ЛУК'ЯНЧЫК Мікіта Савіч, н. у 1892 у в. Старцавічы, вартаўнік. Асуджаны 5.1.1937. Расстраляны 11.11.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 24.4.1959.

МАГІЛЕНСКІ Янкель Ёселевіч, н. у 1876, касір арцелі. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў пазбаўлення волі. Памёр у зняволенні ў 1938. Рэабілітаваны 29.12.1988.

МАНДЗЕЛЬ Матуль Мойшавіч, н. у 1906, токар. Асуджаны 19.6.1925 на высылку на Урал на 3 гады. Рэабілітаваны 28.5.1992.

МАРДВІЛКА Пётр Канстанцінавіч, н. у 1875, царкоўны служка. Арыштаваны 14.3.1933. Сасланы ў Казахстан на 3 гады. Лёс невядомы.

МАРКЕВІЧ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1896. Асуджаны 10.11.1929 на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 2.3.1992.

МАСКАЛЕНКА Гаўрыла Максімавіч, н. у 1885, начальнік аддзела крымінальнага вышуку. Асуджаны 29.10.1921. Вызвалены, але пазбаўлены права займаць адказныя пасады на працягу 2 гадоў. Рэабілітаваны 7.10.1992.

МАСЛАВА Ніна Мацвеєўна, н. у 1920 у Барысаўскім р-не, повар. Асуджана 4.10.1947 на 6 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 22.10.1955.

МАСЮК Пракоп Сцяпанавіч, н. у 1899 у в. Папоўцы, рабочы. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.1.1959.

МАТАЛЫЦКАЯ Ганна Андрэеўна, н. у 1915. Асуджана 22.7.1935 на высылку за межы рэспублікі. Рэабілітавана 11.7.1962.

МАТАЛЫЦКАЯ Ніна Андрэеўна, н. у 1911, прыбіральшчыца. Асуджана 22.7.1935 на высылку за межы рэспублікі. Рэабілітавана 11.7.1962.

МАЦКЕВІЧ Леанід Канстанцінавіч, н. у 1900 у Чэрвенскім р-не, бухгалтар канторы сувязі ў Слуцку. Асуджаны 21.9.1938. Расстраляны 1.10.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 26.5.1958.

МІЛАДОЎСКІ Канстанцін Антонавіч, н. у 1881 у Польшчы, кіяскёр. Асуджаны 27.9.1938. Расстраляны 7.10.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 7.1.1958.

МІЛЛЕР Ванда Ігнатаўна, н. у 1899, дырэктар гасцініцы. Асуджана 29.3.1938. Расстраляна 29.10.1938. Рэабілітавана 12.10.1960.

МІРАНОВІЧ Сцефаніда Сцяпанаўна, н. у 1902, краўчыха. Асуджана 9.11.1937. Расстраляна 21.11.1937 у Слуцку. Рэабілітавана 22.10.1959.

МІСЮЧЭНКА Павел Васільевіч, н. у 1911 у Капыльскім р-не, экспедытар. Асуджаны 19.8.1933 на 2 гады ППЛ. Рэабілітаваны 24.8.1956.

МІХАЙЛАЎ Павел Лукашавіч, н. у 1893 у Польшчы, дырэктар інкубацыйнай станцыі. Асуджаны 17.11.1935 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.3.1960.

МЫСЛІЦКІ Іосіф Серафімавіч, н. у 1892 у Капыльскім р-не, шавец інваліднай арцелі. Прыгавораны 3.11.1938 да ВМП. Звестак аб выкананні прыгавору няма. Рэабілітаваны 29.4.1959.

МЫШУК Іван Іванавіч, н. у 1882, рабочы чыгункі. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

НІЧЫПЯРОВІЧ Соф'я Сільвестраўна, н. у 1902 у в. Баслаўцы, хатняя гаспадыня. Асуджана 22.9.1938 на 10 гадоў ППЛ. Пасля адбыцця тэрміну пакарання была накіравана на пасяленне ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 10.9.1959.

НОВІК МікалайАнуфрыевіч, н. у 1897 у Чырвонаслабодскім р-не, экспедытар. Асуджаны 17.11.1937. Расстраляны 27.11.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 26.10.1962.

НОВІК Яўхім Лаўрэнцьевіч, н. у 1858 на Старобіншчыне, бондар. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 8.2.1938 ў Мінску. Рэабілітаваны 14.4.1989.

НЯМКОВІЧ Леанід Міхайлавіч, н. у 1910, артыст Слуцкага калгасна-саўгаснага тэатра. Асуджаны 17.12.1937. Расстраляны 21.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 29.4.1959.

НЯЧАЙ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1903, бухгалтар. Асуджаны 17.12.1937. Расстраляны 21.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ОДЗІН Эдуард Андрэевіч, н. у 1896 у Латвіі, ваеннаслужачы. Асуджаны 26.9.1938. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 15.3.1963.

Наследие слуцкого края

ПАЛЬЧЫК Пётр Васільевіч, арыштаваны двойчы: у 1932 і 1937. Расстраляны ў 1937 у Слуцку. Рэабілітаваны.

ПАНАМАРОЎ Мікіта Іванавіч, н. у 1910 у Варашылаўградскай вобл., рабочы 116-й аўтарамонтнай майстэрні г. Слуцк. Асуджаны 8.1.1947 да пазбаўлення волі ў ППЛ тэрмінам на 8 гадоў з пазбаўленнем правоў на 3 гады. Рэабілітаваны 14.6.1961.

ПАНЬКО Канстанцін Канстанцінавіч, н. у 1886 у Пінскім пав., святар. Асуджаны 20.9.1938. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 15.10.1959.

ПАЎЛОВІЧ Іосіф Антонавіч, н. у 1875, пуцявы абходчык. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ПАЎЛЮКЕВІЧ Васіль Фаміч, н. у в. Бліжнія Бандары, урач-педыятр. Рэпрэсіраваны ў 1937. Лёс невядомы.

ПАЎЛЮКЕВІЧ, н. у 1894, калгаснік. Асуджаны 17.5.1933 на 3 гады ППЛ (умоўна). Рэабілітаваны 20.7.1959.

ПАЦЕЙ Дзмітрый Піліцавіч, н. у 1885, брыгадзір на чыгунцы. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ПЕЙГАНОВІЧ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1889 у Пружанскім пав., раздатчык нафтабазы. Асуджаны 5.11.1937. Расстраляны 11.11.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 4.3.1958.

ПІГУЛЕЎСКІ Віктар Аляксеевіч, н. у 1871, ерэй, клірык Свята-Міхайлаўскай царквы. Арыштаваны 14.3.1933 і выселены ў Казахстан на 3 гады. Лёс невядомы.

ПІСКУНОЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1885 у Добрушскім р-не, муляр. Асуджаны 20.11.1940 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 23.9.1992.

ПЛЫШЭЎСКАЯ Тамара Фёдараўна, н. у 1926 у Любанскім р-не, рахункавод друкарні газеты «За сацыялістычную Радзіму». Асуджана 27.6.1946 на 1 год 6 месяцаў зняволення ў ППЛ. Рэабілітавана 14.10.1957.

ПОНТУС Аляксандр Карлавіч, н. у 1892 у в. Мяынка. Асуджаны 17.12.1937. Расстраляны 21.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 29.6.1959.

ПРАКАПОВІЧ Кандрат Трафімавіч, н. у 1867, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 17.4.1938. Рэабілітаваны 26.12.1959.

ПРАХОРЧЫК Пётр Анісімавіч, н. у 1890, дарожны майстар. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ПУЛЯК Антон Канстанцінавіч, н. у Чырвонаслабодскім р-не, галоўны бухгалтар Слуцкай канторы Белгандлю. Асуджаны 27.12.1937. Расстраляны 24.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 12.5.1958.

ПЯТРОЎСКІ Ізраіль Мордухавіч, н. у 1896, загадчык базы. Асуджаны 5.11.1937. Расстраляны 11.11.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 2.7.1957.

РАДЗІЁНАЎ Яўграф Уладзіміравіч, н. у 1905 у Растоўскай вобл., інжынер-будаўнік. Асуджаны 25.12.1945 на 7 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 2.11.1946.



В.Ф.Паўлюкевіч з жонкай і дзецьмі.

РАЖКОЎСКІ Сцяпан Вацлававіч, н. у 1893 у Нясвіжы. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 29.11.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 26.6.1959.

РАЖНІЦКІ Іосіф Аляксандравіч, н. у 1883. Арыштаваны 1.8.1941. Асуджаны 28.9.1941 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 16.6.1992.

РАЧКОЎСКІ Васіль Раманавіч, н. у 1873, псаломшчык Слуцкай Свята-Варварынскай царквы. Арыштаваны 14.3.1933. Высланы за межы БССР на 3 гады. Лёс невядомы.

РЫТВІНСКІ Іван Андрэевіч, н. у 1899 у в. Сцяпноўка Грэскага р-на, галоўны бухгалтар Слуцкай акруговай канторы Белпрамгандлю. Асуджаны 5.11.1937. Расстраляны 11.11.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 29.4.1958.

РЭМІЗАЎ Аляксандр Антонавіч, н. у 1885 у Оршы, служачы паштова-тэлеграфнай канторы. Асуджаны 7.6.1933 і 19.2.1934 на пазбаўленне права пражывання ў пэўных населеных пунктах СССР тэрмінам на 3 гады (умоўна датэрмінова вызвалены). Рэабілітаваны 31.3.1989.

РЭУТ Іван Іосіфавіч, н. у 1887 у Лепелі, інструктар слуцкага УВБР-94. Асуджаны 9.12.1937. Расстраляны 22.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 29.4.1958.

САРОКА Іван Нічыпаравіч, н. у 1916 у в. Малышэвічы, шафёр. Асуджаны 7.8.1937 на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 27.3.1989.

САСНОЎСКІ Серафім Францавіч, н. у 1874, сакратар арцелі інвалідаў. Асуджаны 2.11.1938 на высылку ў Казахстан на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19.10.1959.

СЛАБОДНІК Ісак Майсеевіч, н. у 1891 у м. Петрыкаў. Асуджаны 18.3.1930 на 3 гады высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 12.7.1989 і ў 1992.

СТАШЭНІН Якаў Мікалаевіч, н. у 1898 у с. Дзяніскавічы Слуцкага пав., дзесятнік будканторы. Асуджаны 3.1.1938. Расстраляны 23.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 28.3.1958.

Наследие слуцкого края



М.У.Чыж.

СТАШЭНІНА Марыя Антонаўна, н. у 1904 у Бабруйскім пав., загадчыца дзіцячага садка Слуцкага акруговага аддзела НКУС БССР. Асуджана двойчы: 15.8.1938 на 5 гадоў зняволення ў ППЛ і 1.6.1949 да высылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 3.4.1956.

СУЧОК Цімафей Іванавіч, н. у 1900 у в. Агароднікі, электраманцёр. Асуджаны 27.9.1938. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 24.9.1959.

ТРАЦЦЯК Антон Аляксеевіч, н. у 1875 у в. Заракаўцы Капыльскага р-на. Арыштаваны двойчы: 24.7.1935 і 23.8.1937. Расстраляны ў Слуцку 20.10.1937. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ТРУХАН Лука Трафімавіч, н. у 1884 у в. Замошша, інкасатар акруговага спажыўсаюза. Асуджаны 2.12.1937 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 29.4.1957.

ТУРАВЕЦ Вольга Іванаўна, н. у 1900 у Польшчы, загадчыца дзіцячых ясляў. Асуджана 17.12.1937. Расстраляна 22.1.1938 у Слуцку. Рэабілітавана 6.7.1959.

ТУРКО Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1900 у Польшчы, грузчык леспрамгаса. Асуджаны 14.11.1933 на высылку ў Паўночны край на 3 гады; 14.11.1938 зноў асуджаны на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у зняволенні 18.1.1942. Рэабілітаваны 7.1.1960.

УГОРЫЦ-АЛЕКСАНДРОВІЧ Рахіль Беркаўна, н. у 1898 у Віцебску, прадавец. Асуджана 3.9.1929 на 3 гады пазбаўлення права пражывання ў пэўных населеных пунктах СССР. Рэабілітаваны 14.3.1992.

УМІНСКІ Уладзімір Людвігавіч, н. у 1894, пуцявы абходчык. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 19.12.1956.

ХАЦЕНКА Мікалай Пятровіч, н. у 1912 у в. Сярэднікі, цясляр. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 21.11.1937 у Слуцку. Рэабілітаваны 9.11.1959.

ХАЦЬКО Якаў Іванавіч, н. у 1889 у в. Іванскія Агароднікі, справавод. Асуджаны 30.12.1937. Расстраляны 24.1.1938 у Слуцку. Рэабілітаваны 27.10.1989.

ХВАЛЕБНАЎ Аляксандр Васільевіч, протаіерэй, настаяцель Слуцкай Свята-Васкрасенскай царквы. Арыштаваны 1.7.1927. Высланы ў Марыінскія лагеры. Лёс невядомы.

ХЛЯБЦЭВІЧ Уладзімір Ігнатавіч, н. у 1874, псаломшчык. Арыштаваны 14.3.1933, высланы на 3 гады ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы.

ЦЕРНАВЕЦ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1886 у Харкаўскай губ., святар. Асуджаны 20.11.1929 на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 26.3.1992.

ЦЯРНОВІЧ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1883. У 1923—1929 гг. служыў пры царкве Слуцкага Свята-Троіцкага манастыра. Асуджаны ў 1929 на 3 гады турэмнага зняволення. Пасля вызвалення ў 1935 зноў быў арыштаваны. У 1943 пачаў служыць, быў настаяцелем царквы ў Халопенічах Крупскага р-на. Лёс невядомы.

ЧЫГІР Вера Аляксееўна, н. у 1923 у в. Малышэвічы, працавала санітаркай 451-га кавалерыйскага палка, які дыслацыраваўся ў Слуцку. Асуджана 21.1.1942 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 3 гады пазбаўлення правоў. Рэабілітавана 6.2.1957.

ЧЫЖ Міхаіл Уладзіміравіч, н. у 1895 у в. Вялікая Сліва, удзельнік грамадзянскай вайны, рад. 185-га пяхотнага палка. У 1919 начальнік сувязі 71-га стралковага палка. У 1920 член Слуцкага павятовага ваенрэўкома. Працаваў загадчыкам Цэнтральнага аддзела землеўпарадкавання НКЗ Беларусі, загадчыкам земтрэста ў Ленінградзе, намеснікам дырэктара інстытута Дзіправадтранс. Арыштаваны і расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1957.

ШАМЯЦІЛА Барыс Мікалаевіч, н. у 1900 у сям'і святара, царкоўны служка. Асуджаны 10.11.1929 на 3 гады зняволення ў ППЛ. 28.6.1932 пасля адбыцця тэрміну зняволення высланы ў Заходнюю Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 2.3.1992.

ШАМЯЦІЛА Мікалай Іванавіч, н. у 1877 у в. Обрава Пінскага пав. у сям'і святара, закончыў Мінскую духоўную семінарыю, потым Маскоўскую духоўную акадэмію, быў епіскапам у Слуцку. У 1926 знаходзіўся пад следствам АДПУ «за захоўванне і распаўсюджванне» верша антысавецкага зместу, які напісаў С.Ясенін «Послание «евангелисту» Демьяну». Справа была спынена. Другі раз быў арыштаваны Слуцкім ДПУ 13.3.1933. Праходзіў ён па справе контррэвалюцыйнай царкоўна-паўстанцкай арганізацыі, якая быццам бы існавала ў Магілёўскім, Крычаўскім, Чавускім, Слуцкім і іншых раёнах Беларусі. Абвінавачваўся ў арганізацыі і кіраўніцтве слуцкага філіяла гэтай арганізацыі, а таксама правядзенні актыўнай контррэвалюцыйнай агітацыі. Па справе праходзіла 48 чалавек, у тым ліку магілёўскі епіскап Вапчынскі і віцебскі епіскап Поснікаў. 9.6.1933 Шамяціла быў прыгавораны да 8 гадоў ППЛ. Памёр 19.7.1933.

ШАНТЫР Фабіян Гіляравіч, н. у 1887 у Слуцку, беларускі пісьменнік, публіцыст, грамадскі дзеяч. Арыштаваны 17.4.1920. Расстраляны 25.5.1920. Рэабілітаваны 23.3.1992.

Наследие слуцкого края

ШАХНОВІЧ Іван Уласавіч, н. у 1898, тэлеграфіст. Асуджаны 7.6.1933 на пазбаўленне права пражывання ў пэўных населеных пунктах СССР на 3 гады. Рэабілітаваны 31.3.1989.

ШКЛЯР Арцём Нікіфаравіч, н. у 1897 у в. Саўчанкі Верхнядзвінскага р-на, старшыня Слуцкага райвыканкома. Рэпрэсіраваны 15.2.1938. Рэабілітаваны 8.4.1992.

ШКЛЯРОЎСКАЯ Вольга Якаўлеўна, н. у 1878, хатняя гаспадыня. Асуджана 11.10.1938 на 5 гадоў высылкі ў Казахстан. Рэабілітавана 18.1.1961.

ШЫДЛОЎСКІ Іван Міхайлавіч, н. у 1874 у в. Бокшыцы, земляроб. Прыгавораны 23.2.1930 да ВМП. Звестак аб выкананні прыгавору няма. Рэабілітаваны 18.7.1960.

ШЫРЫН Іван Яўхімавіч, н. у 1898 у в. Працавічы, цясляр. Асуджаны 30.10.1937 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 30.4.1960.

ШЫФМАН Іосіф Аронавіч, н. у 1905 у Слуцку. Асуджаны 10.6.1925 на высылку на Урал на 3 гады. 20.1.1928 пазбаўлены права пражывання ў пэўных населеных пунктах СССР тэрмінам на 3 гады. 18.1.1929 атрымаў дазвол выехаць у Палесціну. Рэабілітаваны 28.5.1992.

Сустрэў мяне знясілены хворы мужчына. У ім я з цяжкасцю пазнаў колішняга маладога, жвавага бацьку. Мы абняліся, расплакаліся. Потым бацька павёў мяне ў тую шахту, дзе ён здабываў золата. Спусціліся ў вузкую сырую нару, па ёй ледзь не на чацвярэньках праніклі ў пячору з мокрымі, запляснелымі сценамі. Калі я ўявіў сабе, як там бацька гнуў па 14 гадзін у дзень спіну, мне стала не па сабе. Па яго ўспамінах, некаторыя пажылыя

Наследие слуцкого края

шахцёры ўзімку і начавалі там на скінутых у кутку лахманах. Ахова не баялася, што яны ўцякуць — гэта ўжо былі ледзь жывыя шкілеты. Бацьку пасля адбыцця тэрміну было каля сямідзесяці гадоў, таму ён не адважыўся вяртацца дамоў. Набыў хаціну, карову, кавалак зямлі і тым жыў. А рэабілітавалі яго ў 1962 г., пасля вяртання ў родную вёску. Прэзідыум Мінскага абласнога суда сваім рашэннем ад 3 лютага таго ж года прызнаў пастанову «тройкі» ў адносінах да І.М.Вечара «пазбаўленай складу злачынства».

— Як адбілася на лёсе вашай сям'і высылка бацькі? — цікаўлюся ў Яўгена Іванавіча.

— Для маці — трагічна. Я ўжо гаварыў, што яе тры гады не прымалі ў калгас. У маі 43-га партызаны забралі ў нас каня. Яўна праглядваўся нейчы данос — маўляў, сям'я «ворага народа», няма чаго цырымоніцца. У той дзень забралі каня і ў нашай суседкі. Яна пайшла ў Чырвонаслабодскі раён, адшукала каня і прывяла назад. Пры сустрэчы расказала маці, што бачыла там і нашага Сіўку. Не раздумваючы, маці адправілася ў няблізкую дарогу. Але дамоў ужо не вярнулася. Пасля вайны я ездзіў у тыя мясціны, гутарыў з людзьмі, і мне сказалі, што партызаны расстралялі маці, западозрыўшы ў шпіянажы.

А вось як склаўся лёс Яўгена Іванавіча. Служыў да вайны ў Чырвонай Арміі. У канцы чэрвеня 41-га пад Слонімам хадзіў у контратакі на нямецкія танкі з бутэлькамі гаручай вадкасці. Вызваляў Польшчу, пад Бяла-Падляскай быў паранены, пад Кёнігсбергам — кантужаны. Пасля вайны настаўнічаў у сельскіх школах. Жыў у Слуцку. Я.І.Вечар памёр у 1995 г.

М.А.Тычына.

«ТЭРАРЫСТЫ» З БАНДАРОЎ

Хата Мікалая Дзямідавіча і Антаніны Пятроўны Васілевічаў прытулілася на ўскрайку в. Дальнія Бандары. Да гаспадароў мы завіталі ў надзеі атрымаць яшчэ адзін штрых да падзей, якія адбыліся ў 1930-я гады на Случчыне. У той час бацьку Антаніны Пятроўны — Пятра Іванавіча Трафімовіча — неабгрунтавана рэпрэсіравалі. Узрост Мікалая Дзямідавіча і Антаніны Пятроўны дазволіў ім шмат чаго запомніць з тых трагічных дзён.

— Жылі мы на адным з хутароў, жыхары якіх пазней і стварылі цяперашнюю в. Дальнія Бандары, — успамінае Антаніна Пятроўна. — У пачатку 1930 г. бацьку як «кулацкага элемента» выслалі, і ніякіх вестак ад яго мы не атрымлівалі. Малады быў, з 1905 г. Не перадаць словамі нашу радасць, калі ў адзін з вечароў 1932 г. бацька нечакана з'явіўся ў хаце. «Тат, татачка вярнуўся!» — кінулася я да яго. А ён абняў мяне, патрымаў на руках і сказаў: «Памёр твой татка, дачушка, чуеш, памёр». Тады я не зразумела яго слоў, усяго чатыры гады мне было, але запомніла іх на ўсё жыццё...

Намнога пазней Антаніна Пятроўна даведалася, што бацьку ўдалося ўцячы з месца высылкі. Ён разумеў, што яго будуць шукаць, але не мог не пабачыцца з сям'ёй. А каб маленькая дачка нікому не прагаварылася, што ён быў дома, і сказаў ёй тыя страшныя словы, якія пазней паўтарала і маці. Колькі часу ён хаваўся, каб ніхто яго не бачыў, а потым з вялікай цяжкасцю дабраўся да Ленінграда. Думаў там уладкавацца, а затым забраць да сябе сям'ю.

А.П.Васілевіч працягвала:

— Нікому не пажадаю таго, што было з намі: з сям'ёй раскулачанага. Неўзабаве нас выселілі з хаты, жылі дзе папала. Маму на працу ў калгас не бралі, давялося ёй хадзіць на чыгунку, на 95-ы кіламетр, грузіць дровы. А што ж было рабіць? У хаце, якую ў нас забралі, ніхто не жыў, у яе ссыпалі зерне. Ужо пасля вайны мы яе выкупілі ў калгасе.

А Пятру Іванавічу затрымацца надоўга ў Ленінградзе не ўдалося, прыйшлося шукаць прытулку ў іншым месцы. Пераехаў у Віцебск, уладкаваўся працаваць на вапнавым заводзе, на вывазцы торфу. Але і тут не давялося пажыць, а неўзабаве згінула апошняя надзея на сустрэчу з сям'ёй.

22 лютага 1937 г. П.І.Трафімовіча арыштавалі, а праз месяц па этапе адправілі ў Ленінград. Прыкладна ў гэты ж час былі арыштаваны таксама ўраджэнцы Бандароў браты Яўхім Кандратавіч і Мікіта Кандратавіч Лагуны.

— Сем'і братоў Лагуноў жылі ў адной хаце. Гаспадарка ў іх была добрая, трымалі некалькі кароў, іншую жыўнасць мелі. Але ж і працавалі людзі, як кажуць, дай Бог, — прыпамінае Мікалай Дзямідавіч. — Здаец-

Наследие слуцкого края

ца, у дваццаць дзевятым іх раскулачылі, жанчын з дзецьмі выслалі ў Котлас, а мужчын у іншае месца. Але да 1937 г. ім неяк удалося ўладкавацца ў Ленінградскай вобласці. Яўхім працаваў цесляром у лясгасе, а Мікіта, калі не падводзіць памяць, — дырэктарам саўгаса. Таксама жылі без сем'яў...

Паўгода іх трымалі пад следствам: допыты, вочныя стаўкі, турэмныя камеры, зноў допыты... Абвінавачванне ўсім тром было прад'яўлена найцяжэйшае. Вось радкі з дакументаў па справе П.І.Трафімовіча: «...З'яўляючыся ўдзельнікам контррэвалюцыйнай арганізацыі, сістэматычна праводзіў контррэвалюцыйную прапаганду, поўнасцю падзяляў тэрарыстычныя ўстаноўкі, ухваляў падрыхтоўку тэрактаў над Сталіным і Ждановым». З матэрыялаў следства вынікала, што адным з самых актыўных удзельнікаў контррэвалюцыйнай «арганізацыі» быў Я.К.Лагун. Яго абвінавацілі ў тым, што прапанаваў «членам арганізацыі асабіста ажыццявіць тэракт», гэта значыць, учыніць забойства Сталіна.

Зразумела, з такім абвінавачваннем на літасць разлічваць нельга было. У адзін і той жа дзень, «тэрарысты» з Бандароў былі прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. А затым у адзін і той жа дзень, 4 верасня 1937 г., іх расстралялі ў Ленінградзе. П.І.Трафімовіч пасмяротна рэабілітаваны ў 1957 г. У тым жа годзе ў судовым парадку пацверджана неабгрунтаванасць абвінавачвання братоў Лагуноў, якія таксама рэабілітаваны пасмяротна.

Такім чынам, ніхто з нашых трох землякоў не быў ні ворагам народа, ні тэрарыстам. Яны загінулі бязвінна, стаўшы ахвярамі беззаконня і тэрору, ахвярамі свайго трагічнага часу, які не павінен паўтарыцца.

А.Жук.

Я ПАМЯТАЮ ЯГО

Гэта быў вельмі добразычлівы чалавек, які ўмеў радавацца жыццю нават тады, калі яно было не такім ужо і светлым. Платон Паўлавіч Гарбачэўскі быў суседам і сябрам нашай сям'і. Жыў бедна, у невялікай хаціне, абсаджанай ліпамі і вязамі яшчэ яго продкамі. Крыху цяслярыў, дапамагаў людзям рамантаваць жыллё, па-майстэрску плёў лапці з ліпавага лыку. Яго гонар — глыбокі калодзеж, зроблены самім гаспадаром з дубовых плашак. Блізкія суседзі, вяскоўцы, што жылі наводдаль, проста прахожыя бралі ваду з калодзежа і дзякавалі дзядзьку Платону за яе сцюдзёнасць і чысціню.

Трывожны быў тады час. «Ворагам народа» мог аказацца кожны, хто не выказаў пахвальбу ў адрас Сталіна, не здаў у тэрмін падатак. Па хлуслівым даносе чалавек прападаў без вестак. Асабліва праследваліся так званыя былыя кулакі, веруючыя і сяляне-аднаасобнікі, якія не ішлі ў калгас па сваіх рэлігійных перакананнях. Сем'яў аднаасобнікаў было ў в. Сорагі каля трыццаці. У ліку іх і наша. Непасільныя падаткі і іншыя розныя абкладанні даводзілі да разарэння. Акрамя грашовага падатку, здачы зерня і бульбы патрэбна было здаваць сала, мяса, малако, яйкі і многія іншыя прадукты. Падаткам абкладваліся нават фруктовыя дрэвы. На ўсе віды гэтых абкладанняў устанаўліваўся пэўны тэрмін выканання. Парушэнне тэрмінаў давала падставу прышыць ярлык «ворага народа».

Некалькі разоў упаўнаважаныя ноччу ўрываліся ў нашу хату. Патрабавалі хуценька паказаць квітанцыі, звяралі, ці няма пратэрміноўкі. Бацька працаваў суткамі, каб своечасова выканаць усе абкладанні. Расказваць, хто быў ноччу і аб чым пытаў, забаранялася. Людзі аб гэтым ведалі, і амаль ніхто ні аб чым не пытаў. Сяляне страшна баяліся ночы, у асобных сем'ях пачаргова дзяжурылі каля акна. «Чорны воран» з патушанымі фарамі павольна, быццам здань, рухаўся па цёмнай вясковай вуліцы. Калі мінаў хату, людзі хрысціліся.

У адну з такіх начэй, здаецца, у 1936 г., «воран» прыпыніўся насупраць хаты Гарбачэўскага. Тры чалавекі ў вайсковай форме ўвайшлі ў двор. Начную цішыню раптам парушыў моцны стук у акно і дзверы. Праз мінуту ў кузаў упіхнулі чалавека. Дзверцы зачыніліся, і машына знікла ў цемры. А раніцою людзі шэптам гаварылі: арыштавалі і павезлі Платона. І задавалі пытанне: за што? Пагаворвалі, што быццам бы ён служыў калісьці ў гусарскім войску.

Суд над арыштаванымі вяршыўся непадалёку ад в. Сорагі ў лясным масіве Смурашчына...

Мы захоўваем у сэрцы памяць аб гэтых бязвінна загінуўшых людзях.

С.Шуба.

Наследие слуцкого края

Савецка-фінляндская вайна 1939—1940 гг.

Ва ўмовах 2-й сусветнай вайны і ўзмацнення пагрозы фашысцкай агрэсіі Савецкі ўрад неадкладна спрабаваў палепшыць адносіны з Фінляндыяй. Аднак Фінляндыя пад уплывам Англіі, Францыі, ЗША і фашысцкай Германіі адхіліла прапанаваны Савецкім Саюзам дагавор аб узаемадапамозе і савецкія прапановы адсунуць на захад граніцу на Карэльскім перашыйку ў абмен на ўдвая большую тэрыторыю ў Паўночнай Карэліі. Фінляндыя ўзмацніла работы па ўмацаванні так званай лініі Манергейма, сканцэнтравала на савецкай граніцы да 15 пяхотных дывізій. Пяхоту падтрымлівалі 29 караблёў і 270 самалётаў. 30.11.1939 г. пачаліся ваенныя дзеянні. Савецкае камандаванне на фронце працягам 1500 км ад Баранцава мора да Фінскага заліва разгарнула 14-ю, 9-ю, 8-ю і 7-ю арміі. Галоўны ўдар наносіўся па Карэльскім перашыйку. 11—13.2.1940 г. савецкія войскі прарвалі абарону па лініі Манергейма. У ноч на 4 сакавіка па лёдзе Фінскага заліва абышлі і абкружылі г. Выбарг і рушылі да Хельсінкі. Гэта вымусіла ўрад Фінляндыі прасіць міру.

12.3.1940 г. у Маскве быў падпісаны савецка-фінляндскі мірны дагавор. Фінляндыя адсунула на Карэльскім перашыйку граніцу на 150 км ад Ленінграда, уступіла СССР шэраг астравоў у Фінскім заліве, частку тэрыторыі на паўастравах Сярэдні і Рабочы ў Баранцавым моры, перадала ў арэнду паўвостраў Ханка. Дагавор забяспечваў абарону Ленінграда і Мурманскай чыгункі, гарантаваў незалежнасць Фінляндыі.

Вайна працягвалася 105 дзён. У ходзе яе Чырвоная армія атрымала вопыт прарыву ўмацаванага раёна ва ўмовах суровай і снежнай зімы. Набыты баявы вопыт садзейнічаў далейшаму развіццю тактыкі і аператыўнага майстэрства савецкіх Узброеных Сіл, паляпшэнню арганізацыйнай структуры войскаў, зброі і ваеннай тэхнікі, удасканальванню кіравання войскамі і іх баявой падрыхтоўкі.

Удалося ўстанавіць прозвішчы нязначнай часткі воінаў-землякоў, якія загінулі ў гэтай вайне.

Ураджэнцы Случчыны, якія загінулі ў час савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг.

ГОРАД СЛУЦК

БАНДУРА Афанасій Аляксандравіч, мал. палітрук, загінуў 23.2.1940.

БАРАДЗІН Іван Пятровіч, рад., прапаў без вестак 27.12.1939.

БАРОДЗІЧ Мікалай Сямёнавіч, прапаў без вестак.

ГЕСІК Бер Эльевіч, н. у 1916, рад., загінуў 20.12.1939.

КАРНЕВІЧ Лаўрэнцій Нічыпаравіч, н. у 1912, загінуў у 1939.

КАРОЛЬ ФёдарАнуфрыевіч, н. у 1907, прапаў без вестак 25.12.1939.

КАРПЯЛЕНЯ Іван Фёдаравіч, загінуў 25.12.1939.

ЛЯВОНЧЫК Адам Паўлавіч, рад., загінуў у верасні 1939.

МЕЛЬНІК Шолам Гершавіч, н. у 1919, лейт., прапаў без вестак.

МЕНДЗЯЛЕВІЧ Герман Лейбавіч, н. у 1912, рад., памёр ад ран 25.3.1940.

МІРОНЧЫК Гаўрыла Сямёнавіч, рад., прапаў без вестак у верасні 1940.

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЕЎЛІЧЫ

БАРОДЗІЧ Мікалай Сямёнавіч, прапаў без вестак.

ВАСІЛЕНКА Аляксандр Гаўрылавіч, загінуў у 1939.

ГУРБО Фрол Данілавіч, н. у 1903, прапаў без вестак у 1940.

ШЫШКО Макар Давыдавіч, н. у 1910, прапаў без вестак у 1939.

АМГОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАЛІТА

БЫЛІНКА Палікарп Мікалаевіч, н. у 1910, загінуў у 1939.


Наследие слуцкого края




В.В.Шуманскі.



Я.П.Палазнік.



Т.Л.Дубіна.



М.І.Галец.

ВЁСКА СЛІЎКА

МІСКЕВІЧ Мікалай Дзмітрыевіч, н. у 1904, загінуў у 1939.

БОКШЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВАСІЛІНКІ

ЛЯВОНЧЫК Адам Паўлавіч, н. у 1909, загінуў у верасні 1939.

ВЁСКА ГАРАДЗІШЧА

ШУМАНСКІ Васіль Васільевіч, н. у 1914, прапаў без вестак у 1939.

ВЁСКА КУХТЫ

ПАЛАЗНІК Якаў Пятровіч, н. у 1911, загінуў у сакавіку 1940.

ВЁСКА МІХЕЙКІ

ВАЙЦАХОВІЧ Мікалай Андрэевіч, н. у 1918, загінуў у 1940.

ШЫЛОВІЧ Іван Сцяпанавіч, н. у 1907, загінуў у 1940.

ВЁСКА ПРОШЧЫЦЫ

БАРТОШЫК Серафім Апанасавіч, н. у 1905, загінуў у 1939.

ВЯСЕЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КРАСНАЕ СЯЛО

КАЛЕДЗІЧ Максім Кірылавіч, н. у 1905, загінуў у 1939.

ВЁСКА МЯЛЕШКІ

СЫЦЬКО Васіль Андрэевіч, н. у 1904, загінуў у 1939.

ВЁСКА ПАПОЎЦЫ

ЗАХАРЭВІЧ Нікадзім Максімавіч, н. у 1914, загінуў у 1939.

ПАЛЯШЧУК Іван Сямёнавіч, н. у 1902, загінуў у 1939.

ГРЭСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГРЭСК

АСТРОЎСКІ Раман Цімафеевіч, н. у 1902, загінуў у 1939.

ВЁСКА МАРОЗЫ

ДУШЭЎСКІ Іосіф Сцяпанавіч, н. у 1919, загінуў у 1941.

ВЁСКА ШВЯДЫ

ВІТКА Анатолій Пятровіч, н. у 1902, загінуў у 1939.

ВЁСКА ШЫШЧЫЦЫ

БЕНЕШ Міхаіл Іванавіч, н. у 1903, загінуў у 1939.

ШСАРЫК Несцер Цімафеевіч, н. у 1903, загінуў у 1939.

ІСЕРНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ІСЕРНА

ДУБІНА Трафім Лявонцьевіч, н. у 1906, загінуў у 1939.

ТАПЛЬ Максім Фёдаравіч, н. у 1914, загінуў у 1939.

КАЗЛОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКАЯ СЛІВА

КУРДЗЮК Фёдар Прохаравіч, н. у 1907, памёр ад ран у 1940.

Наследие слуцкого края

ЧЫЖЫК Аляксандр Яўсеевіч, н. у 1906, загінуў у 1939.

ВЁСКА КАЗЛОВІЧЫ

ВАСІЛЕВІЧ Георгій Данілавіч, н. у 1908, загінуў у 1940.

ГАЛЕЦ Міна Ігнатавіч, н. у 1905, загінуў у 1940.

ЖЫВАГЛОД Дзмітрый Майсеевіч, н. у 1907, загінуў у 1940.

КУЛЕШ Канстанцін Іванавіч, н. у 1914, загінуў у 1940.

СІНЯГУБ Нічыпар Максімавіч, н. у 1908, загінуў у 1940.

ВЁСКА ЛЕСУНЫ

КАЛЯДКА Андрэй Адамавіч, н. у 1905, загінуў у 1939.

КІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АГАРОДНІКІ

ГУР Нічыпар Мікітавіч, загінуў у 1940.

ВЁСКА ІВАНСКІЯ АГАРОДНІКІ

МУРАШКА Дзмітрый Васільевіч, н. у 1912, загінуў у 1940.

ХАЦЬКО Пётр Фаміч, н. у 1911, загінуў у 1940.

ЧЫПУРКА Васіль Антонавіч, н. у 1905, загінуў у 1940.

ЧЫПУРКА Мікалай Дзям'янавіч, н. у 1901.

ВЁСКА ІВАНЬ

НОВІК Цімафей Рыгоравіч, н. у 1905.

ВЁСКА ІГРАЁВА

СУЧОК Фёдар Федасеевіч, н. у 1906.

ВЁСКА КІРАВА

КАРАНЕВІЧ Лаўрэн Нічыпаравіч, н. у 1912, загінуў у 1939.

МІХНЮК Міхаіл Агафонавіч, н. у 1899.

МЯЛЕШКА Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1906.

ВЁСКА КЛЯПЧАНЫ

ГУР Аляксей Ягоравіч, н. у 1919, загінуў у 1940.

ЛЯСУН Іван Лявонцьевіч, н. у 1906, загінуў у 1940.

САРАГАВЕЦ Гаўрыла Васільевіч, н. у 1918, загінуў у 1940.

САРАГАВЕЦ Іван Васільевіч, прапаў без вестак у 1940.

САРАГАВЕЦ Лаўрэнцій Пятровіч, н. у 1905, загінуў у 1940.

ВЁСКА ЛЯСПШЧА

ГРАЧОК Уладзімір Раманавіч, н. у 1913, загінуў у 1939.



Ф.І.Тагановіч.

ВЁСКА МАГЛЫШЫ

ПЕТРАКОЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1906, прапаў без вестак.

ЛЕНІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛЕНІНА

РАЦЬКО Фёдар, н. у 1910, загінуў у 1939.

СКРУНДЗІК Сцяпан Андрэевіч, н. у 1904, памёр ад ран у 1939.

ВЁСКА НЯВЯЗЦЫ

ГУРБО Флор Данілавіч, н. у 1907, загінуў у 1939.

ГУЦЬКО Рыгор Пятровіч, н. у 1906, загінуў у 1939.

САДАЎНІЧЫ Піліп Міхайлавіч, н. у 1904, загінуў у 1939.

ВЁСКА ПАДЛЕССЕ

ЛЕМЕШ Міхаіл Іларыёнавіч, загінуў у 1939.

ВЁСКА УЛЬЯНАЎКА

ВАЙТОВІЧ Іван Нічыпаравіч, н. у 1911, загінуў у 1939.

КАРПЯЛЕНЯ Іван Фёдаравіч, загінуў у 1939.

МАЯЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КЛЕШАВА

СЫЦЬКО Павел Іванавіч, н. у 1908, загінуў у 1939.

ВЁСКА ЛЕТКАЎШЧЫНА

ТАГАНОВІЧ Фёдар Іванавіч, н. у 1901, загінуў у 1939.

ВЁСКА МАЯК

ГАНЧАРЫК Парфен Прохаравіч, н. у 1906, загінуў у 1939.

ХРАМЦЭВІЧ Фёдар Дзянісавіч, н. у 1906, загінуў у 1939.

Наследие слуцкого края



М.М.Караленка.



С.І.Тоўкач.

ВЁСКА МУСІЧЫ

КАРАЛЕНКА Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1900, загінуў у 1939.

ТОЎКАЧ Сяргей Ільіч, н. у 1909, загінуў у 1939.

ХЛЕБКА Мікалай Аляксеевіч, н. у 1895, загінуў у 1939.

ПОКРАШАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АНУФРАВІЧЫ

НЯМКОВІЧ Міхаіл Пятровіч, н. у 1909, загінуў у 1940.

ВЁСКА ВЫНІСЦЫ

КУДЗЕЛКА Андрэй Пятровіч, н. у 1915, памёр у палоне ў 1939.

ВЁСКА ЗАМОСЦЕ

ЛЕШЧАНКА Адам Іпалітавіч, н. у 1904, загінуў у 1939 у палоне.

ЛЕШЧАНКА Вікенцій Адамавіч, н. у 1913, загінуў у 1940.

ТАРАСЕВІЧ Сцяпан Іпалітавіч, н. у 1915, загінуў у 1940.

ВЁСКА ПОКРАШАВА

ШЧАРБІЦКІ Вікенцій Браніслававіч, н. у 1920, загінуў у 1939.

РАЧКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЯЛЕВІЧЫ

КАЛЯДА Ануфрый Фёдаравіч, загінуў у 1940.

КОЎЧУР Мітрык Рыгоравіч, н. у 1909, загінуў у 1939.

ПРАКАПОВІЧ Канстанцін Міхайлавіч, н. у 1903, загінуў у 1939.

ПРАКАПОВІЧ Мікалай Ігнатавіч, н. у 1909, загінуў у 1939.

ПРАКАПОВІЧ Сава Сцяпанавіч, н. у 1907, загінуў у 1939.

СУХАН Самсон Максімавіч, н. у 1901, загінуў у 1939.

ВЁСКА ЛЯДНА

БАРЫСЕВІЧ Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1911, загінуў у 1939.

БОРДАК Мікалай Міхайлавіч, загінуў у 1939.

КАЛАЦКІ Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1914, загінуў у 1939.

КАРОЛЬ Рыгор Лук'янавіч, н. у 1913, загінуў у 1939.

КАРОЛЬ Фёдар Ануфрыевіч, н. у 1907, загінуў у 1939.

МАКАЕД Міхаіл Ціханавіч, загінуў у 1939.

САЛАНОВІЧ Уладзімір Сяргеевіч, н. у 1910, загінуў у 1939.

ВЁСКА МАЛЫШЭВІЧЫ

КАЛАЦКІ Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1904.

КУХЦІК Захар Цімафеевіч, н. у 1904.

ШМАК Міхаіл Іванавіч, н. у 1915.

ЯКУБОВІЧ Аляксандр Цімафеевіч, н. у 1903.

ВЁСКА НОВЫЯ РАЧКАВІЧЫ

ВАСІЛЕНКА Аляксандр Гаўрылавіч.

ДЗЯМЧУК Мікалай Паўлавіч, н. у 1910.

САНЮКЕВІЧ Іван Міхайлавіч.

ШЫРЫН Аляксандр Іванавіч, н. у 1910.

ВЁСКА РАЧКАВІЧЫ

ЗІНЬКЕВІЧ Мікалай Данілавіч, н. у 1908.

НАВІЦКІ Павел Міхайлавіч, н. у 1908.

ВЁСКА ПЯТНІЦЫ

ПЯТРОЎ Васіль Іванавіч, н. у 1915, загінуў у 1939.

ВЁСКА ТАНЕЖЫЦЫ

ВАЛАДКОВІЧ Якаў Паўлавіч, н. у 1902.

ВЕЧАР Аляксандр Апанасавіч, н. у 1908.

ВЕЧАР Іван Апанасавіч, н. у 1905.

СТАТКЕВІЧ Іван Сцяпанавіч, н. у 1908, загінуў у 1940.

СТАТКЕВІЧ Павел Сцяпанавіч, н. у 1918.

СТАТКЕВІЧ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1904.

СЯЧКО Аляксандр Васільевіч, н. у 1904.

ВЁСКА ЧАПЛІЧЫ

ВЯРШЭНЯ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1896, загінуў у 1940.

Наследие слуцкого края

ВЯРШЭНЯ Уладзімір Іванавіч, н. у 1909, загінуў у 1940.

ПАЛХОЎСКІ Антон Іванавіч, н. у 1901, загінуў у 1940.

УСОВІЧ Уладзімір Піліпавіч, н. у 1926, загінуў у 1940.

ФЯДЗЮШКА Цімафей Сямёнавіч, н. у 1903, загінуў у 1940.

ПАСЁЛАК ЧАПЛІЧЫ

ПЯТРОЎСКІ Уладзімір Антонавіч, н. у 1914, загінуў у 1940.

СОРАГСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КРУГЛАЕ

БАНДУРА Афанасій Аляксеевіч, н. у 1914, загінуў у 1940.

ВЁСКА СОРАГІ

КАПЦЭВІЧ Аляксандр Васільевіч, н. у 1909, загінуў у 1940.

МАСАКОЎСКІ Іван Сямёнавіч, н. у 1914, загінуў у 1939.

ПАРХІМОВІЧ Пётр Якаўлевіч, н. у 1910, загінуў у 1939.

ТАРАСЕВІЧ Фёдар Васільевіч, н. у 1906, загінуў у 1940.

ЦІШКЕВІЧ Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1908, загінуў у 1939.

СЯРАЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БРАНАВІЧЫ

КРЫВАДУБСКІ Іван Парфір'евіч, н. у 1915, загінуў у 1940.

КРЫВАДУБСКІ Сцяпан Карнеевіч, н. у 1906, загінуў у 1940.

МАКАРЭВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1901, загінуў у 1940.

МАКАРЭВІЧ Міхаіл Хірсанавіч, н. у 1909, загінуў у 1940.

ВЁСКА ВАРКАВІЧЫ

БАБІНСКІ Міхаіл Кірылавіч, н. у 1912, загінуў у 1939.

ВАЛЕТКА Аляксей Цярэнцьевіч, н. у 1910, загінуў у 1939.

КАСЦЮКЕВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1910, загінуў у 1939.

САВАНОВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1920, прапаў без вестак у 1940.

ВЁСКА ЛУЧНІКІ

ДАНІЛОВІЧ Іван Піліпавіч, н. у 1906, загінуў у 1940.



І.В.Макарэвіч.



М.К.Бабінскі.



І.В.Касцюкевіч.



М.А.Крот.



А.Ф.Шпакоўскі.



М.Я.Астапчык.



Г.Я.Чуйко.

Наследие слуцкого края

КРОТ Міхаіл Аляксеевіч, н. у 1913, загінуў у 1940.

ЛІСТАПАД Іван Савіч, н. у 1910, загінуў у 1939.

ШПАКОЎСКІ Андрэй Фёдаравіч, н. у 1905, загінуў у 1940.

ВЁСКА ПАДЛІПЦЫ

АСТАПЧЫК Мікалай Якаўлевіч, н. у 1906, прапаў без вестак у 1940.

КОЎШ Павел Міхайлавіч, н. у 1914, загінуў у 1940.

ВЁСКА СЯРАГІ

ГРЫЦКЕВІЧ Васіль Карнеевіч, н. у 1920, прапаў без вестак у 1940.

ПРАКАПОВІЧ Іван Андрэевіч, н. у 1913, загінуў у 1940.

ЧУЙКО Гаўрыла Яўхімавіч, н. у 1907, загінуў у 1940.

Наследие слуцкого края

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Вайна, пачатая 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкай Германіяй супраць Савецкага Саюза, стала суровым выпрабаваннем для нашага народа, у тым ліку і для жыхароў Случчыны.

Палітычнае і ваеннае кіраўніцтва Германіі, кіруючыся авантурыстычнай дактрынай «маланкавай вайны», разлічвала магутнымі рассякаючымі ўдарамі буйных танкавых і матарызаваных сіл акружыць і знішчыць галоўныя сілы Чырвонай арміі, выйсці на лінію Архангельск—Волга і за 1,5—2 месяцы пераможна закончыць вайну.

На тэрыторыі Беларусі наступала буйнейшая нямецкая група армій «Цэнтр» у складзе 4-й і 9-й палявых армій, 2-й і 3-й танкавых груп; усяго 50 дывізій, у тым ліку 15 танкавых і матарызаваных, 2 матарызаваныя брыгады. Яе падтрымліваў 2-і паветраны флот — 1,6 тыс. баявых самалётаў.

Случане даведаліся пра пачатак вайны ў 12 гадзін 22 чэрвеня 1941 г. з выступлення па радыё намесніка старшыні СНК, наркома замежных спраў СССР В.М.Молатава.

Згодна з пастановай ЦК КП(б)Б ад 22 чэрвеня 1941 г. «Аб задачах і мерапрыемствах у сувязі з выступленнем па радыё намесніка старшыні СНК СССР В.М.Молатава» ў горадзе і раёне былі прыняты тэрміновыя захады па пераводзе жыцця на ваенны лад. На ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах, у сельсаветах, калгасах, МТС былі праведзены мітынгі і сходы, на якіх працоўныя выказвалі гнеў і абурэнне ў сувязі з вераломным парушэннем Германіяй пакта аб ненападзенні, упэўненасць у хуткім разгроме агрэсара.

Пачынаючы з 23 чэрвеня ў горадзе і раёне пачалася мабілізацыя ваеннаабавязаных. Але завяршыць яе, як і іншыя мерапрыемствы па перабудове народнай гаспадаркі на ваенны лад, з-за хуткага прасоўвання варожых войскаў поўнасцю не ўдалося.

Пачатак ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі для войскаў Заходняй Асобай ваеннай акругі (з 22 чэрвеня 1941 г. Заходняга фронту) разгортваўся трагічна. Ведучы абарончыя баі, яны пад націскам колькасна перавышаючых сіл праціўніка (на асноўных напрамках гітлераўцы стварылі трайную, а ў некаторых месцах пяцікратную перавагу) вымушаны былі адступаць. Абарона насіла ачаговы характар. Часці прыкрыцця ўступалі ў бой разрознена і неарганізавана. Паблізу напрамкаў галоўных удараў ворага не было моцных рэзерваў. Адсутнасць суцэльнага фронту давала магчымасць танкавым і матарызаваным злучэнням гітлераўцаў абыходзіць вузлы супраціўлення

Наследие слуцкого края



Помнік каля в. Кучына на брацкай магіле воінаў 14-га механізаванага корпуса, якія загінулі ў чэрвені 1941 г.

нашых войскаў і наносіць ім удары ў фланг і з тылу. У выніку гэтага часці і злучэнні Чырвонай арміі ў шэрагу выпадкаў вымушаны былі змагацца ў акружэнні ці адыходзіць на ўсход.

Слуцка-Бабруйскі напрамак прыкрывала 4-я армія Заходняга фронту, якой камандаваў генерал-маёр А.А.Карабкоў. Але яна ўжо ў прыгранічных баях панесла цяжкія страты і яе чатыры абяскроўленыя дывізіі з баямі адыходзілі да Слуцка.

Гітлераўскае камандаванне, улічваючы важнае стратэгічнае значэнне Слуцка-Бабруйскага напрамку, сканцэнтравала тут 6 матарызаваных і 4 танкавыя дывізіі 2-й танкавай групы генерала Г.Гудэрыяна, якія імкліва рваліся да Слуцка. Горад абаранялі абяссіленыя злучэнні 4-й арміі: 6-я і 42-я стралковыя дывізіі, з паўночнага захаду часці 55-й стралковай дывізіі. Але ўтрымаць Слуцк і раён ад наступаючых варожых танкаў без моцнай супрацьтанкавай абароны пры адсутнасці супрацьтанкавых сродкаў і ўзбраення было немагчыма. Толькі на бліжніх подступах да Слуцка 26 чэрвеня 1941 г. праціўніка змог спыніць мотастралковы полк 30-й танкавай дывізіі палкоўніка С.І.Багданава.

Да 2 гадзін 26 чэрвеня камандны пункт 4-й арміі быў разгорнуты ў Гулевічах. Камендант Слуцкага ўмацаванага раёна палкоўнік Дзянісаў дакладваў, што ў яго распараджэнне перададзены дзве роты і батарэя, якія ахоўвалі ваенныя гарадкі і склады 55-й дывізіі. У горадзе, па яго словах, ходзяць чуткі, што хутка ў горад уступяць немцы. Мясцовыя ўлады часткова эвакуіраваліся, а часткова знішчаюць дзяржаўную маёмасць. Многія жыхары горада, а таксама сем'і камандната саставу Слуцкага гарнізона адыходзяць лясамі да Мазыра. З учарашняга вечара паўсюдна пачаліся пажары.

Былы начальнік штаба 4-й арміі генерал-палкоўнік Л.М.Сандалаў успамінае: «Когда колонна штаба армии следовала через Слуцк, город был охвачен пожарами. Тысячи людей вместе с табунами лошадей и гуртами скота спешили к переправе через реку Случь. С чердаков домов вели стрельбу пробравшиеся в город диверсанты... Оборона на реке Случь была очень ненадежна.

Чтобы усилить ее, сделать противотанковой, Коробков приказал полковнику Тутаринову[1] выставить на западной окраине Слуцка, у шоссейного и железнодорожного мостов, два отряда механизированного корпуса. Остатки 30-й танковой дивизии во главе с полковником Богдановым отводились во второй эшелон за Слуцк и должны были седлать Варшавское шоссе в восьми километрах восточнее города. Туда же Ту-

[1]Палкоўнік І.В.Тутарынаў — начальнік штаба 14-га механізаванага корпуса.

Наследие слуцкого края



Будынкі ў Слуцку, разбураныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў чэрвені 1941 г.

таринов направил батальон пехоты, сформированный из военнослужащих, отбившихся от своих частей...

В течение дня фашистские танковые дивизии при поддержке авиации несколько раз атаковали нас в районе Слуцка, но захватить город и прорваться через реку Случь не смогли. К 18 часам большие потери в танках принудили противника прекратить атаки. Это было достигнуто прежде всего благодаря героизму и самоотверженности отрядов механизированного корпуса, возглавляемых лично Иваном Васильевичем Тутариновым. Немаловажную роль сыграли и заграждения, сооруженные под руководством полковника Прошлякова[1].

В ночь на 27 июня 24-й моторизованный корпус группы Гудериана захватил северную часть Слуцка и военные городки...

С утра 27 июня противник сбил наши войска севернее и южнее Слуцка, потеснил их восточнее реки Случь и полностью овладел городом»[2].

Такім чынам, абарона пад Слуцкам, нягледзячы на прыцягненне 161-га запаснога палка і спробы выкарыстаць там рэшткі старога ўмацаванага раёна, аказалася неэфектыўнай. Пасля захопу Слуцка 3-я нямецкая танкавая дывізія генерала Модэля рушыла на Бабруйск. Услед за ёй па Варшаўскай шашы праз Слуцк з разрывам у суткі прайшлі яшчэ тры дывізіі 24-га танкавага корпуса 2-й танкавай групы Гудэрыяна. На Случчыне ўстанавіліся змрочныя часы фашысцкай акупацыі.

У горадзе і на акупіраванай тэрыторыі раёна, як і на ўсёй захопленай тэрыторыі рэспублікі, гітлераўцы ўстанавілі жорсткі акупацыйны рэжым. Асноўны яго сэнс зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны, а астатніх ператварыць у паслухмяных рабоў.

Яшчэ задоўга да агрэсіі верхаводы Трэцяга рэйха адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам план падзелу захопленай тэрыторыі. Восенню 1941 г. падзел часова акупіраванай Беларусі быў у асноўным завершаны. Яе этнаграфічна цэласную тэрыторыю за-

[1]А.І.Прашлякоў — армейскі інжынер.
[2]Сандалов Л.М. Пережитое. М., 1966. С. 146–151.

Наследие слуцкого края

хопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым гістарычна склаўшуюся супольнасць тэрыторыі, мовы, культуры беларускага народа. Тэрыторыю рэспублікі па лініі Полацк — Барысаў на ўсходзе, Старыя Дарогі — возера Чырвонае на поўдні, па р. Зальвянка і ўсходнім узлессі Белавежскай пушчы на захадзе вылучылі ў генеральную акругу «Беларутэнія», у склад якой была ўключана і Случчына. Плошча генеральнай акругі склала толькі чвэрць тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3 138 256 чалавек (па стане на 4 снежня 1941 г.). Паўднёвыя раёны Гомельскай, Палескай, Пінскай, частка Брэсцкай абласцей былі ўключаны ў рэйхскамісарыят «Украіна». Беластоцкая вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі да акругі «Беласток», якая далучалася да Усходняй Прусіі. Частку Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучылі да генеральнай акругі «Літва». Віцебскую, Магілёўскую, большую частку Гомельскай і ўсходнія раёны Мінскай абласцей аднеслі да зоны армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

Для ўзмацнення акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Случчыне, былі створаны айнзатцкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, жандармерыя, фельдкамендатуры, ортскамендатуры і іншыя карныя органы.

Для больш эфектыўнага ажыццяўлення сваёй злачыннай палітыкі акупанты спрабавалі заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва. Для надання бачнасці мясцовага самакіравання яны стварылі марыянетачную «мясцовую» ўладу — раённыя, валасныя ўправы, у кожнай вёсцы прызначылі старастаў.

Да верасня 1942 г. у Слуцку быў створаны павет, у склад якога ўваходзілі г. Слуцк і Слуцкі раён у складзе 20 валасцей.

У верасні 1942 г. гітлераўцы стварылі слуцкую акругу — гебітскамісарыят, у якую ўваходзілі Слуцкі, Грэскі, Старадарожскі, Любанскі, Старобінскі, Вызненскі і Капыльскі паветы. Кіраўніцтва акругай ажыццяўлялі гебітскамісар Карл і яго намеснік Клюге.

Гебітскамісарыят складаўся з аддзелаў: прапаганды, працы, фінансаў, прамысловасці, аўтатранспартнага, забеспячэння нямецкага насельніцтва, цэнтральнага гандлёвага таварыства.

Галоўнай задачай аддзела прапаганды з'яўлялася абалваньванне людзей. У яго распараджэнні знаходзіліся група прапагандыстаў, радыёвузел, рэдакцыя «Газэты Случчыны», кіно, так званая тэатральная трупа.

Аддзел працы вёў улік працаздольных жыхароў, займаўся камплектаваннем рабочай сілы для прадпрыемстваў і ўстаноў, вярбоўкай людзей у паліцыю. У яго падпарадкаванні знаходзілася рамесная сталярная школа, у якую прымусова было набрана 60 падлеткаў, і г. д. Але асноўным абавязкам гэтага аддзела з'яўлялася адпраўка працаздольных жыхароў на катаржныя работы ў Германію. Праз гэты аддзел працы было вывезена ў Нямеччыну 4500 чалавек.

Фінансавы аддзел займаўся выключна выкалачваннем з жыхароў шматлікіх падаткаў. Цэнтральнае гандлёвае таварыства знаходзілася пад непасрэдным кіраўніцтвам гебітскамісара Карла, а ўзначальваў яго былы начальнік Слуцкай будаўнічай канторы. Асноўнай задачай гэтай арганізацыі з'яўлялася не развіццё гандлю і забеспячэнне насельніцтва неабходнымі таварамі, а рабаванне жыхароў для забеспячэння нямецкай арміі харчаваннем і вываз народнага дабра ў Германію.

Слуцкую гарадскую ўправу ўзначальваў былы выкладчык нямецкай мовы педвучылішча немец па нацыянальнасці Бахман, яго намеснікам быў былы начальнік рамонтнай канторы

Наследие слуцкого края

Слуцкага жылкіраўніцтва Ліхадзіеўскі. У горадзе пры дапамозе гарадской управы акупантам удалося ўвесці ў эксплуатацыю электрастанцыю, пякарню, пладовавінаробчы завод, лесапільны завод, сельскагаспадарчую майстэрню, мэблевы камбінат, які быў ператвораны ў сталярную майстэрню, маслазавод, млын № 6, гарбарны завод, бойню, каўбасную фабрыку і шэраг іншых дробных прадпрыемстваў. Уся прадукцыя, якая выраблялася гэтымі прадпрыемствамі, паступала толькі для забеспячэння нямецкай арміі. Варта заўважыць, што ўсе гэтыя прадпрыемствы працавалі не на поўную магутнасць, з вялікімі перабоямі. Напрыклад, Слуцкі масласырзавод да вайны перарабляў за суткі 37 т малака, а ў 1943 г. — не больш 5—6 т за суткі.

Для падтрымання свайго «парадку» і барацьбы з партызанамі і падпольшчыкамі гітлераўцы стварылі з мясцовых жыхароў, якія перайшлі да іх на службу, так званую дапаможную паліцыю парадку. Акрамя Слуцка, гарнізоны такой паліцыі былі створаны ва ўсіх буйных вёсках раёна. Вясейскі паліцэйскі ўчастак налічваў 60 чалавек, Раманоўскі — 75, Іванскаагародніцкі — 20, Маласліўскі — 19, Навадворскі — 12 чалавек.

Акрамя паліцэйскіх участкаў, былі створаны так званыя раённыя пасты: Заградскі нямецкі пост з 20 чалавек, які размяшчаўся ў в. Заграддзе, пост на чыгуначным мосце ў раёне в. Навадворцы.

У самім горадзе Слуцку і ў былых ваенных гарадках размяшчалася да 2000 салдат і афіцэраў.

Ва ўсіх населеных пунктах былі абнародаваны загады акупантаў з пагрозай расстрэлу за парушэнне каменданцкага часу, за ратаванне чырвонаармейцаў, дапамогу партызанам.

Гітлераўцы рабавалі прадпрыемствы горада і раёна, калгасы, сялянскія гаспадаркі. Замест разрабаваных калгасаў стварылі так званыя абшчынныя гаспадаркі. Строга сачылі за падзелам зямлі, надзяляючы ёю перш за ўсё тых, хто лаяльна ставіўся да акупацыйных улад, падтрымліваў іх. Сяляне абкладаліся вялікімі падаткамі збожжа, бульбы, мяса, малака, фуражу. У сярэднім кожны селянін са сваёй гаспадаркі павінен быў здаць 12—20 пудоў мяса, з гектара зямлі па 5—6 пудоў збожжа, ад кожнай каровы па 400 л малака, а калі меў дзве каровы, то ад другой па 600 л, з кожнай курыцы па 30 яек. Кожны жыхар горада і раёна абкладаўся падушным падаткам па 120—150 руб. Зямельная рэнта гарадскога жыхара складала да 400 руб., сельскага — 300 руб.

Харчовае забеспячэнне насельніцтва праводзілася па картках. Рабочы прадпрыемства атрымоўваў па 300 г



На адной з вуліц Слуцка. 1943 г.

Наследие слуцкого края

хлеба на дзень, а на членаў сям'і па 240 г. Мяса належала па 20 г на суткі, але яно амаль ніколі не выдавалася.

Жыццё працоўных Слуцка стала жабрацкім, сярод жыхароў лютавалі голад, нястача. У горадзе знаходзілася 8000 бежанцаў, якія ўвогуле нічым не забяспечваліся для свайго існавання.

Заробак высокакваліфікаванага рабочага складаў не болей 300 руб., за якія нічога нельга было купіць.

За гады свайго знаходжання ў Слуцку і раёне нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі амаль усё, што было створана мясцовымі жыхарамі за гады савецкай улады.

З першых дзён акупацыі ў горадзе гітлераўцы стварылі два гета, куды сагналі жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці. Адно з іх было створана ў кастрычніку 1941 г. на паўднёвай ускраіне горада ў канцы вуліцы Валадарскага і называлася «Нерабочае». У яго былі сагнаны непрацаздольныя яўрэі — інваліды і жанчыны з малымі дзецьмі. Першы расстрэл яўрэяў гета адбыўся ў кастрычніку 1941 г.

28 кастрычніка ў Слуцк прыбыў нямецкі карны атрад, у склад якога ўваходзілі літоўскія нацыяналісты. Яны прыступілі да масавых расстрэлаў яўрэйскага насельніцтва. Расстрэльвалі на вуліцах, у дварах, агародах, дамах. Карнікі хапалі старых, дзяцей, жанчын, запіхвалі ў грузавыя аўтамашыны, адвозілі за 2 км на поўдзень ад в. Селішча ва ўрочышча Гараваха. Усяго ў гэты дзень было расстраляна больш як 8 тыс. мірных жахароў яўрэйскай нацыянальнасці. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск. Астатнія вязьні гэтага гета былі расстраляны вясной 1942 г.

Частку спецыялістаў з «Нерабочага» гета і членаў іх сямей фашысты перавялі ў другое гета, якое мясцовыя жыхары называлі «Школішча». Яго тэрыторыя складалася з 400 дамоў па вуліцах Парыжскай Камуны, Школьнай, Бабруйскай, Першай Працоўнай, паўночнай частцы вуліцы Манахава. Гета было агароджана калючым дротам, ахоўвалася паліцыяй. У кожным доме жыло па некалькі сямей, усяго больш за тры тысячы чалавек.

Яўрэі павінны былі насіць адзенне з нашытай жоўтай шасціканцовай зоркай. Ім забаранялася самавольна пакідаць гета, мяняць месцажыхарства і кватэры, не дазвалялася карыстацца тратуарамі, наведваць культурныя ўстановы, школы. Жылі яўрэі ў цяжкіх умовах, на галодным пайку. Акупанты рабавалі жыхароў гета, адбіралі золата, срэбра і іншыя каштоўнасці. Выкарыстоўвалі яўрэяў на самых цяжкіх фізічных работах, рабочы дзень для іх працягваўся па 12—14 гадзін, многія з іх паміралі з-за нечалавечых умоў жыцця і працы, з-за адсутнасці медыцынскай дапамогі.

8 лютага 1943 г. усіх жыхароў гэтага гета фашысцкія каты расстралялі ў паўкіламетры ад мукамольнага камбіната. У 1958 г. на магіле вязняў пастаўлены абеліск.

Шматлікія канцлагеры, паліцэйска-жандарскія ўчасткі, фашысцкія засценкі, віселіцы — вось што прынеслі з сабой нямецка-фашысцкія захопнікі. Толькі з ліпеня 1941 г. да верасня 1942 г. у Слуцкім канцлагеры загінула ад голаду і розных захворванняў больш як 10 тыс. ваеннапалонных[1]. За тры гады акупацыі гітлераўцы расстралялі, закатавалі, павесілі і спалілі 26 307 савецкіх грамадзян, у тым ліку 11 150 жыхароў горада і раёна[2].

Але крывавы тэрор, разгул насілля, рабаўніцтва не зламалі волю працоўных горада і раёна да барацьбы, не пазбавілі іх веры ў хуткую перамогу.

У складаных умовах нараджаўся, рос і пашыраўся антыфашысцкі рух на Случчыне. У справе арганізацыі барацьбы ў тыле ворага з першых дзён

[1]Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 669. Л. 72.
[2]Тамсама. Ф. 4902. Воп. 1. Спр.1. Л. 7.

Наследие слуцкого края

акупацыі вялікую ролю адыгралі падпольшчыкі-адзіночкі і падпольныя групы, якія накіроўваліся ЦК КП(б)Б. Яны на першых парах узначальвалі зараджэнне партызанскага руху на тэрыторыі рэспублікі, у тым ліку і на Случчыне. На тэрыторыі Слуцкага раёна са жніўня 1941 г. па ліпень 1942 г. дзейнічала такая група на чале з намеснікам дырэктара па палітчасці Слуцкай МТС Новікавым, якая была накіравана ЦК КП(б)Б з Гомеля. У яе склад уваходзілі намеснік дырэктара па палітчастцы Баўманскай МТС Трушко Фёдар, старшыня калгаса імя Красіна Турленя Майсей, загадчык Ісернскага ДСК Чайкун, старшыня калгаса імя Кірава Жываглод і старшыня калгаса імя Сталіна Жаўрыд. Гэта група пад кіраўніцтвам Ф.Трушко праводзіла вялікую работу сярод жыхароў Велікасліўскага, Казловіцкага і Ісернскага сельсаветаў. У ліпені 1942 г. члены групы, а таксама рахункавод калгаса «Чырвоны Сцяг» Радзюк па данасе здрадніка былі схоплены фашыстамі і пасля катавання расстраляны.

У горадзе і вёсках раёна дзейнічалі шматлікія падпольныя групы і адзіночкі-падпольшчыкі, якія праводзілі значную работу сярод жыхароў.

У 1943 г. гітлераўцы арыштавалі кіраўніка адной з падпольных груп Кузьму Пупкевіча, яго сына і жонку. Пасля катаванняў К.Пупкевіча з сынам павялі на расстрэл. Калі фашыст загадаў яму капаць магілу і даў у рукі рыдлёўку, мужны патрыёт рыдлёўкай забіў немца і разам з сынам уцёк у партызанскі атрад. Яго жонку Юлю фашысты закатавалі[1].

У канцы 1941 г. і ў пачатку 1942 г. у Слуцку і яго наваколлі ўзнікаюць тры падпольныя партыйна-камсамольскія арганізацыі. Ініцыятарамі іх стварэння і кіраўнікамі з'яўляліся А.Дз.Фамін, М.І.Багуноў, А.Ф.Баркоўскі, П.Я.Маглышаў, М.І.Відзякін, Дз.В.Каўшоў. Падпольшчыкі падтрымлівалі сувязь з партызанскімі атрадамі Камарова (В.З.Каржа) Пінскага партызанскага злучэння і імя Фрунзе партызанскай брыгады імя Варашылава Мінскай вобласці. Яны мелі 2 радыёпрыёмнікі, прымалі і распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, збіралі і перадавалі партызанам звесткі пра колькасць і дыслакацыю гітлераўскіх часцей, гарнізонаў, мерапрыемствы акупантаў. Падпольшчыкі забяспечвалі партызан дакументамі, вынеслі з нямецкай гарадской друкарні і перадалі партызанам друкарскі шрыфт, фарбу, паперу, пішучую машынку.

Група Фаміна і Багунова абмундзіравала, узброіла і ў лістападзе 1942 г. пераправіла да партызан больш за 20 ваеннапалонных, перадала народным мсціўцам 22 вінтоўкі, 2 пісталеты, 12 гранат і амаль тысячу патронаў. Група П.Я.Маглышава ў снежні 1942 г. і ў пачатку 1943 г. адправіла да партызан 127 ваеннапалонных, зброю, аўтамашыны. Падпольшчыкі летам 1942 г. пад кіраўніцтвам А.Ф.Баркоўскага спалілі аўтарамонтныя майстэрні разам з абсталяваннем і аўтамашынамі, якія былі на рамонце. У ноч на 5 снежня 1942 г. Дз.В.Каўшоў, М.С.Кокін і К.У.Мешчаракоў узарвалі сілавы трансфарматар гарадской электрастанцыі і вузел сувязі. Вясной 1943 г. Г.Дз.Сотнікаў падпаліў склад гатовай прадукцыі Слуцкай мэблевай фабрыкі.

Пры падрыхтоўцы чарговай аперацыі падпольшчыкі былі схоплены фашыстамі і пасля катаванняў расстраляны. Сярод іх М.І.Багуноў, А.Ф.Баркоўскі, М.К.Барысік, браты П.Я., Н.Я.Маглышы і іх бацька Я.Дз.Маглыш, К.У.Мешчаракоў, Н.Р.Радзюк, М.Н.Сакаловіч, К.П.Станкевіч, урач-хірург П.А.Трухан і іншыя, усяго 15 чалавек[2].

[1]Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 669. Л. 87.
[2]Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 : Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 566.

Наследие слуцкого края

Ужо першыя партызанскія групы і атрады нанеслі адчувальныя ўдары па акупантах. У ліпені 1941 г. партызаны атрада пад камандаваннем М.І.Жукоўскага ўварваліся ў г. Слуцк, разграмілі камендатуру, вывелі са строю пошту і тэлеграф, вызвалілі вялікую групу савецкіх ваеннапалонных, раздалі насельніцтву зерне, муку з млына і прадукты харчавання з прадуктовых складоў[1].

З вясны 1942 г. партызанскі рух на Случчыне хутка пашыраўся. Пад уплывам перамогі Чырвонай арміі пад Масквой і актыўных баявых дзеянняў першых партызанскіх груп і атрадаў павялічваўся прыток патрыётаў у рады народных мсціўцаў. У партызаны ішлі мясцовыя жыхары, чырвонаармейцы, якія трапілі ў акружэнне і ў сілу розных прычын засталіся на акупіраванай тэрыторыі ці збеглі з фашысцкага палону. Да канца 1943 г. на тэрыторыі Слуцкага і суседніх раёнаў былі створаны і актыўна дзейнічалі 20 партызанскіх атрадаў, якія былі аб'яднаны ў 4 партызанскія брыгады.

У жніўні 1942 г. Мінскі падпольны абком КП(б)Б накіраваў групу партыйных работнікаў на чале з сакратаром абкома партыі І.Дз.Варвашэнем у Грэскі раён з задачай распаўсюдзіць свой уплыў на Капыльскі, Слуцкі і Уздзенскі раёны. У групу ўваходзілі А.І.Сцяпанава, І.К.Жыжык, У.І.Заяц. Група пачала дзейнічаць як міжраённы камітэт КП(б)Б Слуцкай зоны (сакратар І.Дз.Варвашэня). У маі 1943 г. І.Дз.Варвашэня выбыў за лінію фронту і абавязкі сакратара міжрайкома выконвала А.І.Сцяпанава. Міжрайкомам была праробленa вялікая работа па арганізацыі падпольных райкомаў партыі: Грэскага, Слуцкага, Дзяржынскага, Капыльскага, Краснаслабодскага, Уздзенскага, а таксама Клецкага і Нясвіжскага райкомаў. Выканаўшы задачу, Слуцкі міжрайком КП(б)Б у ліпені 1943 г. спыніў сваю дзейнасць.

У снежні 1942 г. міжрайком КП(б)Б на базе брыгады імя К.Я.Варашылава стварыў партызанскае злучэнне Слуцкай зоны (камандзір П.П.Капуста). Да снежня 1942 г. брыгада складалася з 9 атрадаў агульнай колькасцю амаль 3 тыс. чалавек. Пры фарміраванні злучэння яна была падзелена на 3: 300-ю імя К.Я.Варашылава, 27-ю імя В.І.Чапаева і 225-ю імя А.В.Суворава.

Злучэнне дзейнічала на тэрыторыі Грэскага, Слуцкага, Капыльскага, Уздзенскага і Краснаслабодскага раёнаў.

У жніўні 1943 г. партызанскае злучэнне Слуцкай зоны было расфарміравана. Да гэтага часу яно складалася з 3 брыгад (21 атрад) агульнай колькасцю больш як 4 тыс. партызан. Атрады «Баявы» і імя Аляксандра Неўскага 300-й брыгады імя К.Я.Варашылава і атрад «За Радзіму» 27-й брыгады імя В.І.Чапаева, а таксама некалькі груп з іншых атрадаў агульнай колькасцю 744 партызаны былі перададзены ў склад партызанскага злучэння Беластоцкай вобласці. Асноўныя яго сілы ўліліся ў злучэнне Мінскай вобласці.

У студзені 1943 г. загадам па партызанскім злучэнні Мінскай і Палескай абласцей на базе асобных атрадаў М.М.Розава, А.І.Патрына, А.Я.Абабкава была створана партызанская брыгада № 64 імя В.П.Чкалава (камандзір М.М.Розаў), якая на дзень злучэння з часцямі Чырвонай арміі 30 чэрвеня 1944 г. складалася з 6 атрадаў (імя Л.М.Даватара, імя М.М.Громава, «Жалязняк», імя Р.І.Катоўскага, імя С.Г.Лазо, імя 14 слуцкіх партызан (агульнай колькасцю 1115 партызан). Брыгада па рашэнні Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б была замацавана за Слуцкім раёнам і несла поўную адказнасць за пашырэнне партызанска-

[1]Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1983. Т. 1. С. 148.

Наследие слуцкого края

га руху, арганізацыю масава-палітычнай работы сярод насельніцтва раёна.

Рашэннем Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б 29 сакавіка 1943 г. быў створаны Слуцкі падпольны райком КП(б)Б. Сакратаром яго быў зацверджаны І.С.Кананоўіч. Райком базіраваўся ў партызанскай брыгадзе № 64 імя В.П.Чкалава.

1 верасня 1942 г. быў створаны Слуцкі падпольны райком ЛКСМБ (сакратары Г.М.Абухаў, з 1 кастрычніка 1943 г. П.Д.Локаць), асноўная база якога знаходзілася таксама ў партызанскай брыгадзе № 64 імя В.П.Чкалава.

Значную ролю ў пашырэнні партызанскага руху і ўзмацненні масава-палітычнай работы сярод партызан і жыхароў раёна адыграла стварэнне друкаванага органа падпольнага райкома КП(б)Б газеты «Народны мсцівец» (рэдактар М.Е.Дастанка), першы нумар якой выйшаў 1 красавіка 1943 г. Акрамя газеты ў яе друкарні друкавалася шмат лістовак, адозваў і іншых агітацыйна-прапагандысцкіх матэрыялаў. Сярод іх «Да паліцэйскіх», «Да моладзі», «Да працоўных Слуцкага раёна», «Пісьмо-адозва чэхаславацкіх салдат, якія перайшлі да партызан», і інш.

Усяго ў тыле ворага было выпушчана 78 нумароў газеты «Народны мсцівец» агульным тыражом 37 300 экзэмпляраў і 72 000 экзэмпляраў лістовак і адозваў.

Вакол газеты «Народны мсцівец» быў створаны значны аўтарскі калектыў, які налічваў больш за 120 чалавек. Найбольш актыўнымі сярод іх былі Кананоўіч, Карнееў, Абухва, Бялько, Скрылёў, Радкевіч, Радзюк, Верамейчык, Шаўцоў, Рыклін, Луцэвіч і інш. У 1943 г. рэдакцыя газеты выдала зборнік вершаў беларускага паэта А.Астрэйкі, які па заданні БШПР знаходзіўся ў гэты час у тыле ворага, пад назвай «Слуцкі пояс». Зборнік быў добра аформлены.

У атрадах брыгады № 64 імя Чкалава па стане на 1 ліпеня 1944 г. налічвалася больш за 150 агітатараў, якія за ўвесь час барацьбы ў тыле ворага правялі 453 даклады і 750 гутарак сярод партызан на розныя тэмы. Сярод партызан брыгады сістэматычна праводзіліся калектыўныя чыткі кніг і брашур, якія дастаўляліся з савецкага тылу. Гэта «Они сражались за Родину», «Героическая молодежь Ленинграда на страже города революции», «Советская женщина», «Беларусь борется», «Смерть немецким крепостникам», «Василий Теркин», «Генерал Доватор» і інш.

Партызаны брыгады сістэматычна праводзілі масава-палітычную работу сярод насельніцтва раёна і мелі вялікі ўплыў не толькі на большасць населеных пунктаў раёна, але і на г. Слуцк і гарадскі пасёлак Урэчча. За перыяд з 1 красавіка 1943 г. па 1 ліпеня 1944 г. сярод жыхароў раёна было праведзена 837 калектыўных гутарак, 113 дакладаў, 73 мітынгі па пытаннях міжнароднага і ўнутранага становішча Савецкага Саюза, пра становішча на франтах Айчыннай вайны, захаванне ўраджаю 1943 г., зварот воінаў-беларусаў да партызан, да ўсяго беларускага народа і інш. Лепшымі агітатарамі былі партызаны Чорны, Локаць, Трафімовіч, Горны, Карнееў, Рэзнікаў, Змітровіч, Конеў, Тамуркін.

Жыхары раёна былі цесна звязаны з партызанамі, бачылі ў іх асобе сваіх абаронцаў і аказвалі ім усебаковую дапамогу. Яны перадалі партызанам каля 200 вінтовак, 4 кулямёты, шмат патронаў і іншых боепрыпасаў, забяспечвалі прадуктамі харчавання і ўсім неабходным.

Адначасова з гэтым жыхары Слуцкага раёна аказвалі дапамогу ў павышэнні баяздольнасці Чырвонай арміі зборам сродкаў на пабудову танкавай калоны. Толькі ў жніўні 1943 г. яны сабралі ў фонд абароны Радзімы аблігацый дзяржаўнай пазыкі на суму

Наследие слуцкого края

44 400 рублёў, грашыма 8200 рублёў, 70 рублёў золатам і 40 серабром. Гэтыя грошы мелі не толькі матэрыяльную каштоўнасць, але яшчэ большую маральна-палітычную, бо збіраліся яны ў глыбокім тыле ворага і за кожны ўнесены рубель жахары раёна падвяргалі сябе і членаў сваёй сям'і смяротнай небяспецы. Але нашы людзі не лічыліся з небяспекай, калі размова ішла пра дапамогу Чырвонай арміі ў хутчэйшым разгроме ворага.

Вялікая работа, якая праводзілася падпольным райкомам КП(б)Б, партызанамі, давала свае вынікі. Усенародная барацьба пашыралася і мацнела. З 20 валасцей Слуцкага павета работа нямецкіх улад амаль у паловы з іх была поўнасцю паралізавана і яны знаходзіліся пад кантролем партызан. У астатніх валасныя старшыні не знаходзіліся ў сваіх валасцях, а жылі ў Слуцку ці ў іншых буйных нямецка-паліцэйскіх гарнізонах. На тэрыторыю сваіх валасцей яны маглі з'яўляцца толькі пад аховай паліцыі ці немцаў. У Грэскім раёне амаль усе воласці знаходзіліся пад кантролем партызан.

Жыхары раёна не выконвалі загадаў акупантаў, імкнуліся не выконваць пастаўкі падаткаў, сабатавалі ўсе палітычныя, ваенныя і эканамічныя мерапрыемствы гітлераўцаў. Рабочыя праводзілі дыверсіі на прадпрыемствах, выводзілі са строю машыны і абсталяванне. 24 мая 1943 г. група працаўнікоў Слуцкага масласырзавода пад кіраўніцтвам інжынера цалкам спалілі завод і пайшлі ў партызанскі атрад. На мэблевым камбінаце рабочыя спалілі склад з гатовай прадукцыяй, у ліку якой была мэбля, выраблена для кватэры гебітскамісара Карла. 6 разоў выводзілася са строю Слуцкая электрастанцыя, а ў маі 1943 г. пасля чарговай дыверсіі група інжынерна-тэхнічных работнікаў электрастанцыі на аўтамашыне на чале з галоўным інжынерам з'ехала да партызан.

У партызаны ішлі адзінкамі, групамі і нават сем'ямі. Напрыклад, у маі 1943 г. з в. Вялікая Сліва ў адзін дзень пайшлі ў партызаны 18 чалавек, з в. Нежаўка — 8 чалавек. Толькі за жнівень 1943 г. у партызанскія атрады брыгады № 64 імя Чкалава ўліліся 259 жыхароў Слуцкага раёна[1]. За гэты ж месяц са Слуцка і населеных пунктаў Слуцкага раёна збеглі больш за 240 сямей, якія шукалі паратунку сярод народных мсціўцаў. Гэтыя сем'і былі размешчаны ў партызанскай зоне. Для кіраўніцтва работай па захаванні насельніцтва і размеркаванні сямей, якія прыбылі ў партызанскую зону з размяшчэння варожых гарнізонаў, была створана спецыяльная камісія з прадстаўнікоў партызанскіх атрадаў. У лясах для такіх сямей былі абсталяваны зямлянкі, а шмат якія з іх рассяляліся па вёсках. Да канца 1943 г. пад аховай партызанскіх атрадаў знаходзілася больш за 400 сямей, якія збеглі са Слуцка і іншых фашысцкіх гарнізонаў. Іх колькасць асабліва павялічылася ў 1944 г., калі адступаючыя нямецкія войскі ўзмацнілі тэрор у раёне, праводзілі масавы вываз людзей у Нямеччыну. 27 верасня 1943 г. толькі з аднаго Ісернскага сельсавета пераехалі ў партызанскую зону 60 сямей з усёй сваёй маёмасцю. За верасень у партызанскія атрады брыгады прыбылі 110, за кастрычнік — лістапад — 285 жыхароў раёна[2].

У снежні 1943 г. у партызанскую брыгаду № 64 імя Чкалава прыбылі 676 жыхароў раёна прызыўнога ўзросту, якія штабам брыгады былі падрыхтаваны і адпраўлены за лінію фронту для папаўнення часцей Чырвонай арміі[3].

[1]Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3968. Воп. 1. Спр. 2. Л. 18.
[2]Тамсама. Л. 25—26, 37, 42.
[3]Тамсама. Л. 42.

Наследие слуцкого края

У Грэскім раёне з першых дзён акупацыі на нелегальнае становішча перайшоў загадчык ваеннага аддзела райкома КП(б)Б У.І.Заяц, які з'яўляўся адным з арганізатараў партызанскага руху ў раёне. У жніўні 1942 г. ён быў уключаны ў склад міжрайкома партыі Слуцкай зоны.

2 верасня 1942 г. Мінскі абком КП(б)Б, які знаходзіўся ў Маскве, накіраваў у Грэскі раён у якасці партарганізатара І.І.Пузевіча. Мінскі падпольны абком партыі 12 сакавіка 1943 г. зацвердзіў яго сакратаром Грэскага падпольнага райкома КП(б)Б. 28 мая 1943 г. ЦК КП(б)Б зацвердзіў сакратаром Грэскага падпольнага райкома партыі У.І.Зайца. Падпольны райком КП(б)Б базіраваўся ў партызанскай брыгадзе № 225 імя А.В.Суворава.

Друкаваным органам падпольнага райкома КП(б)Б з'яўлялася газета «Сталинец», першы нумар якой выйшаў 27 чэрвеня 1943 г. Яе рэдактарам быў зацверджаны Т.М.Беразоўскі. Усяго было выпушчана 66 нумароў газеты і 100 розных лістовак агульным тыражом 76 700 экзэмпляраў.

У снежні 1942 г. прыступіў да работы Грэскі падпольны райком камсамола. Яго сакратарамі былі да 1 лістапада 1943 г. П.Я.Папоў, а з 1 лістапада 1943 г. А.М.Сурдо.

Падзеі на фронце, перамогі Чырвонай арміі ставілі перад падпольшчыкамі і партызанамі ўсё новыя задачы. Разгорнутая бітва на Курскай дузе была актыўна падтрымана і слуцкімі партызанамі. Згодна з пастановай ЦК КП(б)Б.ад 24 чэрвеня 1943 г. «Аб разбурэнні чыгункі праціўніка метадам «рэйкавай вайны» партызаны брыгады № 64 імя Чкалава толькі за жнівень 1943 г. на чыгунцы Урэчча — Слуцк перабілі 2294 рэйкі, спусцілі пад адхон 4 варожыя эшалоны, падарвалі 2 аўтамашыны, знішчылі 7 км тэлеграфна-тэлефоннай сувязі, спалілі 3 масты на гравейцы, забілі 169 і паранілі 34 гітлераўцаў[1].

Занепакоеныя дзеяннямі партызан у тыле сваіх войскаў, нямецка-фашысцкія захопнікі арганізавалі супраць іх шматлікія карныя аперацыі. У Слуцкім раёне акупантамі былі праведзены карныя аперацыі пад кодавай назвай «Свята ўраджаю І», «Свята ўраджаю ІІ», № 6, «Люты» і інш. У ходзе іх, не дамогшыся перамогі над партызанамі, гітлераўцы палілі вёскі, знішчалі ні ў чым не павінных мірных жыхароў, рабавалі маёмасць, вывозілі людзей на катаржныя работы ў Германію. Ратаваць жыхароў раёна ад знішчэння і вывазу на катаргу з'яўлялася адной з важнейшых задач партызан.

Час гаспадарання гітлераўцаў на Случчыне падыходзіў да свайго канца. 23 чэрвеня 1944 г. пачалася Беларуская наступальная аперацыя Чырвонай арміі, якая мела кодавую назву «Багратыён». Галоўныя сілы 1-га Прыбалтыйскага, 3-га і 2-га Беларускіх франтоў пасля магутнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі перайшлі ў наступленне на віцебскім, аршанскім і магілёўскім напрамках. На наступны дзень па варожых пазіцыях на бабруйскім напрамку абрушылі ўдары войскі 1-га Беларускага фронту дзвюма ўдарнымі групамі. З плацдарма ў раёне Рагачоў — Жлобін рушылі на пазіцыі ворага 3-я і 48-я арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнантаў А.В.Гарбатава і П.Л.Раманенкі. На поўдзень ад Парыч — войскі 65-й арміі пад камандаваннем генерал-палкоўніка П.І.Батава і 28-й арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта А.А.Лучынскага. На гэтым напрамку савецкія войскі ў першы ж дзень наступлення дабіліся значных поспехаў, што дало магчымасць увесці ў бітву 1-ы гвардзейскі танкавы корпус генерал-маёра танкавых войскаў М.Ф.Панова, а на наступны дзень конна-механізаваную

[1]Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3968. Воп. 1. Спр. 2. Л. 18.

Наследие слуцкого края

групу пад камандаваннем генерал-лейтэнанта І.А.Пліева. Конна-механізаваная група 28 чэрвеня вызваліла Старыя Дарогі і перадавымі атрадамі выйшла на подступы да Слуцка. У цэнтры горада кругавую абарону занялі амаль два нямецкія палкі з танкамі. Досвіткам 30 чэрвеня пасля кароткай артылерыйскай падрыхтоўкі злучэнні 4-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса атакавалі слуцкі гарнізон праціўніка, прарвалі абарону гітлераўцаў на флангах і імкліва прасоўваліся да цэнтра горада. З усходу ў горад уварваліся танкі 219-й танкавай брыгады 1-га механізаванага корпуса. Завязаўся ўпарты вулічны бой.

У 8 гадзін 30 чэрвеня да палка пяхоты гітлераўцаў пры падтрымцы артылерыі і танкаў контратакавалі савецкіх воінаў на паўднёва-ўсходняй ускраіне Слуцка і адціснулі часці 9-й кавалерыйскай дывізіі да цэнтра горада. На дапамогу кавалерыстам быў кінуты артылерыйскі полк 15-й стралковай дывізіі 18-га корпуса 65-й арміі. Нямецкая контратака пацярпела паражэнне. З паўночнага ўсходу ў горад уварвалася 35-я мотастралковая брыгада 1-га механізаванага корпуса, а з поўдня Слуцк абышлі часці 3-га стралковага корпуса 28-й арміі.

Атакаваныя з некалькіх бакоў гітлераўцы не вытрымалі ўдару і, пакінуўшы на полі бою вялікую колькасць забітых і параненых, пачалі адыходзіць на захад.

Да 11 гадзін 30 чэрвеня Слуцк быў поўнасцю ачышчаны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 8 часцям і злучэнням (10-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі, 37-й механізаванай брыгадзе, 1-й асобнай знішчальна-супрацьтанкавай брыгадзе, 218-му, 431-му і 874-му штурмавым авіяцыйным палкам, 53-му асобнаму матарызаванаму пантонна-маставому батальёну і 91-му інжынерна-сапёрнаму батальёну), якія вызначыліся ў баях за г. Слуцк, было нададзена ганаровае найменне «Слуцкіх».

1 ліпеня 1944 г. часці 44-й гвардзейскай стралковай дывізіі 65-й арміі ва ўзаемадзеянні з партызанамі 225-й брыгады імя А.В.Суворава вызвалілі Грэск.

У вызваленні Случчыны вялікую дапамогу савецкім воінам аказвалі партызаны. Яны прадстаўлялі часцям Чырвонай арміі падрабязныя разведданыя, рабілі засады на шляхах адступлення нямецкіх войскаў, знішчалі жывую сілу і тэхніку ворага, захоплівалі пераправы цераз водныя перашкоды, ва ўмовах панічнага адступлення гітлераўцаў сваімі сіламі вызвалялі населеныя пункты і ўтрымлівалі іх да падыходу савецкіх войскаў, ратавалі жыхароў ад знішчэння і вывазу ў Германію.

З набліжэннем савецкіх войскаў да Слуцкага раёна, дзе гітлераўцы, выкарыстаўшы натуральную перашкоду — раку Случ, арганізавалі даволі моцную абарону і спрабавалі затрымаць наступленне часцей Чырвонай арміі, слуцкая партызанская брыгада № 64 імя Чкалава па ўзгадненні з савецкім камандаваннем заняла пераправу каля населенага пункта Пагост цераз р. Случ і сумесна з савецкімі воінамі павяла наступленне на горад і разам з імі штурмам авалодала г. Слуцк[1].

2 ліпеня ў Слуцку адбыўся мнагалюдны мітынг, прысвечаны вызваленню Случчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На ім прысутнічалі жыхары горада, партызаны, прадстаўнікі вайсковых часцей, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Слуцка, — усяго больш за 3 тыс. чалавек. Мітынг адкрыў сакратар Слуцкага падпольнага райкома КП(б)Б І.С.Канановіч. На ім выступілі намеснік камандуючага 28-й арміі палкоўнік Цыбін, партызаны, партызанкі, прадстаўнікі насельніцтва і лектар палітаддзела 28-й арміі маёр Данскі. У мітынгу прыняў удзел член Ваеннага

[1]Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 599. Л. 36.

Наследие слуцкого края

савета 28-й арміі генерал-маёр П.Л.Печарыца.

У сваіх выступленнях жыхары горада выказвалі сардэчную падзяку сваёй вызваліцельніцы Чырвонай арміі і абяцалі аддаць усе сілы і здольнасці, каб хутчэй аднавіць разбураную нямецка-фашысцкімі захопнікамі народную гаспадарку, аказаць дапамогу фронту. «Мы падымем з развалін і папялішчаў наш Слуцк, зноў заквітнеюць багатым ураджаем нашы калгасныя палі. Усе сілы і сродкі мы аддадзім на падтрымку слаўнай Чырвонай арміі, для поўнага разгрому ворага», — гаварылася ў рэзалюцыі, прынятай на мітынгу[1].

Гады «гаспадарання» нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі прынеслі незлічоныя страты і пакуты нашаму народу. На тэрыторыі Случчыны фашысты спалілі поўнасцю 23 і часткова 24 вёскі, знішчылі больш за 11 500 мірных жыхароў, у тым ліку 800 жанчын, 14 тыс. ваеннапалонных, вывезлі ў фашысцкае рабства звыш 850 чалавек[2].

Вялізныя страты нямецка-фашысцкія захопнікі нанеслі жывёлагадоўлі раёна. На калгасных фермах і ў гаспадарках сялян імі было знішчана 3078 коней, 7323 дойныя каровы, 4091 галава маладняку, 8209 свіней, 7770 авечак. Былі разрабаваны і спалены амаль усе школы, 24 бальніцы, 8 ветэрынарных пунктаў, 45 кааператыўных будынкаў, 10 мельніц, 29 клубаў, 287 кароўнікаў і канюшань. У Слуцку гітлераўцы спалілі Дом Саветаў, разбурылі пошту, дзяржбанк, электрастанцыю, педвучылішча, 6 школ, кінатэатр, драмтэатр, летні сад, масласырзавод, пладова-вінаробчы завод, мясакамбінат, хлебапякарню, трыкатажную фабрыку і іншыя прадпрыемствы і ўстановы[3].

Пасля вызвалення горада і раёна ад захопнікаў патрэбны былі вялікія намаганні, самаадданая праца жыхароў Случчыны, каб аднавіць разбураную акупантамі народную гаспадарку, наладзіць нармальныя ўмовы жыцця, аказаць дапамогу фронту ў хутчэйшым заваяванні Перамогі.

Адразу пасля вызвалення раёна ў Слуцку пачаў дзейнічаць райком партыі, які ўзначальваў былы сакратар Слуцкага падпольнага райкома КП(б)Б І.С.Канановіч. Разам з гаркомам КП(б)Б і выканкомам райсавета дэпутатаў працоўных яны прыступілі да аднаўлення разбуранай гітлераўцамі за тры гады акупацыі народнай гаспадаркі. На ўсе важнейшыя пасады ва ўстановы, на прадпрыемствы, у сельскія Саветы і калгасы былі накіраваны былыя партызаны, якія самаадданa ўзяліся за справу.

У першую чаргу пачалося аднаўленне органаў савецкай улады. Ужо ў першыя дні ў раёне пачалі працаваць усе раённыя арганізацыі і ўстановы, усе выканкомы сельскіх Саветаў, калгасы, якія аб'ядноўвалі 11 272 гаспадаркі. У калгасах былі адноўлены ўсе канюшні з застаўшыміся ў наяўнасці коньмі, арганізаваны 63 малочна-таварныя фермы, у якіх налічвалася 642 дойныя каровы, 68 быкоў, 37 цялушак і 375 галоў маладняку, 10 авечкагадоўчых, 2 свінатаварныя фермы. У калгаснікаў было закантрактавана 709 цялят. Калгас імя Дзяржынскага Бокшыцкага сельсавета арганізаваў птушкагадоўчую ферму з 500 кур.

З першых дзён вызвалення быў адноўлены трактарны парк раёна, пачалі працаваць 3 МТС: Слуцкая, Баўманская і Кучынская, якія мелі на першых парах 25 трактароў, 7 плугоў, 12 складаных малатарняў, 6 трактарных сеялак.

Вялікую ўвагу райком КП(б)Б і гарвыканком надавалі аднаўленню разбураных прадпрыемстваў Слуцка. Ужо

[1]Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф.233. Воп. 2374. Спр. 41. Л. 89.
[2]Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф.845. Воп. 1. Спр. 60. Л. 80.
[3] Тамсама. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 274. Л. 153.

Наследие слуцкого края

на другі дзень пасля вызвалення, дзякуючы намаганням былых партызан, пачалі працаваць у горадзе хлебапякарня, цырульня, баня. У хуткім часе былі адноўлены і пачалі дзейнічаць сельскагаспадарчая, шавецкая майстэрні, масласырзавод, кравецкая арцель, майстэрня па рамонце гадзіннікаў, фатаграфія, адкрыты магазіны.

Важнейшай задачай гарадскіх улад з'яўлялася аднаўленне электрастанцыі, дырэктарам якой быў прызначаны былы партызан Бачароў. Электрастанцыя магутнасцю 500 кВт·ч была пушчана ў кароткі тэрмін. Рыхтавалася для здачы другая, больш магутная турбіна.

Адразу ж пасля вызвалення пачаў працаваць млын «Прагрэс», які даваў 1000 пудоў мукі за суткі, хуткімі тэмпамі ішлі работы па ўводзе ў дзеянне другой чаргі млына такой жа магутнасці, аднаўляўся гарбарны завод. На млыне «Усход» пачала працаваць лесапілка прадукцыйнасцю 25 кубаметраў піламатэрыялаў за суткі.

У горадзе пачалі працаваць паштамт, тэлеграф, тэлефонная станцыя, радыёвузел на 50 радыёкропак. Была ўстаноўлена тэлефонная сувязь з 6 сельсаветамі раёна, адкрыты бальніца і паліклініка, у якіх працавалі каля 100 чалавек медперсаналу. У Слуцку былі адкрыты і прыступілі да работы 6 школ, пачаўся прыём заяў навучэнцаў у педвучылішча, у якое меркавалася прыняць 500 юнакоў і дзяўчат.

Хуткімі тэмпамі рамантаваўся будынак пад кінатэатр, рамантаваліся жылыя дамы.

З першых дзён вызвалення быў адноўлены і пачаў работу партыйны кабінет пры райкоме КП(б)Б, у якім мелася бібліятэка. Яна налічвала 10 000 экзэмпляраў розных кніг.

Былыя партызаны, якія былі пасланы райкомам КП(б)Б у сельсаветы і калгасы, арганізавалі хуткую ўборку ўраджаю. Па стане на 10 верасня 1944 г. усе калгасы раёна закончылі касавіцу, сціртаванне. На 10 верасня 1944 г. было ўбрана і абмалочана зерневых з 1833 га і намалочана 16 471 ц зерня, засеяна азімых 1348 га, падрыхтавана пад пасеў 2982 га глебы.

Калгасамі раёна на гэтую ж дату было здадзена хлеба дзяржаве 11 725 ц, ці 86 працэнтаў ад плана. Палова калгасаў раёна на гэты час поўнасцю выканала свае планы здачы збожжа дзяржаве, у бліжэйшыя дні рыхтаваліся закончыць здачу і астатнія[1].

Трэба мець на ўвазе, што ўсё гэта рабілася ва ўмовах, калі працягвалася цяжкая вайна з фашысцкай Германіяй і мужчыны былі на фронце. Асноўны цяжар работ у Слуцку і раёне, як і па ўсёй Беларусі, лёг на плечы жанчын і падлеткаў. Гэта ў асноўным іх рукамі, іх самаадданай працай праводзіліся першыя работы па аднаўленні народнай гаспадаркі, разбуранай нямецка-фашысцкімі захопнікамі, наладжванні нармальных умоў жыцця, аказанні ўсебаковай дапамогі Чырвонай арміі ў хутчэйшым канчатковым разгроме ворага. «Усё для фронту, усё для Перамогі!» — быў галоўны лозунг таго часу.

Пад гэтым лозунгам жылі і працавалі случане, як і жыхары ўсёй Беларусі, аказваючы дапамогу фронту. Яны свядома ішлі на цяжкія выпрабаванні, нягоды і ахвяры за лёс Радзімы, для дасягнення Перамогі. Рабочыя і служачыя прадпрыемстваў і ўстаноў адлічвалі штомесяц у фонд абароны Радзімы аднадзённы заробак, калгаснікі за кошт грамадскіх гаспадарак і асабістых запасаў накіроўвалі чырвоныя абозы са збожжам, бульбай, агародніной, уносілі са сваіх асабістых зберажэнняў грошы і каштоўнасці на пабудову баявых самалётаў, танкаў.

Справай усяго народа, у тым ліку і жыхароў Слуцкага раёна, былі клопаты аб параненых воінах Чырвонай арміі. Над шпіталямі, якія размяшча-

[1]Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 274. Л. 162—163.

Наследие слуцкого края

ліся на тэрыторыі горада і раёна, бралі шэфства арганізацыі, жанчыны і дзяўчаты. Яны аказвалі дапамогу ў доглядзе за параненымі, у іх культурным абслугоўванні, па рамонце і мыцці бялізны і абмундзіравання і г.д.

Адным з праяўленняў патрыятызму жыхароў Случчыны было развіццё донарскага руху. У Слуцку 60 дзяўчат сталі актыўнымі донарамі, якія рэгулярна здавалі сваю кроў для выратавання жыцця параненых[1].

Зямля Случчыны шчодра паліта крывёю сыноў і дачок усіх народаў былога Савецкага Саюза. На тэрыторыі раёна знаходзяцца больш за 70 брацкіх магіл, у якіх пахаваны звыш 1100 воінаў Чырвонай арміі, партызан, якія загінулі пры абароне і вызваленні Случчыны.

Цяжкімі шляхамі вайны ў складзе Чырвонай арміі прайшлі тысячы случан. Яны ўнеслі важкі ўклад у разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў і агульную перамогу над ворагам. Звыш 7 тысяч з іх аддалі сваё жыццё за свабоду і незалежнасць нашай Айчыны.

Удзячныя жыхары раёна ніколі не забудуць подзвігаў савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў, здзейсненых дзеля жыцця на зямлі. Сведчанне таго — больш за 190 помнікаў, стэл, абеліскаў, пастаўленых на ўшанаванне іх памяці. З пачуццём адказнасці і пашаны мы сёння гаворым: «Нізкі паклон табе, слаўнае пакаленне Вялікай Айчыннай вайны!..».

У.І.Лемяшонак.

Абарону трымалі...

З успамінаў Віктара Эрнэставіча Шомадзі, былога камандзіра 1-й батарэі 84-га лёгкаартылерыйскага палка 55-й стралковай дывізіі генерал-маёра артылерыі ў адстаўцы

...На зыходзе 25 чэрвеня 1941 г. злучэнні 24-га матарызаванага корпуса гітлераўцаў былі спынены часцямі 55-й стралковай дывізіі і атрадам 14-га механізаванага корпуса на рубяжы Слуцкага ўмацаванага раёна. Да раніцы 26 чэрвеня пасля моцнага ўдару авіяцыі танкавыя часці праціўніка прарваліся цераз баявыя парадкі 55-й стралковай дывізіі на рубяжы Слуцкага ўмацаванага раёна і атрада 14-га механізаванага корпуса, якія прыкрывалі Варшаўскую шашу, адцясніўшы іх на рубеж Лядна, Малышэвічі, але да 14 гадзін прасунуцца далей не змаглі. У перыяд з 14 да 15 гадзін немцы прарвалі абарону нашых войскаў на гэтым рубяжы, і атрад 14-га механізаванага корпуса з часткай сіл 55-й стралковай дывізіі адышлі на рубеж Сярагі (паўночная ўскраіна г. Слуцк), дзе злучыліся са зводным атрадам 28-га стралковага корпуса, а атрад 55-й стралковай дывізіі быў адкінуты на поўдзень ад шашы.

Задача абароны Слуцка з раніцы 26 чэрвеня была ўскладзена на камандзіра 28-га стралковага корпуса генерал-маёра В.С.Папова.

Да падыходу гітлераўцаў да Слуцка абарону тут займалі: зводны атрад 28-га стралковага корпуса — паўночную частку горада і двухкіламетровы ўчастак на поўнач ад яго; атрад 14-га механізаванага корпуса разам з батальёнам (дзве роты) 161-га запаснога стралковага палка і 120-м гаўбічным палком РГК утрымлівалі паўднёвую частку Слуцка, в. Казловічы; атрад 161-га запаснога стралковага палка — на поўдзень ад в. Казловічы; атрад 30-й танкавай дывізіі — у другім эшалоне на рубяжы вёсак Падарэссе, Валашэва, Сорагі.

Частка сіл 55-й стралковай дывізіі сканцэнтравалася ва Урэччы.

Штаб 28-га стралковага корпуса знаходзіўся ў в. Вясея, а 14-га механізаванага корпуса — у раёне в. Паўстынь.

Акрамя таго, з адступаючых груп, якія былі затрыманы 14-м механізаваным корпусам каля Слуцка, быў сфарміраваны

[1]Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 63. Воп. 16. Спр. 2. Л. 67.

Наследие слуцкого края



В.Э.Шомадзі ў 1941 г.

атрад з чатырох рот (без артылерыі), які па ўказанні камандуючага 4-й арміяй заняў абарону на рубяжы вёсак Амговічы, Каліта і ўвайшоў у падпарадкаванне 14-га механізаванага корпуса.

На магчымых шляхах руху праціўніка, у першую чаргу на шашы, рабіліся завалы, разбіраліся масты, перакопваліся дарогі. У атрадах 14-га механізаванага корпуса для загароды прыстасоўваліся няспраўныя машыны. Для прыкрыцця найбольш важных загарод фарміраваліся невялікія групы са стралковым узбраеннем і асобнымі супрацьтанкавымі гарматамі.

У выніку прынятых мер рубяжы, якія займалі нашы войскі, былі некалькі ўзмоцнены, і праціўнік на працягу 26 чэрвеня не змог прарваць абарону ў раёне Слуцка, нягледзячы на танкавыя атакі, якія былі падтрыманы авіяцыяй.

У ноч на 27 чэрвеня 3-я танкавая дывізія 24-га механізаванага корпуса немцаў пасля моцных артылерыйскіх удараў і налётаў авіяцыі некалькі разоў атакавала нашы войскі ў раёне Слуцка і ёй удалося адкінуць атрад 28-га стралковага корпуса на ўсход і захапіць паўночную частку горада, але яго далейшае прасоўванне было затрымана на р. Случ.

Рашэннем камандуючага 4-й арміяй з астаткаў 28-га стралковага корпуса і 161-га запаснога стралковага палка быў сфарміраваны зводны атрад, які на аўтамашынах быў перакінуты па Варшаўскай шашы на рубеж р. Пціч для арганізацыі там абароны. Адзін атрад 55-й стралковай дывізіі сумесна з 28-м стралковым корпусам займаў абарону на р. Пціч, а другі абараняў раён Глуска. З гэтага часу кіраўніцтва часцямі, якія трымалі абарону на рубяжы р. Случ, было ўскладзена на начальніка штаба 14-га механізаванага корпуса палкоўніка І.В.Тутарынава і намесніка камандзіра гэтага ж корпуса па палітычнай часткі палкавога камісара І.В.Насоўскага. Ім падпарадкаваліся тры атрады, якія да раніцы 27 чэрвеня займалі наступныя пазіцыі: перадавы атрад у складзе трох рот, пяці гармат і двух бронеаўтамабіляў сумесна з батальёнам 161-га запаснога стралковага палка займаў абарону па р. Случ ад Варшаўскай шашы да чыгункі Слуцк — Урэчча; другі атрад у складзе чатырох рот сумесна з атрадам 22-й танкавай дывізіі арганізаваў абарону на рубяжы Амговічы — Каліта; атрад 30-й танкавай дывізіі пад камандаваннем палкоўніка С.І.Багданава, які знаходзіўся ў другім эшалоне, утрымліваў вёскі Падарэссе, Вялікая Баравая, Волашава, Сорагі. Камандны пункт атрадаў размяшчаўся ў раёне в. Каліта.

На досвітку 27 чэрвеня гітлераўцы здзейснілі некалькі моцных авіяцыйных налётаў на баявыя парадкі атрадаў, якія абараняліся ў раёне Слуцка. Пасля гэтага часці 3-й танкавай дывізіі немцаў з некалькіх напрамкаў пачалі масіраваныя танкавыя атакі, якія былі падтрыманы моцным артылерыйскім і мінамётным агнём. Асобным групам танкаў праціўніка ўдалося прарвацца за р. Случ, але галоўныя яго сілы былі затрыманы нашымі атрадамі. Каля 10 гадзін гітлераўцы правялі некалькі беспаспяховых атак супраць атрадаў 14-га механізаванага корпуса і 55-й стралковай дывізіі на рубяжы вёсак Амговічы — Каліта і Урэчча, але панеслі вялікія страты і прарвацца не змаглі. Тады часці 3-й танкавай дывізіі немцаў абышлі абарончы рубеж Амговічы — Каліта з поўначы і да сярэдзіны дня выйшлі цераз Падарэссе ў раён Старых Дарог. Да 18 гадзін танкі праціўніка падышлі да р. Пціч і цераз гарэўшы мост прарваліся на яе ўсходні бераг.

У жорсткіх баях у раёне Слуцка ў адной з контратак па-геройску загінуў камандзір 55-й стралковай дывізіі палкоўнік Дзмітрый Іванавіч Іванюк, і камандаванне дывізіяй прыняў начальнік яе штаба падпалкоўнік Тэр-Гаспаран.

Наследие слуцкого края

Той незабыўны чэрвень 41-га

З успамінаў Міхася Адамавіча Тычыны, жыхара Слуцка

...Той доўгі і трывожны сонечны дзень помніцца лепей, чым тое, што было ўчора. Яно і зразумела: мне тады ішоў пятнаццаты год, памяць была «ўчэпістая», а падзеі — вельмі ўражлівыя і трывожныя.

Пасля школы я пагадзіўся за працадзень з чверцю пасвіць калгасных коней. У шэсць гадзін раніцы таго чэрвеньскага дня маці мяне пабудзіла, і я хуценька пашыбаваў да канюшні. Недзе праз паўгадзіны стрыножаны мой табун быў ужо за вёскай. Гадзін у восем ці дзевяць з боку Слуцка (туды ад нашай вёскі напрамкі 15 кіламетраў) пачуліся выбухі бомбаў. У неба ў тым баку пацягнуўся шнур чорнага дыму. Затым ужо і над нашай вёскай на невялічкай вышыні, — бо бачны былі жоўтыя канцы крылаў і чорныя крыжы на іх — сталі пралятаць на ўсход чацвёркі і шасцёркі двухматорных бамбардзіроўшчыкаў «Ю-88», а затым і адзіночныя самалёты. Па іх ні разу ні над чыгункай, што праходзіць за 4 кіламетры, ні над шашой-«варшаўкай», да якой 7 кіламетраў, ніхто не страляў. А ў небе за цэлы дзень я не ўбачыў ніводнага нашага знішчальніка. Мяне, хлапчука, які верыў, што Чырвоная армія «всех сильней», а нашы лётчыкі і самалёты лепшыя ў свеце, гэта здзіўляла і засмучала.

Тады ж, 26 чэрвеня, зрэдку ў небе высока пралятралі на захад дзевяткі нашых двухматорных бамбардзіроўшчыкаў «СБ» — без прыкрыцця знішчальнікаў. Гадзіны праз 2—3 назад вярталіся па 3—4 машыны.

Гадзін у 10—12 дня праз вёску ў бок Урэчча пачалі ісці адзіночныя і групамі, па 3—4 чалавекі, чырвонаармейцы — стомленыя, у мокрых ад поту гімнасцёрках. На пытанні майго дзядулі, дзе немцы, яны адказвалі коратка: «Уже в Слуцке». У аднаго лейтэнанта разрыўной куляй раздрабіла далонь, і вясковая акушэрка Надзя Бараноўская забінтавала яму рану. З размоў вайскоўцаў я падслухаў, што мост цераз Случ спалены, і яны раку пераплывалі. Пазней праз вёску пацягнуліся вайсковыя абозы з параненымі, а недзе гадзін у 16—17 над Слуцкам паўстала чорная сцяна дыму, а з боку в. Вясея сталі далятаць гарматныя стрэлы, кулямётныя чэргі, з неба там пікіравалі нямецкія «Ю-87», ды так нізка, што хаваліся за лесам, што стаяў у паўночным напрамку ад нашай вёскі, а потым, адбамбіўшыся, узмывалі ў неба. Да самага вечара ў тым напрамку чулася стралянніна, а потым усё сціхла.

27 чэрвеня паблізу вёсак Стары Гуткоў, Каліта, Кучына з гадзіну грымеў жорсткі бой... Я з вясковымі хлапчукамі хадзіў пазней на поле таго бою сабіраць патроны. Узбоч шашы каля пас. Кучына стаяла наша 122-міліметровая гаўбіца, побач, у канаве, блішчэлі кінутыя снарады — штук трыццаць. Непадалёку чарнелі шкілеты трох спаленых грузавікоў ЗІС-5. А на палетку, за шашой, у вочы кінуўся россып зялёных касак, процівагазавых сумак. І ўсюды — патроны ў абоймах, кулямётных лентах. Падышла жанчына і ціха прамовіла: «Вось тут, хлопчыкі, мы два дні збіралі забітых нашых салдацікаў — немцы загадалі». Мы ўбачылі брацкую магілу, дзе іх пахавалі. Над ёй стаяў высокі драўляны крыж. Сваіх немцы пахавалі ў адзіночныя магілы. І хоць карціна нямецкіх могілак парадавала нашы хлапечыя сэрцы, дамоў мы вярталіся азмрочаныя ўсім убачаным.

Подзвіг двух салдат

...26 чэрвеня раніцай перадавыя злучэнні танкавых і матарызаваных дывізій ворага ўварваліся на тэрыторыю Слуцкага раёна. Завязаліся баі каля мястэчка Леніна. Вораг падышоў ушчыльную да Слуцка.

Лічачы, што ў горадзе ўжо няма савецкіх войскаў, немцы накіравалі па Пралетарскай (цяпер Леніна) вуліцы бронетранспарцёры з пяхотай. З паветра іх падтрымлівалі эскадрыллі самалётаў-знішчальнікаў. Вось ужо бронетранспарцёры з лязганнем імчацца каля ахопленага полымем будынка былога педвучылішча.

Але што гэта? Уперадзе, каля цэнтра горада, маланкай бліснула полымя і амаль у той жа момант пад пярэднім бронетранспарцёрам з грукатам узрываецца артылерыйскі снарад. Ахопленая полымем машына хіліцца на бок, з яе вывальваюцца забі-

Наследие слуцкого края

тыя і параненыя салдаты. За першым узрывам другі, трэці, чацвёрты... Вось ужо з трох бронетранспарцёраў, загарадзіўшых вуліцу, у блакітнае чэрвеньскае неба паваліліся слупы чорнага дыму. На маставой валяюцца трупы ворага. З ідучых ззаду бронетранспарцёраў узнялася беспарадкавая страляніна. А гармата пасылала снарад за снарадам у самую гушчыню варожай калоны...

Гэта два савецкія воіны, прозвішчы іх так і засталіся невядомымі, развярнулі на рагу вуліц Пралетарскай і Валадарскага гармату і сталі біць з яе прамой наводкай па калоне нямецкіх бронетранспарцёраў.

Сустрэўшы супраціўленне, немцы вымушаны былі прыпыніць калону і накіраваць у абход, на вуліцу Урыцкага, некалькі танкаў. Два савецкія салдаты, адзін з якіх быў паранены ў галаву, расстраляўшы снарады, працягвалі весці агонь з кулямёта да апошняга патрона, пакуль чарга з варожага танка не абарвала жыцці мужных абаронцаў.

Аўтару гэтага артыкула на другі дзень давялося бачыць гармату, з якой вялі агонь салдаты, і тры спаленыя бронетранспарцёры. Мужнасць апошніх абаронцаў Слуцка бачылі браты Шацілы, якія жылі тады ў цэнтры горада. Адзін з іх загінуў на фронце...

Невядомыя салдаты былі пахаваны на рагу вуліцы Пралетарскай і пад'езда да Дома культуры. Усе тры гады акупацыі на магіле ляжаў снарад калібру той гарматы, з якой салдаты вялі агонь па ворагу. Вясной і летам чыясьці невядомая рука прыносіла на магілу жывыя кветкі. Пасля вайны астанкі герояў былі перанесены на брацкія могілкі. Жыхары Слуцка ніколі не забудуць мужных абаронцаў роднага горада.

М.Васілюк.

За сацыялістычную Радзіму. 1957. 13 сак.

Дзве сустрэчы з горадам

З успамінаў Ю.Пограбава, удзельніка баёў за Слуцк, былога танкіста 60-га танкавага палка

Франтавыя дарогі двойчы прыводзілі мяне ў Слуцк. Першы раз у чэрвені 1941 г., другі — у чэрвені 1944 г. Дзве сустрэчы з горадам засталіся ў маёй памяці на ўсё жыццё. 25 чэрвеня 1941 г. мы, танкісты 60-га танкавага палка, з баямі адступалі на ўсход. Здалёку ўбачылі горад Слуцк у полымі пажараў. Занялі абарону. Вечарам 26 чэрвеня фашыстам удалося ўварвацца ў Слуцк. У гэтым баі танк лейтэнанта Краснова, які застаўся без гаручага і боепрыпасаў, тараніў фашысцкі танк. Наш воін знішчыў некалькі варожых салдат і машын, загінуў сам смерцю героя. А раніцай 27 чэрвеня, калі фашысты захапілі амаль увесь горад, экіпаж нашай «трыццацьчацвёркі» пад камандаваннем лейтэнанта Міхаіла Жматчанкі з падбітай машыны вёў бой да апошняга снарада.

З болем у сэрцы пакідалі мы родныя гарады і вёскі. Прайшлі тры цяжкія ваенныя гады, і радасны дзень настаў. Мне выпаў гонар 30 чэрвеня 1944 г. у складзе 54-й гвардзейскай стралковай дывізіі 28-й арміі генерала Лучынскага сумесна з партызанамі вызваляць Слуцк ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мы бачылі слёзы радасці на вачах людзей, бачылі калоны палонных фашыстаў. Зусім не тымі былі цяпер ужо гэтыя «заваёўнікі свету», якія ўступілі ў Слуцк 1941 года.

Мужнасць невядомага лётчыка

Ішоў шосты дзень Вялікай Айчыннай вайны. Па шасэ на Бабруйск, міма дагаравючых каля пасёлка Кучына танкаў і машын з крыжамі на бартах рухаліся на ўсход матарызаваныя калоны ворага.

Раптам неба над вёскамі Немчае і Муравішчына прачарцілі пункціры трасіруючых куль, пачулася глухое ракатанне буйнакаліберных кулямётаў. Гэта савецкі знішчальнік атакаваў 12 нямецкіх самалётаў. Завязаўся кароткі, але жорсткі бой. Нягледзячы на колькасную перавагу немцаў, савецкі знішчальнік смела атакаваў варожыя самалёты.

Вось што расказаў відавочца гэтага паветранага бою былы партызан Вялікай

Наследие слуцкого края

Айчыннай вайны Аляксандр Тарасавіч Зубарык:

— Раніцай 28 чэрвеня 1941 г. савецкі знішчальнік завязаў бой з нямецкімі самалётамі. З першай чаргі ён падпаліў адзін з «юнкерсаў». Сцярвятнік упаў у бліжэйшы лес. Праз некалькі секунд, пакідаючы хвост чорнага дыму, да зямлі пачаў падаць другі «юнкерс», потым трэці... У гэты час у бой уступілі дзве «рамы» (нямецкі двухфюзеляжны самалёт-разведчык). Трапнай чаргой знішчальнік збіў адну «раму», другую дагнаў і рубануў вінтом. «Рама» нязграбна закружылася і пайшла на пасадку. Але загарэўся і наш самалёт. Ён упаў ва ўрочышчы Жукава Балота ў моцна забалочаным месцы. Матор і абломкі машыны зніклі ў багне. Пасля вайны матор быў выцягнуты разам з астанкамі лётчыка. Больш нічога знайсці не ўдалося.

...Імя героя-лётчыка так і засталося невядомым...

М.Барысевіч.

За сацыялістычную Радзіму. 1957. 23 чэрв.

Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго накірункі былі выкладзены Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25 мая 1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншароднага насельніцтва» ў напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму былі даволі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых сумнавядомых дакументаў, у тым ліку ў плане «Барбароса» (канчатковы варыянт выкладзены ў дырэктыве вярхоўнага галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі ад 18.12.1940 г.), які вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР, генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі, «Інструкцыі пра асобныя вобласці» да дырэктывы № 21 плана «Барбароса» (13.3.1941 г.), дырэктыве па кіраўніцтве эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях і інш. Гэтыя дакументы намецілі практычныя мерапрыемствы па ўстанаўленні акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі, якая падлягала захопу. У далейшым яны дапаўняліся загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванні, гвалтаванне і забойствы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны. Гэтыя дакументы поўнасцю развязалі рукі гітлераўскім катам і забойцам, вызваляючы іх ад усялякай адказнасці за здзейсненыя злачынствы.

У.І.Лемяшонак.

Дакументы сведчаць


З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

7 ліпеня 1941 г.

1.Аб прызначэнні бургамістраў у валасцях

1.На пасады бургамістраў у першую чаргу павінны быць прызначаны палітычна надзейныя і кваліфікаваныя асобы, па магчымасці з ліку беларусаў.

Наследие слуцкого края



ANORDNUNG
über Sperrstunden

Mit Zustimmung des Reichskommissars für das Ostland setze ich die Sperrzeit im Generalbezirk Weissruthenien in den Städten auf die Zeit vom Dunkelwerden bis zum Hellwerden fest.

Zivilpersonen, die während der Sperrzeit ohne zwingende Gründe auf der Straße betroffen werden, werden sofort standgerichtlich erschossen.

Für die Besucher von Theatern und sonstigen kulturellen Veranstaltungen ergeht eine Sonderregelung.

Diese Anordnung tritt am 1. November 1941 in Kraft.

Der Generalkommissar für Weissruthenien
WILHELM KUBE

РАСПАРАДЖЭНЬНЕ
аб агранічэньні хаджэньня
вячэрнюю парою

Са згоды Дзяржаўнага Камісара Усходняга Абшару пастанаўляю агранічыць час хаджэньня ў гарадах Гэнэральнай Акругі Беларусі ад сьцямненьня да разьвідненьня.

Асобы цывільныя, якія ў агранічэньні часе без уважлівай прычыны будуць спатканыя на вуліцы, будуць зараз-жа на месцы расстраляны.

Для адведваючых тэатр і іншыя культурныя ўстановы выйдзе асобнае распараджэньне.

Гэта распараджэньне ўваходзіць у сілу ад 1 лістапада 1941 г.

Генэральны Камісар Беларусі
ВІЛЬГЕЛЬМ КУБЭ

ROZPORZĄDZENIE
o ograniczeniu ruchu cywilnego w czasie od początku zmierzchu do świtania

Za zgodą Komisarza Rzeszy Ostlandu zarządzam ograniczenie czasu chodzenia po miastach Generalnego Okręgu Białorusi od zmierzchu do świtania.

Osoby cywilne, które w zabronionym czasie spotka się chodzące bez powodu na ulicy, będą natychmiast doraźnym sądem rozstrzelane.

Dla odwiedzających teatr i inne kulturalne imprezy wydane zostanie odrębne uregulowanie.

Rozporządzenie wchodzi w życie z dniem 1 listopada 1941 r.

Generalny Komisarz Białorusi
WILHELM KUBE

РАСПОРЯЖЕНИЕ
об ограничением хождении вечерной порой

С согласия Государственного Комиссара Восточной Территории постановляю:

Ограничить время хождения в городах Генерального Округа Белоруссии от вечерних сумерек до рассвета.

Лица гражданские, которые в ограниченное время без уважительной причины будут встречены на улице, будут сейчас же Военным Судом расстреляны.

Для посещающих театр и другие культурные учреждения выйдет особый приказ.

Это распоряжение входит в силу с 1-го ноября 1941 г.

Генеральный Комиссар Белоруссии
ВИЛЬГЕЛЬМ КУБЕ

Распараджэньне акупацыйных улад.

2.Бургамістр з'яўляецца прадстаўніком воласці.

3.Ён з'яўляецца службовым начальнікам над усімі асобамі, якія працавалі ў воласці. Ён прымае іх і звальняе з працы.

4.Бургамістр нясе адказнасць за фінансавыя справы воласці.

5.Усе жыхары, якія пражываюць у воласці паводле становішча на 21.6.1941 г., павінны быць нанава ўлічаны і перапісаны бургамістрам.

6.Бургамістры неадкладна павінны паклапаціцца аб тым, каб усе жыхары былі забяспечаны адпаведнымі дакументамі, якія засведчваюць іх асобу: прозвішча і імя, час і месца нараджэння, месца жыхарства, склад сям'і, прафесія, прабыванне і род заняткаў, сацыяльнае паходжанне, веравызнанне, нацыянальнасць, падданства.

7.Бургамістры прыцягваюць да адказнасці вінаватых за ўчыненыя акты сабатажу ў даверанай ім воласці. Яны павінны ўсімі сродкамі прадухіляць акты сабатажу. У іх абавязкі ўваходзіць ахова прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі воласці, асабліва жыццёва важных.

Наследие слуцкого края

8.Бургамістраў і іх намеснікаў у населеных пунктах, якія налічваюць да 20 000 жыхароў, прызначае мясцовы камендант, а ў населеных пунктах, у якіх звыш 20 000 жыхароў, прызначае камендант палявой камендатуры.

II Аб забароне пакідання кватэр ў начны час

1.У перыяд з 21.00 да 5.00 раніцы насельніцтву забараняецца пакідаць кватэры.

2.Выключэнні дапускаюцца па пісьмовым дазволе мясцовага каменданта для асоб, якія працуюць у начны час на жыццёва важных прадпрыемствах, дактарамі, акушэркамі, на машынах хуткай дапамогі.

3.Парушальнікі будуць найстражэйшым чынам наказывацца мясцовымі камендантамі. Як дапаможнымі мерамі пакарання могуць быць часовы арышт з абмежаваным харчаваннем, насільнае затрыманне і прыцягненне да працы.

III.Адметныя знакі для яўрэяў і яўрэяк

1.Усе яўрэі і яўрэйкі, якія знаходзяцца на занятай рускай тэрыторыі і дасягнуўшыя 10-гадовага ўзросту, неадкладна абавязаны насіць на правым рукаве верхняга адзення і сукенкі белую паласу шырынёй да 10 см з намаляванай на ёй сіянісцкай зоркай або жоўтую павязку шырынёй да 10 см.

2.Такімі павязкамі забяспечваюць сябе самі яўрэі і яўрэйкі.

3. Яўрэям катэгарычна забараняецца вітаць.

Парушальнікі будуць найстражэйшым чынам каралцца мясцовым камендантам па месцы жыхарства.

VIII. Стварэнне дапаможнай паліцыі

1. Для правядзення паліцэйскіх мер бяспекі бургамістрам даручана прыцягнуць у дапаможную паліцыю надзейных «фольксдойча», беларусаў і, калі такіх няма, тады палякаў і выкарыстоўваць гэту паліцыю са згоды з начальнікамі каманд паліцыі бяспекі.

2. Служачыя дапаможнай паліцыі, якія працуюць у цесным кантакце з мясцовымі айнзатцкамандамі паліцыі бяспекі і СД, могуць падтрымліваць сувязь толькі з мясцовымі начальнікамі паліцыі бяспечнасці і СД або прызначанымі імі органамі.

3. Служачыя дапаможнай паліцыі носяць белую нарукаўную павязку з надпісам «Дапаможная паліцыя».

4. Мясцовыя камендатуры да 20-га чысла кожнага месяца, а ўпершыню да 20.7.1941 года, паведамляюць пра колькасць і ўзбраенні дапаможнай паліцыі.

Камандуючы тылам групы армій «Цэнтр» фон Шэнкендорф, генерал пяхоты

Пераклад з нямецкай.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1—2, 4—5.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

ЗАГАД НАСЕЛЬНІЦТВУ

В последнее время начали повторяться случаи саботажа на железной дороге и железно-дор.станциях. При повторении случаев на бесперебойную работу железной дороги, они будут строжайшим образом пресечены. В случае необнаружения саботажников будет привлечена к ответу и штрафу та ближайшая деревня, которая будет расположена к месту происшествия.

Приказ старостам деревень, находящихся в непосредственной близости от жел.-дор.

А. 1. Всех жителей деревни зарегистрировать.

Списки жителей сдать в комендатуру, при отсутствии таковой, сдать в ближайшую деревню, где есть комендатура.

2. П р о ж и в а н и е посторонних крестьян СТРОГО ВОСПРЕЩАЕТСЯ. Обо всех случаях немедленно сообщать в комендатуру.

3.Посторонних (чужих) людей немедленно приводить или сообщать в комендатуру.

Б. Староста обязан оповестить население о нижеследующем:

1. Каждый крестьянин, подошедший меньше чем на 200 м к железной дороге, будет без предупреждения РАССТРЕЛЯН.

2. Всякая езда и движение в 200 м зоне ВОСПРЕЩАЕТСЯ.

3. Всякие полевые работы в зоне 200 м от жел. дороги ВОСПРЕЩАЮТСЯ.

Наследие слуцкого края

В. 1. Проход в 200 м зоне и по путям разрешен только людям, работающим в Германской армии и имеющим особые повязки на рукавах с надписью и печатью, что эти люди принадлежат к Железнодорожному Корпусу.

Командующий немецкими войсками.

Фонды Слуцкага краязнаўчага музея.

АБ'ЯВА НЯМЕЦКІХ АКУПАЦЫЙНЫХ УЛАД АБ ВЯРБОЎЦЫ НАСЕЛЬНІЦТВА НА РАБОТУ Ў ГЕРМАНІЮ

15 студзеня 1942 г.

Великая Германия дает русскому и белорусскому населению, независимо от пола, в возрасте от 17 до 40 лет работу и хлеб. За труд в Германии предоставляется: продовольствие, квартиры и заработная плата в достаточном размере. Кроме этого, за особенно хорошее исполнение работы предусмотрена добавка в виде табака, напитков и т.д.

Остающиеся на их родине семьи будут обеспечиваться по их заявлению и под немецким надзором городскими или волостными управлениями.

Желающие! Немедленно явитесь для приема на работу в Германию, ведь это в вашем собственном интересе.

МЕСТО ЯВКИ: Мужское и женское население города может явиться в учреждение труда бургомистра города.

Женское сельское население, которое желает в Германии поступить на сельскую работу, может явиться в управление бургомистра.

Надзиратель ВЕЙГАНТ

Генерал-лейтенант

Фонды Слуцкага краязнаўчага музея.

НАЙБОЛЬШ БУЙНЫЯ КАРНЫЯ АПЕРАЦЫІ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ СУПРАЦЬ ПАРТЫЗАН І МІРНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА НА СЛУЧЧЫНЕ

Назва аперацыі ці яе нумар	Час і месца правядзення аперацыі	Назва воінскіх часцей, якія праводзілі аперацыі. Колькасць знішчаных савецкіх грамадзян
№ 6 (у некаторых дакументах № 10)	Жнівень 1942 г. Любанскі, Слуцкі раёны Мінскай, Бабруйскі раён Магілёўскай вобл.	3 батальёны 203-й ахоўнай дывізіі
«Свята ўраджаю-I»	Студзень 1943 г. Пухавіцкі, Слуцкі раёны Мінскай вобл.	11 нямецкіх паліцэйскіх і ахоўных батальёнаў, батальён СС Дзірленвангера. Забіта больш за 2 тыс. чалавек, пагнана ў Германію больш за 1 тыс. чалавек
«Свята ўраджаю-II»	Студзень—люты 1943 г. Капыльскі, Слуцкі, Уздзенскі раёны Мінскай вобл.	13-ы нямецкі паліцэйскі полк СС, айнзатцгрупа Вільке. У ходзе аперацыі забіта 2325 чалавек, каля 300 чалавек захоплена для адгону на фашысцкую катаргу
«Люты»	Люты 1943 г. Лунінецкі, Ляхавіцкі раёны Брэсцкай вобл., Жыткавіцкі раён Гомельскай вобл., Слуцкі, Салігорскі, Капыльскі, Нясвіжскі раёны Мінскай вобл.	3 нямецкія паліцэйскія палкі СС, 4 ахоўныя батальёны, батальён СС Дзірлевангера. Каля 13тыс. савецкіх грамадзян расстралялі і па-зверску закатавалі фашысты ў ходзе аперацыі. Захапілі каля 17 тыс. галоў жывёлы, разбурылі і спалілі 1900 хат

Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944). Мн., 1995. С. 359, 365—366.

Наследие слуцкого края

НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ СЛУЦКАГА РАЁНА, ЗНІШЧАНЫЯ РАЗАМ З ЖЫХАРАМІ І АДНОЎЛЕНЫЯ ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Назва населенага пункта	Колькасць напярэдадні вайны		Колькасць знішчаных		Дата знішчэння
	двароў	насельніцтва	двароў	насельніцтва	
Адамова	52	223	52	213	люты 1943
Чырвоная Старонка	29	111	24	75	люты 1943
Палікараўка	38	124	38	96	люты 1943
Руднаўка	13	60	13	54	люты 1943

НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ СЛУЦКАГА РАЁНА, ЗНІШЧАНЫЯ З ЧАСТКАЙ НАСЕЛЬНІЦТВА І АДРОДЖАНЫЯ ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Назва населенага пункта	Колькасць напярэдадні вайны		Колькасць знішчаных		Дата знішчэння
	двароў	насельніцтва	двароў	насельніцтва	
Апаліны	48	192	48	31	сакавік 1943
Баравая	17	68	16	7	красавік 1943
Вараб'ёва	20	217	20	33	студзень 1943
Вярбішчына	6	30	6	7	люты 1943
Гольчыцы	201	804	115	24	верасень 1943
Гутніца	27	110	27	6	красавік 1943
Жылін Брод	11	44	11	5	ліпень 1942
Каліта	41	178	36	2	чэрвень 1941
Кошышча	9	35	9	1	снежань 1943
Навінкі	22	89	22	1	люты 1943
Ніва	73	238	72	1	красавік 1943
Новы Гуткоў	52	223	52	2	люты 1944
Падстарэва	7	35	7	6	люты 1943
Паўлаўка	28	134	28	31	люты 1943
Пільня	17	68	17	6	люты 1943
Рудня	70	279	68	25	люты 1943
Стары Гуткоў	41	188	39	2	чэрвень 1941
Старэва	28	131	28	43	люты 1943
Строхава	50	195	50	2	сакавік 1943
Хорашава	23	94	22	–	люты 1943

Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941–1944). Мн., 1995. С. 40–279.

Сёстры Хатыні

Населеныя пункты Слуцкага раёна, спаленыя разам з жыхарамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і не адроджаныя ў мірны час

Беразінец, Першамайскі сельсавет. Вёска знаходзілася за 1 км на поўнач ад в. Жылін Брод. Да пачатку вайны жылі 37 чалавек. 23 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 22 жыхары, вёску (9 двароў) спалілі. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

Гондарава, Амговіцкі сельсавет. Знаходзілася за 3 км на поўнач ад в. Ціхань. Да пачатку вайны жылі 76 чалавек. 23 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 60 жыхароў, вёску (16 двароў) спалілі. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

Задоўба, Першамайскі сельсавет. Пасёлак знаходзіўся за 3 км на поўнач ад в. Жылін Брод. Да пачатку вайны жылі 9 чалавек. 23 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 9 яе жыхароў, пасёлак (4 двары) спалілі. Увекавечаны ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

Захацінава, Гацукоўскі сельсавет. Да пачатку вайны жылі 54 чалавекі. У лютым 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі

Наследие слуцкого края



На гэтым месцы была в. Крушнік.

загубілі 2 яе жыхароў, вёску (14 двароў) спалілі.

Кабыліна Балота, Першамайскі сельсавет. Да пачатку вайны жылі 6 чалавек. 22 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 65 жыхароў, хутар (2 двары) спалілі.

Краснае, Першамайскі сельсавет. Да пачатку вайны жылі 17 чалавек. 23 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 5 жыхароў, пасёлак (6 двароў) спалілі.

Крушнік, Першамайскі сельсавет. Вёска знаходзілася за 2 км на поўдзень ад в. Палікараўка. Да вайны жыў 41 чалавек. 23 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 15 жыхароў, вёску (14 двароў) спалілі.

Лазараў Бор, Амговіцкі сельсавет. Да пачатку вайны жылі 32 чалавекі. 23 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 20 жыхароў, вёску (8 двароў) спалілі.

Лявішча, Амговіцкі сельсавет. Вёска знаходзілася за 1,5 км на паўднёвы захад ад в. Чырвоная Старонка. Да пачатку вайны жылі 63 чалавекі. 23 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 50 жыхароў, вёску (12 двароў) спалілі. У 1982 г. на месцы былой вёскі пастаўлена стэла. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

Перавалока, Покрашаўскі сельсавет. Да пачатку вайны жылі 30 чалавек. 23 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 5 жыхароў, вёску (7 двароў) спалілі.

Пераходы, Першамайскі сельсавет. Вёска знаходзілася за 1,5 км на поўдзень ад в. Жылін Брод. Да пачатку вайны жыў 131 чалавек. 23 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 116 жыхароў, вёску (26 двароў) спалілі. На месцы былой вёскі ў 1979 г. пастаўлены помнік — на насыпным невысокім кургане скульптура жанчыны ў жалобе. На месцы былых хат — помнікі з прозвішчамі загінуўшых. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

З успамінаў Паўла Антонавіча Жураўскага, былога жыхара в. Пераходы

23 лютага 1943 г. на досвітку, калі людзі яшчэ спалі, немцы ўрываліся ў кожны дом, расстрэльвалі сялян, а затым падпальвалі будынак. Усё трашчала і палыхала, чуліся енкі. Так загінулі і мае дзеці, а старэйшую дачушку карнікі жывой кінулі ў агонь. Так знішчылі яны ўсю вёску. Жудасна, і цяпер часта паўстае перад вачыма тая страшэнная карціна...

З успамінаў Сцепаніды Мікалаеўны Дардынскай, былой жыхаркі в. Пераходы

...У мяне было шасцёра дзяцей, іх усіх немцы расстралялі. У гэты страшэнны час на руках я трымала самага меньшанькага. Куля пранізала дзіцятка і параніла мяне ў плячо. Ад жаху, болю рухнула я на падлогу і страціла прытомнасць. Фашысты запалілі хату. Апрытомнела я, калі агонь ужо

Наследие слуцкого края

бушаваў ва ўсю. Неяк мне ўдалося выпаўзці. Твар і валасы абгарэлі, але, сабраўшы ўсе сілы, дапаўзла да лесу. Там мяне ўжо заўважылі свае людзі і падабралі.

Фадзееўка, Першамайскі сельсавет. Знаходзілася за 1 км на ўсход ад в. Палікараўка. Да пачатку вайны жылі 33 чалавекі. 23 лютага 1943 г. фашысцкія карнікі загубілі 9 жыхароў, вёску (11 двароў) спалілі. У 1975 г. на месцы былой вёскі пастаўлена стэла.

З прамовы А.Н.Цыбулькі на антыфашысцкім мітынгу

Аляксей Нічыпаравіч Цыбулька нарадзіўся ў 1907 г. у в. Белічы. Быў першым сакратаром Беліцкай камсамольскай ячэйкі. Працаваў настаўнікам, завучам у Слуцку. Яму прысвоена званне «Выдатнік народнай асветы». Памёр у 1986 г.

11 кастрычніка 1942 г. у Маскве адбыўся ўсесаюзны антыфашысцкі мітынг настаўнікаў. Ад Беларусі выступаў А.Н.Цыбулька. Быў прыняты зварот да ўсіх настаўнікаў свету — актыўна змагацца з фашысцкімі захопнікамі, уступаць у партызанскія атрады, не даваць фашыстам спакою ні днём, ні ноччу. Сярод іншых стаяў і подпіс нашага земляка.

Тэкст прамовы А.Н.Цыбулькі быў змешчаны 13 кастрычніка 1942 г. ва «Учительской газете». Мы друкуем яго ў скарачэнні ў перакладзе на беларускую мову.

Дарагія таварышы!

Я — беларускі настаўнік. Гневам і нянавісцю напаўняецца маё сэрца, калі я думаю аб тым, што брудны бот нямецкага фашыста ганьбіць зямлю роднай Беларусі.

Незлічоныя пакуты прынеслі майму народу гітлераўскія разбойнікі. Разбурэнні, смерць пануюць у раней прыгожых і квітнеючых гарадах Беларусі. Спалены і апустошаны вёскі, горкі палын расце на палях. Тысячы людзей расстраляны, павешаны. Тысячы вывезены ў фашысцкую Германію на рабскую, катаржную працу.

Фашысцкія вандалы глумяцца над рэліквіямі беларускай нацыянальнай культуры. Яны варварскі разбурылі і спалілі лепшыя нашы музеі, бібліятэкі, разрабавалі інстытуты, ператварылі школы ў казармы для салдат, у канюшні для коней. Народ ненавідзіць фашысцкіх захопнікаў. Ён ніколі не скарыцца акупантам і па-геройску змагаецца з імі, не баючыся пагроз, насілля, тэрору.

Я ганаруся тым, што ў гэтай мужнай барацьбе разам з усім народам актыўна ўдзельнічаюць беларускія настаўнікі. Тысячы іх партызаняць у лясах Беларусі, многія з'яўляюцца кіраўнікамі партызанскіх атрадаў і сваімі смелымі раптоўнымі налётамі наводзяць паніку на нямецкія гарнізоны. Настаўнікі актыўна працуюць сярод насельніцтва, выкрываючы хлуслівыя абяцанні гітлераўскіх «правіцеляў». Настаўнікі расказваюць народу праўду аб барацьбе Чырвонай арміі з ворагамі, умацоўваюць у масах гарачую веру ў хуткае вызваленне ад крывавых акупантаў.

Гітлераўцы адчуваюць сілу беларускага настаўніцтва, яны стараюцца схіліць яго на свой бок, запрашаюць настаўнікаў на работу, зрабілі спробу адкрыць некалькі школ, але з гэтага нічога не выйшла.

Страціўшы надзею ў магчымасць ператварыць настаўнікаў у сваіх прыслужнікаў, фашысты спрабуюць запалохаць іх зверскімі рэпрэсіямі...

Але ніякія пакуты і сама смерць не спыняюць герояў-настаўнікаў у іх барацьбе з ненавісным ворагам.

Няхай мой голас пачуюць настаўнікі-партызаны, якія мужна змагаюцца ў тыле ворага. Таварышы, яшчэ больш бязлітасна знішчайце фашысцкіх звяроў! Узнімайце ўвесь народ на свяшчэнную барацьбу. Верце, не далёка час вызвалення нашай роднай Беларусі ад праклятага немца...

Дакументы сведчаць

З АКТА АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ АКУПАНТАЎ У СЛУЦКУ І СЛУЦКІМ РАЁНЕ

29 ліпеня 1943 г.

Мы, нижеподписавшиеся, представитель партизанского отряда тов. Пичулевский Николай Андреевич бригады им. Чкалова и граждане гор. Слуцка Крутелев Максим Тимофеевич, Личман Борис Афанасьевич, Лимина Александра Александровна, Поддымова Александра Алекс. составили настоящий акт в нижеследующем:

Наследие слуцкого края



Месца масавых расстрэлаў вязняў Слуцкага лагера ваеннапалонных.

Немецко-фашистские мерзавцы с первого дня своего кровавого хозяйничания на временно оккупированной ими территории начали производить кровавую расправу и произвол над мирным населением нашей Белорусской Советской Социалистической Республики. За период своего хозяйничания гитлеровские бандиты зверски замучили и расстреляли сотни и тысячи ни в чем не виновных советских граждан — стариков и детей...

...Немецко-фашистские бандиты за период с 26 июня 1941 г. по 28 июля 1943 г. в г. Слуцке и районе произвели следующее:

1. Сожжено живьем военнопленных — 6200 человек.

2. Расстреляно и повешено мужчин и женщин, стариков и детей — 14 350 человек.

3. Угнано[1] в рабство в Германию с города и района — 41 000 человек.

Отправка в рабство производилась насильственным путем через органы жандармерии и полиции. Первым приемным пунктом несчастных граждан, отправляемых в фашистскую неволю, была Слуцкая тюрьма. Здесь невольники проходили карантин... Затем их отправляли на автомашинах под охраной в Минск для погрузки в телячьи вагоны.

4. Так, например, только 7 и 8 февраля 1943 г. сожжено живьем 2340 человек и расстреляно 1800 человек. Таким образом только за два дня уничтожено фашистскими катами 4140 человек. Из них мужчин 1000, женщин 1830, стариков 760, детей 550 чел.

Во время этого злодейского акта сожжено и разрушено 124 жилых дома в северо-западной части города.

5. 6 июля 1943 г. совершенно невинную женщину, жительницу гор. Слуцка Усович Татьяну Константиновну и ее 6-летнего сына Леонтия следователь Слуцкой жандармерии Рунчик и его переводчик негодяй Бодеев вывезли на автомашине за город в район дер. Журово и там их подвергли чудовищным пыткам, а потом убили. Татьяне Усович с левой руки сорвали 4 ногтя, вырвали почти все волосы, затем выстрелили в живот. Мальчику ударом палки переломали правую ногу, а затем отрезали уши в присутствии матери, ожидая ее признания... Изуродованных их бросили на поле, через 2 дня приехали фашистские мерзавцы и зарыли трупы.

6. Тысячи крестьян других районов, приезжавших на базар и по другим делам в г. Слуцк, вылавливались жандармерией и полицией якобы партизаны, заключались в Слуцкую тюрьму, а затем вывозились за город на автомашине и расстреливались.

7. Шеф МТС (ныне ремонтные мастерские) избивает рабочих палкой и угрожает отослать на работы в Германию. 14 апреля 1943 г. он избил Новикова Степана, затем ранил в живот. 19 апреля Новиков скончался.

[1]В документе «отослано».

Наследие слуцкого края

8. Шеф мебельного комбината (ныне его владелец) избивает рабочих палкой, а затем натравливает свою собаку...

9. Шеф электростанции избивает палкой жителей города за несвоевременный взнос платы за пользование электроэнергией. 26 июля с.г. была избита до потери сознания гражданка г. Слуцка Шарамеьева Евдокия на ее же квартире за то, что она пользовалась электроутюгом, не имея на это немецкой санкции.

Таким образом за этот период гитлеровские бандиты по гор. Слуцку и району уничтожили 50 процентов жилых и общественных построек, убили и сожгли живьем 24 690 чел., из них стариков 3400, детей 4896 чел., угнали на каторгу в Германию из г. Слуцка и Слуцкого района 41 000 чел., заключили в тюрьму и концлагери 11 500 чел.

В виду производства массового убийства и сожжения тысяч советских граждан приложить подробные списки не представляется возможным.

В чем и составили настоящий акт.

Подписи.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3968. Воп. 1. Спр. 3. Л. 21–22.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

З АКТАЎ КАМІСІІ ПА ЎСТАНАЎЛЕННІ І РАССЛЕДАВАННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У СЛУЦКУ

18 верасня 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе: председателя комиссии – начальника Слуцкого горотдела НКВД Михалькевича Каспира Бонифатьевича; заместителя председателя горсовета депутатов трудящихся гор. Слуцка Черного Алексея Васильевича; врача-хирурга Слуцкого горздрава Мурашко Игнатия Прохоровича; сотрудника Минской областной чрезвычайной комиссии Утенкова Бориса Митрофановича; ст. землеустроителя Слуцкого райзо Плешевича Николая Петровича составили настоящий акт на нижеследующее:

Нами обследовано место массового расстрела и захоронения немцами советских граждан вблизи военного городка гор. Слуцка, где обнаружены две большие ямы-могилы размерами: первая – длина 18 метров, ширина 3 метра; вторая – длина 10 метров, ширина 4 метра.

Вскрытиями ям-могил установлено: ямы полностью заполнены человеческими трупами и скелетами. Врачебно-медицинской комиссией установлено:

– трупы захоронены в 1942–44 гг.:

– среди общей массы трупов есть трупы детей и женщин;

– у большинства трупов в черепах имеются сквозные пулевые отверстия. Все трупы в обеих ямах-могилах расположены в хаотическом состоянии.

Исходя из этого, комиссия пришла к выводу, что все захороненные были расстреляны.

Для определения численности расстрелянных и захороненных нами была определена глубина и кубатура обеих ям-могил, исходя из расчета 5 трупов на кубометр, подсчитано: в двух ямах-могилах захоронено 1410 расстрелянных немцами советских граждан.

На что составлен настоящий акт.

Зав. спецчастью Бобруйского облисполкома (Л.Алферова)

21.VI-48 г.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 845. Воп. 1. Спр. 60. Л. 38.

* * *

19 верасня 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе: председателя комисии: начальника Слуцкого гор. отдела НКВД Михалькевича Каспира Бонифатовича;

Члены: 1. Зам. председателя городского Совета депутатов трудящихся гор. Слуцка – Черного Алексея Васильевича, 2. Врача-хирурга Слуцкого Горздрава – Мурашко Игнатия Прохоровича, 3. Сотрудника Минской областной Чрезвычайной Комиссии Утенкова Бориса Митрофановича, 4. Ст. землеустроителя Слуцкого Райзо – Плешевеня Николая Петровича составили настоящий акт на нижеследующее: Нами обследована окрестность бывшего лагеря военнопленных, который устроили фашисты в расположении военного городка гор. Слуцка. Обследованием установлены две большие ямы-могилы размерами: 1-я – длина 160 метров, ширина 4 метра, 2-я – длина 53 метра, ширина 4 метра. Обе ямы-могилы вырыты в бывшем тире для стрельбы в 200 метрах от военного городка.

Наследие слуцкого края



Помнік загінуўшым ваеннапалонным на гарадскіх могілках.

Для установления численности захороненных нами вскрыты в нескольких местах обе ямы-могилы, в которых по всей площади обнаружены человеческие скелеты в несколько рядов. Врачебно-медицинской экспертизой установлено: трупы захоронены в 1941—1943 гг.

Численность захороненных комиссия установила исходя из рассчёта на 1 куб/м пять трупов. Таким образом в двух общих ямах-могилах захоронено 12 780 трупов, из которых в первой яме-могиле размерами 160 х 4 х 3 — 9600 трупов, во второй яме-могиле размерами 53 х 4 х 3 — 3180 трупов.

Все захороненные умерли в лагере военнопленных в гор. Слуцке от голода и эпидемии сыпного тифа.

Кроме этого, комиссией установлено: в 1942 г. немцы внутри лагеря сожгли барак с больными сыпным тифом русскими военнопленными. В бараке помещалось около 600 человек.

Всего в лагере военнопленных гор. Слуцка за период с 1941—1944 гг. было замучено, расстреляно, умерло с голода и эпидемии свыше 14 000 человек, что подтверждается показаниями свидетелей.

На что составлен настоящий акт, к акту прилагаются показания свидетелей, план местности и расположение могил.

Председатель комиссии:

Члены: Черный, Мурашко, Утенков, Плешевеня

Настоящий акт заверяем:

Председатель Гор. Совета Депутатов трудящихся

Отв. Секретарь.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 845. Воп. 1. Спр. 60. Л. 40.

* * *

19 верасня 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе: председателя комиссии — начальника Слуцкого горотдела НКВД Михалькевича Каспира Бонифатовича; зам. председателя городского Совета депутатов трудящихся Черного Алексея Васильевича; врача-хирурга Слуцкого горздрава Мурашко Игнатия Прохоровича; сотрудника Минской областной чрезвычайной комиссии Утенкова Бориса Митрофановича; ст. землеустроителя Слуцкого райзо Плешевеня Николая Петровича составили настоящий акт на нижеследующее:

Нами обследовано место массового расстрела немцами советских граждан в г. Слуцке по ул. Монахова в саду больничного городка.

При обследовании нами обнаружено пять мест захоронения расстрелянных советских граждан, из них две ямы-могилы размерами: первая — длина 20 метров, ширина 3 метра; вторая — длина 10 метров, ширина — 2 метра; три остальных места захоронения являются зигзагообразными щелями, предназначенными для укрытия от воздушных налетов. Размерами: первая — длина 20 метров, ширина 1 метр; вторая — длина 15 метров, ширина 1 метр, третья — длина 9 метров, ширина 1 метр.

Раскрытием ям-могил и щелей комиссией установлено:

Глубина ям-могил равна 2 метрам. Ямы-могилы заполнены трупами на 1,5 метра. Глубина щелей равна 1,75 метра, щели заполнены трупами на 1 метр по всей длине.

Численность захороненных в двух ямах-могилах равна 710 трупам. В щелях захоронено 130 трупов.

Врачебно-медицинской экспертизой установлено: трупы в ямах-могилах и щелях захоронены в 1941 году в хаотическом порядке. У большинства трупов в черепе имеются сквозные пулевые отверстия, следовательно, все захороненные были расстреляны из огнестрельного оружия.

Наследие слуцкого края

Комиссией установлено: всего в саду больничного городка немцами расстреляно 840 советских граждан, что подтверждается вскрытием ям-могил и щелей, расположенных в саду, и показанием свидетелей...

Председатель комиссии: Михалькевич

Члены: Черный, Мурашко, Утенков, Плешевеня

Верно: зав. спецчастью Бобруйского облисполкома (Л.А.Алферова)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 845. Воп. 1. Спр. 60. Л. 39.

Падрыхтавала В.С.Відлога.

ЗАПІСКА НЕВЯДОМАЙ 19-ГАДОВАЙ ДЗЯЎЧЫНЫ СА СЛУЦКА, НАПІСАНАЯ Ў 1944 ГОДЗЕ*

«Бора, нас ноччу заб'юць, паганыя адчуваюць, што ім хутка канец. Я ім у твар сказала, што наша возьме. Бора, ты мяне прабач, што я цябе агарчыла. Ведаеш, не заўсёды так гаворыш і робіш, як хочацца, а я цябе так КАХАЮ, што не ўмею сказаць. Бора, я цяпер прытулілася да цябе, і нічога мяне не палохае, хай вядуць. Учора, калі вельмі білі, я пра сябе паўтарала: «Боранька, я ім нічога не сказала — не хачу, каб яны чулі тваё імя. Боранька, ты бывай, дзякуй табе за ўсё».

З АКТА РАЁННАЙ КАМІСІІ ПА ЎСТАНАЎЛЕННІ І РАССЛЕДАВАННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ВЁСЦЫ ЛЕНІНА СЛУЦКАГА РАЁНА

27 верасня 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе:

Председатель комисии: начальник Слуцкого ГО НКВД Михалькевич Каспир Бонифатович.

Члены: 1. Зам. пред. Райсовета депутатов трудящихся Воробей Адам Антонович.

2. Врач-хирург Слуцкого Горздрава Мурашко Игнатий Прохорович.

3. Землеустроитель Слуцкого райземотряда Голуб Юрий Иванович.

Составили настоящий акт на нижеследующее:

Нами обследована яма-могила, расположенная в Глинищах, рядом с русским кладбищем, м-ко Ленино Слуцкого р-на.

Обследованием установлена одна яма-могила размером длина 7 метров, ширина 4 метра.

Для установления численности захороненных нами была вскрыта яма-могила, в которой были обнаружены неразложившиеся человеческие трупы.

Врачебно-медицинской экспертизой установлено: трупы захоронены в 1942 г.

Численность захороненных комиссия установила исходя из расчета 1 куб. метр на 5 трупов. Таким образом в яме-могиле 140 трупов.

Яма-могила 7 х 4 х 1 х 5 = 140 трупов.

Среди расстрелянных обнаружены трупы женщин, детей и мужчин. У большинства трупов в черепе имеется сквозное пулевое отверстие. Следовательно, все захороненные были расстреляны из огнестрельного оружия.

На что составлен настоящий акт. К акту прилагаются показания свидетелей, план местности и расположения могил...

Настоящий акт заверяем: Пред. Слуцкого райсовета депутатов трудящихся Розов

Отв. Секретарь Финьке

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 845. Воп. 1. Спр. 60. Л. 43.

З АКТА РАЁННАЙ КАМІСІІ ПА ЎСТАНАЎЛЕННІ І РАССЛЕДАВАННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ІВАНСКААГАРОДНІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА СЛУЦКАГА РАЁНА

29 верасня 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе: председатель комиссии: начальник Слуцкого ГО НКВД — Михалькевич Каспир Бонифатович;

*Запіска была напісана на лістку, вырваным са сшытка. Упершыню была надрукавана ў газеце «Комсомольская правда» 1 студзеня 1945 г. Потым у зборніку «Гавораць загінуўшыя героі».

Наследие слуцкого края

Члены: 1. Зам. пред. Райсовета Депутатов Трудящихся — Воробей Адам Антонович. 2. Врач-хирург Слуцкого Горздрава — Мурашко Игнатий Прохорович. 3. Землеустроитель Слуцкого Райземотдела — Голуб Юрий Иванович.

Составили настоящий акт на нижеследующее:

Нами обследовано место массового расстрела немцами советских граждан в урочище «Гороваха» Ив. Огородницкого сельсовета Слуцкого р-на.

Расследованием установлено 7 ям-могил размерами: 1-я — длина 40 метров, ширина 3 метра; 2-я — длина 51 метр, ширина 3 метра; 3-я — длина 25 метров, ширина 6 метров; 5-я — длина 9 метров, ширина 3 метра; 6-я — длина 34 метра, ширина 3 метра; 7-я — длина 26 метров, ширина 3 метра.

Все ямы-могилы вырыты в глинищах и кустарнике на расстоянии от 40 до 150 метров от Екатерининского тракта.

Для установления численности захороненных, нами были вскрыты все ямы-могилы, в которых по всей площади обнаружены человеческие трупы, сложенные в несколько рядов в глубоком залегании.

Врачебно-медицинской экспертизой установлено: трупы захоронены в 1941 – 1942 гг.

Численность захороненных трупов комиссия установила исходя из расчета 1 куб./м на 6 трупов. Таким образом в 7-ми ямах-могилах захоронено 8712 человек, из которых в 1-й яме — 144 чел., 2-й — 1836 трупов, в 3-й — 1800 трупов, в 4-й — 1152 трупа, в 5-й — 324 трупа, в 6-й 1224 трупа, в 7-й — 936 трупов.

Комиссией установлено, что у большинства трупов в черепе имеются сквозные пулевые отверстия. Следовательно, захороненные расстреляны из огнестрельного оружия. Среди общей массы трупов есть трупы женщин и детей.

Кроме этого, в силосной яме дер. Селище немцы сожгли около трех тысяч советских граждан. На месте сожжения остались железные бочки из-под горючего. Таким образом, в районе Ив. Огородницкого с-совета в урочище «Гороваха» и силосной яме немцами расстреляно и сожжено 11 712 советских граждан.

На что составлен настоящий акт. К акту прилагаются показания свидетелей, план местности и расположения ям-могил.

Председатель комиссии:

Члены:

Настоящий акт заверяем: Пред. Райсовета Депутатов Труд. (Розов)

Отв. Секретарь:

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 845. Воп. 1. Спр. 60. Л. 42.

Падрыхтавала В.С.Відлога.

З АКТА РАЁННАЙ КАМІСІІ ПА ЎСТАНАЎЛЕННІ І РАССЛЕДАВАННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЫЛОГА ГРЭСКАГА РАЁНА

30 сакавіка 1945 г.

Мы, нижеподписавшиеся, члены комиссии по расследованию и установлению злодеяний немецко-фашистских захватчиков в их составе председателя комиссии секретаря Гресского РК КП(б)Б т. Заяц Владимир Иванович, зам. председателя комиссии — председатель Гресского райисполкома т. Коледа Анатолий Матвеевич, члены комиссии: начальник Гресского РО НКВД т. Болонов Александр, военком Гресского райвоенкомата т. Кореньков Семен Тарасович, начальник Гресского НКГБ т. Наталов, зав. Гресским Райзо т. Корончик Пётр Федорович, зав. Гресским райздравотделом т. Брановец Степан Иванавич, редактор райгазеты «Сталинец» т. Березовский Тарас Михайлович, ответственный секретарь комиссии, секретарь Гресского Райисполкома т. Тишкевич Александр Александрович составили настоящий акт в нижеследующем:

Материалами следствия комиссия установила: немецко-фашистские захватчики, ворвавшись в Гресский район и подобрав себе из местных предателей сообщников, занялись поголовным истреблением советских граждан разного возраста, пола и национальности. Методы истребления применялись разные: расстрел, повешение, сожжение. Наравне со взрослыми зверскому истреблению подвергались и дети.

Очевидец варварских действий немецко-фашистских захватчиков и их сообщников по истреблению советских граждан показывает:

Наследие слуцкого края

1. Свидетель Юнец Михаил Васильевич из дер. Бор Пуховского с/с рассказывает: В феврале м-це 1942 г. в колхоз «Случь» Поликаровского с/с приехал отряд немцев и полицейских, которые оцепили дер. Рудновку, Вербищина, Переволоку, Адамова, Поликаровку и, собрав жителей этих деревень и загнав их в колхозные постройки, подожгли их вместе с живыми людьми. Из горевших построек слышны были страшные крики горевших мужчин, женщин, стариков и детей. Этот раз немецкими варварами было сожжено живыми 235 чел. советских граждан.

2. Свидетели Острейко Надежда Николаевна дер. Фадеевка Поликаровского с/с рассказывает: В 1942 г. я была арестована немцами вместе со своей семьей и когда нас конвоиры вели в м. Гресск мимо дер. Поликаровка, которая в это время горела, я сама видела как немцы расстреливали стариков и детей и трупы их бросали в огонь, а малых ребятишек заживо на штыках бросали в огонь. Такую же картину я видела в дер. Адамова. В этих двух деревнях было только сожжено немецкими извергами 241 человек советских граждан.

Комиссия считает, что по Гресскому району немецко-фашистскими властями было сожжено ни в чем неповинных советских граждан, стариков, женщин и детей до 585 человек (пятьсот восемьдесят пять) и расстреляно 1124 человека советских граждан.

Немецкими властями Гресского района путем облав насильственно вывезено в немецкое рабство 570 человек советских граждан Гресского района.

Председатель комиссии Заяц

Зам. пред. комиссии Колета

Члены комиссии: Кореньков, Болонов, Наталов, Корончик, Барановец, Березовский.

Отв. секретарь комиссии Титкевич.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 845. Воп. 1. Спр. 60. Л. 24.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

РАШЭННЕ ВЫКАНКОМА СЛУЦКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫНІКАХ РАБОТЫ ПА ЎДАКЛАДНЕННІ ЗВЕСТАК АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ РАЁНА Ў 1941—1944 гг.

3 чэрвеня 1969 г.

Рассмотрев материалы комиссий по уточнению преступлений немецко-фашистских захватчиков на территории района в период Великой Отечественной войны, исполком районного Совета депутатов трудящихся

Р Е Ш А Е Т:

1. Считать установленным, что на территории Слуцкого района немецко-фашистскими захватчиками в 1941—1944 годах:

а) полностью уничтожено деревень — 23, в них дворов — 705, населения — 792 чел., угнано в рабство — 25 человек;

б) частично сожжено — 24 деревни, уничтожено в них населения — 396 человек, угнано в рабство — 90 человек;

Кроме указанного в остальных 177 населенных пунктах сожжено 411 дворов, уничтожено жителей — 293 чел., угнано в рабство — 46 чел.

в) на фронтах Великой Отечественной войны погибло 4498 чел. уроженцев Слуцкого района, в партизанских отрядах и в подполье погибло 250 человек.

Председатель исполкома Райсовета депутатов трудящихся В.Голуб

Секретарь исполкома Райсовета депутатов трудящихся М.Смельчук

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 764. Л.1.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА ІНСТЫТУТА ГІСТОРЫІ ПАРТЫІ ПРЫ ЦК КПБ У.І.ЛЕМЯШОНКА НАМЕСНІКУ ДЫРЭКТАРА ІНСТЫТУТА П.П.ЛІПІЛУ

29 чэрвеня 1969 г.

с 20 по 26 июня 1969 г. выезжал в командировку по уточнению населенных пунктов Минской области, которые были уничтожены немецко-фашистскими оккупантами вместе с их жителями и не восстановлены в настоящее время[1].

[1]Гэты матэрыял рыхтаваўся па заданні першага сакратара ЦК КПБ П.М.Машэрава для падрыхтоўкі мемарыяльнага комплекса Хатынь.

Наследие слуцкого края

... В Слуцком районе таких деревень четыре: Гондарево, Переходы, Березинец, Лявище.

В дер. Гондарево жителей сжигали в каждом доме отдельно. Здесь же на пепелищах они и похоронены. Могилы огорожены и на них родственники поставили памятники с именами погибших. Вот надпись на одном из них: «Довнар Г. 74 г., Довнар М. 72 г., Довнар Л. 26 г., Алиновская М. 37 г., Гутковская Я. 22 г., Гутковская А. 9 г., Алиновский Л. 7 г. В 1943 г. убиты немцами».

На одном из памятников стоит дата 23/1-1943 г. Три могилы без памятников — старые кресты сгнили.

Дер. Левище сожжена вместе с жителями в феврале 1943 г. Имеется памятник, на котором написано: «д. Левище сожжена немецко-фашистскими захватчиками в 1943 г. Одновременно зверски убиты и сожжены семьи: Аранович Казимир Адамович, семья и родные — 10 человек.

Денисевич Мартин Яковлевич, семья — 4 человека.

Яскевич Константин Казимирович, семья 4 человека.

Неглюй Александр, семья 6 человек.

Неглюй Адам Филимонович, семья — 2 человека.

Паходня Юстин Кондронович, семья — 6 человек.

Вечная память погибшим».

Деревня Переходы уничтожена вместе с жителями 23 февраля 1943 г. Жители сжигались отдельно в каждом доме. Здесь же, на месте пепелищ, они и захоронены. Четко выделяются возвышения на местах бывших домов, посреди которых огороженные могилы, на каждой стоит массивный дубовый столб с вырезанными именами погибших.

Вот надпись на одном из них:

«Зверски убиты и сожжены немецко-фашистскими оккупантами:

Тарасевич Елена Бонифацевна

Тарасевич Иван Вас. 53 г.

Тарасевич Михаил Васильевич 42 г.

Тарасевич Софья Ипполитовна 32 г.

Тарасевич Иван Иванович 13 л.

Тарасевич Нина Ивановна 9 л.

Тарасевич Наталья Михайловна 7 год

Тарасевич Шура Михайловна 5 год

Тарасевич Михаил Иванович 3 года

Тарасевич Таня Михайловна 2 года

Трухановская Софья Ивановна 70 год».

В конце бывшей улицы деревни насыпан курган и сооружен обелиск.

Деревня Березинец. На месте бывшей деревни общая огороженная могила с крестом. Метрах в 200-х сейчас находится Слуцкий лесозавод.

...Хорошо сохранившиеся пепелища деревень Переходы Слуцкого района и Хадыка Солигорского района можно было бы использовать для создания мемориального комплекса.

В.Лемешонок.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 771. Л. 147—154.

Крывавы час

З успамінаў Айзіка Майсеевіча Рывіна, 1911 г.н., і Рыгора Юдалевіча Шмярковіча, 1900 г.н., былых жыхароў Слуцка

Мы абодва нарадзіліся і выраслі ў Слуцку. Працавалі ў родным горадзе. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў Слуцку шмат пражывала яўрэяў, дзесьці каля 14 тысяч чалавек. Калі пачалася вайна, эвакуіравацца змаглі нямногія. У першыя дні акупацыі ў горадзе фашыстамі было створана гета, куды была сагнана большая частка яўрэйскага насельніцтва, якое бязлітасна расстрэльвалі. Ужо на трэці дзень акупацыі на базарнай плошчы яны забілі 15 чалавек.

Першы масавы расстрэл яўрэйскага насельніцтва адбыўся ў пачатку кастрычніка 1941 г., калі з так званага «Рабочага гета», што размяшчалася па вуліцы Вала-

Наследие слуцкого края

дарскага, было вывезена ў Гараваху (лясок непадалёку ад Слуцка) звыш 500 чалавек. У асноўным гэта былі старыя, якіх там расстралялі. Вывезлі іх падманным шляхам. Жандары перад тым, як пагрузіць іх на машыны, сказалі, што паедуць капаць за горадам бульбу. І ўсе каштоўныя рэчы (залатыя пярсцёнкі, часы, бранзалеты) яны павінны па спісу здаць на захоўванне. На машыны фашысты ўскінулі рыдлёўкі і кашы. Аднак з гэтай «бульбы» ніхто не вярнуўся.

У канцы гэтага ж месяца адбыўся яшчэ адзін расстрэл. Каля будынка гарадскога Савета фашысты выстраілі цэлую калону накрытых грузавікоў, пачалі хапаць яўрэяў і заганяць на машыны. Іх таксама завезлі ў Гараваху, дзе былі ўжо выкапаны ямы. Людзей раздзелі дагала. Лепшае адзенне адкідвалася асобна ад горшага. У гэты дзень было расстраляна каля 5, а можа і больш 5 тысяч дарослых, старыкоў і дзяцей.

У красавіку 1942 г., гэта было якраз вялікае яўрэйскае свята, з рабочага гета (вул. Валадарскага) пешшу пагналі людзей у лес. Іх было многа, некалькі соцень. Па дарозе многія падалі, іх дабівалі.

Але самы вялікі расстрэл яўрэяў пачаўся ў лютым 1943 г. На гэты раз было знішчана гета, якое размяшчалася ў раёне цяперашняй сярэдняй школы № 6 аж да фабрыкі хімчысткі. Тут знаходзілася звыш 3 тысяч чалавек. Яўрэям, якія маглі працаваць, у дзень выдавалі паёк — 200 грамаў хлеба, а на ўтрыманца ўсяго толькі 50. Мы добра памятаем, што раніцай 8 лютага да варот гета пачалі з'язджацца грузавікі. Фашысты акружылі яго з усіх бакоў. Людзей пачалі выводзіць і, як быдла, заганяць на машыны. Чуўся плач, стогны, стрэлы. На гэты раз іх завезлі ў в. Мохарты, дзе да вайны быў квасільны пункт. У першай палове дня туды было адпраўлена звыш 500 чалавек. А пасля абеду фашысты падпалілі гета. Крывавае зарыва падняло над Слуцкам. Гарэлі дамы разам з людзьмі. А той, хто хацеў выбегчы, пападанне пад кулямётныя чэргі. Тры дні бушаваў пажар. Потым тое, што засталося ад нясчасных, вывезлі на санях у Сёлкі, дзе да вайны была звалка. Людскія косці доўга валяліся аж да вясны. Толькі вясной фашысты распарадзіліся закапаць астанкі людзей.



Помнік на магіле ахвяр фашызму ва ўрочышчы Гараваха.

Для рабочых гета быў устаноўлены так званы «крывавы час». Пасля працы людзей строілі каля банка (на вуліцы Урыцкага) і бягом гналі да вуліцы Валадарскага. Там яны расчышчалі пляцоўку, потым зноў бягом — на насілках з яўрэйскіх могілак неслі помнікі на фундаменты. Людзі не вытрымоўвалі, падалі. На іх пускалі сабак, білі... Вось які «новы парадак» устанавілі карнікі на нашай роднай зямлі.

Дакументы сведчаць

З РАПАРТА КАМІСАРА СЛУЦКАЙ АКРУГІ КАРЛА ГЕНЕРАЛЬНАМУ КАМІСАРУ БЕЛАРУСІ В.КУБЭ АБ ЗНІШЧЭННІ ЯЎРЭЯЎ У СЛУЦКУ

30 кастрычніка 1941 г.

Что касается самого способа проведения акции, я должен с глубоким прискорбием отметить, что он граничил с садизмом. Сам город во время акции представлял собой ужаса-

Наследие слуцкого края

ющую картину. С неописуемой жестокостью, как со стороны немецких полицейских, так и со стороны литовских партизан, еврейское население, а также немало белорусов, были выведены из домов и согнаны в одно место. Повсюду в городе была стрельба, и на некоторых улицах валялись трупы евреев. Мало того, что с еврейским населением, в том числе и с ремесленниками, обращались по-зверски прямо на глазах у белорусского населения, но и само белорусское население точно также подвергалось избиению резиновыми дубинками и прикладами. Вырваться из облавы белорусам удавалось лишь с большим трудом. О еврейской акции я уже не говорю, скорее это напоминало революцию. И сам я, и все мои подчиненные весь день были в гуще происходящего, пытаясь спасти хотя бы некоторых. Неоднократно мне приходилось буквально с пистолетом в руке выгонять с предприятий немецких полицейских и литовских солдат. Такое же задание я дал и своим жандармам, однако из-за сильной стрельбы им часто приходилось покидать улицы, чтобы не попасть под пули. Вообще, вся картина была более чем ужасной. После полудня на улицах, тут и там, осталось множество подвод с лошадьми без хозяев, так что я должен был поручить городским властям немедленно позаботиться о повозках. Как впоследствии было установлено, это были повозки евреев, получивших от вермахта задание возить амуницию. Амуницию попросту вынули из телег и увезли, а о самих повозках забыли.

При расстреле, производившемся за городом, я не присутствовал. Поэтому о жестокостях, имевших место там, я ничего не скажу. Отмечу только, что в течение долгого времени после того, как могилы были засыпаны землей, оставшиеся в живых пытались из них выбраться. Относительно экономического ущерба замечу, что сильнее всего пострадала кожевенная фабрика. Здесь работали 26 специалистов. 15 лучших специалистов из этого числа было расстреляно, 4 других спрыгнули на ходу с машины и скрылись, еще 7 бежали и не были пойманы. Предприятие ныне едва может продолжать работу. В тележной мастерской работало 5 тележников. Из них четверо расстреляны, и теперь поддерживать производство должен один человек. Не осталось таких ремесленников, как столяры, кузнецы и т.д. До сего дня я так и не смог получить полного отчета. Как я уже упомянул вначале, семьи ремесленников следовало пощадить. Однако сегодня, по-видимому, почти во всех семьях не хватает по несколько человек. Отовсюду поступают сообщения, из которых с очевидностью следует, что в одних семьях нет самого ремесленника, в других — нет жены, в третьих отсутствуют дети. Так что почти все семьи пострадали. Сомнительно, чтобы в этих обстоятельствах оставшиеся ремесленники работали с охотой и качество их работы было соответствующим, тем более что их успели жестоко избить. Белорусское население, чье полное доверие мы завоевали, пребывает в растерянности. Хотя люди напуганы и не отваживаются открыто высказывать свое мнение, есть основание полагать, что этот день не забыт. Я считаю, что пройдет еще немало времени, прежде чем мы вернем утраченное доверие населения.

В заключение считаю нужным указать на то обстоятельство, что полицейский батальон в ходе акции занимался неслыханным грабежом, причем не только в еврейских, но и в белорусских домах. Все пригодное как, например, сапоги, кожу, ткань, золото и прочие ценности полицейские (литовские партизаны) забирали с собой. По сведениям, полученным от солдат вермахта, у евреев часто прямо на улицах срывали с рук часы, жесточайшим образом снимали кольца с пальцев. Главный казначей сообщил, что у одной еврейской девушки полиция потребовала 5000 рублей за освобождение ее отца. Эта девушка должна была обежать весь город, чтобы раздобыть деньги. В самом гетто есть отдельные бараки, которые гражданские власти заполнили вещами евреев и забили гвоздями, но полиция взломала и разграбила эти бараки. Даже в казарме, где расквартирована воинская часть, были выломаны для костра оконные рамы в двери. Хотя я во вторник, в первой половине дня, имел по поводу грабежей объяснение с адъютантом командира и в ходе этих переговоров мне было обещано, что ни один полицейский более не появится в городе, спустя несколько часов я был вынужден арестовать двух литовских партизан в полном вооружении, застигнутых за грабежом. В ночь со вторника на среду батальон покинул город и двинулся в направлении Барановичей. Население воспряло духом только тогда, когда весть об этом распространилась по всему городу.

Доклад окончен. В скором времени я прибуду в Минск, чтобы изложить дело устно. В настоящее время я больше не в состоянии проводить еврейские акции. Сначала все должно успокоиться. Я надеюсь, что в самом скором времени нам удастся установить порядок и,

Наследие онлайн

несмотря на все трудности, снова оживить экономику. Я прошу только об одном: чтобы меня навсегда избавили от встреч с этим полицейским батальоном.

Карл.

Трагедия евреев Белоруссии в 1941—1944 гг. Сборник материалов и документов. Второе исправленное и дополненное издание. Мн., 1997. Л. 90—91.

ЗАГАД НАЧАЛЬНІКА ПАЛІЦЫІ БЯСПЕКІ І СД БЕЛАРУСІ АБ ЗНІШЧЭННІ ЯЎРЭЯЎ У СЛУЦКУ

Мінск, 5 лютага 1943 г.

8 и 9 февраля 1943 г. наша служба производит в г. Слуцке переселение[1] проживающих там евреев. В этой операции примут участие персонально названные ниже сотрудники службы...

Руководит операцией оберштурмфюрер СС Мюллер.

Участники операций собираются 7 февраля 1943 г. в 11.15 в нижнем коридоре служебного здания для отъезда, который состоится в 11.30. Обед — в 10.30.

Автоколонну будет возглавлять штурмбанфюрер СС Бредер. Из состава отделов в операции участвуют следующие офицеры, унтер-офицеры и солдаты.

Отделы I—II

оберштурмфюреры СС Кауль и Бербах, гауптштурмфюреры СС Мадекер и Шнейдер, унтерштурмфюреры СС Вертхольц, Мюллер, Юнкер, Шмидт, Вихерт, штурмшарфюреры СС Краузе, Цеманн, шарфюрер СС Краузе, роттвахмайстер Альтман, роттенфюреры СС Николь, Гайчер, Грюнер, Штрессингер, Этгер, Фишер, обершарфюрер СС Геннерт, рядовой СС Крафт, вахтмайстеры Кранке, Мишке.

Отдел III

гауптштурмфюреры СС Шлегель, Фридрих, унтерштурмфюрер СС Экк, гауптшарфюрер СС фон де Гольц, роттенфюрер СС Шрамм, переводчики Юлик и Кроветц.

Территория переселения

На территории переселения имеются две ямы. У каждой ямы работает по одной группе из 10 офицеров и солдат, которые меняются каждые 2 часа: 8—10, 10—12, 12—14, 14—16.

Яма I

1-я группа

штурмбанфюрер СС Бредер (руководитель), оберштурмфюреры СС Кауль и Мербах, гауптштурмфюрер СС Шнейдер, унтерштурмфюреры СС Вертхольц. Мюллер, Юнкер, штурмшарфюрер СС Фритц, роттенфюреры СС Гайгер и Грюнер.

2-я группа

гауптштурмфюрер СС Шлегель, обершарфюреры СС Бургер, Зекингер, Брандлмайер, гауптшарфюрер СС Хюттнер, обершарфюрер СС Веллер, унтершарфюрер СС фон Толь, шарфюрер СС Рексхаузер, цугвахмайстер Эксмер, унтершарфюрер СС Хермер.

Яма II

1-я группа

оберштурмфюрер СС Мюллер, унтерштурмфюрер СС Экк, гауптштурмфюрер СС Фридрих, вахмайстер Кранке, гауптшарфюрер СС фон дер Гольц, роттенфюреры СС Шрамм, Штрессингер, Этгер, Цеманн, Фишер.

2-я группа

оберштурмфюрер СС Освальд, гауптшарфюрер СС Рюбе, унтерштурмфюрер СС Шмидт, гауптшарфюрер СС Крайманн, обершарфюреры СС Шут, Герсбергер, Поклер, унтершарфюрер СС Штратманн, обершарфюрер СС Крамер, унтершарфюрер СС Гетман.

Охрану территории переселения обеспечивает унтерштурмфюрер СС Пирре... За автотранспорт в период подготовки в Минске, на пути в Слуцк и во время перевозки евреев из гетто до территории переселения отвечает унтерштурмфюрер СС Вихер. Одновременно он же обеспечивает доставку боеприпасов. На месте переселения патроны выдают рядовой СС Крафт и роттвахмайстер Альтман.

Отдел IV

оберштурмфюрер СС Мюллер, штурмшарфюрер СС Фритц, гауптшарфюрер СС Эриг, обершарфюреры СС Бухнер, Кремер, Бургер, Зекингер, Гетман, унтершарфюреры СС фон

[1]Так фашысцкія каты называлі расстрэл яўрэяў.

Наследие слуцкого края

Толль, Рексхаузер, Зернер, оберштурмфюрер СС Освальд, обершарфюреры СС Румшевитц, Брандлмайер, унтершарфюрер СС Штратманн, переводчики Зиссас, Соколовский, Натаров, Айзуце, Горшков, Михельсон, техперсонал: Бунте, Замтц, Томсоне, Зипельс, Мешак, Ренникс, Эглитис, Кубулинс, Аушкане, Викенс.

Отдел V

гауптшарфюреры СС Крайманн, Цойшель, Кюттнер, обершарфюреры СС Веллер, Герсбергер, Шут, Поклер, гауптшарфюрер Рюбе, переводчик Красковский, вспомогательные рабочие Озольс и Плаукс.

Проведение операции в Слуцке.

Гетто

Оцепление и охрана гетто осуществляются полицией порядка. За сбор имущества евреев отвечает гауптштурмфюрер СС Мадекер, которому придаются в помощь два сотрудника (Крузе, Бухнер), два переводчика (Михельсон, Натаров)...

Сбором евреев в гетто руководит штурмбанфюрер СС Грааф. Ему придается пять отрядов... Отрядами руководят: Краузе, Николь, Генкерт, Эриг, Беллер, Цойшель. Транспортировка евреев к месту переселения производится на шести грузовых машинах... Размещением и питанием офицеров и солдат ведает оберштурмфюрер СС Кауль.

Штраух, оберштурмбанфюрер СС.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 845. Воп. 1. Спр. 206. Л. 44—47.

З ДЗЁННІКА ГАЎПТШТУРМФЮРЭРА СС ВІЛЬКЕ

Воскресенье 7.2.43. 11.30 выезд всего отряда в Слуцк на 24 машинах.

16.30 прибытие — размещение в нар. школе (Рыночная ул.)

18.00 — переговоры об операции в гетто. Новое распределение отряда до 2-х часов ночи.

Понедельник 8.2.43. 4 часа подъем, 4.30 построение. 4.45 выступление, 5 часов начало операции в гетто. Очень хорошее начало. Выгоняется 1300 евреев (говорят, что их 3100), после обеда г.к. (гебитскомиссар) Карл решается на сожжение. (Примерно 300—400 евреев выходят из своих бункеров). Майор д-р Куфриту удален из гетто.

Бригаденф (юрер) фон Готтберг в гетто, оберфюрер Гартманн.

20 часов выступление в обратный путь. Спал как убитый.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.Ф. 845. Воп. 1. Спр. 206. Л. 54.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

Гісторыя газетным радком

На старонках газеты «Народны мсціўец», органа Слуцкага падпольнага РК КП(б)Б

11 красавіка 1943 г.

РЭЖЫМ РАБСТВА, ТЭРОРУ І НАСІЛЛЯ

Нельга пералічыць зверскія ўчынкі гітлераўскіх кравапіўцаў, нельга пералічыць імёны нашых людзей, якія загінулі ад рукі нямецкіх катаў. Яны, ап'янеўшыя ад народнай крыві, шукаюць новых повадаў, каб знішчыць беларускі народ.

У акупіраваных немцамі раёнах ходзіць эпідэмія тыфусу. Усё насельніцтва, захварэўшае на тыф, немец бязлітасна знішчае. Так, у г. Слуцку ім спалена каля 2000 чалавек.

Сэрца сціскаецца ад болю, калі бачыш, што робіць вораг з нашым народам...

25 красавіка 1943 г.

НА ПРАВАХ РАБОЎ

У германскую няволю мяне забралі прымусова. Мы ехалі тыдзень. Вагонаў ніхто не адкрываў. Харчавання не давалі. Толькі калі нявольнікі, разламаўшы вагон, уцякалі, тады ў вагон, як звяры, урываліся немцы і білі да паўсмерці тых, хто застаўся.

Нас завезлі ў горад Хэмнес. У лагеры ўжо было 9 тысяч мужчын, жанчыны былі ў другім лагеры. Ён быў агароджаны калючым дротам, кругом стаялі кулямёты, ноччу лагер асвятлялі пражэктары.

Спалі на сырой зямлі ў сваім адзенні. У 5 гадзін раніцы ўсіх паставілі ў калону

Наследие слуцкого края

і пад канвоем пагналі на работу — вазіць на сабе тачкі зямлі. Такая катаржная работа працягвалася да 7 гадзін вечара.

Абяссіленыя, збітыя гумавымі палкамі, пад вартай звярталіся мы ў лагер. Па дарозе многія гублялі сілы, падалі і больш не ўставалі: іх прыстрэльвалі. Увесь час галадалі. На суткі выдавалі па 230 грамаў хлеба, спечанага з сушаных буракоў і бульбяной шкарлупы, і конаўку гарачай вады. Ад такой працы штодзённа паміралі 50—70 чалавек. Так загінулі Васіль Белавус, Статкевіч і Барысенка з Любаншчыны. На правах рабоў, катаржнікаў жывуць і працуюць нашы браты і сёстры, прымусова ўвезеныя ў Германію.

З рызыкай для жыцця мне ўдалося ўцячы з фашысцкай няволі. Зараз са зброяй у руках знішчаю праклятага ворага за зверскія здзекі над нашым народам.

В.Несцераў, партызан.

3 чэрвеня 1943 г.

ТАКІМ СТАЎ СЛУЦК

... Зусім другім стаў Слуцк цяпер. Фашысцкія варвары разбурылі, зруйнавалі прыгожыя пабудовы горада. Глядзіш і не верыш сваім вачам, што гэта ранейшы Слуцк. Замест прыгожых дамоў — груды развалін, руіны, папялішчы, заросшыя бур'янам і чартапалохам.

Горад абязлюдзеў. Сотні людзей кінуты ў турмы, многія расстраляны, павешаны і спалены. Тысячы случан увезены ў нямецкае рабства. Астаўшыеся ў жывых гараджане церпяць голад, здзекі і пабоі фашысцкіх катаў.

Слуцк стаў горадам смерці, голаду. У пакутах і муках случане ні на мінуту не трацяць надзей на вызваленне ад фашысцкіх разбойнікаў. Многія з іх уходзяць у партызанскія атрады, каб бязлітасна знішчаць немчуру.

Паддымаў.

6 чэрвеня 1943 г.

РАБСКАЯ ПРАЦА

120 чалавек рабочых працуюць на слуцкім мэблевым камбінаце. Большасць з іх гэта падросткі 14—16 гадоў. Гаспадар камбіната немец Саксамаер немаверна здзекуецца з рабочых. У гэтага ката ёсць сабака аўчарка. За малейшы праступак, а часта і без віны, ён збівае рабочых, сабака кусае іх. Нядаўна Саксамаер збіў рабочага Алісейчыка Пятра, аўчарка парвала вопратку і пакусала яго. 7 дзён Пётр не мог падняцца.

Па спіне кожнага рабочага пахадзіў кнут...

М.Курасава.

13 чэрвеня 1943 г.

НОВЫЯ НАМЕРЫ ЛЮДАЕДАЎ

... На Случчыне фашысты ўжо закатавалі і забілі дзесяткі тысяч нявінных людзей. Сляды сваіх крывавых злачынстваў яны імкнуцца захаваць. Але ад народа нічога не захаваеш, ён ведае ўсё. Яму вядома, што больш як тысячы савецкіх грамадзян забілі і закапалі фашысцкія каты ў саўгасе Вясея (маёнтак Махорты), тысячы людзей закатавалі, расстралялі і закапалі жывымі ў Жураўскім лесе, у Слуцку на двары быўшых дзетясляў па Манахавай вуліцы, у ціры 11 палка, каля скотабазы, у Бязверхавічах, на амговіцкіх могілках і г.д.

Зараз у Слуцку фашысцкія людаеды рыхтуюцца да новага масавага знішчэння людзей. Яны ўжо пабудавалі гета каля шашы Масква — Варшава, абгарадзілі яго дротам у 7 радоў, пакапалі ямы-рвы для новых нявінных ахвяр.

Свае каварныя намеры гітлераўцы хочуць скрыць, для чаго яны праводзяць у горадзе мітынгі, пускаюць у ход хлусню, ашуканства і правакацыю...

Іван К.

20 чэрвеня 1943 г.

У ЗАСЦЕНКАХ ФАШЫСЦКАЙ ТУРМЫ

Камеры слуцкай турмы заўсёды перапоўнены. Нямецкія бандыты штодзённа сюды кідаюць лепшых сыноў і дачок Случчыны, каб пасля зверскіх распраў і нечалавечых здзекаў спыніць іх жыццё. Кожны дзень гітлераўскія галаварэзы вывозяць з турмы дзесяткі людзей у Журава і там іх расстрэльваюць. Знішчэнне людзей гітлераўцы ўсякімі спосабамі ўкрываюць. Яны гавораць, што ўвезеныя з турмы людзі адпраўлены ў Германію ці на далейшае следства ў Мінск і г.д.

Мне нядаўна ўдалося вырвацца ад смерці з фашысцкіх кіпцюроў. За час знаходжання ў турме я перанёс многа пабояў, здзекаў, увесь час галадаў. Кат турмы Калантай штодзённа ўрываецца ў камеры і гумавай палкай збівае да паўсмерці нявольнікаў. Я з'яўляўся сведкай, калі кат-

Наследие слуцкого края

бандыт збіў да непрытомнасці слуцкага папа Шахновіча, урача Трухана...

Гітлераўцы ўвялі такі парадак, што кожны нявольнік за катаванні і здзекі плаціць фашысцкім катам па 10 рублёў у суткі....

Барыс М.

4 ліпеня 1943 г.

... Над Случчынай распрасцерлі свае крывавыя рукі гітлераўскія бандыты. Акруговы камісар Карл, яго разбойніцкая банда, розныя эзесы, саксамаеры, каптайны, грынервельдэры, бірманы п'юць кроў случан, уводзячы «новы парадак».

... Нядаўна фашысцкія душагубы наляцелі на вёску Кублішча і па-бандыцку расстралялі 8 сялянскіх сямей — 35 невіноўных старыкоў, жанчын і дзяцей.

На месцы стаяўшых дамоў вёскі Адамова — папялішчы, на якіх стаяць крыжы. У агні згарэла 274 чалавекі.

У Грэскім раёне немцы спалілі ў агні 350 сялян з вёскі Палікараўка, 70 сялян вёскі Фадзееўка, насельніцтва вёсак Беразінец і Жылін Брод.

Згарэўшыя ў агні не могуць нам расказаць аб сваіх муках. Але мы знаем, як маленькія дзеці абнімалі маленькімі ручкамі шыю мацеры і як маці ўжо з загарэўшыміся на галаве валасамі апошні раз прыціскала да грудзей малютку, развітваючыся з ёй у полымі агню...

17 кастрычніка 1943 г.

... З вёсак Вяліка-Сліўскага сельсавета немцы забралі 358 кароў, 104 свінні, 137 авец, 442 куры, 117 тон хлеба, 353 тоны бульбы, 57 каней. Бандыты пазайздросцілі на наша адзенне, абутак. Ад сялян забрана 100 кажухоў і аўчын, 12 адзеялаў, 150 цёплых шапак, 10 жаночых мехавых пальто, 225 жаночых плацяў.

Раней у вёсцы была школа, бальніца, радзільны дом, клуб. Зараз іх няма. Усё знішчана разбойнікамі-немцамі.

Васіль С., селянін.

* * *

...Нямецкія драпежнікі да паследняй ніткі абрабавалі калгас, жыхароў вёскі ... забралі 142 каровы, 27 авец, 17 свіней, 223 птушкі, 167 тон хлеба, 342 тоны бульбы, 14 лепшых каней, 12 калёс. Не размінуліся грабежнікі і з маёмасцю сялян. Яны забралі 17 веламашын, 182 аўчыны, 21 кажух і іншае адзенне, абутак... Па-зверску расправіліся з 58-гадовым Фёдарам Жываглод, Пятром Жываглод, Райкіс, Мендэлевіч, Віннік Я. Угналі з родных мясцін у нямеччыну 13 чалавек...

Барыс В.,
селянін вёскі Казловічы

* * *

... Слуцк ператвораны ў разбойніцкае логава, у пляц шыбеніц і расстрэлаў. Многія будынкі ператвораны ў турмы. Шматпавярховае памяшканне педагагічнага тэхнікума кожны дзень папаўняецца ні ў чым не павіннымі случанамі.

19 снежня 1943 г.

Днямі гітлераўскія мярзотнікі ўтварылі новае злачынства над мірным насельніцтвам вёскі Крупенікі. Нямецкія душагубы ўварваліся ў вёску, забралі ўсе рэчы і маёмасць, сялян пагрузілі на машыны, на вуліцу выгналі ўсё насельніцтва. Пад пагрозай смерці гітлераўцы пасадзілі на машыны мужчын, жанчын, старыкоў, дзяцей і вывезлі з вёскі.

Каля Слуцка людаеды па-зверску расправіліся з бязвінным мірным насельніцтвам. Старыкоў і дзяцей расстралялі, а працаздольных угналі на катаргу ў Германію.

11 ліпеня 1943 г.

ФАШЫСЦКІЯ МАХЛЯРЫ

... У Слуцку створана фашысцкая «ўстанова», названая «Акруговая біржа працы». На справе гэта не біржа працы, а біржа ганебнага ашуканства насельніцтва Случчыны, біржа прымусовай пастаўкі рабоў на катаржныя работы ў Германію. Я працаваў на гэтай біржы круговым «вербаўшчыком», і мне вядомы ўсе жульніцкія прадзелкі махляроў фашысцкай біржы.

Нас, работнікаў біржы, на сакрэтнай нарадзе немцы папярэдзілі, каб мы распаўсюджвалі хлусню аб тым, што народу ў Германіі жывецца багата і шчасліва.

Мне і Казубскаму Барысу было даручана выяўляць фізічна здаровых людзей, складаць на іх спіскі і накіроўваць у паліцыю і пры яе дапамозе вылаўліваць моладзь і адпраўляць у Германію. З інструктажа я даведаўся, што на катаргу ў Германію павінна быць адпраўлена 25 працэнтаў працаздольнага насельніцтва Случчыны.

Ужо адпраўлена са Слуцкага раёна толькі за 1943 г. 2400 хлопцаў і дзяўчат. Уся адпраўка ўтваралася прымусова.

Наследие слуцкого края

«Завербаваныя» ведалі, што яны едуць на катаргу, пагэтаму многія стараліся адкупіцца. Рабапрадавец, галоўны махляр біржы Геккер бярэ падкупы золатам, гарэлкай, салам...

А.Лемеш.

18 ліпеня 1943 г.

.. Нібы на медагляд, немцы выклікалі ў Слуцк 35 чалавек з Вялікай Слівы і 11 чалавек з Нежаўкі. Добра знаючы намеры фашысцкіх разбойнікаў, сяляне гэтых вёсак на медпункт не пайшлі. Тады нямецкі афіцэр разам са старастай Вялікай-Сліўскай воласці зрабілі аблаву на сялян гэтых вёсак, прыехаўшых на базар. Злавілі 15 чалавек і загналі ў турму для адпраўкі ў Германію.

Такія аблавы ў Слуцку бываюць часта.

Дзіма К.

Змагаліся ў тыле ворага

На акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі Случчыне ўжо ў першыя месяцы вайны, як і прадугледжвала дырэктыва ЦК КП(б)Б, пачалі ўзнікаць падпольныя і баявыя групы для барацьбы з акупантамі. «Новы парадак» гітлераўцаў, здзекі, рабаванне і знішчэнне людзей паскорылі гэты працэс. І ўжо ў хуткім часе ў горадзе і на тэрыторыі раёна дзейнічала добра наладжаная сістэма патрыятычнага падполля, разгарнулася партызанская барацьба.

МЕЖРАЙОННЫЙ КОМИТЕТ КП(б)Б СЛУЦКОЙ ЗОНЫ (8.1942—7.1943)

В августе 1942 года Минский подпольный обком КП(б)Б направил группу партийных работников во главе с секретарем обкома партии И.Д.Варвашеней в Гресский район с задачей распространить свое влияние на Копыльский, Слуцкий и Узденский районы. В группу входили: А.И.Степанова, И.К.Жижик, В.И.Заяц. Группа стала действовать как межрайонный комитет КП(б)Б Слуцкой зоны[1].

В марте 1943 года межрайком КП(б)Б утвердил И.К.Жижика секретарем Копыльского райкома КП(б)Б. Вместо него в состав межрайкома был введен командир партизанской бригады им. К.Е.Ворошилова Ф.Ф.Капуста.

В мае 1943 года И.Д.Варвашеня выбыл за линию фронта.

В июне 1943 года обязанности секретаря межрайкома партии исполняла А.И.Степанова.

Межрайком КП(б)Б Слуцкой зоны 7 апреля 1943 года утвердил состав организованных им подпольных райкомов партии: Гресского, Дзержинского, Копыльского, Краснослободского, Слуцкого, Узденского, а также Клецкого и Несвижского и уполномоченного межрайкома по Ляховичскому району Барановичской области.

Межрайком КП(б)Б прекратил свою деятельность в июле 1943 года

СОСТАВ МЕЖРАЙКОМА КП(б)Б

Секретарь — Варвашеня Иван Денисович («В.Петров»; 8.1942—4.1943).

И.о.секретаря — Степанова Александра Игнатьевна (6.1943—7.1943).

Члены межрайкома: Жижик Иван Климентьевич (8.1942—20.3.1943), Заяц Владимир Иванович (8.1942—7.1943), Степанова Александра Игнатьевна (8.1942—7.1943), Шестопалов Николай Анисимович (21.12.1942—7.1943), Капуста Филипп Филиппович (20.3.1943—7.1943).

Печатный орган межрайкома КП(б)Б — газета «Патриот Родины».

Выпускалась с 1 января 1943 года. Решением Минского подпольного обкома КП(б)Б от 26 июня 1943 года издание газеты прекращено. Материальная ее часть (типография и др.) передана Копыльскому райкому.

Редактор — Клюйко Константин Николаевич.

Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1944): Краткие сведения об организации, структуре и составе. Мн., 1975. С. 155—156.

[1]Состав межрайкома КП(б)Б был представлен на утверждение в ЦК КП(б)Б В.И.Козловым 30 августа 1942 года.

Наследие слуцкого края

Дзейнічала з ліпеня 1941 г. да чэрвеня 1944 г. у Грэскім раёне пад кіраўніцтвам Грэскага падпольнага РК КП(б)Б (з сакавіка 1943). Арганізатар і кіраўнік У.І.Заяц. Каля 80 чалавек, у т. л. 10 камуністаў і 4 камсамольцы, 4 групы: у бальніцы в. Грэск — кіраўнік Ю.Г.Войчык, в. Стараселле — А.В.Вадап'ян, в. Гацук — Заяц, в. Вобчае (Сялецк) — І.І.Каско. Падпольшчыкі вялі сярод насельніцтва палітычную работу, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, перадавалі партызанам звесткі пра рух варожага транспарту, папярэджвалі іх пра карныя аперацыі акупантаў, памагалі зброяй, медыкаментамі. Сістэматычна парушалі тэлефонную сувязь праціўніка, спалілі некалькі мастоў на шашэйных дарогах, напалі на апорны пункт акупантаў у в. Вобчае, захапілі абоз з прадуктамі і пераправілі партызанам 3 т збожжа, 4,5 т бульбы, 6 пудоў солі, пусцілі пад адхон эшалон з жывой сілай і тэхнікай ворага.

У барацьбе з ворагам загінулі: Аляксандр Аляксандравіч Бурак, Анатоль Аляксандравіч Бурак, А.М.Бурак, Е.І.Бурак, Ю.Г.Войчык, А.А.Дземідовіч, Л. Кавалёва, А.А.Каляда, А.В.Каляда, Ю.М.Каляда, А.М.Каспяровіч, А.В.Клебановіч, І.В.Клебановіч, В.А.Нямковіч, У.І.Рухлевіч, Ф.Р.Тарасевіч, А.П.Хацько.

А.Б.Рогаў.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945: Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 181.

Канстанцінаўцы

У жніўні 1941 г. у Вароніцкіх балотах была ўтворана партызанская група. Яе арганізаваў былы загадчык аддзела Грэскага РК КПБ В.І.Заяц. У групу ўваходзіў таксама былы інструктар Грэскага РК КПБ Т.М.Беразоўскі. Неўзабаве група партызан напаткала групу байцоў і камандзіраў на чале з генерал-маёрам Міхаілам Пятровічам Канстанцінавым. Генерал Канстанцінаў быў у першыя дні вайны паранены і аказаўся ў тыле ворага. Калі крыху падлячыўся, з групай байцоў рушыў на ўсход. Гэтая дарога і прывяла іх да першых грэскіх партызан.

Аб'яднаная група налічвала 17 чалавек. Амаль усе мелі зброю. Размясціліся на ўзвышшы, якое акружалі балоты. Былі зямлянкі, назіральны пункт, адкуль праглядваліся ўсе падыходы. Падтрымлівалася цесная сувязь з жыхарамі навакольных вёсак, якія забяспечвалі групу прадуктамі.

Праз Т.М.Беразоўскага была ўстаноў-

Наследие слуцкого края

лена сувязь з падпольнай антыфашысцкай арганізацыяй у Грэску, якой кіраваў урач Юрый Войчык. Актыўнай памочніцай яго была медсястра Ірына Каліноўская. Падпольшчыкам удалося накіраваць у лес дзесяткі чалавек, многія з якіх сталі потым героямі партызанскай барацьбы. Гэта кулямётчык Іван Чалыгін, разведчык Аркадзій Малчанаў, Пётр Лахно, Анатолій Нікалаеў і інш. Па ініцыятыве бальнічнай падпольнай арганізацыі ў грэскіх лясах з ліку параненых салдат Савецкай Арміі быў створаны партызанскі атрад «Бальнічны». Узначаліў яго палітрук Віктар Курганаў. Атрад трымаў цесную сувязь з падпольшчыкамі праз Ірыну Каліноўскую.



М.П.Канстанцінаў.

Восенню 1941 г. у падпольную арганізацыю акрамя Войчыка і Каліноўскай увахадзілі медсёстры Феня Тарасевіч, Марыя Пяткевіч, Ліда Кавалёва, Зіна Маскалевіч. Сярод іх быў і афіцэр Савецкай Арміі М.М.Лебянкоў. Пасля выздараўлення ён быў перапраўлены ў групу Канстанцінава.

У пачатку лютага 1942 г. у Грэск прыбылі гестапаўцы, а ўслед за імі — карны атрад. Гестапаўцам удалося арыштаваць Феню Тарасевіч, Ліду Кавалёву, Галю Жук. Пасля жудаснага здзеку падпольшчыц расстралялі. Юрый Войчык быў арыштаваны ў Слуцку 11 чэрвеня 1942 г. Ён ехаў за медыкаментамі для партызан. Праз два дні яго ў ліку 32 іншых патрыётаў гітлераўцы расстралялі. Ірына Каліноўская пайшла ў групу генерала Канстанцінава.

Дзейнасць групы генерала Канстанцінава не давала спакою немцам ні днём, ні ноччу. Фашысты пачалі пошукі партызан. Даведаўшыся, што адзін з партызан — Тарас Беразоўскі — бывае ў сваіх бацькоў, фашысты пайшлі на хітрыкі. Калі Т.М.Беразоўскі прыйшоў да бацькоў за прадуктамі, у хату зайшлі два чалавекі, апранутыя ў цывільную вопратку. Яны назваліся партызанамі з Капыльскага раёна, гаварылі, што іх атрад разбіты немцамі, і прасілі праз Беразоўскага звязацца з мясцовымі партызанамі. Беразоўскі западозрыў нядобрае, адказаў, што пра партызан нічога не ведае. Тады яго папрасілі, каб ён правёў іх у суседнюю вёску. Па дарозе Беразоўскі заўважыў у прыдарожных кустах узброеных людзей, многія з якіх былі апранутыя ў нямецкую форму. Яны растлумачылі, што апранутыя многія ў нямецкую форму для маскіроўкі. Але Беразоўскі здагадаўся, што гэта ворагі. І калі адзін закурыў і прапанаваў Беразоўскаму, той прыпыніўся, узяў цыгарэту. Нямецкі прыслужнік чыркнуў запальніцай і паднёс яе да цыгаркі Беразоўскага. Беразоўскі з усей сілы ўдарыў ворага і кінуўся наўцёк да лесу. Правакацыя не ўдалася.

Тады гітлераўцы вырашылі знішчыць групу Канстанцінава з дапамогай права-



Помнік каля в. Крывая Града ў гонар партызанскага атрада М.П.Канстанцінава.

Наследие слуцкого края

катара. Аперацыю па ліквідацыі групы партызан немцы назначылі на 14 лютага 1942 г. На досвітку з Грэска выйшаў атрад немцаў. Ворагі рухаліся па дарозе Асіповічы — Бабоўня. Дайшоўшы да в. Палікараўка, яны павярнулі на лясную дарогу, у той бок, дзе, на іх думку, размясцілася партызанская група. Немцы былі апрануты ў белыя халаты, а іх праваднік, здраднік і правакатар — у простую вясковую вопратку.

Партызанскі назіральнік, які амаль пастаянна сядзеў на хвоі, паведаміў пра набліжэнне ворагаў. Партызаны падрыхтаваліся да сустрэчы, падпусцілі немцаў на блізкую адлегласць і адкрылі агонь. Ніводнаму гітлераўцу не ўдалося выратавацца ад трапных партызанскіх куль.

Неўзабаве пасля гэтага група Канстанцінава пакінула грэскія лясы і перайшла ў Любанскі раён, дзе ўлілася ў адзін з атрадаў партызанскага злучэння Мінскай вобласці.

У.Кулік.

Шлях Ільіча. 1967. 12 снеж.

У семнаццаць юнацкіх гадоў

Грозны 1941 год. Разбурэнні, смерць, голад прынеслі захопнікі на Случчыну.

Аляксею Караку тады было семнаццаць. Цёмнай ноччу ў хаце Каракі збіраліся аднагодкі Аляксея. Часта прыходзілі сюды камсамольцы Іван Капацэвіч, Міша Карака. Хлопцы шчыльна завешвалі посцілкамі вокны, дамаўляліся, што рабіць.

Расла сям'я камсамольцаў-падпольшчыкаў у в. Ісерна. Няраз, калі вёску ахутвала цемень, ціха скрыпелі вароты гумна, што стаяла крыху наводшыбе ад хаты Іосіфа Пекара. Тут збіраліся падпольшчыкі. Месца зручнае — побач рэчка, хмызнякі.

— Першае наша заданне, — сказаў Мікалай Бялько, — дастаць зброю, што ў рацэ Случ каля моста. Потым будзем выконваць даручэнні партызан.

Часта ісернскіх падпольшчыкаў наведвалі лясныя салдаты.

Камсамольцаў Мікалая Бялько, Аляксея Караку, Іосіфа Пекара, Івана Капацэвіча, Сяргея Бялько, Мікалая Караку, Мікалая Самусевіча, Віктара Караку, Мішу Караку, Івана Шаблыку ведалі многія жыхары, але пра іх падпольную дзейнасць толькі здагадваліся.

Фашысцкія агенты напалі на след.

— Цяпер, хлопцы, наша дарога ў партызаны, заставацца ў вёсцы небяспечна, — сказаў Мікалай Бялько.

На лясной паляне сабраліся юныя падпольшчыкі. Тут былі і многія аднавяскоўцы. Усе згадзіліся арганізаваць новы партызанскі атрад. Назвалі яго імем 14 слуцкіх партызан. Камандзірам стаў Мікалай Бялько.

Пачаліся вогненныя дарогі партызанскага атрада. Білі фашыстаў і ў Слуцкім, і ў Любанскім, і ў Старобінскім, і ў Старадарожскім раёнах. Мужнасцю заўсёды вызначаўся камандзір атрада Мікалай Данілавіч Бялько. Толькі незадоўга перад вызваленнем Беларусі жыццё партызанскага камандзіра абарвала варожая куля.

За смерць баявога сябра жорстка помсцілі ворагу партызаны. Многія з атрада імя 14-ці слуцкіх партызан дайшлі з баямі да Берліна, штурмавалі рэйхстаг...

У.Цішкевіч, М.Сеўрук.

Шлях Ільіча. 1967. 28 кастр.

Ямпальскія патрыёты

Гарбуноў Віктар, два браты Габа — Аляксей і Іван, Жукавы Дзмітрый і яго жонка, Каплан Соф'я, Кулыгін Ігнат, Белы Мікалай, Федаркоў Мікалай, Салавей Надзея — усе яны з Ямпаля. Нянавісць да гітлераўцаў прывяла іх у рады барацьбітоў з ворагам. Лясным салдатам добра была вядома падпольная дзейнасць хутарскога хлопчыка Колі Федаркова. Ён дастаўляў народным мсціўцам друкарскі шрыфт, фарбу, паперу і ўсё іншае для выпуску падпольнай газеты. Трынаццацігадовы Коля Федаркоў праславіўся як выдатны лясны салдат.

Патрыётамі Радзімы на хутары былі таксама сястра Федаркова — Ніна Андрэеўна са сваім мужам Аляксеем Антонавічам Габа і інш. А што ведаюць у нас пра гэта, або аб трагедыі, якая здарылася на гэтым хутары ў верасні 1943 г.?

Наследие слуцкого края

... Астраўком у вялікім калгасным садзе выглядаў хутар з некалькіх доўгіх драўляных дамоў. Стук у шыбы вокнаў па начах не палохаў жыхароў. Яны ведалі, што гэта просіць дапамогу хто-небудзь з цярпеўшых бедства людзей. Нікому з іх не адмаўлялі ў дапамозе, хоць ведалі, якой небяспецы падвяргаюць сябе.

Многія з жыхароў хутара былі падпольшчыкамі. Яны падтрымлівалі сувязь з гарадамі, працуючы па заданні партызанскага атрада імя Ракасоўскага. Здабывалі і перадавалі вінтоўкі, патроны, іншыя боепрыпасы. Акрамя таго, накіроўвалі ў лес акружэнцаў і тых, хто вырваўся з палону, зрабілі свае кватэры месцамі сувязі партызан са Слуцкім падполлем.

Былы камандзір партызанскага атрада імя К.К.Ракасоўскага А.Дз.Фамін расказаў пра тое, як 3 мая 1943 г. з партызанамі Анатолем Афанасьевічам Ходасавым і Рыгорам Кандратавічам Свянціцкім на х. Ямпаль узялі ў палон трох паліцаяў, якія былі ў поўным узбраенні.

Знікненне паліцаяў выклікала перапалох у ворагаў. Хтосьці данёс, што іх схапілі на хутары. Абстаноўка складалася такая, што далей заставацца партызанскім сувязным у Ямпалі было нельга. У адну з ліпеньскіх начэй 1943 г. 8 жыхароў хутара, абышоўшы гітлераўскія засады і пасты, раніцай апынуліся ў размяшчэнні партызанскага атрада імя Ракасоўскага.

Не вярнуліся ў родныя хаты з вайны Ігнат Кулыгін, Аляксей Габа, Дзмітрый Жукаў, Фёдар Лысенка, Мікалай Белы. Іх прозвішчы ў мармуры і граніце помнікаў. Адзіная жывая сведка ямпальскай трагедыі былая партызанка Вялікай Айчыннай вайны, інвалід першай групы Надзея Іванаўна Салавей расказвае:

— Пасля таго як мужчыны падаліся ў партызаны, хутар усё больш часта сталі наведваць паліцаі. Карнікі нечакана наляцелі на Ямпаль, акружылі дамы і нікога не выпускалі адсюль. Усіх жыхароў сагналі да месца стаяўшых трох аўтамашын і сілком пагрузілі ў кузавы. На кожнай па баках сядзелі са зброяй напагатове ворагі.

У тую раніцу мяне дома не было. Начавала ў сяброўкі і, калі выйшла ад яе і накіравалася на хутар, на цяперашняй вуліцы 14 партызан сустрэла машыну з людзьмі. «Нашы!» — крыкнула я і пабегла за імі. Сястра Аня са слязамі крыкнула мне: — «Усіх забралі, усіх! Запомні гэты дзень! Адпомсці!»

Адзін з паліцаяў вырашыў праявіць да мяне «добрыя пачуцці» і стаў адрываць мае рукі ад кузава, гаворачы: «Шалёная, адыдзі, табе жыць надаела?»

Сэнс гэтых слоў я зразумела пазней, калі следам за машынамі пабегла да турмы, якая паглынула маіх сясцёр з маленькімі дзецьмі на руках, старых жанчын Сцефаніду і Марыю Гарбуновых, маладых жанчын Ганну і Ніну Габа, Соф'ю Каплан і іншых. Каля дваццаці чалавек жыхароў Ямпаля былі кінуты ў гэты дзень за турэмныя краты, а пазней расстраляны.

Праз расчыненыя вароты Надзя ўбачыла на турэмным двары акрываўленую Матрону Салавей, жанчыну, якая замяніла ёй маці. Надзі і году не было, калі асірацела. Бацька — Іван Іванавіч пасля смерці жонкі ажаніўся з Матронай. Яна і выгадавала Надзю і яе трох сясцёр, а калі настаў час ў школу пайсці, дзяўчынка пераехала жыць у Ямпаль.

Як толькі на Случчыне пачалі дзейнічаць партызаны, Матрона са сваім мужам сталі сувязнымі. Матрону схапілі паліцаі на Мінскай шашы, калі яна ішла з даручэннем камандавання партызан атрада імя Ракасоўскага да ямпальскіх патрыётаў, і кінулі ў турму. Колькі гітлераўцы ні катавалі жанчыну, нічога ад яе пра партызан не даведаліся. Івана Іванавіча Салаўя схапілі жандары ў час баявой аперацыі. Яго і жонку Матрону павесілі ў адзін дзень.

— З дапамогай сувязных народных мсціўцаў, — працягвала расказ Надзея Іванаўна, — я 28 верасня 1943 г. стала радавой партызанскага атрада імя Ракасоўскага брыгады № 95 імя Фрунзе. Мяне прызначылі ў гаспадарчую роту.

Знясіленая горам дзеўчына пасля прастуды доўга хварэла. У в. Ржаўка, дзе стаяла партызанская ахова, яна праляжала больш за месяц. І калі абставіны складваліся так, што не хапала людзей для выканання тэрміновых заданняў, Надзея Салавей станавілася ў баявыя рады. У ліпені 1944 г., калі родную Беларусь ачысцілі ад гітлераўцаў і партызаны злучыліся з часцямі Чырвонай арміі, Надзея Салавей пачала працаваць у народнай гаспадарцы...

С.Дубярштэйн.

Шлях Ільіча. 1976. 1 вер.

Наследие слуцкого края

Шлях да партызан

Нелегок был путь к партизанам и медицинской сестры Ирины Гордеевны Калиновской, моей первой помощницы. Родилась она в местечке Старосельцы Белостокской области. Каторжной была жизнь белорусов под гнетом помещичье-буржуазной Польши. Тяжело было белорусским детям получить образование, еще труднее — найти работу. Родители Ирины решили наперекор всем трудностям вывести дочь «в люди». Способная девочка окончила Старосельскую среднюю школу, поступила в фельдшерское училище в Вильно. За учебу надо было платить, а денег родители не имели. Ирина пошла работать санитаркой в городскую больницу.

Несмотря на все трудности, Ирина успешно окончила фельдшерское училище, поступила работать в Белостокскую городскую больницу, а перед самой войной перешла в военный госпиталь. Самым большим событием в жизни молодого фельдшера было установление советской власти в районах бывшей Западной Белоруссии. Теперь она наконец смогла забрать к себе родителей, зажить счастливо. Но счастье это было недолгим. Началась война. В первый же день в госпиталь стали поступать раненые, а 26 июня был получен приказ эвакуироваться.

Ирина сопровождала машину с ранеными в Минск. Были уже недалеко от города, когда узнали страшную весть: в столице враг, дорога перерезана немецкими танками. Те, кто мог самостоятельно передвигаться, ушли через леса и болота на восток. Но в машине были и тяжелораненые. Ирина решила остаться с ними, разделить их участь.

Захватив машину, немцы направили ее в Слуцк. Так они очутились в селе Шищицы. Здесь добрые люди накормили раненых и их смелую проводницу, переодели всех в гражданскую одежду и посоветовали Ирине везти людей в Гресскую больницу. Сказали, что главврач больницы Юрий Георгиевич Войчик в беде не оставит.

Ирина послушалась совета. Юрий Георгиевич действительно тепло принял раненых, разместил их по палатам вместе с больными местными жителями. Предложил работать Ирине в больнице санитаркой. Жить она стала у медсестры Фени Тарасевич, матери троих детей. Работала самоотверженно, делала все, чтобы поскорее поставить на ноги своих раненых. Но позже стала выполнять и другие обязанности.

Юрий Георгиевич Войчик создал подпольную группу, куда кроме Ирины вошли и другие медработники: Лида Ковалева, Аня Соболевская, Феня Тарасевич, Мария Паткевич, Галина Жук, Иван Клебанович со своей семьей. Подпольщики стали понемногу активизировать свои действия.

В обязанности Ирины входило держать связь с людьми, которые доставали оружие для бойцов, направляемых после выздоровления к партизанам. Винтовки и боеприпасы она получала в деревне Поликаровка у подпольщиков Виктора Тишкевича и Василия Матусевича. Оружие приносила домой в разобранном виде. А ночью приходили выздоравливающие, собирали его и уносили в больницу. Ирине не раз приходилось спать на койке, где под матрацем лежало оружие.

В сентябре 1941-го бывшие раненые организовали под Греском партизанский отряд. Командиром стал Виктор Курганов. В армии он был политруком. Комиссаром — Алексей Тишкевич. С этим небольшим отрядом Ирина держала постоянную связь, информировала его о всех намерениях и делах фашистов в гресском гарнизоне.

В начале октября немцы привезли в больницу тяжелораненого лейтенанта Михаила Михайловича Лебенкова. Прикрывая отход партизан, он был ранен в грудь и руку, потерял сознание и был схвачен фашистами. Положение раненого казалось безнадежным. Несколько суток он не приходил в сознание, но каждый день немцы справлялись о состоянии лейтенанта. Они надеялись получить от него сведения о расположении партизанского отряда и его численности. Весь персонал больницы ухаживал за Лебенковым, делал все, чтобы спасти ему жизнь. И он выжил, стал поправляться. А в своих докладах немецкому офицеру главврач сообщал, что раненый в плохом состоянии, вот-вот умрет.

Когда лейтенант пришел в себя, Юрий Георгиевич рассказал ему о подпольной

Наследие слуцкого края

группе, попросил помочь установить связь с партизанским отрядом. Лебенков дал пароль для явки, указал местонахождение отряда. На встречу с комиссаром была направлена Ирина. Встретились они в деревне Гацуки. Ирина рассказала комиссару о том, что Лебенков у них в больнице, поправляется, но не сегодня-завтра немцы могут взять его на допрос.

Тут же был разработан план возвращения Лебенкова в отряд. Ирина должна была переправить его из больницы в деревню Камень. Лебенков благополучно вернулся к своим.

На следующий день главврач доложил немцам, что больной убежал. Гитлеровцы заподозрили неладное. Они установили слежку за Ириной. Чтобы отвести подозрение от остальных членов группы, Юрий Георгиевич разрешил ей уйти в партизаны. Решение оказалось своевременным.

Друкуецца паводле кн.: Д р у я н И. Клятву сдержали. Мн., 1975. С. 115—118.

Байер раскрывает тайны

Как-то командир одного из отрядов Александр Фомин получил записку. «Шефа машинно-тракторной станции обер-лейтенанта Байера словно подменил кто, он начал лояльно относиться к местным жителям», — писала слуцкая подпольщица Валентина Алейник. Фомин, в недавнем прошлом армейский офицер, отнесся к сообщению подпольщицы настороженно. Посоветовался с Арестовичем. Тот сказал, что надо присмотреться к немцу. В Слуцк послали партизан-связных. Они передали подпольщикам задание командира бригады — как можно ближе познакомиться с Байером, выяснить его взгляды и намерения.

Валентина Алейник работала в местной больнице. Ей приходилось часто обращаться к шефу машинно-тракторной станции по разным делам: то помочь в заготовке дров, то достать нужные лекарства, то выделить для врача автомашину. Таким образом они познакомились. Байер не скрывал страха, когда говорил о наступлении советских войск, которые начали освобождать восточные районы Белоруссии. Как-то он высказал даже мысль, что навряд ли Германии удастся остановить натиск Красной Армии.

— Пропала Германия, — с отчаянием проговорил он.

— А стоит ли об этом жалеть, господин обер-лейтенант? — спросила подпольщица.

— Вам, конечно, нечего жалеть. Вы рады. А каково мне?

— Вы никогда не задумывались, что вместо нынешней Германии может быть создана другая, не похожая на эту?

— Какая же?

— Ну хотя бы такая, которая не будет больше посылать вас в чужие страны...

Байер долго молчал, опустив голову.

— Народ устал, — наконец сказал он. — Никому нет дела до новой Германии.

— Напрасно вы так считаете. Настоящие немецкие патриоты думают иначе.

— Я не знаю таких патриотов.

Подпольщица, усмехнувшись, сказала:

— Вам могут помочь найти к ним дорогу.

Байер только пожал плечами.

Ночь Алейник провела у соседей, опасаясь, что обер-лейтенант арестует ее. Но Байер не собирался этого делать. Назавтра он позвал Валентину к себе и, когда подпольщица переступила порог кабинета, приветливо пригласил ее сесть.

— Я мог бы передать вас в руки оккупационных властей, — начал он задумчивым голосом, — но ваша смерть не спасет ни меня, ни мою Германию. Кто же будет ее строить?

— Есть патриоты, которые поведут за собой немецкий народ. Присоединяйтесь к ним, господин обер-лейтенант. Тогда вам не придется с тревогой думать о завтрашнем дне.

Вскоре подпольщица передала в штаб бригады новую записку: «Байер дал согласие на встречу».

В Слуцк отправился Александр Фомин. Встреча была назначена в доме № 13 по улице Вечеркевича. После короткого знакомства обер-лейтенант сказал Фомину:

— Мое решение перейти на вашу сторону обдумано до конца, и я хочу доказать это делом. Так вот, меня переводят отсюда: я назначен на должность руко-

Наследие слуцкого края

водителя хозяйства, которое раньше принадлежало Киселевичской МТС, что рядом с Бобруйском. Дайте мне шофера, и мы попробуем что-нибудь привести партизанам.

В Бобруйск Байер поехал с Николаем Анохиным. А вскоре, как и было условлено, обер-лейтенант «случайно» наскочил на партизанскую засаду у деревни Кучино, и наши бойцы взяли его в плен. В качестве трофея партизанам досталась автомашина, груженная оружием, боеприпасами и продуктами питания.

В штабе бригады Байер рассказал, что в районе Кельна, где он недавно побывал в отпуске, видел большое военное строительство. Знакомые офицеры говорили ему, что там возводятся стартовые площадки для обстрела Лондона «чудо-снарядами». Идут разговоры о том, что новые снаряды-ракеты будут применены и на Восточном фронте. Обер-лейтенант передал также сообщение о том, будто Гитлер готовит специальный десант для нападения на Тегеран, где в скором времени соберутся руководители союзных держав.

Сообщение Байера вскоре подтвердил и другой немецкий военнослужащий — Рудольф М., инженер по образованию. До того как попасть в Белоруссию, Рудольф М. служил в ракетных войсках на территории Германии. Он многое знал и о стартовых площадках снарядов-ракет «ФАУ-2», и о самих ракетах.

Подпольный обком партии передал ценные сведения начальнику Центрального штаба партизанского движения П.К.Пономаренко. Байера и Рудольфа М. самолетом отправили в Москву.

Но фронт требовал от партизан не только разведданных. По указанию штаба Западного фронта народные мстители провели ряд операций по разрушению мостов на дорогах. Так, за пять дней августа 1942 г. было взорвано шесть мостов на Варшавском шоссе и на шоссе Осиповичи — Бобовня. Был также взорван железнодорожный мост на участке Слуцк — Уречье. В сентябре того же года партизаны уничтожили восемь мостов через реки Случь и Весейку, а в ночь на 5 декабря Коновалов, Шестиков, Осокин, Носов и Сурда спалили мосты у Красной Горки и Бокшиц, что на шоссе Минск — Слуцк.

В 1943 г. партизаны Арестовича приняли участие в «рельсовой войне». В соответствии с планом, который был разработан штабом нашего соединения, бригада совершила тяжелый переход к своему участку на железной дороге Брест — Москва. На рассвете 11 августа партизаны заняли позиции вдоль перегона между станциями Фаниполь и разъездом Волковичи. Смелой атакой была выбита из дзотов охрана дороги. Минеры подложили под рельсы взрывчатку. Загремели взрывы. Около тысячи рельсов были выведены из строя. Трое суток понадобилось гитлеровцам, чтобы восстановить движение на этом участке железной дороги.

Партизаны-фрунзенцы ни на один день не давали покоя врагу. Иван Васильевич Арестович был сторонником небольших по масштабу, но дерзких и стремительных налетов на противника. И нередко он комплектовал до десятка групп по нескольку человек и рассылал их на задания во все концы района. Случалось, что в один и тот же день в одном месте взрывался мост на шоссе, в другом горел вражеский продовольственный склад, в третьем партизанская засада уничтожила автомашины неприятеля, в четвертом появлялись листовки во вражеском гарнизоне. Все это сильно тревожило фашистов. Немецкий комендант Слуцка не раз доносил в Минск о большом скоплении партизан в гресских лесах, хотя там действовали две средние по размерам бригады — имени Фрунзе и имени Суворова. Вот несколько выдержек из боевого журнала фрунзенцев.

28 ноября 1942 г. Рота под командованием Н.Макаревича разгромила фашистский гарнизон на торфозаводе «Радичево» близ Слуцка, захватила продовольственный склад и освободила 38 советских военнопленных. Роты под командованием Е.Лизюкова и Н.Степанова разгромили немецкое имение в деревне Весея Слуцкого района, захватили большое количество скота — коров, лошадей, овец, свиней. Часть скота была роздана населению.

5 декабря 1942 г. Группа партизан проникла в Слуцк и сожгла склад мельницы «Прогресс».

15 декабря 1942 г. Рота под командованием Георгия Авдюкевича устроила засаду на дороге Уречье — Кучино. В бою было уничтожено 15 гитлеровцев, в том числе 5

Наследие слуцкого края

офицеров, сожжены легковая и грузовая автомашины, захвачены трофеи.

8 ноября 1943 г. Группа партизан во главе с начальником штаба Прыгуновым проникла во вражеский гарнизон в деревне Горки, сняла ночные караулы и уничтожила немало фашистов. 14 гитлеровцев было захвачено в плен.

19 января 1943 г. Рота Е.Лизюкова совершила налет на языльский гарнизон. Вскоре налет был повторен и гарнизон полностью разгромлен.

Гитлеровское командование не могло примириться с поражениями и большими потерями. Несколько раз предпринимались крупные карательные экспедиции против партизан. В конце января 1943 г. для блокады леса были брошены многочисленные подразделения пехоты при поддержке авиации, танков и артиллерии. Фрунзенцы то в одном месте, то в другом навязывали карателям бои, изматывали их силы, а потом, совершив смелый ночной маневр, вышли возле деревни Застаричи в тыл противнику и неожиданным ударом разгромили одно из его подразделений. Массовый героизм проявили партизаны бригады имени Фрунзе и во время блокадных боев в июне 1944 г. Народные мстители помогли частям Красной Армии освободить город Слуцк.

Друкуецца паводле кн.: Мачульский Р.Н. Вечный огонь. 3 изд. Мн., 1978. С. 301—304.

На Мінскай шашы

Пахмурнай майскай раніцай па Мінскай шашы нетаропкай хадою ішлі два хлопцы ў паношанай сялянскай вопратцы. Адзін нёс на плячы касу, а другі — граблі. Міма, абдаваючы дымам і гарам, праносіліся калоны нямецкіх грузавікоў.

Зброя патрэбна была як паветра. У нашай партызанскай групе «Іваныча» было ўжо чалавек 20, а зброі не хапала. Ішоў 1943 год. Тое, што засталося са зброі на палях бітвы, партызаны падабралі. Патрэбна было ўзбройвацца за лік ворага. З гэтай мэтай і папрасілі ў начальніка штаба Рыгор Свінціцкі і разведчык Васіль Рудкоўскі дазволу на «свабоднае паляванне». Разлік быў такі: спыніць на шашы нямецкую аўтамашыну, перабіць экіпаж і ўзяць зброю. Справа была рызыкоўная. Але хлопцы на ўсё гатовы.

...Час ішоў да паўдня, паток машын стаў радзець. Нарэшце за паваротам партызаны ўбачылі грузавік, які стаяў на абочыне дарогі.

— Вось гэты будзе наш! — усхвалявана сказаў Рыгор Свінціцкі.

Падышоўшы бліжэй, убачылі сядзеўшага ў кабіне афіцэра. Салдат-шафёр стаяў на каленях, мяняючы задняе кола ў машыне. У кузаве быў нагружаны калючы дрот.

— Ты бі шафёра, а я афіцэра, — сціснуў локаць Рудкоўскага Свінціцкі. — Страляць разам, ва ўпор!

Параўнаўшыся з машынай, Рыгор выхапіў пісталет і рвануў ручку кабіны.

— Іх бін афіцэр! — у жаху крыкнуў фашыст, паказваючы рукой на пагоны.

— Тым лепш! — адказаў партызан і выстраліў.

Убачыўшы зброю ў руках сялян, шафёр кінуўся бегчы і пасля стрэлу Рудкоўскага рухнуў у канаву.

У кабіне хлопцы ўзялі дзве вінтоўкі і пісталет забітага обер-лейтэнанта. Спаліць машыну не паспелі — удалечыні паказалася чарговая калона. Да рэчкі, за якой была партызанская зона, некалькі кіламетраў чыстага поля. І наўрад ці смельчакам удало́ся б выратавацца. Але недалёка пасвіліся коні. Разрэзаўшы нажом путы, Рудкоўскі дапамог таварышу сесці на каня, ускочыў сам — выручыў спрыт цыркавога артыста. Народныя мсціўцы хутка памчаліся да лесу. І калі на шашы ўзнялася страляніна, партызаны былі ўжо ў сваёй зоне.

Абодва адважныя партызаны не дажылі да Перамогі. Смерцю храбрых загінулі яны ў баях з акупантамі. Пахаваны каля в. Жылін-Брод у брацкай магіле, куды мы, іх баявыя таварышы, прыносім кветкі ў светлы дзень Вялікай Перамогі.

Б.Багдановіч, былы камандзір групы «Іваныча» партызанскай брыгады імя Суворава.

Шлях Ільіча. 1982. 3 ліп.

Наследие слуцкого края

Партызанская хроніка

...Конные разведчики донесли, что гарнизон в Белой Луже получил подкрепление и, по-видимому, что-то готовит. Вскоре прибыли артиллеристы с тремя пушками.

Мы выслали несколько разведывательных групп в район Буда Греская и в район деревни Шищицы узнать, что делается в гарнизонах противника. Возвратившись, они доложили, что оккупанты готовятся к выступлению. Оставались неясными только направления их выступлений.

Теперь днем и ночью возле вражеских гарнизонов лазили наши разведчики.

Партизанами бригады имени Суворова были получены новые данные: гарнизоны Греска и Слуцка тоже готовятся к карательным действиям против партизан и населения...Было ясно, что немцы решили произвести нападение одновременно всеми окружавшими партизанскую зону гарнизонами.

Преградить оккупантам дорогу мы выслали все три роты, а группу Кузнецова оставили для обороны лагеря. И вот в трех местах в лесу Княжий Ключ завязались бои. Потеряв около трех десятков убитыми, противник отступил.

...С юга от Слуцка и Старых Дорог фашисты начали наступление на бригаду имени Фрунзе. С запада от Греска, Белой Лужи, Шищиц, Буды Греской против нашего отряда и бригады имени Суворова выступили три полка пехоты с танками и пушками.

Для удобства руководства обороной комбриг Коледа передал в мое распоряжение два отряда: имени Фрунзе и имени Суворова. Усиленные группы разведчиков вступили в перестрелку с передовыми подразделениями противника. Мы с командирами приданных отрядов решили выдвинуться вперед, к берегу реки Случь. К рассвету достигли шоссе Осиповичи — Бобовня. В районе сожженного моста мы остановились.

Здесь приняли решение занять линию обороны на флангах отряда имени Фрунзе и имени Суворова, а наш отряд должен был расположиться по обеим сторонам шоссе. Западный берег Случи и подступы к сожженному мосту заминировали.

Над нашими головами пронеслись две эскадрильи бомбардировщиков с черными крестами. Сзади нас грохнули взрывы, и опять наступила тишина. Мокрые, только что переплывшие на лошадях реку, прискакали разведчики Васильева и Терновский. Валя быстро направилась к нам, в ее сапогах хлюпала вода.

— Из Шищиц вышли гитлеровцы, с ними танки и артиллерия, — быстро доложила она.

Передав через связных последние приказания командирам, я сел на своего Орлика и поехал осматривать линию обороны. Все лежали, укрывшись под деревьями, в ямах, замаскировавшись. В канаве находились минометные и противотанковые расчеты. Рядом, возле станкового пулемета, словаки Штефан Качалка и Рудольф Заяц что-то разъясняли своим бойцам. Подойдя к Рудольфу, я спросил:

— Не отступите?

— Ни за что!

— Этот сектор очень важен. Подпускайте противника до самого моста...

На другом берегу послышался гул моторов. Рудольф с Качалкой залегли у пулемета, а я поскакал на командный пункт.

Далеко между болотами вилось белой лентой шоссе. Вскоре на нем одна за другой показались несколько точек. В бинокль я увидел, что к нам приближались вражеские мотоциклисты. Они ехали медленно, оглядывая близлежащие кусты. Но вот они въехали на минное поле. Там поднялся столб земли и пыли. Один из мотоциклистов быстро развернулся, выпустил несколько очередей и помчался назад. В то же время на шоссе показались три танка и самоходная пушка. Первый танк остановился около разбитого мотоцикла, потом дал газ и устремился вперед. Под его гусеницами разорвалась мина. Танк вздрогнул всем корпусом, завертелся на месте, затем заглох. Остальные танки и две пушки открыли огонь по нашему расположению: за танками развернулась пехота.

Снаряды разрывались позади нас. Мы не отвечали. Гитлеровцы продвинулись к реке. Самоходная пушка, объехав поврежденный танк, приблизилась к мосту. Я подал команду: «Огонь!»

Ударили минометы, противотанковые ружья. Огонь партизан прижал гитлеровцев к земле. От танков отскакивали ярко

Наследие слуцкого края

светящиеся искры. Враг огрызнулся огнем, попятился назад и начал окапываться. Я опять посмотрел в бинокль.

Далеко на шоссе показалась автоколонна. Она остановилась. Солдаты выпрыгнули из машины. Заметив противника, Козлов, посмотрев в бинокль, выбрался из укрытия и побежал к пулеметчикам, которые находились возле шоссе. Пулеметчики открыли меткий огонь по автоколонне. Солдаты противника бросились было врассыпную, и гитлеровским офицерам пришлось немало потрудиться, чтобы восстановить порядок. Через поле, прикрываясь кустами, подходили к реке новые силы гитлеровцев. Перед нами стояла более чем в три раза превосходящая численным составом и боевой техникой группировка. Кругом свистели пули, рвались снаряды.

...Гитлеровцы начали общее наступление. Первые вражеские подразделения переправились через реку, но, не успев закрепиться на нашем береге, были уничтожены. Бой затих. Мы немного перекусили. С наступлением сумерек выслали разведчиков... На рассвете противник открыл артиллерийский огонь... Неожиданно артиллерия замолкла. Гитлеровцы на всех участках вновь начали атаки. Они бросились к реке...

Под вечер разведчики сообщили, что противник крупными силами закрыл нам отход через шоссе Бобруйск — Слуцк и Минск — Слуцк. Других путей к отступлению у нас не было. Необходимо пробиться силой.

...Как только наши отряды стали отходить, фашисты бросились в атаку, стали нажимать на группу прикрытия, но наскочили на мины и, потеряв три подводы с боеприпасами, с десяток своих солдат и проводника, отстали. Нам удалось оторваться.

В районе деревни Кошели остановились на отдых. Через час прибыла бригада имени Суворова. Несмотря на тяжелые бои, настроение было бодрое, боевое... Мы двинулись вперед, в Воробьевский лес. В пути наша разведка выяснила, что немецкие войска снимаются, значит карательная операция заканчивается.

В Гресском районе мы встретились с партизанами бригады имени Фрунзе, которые рассказали, что в ночь на 3 июня бригада отошла за шоссе Осиповичи — Бобовня.

На рассвете следующего дня с целью дезорганизовать противника и сорвать его планы бригада силами отрядов имени Буденного, Рокоссовского и Дзержинского перешла в наступление в районе деревень Обчее и Селец. Это наступление было неожиданным для гитлеровцев, и бригада, воспользовавшись растерянностью противника, оторвалась от него, зашла в тыл вражеской группировке, нанесла ей сильные удары.

Так, 9 июня 1944 г. группа партизан отряда имени Рокоссовского в районе деревни Жилин Брод отбила у противника большой обоз, взяла в плен несколько гитлеровцев.

На следующий день рота партизан отряда имени Кирова напала на вражескую автоколонну на участке дороги Мелитоново — Щитковичи в районе деревни Красная и уничтожила десять автомашин, при этом было убито и ранено восемнадцать гитлеровцев. Подразделения бригады имени Фрунзе, оказавшись в тылу наступавших против партизан вражеских войск, дезорганизовали их своими смелыми и энергичными действиями.

Бригада имени Суворова прорвалась на запад в Воробьевский лес. Задуманная немецко-фашистским командованием операция по уничтожению партизанских отрядов и бригад на территории четырех районов Белоруссии, как и предыдущие операции, провалилась.

Друкуецца паводле кн.: В а у п ш а с о в С.А. Партизанская хроника. 2 изд. Мн., 1971. С. 365—382.

Браты-партызаны

Калі пачалася калектывізацыя, Іван Жук з першых дзён арганізацыі ў Паўстыні калгаса старанна працаваў на калектыўнай гаспадарцы. Былы батрак стаў актывістам. Яго паважалі аднавяскоўцы.

Але вось надышоў 1941 год. Чорная хмара фашысцкай навалы навісла над нашым мірным домам.

...Са Слуцка Іван і яго брат Фёдар вярнуліся дадому: у ваенкамаце ўжо ніко-

Наследие слуцкого края

га не было. Вечарам сталі раіцца, што рабіць.

— Склаўшы рукі сядзець не будзем, — сказаў Іван. — Будзем змагацца!

У хуткім часе Івану і Фёдару ўдалося ўстанавіць сувязь з партызанамі. Яны збіраюць зброю, дапамагаюць партызанам харчамі, вопраткай. Затым пераходзяць да больш актыўнай барацьбы з ворагам. Ад іх рук узляцела ў паветра не адна варожая машына. Дзесяткі акупантаў знайшлі сабе магілу.

У в. Заграддзе стаяў атрад фашыстаў. Па чыгункі ім дастаўлялі на ваганетцы прадукты, боепрыпасы. У сакавіку 1943 г., даведаўшыся, што ў Заграддзе павінна быць дастаўлена вялікая колькасць такога грузу, Іван і Фёдар вырашылі ўзарваць ваганетку. Заклалі добрую порцыю толу, і ён зрабіў сваю справу.

Злавіць падрыўнікоў паліцэйскім і немцам у гэты дзень не ўдалося. Аднак паліцаі цвёрда заяўлялі, што выбух на чыгунцы — справа рук толькі Івана і Фёдара, і пачалі пільна сачыць за іх хатай.

На наступны дзень, у нядзелю, жонка Івана — Варвара на золку разам з іншымі жанчынамі пайшла ва Урэчча на базар. А праз некаторы час паліцаі схапілі Івана і Фёдара. Іх завялі ў памяшканне былой школы і пачалі збіваць, патрабуючы выдаць партызан. Аднак браты трымаліся цвёрда. Ніводнага слова не пачулі ад іх ворагі.

Вяртаўшыяся з Урэчча паўстынцы, у тым ліку і цяжарная жонка Івана, убачылі, як па вясковай вуліцы вялі збітых, са звязанымі рукамі, Івана і Фёдара. За імі неслі крэслы. Для чаго яны былі патрэбны, людзі здагадаліся. Варвара страціла прытомнасць...

Фёдару ўдалося развязаць рукі, і ён кінуўся ўцякаць. Сем немцаў пусціліся наўздагон, пачалі страляць. Але злавіць Фёдара ім не ўдалося. Лёгка паранены фашысцкай куляй, ён дабег да лесу і зарыўся ў мох. Ворагі вырашылі, што забілі партызана, і не адважыліся ісці далей.

Яшчэ больш за год помсціў Фёдар фашыстам і загінуў летам 1944 г. у адным з цяжкіх баёў.

Івана гітлераўцы павесілі.

А.Дубіцкі.

За сацыялістычную Радзіму. 1958. 5 мая.

Лёс Марыі Елавец

...1942 год. Ужо які дзень Маша з братам і маці знаходзілася на Капыльскай вуліцы ў мястэчку Леніна пад наглядам гітлераўцаў. З гета дазвалялася выходзіць толькі на работу. Адлучышся куды, напаткаюць карнікі — расстраляюць. Адчувалася нядобрае, трывожнае, але што і як рабіць, куды кінуцца — не ведалі.

7 чэрвеня 1942 г., калі над мястэчкам Леніна неба на ўсходзе ледзь-ледзь зачырванелася, да Капыльскай вуліцы набліжаліся карнікі. Яны акружылі хаты і сталі выганяць жыхароў — старых, дзяцей, жанчын. Брэх гітлераўскіх сабак ранішняя цішыня разнесла па населенаму пункту, рассеяла па навакольных палях. Трывожна забіліся сэрцы ў тых, хто па волі лёсу стаў сведкам страшэннай трагедыі. Васемнаццацігадовая дзяўчына Маша паспела ўцячы.

Далёка засталіся ўжо могілкі, не бачна і лашчыны — месца страшэнных падзей, дзе назаўсёды засталіся ляжаць яе маці і брат ды яшчэ каля 200 расстраляных. Ёй адной удалося выратавацца, каб адпомсціць фашысцкім вылюдкам за смерць родных і блізкіх.

Укрыццём для дзяўчыны стаў стог мінулагодняй саломы. Калі летняя ноч спаўзла на зямлю, Маша дабралася да адной з хат у пас. Крошня, што ля Рачкавіч. Лёгкі стук у дзверы. Выйшаўшы насустрач мужчына сярэдніх гадоў гасцінна запрасіў:

— Зайдзі, дачка, адпачні...

Гэта быў Алесь Раманавіч Мартынчык. Душэўны, сапраўды наш, савецкі чалавек. Мартынчык, рызыкуючы сваім жыццём і жыццём усіх членаў сям'і, схаваў «ущякачку». Інакш не мог ён паступіць, ведаючы, што чалавеку пагражае смерць ад фашысцкіх катаў. Калі Алесю Раманавічу ўдалося высветліць, як дабрацца да партызан, якія дзейнічалі на Капыльшчыне, ён пераправіў яе ў лес.

Вёска Какорычы на Капыльшчыне — месца, дзе Марыя Елавец уступіла ў партызанскі атрад, які потым вырас у брыгаду імя Суворава. Неўзабаве ёй давялося прыняць баявое хрышчэнне. Карнікі прыехалі

Наследие слуцкого края

ў в. Раёўка, каб «супакоіць» жыхароў. Партызаны завязалі бой у Савіцкім лесе. Санітарка Елавец захапіла першы трафей — вінтоўку з патронамі, з якой не разлучалася да самага дня сустрэчы партызан з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі.

...Бой у Лаўскім лесе. Партызаны, сярод якіх была і Марыя Елавец, вялі цяжкія баі з гітлераўскімі акупантамі. У Лавах знаходзіліся рацыя і шпіталь. Фашысты прарвалі абарону і сталі набліжацца да вёскі. Ахова рацыі (у нарадзе была і М.Елавец) разам з двумя сувязістамі павінны былі эвакуіраваць рацыю. Гразнучы па калена ў снезе, партызаны выканалі загад камандавання: рацыя была выратавана.

Дванаццаць разоў удзельнічала Марыя Міронаўна Елавец у баях. На чыгунцы яна асабіста знішчыла каля двух кіламетраў ліній сувязі, удзельнічала ў засадах па знішчэнні варожых аўтамашын. З групай партызан з-пад носа гітлераўцаў вывезла ў атрад вінтоўкі, снарады і іншыя боепрыпасы.

Летам 1944 г. пад магутнымі ўдарамі Чырвонай Арміі нямецка-фашысцкія акупанты паспешна адступалі на Захад. Разам з савецкімі войскамі гераічна змагаліся і народныя мсціўцы ў тыле ворага.

Настаў радасны дзень 28 чэрвеня 1944 г. Партызанская брыгада імя Суворава непадалёку ад в. Палікараўка сустрэлася з часцямі Чырвонай Арміі. Побач з танкістамі, пехацінцамі, артылерыстамі крочаць байцы ў цывільным. Сярод іх дзяўчына ў белай блузцы з вінтоўкай у руках. Кінааператары знялі гэту сустрэчу на плёнку, і яна ўвайшла ў гістарычны паўнаметражны фільм «Вызваленне Савецкай Беларусі». Дзяўчына — гэта былая партызанка Марыя Міронаўна Елавец. За трыццаць гадоў, якія мінулі пасля вызвалення Беларусі ад гітлераўцаў, у яе адбылося многа радасных змен. Пасля заканчэння ў 1959 г. кааператыўнага тэхнікума Елавец-Шуцерман стала працаваць у гандлі...

Яе баявыя гераічныя подзвігі ў гады Вялікай Айчыннай вайны адзначаны шасцю ўрадавымі ўзнагародамі. Ордэн салдацкай Славы III ступені знайшоў Марыю Міронаўну праз дваццаць гадоў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.

С.Дубярштэйн.

Шлях Ільіча. 1974. 5 вер.

Аўтамат «ГЦД»

Аўтамат «ГЦД» добра служыў партызанам атрада імя Громава, які дзейнічаў у гады вайны на Случчыне.

ГЦД — гэта імя, прозвішча канструктара Георгія Ціханавіча Дзмітрыенкі, былога партызана.

— Што тычыцца аўтамата, то, сапраўды, я зрабіў яго разам з таварышамі ў вясковай кузні на Любаншчыне, — расказвае Георгій Ціханавіч.

Не хапала зброі.

— А што, калі самім зрабіць, напрыклад, аўтамат такі, як у вас, — сказаў аднойчы Георгій Ціханавіч камандзіру атрада імя Громава.

— Справу гаворыш, — адказаў той.



Зброевая майстэрня партызанскай брыгады імя Чкалава.

Наследие слуцкого края

У свой час Дзмітрыенка вучыўся ў тэхнікуме, пазнаёміўся з апрацоўкай металу, а будучы ў арміі — яшчэ перад вайной, займаўся рацыяналізацыяй. Усё гэта згадзілася. За металам справа не стала — яго хапала навокал. А інструмент знайшоўся ў мясцовых жыхароў.

Падоўгу разбіраў і збіраў партызан камандзірскі аўтамат. А потым — за справу. Кожух зрабіў са звычайнай аўтамабільнай помпы, вось трактарнага плуга пайшла на выраб затвора.

Вядома, не лёгка было зрабіць аўтамат. Але жаданне даць зброю таварышам дапамагала пераадольваць цяжкасці. І вось аўтамат ужо зроблены. Ён вытрымаў выпрабаванне, і з ім пайшоў у бой Г.Дзмітрыенка. А потым такі аўтамат з'явіўся і ў іншых партызан.

Аднойчы ў атрадзе пабываў В.І.Казлоў, камандзір партызанскага злучэння. Ён з цікавасцю агледзеў партызана, падзякаваў яму, параіў наладзіць масавы выпуск. А першы ўзор забраў для адпраўкі ў Маскву, на «Вялікую Зямлю», як казалі тады.

Камандзір узвода Г.Дзмітрыенка часта выходзіў на аперацыі, а ў вольны ад баявых заданняў час майстраваў зброю. Ён, акрамя аўтаматаў, рабіў ружэйныя гранатамёты.

Адважна ваяваў партызан. На яго рахунку, як гаворыцца ў характарыстыцы, выданай камандаваннем, 34 падбітыя і ўзарваныя аўтамашыны, 116 забітых і раненых гітлераўцаў і іх прыслужнікаў-паліцэйскіх. Ордэнам Чырвонай Зоркі адзначаны баявыя справы Г.Дзмітрыенкі.

Пасля вайны — служба ў арміі. А потым — мірная праца.

І такім чынам, быў такі аўтамат «ГЦД», як называлі яго партызаны. Калі вы хочаце ўпэўніцца ў гэтым, наведайце Слуцкі краязнаўчы музей. На адным са стэндаў — аўтамат партызана, а на прыкладзе выпалены надпіс «Г.Ц.Дзмітрыенка».

Г.Яўсееў.

Шлях Ільіча. 1974. 17 вер.

Юныя партызаны

...Юныя героі змагаліся з ворагам і ў нас на Случчыне. У падпольных антыфашысцкіх арганізацыях у асноўным была моладзь, большасць яшчэ падлеткі.

У патрыятычную групу Мікалая Радзюка, якая была створана ў верасні 1941 г.у в. Навадворцы, увайшлі два малодшыя браты Мікалая — 16-гадовы Яўген і 14-гадовы Лёня, а таксама 14-гадовая Людміла Ласевіч. Яны выконвалі складаныя заданні: расклейвалі ў зонах варожых гарнізонаў лістоўкі, агітацыйныя плакаты, даставалі для партызанскага атрада тол, медыкаменты, узрыўчатку, зброю. Людміла была яшчэ і сувязной партызанскага атрада Губіна. Па заданню партызан звязалася з галоўным урачом Слуцка Трухан, які даваў ёй патрэбныя лекі, перавязачны матэрыял. Хутка Людміла вымушана была застацца ў партызанскім атрадзе, бо фашысты пачалі яе шукаць.

У час блакады партызанскага злучэння ў раёне Чорнага балота Людміла абмарозіла ногі. У пасляваенны час яна закончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, працавала ў Мінску.

З верасня 1941 г. на тэрыторыі Случчыны ў раёне в. Гутніца дзейнічала разведгрупа Заходняга фронту, кіраўніком якой быў М.К.Коган. У склад гэтай групы ўваходзілі 14-гадовы Толя Гужаў (Орлік) і Валодзя Фралоў (Снігір). Толя Гужаў быў разведчыкам-сувязным. Кожны дзень па бездарожжу ён адмяраў дзесяткі кіламетраў. ...Аднак Орлік марыў сустрэцца з ворагам у адкрытай бітве. Каля в. Жылін Брод разам з партызанамі ён удзельнічаў у баявой аперацыі.

Удзельнік бою А.А.Айлараў успамінае, што ў рукапашнай сутычцы Толя Гужаў знішчыў фашыста, які цэліўся ў камандзіра атрада. За храбрасць і рашучасць камандзір падарыў Орліку «вальтэр» (мініяцюрны пісталет), з якім ён не разлучаўся ніколі. Гэта была яго ракавая памылка. У пачатку лістапада 1942 г. Толя наткнуўся ў в. Амговічы на паліцэйскі патруль. Яго абшукалі і знайшлі «вальтэр». ...Толю Гужава адправілі ў гестапа. Прайшоўшы страшэнныя катаванні і крывадушныя абяцанкі следчага, Толя Гужаў быў расстраляны.

А колькі юных патрыётаў было ў партызанскіх атрадах, дыслацыраваных непасрэдна на Случчыне. Іван Матусевіч — ён у 10 гадоў ужо быў партызанам брыгады

Наследие слуцкого края



Л.Ласевіч.



У.Фралоў.



Р.В.Родчанка.



І.М.Матусевіч.



В.І.Ткачоў.



М.А.Шыманоўскі.



С.В.Ляшчэня.



І.А.Гельфанд.

імя Суворава. Рыгор Родчанка, Мікалай Шыманоўскі партызанілі ў атрадзе імя Ракасоўскага брыгады імя Фрунзе. У сваёй аўтабіяграфіі Рыгор Родчанка пісаў аб тым, што ў 12 гадоў быў у партызанскім атрадзе, удзельнічаў у баях пад Старобінам у пачатку 1943 г., пад в. Калінаўка Любанскага раёна ў лютым 1943 г., а ў маі 1943 г. пад в. Шчыткавічы.

У пасляваенны час Р.Родчанка працягваў вучобу, стаў настаўнікам і краязнаўцам... І гэта не ўсе імёны юных патрыётаў, якія нароўні з дарослымі змагаліся з фашыстамі. Віктар Ткачоў — партызан атрада імя Кірава брыгады імя Фрунзе, Сяргей Ляшчэня — разведчык, падрыўнік атрада імя Заслонава, Іосіф Гельфанд — партызан атрада імя Кутузава брыгады імя Кірава — усе яны мужна змагаліся з захопнікамі.

Н.Барысавец.

Слуцкі край. 1994. 6 ліп.

Медыкі — актыўныя ўдзельнікі партызанскай барацьбы ў грэскіх лясах

В годы Великой Отечественной войны в гресских лесах дислоцировались десятки партизанских отрядов и бригад. В результате их активных боевых действий была очищена от гитлеровцев большая зона, простиравшаяся на десятки километров южнее Минска. В ней находили себе укрытие от фашистов тысячи жителей Гресского, Слуцкого, Стародорожского, Узденского, Пуховичского и др. районов. С юга зону надежно прикрывали бригады им. Суворова и им. Фрунзе. В партизанских соединениях находилось немало медицинских работников, которые, кроме участия в боевых операциях, выполняли свой профессиональный долг — боролись за жизнь и здоровье советских людей. О некоторых из них хочется рассказать.

Морозной декабрьской ночью 1942 г. группа партизан в количестве 28 чел. из

Наследие слуцкого края

отряда им. Фрунзе направлялась к шоссе Слуцк — Бобруйск. Возглавлял группу командир роты Георгий Авдюкевич. Вместе с бойцами на задание шла и медицинская сестра Ирина Кудрицкая. ...На рассвете между деревнями Рабак и Круглое показалось шоссе. Выбрали место для засады, замаскировались и стали ждать. Около полудня показались машины с офицерами и солдатами. Завязался бой. В этом бою фашисты потеряли 20 человек убитыми, были захвачены большие трофеи, оружие, боеприпасы. Медицинская сестра И.Кудрицкая вынесла из-под обстрела и оказала медицинскую помощь раненым партизанам Дубову, Юрьеву, Ермакову, Цвирко, командиру роты Авдюкевичу. Не одну бессонную ночь провела она в партизанских землянках-госпиталях, выхаживая раненых и больных, помогла возвратить в строй десятки народных мстителей.

В бригаде им. Фрунзе медицинскую помощь раненым оказывали врачи Любовь Михайловна Арестович и Елизавета Альбертовна Рогатинская. Бригаду обслуживал партизанский госпиталь, который располагался вблизи д. Шантаровщина Гресского р-на. Начальником медицинской службы была Л.М.Арестович. Вместе с ней медицинское обслуживание партизан осуществляли врачи М.В.Арестович, фельдшер М.Сачишина, медсестры И.Кудрицкая и А.Бочарова.

